# ПАМЯЦЬ

## МАГІЛЁЎСКІ РАЁН

МІНСК «ПОЛЫМЯ» 1996

ББК 63.3(4 Беи)
П 15
УДК 947.64

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

У. Ф. АГУРЦОЎ, П. А. КАНДРАТАЎ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ,
А. І. САЛАМЕВІЧ, М. П. ХОБАТАЎ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ
ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В. К. ЯЛЕНСКІ (старшыня камісіі),
У. Ф. АГУРЦОЎ (намеснік старшыні), Г. П. СІДАРЭНКА (сакратар),
І. Ф. ГУРКОЎ, С. В. БУРАЧКОЎ, С. М. КАПУСЦІН, А. А. КАТЛЁНАК, А. Ф. КУКСЕВІЧ, С. Л. ЛАБЕЦІК, Г. П. ЛІСІЦКІ, І. У. МЕНЧУКОВА, А. У. ПУСКОЎ, Н. С. СКАПЦОВА, В. М. СУХОЦКАЯ

Арганізацыйна-метадычны цэнтр
па выданні гісторыка-дакументальных хронік Памяці
Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку:

А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК
(галоўны рэдактар), М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст)

Укладальнікі:
У. Ф. АГУРЦОЎ, М. П. ХОБАТАЎ

Рэдактары:
С. М. ДЗЕРАНГОЎСКАЯ, І. М. КАВАЛЕЎСКІ, І. В. КАМАРОЎ,
І. В. КІСЯЛЁВА, А. І. САЛАМЕВІЧ (вядучы)

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі
В. А. РАГАЛЕВІЧА

Рэцэнзент А. П. ЯРОХІН

$П\frac{9470600000-025}{М 306 (03) - 96}$ Без аб'яўл.

ISBN 985-07-0121-8

© Выдавецтва «Полымя», 1996



Мемарыяльная капліца на месцы бітвы ў Айчынную вайну 1812 г. у в. Салтанаўка

| | | |
|---|---|---|
| 10—8 тысячагоддзі да н. э. | — | з'яўленне першых людзей на тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны |
| Канец 5—3 тысячагоддзе да н. э. | — | на тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны жылі плямёны верхнедняпроўскай археалагічнай культуры |
| 2 тысячагоддзе да н. э. | — | землі сучаснага Магілёўскага раёна насялялі плямёны сярэднедняпроўскай археалагічнай культуры |



Царква Пакроваў Багародзіцы ў в. Вейна

| | |
|---|---|
| 7—3 стагоддзі да н. э. | — тэрыторыю сучаснага Магілёўскага раёна насялялі плямёны мілаградскай археалагічнай культуры |
| 3 стагоддзе да н. э. — 2 стагоддзе н. э. | — тэрыторыю сучаснага Магілёўскага раёна насялялі плямёны зарубінецкай археалагічнай культуры |
| Другая палова 1 тысячагоддзя н. э. | — у Верхнім Падняпроўі пачалося рассяленне славян. Тэрыторыя сучаснага Магілёўскага раёна была заселена крывічамі, радзімічамі і дрыгавічамі |



Помнік воінам 172-ой стралковай дывізіі, якая абараняла Магілёў, у в. Буйнічы

| | |
|---|---|
| 10—13 стагоддзі | — тэрыторыя сучаснага Магілёўскага раёна ўваходзіла ў склад Полацкага, Смаленскага, Друцкага княстваў |
| 14 стагоддзе | — тэрыторыя сучаснага Магілёўскага раёна ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага |
| 28 студзеня 1577 г. | — Магілёў атрымаў поўнае магдэбургскае права і герб |



Помнік К. М. Сіманаву на Буйніцкім полі

| | |
|---|---|
| 1633 г. | — пабудаваны Буйніцкі жаночы манастыр |
| Жнівень 1654—1661 г. | — Магілёўскі павет захоплены войскамі маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча |
| 1708 г. | — на Магілёўшчыне стаяла войска рускага цара Пятра I |
| Жнівень 1708 г. | — Магілёў занялі войскі шведскага караля Карла XII |



Магіла ахвяр фашызму ў в. Дубінка

| | |
|---|---|
| 1772 г. | — у выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай Магілёўшчына апынулася ў складзе Расійскай імперыі |
| 8 чэрвеня 1772 г. | — утворана Магілёўская губерня, у складзе якой быў і Магілёўскі павет (з 23 снежня 1796 г. да 11 сакавіка 1802 г. — у складзе Беларускай губерні) |
| 8 ліпеня 1812 г. | — Магілёў занялі напалеонаўскія войскі |



Помнік воінам Чырвонай Арміі, якія загінулі пры фарсіраванні Дняпра, у в. Палыкавічы

| | |
|---|---|
| 11 ліпеня 1812 г. | — адбыўся бой паміж корпусам Раеўскага і корпусам Даву каля вёскі Салтанаўка |
| 1882 г. | — выступленне сялян вёскі Алень супраць захопу іх зямель уладальнікам маёнтка |
| 1896 г. | — у Магілёве адбылася выстаўка-агляд сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай прадукцыі |




Брацкая магіла савецкіх воінаў у в. Сялец

| | |
|---|---|
| 1905 г. | — хваляванні сялян у вёсках Вейна, Навасёлкі, Машанакі і інш |
| 8 сакавіка 1917 г. | — у Магілёве быў арыштаваны былы імператар Мікалай II |
| Сакавік 1917 г. | — у Магілёве створаны Савет рабочых дэпутатаў |



Ансамбль «Славіца»

| | |
|---|---|
| Май 1917 г. | — выйшаў першы нумар газеты «Крестьянское слово» — органа Магілёўскага губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў |
| 18 лістапада 1917 г. | — Магілёўскі Савет прызнаў савецкую ўладу. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт узяў уладу ў горадзе і ўстанавіў кантроль над Стаўкай |
| Люты — кастрычнік 1918 г. | — частка тэрыторыі Магілёўскага павета акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі |



У дзіцячым садку в. Буйнічы

| | | |
|---|---|---|
| 16 чэрвеня 1921 г. | — | арганізаваны Магілёўскі павятовы эканамічны савет |
| 17 ліпеня 1924 г. | — | утвораны Магілёўская акруга і ў яе складзе Магілёўскі раён |
| 30 чэрвеня 1931 г. | — | выйшаў першы нумар раённай газеты «Камунар Магілёўшчыны» (са студзеня 1938 г. мела назву «Бальшавік Магілёўшчыны», з лютага 1938 г. — «Сацыялістычная праца», з мая 1962 г. — «За камуністычную працу», з лістапада 1991 г. — «Прыдняпроўская ніва») |



Дзіцячы аздараўленчы лагер «Каласок»

| | |
|---|---|
| 1934 г. | — у вёсцы Дашкаўка створаны конезавод |
| 15 студзеня 1938 г. | — утворана Магілёўская вобласць |
| Ліпень 1941 г. | — гераічная абарона Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая доўжылася 23 дні |
| Ліпень 1941 г. | — тэрыторыя Магілёўскага раёна акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі |



На Магілёўскай птушкафабрыцы ў в. Лыкава

| | |
|---|---|
| Сакавік 1943 г. | — зацверджаны састаў Магілёўскага падпольнага райкома КП(б)Б |
| Ліпень 1943 г. | — створана Магілёўская ваенна-аператыўная група пры Магілёўскім падпольным райкоме КП(б)Б |
| 28 чэрвеня 1944 г. | — Магілёўскі раён вызвалены войскамі Чырвонай Арміі |
| 24 кастрычніка 1948 г. | — на тэрыторыі калгаса «Камінтэрн» адкрылася раённая сельскагаспадарчая выстаўка |



Раённая камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі

| | |
|---|---|
| 1956 г. | — на базе расфарміраванага конезавода створана эксперыментальная база «Дашкаўка» |
| 1987 г. | — створана аграгандлёвая фірма «Днепр» |
| Май 1995 г. | — у раёне ўрачыста адсвяткавана 50-годдзе Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі |

## ДА ЧЫТАЧА

Гісторыка-дакументальная хроніка Памяці Магілёўскага раёна з'яўляецца амаль што адзінай кнігай пра спадчыну раёна. У гэтай кнізе яе стваральнікі ставілі мэтай расказаць аб гісторыі развіцця раёна, жыцці яго насельніцтва ў мінулым і сёння, аб барацьбе за савецкую ўладу ў час Кастрычніцкай рэвалюцыі і пра абарону Бацькаўшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

У кнізе змешчаны спісы воінаў-землякоў, партызан і падпольшчыкаў, мірных жыхароў, якія загінулі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, а таксама жыхароў раёна, неабгрунтавана рэпрэсіраваных у гады сталіншчыны. На жаль, стваральнікі кнігі не могуць гарантаваць паўнату звестак аб раёне, бо шмат архіўных дакументаў загінула і ў час так званай барацьбы з нацыяналізмам, і ў час Вялікай Айчыннай вайны.

У складанні кнігі прымалі актыўны ўдзел усе члены спецыяльна створанай для падрыхтоўкі гэтай кнігі раённай камісіі, супрацоўнікі абласнога архіва, краязнаўчых музеяў вобласці і раёна, абласной і раённай бібліятэк, раённай газеты «Прыдняпроўская ніва», навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага педагагічнага інстытута. Вялікую дапамогу аказалі жыхары раёна, стваральнікі мясцовых краязнаўчых музеяў, ужо адышоўшы ад нас член Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь В. Д. Гузаў. Раённая камісія па падрыхтоўцы кнігі горача дзякуе грамадскасці раёна за дапамогу ў састаўленні і ўдакладненні спісаў загінуўшых у гады барацьбы з фашысцкімі захопнікамі, а таксама жыхарам раёна і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны за ўспаміны.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ), Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці, Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Расійскай Федэрацыі (ЦДГА РФ), Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ДА РФ), Падольскага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМО РФ), Публічнай бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу, а таксама матэрыялы газеты «Соха и молот», раённай газеты «Прыдняпроўская ніва» і інш.

Раённая камісія вельмі ўдзячна абласному цэнтру па стварэнні хронік Памяці (кіраўнік М. П. Хобатаў) за дапамогу ў рабоце над кнігай.




**Магілёўскі раён** — самы цэнтр Магілёўскай вобласці. Сфармаваўся ён вакол горада абласнога падпарадкавання. Утвораны 17.07.1924 г.; у складзе вобласці з 15.01.1938 г., займае плошчу ў 1914 км$^2$; у складзе раёна 16 сельсаветаў: Брылёўскі, Вяйнянскі, Вендаражскі, Дашкаўскі, Заводскаслабодскі, Кадзінскі, Княжыцкі, Мастоцкі, Махаўскі, Нядашаўскі, Палыкавіцкі, Пашкаўскі, Семукацкі, Сідаравіцкі, Сухарэўскі, Цішоўскі. У склад сельсаветаў уваходзяць 294 сельскія населеныя пункты, больш за трэцюю частку якіх забруджаны радыёнуклідамі: 97 — ад 1 да 5 Кю/км$^2$; 10 — ад 5 да 15 Кю/км$^2$. На ўсходзе і паўночным усходзе раёна раскінуліся Аршанска-Магілёўская, на поўдні і паўднёвым захадзе — Цэнтральнабярэзінская раўніны, багатыя на торф, пясчана-жвіравы матэрыял, пясок, гліну і суглінкі, мінеральныя фарбы і мінеральныя воды. Клімат умерана-кантынентальны, вільготны. Ападкаў — 644 мм за год. Вегетатыўны перыяд 187 сутак. З 1972 г. у в. Лубнішча дзейнічае Магілёўская метэаралагічная станцыя. Галоўная рака на тэрыторыі раёна — Дняпро з прытокамі Хвоенка, Любуж (Чорны), Дунаёк, Вільчанка, Дубравенка, Фатаўка, Даска (Дзясна), Друць з Арлянкай; на ўсходзе — Раста з Рудзеяй. Пад балотамі — 2,3%, пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі — 63,5% (пераважна дзярнова-падзолістыя глебы), пад лесам — 26% тэрыторыі. Больш лясоў на поўдні раёна. Насельніцтва раёна складае 56,6 тыс. чалавек. Беларусаў — 92,2%; рускіх — 5,9; украінцаў — 1,4; іншых — 0,4% (на 1989 г.). Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 27,1 чал. на км$^2$. Спецыялізацыя раёна — мяса-малочная жывёлагадоўля (з развітой птушкагадоўляй), агародніцтва, бульбаводства, ільнаводства, зверагадоўля (пясец, норка). Дзейнічаюць: лясгас, камбінат бытавога абслугоўвання, завод буйнапанельнага домабудавання (в. Вільчыцы); завод прамбудматэрыялаў (в. Палыкавічы); філіял Гомельскага завода буддэталяў (в. Дашкаўка); бройлерная фабрыка (в. Мяжысеткі); Магілёўская і Прыдняпроўская (вёскі Лыкава, Раманавічы) птушкафабрыкі, эксперыментальная база «Дашкаўка», дзяржплемпрадпрыемства (в. Чаромушкі); зверагаспадарка (в. Вільчыцы); райаграпрамтэхніка, райсельгасхімія (в. Буйнічы); сельскагаспадарчая вопытная станцыя, абласная праектна-вынаходніцкая станцыя хімізацыі сельскай гаспадаркі (в. Дашкаўка). На тэрыторыі раёна 12 чыгуначных станцый. Найважнейшыя аўтадарогі: Магілёў — Шклоў; Магілёў — Быхаў; Магілёў — Бабруйск; Магілёў — Чавусы. Ажыццяўляюцца грузавыя перавозкі па Дняпры. Аэрапорт горада Магілёва ў в. Лубнішча. Працуе тэлеперадаючая станцыя (в. Палыкавічы-1).

Выдаецца раённая газета «Прыдняпроўская ніва».

*Г. У. Рыдзеўскі, І. М. Шаруха.*

# АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

# 1917

## ПАМЯЦЬ ВЯКОЎ

### Вытокі старажытнай гісторыі Магілёўскага раёна

Старажытная гісторыя Магілёўскага раёна налічвае звыш дзесяці тысячагоддзяў і пачынаецца з каменнага веку. Дайшоўшыя да нас нешматлікія помнікі таго часу дапамагаюць прачытаць яе першыя старонкі і ўстанавіць час з'яўлення тут першых насельнікаў.

Па меры адступлення апошняга ледніка за межы Беларусі невялікія групы адважных першапраходцаў, змагаючыся з суровай прыродай, упарта рухаліся па далінах рэк на поўнач, асвойваючы новыя тэрыторыі. На землях сучаснай Магілёўшчыны яны сталі рассяляцца 12—10 тысяч гадоў таму назад. Помнікам таго часу з'яўляецца стаянка Хвойна, размешчаная на левым беразе Дняпра, за 3 кіламетры на захад ад шашы Санкт-Пецярбург—Адэса ля в. Масток, 2 кіламетры вышэй вусця ракі Хвоенка (левы прыток Дняпра). Стаянка, адкрытая ў 1975 г. В. Ф. Капыціным і даследаваная ім на плошчы 500 м$^2$ у 1985—1989 гг., аказалася старажытным паляўнічым лагерам (паўночная частка яго знішчана кар'ерам).

Культурныя рэшткі прадстаўлены гарызонтам цёмна-бурага пяску магутнасцю да 0,15 м з зольнымі ўключэннямі. Знаходкі расшчэпленага і апрацаванага крэменю залягалі на глыбіні 0,9—1,6 м ад сучаснай дзюннай паверхні і былі перакрыты дзюннымі пясчанымі адкладамі. Відаць, паселішча размяшчалася тут напярэдадні ўтварэння дзюны — у перыяд фарміравання глебавага покрыва. Па існуючых уяўленнях, працэс дзюнаўтварэння працягваўся 200—300 гадоў і завяршыўся ў сярэдзіне 9-га тысячагоддзя да н. э. Значыць, паляўнічы лагер быў пакінуты 11 тысяч гадоў назад.

Раскопкі далі багаты археалагічны матэрыял: прадукты расшчаплення крэменю-пласціны і адшчэпы для вырабу прылад працы, а таксама нуклеусы, аб якія яны скалваліся. Аб тым, што насельніцтва займалася паляваннем, сведчаць знаходкі наканечнікаў стрэл, разцы, праколкі.

Кліматычныя змены, што адбыліся пасля адступлення ледніка, зрабілі істотны ўплыў на лад жыцця першабытных людзей і стварылі ўмовы для новых культурных дасягненняў, зробленых у эпоху мезаліту — сярэднекаменнага веку (10—7 тысячагоддзяў назад).

Мезалітычных помнікаў у раёне знойдзена нямнога: Магілёў, Дашкаўка, Навасёлкі, Салтанаўка. Але і гэтага дастаткова, каб мець уяўленне аб занятках і ўзроўні развіцця насельніцтва.

Найбольш вывучана стаянка Магілёўская. Яна размешчана на першай надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра, на ўсходняй ускраіне горада, за 1 км на ўсход ад чыгуначнага моста, ля в. Ніжні Палавінны Лог. Стаянку адкрыў у 1897 г. Е. Р. Раманаў, абсле-




Схема размяшчэння помнікаў археалогіі на тэрыторыі Магілёўскага раёна

даваў яе ў 1925 і 1927 гг. К. М. Палікарповіч. У 1985–1986 гг. у сувязі з небяспекай знішчэння помніка дзеючым кар'ерам экспедыцыя Магілёўскага педінстытута пад кіраўніцтвам В. Ф. Капыціна правяла тут выратавальныя работы. Было ўскрыта 180 м$^2$ культурнага слою, які залягаў на глыбіні 0,3–0,6 м у верхняй частцы разбуранага ворывам.

Калекцыя знойдзенага крэмневага начыння налічвае больш тысячы экземпляраў. Гэта шматлікія прадукты расшчаплення крэменю: пласціны, адшчэпы, нуклеусы; прылады працы, якія служылі для апрацоўкі скуры, косці, дрэва (скрабкі, разцы, праколкі, вырабы з выемкай, сякеры); паляўнічыя прылады (наканечнікі стрэлаў грэнскага тыпу, нажы, вастрыі). Унікальнай знаходкай з'яўляюцца пласцінкі з прытупленым краем – рэшткі складанай прылады.

Яшчэ адна стаянка мезаліту размешчана за 2 км на поўнач ад в. Дашкаўка (1,5 км на паўднёвы ўсход ад в. Навасёлкі, на другой надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра) і займае плошчу 120 × 40 м. У раскопе (плошча 12 м$^2$) знойдзены таксама прадукты расшчаплення крэменю: дробныя асколкі, адшчэпы, пласціны, нуклеусы і прылады працы (канцавыя скрабкі, рэтушныя разцы, абломак тронкавага наканечніка стралы, вастрыі, нажы).

Бясспрэчную цікавасць уяўляе стаянка ля в. Навасёлкі, размешчаная на другой надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра (0,5 км на поўнач ад вёскі і 0,1 км на ўсход ад дарогі Магілёў–Быхаў). Тут ускрыта 18 м$^2$ культурнага слою, які залягае пад ворыўным га-

рызонтам глебы. Знойдзены тры скапленні апрацаванага крэменю, які размешчаны ўздоўж броўкі тэрасы на адлегласці 50 м адно ад аднаго. Магчыма, гэта месца, дзе знаходзілася старажытнае жыллё.

Такім чынам, адшчэпамі і пласцінамі крэменю, прыладамі побыту, зробленымі рукамі «каменных спраў майстроў», адзначаны шляхі ў мінулае. Сыравінай для вырабу служыў мясцовы цёмна-шэры крэмень, выхады якога знойдзены ў мелавых адкладах недалёка ад стаянкі. Звычайна паблізу месцаў здабычы крэменю размяшчаліся майстэрні, прызначаныя для пачатковай апрацоўкі крэмневых канкрэцый. З іх сколвалі корку, нарасты, рабілі загатоўкі для нуклеусаў. Заканчвалі выраб на стаянцы. Майстэрні былі месцам часовага знаходжання.

У эпоху мезаліту істотна змяніліся прыродныя ўмовы, сфарміраваліся сучасныя кліматычныя зоны і ландшафты, ішоў актыўны пошук новых спосабаў здабычы ежы, вырабу прылад. Больш важную роль стала адыгрываць рыбная лоўля. З'явіліся разнастайныя рыбалоўныя прылады: сеці, кручкі, закалы. Лясы, якія густа пакрылі зямлю пасля ўходу ледніка, былі багатыя ягадамі, грыбамі, што давала магчымасць папаўняць запасы ежы шляхам збіральніцтва. Аднак галоўным заняткам мезалітычнага насельніцтва працягвала заставацца паляванне. А таму вялізную ролю адыграла шырокае распаўсюджванне лука і стрэл. Яны далі магчымасць расшырыць сферу паляўнічай дзейнасці і надаць ёй выбарны характар. Індывідуальнае паляванне патрабавала вялікай рухомасці, хуткага асваення новай прасторы. Надзейным памочнікам у паляванні стаў сабака — першая прыручаная жывёліна. Паляўнічы ўклад з'яўляўся асновай эканомікі і вызначаў развіццё грамадскага ладу і духоўнага жыцця.

У неаліце (7—5 тысячагоддзяў назад) ідэі, якія выношвала мезалітычнае насельніцтва, знайшлі рэальнае ўвасабленне. Гэта праявілася ў больш дасканалых прыёмах апрацоўкі каменю: пілаванне-шліфаванне, свідраванне. Шырока распаўсюджваліся крэмневыя прылады з двухбаковай апрацоўкай, якія ўражваюць майстэрствам вырабу і прыгажосцю формаў, а таксама прылады для сячэння: сякеры, цёслы, долаты. З іх дапамогай будавалася жыллё, гаспадарчыя памяшканні, выпрабляліся транспартныя сродкі (лыжы, лодкі, плыты).

Адным з важнейшых вынаходніцтваў неаліту з'яўляецца кераміка. Яе з'яўленне давала новыя магчымасці для прыгатавання і захоўвання ежы, садзейнічала пераходу да аселага жыцця. Старажытныя гліняныя ёмістасці са знешняга боку пакрываліся рознымі ўзорамі, пераважна ямачнымі ўцісканнямі, або адбіткамі дробназубчастага грэбеня, а прасцей — арнаментаваліся. Арнамент з'яўляецца яскравым прыкладам старажытнага выяўленчага мастацтва, ён мае таксама вялікую пазнавальную каштоўнасць. У форме сасудаў, прапорцыях асобных частак, тэхналогіі вырабу, у арнаментацыі праяўляюцца глыбокія і ўстойлівыя традыцыі асобных першабытных калектываў, якія дазваляюць зрабіць вывад аб культурнай і храналагічнай прыналежнасці помнікаў. Гліняны посуд і яго фрагменты — найбольш масавая катэгорыя знаходак пры раскопках неалітычных паселішчаў.

На тэрыторыі сучаснага Магілёўскага раёна вядома некалькі стаянак неалітычнага часу. Адна з іх размяшчаецца на ўсходняй ускраіне Магілёва, на першай надпоймавай тэрасе Дняпра, на поўдзень ад в. Ніжні Палавінны Лог, ва ўрочышчы Гарадчызна (Кастрамін). Стаянку адкрыў у 1897 г. Е. Р. Раманаў і памылкова датаваў яе палеалітычным часам. У 1925 і 1927 гг. абследаваў К. М. Палікарповіч.



Від на стаянку эпохі мезаліту каля в. Навасёлкі Дашкаўскага сельсавета

У культурным слоі, пад гарызонтам глебы, у агаленні берагавога абрыва Дняпра, даследчыкі знайшлі фрагменты ляпной керамікі, арнаментаванай кропкамі і елачкамі (ямачнымі ўціскаммі і адбіткамі дробназубчатага штампа), а таксама абкладзеныя каменем ачагі, косці жывёлін, крэмнёвыя прылады працы (скрабкі, нажы, праколкі і інш.). Помнік знішчаны кар'ерам...

Яшчэ адна стаянка неаліту размешчана на першай надпоймавай тэрасе левага берага Дняпра, за 0,8 км на захад ад пас. Любуж, за 0,3 км ніжэй вадазабору, па абодва бакі безыменнага ручая — левага прытока Дняпра. Стаянку адкрыў і абследаваў у 1989 г. В. Ф. Капыцін. У шурфах і ў агаленні берагавога абрыва сабраны прадукты расшчаплення крэменю: канцавыя скрабкі, вастрыі, фрагменты грубалепнай керамікі з ямачна-грэбневым арнаментам.

Комплекс неалітычных помнікаў, што сфарміраваўся ў Верхнім Падняпроўі, аказаўся вельмі своеасаблівым, што дало магчымасць даследчыкам выдзеліць у даным рэгіёне неалітычную культуру, якая атрымала назву верхнедняпроўскай. Аналіз матэрылаў гэтай культуры паказвае, што асноўнымі заняткамі насельніцтва былі паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва. Паселішчы размяшчаліся па берагах рэк і азёраў. Пры іх вывучэнні знаходзяць наканечнікі стрэлаў і дроцікаў з крэменю; прылады для апрацоўкі каменю, дрэва, косці і скур жывёлін; аднатыпна арнаментаваны гліняны посуд.

На рубяжы 3—2 тысячагоддзяў да н. э. землі сучаснага Магілёўскага раёна засялілі плямёны, якія раней жылі ў басейне сярэдняга цячэння Дняпра. Іх культуру археолагі назвалі сярэднедняпроўскай і лічаць роднаснай шырокаму колу культур шнуравой керамікі і баявых сякер, якія ахоплівалі ў старажытнасці вялікія прасторы ад Фінляндыі і Швецыі на поўначы да Карпат на поўдні, ад Прыуралля на ўсходзе да Рэйна на захадзе. Насельніцтва гэтых культур — старажытныя індаеўрапейцы, продкі славян, балтаў, германцаў і іншых народаў.

Адным з помнікаў сярэднедняпроўскай культуры з'яўляецца грунтовы могільнік на ўсходняй ускраіне в. Вейна, адкрыты ў час земляных ра-

бот у 1930 г. і даследаваны В. Р. Тарасенкам. Пахаванні зроблены па абраду трупапалажэння на глыбіні 2,5 м. Побач з адным з пахаваных знойдзена каменная свідраваная сякера, ля другога — канцавы скрабок з рэтушыраванымі канцамі. У астатніх пахавальнага інвентару не было.

Сярэднедняпроўцы заставаліся ў нашым краі амаль тысячагоддзе. Адначасова з імі жылі і паступова мяняліся паляўнічыя плямёны, якія засялялі гэту тэрыторыю раней. У такім суіснаванні, відаць, была ўзаемная выгада. Больш таго, па дадзеных антраполагаў, пазней адбылося і зліццё насельніцтва гэтых культур, іх узаемная асіміляцыя.

Сярэднедняпроўская культура (2-ое тысячагоддзе да н. э.) — гэта культура бронзавага веку; час, калі людзі навучыліся сплаўляць у бронзу здабытыя з руды медзь і волава і вырабляць з яе ўпрыгожанні і прылады працы. Бронзавы век для тэрыторый Магілёўскага раёна прынёс карэнныя пераўтварэнні самой асновы жыцця мясцовых плямёнаў: на змену першабытнаму гаспадаранню прыйшло вытворчае — жывёлагадоўля і земляробства. Важную ролю ў гэты час працягваў адыгрываць камень. У раёне вёсак Адраджэнне, Дашкаўка, Запруддзе, Малыя Бялевічы, Махава, Палыкавічы вядома некалькі знаходак каменных сякер, старанна адшліфаваных, з адтулінай, прасвідраванай дакладна па доўгай восі, з дапамогай якой іх насаджвалі на драўляныя дзяржальны. Гэтыя «баявыя» сякеры вельмі падобныя на тамагаўкі паўночнаамерыканскіх індзейцаў і, відаць, выконвалі тыя ж функцыі.

З'яўленне жывёлагадоўлі і земляробства, пашырэнне абмену паміж плямёнамі спрыяла развіццю патрыярхальных адносін, хуткаму распаўсюджванню агульных прыкмет матэрыяльнай і духоўнай культуры. Апошняе знайшло сваё адлюстраванне ў спецыфіцы вырабу і арнаментавання гліняцага посуду з характэрнымі адбіткамі шнура, у наборы прылад, у пахавальным абрадзе (пахаванне мёртвых у скурчанай позе ў курганах або грунтовых магільніках), у асаблівасцях абсталявання жылля і інш.



Каменныя сякеры, знойдзеныя пры археалагічных раскопках

Пашыраліся абменныя і культурныя сувязі. Да гэтага прымушалі адсутнасць уласнай сыравіннай базы для металургіі бронзы, залежнасць ад прывазной сыравіны.

На мяжы 8—7 стагоддзяў да н. э. насельніцтва тэрыторыі сучаснай Магілёўшчыны ўступіла ў жалезны век. У адрозненне ад медных і алавяных, тут былі шырока распаўсюджаны ў прыродзе жалезныя руды — бурыя жалязнякі (балотныя, лугавыя, азёрныя). Агульнадаступнасць іх і высокія якасці новага металу садзейнічалі хут-



Гарадзішча каля в. Калясішча Мастоцкага сельсавета

каму выцясненню каменных прылад працы. Жалезныя прылады далі магчымасць значна павялічыць апрацоўваемыя плошчы, павысіць прадукцыйнасць працы ў земляробстве, удасканаліць дрэваапрацоўку, будаўнічую справу, рамёствы. З'яўленне рэгулярнага дабавачнага прадукту, накапленне лішкаў парадзілі магчымасць адносна хуткага абагачэння за кошт прысваення вынікаў чужой працы ў працэсе войнаў. Неабходнасць арганізацыі абароны ад частых і нечаканых нападкаў прымусіла насельніцтва ўмацоўваць свае пасяленні. У адрозненне ад стаянак каменнага і бронзавага вякоў, якія не мелі ўмацаванняў, у раннім жалезным веку паўсюдна з'явіліся гарадзішчы. Яны прадстаўлялі сабой невялікія крэпасці, размешчаныя на высокіх месцах па берагах рэк або глыбокіх равоў. З боку поля гарадзішча ахоўвалася земляными валамі і равамі. Па краі пляцоўкі гарадзішча ўзводзілася драўляная сцяна або частакол. Даволі часта гарадзішчы мелі некалькі радоў умацаванняў з двума–трыма валамі і равамі паміж імі, што стварала дастаткова сур'ёзную перашкоду для тых, хто сілай спрабаваў пранікнуць у паселішчы.

У Магілёўскім раёне захаваліся рэшткі дзевятнаццаці гарадзішчаў: ля вёсак Бароўка, Буйнічы, Васілевічы, Вендараж, Гарадок, Гарадзішча (2), Дашкаўка (3), Калясішча (2), Княжыцы, Палыкавічы-1 (2), Пусты Асавец, Старая Мілееўка, Сухары, Фойна (Агееўшчына). У раннім жалезным веку тут, у залежнасці ад часу, жылі прадстаўнікі розных археалагічных культур. Так, першыя гарадзішчы былі ўзведзены насельніцтвам мілаградскай культуры (7 – 3 стагоддзі да н. э.), названай па вёсцы Мілаград Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Мілаградцы былі знаёмыя з жалезам, з якога выраблялі прылады працы і зброю, карысталіся кругладоннымі гладкасценнымі пасудзінамі, арнаментаванымі ў верхняй частцы пазногцевымі або пальцавымі ўціскннямі і насечкамі. Жыллё ўяўляла сабой невялікія наземныя або злёгку паглыбленыя ў зямлю (0,2 – 0,5 м) прамавугольныя пабудовы слупяной канструкцыі плошчай 10 – 16 м$^2$, разлічаныя на адну сям'ю. Своеасаблівасць культуры надаюць знойдзеныя фігуркі (пераважна коней), звязаныя з сонечным бажаством, і гліняныя грузікі, часам выраблены ў форме пасудзін і арнаментаваныя салярнымі знакамі.

Асноўнымі заняткамі насельніцтва мілаградскай культуры былі жывёлагадоўля і земляробства, аб чым сведчаць знаходкі на паселішчах касцей буйной рагатай і дробнай жывёлы (коней, свіней), зерня пшаніцы і проса, сярпоў, каменных таўкачоў, зерняцёрак. Значнае развіццё атрымалі бронзаліцейнае і кавальскае рамёствы, ткацтва, апрацоўка дрэва і скур. У якасці падсобных промыслаў працягвалі заставацца паляванне і рыбалоўства.

Адносна этнічнай прыналежнасці мілаградскіх плямёнаў існуе думка (О. Н. Мельнікаўская) аб тым, што яны былі неўрамі, аб якіх пісаў Герадот, а іх краіна называлася Неўрыдай.

Пазней умацаваныя пасяленні мілаградцаў выкарыстоўвалі плямёны зарубінецкай культуры (3 стагоддзе да н. э. — 2 стагоддзе н. э.), названай па магільніку ў сяле Зарубінцы Кіеўскай вобласці. У знаходках гэтага перыяду шырока прадстаўлены сякеры-кельты, сярпы, лістападобныя наканечнікі коп'яў і дроцікаў скіфскага тыпу, грубалепная і глянцаваная пласкадонная ў адрозненне ад мілаградскай кераміка. Вядомы грунтовыя могільнікі зарубінецкага насельніцтва, якія не маюць знешніх надтрунных збудванняў і ўтрымліваюць пахаванні па тыпу трупаспалення ў авальных або круглых ямах на глыбіні 0,2—1 м ад сучаснай паверхні. Пахавальны інвентар небагаты і аднастайны: гаршкі, міскі, упрыгожванні, часам зброя.

Для зарубінецкай культуры характэрна невялікае (плошча 10—24 м$^2$) жыллё, квадратнае або прамавугольнае ў плане, асновай якога былі слупы з вертыкальнымі пазамі. У пазы ўпускалася зацясанае на канцах гарызантальна пакладзенае бярвенне. Ачаг размяшчаўся ў цэнтры жылля або ля сцяны і меў каменную (радзей гліняную) агароджу.

Сярод даследчыкаў няма адзінай думкі адносна этнічнай прыналежнасці зарубінецкіх плямёнаў. Адны лічаць іх праславянамі, іншыя адносяць да заходніх балтаў.

Землі Магілёўшчыны ўваходзілі таксама ў арэал распаўсюджвання культуры штрыхаванай керамікі (7 стагоддзе да н. э.— 5 стагоддзе н. э.), якая атрымала сваю назву па своеасабліваму арнаменту посуду, паверхня якога са знешняга боку, а часам і знутры, пакрывалася штрыхамі, нанесенымі пучкамі саломы ці травы па неабпаленай гліне. Жыллём служылі вялікія наземныя драўляныя дамы, раздзеленыя на некалькі памяшканняў. (Магчыма, старажытныя збудаванні зрубнага тыпу былі зроблены ў Беларусі менавіта ў той час.) Кераміка прадстаўлена сасудамі слоікавай формы, рабрыстымі, слабапрафіляванымі. Могільнікі насельніцтва гэтай культуры пакуль не знойдзены.

Большасць даследчыкаў лічыць, што помнікі культуры штрыхаванай керамікі пакінуты балцкім насельніцтвам, пазней асіміліраваным у выніку славянскай каланізацыі.

У 1937 г. В. Р. Тарасенка зрабіў раскопкі гарадзішча на ўрочышчы Барсукова Гара ля в. Палыкавічы-1. Помнік размешчаны на правым беразе Дняпра за 0,2 км на поўдзень ад вёскі на прадаўгаватым мысе паміж двума равамі. Датуецца 1-ым тысячагоддзем да н. э.— 3-яй чвэрцю 1-га тысячагоддзя н. э. Было ўзведзена на месцы папярэдняга пасялення. Гарадзішча мела складаную сістэму ўмацаванняў у выглядзе равоў і валоў, а таксама дзве пляцоўкі агульнай даўжынёй 108 м, раздзеленыя валам вышынёй 1,5 м. Шырыня пляцовак у паўднёвай частцы 31 м. У паўночнай — 51 м. Вышыня над дно́шчамі равоў 12—14 м. З паўднёвага наземнага боку пляцоўка ўмацавана валам вышынёй 5,5 м пры шырыні асновы 14 м. У паўночнай мы-



Гарадзішча каля в. Буйнічы Цішоўскага сельсавета

савай частцы таксама праглядваецца аплыўшы вал.

У культурным слоі магутнасцю 1,3—2,2 м знойдзены рэшткі двух наземных прадаўгаватых жытлаў слупавой канструкцыі, раздзеленых на асобныя памяшканні. Кожнае з іх мела свой абкладзены каменнем ачаг дыяметрам 1—1,5 м. Знойдзены фрагменты ляпных сасудаў, жалезныя нажы, рыбалоўны кручок, трохлопасцевы наканечнік стралы познесармацкага тыпу, прасніца, іголкі, шылы, абломкі сякеры і зерняцёркі, тачыльныя брускі, грузікі, косці кароў і коней.

Другое гарадзішча ранняга жалезнага веку культуры штрыхаванай керамікі таксама размешчана на правым беразе Дняпра за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад в. Палыкавічы-1, 0,5 км на паўночны ўсход ад в. Нікалаеўка-2 на мысе паміж двума равамі, ва ўрочышчы Гарадок. Адкрыў і даследаваў яго ў 1936 г. В. Р. Тарасенка. Пляцоўка авальная ў плане, памерам 23 × 32 м, узвышалася над поймай ракі на 40 м. З наземнага паўднёвага боку і паўднёвага захаду ўмацавана валам (вышыня 2,5—3 м, шырыня 15—18 м) і ровам. Другі аплыўшы вал знаходзіўся на мысавай частцы гарадзішча. У шурфе 1 × 1 м знойдзены культурны слой магутнасцю 0,2 м. Ён утрымліваў фрагменты ляпной керамікі і абпаленыя камяні. Гарадзішча часткова разбурана траншэямі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Сярод мясцовага насельніцтва бытуе легенда аб царкве, якая нібыта тут «правалілася».

Аналагічнае гарадзішча знаходзіцца на мысе другой надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра за 0,8 км на поўдзень ад в. Буйнічы, ва ўрочышчы Благадаць. Пляцоўка авальнай формы, выцягнута з поўдня на поўнач, мае паўднёвую экспазіцыю памерам 46 × 26 м і вышыню над поймай ракі 12—13 м. З напольнага паўночнага боку ахоўвалася валам (вышыня 4,5 м, шырыня да 25 м) і ровам (глыбіня 1 м, шырыня 3 м). У культурным слоі магутнасцю 0,35—1,4 м знойдзены фрагменты ляпной керамікі розных культур (мілаградскай, зарубінецкай і штрыхаванай), а таксама жалезны нож і вудзільна, косці жывёлін, абпаленае каменне і вуголле.

На поўнач ад в. Дашкаўка на правым беразе Дняпра на працягу 0,5 км знаходзяцца тры гарадзішчы, два з якіх былі гарадзішчамі-сховішчамі. Тут насельніцтва пастаянна не пражывала, а толькі хавалася ў выпадку небяспекі. Відаць, такая з'ява была характэрнай і для больш позняга часу — 9—13 стагоддзяў, бо на гарадзішчах,

якія падвяргаліся шурфоўцы ці раскопкам, знаходзяць рэчы і ганчарную кераміку таго перыяду.

У раннім жалезным веку побач з гарадзішчамі існавалі і неўмацаваныя паселенні — селішчы. Адно з іх знаходзілася на дзюнных узвышшах першай надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра, на ўсходняй ускраіне Магілёва на поўдзень ад в. Палавінны Лог, ва ўрочышчы Гарадшчызна. Паселенне займала плошчу 60 × 210 м. Знаходкі прадстаўлены фрагментамі грубалепнай керамікі цёмна-шэрага колеру з шарахаватай паверхняй без арнаменту, з дамешкай кварцавага пяску ў рошчыне.

Такія селішчы вядомы таксама ля вёсак Бароўка, Дашкаўка, Мікалаеўка-2, Стайкі. Яны звычайна размяшчаліся па берагах рэк і займалі параўнаўча невысокія роўныя і зручныя для жыцця і гаспадарчай дзейнасці месцы. Культурны слой селішчаў практычна не захаваўся. Да таго ж яны не падвяргаліся раскопкам і вядомыя ў асноўным па знойдзенаму матэрыялу: фрагментах керамікі, прасніц, упрыгожванняў, асобных прылад працы.

## Рассяленне славянскіх плямёнаў на Магілёўшчыне

У другой палове 1-га тысячагоддзя н. э. у Верхнім Падняпроўі пачалося рассяленне славян. Адначасова фарміруюцца племянныя саюзы з уласцівымі ім этнічнымі асаблівасцямі і адасобленасцю тэрыторый. Гісторыя славянскіх плямёнаў поўная загадак. Звесткі 9—10 стагоддзяў, якія ёсць у летапісах, нешматлікія, няпоўныя і не заўсёды праўдзівыя. Археалагічныя знаходкі таксама мала дапамагаюць вывучэнню гісторыі ўсходніх славян у сувязі з тым, што ўзнікаюць праблемы з дакладнасцю вызначэння граніц паміж плямёнамі. Так, тэрыторыя сучаснага Магілёўскага раёна была заселена прадстаўнікамі трох саюзаў плямёнаў — крывічамі, радзімічамі і дрыгавічамі. Першапачаткова граніцы не былі ўстойлівымі з прычыны таго, што славяне працягвалі асвойваць дадзены рэгіён. Не былі яны даўгавечнымі і пазней, у перыяд феадальнай раздробленасці, калі пры ўтварэнні асобных княстваў узнікалі новыя палітычныя граніцы, якія часта не супадалі з ранейшымі племяннымі.

Першыя звесткі аб радзімічах, крывічах і дрыгавічах утрымліваюцца ў «Аповесці мінулых гадоў». Расказваючы аб рассяленні ўсходнеславянскіх плямёнаў, манах Кіева-Пячэрскага манастыра Нестар адзначае, што «...друзиш седоша межю Припетью и Двиною и нарекашася дреговичи». Тут жа названы і крывічы, «иже седять на верх Волги и на верх Двины и на верх Днепра, их же град есть Смоленск». У летапісе асоба выдзелены радзімічы і вяцічы. Указана на іх паходжанне «от ляхов». І далей: «Бяста бо два брата в лесях, — Радим, а другой Вятко, — и пришедьша седоста Радим на Оьжю, и прозвашася радимичи...»

Цікавыя, але яўна тэндэнцыйныя звесткі летапісца аб норавах і звычаях гэтых плямёнаў: «И радимичи, и вятичи, и север один обычай имаху: живяху в лесе, яко же и всякий зверь, ядуще все нечисто, и срамословье в них пред стьци и пред снохами, и браци не бываху в них, но игрища межю селы, схожахуся на игришча, на плясание и на вся бесовская песни, и тут умыкаху жены себе, с нею же кто сьвещаетеся; имяху же по две и по три жены, и аще кто умярще, творяху тризну над ним... си же творяху обычая кривичи...»



Курган каля в. Мяжысеткі Дашкаўскага сельсавета

Адным з найбольш дыскусійных пытанняў з'яўляецца час рассялення славянскіх плямёнаў у Верхнім Падняпроўі. Агульнавядома, што славяне прыходзілі не на пустое месца. Па дадзеных археалогіі, мовазнаўства і летапісу, да прыходу славян тут жылі балты – продкі сучасных латышоў і літоўцаў, а славянская каланізацыя насіла быццам «мірны характар», але на многіх гарадзішчах банцараўскай культуры часоў рассялення славян археолагамі фіксуюцца сляды пажараў.

Напрыканцы 6 стагоддзя адбывалася актыўнае пранікненне славян у вобласці, дзе знаходзіліся балты, якія звычайна не пакідалі месц свайго пражывання. Першапачаткова балты і славяне жылі побач, потым пачалі змешвацца паміж сабой, і адбывалася славянізацыя дняпроўскага балтамоўнага насельніцтва. Уплыў балтаў прасочваецца на знешнім выглядзе шматлікіх груп крывічоў-палачан, дрыгавічоў і радзімічаў.

На тэрыторыі сённяшняга Магілёўскага раёна рассяляліся ў асноўным крывічы і радзімічы. Як сказана ў летапісе, назва радзімічы паходзіць ад імя Радзім. На чале з чалавекам, які меў такое імя, радзімічы прыйшлі з прапольскіх (ляшскіх) зямель. Курганы радзімічаў вывучаліся каля Бялыніцкага, Касцюковіцкага і інш. раёнаў.

У вярхоўях Дняпра жылі крывічы. Назву гэтага вялікага аб'яднання плямён даследчыкі выводзяць па-рознаму: ад прозвішча старэйшага роду – Крыў; ад слова «крэўныя» (блізкія па крыві); ад язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва-Крывейтэ; ад перасечанай узгоркаватай мясцовасці (крывізна).

Відаць, асваенне Верхняга Падняпроўя славянамі праходзіла ў некалькі этапаў і залежала як ад унутраных (павелічэнне колькасці насельніцтва, гаспадарчая неабходнасць асваення новых тэрыторый), так і знешніх прычын. Міграцыйныя патокі, у тым ліку і вялікае перасяленне народаў, не маглі абысці старажытнаславянскія плямёны, вымушаючы іх пакідаць абжытыя тэрыторыі і шукаць больш спакойныя месцы. Рух гоцкіх плямёнаў з нізоўяў Віслы ў Паўночна-Заходняе Прычарнамор'е ў канцы 2 – пачатку 3 стагоддзя прымусіў частку венедаў рухацца ў вярхоўі Волгі, Дзвіны і Дняпра. Гэ-



Гарадзішча каля в. Княжыцы

тыя апошнія і вядомыя пад назвай крывічоў.

Нашэсце гунаў у канцы 4—пачатку 5 стагоддзя і авараў на мяжы 6—7 стагоддзяў зноў прымусілі славян шукаць выратаванне ў лясах і балотах Верхняга Падняпроўя. З гэтымі падзеямі, відаць, звязана і рассяленне дрыгавічоў. Нарэшце, апошнім перасяленнем у 8—9 стагоддзях і было перасяленне плямёнаў радзімічаў і вяцічаў, якія спачатку жылі ў Верхнім Падняпроўі і пад націскам уграў (венграў) аселі ў басейне Сожа і яго прытокаў. Аб іх роднасных сувязях сведчаць вельмі блізкія па форме сямілопасныя скроневыя кольцы вяцічаў і сяміпромневыя скроневыя кольцы радзімічаў, якія былі характэрнымі для жаночых упрыгожванняў.

Этнавызначальнай прыкметай крывічоў былі бранзалетападобныя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі і пазалочаныя шкляныя каралі, знаходкі якіх даюць магчымасць акрэсліць крывіцкую тэрыторыю ў 11—13 стагоддзях. Мяжа паміж крывічамі і дрыгавічамі, на думку В. В. Сядова, праходзіла прыкладна па лініі Заслаўе—Барысаў—Шклоў і спускалася па Дняпры да Рагачова. Мяжа паміж радзімічамі і дрыгавічамі праводзіцца даследчыкамі па Дняпры, хоць асобныя помнікі радзімічаў сустракаюцца і на правабярэжжы ракі.

Найбольш старажытнымі пахавальнымі помнікамі крывічоў былі доўгія курганы з абрадам спальвання трупаў (6—9 стагоддзі). Курганныя насыпы былі калектыўнымі ўсыпальніцамі, якія ядналі па некалькі індывідуальных пахаванняў. Крэмацыя нябожчыкаў рабілася па-за курганам. Астанкі, сабраныя з пахавальнага кастра, змяшчаліся ў курганныя насыпы ў выглядзе кучкі кальцыніраваных касцей. Пахавальны інвентар у асноўным адсутнічае. З 10 стагод-

дзя ў крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў пачаў распаўсюджвацца абрад трупапалажэння ў курганах паўсферычнай формы, круглаватых у плане, вышынёй 0,5–3 м. Асновы курганоў былі акружаны ровікамі-канаўкамі, у якіх гарэлі пахавальныя кастры.

У Магілёўскім раёне вядомы 37 курганных могільнікаў. Знаходзяцца яны ў розных месцах, але лепш за ўсё захаваліся ў лясах. Асобныя з іх часткова або поўнасцю знішчаны, як гэта было ў в. Васілевічы, дзе кар'ерам знесена 49 насыпаў. Поўнасцю разараны курганныя могільнікі ў вёсках Княжыцы (60 курганоў), Малое Запаточча (6 курганоў), Салтанаўка (15), Бракава і інш. Часам курганы стаяць паасобку (вёскі Бароўка, Бракава, Гарадзішча, Мядзвёдаўка, Сідаравічы) або размешчаны невялікімі групамі – ад трох да дзесяці насыпаў (вёскі Боўшава, Брылі, Гуслянка, Капейна, Стайкі, Фойна). Ля некаторых населеных пунктаў ёсць па дзве-тры курганныя групы (вёскі Малое Запаточча, Мяжысеткі, Пална, Пусты Асавец, Салтанаўка, Старая Мілееўка). Вядомы курганныя могільнікі, якія складаюцца з некалькіх дзесяткаў курганоў: ля вёсак Вялікія Бялевічы (32 курганы), Усход (93), Гуслішча (28), Досава Сяліба (84), Дабрасневічы (90), Нядашава (42), Сінюга (73), Шылаў Вугал (155), Ямніцы (27 курганоў).

У 1964 г. Т. Д. Елісеева правяла раскопкі курганных могільнікаў крывічоў 10–11 стагоддзяў ля вёсак Княжыцы і Ямніца. Курганны могільнік ля в. Княжыцы, які цяпер поўнасцю знішчаны, знаходзіўся на правым беразе р. Лахва, за 0,2 км на поўдзень ад вёскі. У кургане была знойдзена бронзавая падкова са спіральна загнутымі канцамі, трохвугольная ў сячэнні з язычком для зашчэпкі.

Цікавыя матэрыялы атрыманы пры раскопках кургана ля в. Ямніца. Было выяўлена два пахаванні: жаночае – асноўнае і дзіцячае – упускное ў насыпе кургана. Пахаваныя ляжалі на спіне, галавой на захад, што характэрна для славянскіх пахаванняў. Ля ног жанчыны, з паўночнага боку, знаходзіўся гліняны сасуд, выраблены на ганчарным крузе, са шматрадным лінейным арнаментам. На дне сасуда – кляймо ў выглядзе круга з упісанай у яго пяціканцовай зоркай. Ля ног дзіцяці стаяў паўляпны гаршчок слоікавай формы, арнаментаваны глыбокімі ўцісканнямі па краі венчыка. У жаночым пахаванні знойдзены таксама тры шкляныя пазалочаныя каралі, дзве цыліндрычнай і адна – бочкападобнай формы.

Ад мясцовага насельніцтва даволі часта можна чуць, што курганы – гэта «шведскія» або «французскія» магілы, што засталіся ад часоў нашэсця войска Карла XII або Напалеона. Але гэта не так. Аналіз курганных пахаванняў 9–13 стагоддзяў і наяўнасць пахавальнага інвентару сведчыць аб тым, што могільнікі з'яўляюцца месцам пахавання нашых продкаў – крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў.

## Пераход ад першабытнаабшчынных адносін да феадалізму

У 6–9 стагоддзях ва ўсходніх славян ажыццяўляўся пераход ад першабытнаабшчынных адносін да феадалізму. Патрыярхальная родавая абшчына паступова ўступала месца суседскай сельскай абшчыне, у аснове якой былі не кравародныя, а эканамічныя і тэрытарыяльныя сувязі.

Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва 9–13 стагоддзяў была дастаткова разнастайнай. Але аснову эканомікі складала ворнае земляробства, на што

ўказваюць знаходкі пры раскопках розных зярнят і сашнікоў. Паколькі ў старажытнасці землі Беларусі былі заняты векавымі лясамі, побач з ворным працягвала існаваць падсечнае земляробства. Яно захавалася аж да 16 стагоддзя.

Асноўным у земляробстве было вырошчванне збожжавых. Пры раскопках знойдзены зярняты азімага жыта, «ядрыцы» (жыта яравое), пшаніцы, ячменю, аўса, проса, грэчкі, гароху. Сеялі таксама лён, каноплі, рэпу. На агародах вырошчвалі капусту, цыбулю, часнок, рэдзьку, буракі.

Важнай галіной для славян была жывёлагадоўля. Мяркуючы па знаходках касцей жывёлін, больш за ўсё разводзілі буйной рагатай жывёлы, коней, свіней, некалькі менш — дробнай рагатай жывёлы. Хатняе птушкаводства звязана з развядзеннем курэй, гусей, качак. Вядомы хатнія лебедзі, жоравы, галубы, лоўчыя сокалы і ястрабы.

Значную ролю ў жыцці насельніцтва Магілёўскага раёна працягвалі адыгрываць паляванне, рыбная лоўля, збіральніцтва. Палявалі з дапамогай лука і стрэл, рагацін, лоўчых ямаў, розных пастак, сецяў і інш. Пры раскопках паселішчаў знаходзяць многа рыбалоўных прылад: кручкі, восці, блешні, грузікі ад сецяў, што сведчыць аб розных спосабах лоўлі — сецямі, кручкамі, перамётамі. На мелкіх месцах прымяняліся восці і гарпуны. Мяркуючы па знаходках рыбных касцей і лускі, вылоўліваліся асятровыя, ласось, шчупакі, судакі, ляшчы, ліні, самы, налімы, акуні, плоткі, карасі. Практыкаваўся і адлоў ракаў.

Адпаведную ролю адыгрывала збіральніцтва і лясныя промыслы. Лес даваў грыбы, арэхі, ягады, смалу, дзёгаць, кару, якая ішла на дубленне скур, берасту і лыка, з якога плялі лапці, рабілі корабы і г. д. Дрэва было будаўнічым матэрыялам для жылля, падсобных і гаспадарчых пабудоў, вырабу дамашніх прылад (бочкі, вёдры, каўшы, бароны, вілы, граблі, сохі, сані, калёсы), ішло на дровы, лучыну і інш. Немалую ролю ў гаспадарцы адыгрывала і бортніцтва. Мёд і воск спаганяліся ў выглядзе даніны з сялян-абшчыннікаў.

Пры натуральнай гаспадарцы вялікае месца ў жыцці насельніцтва займалі розныя рамёствы, уласцівыя кожнай сям'і. Жанчыны пралі ніткі, займаліся ткацтвам. Тканіны выраблялся з лёну, канаплі і воўны. У хатніх умовах рабілася апрацоўка скур.

Рост вытворчых сіл і ўдасканаленне прылад працы вялі да спецыялізацыі рамёстваў. Асобныя абшчыннікі, не парываючы з сельскай гаспадаркай, выраблялі прадукцыю на заказ і на рынак. Пры раскопках, галоўным чынам гарадоў, знаходзяць прылады працы, інструменты і вырабы з жалеза, ювелірнага, кастарэзнага і іншых рамёстваў. Раней за іншыя пачалі адасабляцца кавальскае і ганчарнае рамёствы. З узнікненнем гарадоў рамеснікі пераносяць сваю дзейнасць з сельскіх паселішчаў у гарадскія.

## У складзе Полацкага, Смаленскага княстваў. Друцкае княства

Тэрыторыя сучаснага Магілёўскага раёна ўваходзіла ў склад Полацкага, Смаленскага, а пазней — Друцкага княстваў.

Полацкае — адно з самых старажытных усходнеславянскіх княстваў, якое існавала ў 10—13 стагоддзях. Размяшчалася ў басейнах Заходняй Дзвіны, Бярэзіны, Нёмана, на тэрыторыях сучасных Віцебскай, частках

Мінскай і Магілёўскай абласцей. Полацкае княства мела шырокія гандлёвыя сувязі, у ім шырока былі развіты пісьменнасць, архітэктура, жывапіс.

Скупыя дадзеныя летапісаў толькі ў агульных рысах расказваюць аб узнікненні Полацкага княства. Вядома, што Рурык у 862 г. пры раздачы зямель сваім дружыннікам аднаму з іх аддаў Полацк. У 865 г. кіеўскія князі Аскольд і Дзір, «воеваша... полачан и многа зла натворашша», устанавілі ўладу над Полацкам у выглядзе выплаты даніны. Пасля забойства Алегам Аскольда і Дзіра і захопу ў 882 г. Кіева новы князь, як гаворыцца ў летапісе, «нача городы ставити, и у стави дани... кривичемъ и мери...»

На думку даследчыкаў, Полацкае княства было першай дзяржавай на тэрыторыі Беларусі. Адным з Полацкіх князёў быў Рагвалод, які «власть свою в Полотьске» трымаў у другой палове 10 стагоддзя.

У 980 г. у Полацку разыгралася крывавая трагедыя. З летапісаў вядома, што наўгародскі князь Уладзімір Святаславіч сватаўся да дачкі Рагвалода Рагнеды і атрымаў адмоўны адказ. Пакрыўджаны Уладзімір захапіў горад і ўчыніў жорсткую расправу над княжацкай сям'ёй, а Рагнеду супраць яе волі ўзяў у жонкі. Уладзімір забіў свайго брата Яраполка і стаў кіеўскім князем. Няўдалая спроба замаху на жыццё Уладзіміра прывяла Рагнеду з малалетнім сынам Ізяславам да ссылкі. Менавіта Ізяслаў аднавіў полацкую княжацкую дынастыю па лініі маці, і яго нашчадкі называлі сябе Рагвалодавічамі. Пасля смерці Ізяслава ў 1001 г. Полацкае княства было падзелена паміж яго сынамі на шэсць удзелаў: Мінскае княства, Віцебскае, Друцкае і г. д.

Заходнія землі сучаснага Магілёўскага раёна, размешчаныя па правым беразе Дняпра, увайшлі ў Друцкі ўдзел-воласць, граніцы якой цягнуліся, відаць, да вусця Друці. Па гэтай рацэ ў той час праходзіла адно з разгалінаванняў шляху «з варагаў у грэкі».

З першай паловы 12 стагоддзя Друцкае княства вядома як самастойнае. На чале яго стаялі пераважна нашчадкі полацкага князя. Напрыканцы 12 стагоддзя яно адышло да Смаленска, а ў сярэдзіне 13 стагоддзя — да Вялікага княства Літоўскага.

Усходняя частка раёна ўваходзіла, як ужо адзначалася вышэй, у Смаленскае княства. Цікавасць да Смаленскай зямлі з боку кіеўскіх князёў спачатку праяўлялася пераважна ў зборы падаці. У другой палове 11 стагоддзя на смаленскі пасад сталі назначацца князі з Кіева. У эканамічным развіцці Смаленская зямля некалькі адставала ад Полацкай. У эпоху феадальнай раздробленасці даследчыкі адзначаюць наяўнасць паміж гэтымі княствамі цесных эканамічных і культурных сувязей, дзякуючы якім ствараліся ўмовы для фарміравання беларускай народнасці.

*В. Капыцін*

## Пра што могуць расказаць манеты

Магілёўскія землі, размешчаныя па берагах Дняпра на легендарным шляху «з варагаў у грэкі», падтрымлівалі шырокія гандлёвыя сувязі. Так, у 1822 г. у наваколлі Магілёва быў знойдзены клад з 1300 сярэбраных дырхемаў Арабскага халіфата, схаваны ў першай палове 9 стагоддзя. Пры раскопках курганоў сустракаюцца шкляныя каралі кіеўскага паходжання, бурштын з Прыбалтыкі і інш.

Манетныя скарбы з'яўляюцца важнымі гістарычнымі помнікамі. Яны даюць магчымасць вызначыць склад гра-

шовага абарачэння ў той ці іншы перыяд часу, уяўленне аб грашовых сістэмах дзяржаў, аб узроўні і асноўных накірунках эканамічных, палітычных і культурных сувязей паміж дзяржавамі ў мінулым.

На Беларусі выяўлена больш за тысячу манетных скарбаў, у тым ліку больш за 200 з іх у Магілёўскай вобласці.

Манеты ў старажытныя часы выраблялiся з металу, фарфору, шкла і г. д. Упершыню манеты ўзніклі ў Кітаі ў 12 стагоддзі да н. э., ва Усходнім Прычарнамор'і — на мяжы 7—6 стагоддзяў да н. э.

Першыя манеты на Русі пачалі выпускаць у канцы 10—пачатку 11 стагоддзя; у Вялікім княстве Літоўскім — у канцы 14—пачатку 15 стагоддзя.

Пачатак грашовага абарачэння на Беларусі прыпадае на канец 2—пачатак 3 стагоддзя н. э. У розныя перыяды хадзілі розныя манеты. Першымі былі рымскія дынарыі, потым былі перыяды куфіцкага дырхема (9—10 стагоддзі), заходнееўрапейскага дынарыя (канец 10 стагоддзя), пражскага гроша (14—15 стагоддзі) і г. д.

На тэрыторыі Магілёўскага раёна знойдзена 16 скарбаў, з іх пяць у Магілёве. Сярод срэбных манет (медзякі пападаліся зрэдку) у асноўным гэта грошы Рэчы Паспалітай, Вялікага княства Літоўскага, Польшчы, Расіі. Але пападаюцца манеты і іншых, вельмі далёкіх ад тэрыторыі Магілёўскага раёна дзяржаў. І гэты факт выклікае асаблівую цікавасць: як, напрыклад, у вёсачку Навасёлкі на пачатку 18 стагоддзя трапілі талеры герцагства Гановер ці ў Малое Бушкава талеры Іспанскіх Нідэрландаў? Такія знаходкі пераконваюць у цесных сувязях беларусаў з еўрапейскімі дзяржавамі, Іранам, Арабскім Халіфатам з даўніх часоў.

Зазірнём у некаторыя найбольш цікавыя скарбы. Так, у в. Батунь скарб быў знойдзены ў 1893 г.: 51 срэбная манета Рэчы Паспалітай і Прусіі (захаваны ў 1709 г.); в. Буйнічы, 1901 г.: 76 манет Рэчы Паспалітай, Іспаніі, Прусіі, Шведскай Прыбалтыкі і інш. (захаваны ў 1635 г.); в. Дашкаўка, 1908 г.: 52 манеты Рэчы Паспалітай, Прусіі, Аб'яднаных Правінцый (захаваны ў 1639 г.); в. Малое Бушкава, 1905 г.: 4 манеты Іспанскіх Нідэрландаў (захаваны ў 17 стагоддзі); в. Навасёлкі, 1958 г.: 46 манет герцагства Гановер, Прусіі, Саксоніі і інш. (захаваны ў 18 стагоддзі) і г. д.

*Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.*
*Могилев: Энцикл. справ. Мн., 1990.*
*Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты. Мн., 1968; яго ж: Основные итоги нумизматических исследований в БССР// Белорусские древности. Мн., 1967.*

*А. Ярохін*

## З «летапісу» 19 стагоддзя

Могилевская губерния преимущественно заселена тем славянским племенем, которое говорит особым наречием, известным под названием белорусского. Это наречие является господствующим на обширном пространстве от истоков Немана и Нарева до верховьев Волги, и от Западной Двины до Припети и Ипути, притоков Днепра и Сожа.

В первый период... истории населенцы упомянутого пространства назывались кривичами, а по левому берегу Днепра, в долине Сожа — радимичами. Впоследствии обоим племенам было присвоено название Белорусов, что, однако, не выражает этнографического понятия.

...Из скудных летописных свидетельств можно сделать следующие вы-

воды касательно характера событий в нынешней Могилевской губернии: 1) В IX и X веке князья воевали при помощи земской рати, совершая с нею походы даже отдаленные. ...2) В XI–XII столетиях князья вели войну, опираясь только на одне свои дружины. 3) ...Эти дружины опустошали только княжеские города и селы. ...4) Так как общественная жизнь... являлась в то время единственно в торговом движении, центрами которого были те же города и села, то торговля их вследствие частого разорения начала клониться к упадку.

...Для обороны границ от нападений кочевников князья принуждены были строить города с чисто военными целями... Таким образом возникли области с государем во главе, с населением, связанным общностью местных интересов. Такая область представляла большую семью – **господу** и управлялась **господарем.** Местность нынешней Могилевской губернии упоминается уже на первых страницах летописи Нестора – в основном о нравах и обычаях древних поселенцев этих мест...

...Могилев на Днепре был сначала замком, построенным... около 1267 г. Львом Даниловичем... Имел двойной ряд укреплений. Вне замковой части города был торг, т. е. торговая площадь, на которой торговали свои купцы; приезжие купцы, называвшиеся гостями, торговали в особо отведенных помещениях – гостиный двор. ...Торговля была по преимуществу меновая. Деньги в виде монеты (динары, дирхемы) были весьма редки и появлялись на пограничных рынках со стороны Востока. ...На внутренних рынках была в обращении кожаная монета **куны.**

...Обитатели Могилевской губернии платили дань хозарам металлическою монетою **шеляг**... что значит дробная, мелкая монета. ...Отпускали на Восток: мед, воск и меха, в особенности чернобурых лисиц, в изобилии водившихся в... Могилевской губернии...

...В половине XIV века... Могилевский край всецело вошел в состав Литовского княжества.

*Опыт описания Могилевской губернии.../ Сост. под ред. Председателя Могилевского губернского статистического комитета А. С. Дембовецкого: В 3 кн. Могилев на Днепре. 1882. Кн. 3. С. 1–6, 11, 12.*

## У часы Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

Полацкае, Турава-Пінскае і Смаленскае княствы ў 11–12 стагоддзях дасягнулі свайго найвышэйшага ўздыму, і менавіта на іх эканамічным і культурным грунце пачало складвацца Вялікае княства Літоўскае. Выключную ролю пры гэтым адыграла Навагрудская зямля, адкуль і пачаўся працэс фармавання ВКЛ. Утварэнне дзяржавы дыктавалася інтарэсамі беларускіх феадалаў. Нашы старажытныя землі складалі аснову эканамічнай і вайсковай магутнасці княства; панавальнае месца ў ім займала беларуская мова і культура, а дзяржаўнае заканадаўства развівалася з традыцыйнага (звычаёвага) права старажытных славянскіх народаў. Тэрыторыя сённяшняга Магілёўскага раёна ўвайшла ў склад ВКЛ у 14 стагоддзі, у перыяд княжання вялікага князя Вітаўта (1392–1430 гг.). Менавіта ў гэты перыяд ВКЛ

дасягнула асаблівай эканамічнай, вайсковай і як вынік — дзяржаўна-палітычнай моцы. У 1395 г. Вітаўт падначаліў Смаленскае княства, а ў 1422 г. канчаткова падпарадкаваў Жамойць. Пад ягоным пратэктаратам апынуліся Вялікі Ноўгарад, Пскоў, Разань. Чэшскае каралеўства, ведаючы моц Вітаўтавай дзяржавы, запрасіла яго да сябе на гаспадаранне. Ён прыняў прапанову і паслаў да чэхаў намеснікам свайго пляменніка Жыгімонта Карыбутавіча. Вітаўт наважыўся стаць каранаваным манархам, памазанікам Божым на зямлі, і Ватыкан без пярэчанняў асвяціў яго карону. Беларускае гаспадарства было прызнанае тады наймагутнейшым у Еўропе, а ягоныя абшары сягалі Балтыйскага і Чорнага мораў, Берасця і Мажайска.

У другой палове 16 стагоддзя пачалося паступовае аслабленне Вялікага княства Літоўскага. Урад ВКЛ, якое ў гэты час вяло цяжкую Полацка-Інфлянцкую вайну з Масковіяй, мусіў падпісаць у Любліне (1569 г.) ганебнае пагадненне з Польскім каралеўствам узамен на вайсковую дапамогу. У гэты цяжкі для нашай Бацькаўшчыны момант палякі абвясцілі, што Вялікае княства Літоўскае зліквідоўваецца як самастойная дзяржава, уключаецца ў склад Польшчы і, такім чынам, утвараецца адна «рэч паспалітая» (дзяржава) — Польскае каралеўства, што й было зафіксавана імі ў Заключным Акце Люблінскага сойму 1569 г. «Акт аб уніі» ў рэдакцыі палякаў рыхтаваў глебу для поўнага ўваходжання ВКЛ у склад Польскага каралеўства. Але дзякуючы неймаверным высілкам і цвёрдай палітычнай лініі найвышэйшых урадоўцаў княства, найперш Астафія Валовіча (каля 1520—1587) і Льва Сапегі (1557—1632), паяднання не адбылося.

Да таго ж вялікі князь Сцяпан Батура сваімі прывілеямі ад 8 ліпеня 1576 г. цалкам адмяніў усе рашэнні Люблінскага сойму 1569 г., што прыніжалі годнасць Беларускага гаспадарства. У Прывілеі 1576 г. падкрэслівалася поўная незалежнасць Вялікага княства ад Польскай кароны: існавалі дзве незалежныя дзяржавы — Польскае каралеўства і Вялікае княства Літоўскае.

Статут 1588 г. гарантаваў абсалютную эканамічную, дзяржаўна-палітычную і культурную незалежнасць Вялікага княства Літоўскага ад суседніх гаспадарстваў. Статут замацоўваў за беларускай мовай статус дзяржаўнай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім.

Сваю моц Беларускае гаспадарства захоўвала прыкладна да сярэдзіны 17 стагоддзя, але з-за шматлікіх войнаў са Швецыяй і Маскоўшчынай, якія вогненным смерчам праносіліся і па Магілёўшчыне, яно паступова слабела.

Усе гэтыя падзеі і войны дзяржавы самым непасрэдным чынам сказаліся на эканамічным і культурным жыцці Магілёўскага краю.

Найвялікшыя страты нашай дзяржаве прынесла вайна з Масковіяй 1654—1667 гг., калі была знішчана ледзьве не палова ўсяго насельніцтва Беларусі, разрабаваная гаспадарка, парушаны ўвесь дзяржаўны арганізм.

Эканамічны заняпад і прыкметнае аслабленне ўсіх дзяржаўных структураў Вялікага княства ў другой палове 17 — першай палове 18 стагоддзя спрычыніліся да крызісу культуры, духоўнага жыцця. У выніку на землі Беларусі павялічыўся наступ паланізацыі. У 1697 г. пастановай сойму ў Вялікім княстве Літоўскім рэкамендавалася ажыццяўляць дзяржаўнае і судовае справаводства не на беларускай, а на польскай мове.

Пачынаючы з сярэдзіны 17 і да канца 18 стагоддзя сацыяльныя выступленні беларускіх сялян і гараджан былі

нярэдка скіраваныя і супроць польскага панавання на нашых землях. Прыкметную антыпольскую афарбоўку мелі нават вядомыя Крычаўскае сялянскае паўстанне (1740–1744 гг.) пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы і Мазырскае паўстанне канца 50 — пачатку 60-ых гг. 18 стагоддзя.

*І. Саверчанка*

## «Воюя Королеву землю...»

Ударом по самостоятельности и самобытности Литовского княжества явился Акт на Городельском сейме, которым постанавливалось, что родовитые люди Литовского княжества латинской веры во всем сравниваются с польскою хоругвенною шляхтою...

При короле Литовском Сигизмунде наместник Литвы при князе Московском Михаил Глинский в открытом возмущении встал противу поляков и, проиграв дело, бежал в Москву. С ним отъехали князья Трубецкие, Друцкие и много бояр. Перейдя на сторону Москвы, Глинские подняли Московских государей противу своей родины. С этого времени Литва начала почти ежегодно подвергаться ужасам войны братоубийственной.

Летописи этого времени так описывают походы на Литву русских: «...русские, воюя Королеву землю, посады у городов жгли и села жгли, и люди, и живот, — и животину имали, а иное жгли». В продолжительную войну (более 50 лет с небольшими перерывами) были опустошены волости Могилева — в 1515, 1519, 1535, 1564, 1580, 1588 и 1595 гг.

Дорого обошелся Могилевскому краю (да и всей Литве) отъезд к Москве оскорбленного Глинского.

*Опыт описания Могилевской губернии... Могилев на Днепре. 1882. Кн. 1. С. 36.*

## Магдэбургскае права і яго водгукі на Магілёўшчыне

Магдэбургскае права Магілёў атрымаў 28 студзеня 1577 г., і пасля гэтага на Магілёўшчыне назіраецца буйны росквіт рамёстваў, утвараюцца купецкія гільдыі. Гарады пачынаюць набываць тыповае аблічча гарадоў сярэдневяковай Заходняй Еўропы. Пасля магдэбургскага права Магілёў атрымаў і герб, які так апісваецца ў тэксце магдэбургскага акта: «...З вежы ў блакітным полі, уверсе над брамай — пагоня, ніжэй — адчыненая брама, каля якой рыцар з вынятай шабляй стаіць».

Магдэбургскае права апрача права на самакіраванне давала гарадскому жыхарству звальненне ад рэквізіцый, пастояў, падворнай павіннасці і г. д. Купцам дазвалялася гандляваць на 24 мілі вакол Магілёва з прывілеяй: без выплаты мыта і толькі з узносам 1/6 гроша з кожнага воза тавараў. Гэта ўмацавала эканамічныя сувязі з прыгарадам Магілёва, г. зн. з насельніцтвам тэрыторый сённяшняга Магілёўскага раёна, стымулявала яго да больш актыўнай працоўнай дзейнасці.

Грамадзяне-земляробы адпаведна інвентару павінны былі плаціць чынш — 480 коп. У іх распараджэнні знаходзілася зямля на пяці ўчастках: Задубравенскім — 50 валок; Трысцянскім — 63; Ледзькаўскім — 42;

Дубянецкім — 25; Цесенскім — 55 валок. Зямля гэта межавала з Буйнічамі (уладанне маршалка Вялікага княства Літоўскага Палубінскага); Княжыцамі (уладанне харунжага Паца); Пячэрскам (часовае ўладанне біскупа смаленскага, маёмасць архімандрыта кіеўскага); Пашкавам (зямля віцебскага лоўчага Зямбоцкага); Багушавым (зямля баярына Праневіча), Дняпром і вёскамі Бародчыцы, Вейна і Аніськавічы. Апрача гэтага, інвентар прадугледжваў чынш 60 коп за карыстанне Любужскім млынам і зямлёй пры ім (в. Брылі). Плата за мліва на Дубровенскім млыне вызначалася інвентаром на карысць замкавага ўрада. Такім чынам, з атрыманнем Магдэбургскага права насельніцтва акаляючых Магілёў вёсак і мястэчак уступала ў больш цесныя гаспадарчыя сувязі з горадам.

*Магілёўшчына. Магілёў. 1927. С. 20—23.*

*А. Беларусаў*

**Декрет его королевской милости присуженя сеножатей от села Вейны лежачых, през мещан Могилевских розробленых, также и тых, которые бы потом працею своею при селе Онисковском и Бородчицком розробили.**

**Жыкгимонт третий**

Ознаймуем сим нашым листом, кому того потреба будет ведати. Покладали перед нами, гдрем, бурмистры и райцы места нашого Могилевского лист ревизоров нашых староства Могилевского Яна Чижа а Яна Вилчка под печатми и с подписом рук их под датою року тисеча пятсот деветдесят первом, мца юля дванацатого дня, в котором пишет, иж они в року томже деветдесят первом мца юля девятого дня выезджали за жалобою подданых нашых волости Могилевское села Вейны на тых мешан нашых Могилевских о забране сеножатей и дерева бортного в кругу их... За которым выеханем тых ревизоров нашых на тые сеножати, подданные нашы Вейнянские показали лист продка нашого славное памети короля яго млти Стефана под датою року семдесят девятого, мца марца деветнадцатого дня до Андрея Ивановича, справцы на он час будучого Могилевского, писаный...

...На которую жалобу их лентвойт места Могилевского именем бурмистров, райцов и всих тых мещан Могилевских отпор чынечы, показал лист. ...И доводечы лентвойт держаня тых сеножатей показал реестр, выписаный з ревизией першых ревизоров, ...в котором се значит, иж в границах того игрунту Веенского в рейстре ревизорском описаного не толко над рекою Днепром почавшы от выгону, аж до бояр Могилевских, але и в иншых месцах...

Писан у Варшаве лета божего нароженя тисеча пятьсот деветдесят второго, мца октобра десятого дня.

Матей Война, писар

**Лист Яна Вилчка ревизора до пана Голубицкого, подстаростего Могилевского, ознаймуючый о границы меской з волошаны.**

Зацне урожоному его млти пану Янови Корсакови Голубицкому, хоружому Полоцкому, подстаростему Могилевскому, моему ласкавому пану и приятелеви.

Ян Вилчек, з росказаня короля его млти ревизор Могилевской, ознаймую вашей милости, иж маючы росказане короля его млти в старостве Могилевском розницы успокаят, упатрившы розницу межи местом и волостю о въезд до лесов и пущ к месту прилеглых волостных. Иж мещане маючы от первшых ревизоров с потверженем короля его млти Стефана волный въезд от места за две мили, а потом от року осемдесят осмого одержали мещане лист короля его млти на волность въезду за миль чотыри. Зачым межи волостью и местом не малые розницы се деели, а тым болей по розмереню и розданю игрунтов на плате принятого заборонял; а мещане по давному въезд собе

до лёсов привлащали. Которая розница межы местом и волостью так успокоена ест, то есть отграничоно пачавшы стеною, межы волоками Бородчыцкими и мескими заложоное... А за рекою Днепром: з реки Днепра положоно стену ламаную, займуючы Высокий Холм. А от Высокаго Холму простым трибом у ручай Болотный, у брод на старом дорожыщу з места до Онискович на болото Берви. С того броду через болото до стены концовое обрубу Старосельского, тою стеною простым трибом до болота Синичого; оттуль стеною межы моркгами сеножатными мескими и сел Веенских через тоеж болото Синичое и через бор стеною у болото Рогозное, через тое болото межы моркгов сеножатных села Веенского, Новоселок, и межы моркгов меских по моркги сеножатные над рекою Днепром села Вейны; подле тых моркгов у реку Днепр...

Писан у Могилеве року тысеча пятьсот деветдесят девятого мца генвара шестнадцатага дня.

При печати подпис руки тыми словы: вмсти поволный приятел и слуга.

Ян Вилчек рукою власною.

## Конфирмация листу ревизора Вилчка на границу мескую з волостю.

**Жикгимонт третий**

Ознаймуем сим листом нашым всим вобец и кождому зособна, кому то ведат належыт, иж секретар наш и ревизор староства нашого Могилевского, за росказанем нашым успокоене чинечы межы волостю и мещаны Могилевскими права майдебурского о въезд до лесов и пущ к месту прилеглых волостных, чого мещане от першых ревизоров за потверженем продка нашого славное памети короля его млти Стефана за две мили от места волный въезд по дерево и дрова до лесов мели, а от року осмдесят осмого за листом нашым гдрским волно было ездит за миль чотыри, в чом иж розница межи местом и волостью была, кгды вжо с померы каждый своего на плате принятого боронит хотел, а мещане по давному волного въезду до лесов заживати хотели, отграничыл певную часть бору месту и выписавшы границы достаточне положоные; лист свой до враду замкового Могилевского дал, абы вжо волощане за границы в тот бор, месту ограничоный, не вступовали, а мещане теж далей се не вдирали и не привлашали, што шырей в том листе ревизорском описано и доложоно.

Писан у Варшаве лета от нароженя сына божего тисеча пятьсот деветдесят девятого, мца мая третего дня.

Ярош Волович, писар

## Пущене именича Борова месту от Подбипетиное

Лета от нароженя сына божего тисеча шестсот третего, мца ноября пятнадцатого дня.

...Я Марина Ивановая Подбипетиная, земянка гдрская повету Оршанского, з детми моими музское и женское плоти, з небощиком малжонком моим Подбипетою спложоными, ознаймуем сим нашым листом всим вобец и кождому зособна, кому бы то ведати належало, иж што маючы, за рекою Днепром, в держаню своем по небощику малжанку моем пану Ивану Подбипете имениче в тракте староства Могилевского названия Борова, на што и привилей его кор. млти на имя мое мела есми, всего того кгрунту пашного, сеножатного, бору — волок колконадцат, так яко се тое имениче здавна в собе мело и тепер мает, ничого на себе не зоставуючы ани выймуючы; бачечы, иж тое имениче для покою мещан Могилевских их млть панове ревизорове староства Могилевского, пан Ян Корсак а пан Ян Чыж — секретаре его кор. млти до места Могилевского ограничили и копцами закопали, без чого бачечы и я, иж се место Могилевское обыйти не может, тогды принявшы собе тым детем от их млти панов ревизоров пристойную отмену, и от панов мещан нагороду слушную, тое имениче мое Боровую зо всим на все, яко се здавна в широкости и пожытках своих мела и тепер мает, з засеянем жытным, з кгрунты пашными, з сеножатными, з деревом бортным, ничого на себе не зоставуючы, заразом в моц и в держане пустила есми паном мещаном Могилевским и до места Могилевского права майдебурского вечными часы. И вжо от сего часу и даты сего листу моего я сама, дети мои и нихто з близких

кровных и повиноватых моих в тое имене Боровую в найменшую реч вступоватисе и переказы в держаню и ужываню того именя Боровое паном мещаном Могилевским чинити не маю и не буду под зарукою на его кор. млть двемасты копами грошей, а на сторону обжалованую мещан Могилевских другою двемасты копами грошей. Особливе с права се своего вырекаю и касую вечными часы, и што есми мела права на тое имениче, то все до рук есми паном мещаном отдала, ничого собе, детем моим с Подбипетою сплоконым, не зоставуючы, кгдыж есми взглядом того собе и тым детем отмену от их млти панов ревизоров и нагороду слушную от панов мещан взела. И на то есми паном мещаном места гдрского Могилевского права майдебурскага дала сес мой лист с печатю моею, и под печатми и сведомем людей зацных — его млти пана Юра Глебицкого. Ждана Ильинича, возного повету Оршанского, а пана Яна Пенского, которые их млть за власною и очевистсю прозбою моею до сего листу печати свои приложившы, руками власными подписат рачили.

Писан у Могилеве року тисеча шестсот третего, мца ноября пятнадцатого дня. У того листу печатей притесненых чотыри, а подпис рук тыми словы Ждан Ильинич возный повету Оршанского власною рукою.

Писан у Могилеве. При печати подпис руки тыми словы:

Ян Корсак з Голубич, хоружый Полоцкий

**Признане кгрунту Старосельского месту от панов Макаровичов**

Лета от нароженя сына божего тисеча шестсот третего, мца ноябра двадцатого дня.

На враде в замку гдрском Могилевском передомною Яном Корсаком з Голубич, хоружым и городничым Полоцким, подстаростим Могилевским, постановившысе очевисто земенин гдрский Могилевский Яхим Мкарович и при нем Марина Биневна Василевая Макаровичовая признали устне и ку записаню до книг замковых Могилевских подали лист своей водле права справленый под печатми людей зацных, даный мещаном Могилевским на реч в том листе описаную, которого я огледавшы и читаного выслухавшы далем до книг уписати и так се собе мает.

Я Яхим Макарович, а я Марина Биневна Василевая Макаровичовая сознаваем то сами на себе тым нашым листом, иж што маючы за рекою Днепром в держаню своем брат мой пан Василей, а малжонок мой мене Марины Биневны имениче в тракте староства Могилевского званое Староселе, на што и листы их млтий панов ревизоров мел, всего того кгрунту пашного, сеножатного, бору, волок сколконадцать, так якосе тое имениче здавна в собе мело и тепер маеть, ничого на себе брат мой мене Яхима Макаровича пан Василий Макарович, а муж мой мене Марины Биневны не зоставуючы, ани выймуючы, бачечы, иж тое имене для покою мещан Могилевских их млть панове ревизорове староства Могилевского пан Ян Корсак, а пан Ян Чыж, секретаре его кор. млти, до места Могилевского ограничыли и копцами закопали, без чого иж се место Могилевское обыйти не может...

Беларускі архіў. Мн., 1927. С. 40—57.

## Развіццё гандлю і рамёстваў

У Вялікім княстве Літоўскім важнае значэнне набылі гарады, у якіх шырока развіваліся рамёствы, а г. зн. пашыраўся гандаль, узрастала эканамічнае становішча краю. Да сярэдзіны 16 стагоддзя з гэтага пункту гледжання Магілёў вырастае як адзін з найбольш буйных цэнтраў гандлю ва ўсім Вялікім княстве. Менш чым за стагоддзе (канец 16 — сярэдзіна 17 стагоддзя) колькасць рамесніцкіх спецыяльнасцей узрасла тут удвая — з 40 да 80. У іх ліку былі кавалі, слесары, кацельшчыкі, касачы, ювеліры (залатых і срэбраных спраў майстры), гарбары, шаўцы, кушняры. Многа было і тых,

якія займаліся выпечкай хлеба і іншых вырабаў з мукі; пашывам адзення і капелюшоў. Былі маляры, саладоўнікі, цесляры, піваварьі, крупадзёры, бачары, калеснікі, рыбакі. А калі меліся рамеснікі і зробленыя імі рэчы, — неабходна было гэтыя вырабы прадаваць. Менавіта таму Магілёў і становіцца ў сярэдзіне 16 стагоддзя найвялікшым гандляром. Але першае, чым гандлявалі магілёўскія купцы, былі футры і скуры, а галоўнымі пакупнікамі — гарады і мястэчкі Польшчы: Познань, Люблін, Гнезна, Гданьск, Кракаў і інш. Галоўным транспартам — падвода.

Лепш за ўсё аб гандлёвых сувязях Магілёва расказваюць мытныя кнігі. Так, напрыклад, у сакавіку—красавіку 1583 г. праз Брэсцкую мытню з Польшчы праехалі Карп Іванавіч — на 19 падводах; Афрош Рахмаелавіч — на 13; Федар Пошын — на 11 падводах. За люты—сакавік праехала 6 купцоў, прычым пяцёра з іх — на 55 падводах.

Футры, якія яны вазілі ў Польшчу, магілёўскія купцы закупалі перш за ўсё ў жыхароў навакольных вёсак, а найбольш каштоўныя — у Сібіры. Закупаліся невырабленыя скуры, бо іхняй апрацоўкай займаліся мясцовыя кушняры. Магілёўскія майстры гэтай справы славіліся далёка за межамі княства. Такім чынам, размах гандлю быў шырокі: Расія, Польшча, Прыбалтыка. Але з Прыбалтыкай гандаль вёўся слаба, бо купцы везлі прадаваць і там жа куплялі — у першую чаргу тканіны. А ў Прыбалтыцы купляць тканіны было нязручна, і яна там была прывазная. Ды і дарог добрых у Прыбалтыку не было. Таму выгадней быў гандаль з Польшчай. Значную ролю ў гарадскім гандлі адыгрывалі сяляне прыгарадных вёсак і мястэчак. Менавіта яны былі і заўсёдашнімі пакупнікамі рамесніцкіх вырабаў, і ў той жа час збывалі тут сваю прадукцыю, якая служыла сыравінай для рамеснікаў. Сяляне прывозілі мёд, сала, крупы, неапрацаваныя скуры, кару, воск, рыбу, бандарныя вырабы, гліняны посуд, мяса і інш.

Гандляваў Магілёў і з гарадамі, мястэчкамі Вялікага княства Літоўскага. Гандаль уплываў на актыўнае развіццё рамесніцтва, стварэнне спецыялізацыі ў ім, спрыяў нараджэнню сапраўдных талентаў. Але гандлёвы працэс ішоў у складаных і часам цяжкіх абставінах, бо вярхоўная ўлада імкнулася атрымаць максімальныя прыбыткі ў дзяржаўную казну шляхам увядзення розных пошлін. З другога боку — над купцамі ўладарылі і феадалы, і адкупшчыкі, і мытнікі. Гандлёвая палітыка была накіравана на абмежаванне вывазу і павелічэнне ўвозу прамысловых тавараў, што не садзейнічала развіццю прамысловасці ў краіне.

Гандлёвыя мытні за вызначаную плату ў казну маглі здавацца ў арэнду. Арандатарамі былі заможныя людзі. Гэта было вельмі прыбытковай справай, і на атрыманне мытні ў арэнду заўсёды было многа прэтэндэнтаў.

*Малешко В. И. Могилев в XVI — середине XVII в. Мн., 1988. С. 17, 19, 100, 130.*

## «Вайна быццам перайначыла ўсю Беларусь»

Беларускае сярэднявечча, у тым ліку і на тэрыторыі Магілёўскага раёна, пазначана попелам і чорным вуголлем вайны 1654—1667 гг.

Добра ведаючы канфесійныя праблемы ВКЛ, маскоўскі ўрад, здаўна рыхтуючы на княства паход, рабіў стаўку на яго праваслаўных жыхароў. У Рэч Паспалітую папярдне засылаліся царскія граматы, якія мусілі пера-

конваць людзей у лаяльнасці да іх Масквы, схілялі праваслаўных на бок царскіх ратнікаў. Цар Аляксей Міхайлавіч пісаў: «...И всем извещаем, что Богохранимое наше царское величество... собравшись со многими ратными людьми на досадителей и разорителей святой восточной церкви... на поляков, вооружаемся. ...И вы бы, православные христиане, освободились от злых... прежде нашего царского пришествия разделение с поляками сотворите... и каждый против супостат Божиих да вооружается. Которые добровольно... верны нам учинятся... да сохранены будут их домы и достояние **от воинского разорения**» (падкрэслена рэдактарам) [1]. Апроч захавання маёмасці тым, хто пяройдзе на бок Масквы, абяцаліся ўзнагароды і розныя прывілеі, матэрыяльная падтрымка.

Распачыналася вайна, якая працягвалася 13 гадоў. У баявых фарміраваннях, накіраваных на Беларусь, налічвалася 90—100 тыс. чалавек. У арсенале Маскоўскай дзяржавы на той час было каля 4—5 тыс. гарматаў. Колькасць царскага войска, якое вясной 1654 г. рушыла на Беларусь, моцна ўражвала ўладароў суседніх дзяржаў. Вялікае княства Літоўскае такім патэнцыялам не валодала... Сойм Рэчы Паспалітай, які прыме ўхвалу аб 18-тысячным войску для ВКЛ, сабраўся толькі тады, калі маскоўскае войска ўжо імкліва наступала на Беларусь.

...Пры канцы жніўня быў вырашаны лёс Магілёва. Найбуйнейшы гандлёва-рамесніцкі цэнтр тагачаснае Беларусі, стратэгічная фартэцыя, ён быў ключом да Дняпра і адкрываў шлях у сэрцавіну ВКЛ.

Захопленыя земліператвараліся ў правінцыі Маскоўскай дзяржавы пад часовай уладай ваяводаў дзейных царскіх войскаў. Праваслаўным, духавенству, пакрыўджаным каталікамі і уніятамі, Аляксей Міхайлавіч абяцаў аднавіць усе правы, вярнуць уладанні. Патрабаванні маскоўскага ўрада былі цвёрдымі: «униатам не быть»; «костелам не быть, а петь в домех»; «жидом в Белоруссии не быть и жития никакого не имети».

Аднак рэальнае становішча было іншае. Да цара ў першыя ж месяцы вайны пайшлі скаргі праваслаўных. Са звароту сялян Язенскага манастыра вынікала, што царскія ратныя людзі манастырскія вёскі «грабят и з женами и з детми развозят» ды робяць іх сваімі прыгоннымі. У Буйніцкім і Баркалабаўскім манастырах «казаки монастырские вотчины пограбили и разоренье учинили великое, и лошади, и скотину отогнали» [2]. Нават адданы цару Паклонскі ўжо ў жніўні 1654 г. пісаў, што Магілёўскі павет і Чавусы — ці не спрэс праваслаўныя, якія адразу перайшлі на бок Масквы, — «повоевали и полон поимали» ратнікі ваяводы Трубяцкого.

Шляхціцы Мянчынскія з-пад Магілёва, якія прынялі царскае падданства, пісалі: што маскоўскія ратныя людзі «дворишка наша сожгли и разорили без остатку, а животишка наши все поимали... мать нашу да брата, да сестру и людишек наших били и мучили и огнем сожгли до смерти» [2].

Ваяводу Ваейкаву скардзіліся сяляне вёсак Сідаравічы, Мілееўка, Багданаўка, Воранаўка, Дашкаўка, Буйнічы ды іншых, што запарожскія казакі, якія былі ў Маскоўскім войску, «их де крестьян бьют и мучат... и хлеб у них отъимают и продают... Могилевской уезд те казаки насилством пустошат» [2].

На справе і праваслаўныя беларусы, і іхныя суайчыннікі каталіцкага ды уніяцкага веравызнанняў, і шляхта, і жыхары гарадоў — усе былі аднолькава безабаронныя. Царскія ваяўнікі нішчылі і рабавалі ўсіх без разбору.

Катастрофа — інакш не назавеш стан, у які была ўвергнутая Беларусь 13-гадовай вайной. На Беларусі, у ме-

жах прыкладна яе сучаснай тэрыторыі, колькасць насельніцтва зменшылася больш чым напалову. Некаторыя гарады, здавалася, абязлюдзелі назаўжды. Страты жыхароў склалі ў Магілёве больш як дзве трэціны.

Гэтая вайна быццам перайначыла ўсю Беларусь. Край добра развітай гаспадаркі, ремеснай вытворчасці, далёка вядомы вырабамі сваіх майстроў, зусім запусцеў, стаў непрыкметнай ускраінай. Прыкладам, калі на пачатку 17 стагоддзя ў Магілёве было за 2 тыс. рамеснікаў, дык у 1745 г. — толькі 95... [3]. Цяжка сказаць, ці акрыяла наогул Беларусь ад тае катастрофы...

1. Соловьев С. М. История России с древнейших времен. М., 1990. Т. 10. С. 602.
2. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. СПб., 1863. Т. 14. С. 159, 348, 407.
3. Игнатенко А. П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII–XVIII вв. Мн., 1963. С. 13.

*Сагановіч Генадзь. Невядомая вайна. 1654–1667. Мн., 1995. С. 8, 10, 14, 28, 29, 30, 33, 133, 134.*

## З пісьма, што захавалася ў архіве (1654 г.)

Захавалася ў архіве пісьмо Багдана Хмяльніцкага да расійскага цара Аляксея Міхайлавіча, у якім Хмяльніцкі хадайнічае за беларускага шляхціца Канстанціна Паклонскага і просіць аказаць яму царскія міласці. Паклонскі прыйшоў у войска Б. Хмяльніцкага з Літвы, з павета Магілёўскага, і паведаў пра тых, хто гатовы паддацца цару Аляксею Міхайлавічу, «...прямо и верно служить и всякого добра хотеть, дабы им милость получить у государя великого. ...Да пожалует его твое царское величество правами и добрами теми, которые он удержал... при королях польских и предки его держали... Изволь, твое царское величество, в том всем пожаловать кго...»

22 ліпеня Паклонскі быў ужо ў царскай стаўцы пад Смаленскам. Аляксей Міхайлавіч узнагародзіў яго: падараваў 40 собаляў і 50 рублёў грошай, узвёў у чын палкоўніка і дазволіў набіраць свой полк.

*Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею. СПб., 1875. Т. 8. С. 184–185.*

### Государю и великому князю Алексею Михайловичу...

**1654 г. августа 16**

Холоп твой Мишка Воейков челом бьет.

Послан я, холоп твой, для твоего государева дела с полковником с Констянтином с Поклонским. И я, холоп твой, и полковник Костянтин собрали пеших могилевцев, и чаусовцов, и радомцов крестьян с 1000 человек с бердыши, и с рогатины, и с пищалми да конных крестьян со 100 человек. И августа, государь, в 11 день с теми новоприборными людми полковник Констянтин и я, холоп твой, с твоими государевыми ратными людьми, с стрельцами, и с татары, из Чаусова пошел к Могилёву, а от Могилева за земли в с. Петровичех пришед, стали обозом и около обозу вал вскопали. И того ж государь, числа выехали из Могилева на твое государево имя шляхтич Гелда да 3 казака, Иван Миткцев, да Демид Филипов, да Федор Андреев, да 12 человек пеших гайдуков, и я, холоп твой, того шляхтича и казаков и гайдуков привел к вере по чиновной книге в с. Благовичех. Да те же государь, шляхтич, и казаки, и гайдуки сказали мне, холопу твоему, и полковнику: на Днепре делать три мосты; а сказал им: идет де к нам в Могилев ксенжа Радивил; и могилевцы

де черные люди державцу магилевскому пану Петровскому сказали: мы де все будим битца с Радивилом, пока нас станет, а в Могилев Радивилу не пустим.

...А что, государь, полку полковника Костянтина Поклонского шляхтич Олексей кучинский взял на бое шляхтича Юрья Путяту, и того языка, едучи с бою, полковник Василий Золоторенко и судья отняли насильством и повели с собою под Смоленск, а идучи, государь, под Смоленск, могилевцов, и чаусовцов, и радомцов крестьян и казаков, которые поддались под твою государеву высокую руку, пограбили, лошади, и коровы, и всякую животину поимали. А я, холоп твой, им, полковнику и судье, говорил и к ним после писал, чтоб они тех твоих государевых сел и деревень не пустошили, и что они взяли, и то б им назад отдали... И августа, государь, 11 дня из Могилева пан Петровский прислал лист от ксенжи Радивила и от себя к полковнику Констянтину, и те, государь, листы посланы к тебе, государю, вместе с сею ж отписью.

**Государю царю и великому князю Алексею Михайловичу...**

**1654 г. декабря 28**

Холоп твой, полковник солдатского строю Ивашка Ниротморцев челом бьет.

В нынешнем, государь, во 7163 (1654) г. декабря в 21 день в Могилев в сьезжую избу Могилевскую у с. Сидоровичь с деревнями Варколабовского манастыря крестьяня, Овдокимко Петров с товарищами, привели мужика Родку Гореева, а сказали: приехал де тот мужик из Быхова в Варколабово место, и они де его поймали. И я, холоп твой, тово мужика распрашивал, и тот мужик в распросе и я с пытки сказал: поехал де он из Быхова декабря 18 числа, а в Быхове де городе служилых людей желдаков 4 хоронги, драгунов 100 человек, мещан 17 хоронг да Быховского у можиков много, а сколько крестьян, тово он не ведает. До декабря ж де, государь, 18 числа по утру рано из Бобруйска пришло в Быхов с старшим с Оскиркою конных и пеших хоронг с 10, а стали де они под Быховом в таборах, где стоит гетман Иван Золотаренок.

До декабря ж, государь, 22 числа приехал в Могилев Войска Запорожского наказного гетмана Иванова полку Золаторенка полковник Тетьяк Федоров, а с собою привез Литвина Назарка Дмитриева; а сказал полковник: взял де он того литвина декабря в 18 день в Быховском у. в дер. Хонове.

И я, холоп твой, того литвина распрашивал, и в распросе сказал. Декабря де в 18 день прошел де из Бобруйска в Быхов старший Оскирка, а с ним де пришло конных и пеших людей тысячи с 4, а в Бобруйску остался Госевский да Шалевский, а Смольский де пшел в Менск для денег, что давать людям; а всех де, государь, людей с Оскиркою и Смольским, и с Госевским, и с Шалевским ляхов и шляхты тысяч 10, опрично пехоты, а сколько де, государь, пехоты, того он не ведает.

А в Могилеве, государь, вал большой с трех сторон, и тот худ, через вал ходят люди; а с четвертой, государь, стороны р. Днепр, и по реке, государь, Днепру, валу и острогу и никакой крепости нет.

*Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. СПб., 1889. Т. 16. С. 215—217, 466—468.*

*Падрыхтаваў да друку У. Васілеўскі*

## Спусташальныя войны 17—18 стагоддзяў на Магілёўшчыне

Гісторыя магілёўскага наваколля — гэта не толькі гісторыя жорсткіх баёў, без чаго не бывае вайны, але гэта яшчэ і гісторыя крывавага грабяжу, ад якога не было паратунку...

Вось як пра гэта піша навуковец і краязнаўца мінулага стагоддзя А. Кіркор у кнізе «Живописная Россия» (1882 г.).

«...Во время войны с Алексеем Михайловичем, в 1654 году русские войска осадили Могилев. Игумен оршанского Кутейнского монастыря Йоиль Труцевич стал убеждать жителей, доб-

ровольно сдаться на милость царя. Жители послушались и сдались. Семь лет (1654–1661) оставался Могилев во власти русских. Войска, здесь расположенные, и их воеводы, несмотря на то, что город им сдался без борьбы, смотрели на жителей как на врагов. Солдаты неистовствовали, грабили, всячески обижали жителей. Воеводы Горчаков и Полуехтов все жалобы оставляли без последствий. Составился заговор: истребить всех русских, квартировавших в Могилеве. Солдаты жили по квартирам. Условлено было: в назначенный срок, 1 февраля 1661 года, вынуть кремни из их ружей. Заговором руководили члены магистрата и сам бургомистр Леонович. Рано утром многие из жителей толпились в ратуше, скрывая под одеждою оружие, какое у них было: сабли, бердыши, топоры, ломы и т. п. Солдаты, ничего не подозревая, разгуливали по площади и хватали калачи у торговок. Торговки подняли крик. Бургомистр Леонович выбежал из магистрата и закричал: «Пора, пора!» В ту же минуту вечевой колокол ударил набат; почти все жители высыпали на площадь и улицы. Леонович первый бросился на солдат с мечом... Весь гарнизон в числе семи тысяч человек был истреблен... Воеводы Горчаков и Полуехтов, стрелецкий голова Чекин, несколько офицеров, взяты были в плен...»

На пачатку 18 стагоддзя, у часы Паўночнай вайны (1700–1721), Магілёўшчына зноў стала тэатрам ваенных дзеянняў. Праз яе землі праходзілі асноўныя сілы расійскіх і шведскіх войскаў, і ўсе адчувалі сябе тут гаспадарамі. Так, у 1706 г. некалькі палкоў маскоўскага войска пад камандаю князёў Валконскага і Гагарына размясціліся лагерам пад Пашкавам. У тым жа годзе пад гарою Машакоўкаю, што недалёка ад Магілёва, на чале з Аляксандрам Данілавічам Меншыкавым распалажылася некалькі тысяч маскоўскага і казацкага войска; чакалі самога цара. Ішлі чуткі, што цар па рацэ набліжаецца да Магілёва. Раніцай 22 чэрвеня ў маскоўскім лагеры загрымелі барабаны. Пачуўшы іх, магістрат паспяшаўся да ўрочышча Грабёжу. Для Пятра прывялі каня. На срэбраным залачоным блюдзе паднеслі вялікі пірог, а на другім – вялікі сітны хлеб. Пётр не прыняў паднашэнняў, загадаўшы з'явіцца з пірагамі да кватэры. Ён сеў на каня і з вялікай світаю паімчаў да войска...

Пётр I паслаў у Беларусь 70-тысячнае войска. Яго трэба было забяспечыць правіянтам. Акрамя таго, каб пазбавіць правіянту наступаючых шведаў, расійскія войскі выпальвалі беларускія вёскі. З сакавіка па чэрвень 1708 г. стаяла на Магілёўшчыне вялікае войска Пятра I, патрабуючы харчаванне і правіянт, зброю і падводы, прымушаючы будаваць праз Дняпро масты.

У ліпені 1708 г. падышоў са сваім войскам шведскі кароль і размясціўся лагерам на Буйніцкім полі. Магістрат Магілёва наладзіў дэлегацыю да караля прасіць літасці: парабаваная зямля не магла карміць войска. Але кароль праз перакладчыка адказаў: «Вы давалі правіянт маскалю, то трэба даваць і мне». Было строга загадана даставіць войску ўсё неабходнае.

Буйніцкі манастыр шведы разрабавалі, манахаў разагналі

У жніўні 1708 г. войскі Карла XII занялі Магілёў. Горад быў падзелены на 12 кварталаў, якія кожны дзень павінны былі пастаўляць шведам па 312 пудоў хлеба і па 3000 літраў піва. Ворагі рабавалі цэрквы і манастыры, палілі жылыя дамы... Але хутка Пятру I удалося прагнаць шведаў. Вялікаму цару здалося, што Магілёў яшчэ занадта заможны горад. І ён загадаў яго спаліць. Гэта, як піша А. Кіркор,

«...8 сентября 1708 года... было исполнено. Сперва жители были совершенно ограблены, а потом город с нескольких сторон был зажжен. Весь город превращен был в развалины и попелище. Сгорели церкви, растопились колокола, разрушились золоченые купола, тысячи жителей остались без крова, без пищи, почти без платья...»

У верасні таго ж года ў Магілёў, прыйшло некалькі соцень кавалерыі і патрабавалі прыгатаваць для шведскай дывізіі генерала Левенгофа (Левенгаўпта) правіянт. Але два бургамістры, спаслаўшыся на пажар, голад і нястачу, здолелі пераканаць генерала, што такое патрабаванне горад выканаць не можа...

З вялікім абозам корпус Левенгофа рушыў на Прапойск праз в. Лясную. Тут, каля Лясной, Рускія войскі на чале з Пятром нагналі шведаў і разбілі.

*У. Васілеўскі*

## Паміж Польшчай і Масковіяй

Акрамя Польшчы з другой паловы 17 стагоддзя на Беларускае гаспадарства ўсё больш пачынала ціснуць уздужэлая Маскоўская дзяржава. Па заваршэнні вайны 1654—1667 гг. па ўмовах Андрусаўскага пагаднення (1667 г.) Масковія анексавала вялікія тэрыторыі ВКЛ: Смаленск з навакольнымі землямі і ўсе левабярэжныя абшары Дняпра. У захопленыя беларускія гарады і паветы накіроўваліся царскія ваяводы і расійскія чыноўнікі, якія ўсталёўвалі тут сваю непадзельную ўладу.

У 18 стагоддзі расійскія войскі літаральна днявалі й начавалі на беларускіх абшарах. Пакарыстаўшыся як зачэпкай патрабаваннямі Слуцкай канфедэрацыі — аб'яднання праваслаўных і пратэстантаў, што змагаліся за свае палітычныя і грамадзянскія правы,— расійскія войскі ў 1772 г. зноўку ўварваліся ў Вялікае княства і па-драпежніцку забралі Магілёўскае, Мсціслаўскае і значную частку Полацкага ваяводстваў.

Аднак Беларуская дзяржава яшчэ працягвала існаваць як самастойная і незалежная, і юрыдычна была зліквідаваная не расійцамі, а палякамі: 3 траўня 1791 г. Сойм у Варшаве большасцю галасоў зацвердзіў артыкул аб скасаванні Вялікага княства Літоўскага як самастойнай дзяржавы. У дачыненні да Беларусі палякі такім чынам здзейснілі найвялікшае злачынства.

Праз інкарпарацыю княства яны разлічвалі ўмацаваць сваю дзяржаву. Але і Польшча неўзабаве страціла сваю дзяржаўнасць, па-драпежніцку падзеленая Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй. Нашыя землі ў выніку гэтых падзелаў анексавала Расія і аж да 1918, да абвяшчэння БНР, яны, пазбаўленыя аўтаноміі, сталі гэтак званым «Западнорусским краем» Расійскай імперыі.

*І. Саверчанка*

## Магілёўшчына 18—19 стагоддзяў
## Крычаўскае паўстанне 1740—1744 гг.

Даніна, якую беларускі народ прынёс войнам сярэдзіны 17 стагоддзя, была жудаснай: не стала кожнага другога беларуса (з 1650 па 1667 г.); у запусценні ляжалі землі, пустымі сталі хаты. У гады Паўночнай вайны (1700—1721 гг.) Бацькаўшчына, у тым ліку і Магілёўшчына, зноў апынулася паміж молатам і кавадлам: з аднаго боку шведы, з другога — пятроўскае войска... Жорсткі феадальны ўціск, шляхецкія наезды рабілі жыццё сялян на спустошанай войнамі зямлі невыносным. Не хапала цярпення маўчаць, і ўсё больш скаргаў дасылалася князям на арандатараў. Скаржнікаў штрафавалі, катавалі, кідалі ў турмы, але зламаць не маглі. Скаргі на прыгнятальнікаў былі сведчаннем непакою сярод сялян, і ў маі 1740 г. гэты непакой выліўся ў Крычаўскім старостве ў буйнае паўстанне. Узброены атрад узначаліў войт в. Селішча Васіль Вашчыла, якому не раз давялося спазнаць лютасць прыслужнікаў арандатара за тое, што пісаў сялянам скаргі і насіў іх да Радзівіла.

Паўстанцы ўзялі ўладу ў свае рукі. Яны імкнуліся замяніць жорсткіх арандатараў на сумленных і справядлівых, абмежаваць эксплуатацыю сялян. Захавалася звыш 20 арэндных дагавораў, падпісаных В. Вашчылай і іншымі войтамі, у якіх прадугледжваліся меры і супраць ліхвярства, якое даводзіла гаспадаркі да галечы; забаранялася выкарыстоўваць прыгонных на прымусовай працы на панскіх прамысловых прадпрыемствах.

Аднак бяда паўстанцаў была ў тым, што барацьба была накіравана супраць асобных прыгнятальнікаў, а не супраць сістэмы, якая стварала ўмовы эксплуатацыі.

Радзівілаўскае войска, якое мела гарматы, жорстка расправілася з паўстанцамі, але пагалосак Крычаўскага паўстання доўгім рэхам адазваўся па ўсёй Рэчы Паспалітай. Мужнае выступленне прыгонных сялян і простых гараджан прымусіла прыгнятальнікаў задумацца. На некаторы час становішча сялян паляпшалася, ліквідаваліся найбольш агідныя праявы эксплуатацыі.

*Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1. С. 228, 254—257.*

## У складзе Расійскай імперыі

Сённяшняя тэрыторыя Магілёўскага раёна апынулася ў складзе Расійскай імперыі ўжо пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772). Усе падзеі, звязаныя са спыненнем існавання гэтай буйнейшай у Еўропе дзяржавы (1795 г.), не мелі станоўчага ўплыву на стан гаспадаркі далучаных да імперыі зямель. У першыя дзесяцігоддзі царскі ўрад імкнуўся інтэграваць беларускія землі ў імперыю так, каб «покорить сердце в оных живущих добрым... и человеколюбивым управлением». Рэалізацыя гэтай палітыкі спалучала апякунскую заклапочанасць і ваеннае падаўленне сялянскіх хваляванняў. З аднаго боку, дабрачыннасць абстаўлялася мерапрыемствамі па арганізацыі вясковых запасных магазінаў, якія прызначаліся стаць страхавым фондам для збяднелага сялянства; паншчына ў 1797 г. абмяжоўвалася

трыма днямі на тыдзень. З другога боку, запасныя магазіны пуставалі; заканадаўчы акт адносна паншчыны заставаўся на паперы. Саслоўныя супярэчнасці царызм выкарыстоўваў дзеля насаджэння веры ў добрага цара-збавіцеля ад іншаземных прыгнятальнікаў, русіфікацыі землеўладання і адміністрацыйнага апарату.

Дзяржаўныя ўладанні раздараваліся дваранам — у асноўным расійскім чыноўнікам. Так, з 1773 па 1796 г. Кацярына II падаравала сваім прыбліжаным 180 550 беларускіх сялян, у тым ліку і з Магілёўшчыны. Пры Паўле I былі падараваны яшчэ 28 000 сялян (1796—1801 гг.). У выніку на Беларусі прыкладна ў тры разы скарацілася колькасць дзяржаўных сялян, што адмоўна сказвалася на іх матэрыяльным стане. Незадаволенасць такой палітыкай выказвалася і сялянамі, і мясцовай шляхтай. Гэта прымусіла расійскі ўрад адмяніць з 1801 г. практыку вечнаспадчынных падараванняў сялян.

Уводзіўся на беларускіх землях і новы тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел: утвараліся губерні — Полацкая, Віцебская, Магілёўская, Менская і Гародзенская. Губерні дзяліліся на паветы. Згодна ўказу 1773 г., кожны павет падзяляўся на 6 ключоў на чале з войтамі. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі, якія выбіраліся суадносна ад 100—200 і ад 1—25 двароў. Войт насіў на правым баку грудзей знак арла, выбіты на жоўтай медзі; сотнік атрымліваў доўгі кій з меднай круглай булавой на канцы; дзесятнік — кароткі кій. Усе названыя асобы падпарадкоўваліся камісару — прадстаўніку царскіх уладаў. Камісары назначаліся з рускіх афіцэраў і зацвярджаліся ў сенаце.

Губерні аб'ядноўваліся ў генерал-губернатарствы на чале з намеснікамі цара, якія надзяляліся неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Такім чынам, уся ўлада на беларускай зямлі, у тым ліку і на Магілёўшчыне, была поўнасцю ў руках расійскіх чыноўнікаў і прадстаўнікоў царскай улады. Мясцоваму дваранству ў гэтым бюракратычным механізме адводзілася роля другараднaя, у выніку чаго паміж першым і рускай адміністрацыяй узнікалі супярэчнасці. Асабліва яскрава гэта вызначалася падчас вайны 1812 г.

*Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1. С. 267—273.*

## З «летапісу» А. Дамбавецкага

Под великими князьями Литовскими население Могилевской губернии... жило самобытной жизнью до половины XVI века. Слившим интересы свои с польскими в 1569 г., Литва... сделалась постоянным театром войн между Польшею и Москвою, и благосостояние могилевцев быстро пошло к упадку; единственною заботою их стало — как бы сохранить «животы свои», не довести до крайнего разорения семейства и домашний очаг свой.

В половине 18 века бедствия достигли крайних пределов. Могилевский край присоединился к России уже обедневшим. Сельское хозяйство, основанное на крепостном праве, все более и более слабело. Земля и даровый труд, находившийся в полном распоряжении помещиков, не имели никакой цены в глазах тогдашних владельцев, которые пользовались ими без всякого расчета положить прочное основание производительности и состоятельности края; в результате оказалось постепенное обеднение крестьян и упадок помещичьих хозяйств.

Правительство Екатерины Великой уполномочило сохранную казну и приказы общественного призрения открыть землевладению широкий и дешевый кредит. Большинство помещиков Могилевской губернии... истратив свои денежные средства на веселую и расточительную жизнь, на дорого стоившие тогда поездки за границу, ...стали закладывать свои имения и брать ссуды — не на поддержание земельного хозяйства, а... для удовлетворения личных потребностей и непроизводительных расходов.

Первым последствием подобного хозяйничанья явились неудовлетворительные урожаи... Хлебные запасные магазины оказывались пустыми, ибо существовавшие тогда попечители запасных магазинов и чины земской полиции были выборные из тех же помещиков, кругозор которых и стремления не соответствовали требованиям рационального хозяйства.

Препятствием выйти из этого ненормального положения мешали огромные казенные и хлебные долги. Убеждение в том, что избыток, дающий благосостояние, начинается с того времени, с которого прекращается существование долгов и что с этого только времени человек видит пользу или необходимость сбережений, заставило указать населению на необходимость расплатиться с долгами...

*Опыт описания Могилевской губернии... Могилев на Днепре, 1882. Кн. 1. С. 1—2.*

## Уплыў паўстання Т. Касцюшкі на самасвядомасць беларусаў

Яшчэ не сышлі з памяці падзеі, звязаныя з імем сялянскага заступніка Васіля Вашчылы, як над зямлёй Бацькаўшчыны ўзышла новая зорка — імя генерала Тадэвуша Касцюшкі, чалавека высокаадукаванага, вядомага ў многіх краінах свету. У парыжскіх акадэміях Касцюшка вывучаў ваенныя навукі, потым жывапіс і скульптуру. Падарожнічаў па Англіі, Італіі, Швейцарыі, Нямеччыне. У жніўні 1776-га трыццацігадовы Тадэвуш Касцюшка быў залічаны ў амерыканскую армію ў званні палкоўніка: у Паўночнай Амерыцы пачалася ў той час вайна супраць англійскага каланіяльнага ўладарніцтва. За баявыя заслугі кангрэс Злучаных Штатаў прысвоіў яму званне генерала.

Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, Тадэвуш Касцюшка ўзначаліў барацьбу за свабоду. 24 сакавіка 1794 г. быў абвешчаны Акт паўстання. Асноўнымі мэтамі былі: пазбаўленне ад іншаземнай акупацыі; барацьба за поўную суверэннасць Рэчы Паспалітай. Лозунг паўстанцаў: «Вольнасць, цэласць, незалежнасць» — ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім. Акт паўстання заклікаў не толькі да вольнасці, але і «роўнасці грамадзянскай». Найбольш радыкальная частка паўстанцаў на чале з Я. Ясінскім выступала за ліквідацыю паншчыны і прыгону, за раўнапраўе мяшчанства, падтрымлівала ідэю ўтварэння рэспубліканскага ладу.

Паўстанне пратрымалася крыху болей 5 месяцаў і было задушана. Рашаючую ролю ў разгроме паўстання адыграў корпус расійскага войска на чале з А. В. Суворавым. Кароткае па часу, яно было моцным па сіле ўздзеяння на самасвядомасць дваранства і наогул усёй перадавой часткі насельніцтва ВКЛ: кожны народ павінен самастойна вырашаць свой лёс.

*Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Ч. 1. С. 237—242;*
*Ю. Цівуноў. Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі // Ратуша, 2 студзеня 1996.*

## Напалеонаўскія войскі на Магілёўшчыне

У той трагічны для Беларусі час, калі ішла вайна 1812 г., нашы прадзеды апынуліся на ободвух баках — расійскім і французскім. Пасля канчатковай анексіі Беларусі толькі за 1796—1799 гг. у расійскае войска ўзялі 49 тыс. беларусаў; з 1801 па 1812 г. яшчэ 130 тыс. (гэта апрача шляхты, якая папаўняла расійскі афіцэрскі корпус). Сюды трэба дабавіць яшчэ рэкрутаў, прызваных у расійскае войска ў 1783 г. з Полаччыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны. Служылі беларускія рэкруты ў пяхотных дывізіях, якія ўваходзілі ў склад армій Барклая дэ Толі і Баграціёна, і прынялі на сябе галоўны цяжар ваенных дзеянняў у Барадзінскай бітве.

Прыйшоўшы на тэрыторю былога Вялікага княства Літоўскага, Напалеон паводзіў сябе як вызваліцель гэтых зямель ад расійскай акупацыі. Па яго загаду быў створаны Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага. З дазволу імператара ўрад пачаў ствараць уласныя ўзброеныя сілы, якія далучаліся да напалеонаўскай арміі. Мелася на мэце стварыць 100-тысячнае войска, але рэальна паспелі выставіць пяць палкоў пяхоты і чатыры уланскія палкі. Акрамя таго, быў сфарміраваны лёгкаконны полк пад камандаваннем слонімскага ўраджэнца генерала Яна Канопкі, да якога далучыўся эскадрон беларускіх татараў на чале з Мустафой Ахматовічам. Да корпуса Ю. Панятоўскага далучылася беларуская артылерыйская батарэя. Асобны полк уланаў лікам тры тысячы шабляў, выставіў сваім коштам князь Дамінік Радзівіл. На Палессі фарміраваўся 6-ы пяхотны полк. Трэба ўзгадаць яшчэ і конныя харугвы шляхты, якія сабраліся ўжо пад канец вайны, у снежні, на заклік да паспалітага рушэння. На баку Напалеона былі 24 тыс. беларускіх жаўнераў — тое, што здолеў абмундзіраваць і ўзброіць Часовы ўрад.

Такім чынам, беларусы, апранутыя ў мундзіры расійскай і французскай армій, у многіх сутычках і бітвах вайны 1812 г. вымушаны былі забіваць адзін аднаго...

Магілёву і прымагілёўскім землям выпадаў лёс стаць у эпіцэнтры падзей, бо менавіта гэтая тэрыторыя ляжала на прамым шляху напалеонаўскіх войскаў да Смаленшчыны і далей — на Маскву.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Магілёўшчына стала заходняй губерняй Расіі. Беларускай шляхце такое далучэнне было не даспадобы. Напалеон на першай пары сваёй дзейнасці з'яўляўся кумірам многіх беларускіх шляхціцаў, і пры набліжэнні вайны многія з іх марылі стаць пад яго сцягі. Некаторыя з шляхты марылі выкарыстаць сітуацыю для аддзялення гэтых зямель ад Расіі. І так склалася, што землі, якія ляжалі вакол Магілёва, сталі не толькі арэнай жорсткіх баявых дзеянняў, але і своеасаблівымі тэатральнымі падмосткамі, на якіх Напалеон спрабаваў разыграць сцэну прывядзення беларускага народа да прысягі на вернае яму служэнне.

У пачатку ліпеня Баграціён адправіў да Магілёва 7-ы пяхотны корпус генерал-лейтэнанта Раеўскага і частку 4-га кавалерыйскага корпуса генерал-маёра Сіверса. Туды ж кіраваўся і 8-ы пяхотны корпус генерал-лейтэнанта Барадзіна. Але на маршы часці моцна расцягнуліся. Наперад вырваўся казацкі полк (2 тыс. чал.) палкоўніка Сысоева, які ішоў у авангардзе корпуса Сіверса. Казакі даведаліся, што французы ўжо амаль у Магілёве, і рушылі наперад. Да іх далучыліся яшчэ 2 казацкія і 2 драгунскія палкі, і ў шасці кіламетрах ад Магілёва яны сустрэлі праціўніка — 3-і коннаегерскі полк корпуса Даву. Каля 500 французаў былі забіты, больш за 200 трапілі ў па-

лон, астатнія разбегліся. Казакі праследавалі іх, але каля в. Буйнічы былі спынены агнём французскай артылерыі.

У гэты ж час хуткімі тэмпамі на Магілёў рушылі французскія і саюзныя ім войскі: пяхотны корпус маршала Даву, кавалерыйскі корпус генерала Грушы, рэзервовы корпус генерала Латур-Мабура, 5-ы польскі корпус генерала Панятоўскага.

7(19) ліпеня праціўнік заняў Княжыцы, Бялынічы, Коханава, раніцай 8 ліпеня падышоў да Магілёва.

Магілёўскі губернатар Д. А. Талстой ведаў, што на дапамогу ідзе корпус генерала Раеўскага і паспрабаваў арганізаваць абарону горада, але ў яго распараджэнні меўся толькі атрад палкоўніка А. І. Грэсера (каля 400 чал.), які прыйшоў з-пад Барысава, ды не прызначаны для ваенных дзеянняў батальён унутранай варты (200—300 чал.). Гэтыя невялікія сілы размяшчаліся на заходняй ускраіне горада на Віленскім полі пад прыкрыццём Палявога вала.

Даву падышоў да Магілёва раней за Баграціёна. Барацьба была няроўнай. Частка французскай пяхоты накіравалася ў абыход правага фланга абаронцаў горада, да Шклоўскіх варот; другая — пайшла ў штыкавую атаку.

Салдаты магілёўскага гарнізона, адстрэльваючыся, пачалі арганізованае адступленне на поўдзень, мінуючы цэнтр горада. Прайшоўшы Быхаўскую заставу, яны цераз Буйнічы адыйшлі да Дашкаўкі. У гэтых баях каля 50 чалавек былі забіты і паранены, 200 — трапілі ў палон.

8(20) ліпеня 1812 г. войскі праціўніка захапілі Магілёў, мост цераз Дняпро, харчовыя склады, вялікую колькасць коней і буйной рагатай жывёлы. 10 ліпеня войскі Даву занялі моцную пазіцыю за 11 км ад Магілёва, ля в. Салтанаўка, каб сустрэць падыходзіўшую армію Баграціёна. У гэты ж дзень пад Салтанаўкай адбыўся бой, у якім рускія войскі знішчылі полк кавалерыі праціўніка, але прабіцца да Магілёва не здолелі...

Баграціён загадаў Раеўскаму ўступіць у бой ля в. Дашкаўка і адцягнуць на сябе корпус Даву, каб даць Баграціёну магчымасць адыйсці да Новага Быхава і перапраўіцца цераз Дняпро. Цэлы дзень 11(23) ліпеня ішла бітва ля Дашкаўкі і Навасёлкаў з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Па ўпартасці супраціўлення маршал Даву меркаваў, што перад ім уся армія Баграціёна, а не адзін корпус Раеўскага. І толькі праз суткі даведаўся напалеонаўскі маршал, што армія Баграціёна ўжо на левым беразе Дняпра.

Акупаваўшы тэрыторыю Магілёўшчыны, французы ўстанавілі тут рэжым рабаўніцтва і прымусу. Ужо на трэці дзень знаходжання ў Магілёве, маршал Даву, які стаў магілёўскім ваенным губернатарам, аб'явіў, што сяляне застануцца па-ранейшаму ў «павінавенні» сваім памешчыкам, і патрабаваў для французскай арміі «трох рэчаў»: хлеба, хлеба і хлеба.

Ён узначаліў і часовую «камісію польскага праўлення», у якую ўвайшлі галоўным чынам мясцовыя апалячаныя памешчыкі і чыноўнікі. На камісію ўскладвалася задача падтрымання парадку, збору і дастаўкі французскай арміі хлеба, жывёлы, харчовых прыпасаў і фуражу. Адпаведныя камісіі былі створаны ў паветах.

21 ліпеня (2 жніўня) акупанты, пагражаючы зброяй, прымусілі жыхароў Магілёва прынесці прысягу Напалеону. Да гэтай ганебнай справы наўмысна былі прыцягнуты праваслаўныя святары.

Пасля адыходу з горада корпуса Даву ваенным губернатарам Магілёўшчыны быў прызначаны генерал Панятоўскі. Першае, што ён зрабіў, — гэта стварыў магілёўскую канфедэрацыю шляхты, якая выказала пажаданне далучыць Беларусь да Польшчы.

Адной з «навацый» Панятоўскага была ідэя стварэння ўласных узброеных сіл. Па загаду Напалеона ў кожнай прэфектуры на Беларусі павінны былі ствараца так званыя атрады «нацыянальнай гвардыі і жандармерыі», аднак яны вызначаліся нізкімі баявымі якасцямі і слабай дысцыплінай. Пры перамяшчэнні мабілізаваныя сяляне і рамеснікі разбягаліся. Рэкруцкі набор у корпус Панятоўскага таксама праваліўся.

Сяляне аказвалі прышэльцам адкрытае і тайнае супраціўленне: нападалі на вайсковыя склады, на гаспадаркі тых паноў і шляхты, якія падтрымлівалі французаў і іх польскіх стаўленікаў; разбіралі жывёлу, дамашнюю птушку, прадукты харчавання. Такім чынам, барацьба за хлеб ператваралася ў сапраўдную вайну сялянства супраць акупантаў, стала адной з формаў масавага супраціўлення рабаўніцкаму напалеонаўскаму рэжыму.

*Белоруссия в эпоху феодализма*. Мн., 1979. Т. 1, С. 23.
*Могилев*: Энцикл. справ. Мн., 1990, С. 323–324.
*Сто пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі*. Мн., 1993. С. 51.

*А. Ярохін*

## Гэта памяць людская...

Калі выязджаеш з Магілёва па звілістай стужцы Бабруйскай шашы, міжволі звернеш увагу на сціплую цагляную белую капліцу пры дарозе, якая строга і ўрачыста ўзносіцца ў неба высокім шатром. Крыжы-вокны, якія рассякаюць дзве глухія сцяны яе, як сімвал вечнасці і трыумфу жыцця, што разрывае цемру пахавальнага склепа.

Аўтары гэтага своеасаблівага рэквіема – скульптар П. Яцына і архітэктар К. Міхайлаў.

На белай сцяне цёмны надпіс: «Памяці героям. 11 ліпеня 1812 года па ўсёй пазіцыі Фатава – Салтанаўка адбыўся бой рускага войска імператара Аляксандра I 7-га корпуса генераллейтэнанта Раеўскага з французскімі войскамі імператара Напалеона I пад кіраўніцтвам маршала Даву».

Некалькі разоў урываліся рускія салдаты ў в. Салтанаўка, знішчылі ў баях каля сямі тысяч варожых салдат. Пакуль корпус Раеўскага скоўваў сілы праціўніка каля Магілёва, 2-ая руская армія адышла за Дняпро і рушыла на Смаленск. 12 ліпеня пакінуў свае пазіцыі і корпус Раеўскага.



Мемарыяльная капліца на месцы бітвы ў Айчынную вайну 1812 г.

Раеўскі, Васільчыкаў, Паскевіч, Сіверс, Калюбакін — толькі найбольш вядомыя прозвішчы вышэйшага афіцэрскага саставу, што вызначыліся ў баях пад Салтанаўкай. А колькі невядомых, сціплых герояў склалі тут свае галовы!..

Вёсачка Фатава, праўда, з гадамі знікла. Але некаторыя мясцовыя жыхары, па расказах сваіх дзядоў і прадзедаў, сцвярджаюць, што размяшчалася яна на тым месцы, дзе вось ужо восем дзесяткаў гадоў стаіць капліца. Таму, напэўна, і мясцовасць гэту называюць па-старому — Фатаўкай. Няма і пастаялага двара ў Салтанаўцы, млына, плаціны, якія французы прыстасоўвалі пад абарончыя ўмацаванні. А вось Салтанаўка, Дашкаўка, Сялец, Буйнічы — месцы гістарычных падзей — усё тыя ж.

Лёс распарадзіўся так, каб у забалочаных тады мясцінах упершыню памерыліся сіламі дзве вялікія арміі геніяльных палкаводцаў: генерала Баграціёна і маршала Даву.

...На сценах каплічкі — спіс палкоў, адзначаных за мужнасць: Арлоўскі, Кіеўскі, Літоўскі, Смаленскі...

*В. Сакалоўская*

## Ардынарац Кутузава

У баях пад Дашкаўкай прымаў удзел «карнет Аляксандраў», гісторыя якога нагадвае легенду. Звязана яна з імем Надзеі Дуравай.

З дзяцінства лёс рыхтаваў яе да незвычайнай долі. Бацька Надзеі быў кавалерыйскім афіцэрам, і сям'я раздзяляла з ім вандроўнае жыццё. Надзея і нарадзілася ў адным з паходаў, нянькай яе быў дзяншчык Астахаў, першымі цацкамі — пісталет, шабля, а першай музыкай — ваенныя маршы і сігналы. Усё гэта вельмі ўражвала дзяўчынку. Бацька падтрымліваў воінскія схільнасці дачкі. Калі яна падрасла, вучыў ездзіць вярхом на кані, страляць з ружжа, карабіна, пісталета. У дзень яе нараджэння 17 верасня 1806 г. ён падараваў дачцэ казацкі мундзір. Надзея адрэзала касу, села на свайго любімага каня Алкіда і пайшла з горада з казацкім палком. На тэрыторыі Беларусі ўступіла юнкерам ва ўланскі полк. Дакументаў у Надзеі не было, і яна, выдаўшы сябе за юнака, які збег з бацькоўскага дому, назвалася Аляксандрам Васілевічам Сакаловым. Ёй выдалі мундзір, шаблю, дубовую піку, бялізну, эпалеты і высокую маліновую шапку з доўгім валасяным султанам.

У першы бой «юнкер Сакалоў» трапіў у Прусіі, пад горадам Гудштадтам. Гул артылерыі, посвіст карцечы спачатку ашаламілі дзяўчыну, але мужнасць і маладзецтва, перапаўняўшыя яе сэрца, перамаглі. Надзея прышпорыла свайго Алкіда і кінулася ў бой... Бітва ўжо падыходзіла да канца, калі яна заўважыла, што чатыры французы акружылі гусарскага афіцэра. Яму пагражала смерць. Ускінуўшы наперавес піку, «юнкер» з гікам паімчаўся на ворагаў. І тыя, кінуўшы параненага паручніка Паніна, адступілі...

Храбрасцю «Сакалова» захапляліся нават бывалыя служакі. Аднойчы пад каня «юнкера» ўпала ядро, але ён не разгубіўся, імгненна ўзняў свайго Алкіда на дыбкі і прымусіў зрабіць вялікі скачок уперад. І конь, і коннік апынуліся ў недасягальнасці ад месца выбуху.

За выратаванне паручніка Паніна «радавы Сакалоў» быў узнагароджаны салдацкім Георгіеўскім крыжам — вышэйшым знакам доблесці ў рускай ар-

міі, а за прускую кампанію — узведзены ў чын унтэр-афіцэра. Праз год Аляксандр І, даведаўшыся аб яго тайне, за ратныя подзвігі зрабіў «улана Сакалова» афіцэрам, загадаў узяць новае імя, сугучнае з царскім, і накіраваў у Марыупальскі гусарскі полк.

24 чэрвеня 1812 г. войскі Напалеона перайшлі Нёман. Афіцэру Аляксандраву ішоў у той час трыццаты год. «Ён» удзельнічаў у баях пад Мірам, Раманавым, Дашкаўкай, у коннай атацы пад Смаленскам... 6 верасня пачалася Барадзінская бітва. Некалькі разоў хадзіла Надзея ў атаку, пакуль шалёнае ядро не параніла яе. За Барадзінскую бітву Дурава атрымала чын паручніка. Раненне давала сябе адчуць, яна прыйшла да фельдмаршала Кутузава і папрасілася прыняць яе ў ардынарцы. Кутузаў ведаў яе тайну і прыняў да сябе на службу.

Пазней Дурава зноў вярнулася ў строй. У 1816 г. Надзея Дурава пайшла ў адстаўку ў чыне штаб-ротмістра, праслужыўшы дзесяць гадоў у конным страі.

У васьмідзесятых гадах мінулага стагоддзя былі знойдзены дакументы, і аказалася, што Надзея Дурава пакінула родны дом не юнай экзальтаванай асобай, а сталай дваццацітрохгадовай жанчынай.

Памёрла Н. А. Дурава ў Елабузе 21 сакавіка 1866 г. ва ўзросце 83 гадоў, пахавана з воінскімі ўшанаваннямі на гарадскіх Троіцкіх могілках.

*У. Сакалоўскі*

## З жыцця Магілёўскага павета напярэдадні рэформы 1861 г.

### З запіскі Магілёўскага губернскага прадвадзіцеля дваранства аб падзеях вайны 1812 г. у губерні.

**1837 г. студзеня 25**

...У час кровапралітнай бітвы, што адбылася пры в. Салтанаўка, быў узяты непрыяцелем г. Магілёў і навакольныя паветы. Напачатку бурны беспарадак быў жахам для кожнага на ўсёй прасторы гэтага краю, якая ўжо была занята непрыяцелем. Адбываліся розныя беспарадкі, а некаторыя маладушныя сяляне ўчынялі хваляванні супраць паноў (марадзёры ўсялялі ў іх такі дух), рабавалі, разаралі сядзібы, раскрадалі маёмасць. І, нарэшце, апошняя з'ява стала ў губерні агульнай, узрасла колькасць марадзёраў, а прага да нажывы амаль не стрымлівалася ваеннымі ўладамі.

Ахвяравання на карысць непрыяцеля добраахвотна ад Магілёўскай губерні не было. Дастаўка ж айчынных прыпасаў для непрыяцельскага войска прымушалася ваеннаю сілаю па квітанцыі і без яе.

...Страты народанасельніцтва вылічваліся прыкладна паветамі: Магілёўскім, Сенненскім, Чэрыкаўскім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Бабінавіцкім, Копыскім і Мсціслаўскім. Гэта відаць з таго, што па рэвізіі 1811 г. памешчыцкіх і духоўных сялян было па губерні: мужчынскага полу — 359 946 душ, а па рэвізіі 1816 г. засталося 287 149 душ. Значыць, страты ў адным ніжэйшым класе людзей памешчыцкіх склалі 72 797 душ. Але аб змяншэнні колькасці дамоў па даўнасці часу сказаць нельга.

...Пасля бітвы пры в. Салтанаўка, як сцвярджалі тады чуткі, забітых і параненых французаў было 5000 чалавек.

*Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 51.*

## Данясенне Магілёўскага віцэ-губернатара генерал-губернатару Віцебскаму, Магілёўскаму і Смаленскаму аб жорсткім абыходжанні ўпраўляючага маёнткам Палыкавічы гр. Любамірскага Віскоўскага да сялян

**1847 г. студзеня 18**

Пры разглядзе прадстаўленай грамадзянскаму губернатару Магілёўскаму крымінальнаю палатаю справы аб тапельцы, закаваным па распараджэнню экономіі ў кайданы, селяніне памешчыка Любамірскага маёнтка Палыкавічы Гансе Касьміне, па заўважаных мною ў справе недахопах я пісаў 31 снежня 1846 г. працуючаму пры канцылярыі пана начальніка губерні губернскаму сакратару Палькоўскаму: дапоўніць гэту справу, адкрыць прычыну самагубства Касьміна, а таксама звярнуць увагу на кіраванне сялянамі ўпраўляючага Віскоўскага.

1) На гэта чыноўнік палыкавіцкі мне адказаў, што ў маёнтку Палыкавічы з даўніх часоў прынята закоўваць сялян за розныя ўчынкі ў кайданы, якіх тут знойдзена 5 пар.

2) Акрамя патануўшага Касьміна, яшчэ два чалавекі гэтага маёнтка ўцяклі з-пад арышту ў кайданах і невядома дзе падзеліся.

3) Многія прыклады рашучасці сялян і частыя іх уцёкі з маёнтка даюць падставу думаць аб жорсткім абыходжанні з сялянамі ўпраўляючага Віскоўскага.

Па важнасці адкрываючыхся абставін у гэтай справе я даручыў яе расследаванне Магілёўскаму казённых спраў страпчаму пры штабе афіцэру Корпуса жандараў, прадпісаўшы следчаму ахоўваць асобу Віскоўскага да заканчэння гэтай справы паліцэйскім наглядам. Гэты маёнтак аддаць у загадванне паліцыі, каб папярэдзіць растраты.

Аб гэтым маю гонар данесці в. с. і дадаю, што пазней я даведаю да Вашага ведама.

Віцэ-губернатар (подпіс неразборлівы)

*НГАБ, ф. 1297, воп. 1, спр. 15714, л. 16—17.*

## Са справаздачы Магілёўскага губернатара за 1847 г. аб стане сельскай гаспадаркі губерні

**1848 г. сакавіка 23**

Становішча сялян Магілёўскай губерні адносна іх сельскай гаспадаркі знаходзіцца ў тым жа бядотным стане, аб якім я паведамляў у справаздачы за 1846 г. Быт іх не палепшыцца, пакуль не будзе пастаяннага клопату аб іх духоўнасці шляхам выкаранення залішняга ўжывання віна. Яно пры недахопе жыццёвых патрэб ад частых неўраджаяў і заняпаду гандлю пазбаўляе іх апошняй магчымасці наладзіць свой дабрабыт.

Бульба ў губерні разводзіцца ў значнай колькасці. Яна служыць добрым падспор'ем селяніну ў харчаванні сям'і. А ва ўраджайныя гады з яе робяць віно. Але ў мінулым, 1847 г., бульба гніла яшчэ пры ўборцы... З прыкладзенай ведамасці пад № 19 аб колькасці рагатай жывёлы відаць, што ў губерні больш клапоцяцца аб развядзенні яе, чым іншых парод. Між іншым, рагатая жывёла дробная.

З ведамасці аб пасевах і ўраджаі відаць, што ў памешчыкаў ураджай хлеба ў агульным вышэйшы, чым у сялян. У мінулым годзе ўраджай хлеба быў у губерні невялікі. За вылікам насення на душу прыходзіцца па 1 чвэрці 5 чацверыкоў і 1/2 гарца, з чаго відаць, што хлеба ў губерні дастаткова толькі на патрэбы жыхароў.

### Аб развіцці промыслаў у павеце на 1847 г.

Жыхары Магілёўскай губ. займаюцца пераважна хлебаробствам, і толькі нямногія прамышляюць мяснымі вырабамі. У паветах Магілёўскім, Палыкавіцкім, Чэрыкаўскім, Быхаўскім апрацоўваюцца скуры і гліняны посуд, які ўжываецца ў побыце простага народа. Памешчыцкія сяляне прыбярэжных паселішчаў адпраўляюцца на плытах-барках, а тыя, што жывуць паблізу гарадоў, прывозяць у іх на продаж дровы.

Выгады ад гэтай прамысловасці маглі б умацоўваць іх становішча, аднак выручаныя грошы расходуюцца толькі на закуп віна.

У Магілёўскім павеце, у фальварку Аўгустова працуе цукровы завод; у в. Гута — шкляны. Тавару выпускаецца адпаведна на 5060 і 1050 руб. Збываецца тавар у губерні.

*НГАБ, ф. 1828, воп. 4, спр. 55, л. 39—42, 111—112*

## Аб жыхарах павета

На 1859 год колькасць жыхароў Магілёўскага павета складала:

| | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|
| Дваран патомных: | 997 | 992 |
| асабістых | 553 | 571 |
| Духавенства белага | 258 | 299 |
| манахаў | — | 31 |
| Купцоў | 281 | 249 |
| Мяшчан і цэхавых | 6341 | 7458 |
| Аднадворцаў | 203 | 191 |
| Сялян дзяржаўных | 2584 | 2651 |
| Яўрэяў-земляробаў | 919 | 909 |
| Царкоўных сялян | 8 | 14 |
| Памешчыцкіх сялян | 20 504 | 22 327 |
| Дваровых | 467 | 549 |
| Замежных падданых | 2 | 1 |
| Веравызнанне: | | |
| Праваслаўных | 24 243 | 25 865 |
| Раскольнікаў | 49 | 41 |
| Рымска-каталіцкага | 2803 | 2951 |
| Яўрэйскага | 6651 | 7789 |

Колькасць цэркваў:
Каменных — 10; драўляных — 51; манастыроў драўляных — 1; часоўняў — 2; капліц — 9; сінагог — 3.

*Губернатар* Магілёва — *сапраўдны стацкі саветнік* Аляксандр Пятровіч **Бяклемішаў**.
*Павятовы прадвадзіцель дваранства* — Эдуард Іванавіч **Жукоўскі**.
*Павятовая павівальная бабка* — Дарья Фёдараўна **Станішэўская**.
*Наглядчыкі паштовых станцый:* Фойнаўскай — калежскі рэгістратар Іван Ягоравіч **Кукішаў**;
Лакуцянскай — *Васіль Анісімавіч* **Анісімаў**; Вільчыцкай — Фама Данілавіч **Чарняўскі**;
Дасовіцкай — Адам Рыгоравіч **Бабіцкі**; Сялецкай — Іван Ісаевіч **Хрыпіч**.

*Памятная книжка Могилевской губернии. Могилев, 1861. С. 4, 14, 83; 30.*

*А. Пускоў*

**З пісьма магілёўскага губернатара таварышу міністра ўнутраных спраў Н. А. Мілюціну.**

**1860 г. лістапада 4**

Ожидание скорого рассмотрения крестьянского вопроса волнует в настоящее время все умы. ...Крестьяне так долго ждут, надежды их увеличились в таких размерах, что... во многих местностях общественное спокойствие висит на волоске...

*ЦДГА РФ, ф. 109, сакр. арх., воп. 3, 1860 г., спр. 1923, л. 7—10.*

## Выступленне сялян в. Алень

Рэформа 1861 г., якая адмяніла прыгоннае права, паклала пачатак новай сацыяльна-эканамічнай фармацыі — капіталізму. Сама рэформа была падобна на грабёж. У Магілёўскім павеце, напрыклад, памешчыкі атрымлівалі права адразаць сялянскія землі. За зямлю наогул сяляне павінны былі плаціць вялікія выкупныя, у выніку чаго кошт надзела быў намнога больш кошту на выкуп. І зусім натуральна, што такое вырашэнне зямельнага пытання было адмоўна ўспрынята сялянамі. Забяспечанасць зямлёй заставалася нізкай, і па меры росту сялянскага насельніцтва змяншаліся памеры іх надзелаў. Так, у Магілёўскай губерні сярэдні надзел на душу мужчынскага полу скараціўся з 1860 па 1900 г. з 4,8 дзес. да 1,9 дзес. г. зн. у 2,5 раза.

Прагрэсіруючае малазямелле прымушала сялян да самавольнага захопу панскай ворнай зямлі. Такое парушэнне закону шырока распаўсюджвалася на Магілёўшчыне. Аб гэтым сведчыць і данясенне Магілёўскага губернатара Дамбавецкага ў МУС ад 25 чэрвеня 1881 г. У ім гаварылася, што апошнім часам «почти по всем уездам Могилёвской губернии возникают дела по захватам местным крестьянским населением земель и лесов, принадлежащих соседним владельцам». У справаздачы цару за 1882 г. губернатар адзначаў, што захопы грунтуюцца «исключительно на физической силе целого крестьянского общества».

Прыкладам такой барацьбы з'яўляецца выступленне сялян в. Алень, якая адносілася тады да Быхаўскага павета, а цяпер Магілёўскага раёна (Семукацкі сельсавет). На працягу некалькіх гадоў яны вялі ўпартую спрэчку з уладальнікам суседняга маёнтка купцом Прасольным. Сяляне патрабавалі вярнуць ім усе землі, якія знаходзіліся ў іх карыстанні да адмены прыгоннага права. З такім патрабаваннем яны звярталіся ў розныя інстанцыі, аж да міністра ўнутраных спраў і цара. Аднак усе скаргі сялян былі безвыніковымі. Не дачакаўшыся дапамогі ад уладаў, аленцы перайшлі да захопу і самавольнага карыстання спрэчнай зямлёй (1880, 1881, 1882 гг.).

З гэтай нагоды памешчык пісаў губернатару, што сяляне не даюць яму «пользоваться своею собственностью, опустошают лес, травят поля, пасут свой скот и вообще употребляют для этой цели всевозможные противозаконные и даже насильственные действия: производят поджог сена, разбрасывают сжатую рожь и угрожают даже смертью тому, кто осмелится обрабатывать или же убирать что-либо из означенной земли».

15 чэрвеня 1882 г. у вёску прыбыў губернатар і патрабаваў ад сялян спыніць свавольныя дзеянні. У адказ яны заявілі, што будуць працягваць і араць, і касіць, і секчы. 16 чэрвеня на дапамогу мясцовым уладам для падаўлення хвалявання прыбылі дзве пяхотныя роты. 14 жніўня быў сабраны сельскі сход,

на якім сяляне выказалі гатоўнасць выканаць распараджэнні ўладаў. Але праз некалькі дзён з раскватараваных у Алені вайскоўцаў уцёк радавы Зічык родам з суседняй вёскі Цвёрдая і стаў агітаваць аленцаў не ўступаць націску ўладаў да яго вяртання з Пецярбурга, куды паехаў хадайнічаць за іх. Пасля гэтага, як паведамлялася ў запісцы дэпартамента паліцыі, сяляне «во избежание принуждения их к исполнению постановления общественного приговора удалились в соседние леса, где и скрываются, ожидая возвращения названного нижнего чина». Толькі ў кастрычніку частка сялян спыніла барацьбу і стала выконваць патрабаванні ўладаў. Астатнія яшчэ супраціўляліся. У адказ губернатар распарадзіўся паставіць адну роту на поўнае ўтрыманне гэтых сялян, што прымусіла іх урэшце рэшт пакарыцца..

*Магілёўшчына. Магілёў, 1991. С. 40.*

*В. Крук*

## Магілёўскі павет канца 19 стагоддзя

Па справаздачах, на 1890 г. насельніцтва дзялілася па саслоў'ях на дваран і сялян. Першых было 11 167 чал. (1053 мужчыны, 1114 жанчын); другіх — 73 036 чал. (3593 мужчыны, 37 115 жанчын).

Жылых пабудоў было 11 093. З іх 17 каменных; 11 076 драўляных.

Язда ў горадзе каштавала: такса легкавых рамізнікаў — 30 кап. (вясной, восенню — 40); параконных — 45 кап. (вясной, восенню — 60).

*Памятная книжка Могилевской губернии. Могилев, 1890. С. 64, 76.*

У Магілёўскім павеце мелася 12 валасцей: Чарнаруцкая, Круглянская, Шклоўская, Таўпечыцкая, Вендаражская, Палыкавіцкая, Бялыніцкая, Княжыцкая, Нежкаўская, Царковіцкая, Паўлавіцкая, Цяцерынская.

У 1-ую благачынную акругу ўваходзілі прыходскія цэрквы: Высоцкая, Друцкая, Дудкавіцкая, Круглянская, Стара-Шклоўская, Чорная, Чарнаруцкая, Шклоўская, Васкрасенская, Прабражэнская, Троіцкая.

У 2-ую: Барсукоўская, Бракаўская, Вендаржская, Вяйнянская, Галоўчынская, Княжыцкая, Лазіцкая, Нежкаўская, Троіцкая, Батунская, Буйніцкая, Вадвянская.

У 3-юю: дзве Бялыніцкія, Ількавіцкая, Курганская, Кудзінская, Паўлавіцкая, Цяцерынская, Царкавішчанская, Шапялевіцкая, Шупенская.

Дзейнічалі лячэбніцы: Бялыніцкая, Чарнаруцкая, а таксама навучальныя ўстановы — падведамасныя. Дырэкцыі народных вучылішчаў: у Княжыцах — 1; Палыкавічах — 1, Вендаражы — 1; Галянах — 1.

*Памятная книжка Могилевской губернии. Могилев, 1898. С. 232, 263.*

## Аб сельскагаспадарчай выстаўцы

У 1896 г. у Магілёве адбылася выстаўка-агляд сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай прадукцыі.

З мэтай больш блізкага азнаямлення з вытворчасцю розных галін прамысловасці Магілёўскае таварыства сельскай гаспадаркі прызнала своечасовым арганізаваць выставу. Прадукцыю прадставілі: селянін Абрамаў, Паўлавіцкая воласць; Арцямонаў

Дзяніс, Палыкавіцкая воласць; Андэрсон Эдуард, паштовая станцыя «Любуж»; агародніца Бісаставіцкая Марыя, маёнтак Дашкаўка; садоўнік Бялеўскі Леў, паштовая станцыя «Любуж».

## Народная адукацыя сто гадоў таму...

У 1841 г. у павеце зусім не было ні гімназій, ні нават царкоўнапрыходскіх вучылішчаў. Існаваў адзіны «институт благородных девиц», дзе абучалі добрым манерам і замежнай мове 65 дваранскіх дачок.

Праз трыццаць гадоў, у 1871 г., у павеце ўжо было 139 пачатковых царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы, якімі кіравалі царкоўныя ўлады. Міністэрству асветы ў Магілёўскім павеце належала 12 народных вучылішчаў. З 11 795 дзяцей школьнага ўзросту вучыліся толькі 2789 хлопчыкаў і 442 дзяўчынкі.

Царкоўнапрыходскія школы працавалі па аблегчанай праграме. Вучылі чытаць, пісаць, арыфметыцы. Пераважная частка часу адводзілася на вывучэнне «Закона Божага», «Псалтыра» і малітваў. У школах не хапала вучэбных дапаможнікаў, пісьмовых прылад. Узровень кваліфікацыі настаўнікаў быў невысокі. У шэрагу школ настаўнікамі былі простыя сяляне, якія самі ледзь навучыліся грамаце, былыя унтэр-афіцэры, салдаты, духавенства. Так, напрыклад, у школах граматы ў Палыкавічах, Мастку, Пашкаве, Мікалаеўцы заняткі праводзілі сяляне Ілья Кузьмянкоў, Феадосій Волкаў, Захар Кайташкоў, Даніла Паўлаў. За ўвесь тэрмін навучання дзяцей яны атрымлівалі крыху больш як 20 рублёў платы. Сяляне былі настаўнікамі таксама ў Галынцы, Салтанаўцы, Жураўцы, Вільчыцах, Навасёлках, Сідаровічах і Алені.

У прыходскай школе в. Буйнічы заняткі праводзіў дзяк мясцовай царквы, у Слабодцы — сын дзяка, у Вейне і Вендаражы — мясцовае духавенства.

Сяляне в. Ямніца даверылі навучанне сваіх дзяцей адстаўному унтэрафіцэру Васілю Дашкевічу, які перадаваў дзецям тое, чаму сам навучыўся ў палкавой школе.

Па дадзеных Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта за 1908 г., у Палыкавіцкай воласці на 1751 двор было дзевяць вучылішчаў міністэрства народнай асветы і царкоўнапрыходскіх школ. Аднак навучанне ў іх з-за неабходнасці працаваць сялянскія дзеці поўнасцю заканчвалі ў рэдкім выпадку. У адзін з неўраджайных гадоў з Палыкавіч пайшлі на лесараспрацоўкі 180 мужчын і 380 дзяцей.

У 88 населеных пунктах, што ўваходзілі ў склад Вендаражскай воласці, было толькі 6 царкоўнапрыходскіх і ніжэйшых народных школ. На 2000 жыхароў — адна школа.

У Княжыцкай воласці на 57 населеных пунктаў было 4 школы граматы, 8 царкоўнапрыходскіх школ і сельскіх вучылішчаў. Яны размяшчаліся ў Княжыцах, Забалоцці, Навасёлках, Ільінцы, Бракаве, Шчэгліцы, Савасцянавічах і Прысне. Народнае вучылішча было адкрыта ў Княжыцах у 1864 г. Памяшчалася яно ў грамадскім доме. На ўтрыманне вучылішча штогод адпускалася 175 руб. з дзяржаўнага казначэйства. Настаўнік вучылішча і законанастаўнік праваслаўнага веравызнання — свяшчэннік Канстанцін Фёдаравіч Савініч, які закончыў курс у Магілёўскай духоўнай семінарыі, атрымоўваў жалаванне

160 руб. За сваё старанне протаіерэй Княжыцкай царквы Канстанцін Савініч за 1888/89 навучальны год быў узнагароджаны залатым наперсным крыжам з каштоўнымі ўпрыгажэннямі з кабінета Яго Вялікасці.

*Памятная кніжка Віленскай навучальнай акругі. Вільна, 1874. С. 562.*

**Справаздача Магілёўскага Епархіяльнага Савета вучылішчаў аб царкоўнапрыходскіх школах і школах граматы Магілёўскай епархіі за 1887/88 навучальны год**

У справаздачным годзе Савет меў у сваім распараджэнні значна большыя сродкі ў параўнанні з тымі, якія былі ў мінулым годзе. У школы былі назначаны Саветам і зацверджаны Яго Праасвяшчэнствам настаўнікі ці настаўніцы з асоб, якія па сваёй адукацыі маюць права на званне пачатковага настаўніка або закончылі курсы навучання ў Магілёўскай духоўнай семінарыі, у буйніцкім жаночым духоўнага ведамства вучылішчы, у жаночых гімназіях, або тыя, хто набыў гэта права шляхам здачы ўстаноўленага на тое экзамену.

Умацоўваючы школы епархіі, Савет не мог не звярнуць належнай увагі на падрыхтоўку для школ дастатковай колькасці вопытных настаўнікаў. Яго ўвага ў гэтых адносінах была звернута перш за ўсё на жаночае вучылішча духоўнага ведамства, якое знаходзіцца пад Аўгусцейшай апекай Гасударыні Імператрыцы. Вучылішча гэта знаходзіцца пры Буйніцкім жаночым манастыры і мае магчымасці пастаўляць галоўны кантынгент настаўніц для царкоўнапрыходскіх школ епархіі. Каб выхавальніцы гэтага вучылішча маглі добра падрыхтавацца да настаўніцтва, журнальным вызначэннем Савета ад 1 сакавіка было вырашана адкрыць пры вучылішчы ўзорную царкоўнапрыходскую школу па падабенству тых, што існуюць пры духоўных семінарыях.

Для школы было нанята зручнае памяшканне ў доме адной манахіні, зроблена школьная мэбля, набыты ў дастатковай колькасці падручнікі. Заняткі ў гэтай школе пачаліся 15 сакавіка пасля правядзення ў ёй малення. У школу прыйшлі 25 дзяўчынак і часткова хлопчыкаў, але было прынята з іх 15 (12 дзяўчынак і 3 хлопчыкі). У школу прымаліся дзеці, якія ўжо могуць чытаць. Настаўніцай у школу дапушчана Марыя Бяляцкая, якая закончыла курсы ў Буйніцкім жаночым вучылішчы. Жалаванне яе — 100 руб. у год пры гатовай кватэры і стале. Законанастаўнікамі ў школу назначаны свяшчэннік Іаан Кніжнікаў і свяшчэннік Буйніцкай манастырскай царквы Уладзімір Мігай.

*Могилевские епархиальные ведомости. № 9, 21.03.1888.*

## Буйніцкі прытулак для сірот-дзяўчынак духоўнага звання

Яшчэ ў 1835 г. пры Буйніцкім жаночым манастыры ў бытнасць на Магілёўскай кафедры Высокапраасвяшчэннейшага Гаўрыіла (кіраваў магілёўскай паствою у 1831—1837 гг.) і па яго задуме быў пакладзены пачатак догляду дзяўчат-сірот магілёўскай епархіі, хоць тагачасны прытулак да 1846 г. не меў належнай арганізацыі і нават асобнага будынка. Атрымалі будынак дзякуючы клопатам Высокапраасвяшчэннейшага Анатоля (кіраваў магілёўскай паствою ў 1844—1860 гг.), калі прытулак быў пераўтвораны ў вучылішча па ўзору царскасельскага.

Жаночае вучылішча духоўнага ведамства знаходзілася ў Буйніцкім манастыры да пачатку 1892/93 навучальнага года. Але калі ўжо заканчвалася будаўніцтва новага будынка для гэтага вучылішча ў Магілёве, вырашылі скарыстаць ранейшы будынак і зноў адкрыць пры Буйніцкім манастыры прытулак для дзяўчат-сірот духоўнага звання магілёўскай епархіі.

Мэта заключалася ў тым, каб дзяўчат, якія не мелі бацькоў, навучыць карысным у жыцці жаночым работам, даць ім пачатковую адукацыю і па магчымасці падрыхтаваць да паступлення ў жаночае духоўнае вучылішча.

У верасні 1892 г. клопатамі настаяцельніцы манастыра — ігумені Марыі прытулак быў арганізаваны. У ім павінны былі жыць 20 дзяўчынак. Прынялі 23 дзяўчынкі ад 8 да 14 гадоў. Для іх навучання і выхавання былі запрошаны манастырскі святар Філарэт і настаўніца Антаніна Сушчынская, якая закончыла жаночае вучылішча духоўнага ведамства. Школьныя заняткі вяліся ў праграме аднакласнай царкоўнапрыходскай школы. Выхаванне вялося ў духу дабрачыннасці і царкоўнасці. У гэтых адносінах імі кіравала, акрамя самой ігумені, вопытная манашка. Закон Божы выкладаў свяшчэннік, астатнія прадметы — настаўніца. Быў арганізаваны хор, які спяваў у манастырскай царкве. Прытулак даваў сіротам дамашняе цяпло, тэарэтычныя веды і вучыў дзяцей дабру.

*Могилевские епархильные ведомости.*
*№ 17, 1893.*

## Буйніцкі жаночы манастыр

Пабудаваны ў 1633 г. на зямлі, дадзенай фундушам ад Багдана Вільгельмавіча Статкевіча і жонкі яго Алены Саламарэцкай. Размешчаны за 5 вёрст ад губернскага горада Магілёва, паблізу вялікай шасейнай Быхаўскай дарогі, недалёка ад ракі Дняпро. З жыхарамі 100 чалавек, якія жадаюць манаскага адасобленага жыцця.

Знешні выгляд манастыра не прываблівае. Не агароджаны, хоць у ім ёсць каменныя і драўляныя будынкі. Адна каменная царква халодная. Трохпрастольная стаіць асобна і патрабуе рамонту.

Другая каменная царква невялікая і злучана з драўляным флігелем, які быў знішчаны пажарам у 1895 г. Замест згарэўшага цёплага храма абсталявана ў драўляным памяшканні былога жаночага вучылішча часовая царква.

У манастыры здаўна існаваў прыют для дзяўчат духоўнага звання, пазней пераўтвораны ў 6-класнае вучылішча, перанесенае ў Магілёў. У манастыры тры з лішнім гады існаваў завод для вырабу васковых свечак.

Зямля манастыра — 319 дзесяцін. Там ёсць паляводства, агародніцтва, жывёлагадоўля. Настаяцельніца манастыра ігуменя Марыя — дачка прыдворнага саветніка; 15 манашак, з іх: 7 грамадзянак, 3 дваранкі, духоўнага звання — 1, мяшчанак — 1, сялянак — 3. Сярод іх 14 з дамашняй адукацыяй і 1 непісьменная; 69 паслушніц, з іх: духоўнага звання — 4, ваеннага саслоўя — 5, мяшчанак — 5, чыноўніцкага звання — 3, сялянак — 52. Сярод іх закончылі вучылішча — 2, з дамашняй адукацыяй — 64, непісьменных — 3.

Ёсць прыслуга з чорнарабочым па найму — 15 мужчын і 2 жанчыны.

*Могилевские епархиальные ведомости.*
*№ 13, 1898.*

### Высачэйшая грамата
### Праасвяшчэннаму Сергію, Епіскапу Магілёўскаму і Мсціслаўскаму

Як знак увагі да стараннага і клапатлівага служэння Вашага, а таксама і да асобых стараннаяў па добраўпарадкаванню царкоўнапрыходскіх школ у даверанай Вам епархіі міласціва далучылі мы Вас да імператарскага ордэна Святога Роўнаапостальнага

князя Уладзіміра другой ступені, і знакі, да яго прыкладзеныя, загадваем Вам ускласці на сябе і насіць, як належыць.

З усёй імператарскай прыхільнасцю да Вас.

На арыгінале ўласнаю Яго Імператарскай Вялікасці рукою напісана:

«Аляксандр»
1 красавіка 1890 года.
*Могилевские епархиальные ведомости. № 10, 11.04.1890.*

## Са справаздачы магілёўскага губернатара за 1889 г. аб разарэнні часткі памешчыцкіх маёнткаў

В значительной части помещичьих имений задолженность увеличивается, леса продаются, запашки уменьшаются, поля обращаются в залежи или отдаются с доли. Эти имения... близятся к падению, после чего они должны перейти в руки крестьян или в руки землевладельцев... ведущих хозяйство аккуратно... с улучшенным полеводством и... орудиями обработки.

*ЦДГА РФ, ф. 1284, воп. 223, 1890 г., спр. 203, л. 18.*

*Падрыхтаваў да друку У. Агурцоў*

## Са справаздачы магілёўскага губернатара Мікалаю II аб становішчы сялян і перасяленчым руху ў губерні

**1897, верасня 24**

Корень переселенческого движения — в условиях быта крестьянского населения Могилевской губернии: отсутствие отхожих промыслов, которые давали бы части населения постоянный правильный заработок; нахождение большей площади земли в руках частных владельцев; все более и более растущий класс вовсе безземельных крестьян. Необеспеченность части крестьян земледельческим трудом восполнялась заработками по рубке, сплаву леса, но при постепенном истреблении лесов этот заработок сокращается значительно. Потеря не вознаграждается увеличением заработка от полевых работ у частных землевладельцев, ибо цены на сельскохозяйственную продукцию в большей части губернии из-за отсутствия удобных путей для сбыта на таком низком уровне, что едва разве лишь вознаграждают издержки производства.

*Гісторыя Беларускай ССР.*
*Мн., 1972. Т. 2. С. 134—140.*

## Аб фабрыках і заводах павета (1899 г.)

| | Колькасць фабрык | Колькасць рабочых | Кошт прадукцыі (руб.) |
|---|---|---|---|
| Кардонная фабрыка | 1 | 21 | 10500 |
| Ткацкая | 2 | 6 | 565 |
| Вінакурныя | 10 | 86 | 54838 |
| Па вырабу шроту | 1 | 1 | 900 |
| Па вырабу драўлянага начыння | 1 | 4 | 1600 |
| Ганчарныя | 1 | 3 | 225 |
| Клеяварныя | 1 | 3 | 235 |

| | Колькасць фабрык | Колькасць рабочых | Кошт прадукцыі (руб.) |
|---|---|---|---|
| Крупадзёрныя | 4 | 7 | 649 |
| Крухмальна-патачныя | 7 | 9 | 9200 |
| Цагляныя | 5 | 38 | 5900 |
| Маслабойныя | 1 | 12 | 7900 |
| Паравы і вадзяны млыны | 9 | 41 | 36850 |
| Свечачныя | 2 | 21 | 9583 |
| Шкіпінарна-дзягцярныя | 1 | 2 | 900 |
| Эфірна-алейны | 1 | 1 | 240 |

*Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1900—1917). Мн., 1953. Т. 3. С. 28*

# На пачатку 20 стагоддзя

## Параўнальны агляд развіцця Магілёўскага павета за 1895 і 1901 гг.

**Колькасць дзесяцін зямлі, занятай пад пасевамі і сенакосамі** (Ведамасці № 2-2)

| Чым занята зямля | 1895 г. | 1901 г. |
|---|---|---|
| Азімая пшаніца | 575 | 161 |
| Жыта | 30598 | 31217 |
| Авёс | 13535 | 16408 |
| Ячмень | 6948 | 6093 |
| Грэчка | 3387 | 2586 |
| Каноплі | 744 | 680 |
| Лён | 1139 | 1342 |
| Астатнія, яравыя хлябы | 2315 | 2922 |
| Бульба | 5237 | 6779 |
| Сенакосы | 20847 | 24185 |

**Размеркаванне прыватнага землекарыстання** (Ведамасці № 3-3)

| | | |
|---|---|---|
| Дваране: колькасць уладальнікаў | 267 | 366 |
| колькасць дзесяцін зямлі | 106657 | 97546 |
| Мяшчане: колькасць уладальнікаў | 384 | 460 |
| колькасць дзесяцін зямлі | 6468 | 6337 |
| Купцы і ганаровыя грамадзяне: | | |
| колькасць уладальнікаў | 17 | 31 |
| колькасць дзесяцін зямлі | 550 | 1007 |
| Сяляне: колькасць уладальнікаў | 531 | 759 |
| колькасць дзесяцін зямлі | 49562 | 13306 |

| | 1895 | 1901 |
|---|---|---|
| У тым ліку: | | |
| сельскіх абшчын | 55 | 87 |
| таварыстваў | 90 | 113 |
| асобных сялян | 386 | — |
| Іншыя саслоўі | | |
| колькасць уладальнікаў | 81 | 114 |
| колькасць дзесяцін зямлі | 7766 | 10250 |

**Колькасць жывёлы** (Ведамасці № 7-6)

| | | |
|---|---|---|
| Коней | 29694 | 32341 |
| Рагатай жывёлы | 33857 | 39201 |
| Авечак простых | 28970 | 34898 |
| танкарунных | 17 | — |
| Свіней | 32039 | 30791 |
| Коз | 4636 | 2051 |
| Усяго: | 129213 | 139282 |

**Колькасць магазінаў** (Ведамасці № 11—10)

| | | |
|---|---|---|
| Колькасць цэнтральных магазінаў | 5 | 5 |
| для сельскіх таварыстваў | 156 | 156 |
| Колькасць душ, прыпісаных да магазінаў | 19360 | 19360 |

**Аб фабрыках, заводах і іншых прамысловых аб'ектах на 1901 г.** (Ведамасць № 11)

| Прадпрыемствы | Колькасць прадпрыемстваў | Колькасць рабочых | Кошт вытворчасці (руб.) |
|---|---|---|---|
| Вінакурныя | 10 | 78 | 89554 |
| Булачныя і хлебныя | 10 | 19 | 5420 |
| Перапрацоўчыя (фруктовыя воды і ліманад) | 2 | 4 | 1150 |
| Ганчарныя | 1 | 3 | 790 |
| Кардонныя | 1 | 95 | 120000 |
| Цагельныя і чарапічныя | 9 | 99 | 9855 |
| Клеяварныя | 1 | 3 | 600 |
| Цукеркавыя і пернікавыя | 1 | 4 | 245 |
| Крухмальныя | 3 | 33 | 31314 |
| Крупадзёрныя | 8 | 11 | 2690 |
| Маслабойныя | 1 | 18 | 97775 |
| Млыны паравыя | 7 | 32 | 85185 |
| вадзяныя | 46 | 71 | 26646 |
| ветраныя | 24 | 24 | 2565 |

| Прадпрыемствы | Колькасць прадпрыемстваў | Колькасць рабочых | Кошт вытворчасці (руб.) |
|---|---|---|---|
| Рэктыфікацыйныя | 1 | 7 | 30550 |
| Свечачныя | 1 | 15 | 84230 |
| Свечачна-мылаварныя | 2 | 4 | 6443 |
| Смаляна-шкіпінарна-дзягцярныя | 3 | 11 | 5391 |
| Сукнавальні | 8 | 8 | 269 |
| Ткацкія | 3 | 9 | 850 |
| Шчацінасартавальныя | 1 | 12 | 950 |
| Усяго: | 143 | 560 | 602472 |

**Аб колькасці яўрэйскага насельніцтва на 1901 г.** (Ведамасць № 17)

| | | |
|---|---|---|
| У гарадах: | мужчын | 12372 |
| | жанчын | 12817 |
| У мястэчках: | мужчын | 4651 |
| | жанчын | 5133 |
| У калоніях: | мужчын | 542 |
| | жанчын | 518 |
| У сёлах: | мужчын | 1360 |
| | жанчын | 1223 |

Усяго ў павеце на 1901 г. пражывала 38 616 яўрэяў,

у тым ліку мужчын 18 925, жанчын 19 691.

*Памятная книжка Могилевской губернии. Могилев, 1902. С. 68—69, 81—84, 102.*

**Аб медыцынскай дапамозе**

| | 1895 г. | 1901 г. |
|---|---|---|
| Колькасць урачоў | | |
| служачых | 2 | 2 |
| вольнапрактыкуючых | 2 | 3 |
| зубных | — | 1 |
| Фельчараў сельскіх: | | |
| штатных | 9 | 9 |
| нанятых сельскімі і іншымі таварыствамі | 3 | 3 |
| ветэрынарных | 1 | — |
| вольнапрактыкуючых | 8 | 10 |
| Павівальных бабак сельскіх | 3 | 3 |
| вольнапрактыкуючых | 3 | 4 |

| | 1895 г. | 1901 г. |
|---|---|---|
| Аптэк: вольных-нармальных і філіяльных | 2 | 2 |
| Сельскіх па правілах 1881 г. | 1 | 1 |
| Аптэчных лавак | 3 | 5 |
| Правізараў | 2 | 2 |
| Аптэкарскіх памочнікаў | 2 | 2 |
| Аптэкарскіх вучняў | — | 2 |
| Цырульнікаў | 4 | 4 |

**Аб колькасці лячэбных установ і хворых у іх (Ведамасць № 41)**

| | | |
|---|---|---|
| Лячэбніцы. Колькасць установ | 2 | 2 |
| хворых | 257 | 172 |
| памерла | 19 | 14 |
| Прыёмныя пакоі | 4 | 4 |
| Амбулаторнае абслугоўванне на доме: | | |
| сельскага насельніцтва | 34449 | 48090 |
| іншых асоб | 15 | — |

**Аб дамах грамадскага прытулку (Ведамасць № 44)**

| | | |
|---|---|---|
| Багадзельня з аддзяленнем для інвалідаў у Пячэрску, якая знаходзілася ў веданні Прыказа грамадскага прытулку (колькасць жыхароў) | 185 | 174 |
| Кошт утрымання (руб.) | 10059 | 7778 |

Багадзельні пры валасных праўленнях: Вендаражская, Круглянская, Паўлавіцкая, Цяцерская, Нежкаўская, Чарнаруцкая.

*Памятная книжка Могилевской губернии. Могилев, 1902. С. 85.*

## Першыя баі за свае правы

У наваколлі Магілёва сярод сялян і сельскіх рабочых у 1905—1907 гг. дзейнічала Магілёўская група РСДРП. Аб яе рабоце можна меркаваць па забастоўцы ў маёнтку пана Сенажэцкага ў в. Вейна. Перад рабочымі выступіў агітатар, які сваю прамову закончыў заклікам «Далоў цара!». Вечарам адбылася сходка, на якой былі выпрацаваны патрабаванні да памешчыка. Рабочыя дабіліся поўнай перамогі: ім павысілі заработную плату, палепшылі харчаванне і скарацілі рабочы дзень.

*А. Пускоў*

## Аб хваляваннях у в. Вейна

...9 ліпеня 1905 г. у адну з прыгарадных каля Магілёва эканомій Вейна памешчыка Сенажэцкага прыйшлі нейкія трое, відаць, студэнты... Яны падгаварылі некаторых рабочых, з імі адправіліся ў поле і пачалі зганяць там з работ тых рабочых, якія першапачаткова не баставалі. Атрымалася агульная забастоўка — забаставалі не толькі мужчыны, але і жанчыны, і нават кароўніцы. Вярнуўшыся з поля, амаль усе рабочыя і работніцы на чале з названымі студэнтамі прайшлі праз увесь фальварак і накіраваліся ў агульны рабочы пакой. Тут усе рабочыя сабраліся вакол студэнтаў, якія пачалі ім штосьці чытаць, а затым закрычалі: «Далоў цара, самадзяржаў'е, далоў чыноўнікаў і папоў!». Гэтыя воклічы былі пакрыты гучным «ура», прычым рабочыя пачалі падкідваць таварыша свайго Мікалая Іванавіча Жукава на руках угару. Пасля гэтага ўсе, як рабочыя, так і студэнты, разышліся, і на работу ў той дзень ніхто не заступіў.

На другі дзень, 10 ліпеня, гадзін у 7–8 вечара ўсе рабочыя маёнтка Вейна, мужчыны і жанчыны, адправіліся ў сасновы лес, які належаў Магілёву, і там удзельнічалі ў сацыял-дэмакратычнай сходцы. Работы ў эканоміі Вейна аднавіліся 11 ліпеня толькі пасля таго, як упраўляючы маёнтка згадзіўся прыбавіць рабочым плату, палепшыць іх харчаванне і скараціць рабочы час.

14 кастрычніка магілёўскі губернатар тэлеграфаваў міністру ўнутраных спраў аб няспынных «беспарадках»: «У Магілёве забаставала семінарыя, неспакойна ў сярэдніх навучальных установах. Чыгункі бяздзейнічаюць...»

У пачатку лістапада пачынаюцца хваляванні сярод салдат Каднікаўскага палка, які дыслакаваўся ў горадзе Магілёве. Салдаты гэтага палка часта выкарыстоўваліся паліцыяй для падаўлення рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян Магілёўскай губерніі. *(За камуністычную працу, 18.02.1975.)*

*А. Савосіна*

### З данясення магілёўскага губернатара ў Дэпартамент паліцыі

**3 жніўня 1910 г.**

У другой палове чэрвеня г. г. у в. Лыкава Вяйнянскай воласці Магілёўскай павятовай землеўпарадкавальнай камісіяй быў камандзіраваны памочнік каморніка Жлоба для правядзення каморніцкіх работ па абавязковаму аддзяленню з абшчыны некаторых сялян. Частка жыхароў в. Лыкава, што не згаджаліся высяляцца на хутары, сабраўшы 22 чэрвеня г. г. значны натоўп аднавяскоўцаў (да 80 чал.) прыбыла да месца работ і з мэтай не дапусціць нарэзку хутароў прыняла ў адносінах да каморніка, а таксама да знаходзіўшагася тут абавязковага члена землеўпарадкавальнай камісіі пагражальнае становішча: кідала ў іх каменні, палкі. Каморнік вымушаны быў спыніць работы. Пры гэтым натоўп збіў аднаго з пераходзячых на хутары селяніна Елісея Чудакова.

Да месца беспарадкаў тэрмінова выехалі: прадвадзіцель дваранства і павятовы спраўнік з 20 коннымі стражнікамі. Пасля растлумачэння сялянам іх незаконных дзеянняў у адносінах да каморніка і асоб, што выходзяць з абшчыны, каморніцкія работы былі працягнуты.

Дазнаннем выяўлена, што гэта насілле — вынік распаўсюджвання некаторымі мясцовымі сялянамі, галоўным чынам Цімафеем Струкавым, чутак аб тым, што, па іх словах, каморнікаў, якія раз'язджаюць па вёсках і разбіваюць участкі, можна гнаць коллем, бо ў газетах пішуць, што хутары выдумаў не ўрад, а малое начальства. Усюды каморнікаў гоняць палкамі, і за гэта ніякага пакарання не бывае.

Каб сярод сельскага насельніцтва не складвалася ўражанне аб беспакаранасці такіх учынкаў, я палічыў неабходным сялян-зачыншчыкаў і тых, хто сеяў ілжывыя чуткі, пакараць у адміністрацыйным парадку і падверг 26 чал. за парушэнне выдадзеных мной 26 мая г. г. абавязковых пастаноў для жыхароў губерні арышту пры паліцэйскім упраўленні ад 7 да 11 дзён, якія яны і адбылі.

Аб гэтым маю гонар паведаміць Дэпартаменту паліцыі.

*В. а. губернатара (подпіс)*

*НГАБ, спр. 41, ч. 1, л. 7–8*

## Абаронім сябе самі!

У пачатку 1905 г. сяляне в. Навасёлкі Вендаражскай воласці распачалі судзіцца з памешчыцай Падашэўскай за 28 гектараў лугу на сенакос. Але, як водзіцца, не дабіліся станоўчага рашэння сваіх спрэчак у судовых інстанцыях і ў пачатку ліпеня прыбылі на луг, разагналі панскую варту і распачалі касьбу. Памешчыца і паліцыя, бачачы, што не справяцца з сялянамі, выклікалі войска. У вёску прыехаў вялікі карны атрад і падавіў выступленне сялян.

Але сялянскія хваляванні закранулі і Княжыцкую воласць. Там сяляне ў час аднаго выступлення зламалі запруду панскага вадзянога млына, спусцілі ваду, якая пры рабоце млына затапляла сялянскія лугі. Барацьбу ўзначальвалі Захар Карпавіч Клімянкоў і Іван Васілевіч Астапкоў. Яны былі арыштаваны і сасланы ў Сібір.

Як сведчылі мясцовыя ўлады, у Княжыцах у тыя гады адчуваўся ўплыў сацыял-дэмакратаў. У доме братоў Міхаіла, Івана і Васіля Лугаўцовых збіраліся тайныя сходкі.

Начальнік Магілёўскага жандарскага ўпраўлення паведамляў у Санкт-Пецярбургскі дэпартамент паліцыі: «...В результате проникновения социал-демократических идей... крестьяне стали собираться на сходки в лесах и обсуждать интересующие их вопросы об улучшении их быта за счет соседних землевладельцев, будчи убеждены, что земля не должна принадлежать помещику, который лично сам ее не обрабатывает, а должна быть поделена между крестьянами, которые обрабатывают ее личным трудом...»

У жніўні 1905 г. магілёўская сацыял-дэмакратычная група рашыла выкарыстаць вялікае рэлігійнае свята ў Машанаках для правядзення рэвалюцыйнага мітынгу.

За дзень да свята з Магілёва ў Машанакі прыехалі два прапагандысты — Відаровіч і Засімовіч і прывезлі многа лістовак. Сярод тых, хто хаваў і распаўсюджваў іх, былі маладыя машанацкія сяляне Фама Капылоў, Нестар Язэпаў, Барыс Забігулін, Фёдар Каптаеў. Адным з арганізатараў мі-




Мемарыяльная дошка ў памяць аб мітынгу сялян в. Машанакі



В. П. Галіонка

тынгу быў сын мясцовага свяшчэнніка Васіль Галіонка.

Пазней В. Галіонка вёў марксісцкія гурткі ў Хабараўску, быў членам Хабараўскага гаркома РСДРП. У перыяд барацьбы супраць Калчака быў членам падпольнай ваеннай арганізацыі бальшавікоў горада Спаска.

У Машанаках памятаюць Галіонку як першага арганізатара рэвалюцыйнага гуртка для сялян.

*Н. Зверава, Л. Валодзін*

**З хадатайніцтва Магілёўскай павятовай земскай управы ў аддзел сельскай эканомікі і сельскагаспадарчай статыстыкі**

**1913 г. студзеня 25**

...Закранаючы пытанне аб тым, як стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця саматужных промыслаў у Магілёўскім павеце, павятовае земства прыйшло да думкі аб неабходнасці распаўсюджванняў сярод мясцовых саматужнікаў такіх патрэбных ім тэхнічных ведаў, адсутнасць якіх моцна тармозіць паляпшэнне справы... Паколькі ў павеце адсутнічаюць рамесныя школы... а саматужныя промыслы ў павеце прыходзяць у стан застою, земства... прыйшло да вываду аб неабходнасці адкрыцця ў павеце некалькіх вучэбных майстэрняў, і ў першую чаргу — ткацкіх, сталярна-такарных і слесарна-кавальскіх.

У рамках гэтага плана земствам ужо адкрыты сталярна-такарная майстэрня ў Грабянёве і ткацкая ў Савасцянавічах. Рыхтуюцца да адкрыцця яшчэ дзве майстэрні — сталярна-такарная і слясарна-кавальская.

...Магілёўская павятовая земская ўправа пакорнейша просіць... камандзіраваць спецыяліста і адпусціць дапамогу са сродкаў казны...

...Адна сталярна-такарная майстэрня ўжо існуе, і наплыў вучняў у яе значны. Але з-за цеснаты памяшкання многім вучыцца адмоўлена. Таму трэба пабудаваць для яе новае памяшканне адпаведных памераў, каб задаволіць гэту надзённую патрэбу насельніцтва ў тэхнічнай адукацыі. Патрэбен таксама падбор прадметаў для абсталявання майстэрні. На ўсё гэта асігнаваных сродкаў недастаткова, таму дапамога з боку казны вельмі патрэбная. Патрэбна і падтрымка існуючай ткацкай майстэрні. Стварэнне вучэбных сталярна-такарных майстэрняў таксама адпавядае патрэбам мясцовага насельніцтва.

*НГАБ, ф. 395, воп. 1, спр. 2748, л. 1—2.*

## На ваеннае становішча...

У ліпені 1914 г. беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным становішчы — пачалася першая сусветная вайна. Забараняліся сходы, шэсці, маніфістацыі, продаж газет і кніг без дазволу вайсковых уладаў. Асабліва строгія загады рабіліся, каб папярэдзіць забастоўкі на чыгунках. Шалёнае ганенне было на сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Праўдзісцкія групы і партыйныя группоўкі ў Магілёве былі разгромлены. Амаль поўнасцю спыніліся выступленні сялян. Тысячны паток згаладалых бежанцаў рушыў на Магілёўскую зямлю восенню 1915 г.

Работа прадпрыемстваў, што выпускалі прадукцыю для фронту, была ўзята пад кантроль ваенных ведамстваў. У Магілёўскай губерні колькасць занятых працай на такіх прадпрыемствах жанчын і непаўналетніх дзяцей павялічылася ў 1916 г. на 52,6%.

*Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 2. С. 596—606.*

# 1917

# 1941

## ЧАС БАРАЦЬБЫ І ВЫПРАБАВАННЯЎ

### Хроніка падзей 1917—1918 гг. на Магілёўшчыне

#### Адрачэнне

3 сакавіка (16 сакавіка па новым стылі) 1917 г. жыхары горада і губерні яшчэ ў поўным няведанні аб падзеях у сталіцах і арміі. Жыццё ішло спакойна, хоць і трывожна з-за трохдзённай адсутнасці газет. Маскоўскія газеты з'явіліся ў горадзе 4 сакавіка, і вестка аб адрачэнні цара ад прастола была сустрэта даволі спакойна. «Могилевский вестник» надрукаваў маніфест аб адрачэнні цара Мікалая II 5 сакавіка.

«Было такое пачуццё, што людзі разам выдыхнулі і ўслых сказалі: «Даўно пара, так і трэба».

— Фінансы разладжаны, тавараабмен парушаны, прадукцыйнасць працы — на вялізную страту,— рэзюмаваў найбольш інфармаваны чалавек, міністр унутраных спраў Пратапопаў.

— Шляхі зносін у поўным разладзе. Зімою 1916 г. пад снежнымі заносамі аказалася 60 тысяч вагонаў з палівам, чарчаваннем і фуражом.

Наборы ў армію абязлюдзілі вёску, спынілася землеапрацоўчая прамысловасць. У гарадах галадалі, гандаль замёр пад страхам рэквізіцый... Тавараў было мала, цэны раслі, квітнеў продаж з-пад крыса, паявілася марадзёрства. Праца не ішла, а жыццё ляцела, яно патрабавала адказу на пытанні, якія ўзнікалі. Наступіў крызіс.

Аналагічныя сітуацыі мы назіраем і цяпер. І рэакцыя ў нас у асноўным тая ж: пажывём — пабачым».

Так, мусіць, думалі і магіляўчане — удзельнікі святочнай маніфестацыі 5 сакавіка 1917 года на Дняпроўскім праспекце. Удзельнік гэтай падзеі П. Бязуглаў успамінаў: «Сабралася шмат салдатаў, афіцэраў Стаўкі, чыгуначнікаў, рабочых, навучэнцаў мужчынскай гімназіі. Ад плошчы на Дняпроўскім праспекце да самай турмы дэманстранты ішлі са сцягамі моўчкі. Вароты, дзверы і вокны былі расчынены, не было бачна ні арыштантаў, ні турэмнай варты. Дэманстранты спыніліся. Настаўнік спеваў мужчынскай гімназіі падышоў да аднаго з афіцэраў і спытаў дазволу спець рэвалюцыйную песню. Той разгубіўся і, паглядзеўшы з усмешкай на іншых афіцэраў, сказаў: «Чаму б не спець з такога выпадку, я сам ахвотна далучуся да вас». Нястройна, няўпэўнена гімназісты заспявалі: «Отречемся от старого мира...». Затым больш упэўнена, з песняй, накіраваліся на Сянную плошчу. Доўга чакалі начальніка штаба Стаўкі генерала Аляксеева. Ён затрымаўся ў Мікалая II. Нарэшце генерал з'явіўся на трыбуне, зачытаў адрачэнне цара ад прастола. Салдаты, рабочыя і чыгуначнікі накіраваліся з песняй да гарадского сада».

## Арышт

Ужо на другі дзень пасля адрачэння цара Петраградскі Савет, улічваючы патрабаванні, вылучаныя на мітынгах і сходах, пастанавіў арыштаваць мужа і жонку Раманавых. Рашэнне было прынята Часовым урадам 7 сакавіка: «Прызнаць адрачоных імператара Мікалая II і яго жонку пазбаўлення волі і даставіць імператара, які адрокся, у Царскае Сяло».

Выконвалі загад чатыры ўрадавыя камісары: Бублікаў, Грыбулін, Каменік, Вяршынін. Слова на дарогу сказаў міністр юстыцыі Керанскі: «Асабіста былога цара не турбаваць, абмежавацца зносінамі праз генерала Аляксеева».

Камісары з фармальным прадпісаннем Часовага ўрада выехалі экстраным поездам у Магілёў 7 сакавіка. На наступны дзень яны едуць з вакзала на аўтамабілі ў Стаўку і просяць Аляксеева перадаць Мікалаю II: ён аб'яўляецца пазбаўленым волі. Былога цара суправаджае 47 чалавек — світа і прыслуга. Адпраўленне назначана на 5 гадзін дня 8 сакавіка. Імператарскі поезд складаецца, як заўсёды, з дзесяці вагонаў. За некалькі мінут да адпраўлення Мікалай II цераз платформу пераходзіць з поезда маці ў свой.

Першым у 16 гадзін адыходзіць поезд імператрыцы-ўдавы. У 16.45 ад Магілёўскага вакзала ў Царскае Сяло адправіўся блакітны імператарскі поезд...

*Т. Палажэнцава*
*«Магілёўская праўда». 12 сакавіка1992.*

## Стварэнне Савета

У другой палове сакавіка 1917 г. у Магілёве створаны Савет рабочых дэпутатаў. 4 красакавіка адбылося ўстаноўчае пасяджэнне аб'яднанага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, эсэра-меншавіцкага па сваім характары. У жніўні 1917 г. створана бальшавіцка-інтэрнацыяналісцкая арганізацыя. У ёй аформлена бальшавіцкая фракцыя (каля 25 чалавек). Членамі бюро выбраны М. Ц. Максімаў, А. І. Чарніцкі, А. Н. Залманзон. Бальшавікі Магілёва ў паўлегальных умовах вялі барацьбу з контррэвалюцыйнай Стаўкай, меншавікамі, эсэрамі, бундаўцамі. У дні карнілаўшчыны яны падпольна надрукавалі адозву да насельніцтва, праводзілі агітацыю сярод салдатаў Магілёўскага гарнізона, батальёна георгіеўскіх кавалераў, што ахоўвалі Стаўку.

*БелСЭ. Т. 6. С. 499.*

## Сялянскі рух нарастаў

Губернскі камісар 7 мая ў сваім данясенні Часоваму ўраду паведаміў аб сялянскім руху, які ахапіў усю губерню.

*ДАРФ, ф. 398, воп. 2, спр. 113, л. 128.*

## Першы нумар газеты

Выйшаў першы нумар газеты «Крестьянское слово», орган Магілёўскага губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў. Газета рэкамендавала сялянам чытаць «Правду», «Солдатскую правду» і байкатаваць буржуазную прэсу.

*«Социал-демократ». 24 мая 1917.*

### Захоп памешчыцкіх зямель

У Магілёўскі валасны зямельны камітэт ад арандатара маёнтка Раёк Майсея Маневіча.

Заява.

3 чэрвеня 1917 г. член Манеўскага валаснога зямельнага камітэта Цімафей Іскарадаў у суправаджэнні звыш 50 душ сялян вёсак Мокрае і Шабель з'явіліся да мяне як да арандатара маёнтка Раёк і прыступілі ад імя камітэта да незаконнай раздачы лугоў маёнтка Раёк паміж вышэйназванымі сялянамі...

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 629, воп. 1, спр. 4, л. 1.*

## Генералы патрабавалі

У Стаўцы 16 ліпеня адбылася нарада з удзелам Керанскага, Савінкава, Брусілава, камандуючых Заходняга фронту — Дзянікіна і Паўночнага — Клямбоўскага, генералаў Аляксеева, Рузскага і іншых, якія ў мэтах барацьбы з рэвалюцыяй патрабавалі паўнаты ўлады для камандавання, стварэння карных часцей, увядзення смяротнай кары і ваенных судоў у тыле, «изъятия политики из армии». Абмяркоўваўся таксама план вываду рэвалюцыйных войскаў з Петраграда ў колькасці 80—90 тыс. салдат.

*Кин Д. Война и Февральская революция// «Красная летопись» 1923. С. 27.*

## Рашэнне Савета

Магілёўскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў прыняў рэзалюцыю пратэсту супраць увядзення смяротнай кары на фронце і ў тыле. У рэзалюцыі гаварылася: «Выканаўчы камітэт Магілёўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў рашуча пратэстуе супраць спробы ўвесці ў тыле гэту варварскую меру і катэгарычна патрабуе адмены яе на фронце».

*«Молот». 18 жніўня 1917.*

### Палажэнне аб валасных камітэтах, прынятае магілёўскім павятовым земскім сходам

### З журнала сходу 1917 г. сакавіка 22

«...Палажэнне аб валасных камітэтах Магілёўскага павятовага земства прынята сходам у наступнай рэдакцыі:

1. Валасныя камітэты ствараюцца на месцах для падтрымання ў межах воласці спакою, парадку і грамадскай бяспекі і садзейнічання новаму ўраду ва ўсіх яго пачынаннях.

Валасныя камітэты абавязаны праводзіць у жыццё розныя мерапрыемствы мясцовага характару, накіраваныя на ўрэгуляванне ўзаемаадносін мясцовага насельніцтва, і праводзіць у жыццё ўсе цвёрдыя цэны, устаноўленыя ўрадам для паніжэння кошту прадуктаў і працы, а таксама пытанні харчовае, засеву палёў, размяшчэння ваеннапалонных, урэгулявання работы дружын, размеркавання працы бежанцаў і ажыццяўленне іншых намечаных земствам мерапрыемстваў.

2. Валасныя камітэты ўтвараюцца ў кожнай воласці ў наступным саставе: а) старшыня валаснога папячыцельства або асоба, якая яго замяняе; б) мясцовыя земскія галосныя; в) земскія аграномы або агранамічныя старасты; г) земскія ветэрынарныя ўрачы; д) прадстаўнікі кааператываў, па аднаму ад кожнага; е) члены, якіх выбірае насельніцтва воласці як з прыпісанага люду, так і з усіх пражываючых у межах воласці асоб без уліку саслоўя, веравызнання і полу па аднаму ад 300—500 чал., па

пастанове камітэта; ж) прадстаўнік ад земства па выбару земскай управы; з) па два прадстаўнікі ад мястэчак.

3. Камітэт павінен прыцягнуць да ўдзелу ў ім прадстаўнікоў іншых груп насельніцтва і арганізацый, а таксама спецыялістаў, удзел якіх камітэт прызнае карысным.

4. Валасны камітэт выбірае са свайго асяроддзя старшыню, яго таварыша, казначэя і сакратара, а таксама трох прадстаўнікоў у павятовы камітэт, з якіх адзін ад местачковага насельніцтва. Сакратар можа быць запрошаны і з пабочных асоб. Яго праца можа аплачвацца павятовай земскай управай.

5. Усе справы камітэт рашае простай большасцю галасоў, а пры раздзяленні галасоў пароўну голас старшыні дае перавагу. Пасяджэнне камітэта лічыцца адбыўшымся, калі ў ім удзельнічаюць старшыня і не менш трох членаў. Усе пастановы камітэта ўносяцца ў журнал.

Пастановы камітэта выконваюцца старшынёй або асобнымі членамі па даручэнню камітэта.

Для агульнага кіраўніцтва і ўзгодненасці дзеянняў валасных камітэтаў пры павятовай земскай управе ўтвараецца павятовы камітэт, у састаў якога ўваходзяць па два прадстаўнікі ад кожнага валаснога камітэта, з якіх адзін ад местачковага насельніцтва.

*НГАБ, журнал 8-га Надзвычайнага Магілёўскага павятовага земскага сходу.*

## Перамога савецкай улады ў Магілёве

18 лістапада (1 снежня) 1917 г. Магілёўскі Савет прызнаў савецкую ўладу. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, утвораны з прадстаўнікоў выканкома Савета, магілёўскага гарнізона і 3-яй арміі, узяў уладу ў горадзе і ўстанавіў кантроль над Стаўкай. 20 лістапада (3 снежня) у Магілёве пачала дзейнічаць рэвалюцыйная Стаўка (Вярхоўны галоўнакамандуючы М. В. Крыленка, начальнік штаба М. Дз. Бонч-Бруевіч).

*БелСЭ. Т. 3. С. 257.*

## Дапамога рэвалюцыйнага Мінска

З Мінска 19 лістапада накіраваны рэвалюцыйны атрад у Магілёў для барацьбы з контррэвалюцыйнай Стаўкай. У састаў мінскага атрада ад 2-ой арміі ўваходзілі браняпоезд і 60-ы Сібірскі полк.

*Працоўныя Гомельшчыны ў барацьбе за ўладу Саветаў. С. 64.*

## Ліквідацыя контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве



М. Т. Панасевіч

### З успамінаў ураджэнца вёскі Сідаравічы М. Т. Панасевіча

Мітрафан Тарасавіч Панасевіч нарадзіўся 23.11.1899 г. у вёсцы Сідаравічы Магілёўскага раёна Магілёўскай вобл. З 1917 г. рабочы завода «Арсенал» у Петраградзе, потым у Чырвонай гвардыі. У 1917 г. удзельнічаў у штурме Зімняга палаца, ліквідацыі Стаўкі ў Магілёве, у 1918—1920 гг. змагаўся

на франтах грамадзянскай вайны. У 1924—1927 гг. вучыўся на рабфаку лясного інстытута. У 1932 г. скончыў Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію. У Айчынную вайну працаваў у сістэме Наркамлесу, у 1946—1955 гг. галоўны інжынер на Гродзеншчыне, у 1956—1977 гг. выкладчык у Беларускім тэхналагічным інстытуце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

У 1917 г. Беларусь была франтавой паласой. На яе тэрыторыі знаходзіліся тры арміі Заходняга фронту. У Магілёве была Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, дзе контррэвалюцыйныя генералы рыхтавалі сілы для разгрому рэвалюцыі. У Магілёве ў той час знаходзіліся часці «дзікай дывізіі», 4-ы Сібірскі казацкі полк, Гвардзейскі ардынарскі батальён, 2-і Арэнбургскі ўдарны батальён, шэраг дробных вайсковых падраздзяленняў і Георгіеўскі батальён. У Быхаве, дзе знаходзіўся «пад арыштам» генерал Карнілаў, былі сканцэнтраваны вайсковыя часці, якія падтрымлівалі Стаўку: Тэкінскі конны полк, чатыры сотні «дзікай дывізіі» і часці польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. Быхаўская турма ўяўляла сабой неад'емную частку контррэвалюцыйнай Стаўкі, і таму Карнілаў, знаходзячыся там, не адчуваў сябе пад арыштам і фактычна кіраваў дзейнасцю Стаўкі. Ён пасылаў у Магілёў інструкцыі, даваў указанні і асабіста Духоніну. Выконваючы гэтыя ўказанні, Стаўка распарадзілася заняць Жлобін, устанавіла сувязь з атаманам Каледзіным, вырашыла ўмацаваць Магілёўскі гарнізон контррэвалюцыйнымі войскамі, сцягнула да горада некаторыя часці, пачала ствараць запасы зброі і боепрыпасаў, імкнулася ўстанавіць у Магілёве зверскі рэжым контррэвалюцыі. Адкрытае мяцежнае выступленне Стаўкі патрабавала ад бальшавікоў прыняць тэрміновыя меры да ліквідацыі гэтага контррэвалюцыйнага ачага ў Магілёве. Для ліквідацыі Стаўкі ў Петраградзе быў тэрмінова сфарміраваны зводны чырвонагвардзейскі атрад з рабочых-добраахвотнікаў і маракоў Балтыйскага флоту. 18 лістапада 1917 г. з Дзецкасельскага вакзала зводны чырвонагвардзейскі атрад спецыяльным эшалонам быў адпраўлены ў Магілёў. На станцыі Дно чырвонагвардзейцы сказалі, што яны едуць у Магілёў для ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі і што за імі едзе ў спецыяльным эшалоне літоўскі полк, які разам з імі будзе ўдзельнічаць у ліквідацыі Стаўкі. Вестка аб руху рэвалюцыйных атрадаў для ліквідацыі Стаўкі паслужыла штуршком для перавароту ў Магілёве. Рэвалюцыйна настроеныя воінскія часці гарнізона перавыбралі дэпутатаў у Магілёўскі Савет, паслалі туды спецыяльныя дэлегацыі з патрабаваннем прыняць рашучыя меры для барацьбы з контррэвалюцыяй. Рабочыя і салдаты патрабавалі ад выканаўчага камітэта Савета і начальніка гарнізона генерала Бонч-Бруевіча прыняць меры для папярэджвання ўзброеных сутычак часцей Магілёўскага гарнізона з рэвалюцыйнымі войскамі, што прыбываюць з Піцера. Эсэры і меншавікі былі выгнаны з Савета, выканаўчы камітэт Магілёўскага Савета ўзначалілі бальшавікі. Новы выканком Магілёўскага Савета стварыў ВРК, якому была перададзена ўся паўната ўлады ў горадзе і кантроль над дзейнасцю Стаўкі. Пры Стаўцы быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт з прадстаўнікоў рэўкомаў армій і франтоў, а таксама прадстаўнікоў цэнтральнай ваеннай арганізацыі. 22 лістапада ВРК Стаўкі пачаў сваю работу. 23 лістапада пры ВРК Стаўкі быў арганізаваны Ваенна-палявы штаб, які з'яўляўся асноўным апаратыўным ядром новай Стаўкі. Так была ліквідавана контррэвалюцыйная Стаўка.

## За зямлю, за волю!



І. В. Горскі

Калі было атрымана паведамленне аб узброеным паўстанні ў Петраградзе, у многіх валасцях Магілёўскага павета прайшлі мнагалюдныя мітынгі. З вялікім уздымам прайшоў мітынг у вёсцы Княжыцы. Петраградскіх рабочых і салдат, якія звергнулі Часовы ўрад, вітаў ад імя княжыцкіх сялян удзельнік рэвалюцыі 1905 г. Адам Васілевіч Палякоў. Сабраўшыеся на мітынг заявілі аб сваёй гатоўнасці аказаць поўную падтрымку Савецкай уладзе.

— У 1905 г. пасеялі мы канапелькі, а ўзышлі яны толькі ў 1917 г., — так вобразна сказаў на гэтым мітынгу княжыцкі селянін Захар Клімянкоў.

28 лістапада 1917 г. ВРК прыняў рашэнне аб нацыяналізацыі ўсіх памешчыцкіх маёнткаў у Магілёўскай губерні. У адпаведнасці з Дэкрэтам аб зямлі праводзілася новае землеўпарадкаванне. Сялянская бедната Магілёўскага павета нарэшце атрымала зямлю. Быў прыняты закон аб сацыялізацыі зямлі.

Але яшчэ збірала сілы для новага наступлення на савецкую ўладу контррэвалюцыйная Стаўка, якая засела ў Магілёве. У яе канчатковым разгроме прымалі ўдзел магіляўчане: матросы Балтыйскага флоту І. В. Горскі, В. С. Дудараў, Г. І. Балашоў, С. П. Кандрычын, рабочы завода «Арсенал» М. Т. Панасевіч.

## Матрос з крэйсера «Аўрора»

**З успамінаў ураджэнца вёскі Дары В. С. Дударава**

У 1912 г. быў прызваны на ваенную службу і накіраваны ў Лібаву. Потым мяне адправілі служыць у г. Кранштат на крэйсер «Аўрора», на якім я праслужыў да 1917 г. У пачатку лютага 1917 г. у горадзе стала неспакойна. Камандзір крэйсера «Аўрора» Нікольскі забараніў пускаць каманду на бераг. Маракі ўзбунтаваліся. Камандаванне крэйсера выклікала на бераг воінскую часць. Па камандзе нас пастроілі на верхняй палубе і, нічога не гаворачы, доўга трымалі, спадзяючыся, што мы ўзбунтуемся, каб потым выстраеныя на набярэжнай узброеныя войскі расстралялі нас. Але гэты намер не ўдаўся. Тады каманду распусцілі. Раніцай прыбыла група рабочых са сцягамі. Гэта паслужыла сігналам для аўрораўцаў, уся наша каманда са зброяй у руках выбегла на вуліцы Петраг-



В. С. Дудараў

рада, каб ачысціць шлях для выхаду на вуліцы паўстаўшым рабочым.

Мы падышлі да школы юнкераў і прапанавалі ім ісці разам з намі. Яны вагаліся. Давялося нам зрабіць некалькі выстралаў па вокнах вучылішча, і тады юнкеры далучыліся да нас. Неўзабаве на наш бок перайшлі некалькі воінскіх часцей, у тым ліку два кулямётныя палкі. 1 сакавіка 1917 г. было аб'яўлена аб стварэнні Часовага ўрада, у які ўвайшлі царскія міністры, хоць цара ўжо не было. Урад прапанаваў сабраць устаноўчы сход, выбраць прэзідыум, які будзе кіраваць краінай. Аднак бальшавікі заявілі, што будуць змагацца за перадачу ўлады ў рукі Саветаў. Мы атрымалі каманду прыбыць у Петраград на мітынг. Калі пасля мітынгу мы прыбылі на крэйсер, супраць нас пачалося следства. Двух маракоў арыштавалі, але ненадоўга. Нягледзячы на пагрозы Часовага ўрада, мы рыхталіся да барацьбы. 25 кастрычніка 1917 г. маракі крэйсера «Аўрора» з раніцы пачалі рыхтавацца да бою. Крэйсер падышоў да Мікалаеўскага мосту. Чакалі ўмоўнага знаку, каб адкрыць агонь. Калі атрымалі сігнал, маракі крэйсера далі поўны гарматны залп па Зімняму палацу. Неўзабаве атрымалі паведамленне, што Зімні ўзяты, а Часовы ўрад арыштаваны. Маракі крэйсера заступілі на варту па ахове Зімняга палаца. 20 лістапада 1917 г. група аўрораўцаў, у тым ліку і я, пад кіраўніцтвам галоўнакамандуючага Крыленкі была накіравана ў Магілёў для ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі. 17 красавіка 1918 г. дэмабілізаваўся і вярнуўся ў сваю родную вёску.

## На баку Саветаў

5—10 студзеня 1918 г. адбыўся II губернскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ад 15 Саветаў.

Абмеркаваны пытанні: арганізацыя ўлады ў губерні, каардынацыя дзеянняў Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і аб'яднанне гэтых арганізацый; аб Устаноўчым сходзе; аб III Усерасійскім з'ездзе Саветаў.

З'езд адобрыў усе мерапрыемствы, праводзімыя Саветам Народных Камісараў і Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам Саветаў, і заявіў, што «ў выбары паміж Устаноўчым сходам і Саветамі, калі такі ўзнікне, Магілёўскі губернскі з'езд заўсёды будзе на баку Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў». Па пытанню арганізацыі савецкай улады прынята пастанова аб паўнамоцтвах і функцыях мясцовых Саветаў. У ім указваецца, што ўся паўната ўлады на месцах належыць Саветам, функцыі якіх не трэба абмяжоўваць кантролем.

*З газет «Революционная Ставка», № 29 і «Известия Могилевского Совета», № 10.*

## Зямлю — сялянам

7 студзеня 1918 г. IV Магілёўскі губернскі сялянскі з'езд заявіў аб неабходнасці раззбраення контррэвалюцыйных польскіх войскаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі губерні і рабуюць працоўнае сялянства. У рэзалюцыі з'езда па зямельнаму пытанню гаварылася: «Зямлю атрымлівае ў карыстанне той, хто апрацоўвае яе ўласнай працай і працай сваёй сям'і без наёмнай працы. Увесь жывы і мёртвы інвентар (памешчыкаў) з сельгаспабудовамі і прадпрыемствамі пераходзіць у агульнанароднае карыстанне».

*НАРБ, ф. 52, воп. 1, спр. 8, л. 42.*

## Наступленне германскіх войск

18 лютага пачалося наступленне германскага войска на Савецкую Расію пасля зрыву мірных перагавораў у Брэст-Літоўску. Яны наступалі дзвюма групамі: 10-ая армія — на Мінск—Магілёў—Віцебск, а 21-ы рэзервовы корпус — на Гомель. Нямецкія захопнікі мелі на мэце праз Полацк—Оршу выйсці на Смаленск, а праз Гомель—Бранск — на Маскву.

Выканком губернскага Савета ўвёў асаднае становішча ў губерні і аб'явіў мабілізацыю ў Чырвоную Армію ў сувязі з наступленнем немцаў.

*Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў Беларусі. Т. 2. С. 893—894.*

## На дапамогу Магілёву

Газета «Известия Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов» г. Масквы і Маскоўскай вобласці 27 лютага 1918 г. змясціла паведамленне, што на дапамогу Магілёву накіраваны некалькі атрадаў Чырвонай Арміі. Будуць таксама адпраўлены атрады ў Гомель і Смаленск.

## Магілёўскі губвыканком у Мсціславе

У сувязі з заняццем Магілёва нямецкімі акупантамі губвыканком 6 красавіка пераехаў у Мсціслаў. Апублікавана рэзалюцыя з'езда Саветаў Магілёўскай губерні па харчоваму пытанню. У ёй губвыканкому прапаноўвалася ў самы кароткі тэрмін стварыць прадуктовыя камітэты і разам з мясцовымі Саветамі прыняць энергічныя меры па ўзяццю на ўлік усіх харчовых рэсурсаў, што маюцца ў губерні, арганізаваць закуп хлеба за межамі губерні, забяспечыць засеў палёў і патрэбы насельніцтва. Рэзалюцыя патрабавала ўзмацнення барацьбы са спекуляцыяй і самагонаварэннем.

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 64, воп. 1, спр. 2, л. 3.*

## Асуджэнне эсэраўскага мяцяжу

18 ліпеня ў Мсціславе адбыўся з'езд прадстаўнікоў павятовых Саветаў Магілёўскай губерні. Ён абмеркаваў даклад з месц, зямельнага і фінансавага аддзелаў губвыканкома аб арганізацыі ў губерні камітэтаў беднаты, правядзенні ў жыццё дэкрэта аб хлебнай манаполіі і іншыя пытанні. З'езд асудзіў мяцеж эсэраў у Маскве, выказаўся за ўмацаванне Савецкай улады, за ўвядзенне ў жыццё дэкрэта аб хлебнай манаполіі. З'езд прызнаў, што хуткае стварэнне камітэтаў беднаты, як апорных пунктаў Савецкай улады ў вёсках, з'яўляецца пярвейшай задачай Саветаў.

*ДАРФ, ф. 393, воп. 3, спр. 210, л. 1—2.*

## Падпольны райком дзейнічаў

Ішлі цяжкія месяцы Брэсцкага перамір'я. Беларускую зямлю тапталі каваныя нямецкія боты. Прывычныя да грабяжу, прускія ваякі спяшаліся забраць апошняе дабро з бедных сялянскіх двароў. Загучала ў вёсках злавес-

нае слова «рэквізіцыя». Успыхвалі стыхійныя сялянскія хваляванні.

У пачатку 1918 г. ЦК РКП(б) паслаў на акупіраваную кайзераўцамі тэрыторыю Беларусі самых вопытных і загартаваных рэвалюцыянераў для арганізацыі падполля. Непасрэднае кіраўніцтва падпольнымі арганізацыямі было ўскладзена на Паўночна-Заходні абласны камітэт партыі. У ліку бальшавікоў, якія прыбылі на Магілёўшчыну для вядзення падпольнай работы, былі Брэгман, Сямёнаў, Равінскі і Любашэўскі. У складаных умовах Брэсцкага перамір'я ім прадстаяла арганізоўваць супраціўленне насельніцтва незаконным дзеянням германскіх улад, кантраляваць на месцах захаванне немцамі ўмоў Брэсцкага дагавору. Не было выключэннем, што немцы паспрабуюць сарваць перамір'е, і тады пад пагрозай аказаўся б лёс маладой рэспублікі. Таму на падпольшчыкаў была ўскладзена задача: стварэнне партызанскіх атрадаў.

Цэнтральны Камітэт партыі распрацаваў чоткую структуру падполля. Тэрыторыя рэспублікі была раздзелена на 7 раёнаў і 53 падраёны (паветы). Магілёўскі падпольны райком ажыццяўляў кіраўніцтва падпольнымі арганізацыямі Быхаўскага і Шклоўскага паветаў. Узначаліў камітэт вопытны работнік Аляксандр Брэгман. Яго намеснікам быў кіраўнік шклоўскага падполля Н. І. Сямёнаў, сакратаром — бальшавік Рэвека Вайнер. Уся работа падполля была разлічана на самую цесную сувязь з насельніцтвам, на яго падтрымку і дапамогу.

— Перш за ўсё перада мной стаяла задача знайсці таварыша з мясцовых жыхароў, які б добра ведаў абстаноўку і карыстаўся аўтарытэтам у сялян,— успамінаў Сямёнаў.— Такім чалавекам аказаўся М. П. Матронкін, удзельнік рэвалюцыйнага руху 1905 г. У першыя дні перайшоў на падпольную работу і сельскі настаўнік Г. М. Лабузноў. Падпольны райком звяртаў асаблівую ўвагу на арганізацыю растлумачальнай работы сярод насельніцтва.

Падпольшчыкі распаўсюджвалі агітацыйную літаратуру сярод сялян, вялі работу і сярод акупацыйных войск. Магілёўскі райком забяспечваў лістоўкамі. У падпольнай друкарні на Лупалаве друкавалася бальшавіцкая газета «Падпольная праўда». Райком кіраваў на месцах арганізацыяй партызанскіх атрадаў. Збіралася і звозілася зброя ў тайныя партызанскія месцы. У маі 1918 г. сіламі аб'яднаных партызанскіх атрадаў захопнікі з Лупалава былі выгнаны. 28 мая быў створаны павятовы выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Лупалаўская партарганізацыя ўстанавіла цесную сувязь з Магілёўскай партыйнай групай і аказвала ёй вялікую дапамогу ў набыцці зброі і палітычнай літаратуры.

31 кастрычніка 1918 г. часцямі Чырвонай Арміі г. Магілёў вызвалены ад нямецкіх акупантаў. У горадзе адбылася грандыёзная дэманстрацыя і мітынг працоўных горада разам з войскамі Чырвонай Арміі і партызанамі.

У хуткім часе пасля вызвалення Магілёўшчыны ад нямецкіх войск у газеце «Саха і молат» № 6 была надрукавана аб'ява:

«17 студзеня 1919 года ў Магілёве склікаецца Магілёўская павятовая канферэнцыя РКП(б).

Парадак дня:

1. Даклады з месц. 2. Бягучы момант. 3. Арганізацыйныя пытанні. 4. Выбары на губканферэнцыю.

Па даных мандатнай камісіі, дэлегаты першай павятовай Магілёўскай партканферэнцыі прадстаўлялі 319 арганізаваных членаў і 366 спагадлівых пры валасных ячэйках. Дэлегат ад Палыкавіцкай воласці Механік далажыў канферэнцыі, што валасная партыйная ячэйка была арганізавана ў лістападзе 1918 г. членамі падпольнай арганіза-

цыі. Дэлегат ад Княжыцкай валасці Барысенка расказаў аб тым, што партыйная ячэйка стала сапраўдным баявым атрадам камуністаў, і яшчэ 30 сялян заявілі аб сваім жаданні ўступіць у партыю бальшавікоў.

Першая Магілёўская павятовая партканферэнцыя паставіла перад камуністамі шэраг неадкладных задач. Гэта — арганізацыя зямельных аддзелаў, прыцягненне беднаты і сярэдняга сялянства да работы ў савецкіх органах, палітмасавая работа на месцах.

*І. Гаўрылаў*
*«За камуністычную працу». 19 лютага 1966.*

## Партызанскі рух у вёсцы Сухары, 1918 год

Ініцыятарамі стварэння партызанскага атрада ў 1918 г. былі:

Якубаў Кузьма Конанавіч — камандзір атрада, ураджэнец вёскі Гладкова Чавускага павета;

Цюхцяеў Андрэй Ларывонавіч — камісар атрада, ураджэнец в. Іванавічы, які прыехаў у родныя мясціны з землякамі-вайскоўцамі з-пад Дарагабужа.

Партызаны: Валчанкоў Ілья Савельевіч, Валчанкоў Цімафей Мацвеевіч, Валчанкоў Іван Іванавіч, Дзем'янкоў Іван.

Партызаны з в. Іванавічы: Рыжкоў Мікалай Фёдаравіч, П'янкоў Павел Раманавіч, П'янкоў Ягор Іванавіч, Сталяроў Міхаіл.

Пазней партызанскі атрад быў пераўтвораны ў 3-юю сотню 3-га Магілёўскага чырвонагвардзейскага атрада. Байцы гэтага атрада разбілі белапалякаў каля в. Іванавічы. У в. Мікалаеўка захапілі склад з боепрыпасамі, затым у г. Магілёве захапілі турму і вызвалілі палітзняволеных, якімі папоўнілі атрад. Разведаўшы, дзе ў Магілёве знаходзіцца штаб белапалякаў, разграмілі яго, перабіўшы ўсіх афіцэраў. Пасля гэтага працягвалі наступленне на Бабруйскай шашы і каля в. Буйнічы разграмілі конніцу белапалякаў.

Далейшы лёс камандзіра 3-яй сотні 3-га чырвонагвардзейскага атрада К. К. Якубава трагічны. Ён пацярпеў ад паклёпніцкага даносу і, не вытрымаўшы гэтага, застрэліўся. Прывезлі яго цяжка параненага ў школу в. Гладкова, дзе ён і памёр. Яго невінаватасць была ўстаноўлена, але... Пахаваны К. К. Якубаў у вёсцы Гладкова.

*Запісана з успамінаў жыхароў: в. Іванавічы — Гаршкова М. П., в. Гладкова — Якубавай Ф. В.*

*Барацьба за Савецкую ўладу ў Беларусі (1918—1920 гг.): Зборнік дакументаў... Т. 1. Мн., 1968.*

## Гэта было ў Хонаве

...Цяжкім быў для маладой краіны васемнаццаты год. На Магілёўшчыне тады часова гаспадарылі белапалякі, якія рабавалі насельніцтва, здзекаваліся з людзей. Не вытрымала гэтага хойнаўскае насельніцтва, узялося за зброю. Васіль Бардзюгоў, Піліп Сысоеў, Пётр Галяшоў, Барыс Машароўскі, Мікалай Казакоў і іншыя сталі чырвонымі партызанамі. На Друці ад іх трапных куль знайшоў сваю смерць карнік-камендант, ад якога не ведалі літасці ні старыя, ні малыя.

Крыху пазней хойнаўскія партызаны правялі другую аперацыю. Непасрэднай удзельніцай у ёй давялося быць тады яшчэ зусім маладой Феадосіі Латаковай. Як звычайна, яна панесла сва-

ім аднавяскоўцам прадукты харчавання. Па дарозе сустрэла атрад карнікаў, якія накіроўваўся ў вёску Угалле. Паведаміла пра гэта партызанам. Народныя мсціўцы рашылі зрабіць засаду. Нечаканы напад партызан зрабіў сваю справу: без адзінага выстрала ворагі былі раззброены. Паспяхова праведзеная аперацыя акрыліла партызан. Актывізавалася барацьба з акупантамі. Неўзабаве Васіль Бардзюгоў, брат Феадосіі Якімаўны, і яго баявыя сябры рашылі правесці больш буйную і складаную аперацыю. Ставілася задача знішчыць атрад белапалякаў, якi знаходзіўся ў маёнтку пана Ярашэўскага. Спачатку ўсё ішло, як было задумана. Надвячоркам фурманка кранулася з месца. На возе сядзелі Піліп Сысоеў, Васіль Бардзюгоў і яго сястра. Недалёка ад маста іх спынілі конныя легіянеры. Пры вобыску ў Піліпа Сысоева яны знайшлі невялікую бомбу. Збіваючы прыкладамі, іх пагналі ў маёнтак. Праз некаторы час былі арыштаваны Пётр Галяшоў, Барыс Машароўскі і Мікалай Казакоў. Цэлую ноч працягваўся допыт, катаванні. Арыштаваныя ні слова не прамовілі, не выдалі ніводнага свайго таварыша. Нічога не даведаліся каты і ад юнай сястры Васіля Бардзюгова, нягледзячы нават на невыносныя здзекі. Яе некалькі разоў усцягвалі на шыбеніцу і, калі дзяўчына траціла прытомнасць, адлівалі вадой. Нічога не дабіліся яны ад Феадосіі Якімаўны.

Іншы лёс чакаў партызан. Збітых да паўсмерці пецярых народных мсціўцаў белапалякі завезлі ў Незаўскі лес і там пасля здзекаў расстралялі. Толькі адзін Васіль Бардзюгоў яшчэ быў жывы. Аднак назаўтра, калі яго прывезлі дадому, і ён памёр ад некалькіх штыкавых і агнястрэльных ран...

З дня смерці хонаўскіх партызан мінула многа гадоў. Аднак героі не забыты. На мемарыяльнай дошцы, устаноўленай у цэнтры вёскі, напісана: «Вечная слава чырвоным партызанам, загінуўшым у 1918 годзе ў барацьбе з белапалякамі за ўстанаўленне Савецкай улады ў Беларусі».

*І. Стражэвіч*
*«За камуністычную працу».*
*21 ліпеня 1966.*

**ЖЫХАРЫ ВЁСКІ ХОНАВА, РАССТРАЛЯНЫЯ ПОЛЬСКІМІ ЛЕГІЯНЕРАМІ:**

**БАРДЗЮГОЎ** Васіль Якімавіч
**ГОЛЕШАЎ** Пётр Мікалаевіч
**КАЗАКОЎ** Мікалай Васілевіч
**МАШАРОЎСКІ** Барыс Пятровіч
**СЫСОЕЎ** Піліп Васілевіч

## Змагары за новую ўладу з вёскі Сідаравічы

У ліку рэвалюцыйных маракоў і рабочых-чырвонагвардзейцаў, якія прымалі непасрэдны ўдзел у кастрычніцкім узброеным паўстанні 1917 г. у Петраградзе, былі і сідараўчане: Г. І. Балашоў, С. П. Кандрычын — матросы лінкора «Петрапаўлаўск», М. Т. Панасевіч — рабочы завода «Арсенал». Усе трое актыўна ўключыліся ў работу па ўмацаванню новай улады ў Грудзінаўскай воласці, у якую ўваходзілі і Сідаравічы. Яны атрымалі ў Магілёве зброю і на кані М. Р. Шляханава прывезлі яе ў Сідаравічы (станковы кулямёт, дзве скрыні стужак, 30 вінтовак, 6 скрыняў патронаў і інш.). У Сідаравічах, у памяшканні школы, быў сфарміраваны чырвонагвардзейскі атрад, у які ўвайшло 30 найбольш актыўных і свядомых сялян. Узброеныя чырвонагвардзейцы ўступілі ў 1-ы Чавускі чырвонагвардзейскі атрад, якім камандаваў матрос-бальшавік Фёдар Мядзведскі. Сідараўчане ў гэтым атрадзе склалі 1-ую роту, камандзірам якой быў прызначаны Я. С. Шалку-



С. П. Кандрычын

ноў, байцы М. Т. Панасевіч, Г. І. Балашоў, І. В. Гаўрылін, Р. І. Кавалёў, Ф. І. Топалеў. Праз некаторы час Чаvскі атрад увайшоў у фарміраванне Чырвонай Арміі — 152-і стралковы полк 17-ай стралковай дывізіі.

Услед за першай групай чырвонагвардзейцаў з 30 чалавек у рады Чырвонай Арміі ўступіла другая група сідараўчан у колькасці 40 чалавек. Такім чынам, у перыяд грамадзянскай вайны байцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі служылі 70 сідараўчан. Разам з усім рэвалюцыйным народам доўгія і цяжкія дарогі прайшлі гэтыя сідаравіцкія сяляне-беднякі, якія змагаліся за новае жыццё, не шкадуючы ні сіл, ні самога жыцця.

Чацвёра сідараўчан — С. К. Барыськоў, П. Ц. Каралёў, С. І. Карпечын і П. Л. Карпечын у канцы 1918 г. былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію і адпраўлены ў горад Ельню, а праз некаторы час яны абаранялі Петраград ад войск Юдзеніча. У ліпені 1919 г. яны ўдзельнічаюць у баях з праціўнікам каля форта Чырвоная Горка. У 1920 г. яны змагаюцца на Паўднёвым фронце ў баях супраць Урангеля. У адным з баёў каля сяла Старадубаўка С. К. Барыськоў па-геройску загінуў, а П. Ц. Каралёў, цяжка паранены, быў па-зверску дабіты белагвардзейцамі. С. І. Карпечын, паранены ў правую нагу, быў схоплены ў палон і разам з іншымі палоннымі накіраваны на расстрэл. Пасля грамадзянскай вайны, вярнуўшыся дадому, Савасцян Іванавіч расказаў: «Я страціў многа крыві, у вісках стукала, ва ўсім целе слабасць, здавалася, вось-вось упаду. І я папрасіў канваіра: "Дабі мяне тут, не магу далей ісці". Але канваір адказаў: «Недалёка, дацягнеш!». Здавалася, усё, канец майму жыццю. Але ў гэты момант паказалася група чырвоных коннікаў, якія імчалі з усіх сіл. Белыя кінулі палонных і разбегліся». Карпечына накіравалі на лячэнне ў Сімферопаль, адкуль ён і вярнуўся ў роднае сяло.

Трагічны лёс С. П. Кандрычына. Сцяпан Парфенавіч Кандрычын нарадзіўся ў 1885 г. у в. Сідаравічы. У 1912 г. быў прызваны на службу на Балтыйскі флот і служыў спачатку на крэйсеры «Аўрора», а потым пераведзены на лінкор «Петрапаўлаўск». У 1917 г. у ліку рэвалюцыйных маракоў і салдатаў удзельнічаў у кастрычніцкім узброеным паўстанні ў Петраградзе, а потым у падаўленні контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве. Пазней яго накіроўваюць на работу па ўмацаванню новай улады ў Грудзінаўскі валвыканком. Восенню 1919 г. Сцяпан Кандрычын назначаецца старшынёй Грудзінаўскага рэўкома і праводзіць вялікую работу па ажыццяўленню сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, вёў барацьбу з контррэвалюцыяй і сабатажам. Вызначаўся прынцыповасцю і настойлівасцю. У вёсцы карыстаўся вялікім аўтарытэтам.

Але не давялося Сцяпану Парфенавічу ўбачыць тыя светлыя дні, аб якіх марыў, за набліжэнне якіх ён змагаўся з уласцівай яму энергіяй. У ноч на 29 мая 1920 г., калі С. П. Кандрычын вяртаўся з Грудзінаўкі ў Сідаравічы, дзе знаходзілася сям'я, ён быў па-зверску забіты недалёка ад вёскі Прыбяражжа. Яго труп быў знойдзены ў жыце на былым панскім полі. Пахавалі С. П. Кандрычына на паўночных «Странскіх» могілках. У забойстве

спачатку западозрылі і арыштавалі былога повара памешчыка Кутлярскага Васіля Барыськова, якому ўдалося з-пад арышту ўцячы і схавацца.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў в. Прыберажжа гітлераўцы арыштавалі селяніна Макара Прахарэнку і даручылі паліцаю Фёдару Сакалову (па мянушцы Галдаеў) адвезці яго ў Быхаў у паліцыю. Каля вёскі Перакладавічы партызаны захапілі Галдаева. Пры вобыску ў яго быў знойдзены імянны рэвальвер з надпісам: «Кандрычыну С. П. за ўзорнае выкананне асобага задання». Аб гэтым расказаў сын Макара Прахарэнкі. Жыхары Сідаравіч шануюць памяць рэвалюцыянераў — змагароў за новае жыццё. 30 кастрычніка 1987 г. на магіле С. П. Кандрычына ўстаноўлены помнік.

*І. Гуркоў*

**Пратакол міжведамаснай нарады 25 лютага 1919 г. пры эканамічна-прававым аддзеле народнага камісарыята па замежных справах**

П о в е с т к а  д н я:

1. О выделении Гомельской губернии.
2. Об установлении границ с Украиной.

Присутствовали:

Иванов и Мальцев — представители Украинского правительства.

Спасский — представитель Наркомвнудела.

Копнер — уполномоченный Совнаркома по делам Белоруссии.

Кацаф — представитель Могилевского ревкома.

Инденбаум — представитель Могилевского губисполкома.

Представители Народного Комиссариата по иностранным делам профессор Немировский и Крутиков.

Заседание открывается в 8 час. 30 мин. Председатель профессор Немировский, секретарь Крутиков.

Заслушано: о выделении Гомельской губернии.

П о с т а н о в л е н о: совещание единогласно признало необходимым перенести губернский административный центр из Могилева в Гомель.

1) Из состава Могилевской губернии уезды: Быховский, Могилевский, Чаусский, Рогачевский, Чериковский и части Горецкого и Климовичского.

Принимается единогласно.

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 79, спр. 1, воп. 1, л. 103.*

## Першая мірная вясна

Вясной 1919 г. Магілёўскі павятовы зямельны аддзел прыняў рашэнне «правесці самымі рашучымі мерамі агульную мабілізацыю коней ва ўсім раёне Магілёўскага павета для патрэб веснавых палявых работ». Гэта датычылася перш за ўсё кулацкіх гаспадарак, у якіх было па некалькі коней, у той час як больш двух тысяч сялян павета звярнуліся ў земаддзел з просьбай выдзеліць ім цяглавую сілу на час палявых работ.

Пытанне аб землеўладкаванні і пасяўной кампаніі было галоўным і на сабраўшымся 25 мая 1919 г. 3-ім павятовым з'ездзе Саветаў. Дэлегаты з'езда ўважліва выслухалі даклады з месц. Нялёгкая спадчына дасталася маладой Беларусі ад старога рэжыму, ад іншаземнай акупацыі. Не хапала плугоў, барон і іншага сельскагаспадарчага інвентару, былі разбураны і спалены многія гаспадарчыя пабудовы: млыны, амбары, хлявы для жывёлы. Толькі яшчэ пачыналася перабудова сялянскай свядомасці: яшчэ былі жывучымі ўласніцкія настроі, сяляне яшчэ толькі

што вучыліся думаць дзяржаўнымі маштабамі.

Дэлегаты ад Княжыцкай воласці Акулаў, ад Палыкавіцкай Карыткін, Вендаражскай Вераценнікаў, ад Вейнянскай Радзялаў і іншыя гаварылі аб складаным харчовым становішчы ў валасцях, аб недахопу насення і інвентару, патрабавалі ўзмацніць палітыка-масавую растлумачальную работу сярод насельніцтва, рыхтаваць агітатараў і прапагандыстаў, якія добра ведаюць мясцовыя ўмовы і здолеюць растлумачыць сялянам, што з вызваленнем Магілёўшчыны рэвалюцыйная барацьба з ворагамі Савецкай улады не закончана, што яна яшчэ патрабуе вялікага напружання ўсіх сіл. Адначасова з гэтым выступаўшыя прадстаўнікі валасцей адзначалі, што насельніцтва павета цалкам падтрымлівае сваю ўладу. Сяляне прыкладуць усе намаганні, каб узараць і пасеяць усю прыгодную зямлю, дапамогуць сем'ям чырвонаармейцаў. У вёсках адкрываюцца новыя школы, хаты-чытальні, фельчарскія пункты.

Асаблівую ўвагу ўдзяліў з'езд гаспадаркам першых камун, сельскагаспадарчых арцелей. Ім у першую чаргу адводзіліся землі былых памешчыцкіх маёнткаў, аказвалася дапамога насеннем і інвентаром.

*З. Якаўлева, «За камуністычную працу». 16 мая 1968.*

**Ко всем владельцам и управляющим мельниц Могилевского, Чаусского, Быховского уездов и г. Копыси**

Не желая прибегнуть к строгим репрессивным мерам за непредставление сведений по анкетам и не желая закрывать целый ряд мельниц, особенно на уездах, за неисполнение обязательного постановления № 2 Могилевский Окружной Совет Народного хозяйства вместе с Могилевским Земельным Отделом и Могилевским продовольственным комитетом сзывает съезд всех владельцев и управляющих мельниц, находящихся в пределах Могилевского, Чаусского, Быховского уездов и гор. Копыси.

На съезде будут выработаны условия перемола и план нормального снабжения всех мельниц ремонтным и смазочным материалом и топливом. Мельницы, владельцы и управляющие которых не явятся на съезд, не войдут в общий план снабжения и безусловно будут закрыты.

Съезд состоится в Могилеве 24 июля 1919 г. Место явки — Отдел Разных Производств, Могилев, Пожарный пер., д. № 4.

Председатель Могилевского Совнархоза Н. Г. Кирзнер
Комиссар Могилевского Уездгорпродкома Юдин
Заведующий Земотделом Воленберг

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 83, воп. 1, спр. 29, ст. 373.*

**Паведамленне газеты «СОХА И МОЛОТ» аб арганізацыі Валрэўкомаў у Магілёўскім павеце**

**16 верасня 1919 г.**

Работа многіх валвыканкомаў Магілёўскага павета моцна кульгала. Указанні і інструкцыі розных павятовых аддзелаў або зусім не праводзіліся ў жыццё, або праводзіліся толькі фармальна. Намаганні інструктараў аддзела кіравання ні да чаго не прыводзілі, бо віна ляжала на саміх членах валвыканкомаў, якія не жадалі працаваць.

Лічачы неабходным, асабліва ў даны момант, наладзіць работу ў вёсцы, павятовы рэўком пастанавіў: усюды, дзе гэта патрэбна, часова замяніць валвыканкомы рэўкомамі.

У валасцях, блізкіх ад фронту — Вендаражскай, Царкоўішчанскай, Бялыніцкай, Цяцерынскай, — ужо ўтвораны рэўкомы. У кожны рэўком уваходзяць 2 мясцовыя работнікі і па назначэнню павятрэўкома як старшыня — яшчэ адзін мясцовы работнік. Астатнія валасці аб'язджаюцца членамі калегіі ад упраўлення для высвянення становішча і наладжвання работы.

## Паведамленне аб з'ездзе старшынь валасных выканкомаў і рэўкомаў Магілёўскага павета

**5 кастрычніка 1919 г.**

...5 кастрычніка ў памяшканні павятова-гарадскога выканкома адкрыўся з'езд прадстаўнікоў валасных выканкомаў Магілёўскага павета...

1. У першую чаргу заслухоўваюцца даклады з месцаў.

### ВЯЙНЯНСКАЯ ВОЛАСЦЬ

Тав. Галіноўскі. Па меры магчымасці забяспечваюцца сем'і чырвонаармейцаў. За час з 1 студзеня па 1 кастрычніка па сабесу выдадзена каля 600 000 рублёў. Работа зямельнага аддзела па мностве незалежачых прычын не зусім паспяховая, можа здарыцца так, што не ўсе землі будуць засеяны азімымі. Харчовае становішча можна прызнаць дрэнным, моцна адбіваецца беднасць насельніцтва. Работа аддзела народнай адукацыі ў дастатковай ступені паспяховая. У воласці адкрыта 5 новых школ, праводзіцца рамонт школьных памяшканняў, праходзяць перавыбары школьных работнікаў. Функцыянуе цэнтральная бібліятэка. У фінансавых адносінах валвыканком забяспечаны недастаткова, мясцовых сродкаў мала, падаткі слаба паступаюць. Настрой насельніцтва адназначна схіляецца на бок Савецкай улады.

### ПАЛЫКАВІЦКАЯ ВОЛАСЦЬ

Тав. Французаў. Сем'і чырвонаармейцаў забяспечваюцца спраўна, грашовыя дапамогі выдадзены ім па верасень месяц уключна. Акрамя таго, чырвонаармейскім сем'ям раздадзена 50 пудоў жыта на пасеў з ліку 200 пудоў, адпушчаных для гэтай мэты павятземаддзелам. Работа аддзела народнай адукацыі праходзіць паспяхова, у воласці функцыянуе 1 школа другой ступені. Хутка пачне працаваць цэнтральная бібліятэка. Вострай патрэбы ў школьных памяшканнях няма. Падаткі і нядоімкі паступаюць слаба. Харчовае становішча воласці няважнае, колькасць дызерціраў значна скарацілася.

### ВЕНДАРАЖСКАЯ ВОЛАСЦЬ

Тав. Эстэркін. Найпершай задачай новаўтворанага рэўкома было ўстанаўленне нармальнай дзейнасці ўсіх аддзелаў. Сельскія саветы ўсё яшчэ дзейнічаюць слаба. Забеспячэнне чырвонаармейскіх сем'яў пастаўлена добра. 200 пудоў жыта, выдзеленага павятземкомам для сяўбы, раздзелены. Работа зямельнага аддзела не наладжана, праяўляюцца вынікі работы ранейшага выканкома. Харчовае забеспячэнне воласці няважнае. Ёсць 4 млыны, але яны патрабуюць рамонту. Фінансавае становішча вельмі дрэннае. Падаткі паступаюць слаба, мясцовых сродкаў няма зусім. Аддзел народнай асветы за ўсё лета не праявіў сябе ніяк. Школы не рамантаваліся. З вяртаннем школьных работнікаў з павятовых курсаў работа пачала наладжвацца. Хутка пачне функцыянаваць цэнтральная валасная бібліятэка. Валвыканком працуе добра. Дызерцірства выкараняецца.

### ТАЎПЕЧЫЦКАЯ ВОЛАСЦЬ

Тав. Жогаў. Работа валвыканкома не зусім паспяховая. Адчуваецца недахоп узброенай сілы. Фінансавае становішча дрэннае. За ўвесь час рэўпадатку спагнана 65 000 рублёў. Прагрэсіўна-падаходнага падатку паступіла ўсяго 15 000 рублёў. Даводзілася браць пазыку для мясцовых патрэб з паступленняў. Работа ўсіх аддзелаў тармозіцца адсутнасцю сродкаў. Па аддзелу народнай адукацыі адкрыты 2 новыя школьныя комплексы, арганізавана сталярная майстэрня. У воласці ёсць 23 хатычытальні.

КНЯЖЫЦКАЯ ВОЛАСЦЬ

Тав. Калінаў. Выканком вельмі заняты выкананнем розных ваенных нарадаў. Барацьба з дэзерцірствам дае станоўчыя вынікі. Мабілізацыя коней і працоўная павіннасць праходзяць таксама паспяхова. Культурна-асветная дзейнасць развіваецца даволі інтэнсіўна. Аддзелам народнай адукацыі адкрыта школа другой ступені, размяркоўваецца літаратура па школах і хатах-чытальнях.

**Паведамленне газеты «ПУТЬ СОВЕТОВ» аб правядзенні «тыдня фронту» ў Магілёўскім павеце**

**14 красавіка 1920 г.**

«Тыдзень фронту» прайшоў па павету вельмі добра. У вёсцы праведзена энергічная агітацыя. Сяляне ахвотна давалі зброю і прадукты. Грашыма было сабрана звыш 1 000 000 рублёў. Падлік вынікаў «Тыдня фронту» яшчэ не закончаны.

## Звесткі з архіваў

### Баі з белапалякамі 4 чэрвеня 1920 г. на подступах да Магілёва

Вясной 1919 г. у Магілёў прыбыла невялікая каманда 35-га аўтабраняпоезда, сфарміраванага ў Ніжнім Ноўгарадзе. Бранепоезд прымаў удзел у баях пад Мінскам, Слуцкам, Бабруйскам, а пазней і пад Магілёвам.

У час дыслакацыі ў Магілёве браняпоезд папоўніўся вялікай групай шафёраў з магіляўчан, а рабочыя паравознага дэпо станцыі Магілёў адрамантавалі ўсю баявую тэхніку і перарабілі два грузавікі ў бронемашыны. У 1920 г. міжнародны імперыялізм пачаў свой трэці паход супраць Краіны Саветаў. У гэтым паходзе асноўную стаўку імперыялісты рабілі на белапалякаў. Яны захапілі Бабруйск і рушылі на Магілёў.

4 чэрвеня 1920 г. уступіў у свой апошні бой 35-ы аўтабраняпоезд на



Помнік байцам 35-га аўтабраняпоезда і 66-га стралковага палка, якія загінулі ў баях з белапалякамі ў 1920 г.

Бабруйскай шашы каля вёскі Тойкічы. У час бою атрад аказаўся ў вельмі нявыгадным становішчы: высокі насып шашы праходзіў па балоцістай мясцовасці.

Уперадзе белапалякі ўзарвалі мост. Страціўшы манеўранасць, байцы атрада агнём кулямётаў са сваіх бронемашын адбілі многа атак пераўзыходзячых сіл праціўніка, а калі боепрыпасы былі зрасходаваны, увесь асабовы састаў браняпоезда выйшаў з машын і ў рукапашным бай змагаўся да апошняй кроплі крыві. Ніхто не здаўся ў палон. Яны загінулі смерцю герояў. Але гэта гераічная смерць не была паражэннем. Вораг у гэтым баі панёс вялікія страты. Байцы 35-га аўтабраняпоезда надоўга прыкавалі да сябе вялікія сілы ворага і тым самым далі магчымасць Чырвонай Арміі зрабіць удалы манеўр і выйграць бой. Рух белапалякаў на Магілёў быў спынены.

За гераічныя подзвігі ў гэтым баі загадам Рэўваенсавета рэспублікі былі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга пасмяротна: камандзір бронемашыны Усаў Васіль Міхайлавіч, кулямётчык Міхайлаў Аляксей Васілевіч, кулямётчык Філатаў Іван Мікалаевіч.

7 чэрвеня 1920 г. пятнаццаць загінуўшых былі пахаваны з ушанаваннямі ў Магілёве на Савецкай плошчы.

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 1065, воп. 7, спр. 7, л. 77.*

## Магілёўшчына, год 1920-ы

«...Открыл я с тихим шорохом глаза страниц — и потянуло порохом со всех границ...»

Гэтыя радкі міжволі прыходзяць на памяць, калі ў ціхім пакоі абласнога дзяржаўнага архіва адкрываеш падшыўку Магілёўскай павятовай газеты «Соха и молот» за 1920—1921 гг. Па валасцях і сёлах павета толькі што пракацілася грамадзянская вайна... Студзень 1920 г. прынёс з сабой нядоўгую перадышку: заключаны мір з буржуазнымі рэспублікамі Прыбалтыкі, знята эканамічная блакада Антанты. Але нядобрыя сляды пакінуў мінулы, 1919 г.— разруха на транспарце, у прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Працоўнае сялянства павінна аднавіць сваю індывідуальную гаспадарку, каб потым перайсці да калектыўнага вядзення яе. Паводле «Даведкі аб рабоце сельскагаспадарчых калектываў са студзеня 1920 года», якая была апублікавана ў 174-ым нумары газеты «Соха и молот», на тэрыторыі Магілёўскага павета налічвалася ўсяго 6 калектыўных сялянскіх гаспадарак.

У ліпені 1920 г. паведамляла газета аб вялікім мітынгу сялян Дашкаўкі, на якім з дакладам «Аб бягучым моманце» выступалі гарадскія камуністы. Такія ж мітынгі праходзілі і ў іншых валасцях павета. Асаблівая ўвага ўдзялялася рабоце з сялянскай моладдзю. У гэтым жа месяцы 1920 г. у памяшканні Магілёўскага Камуністычнага клуба пачаў сваю работу 1-ы з'езд беспартыйнай сялянскай моладзі павета.

У жніўні 1920 г. у Магілёўскім павеце адбыўся «Тыдзень селяніна». Каля васьмісот камсамольцаў і чырвонаармейцаў выехалі на работу ў вёску. Асабліва многа спраў аказалася ў тых, хто меў прафесію каваля, сталяра, цесляра, краўца. Расказваючы аб выніках «тыдня», «Соха и молот» піша ў нумары ад 4 жніўня 1920 г.: «Скошана сена 2621 воз. Абмалочана і ўбрана 2580 вазоў жыта. Прабаранавана 153 дзесяціны зямлі. Адрамантавана 152 плугі, навострана 102 сярпы. Праведзена 125 сходаў і гутарак з сялянамі на тэму: «Што такое Савецкая ўлада», «Чаму мы ваюем», «Што такое тыдзень селяніна». Гэта была рэальная дапамога

сялу ў спалучэнні з дзейснай арганізацыйна-растлумачальнай работай.

«Больш святла вёсцы!» — пад такім загалоўкам расказвае «Соха и молот» у нумары ад 23 верасня 1920 г. аб з'ездзе рабочых і сялянскіх дэпутатаў Палыкавіцкай воласці. З'езд сабраўся ў Палыкавіцкім народным доме імя Калініна.

У лютым 1921 г. «Соха и молот» паведамляе, што «па павету арганізавана шэсць агранамічных участкаў у наступных пунктах: Палыкавіцкая, Вяйнянская воласці — саўгас «Вейна», Вендаражская і Княжыцкая — саўгас «Буйнічы» і г. д.»

У сакавіку 1921 г. у павеце праходзіць Тыдзень чырвонага аратага. Арганізаваны бясплатны рамонт сельскагаспадарчых прылад, «у першую чаргу сямействам чырвонаармейцаў, адпушчаных у бястэрміновы адпачынак, бяднейшаму сялянству, сераднякам» («Соха и молот» ад 23 сакавіка 1921 г.).

У сакавіку 1921 г. на X з'ездзе партыі харчразвёрстка была заменена для сялян харчпадаткам. Было пастаўлена пытанне аб гандлёвай сувязі дзяржаўнай прамысловасці з дробнатаварнай сялянскай гаспадаркай.

У нумары «Сохи и молота» ад 18 мая 1921 г. тав. Тадэуш, які быў упаўнаважаным павятовага камітэта па правядзенню перавыбараў у сельскіх Саветах Палыкавіцкай воласці, піша: «Сялянства, безумоўна, задаволена заменай харчразвёрсткі харчпадаткам і ўсюды хваліць гэту меру, бачачы ў ёй пачатак умацавання сялянскай гаспадаркі. Намячаецца расшырэнне пасеваў».

Ён дае падрабязны аналіз саставу сельскіх Саветаў воласці: «Саветы па сёлах і вёсках утварыліся яшчэ ў 1918 г. Сацыяльны склад у сельскіх Саветах: 40 працэнтаў сераднякоў і 60 працэнтаў беднай вёскі. ...Нельга не адзначыць, што вёска змагла вылучыць і вылучае многа дзейсных работнікаў, у якіх клопаты аб уладкаванні чыста мясцовых спраў спалучаюцца з высокім разуменнем агульнадзяржаўных інтарэсаў». Пачынае расці і культурны ўзровень магілёўскай вёскі. Выступаючы ў маі 1921 г. на шостым з'ездзе павятовых Саветаў, загадчык аддзела народнай адукацыі тав. Лазінскі прыводзіць наступныя лічбы: у павеце налічваецца 392 хаты-чытальні. Да рэвалюцыі ў горадзе быў толькі адзін дзіцячы сад, а зараз па павету іх 19. Сялянства зразумела, што дзіцячы сад патрэбен.

У чэрвені 1921 г. газета паведамляла аб правядзенні тыдня агітацыі за ліквідацыю непісьменнасці. Ставіцца новы лозунг дня: «Барацьба з непісьменнасцю — барацьба з разрухай».

Пачыналася вялікая работа на вёсцы, тая работа, якая падрыхтавала пераход сялянскіх гаспадарак на рэйкі новага, калектыўнага жыцця.

*Н. Канстанцінава «За камуністычную працу» 11 кастрычніка 1966.*

**З паведамленняў газеты «СОХА И МОЛОТ»**

**14 студзеня 1921 г.**

ВЦИК издал постановление об учреждении в губерниях, уездах (районах) и волостях комитетов по расширению посевов и улучшению обработки земли — посевкомов.

Посевкомы будут работать для всесторонней помощи крестьянскому хозяйству республики. Кроме того, для дальнейшего развития самостоятельности масс крестьянского хозяйства при сельских советах учреждаются крестьянские комитеты по улучшению сельского хозяйства.

**7 жніўня 1921 г.**

Могилевский уезд должен сдать к 15 августа для отправки в голодающие губернии 35 000 пудов ржи...

**6 верасня 1921 г.**

В нашем селе Пашкове Полыковичской волости гражданка М. Прокопенкова занимает три должности:

1) школьной работницы, обучая взрослых и совершенно безграмотных граждан деревни;

2) секретаря сельсовета;

3) должность счетовода в нашем кооперативе, каковую работу она выполняет исключительно по праздничным дням. Таких бы побольше.

**6 верасня 1921 г.**

В Полыковичах открылся на днях волостной Экономический совет, которому предстоит выполнить целый ряд организационных задач.

Открытие Экономсовета сопровождалось докладом местного уполномоченного по сбору продналога т. Тадеуша о роли и задачах Экономсовета вообще и Полыковичского в частности.

### З пратакола нарады аб лапцепляценні

**17 студзеня 1921 г.**

Прысутнічалі: Чусаснабарм-16 тав. Красікаў, надзінспектар па Магілёўскаму раёну т. Брук, ад Рабоча-сялянскай інспекцыі 16-ай арміі т. Грудзінскі, загадчык Укустпрома т. Чарняўскі і ўпаўнаважаны Мурманскага жэляскома т. Гурэвіч.

Парадак дня:

1. Аб падаўжэнні тэрміну дзеяння нараду на выраб лапцяў для 16-ай арміі.
2. Аб расцэнцы.
3. Аб кантролі над вытворчасцю.
4. Аб тыпе лапцяў.
5. Аб парадку прыёмкі лапцяў.
6. Аб набыцці лыка.

Пастанавілі:

Па першаму пункту: Нарад, дадзены жэляскому, аднавіць на 50 000 пар лапцяў з тым, каб пасля іх вырабу нарад зноў аднавіць. Тэрмін вырабу ўказанай колькасці лапцяў з дня дастаўкі лыка ў Магілёў устанавіць паўтара месяца.

Па пункту другому: Нарад аднаўляецца на ранейшых умовах, г. зн. 300 руб. з пары і прэміровачны паёк 1/20 фунта мыла, 1/20 фунта солі і 1/20 фунта табакі за кожную пару, каб у выпадку заявы Мурмжэляскома аб нізкай расцэнцы, пытанне аб павышэнні цаны на пару перадаць на сумесны разгляд і заключэнне фабрычна-заводскага аддзела Саўнаргаса П. Р. К. І. 16-ай арміі.

Па пункту трэцяму: Кантроль не ўстанаўліваць.

Па пункту чацвёртаму: З прадстаўленых Мурманскім жэляскомам для прагляду лапцяў устаноўлена, што яны па сваёй якасці з'яўляюцца крайне ненадзейнымі ў носцы, для чаго пры далейшым вырабе лапцяў да іх днішча прыбавіць яшчэ адзін рад — знешнюю сетку.

На прапанаваны тып вырабіць узоры і прадставіць для агляду.

Па пункту пятаму: Прыёмку выробленых лапцяў на нарадах Чусаснабарма-16 Ваенна-гаспадарчае забеспячэнне павінна праводзіць пасля агляду Ваенна-акруговай камісіі прыёмку.

Па пункту шостаму: Мурманскаму жэляскому прадстаўляецца права даставіць лыка ў неазначанай колькасці, за дастаўку якога жэляскому адпускаецца 40 працэнтаў з ліку дастаўленага лыка ў Магілёў, акрамя таго, выплочваюцца ўсе расходы па дастаўцы лыка, прызначанага арміі, і аказваць усе меры садзейнічання хутчэйшай перавозцы лыка.

Арыгінал падпісалі: заг. Чусаснабарм-16 І. Красікаў; надз. інспектар Маграёна Брук; прадст. ад РКІ 16-ай арміі Грудзінскі; загад. Укустпрома Чарняўскі; ўпаўнаважаны Муржэляскома Гурэвіч.
Заверыў: ст. Справавод Чусо 16-ай арміі (подпіс)

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 2, воп. 1, спр. 731.*

## З паведамленняў газеты «СОХА И МОЛОТ»

**14 красавіка 1921 г.**

Что такое натуральный налог и для чего он введен. Это точно определенная на каждый год доля для сельских продуктов, которую крестьянин обязан сдать государству для того, чтобы оно могло обеспечить пайки Красной Армии, рабочим и прочему не земледельческому населению. Другая часть сельских продуктов остается в полном распоряжении крестьянина, чтобы он мог расширить и улучшить свое хозяйство и выменять на них, что ему надо.

Свободный обмен продуктами разрешен только в пределах местного хозяйственного оборота для того, чтобы облегчить мелким производителям крестьянам и кустарям приобретение необходимых для хозяйства продуктов. Советская власть приглашает трудящихся обменивать через кооперативы, чтобы не плодить спекулянтов. Советская власть сама будет обменивать фабрично-заводские продукты на сельские, чтобы наибольшая часть продовольствия попала в общий котел для всех трудящихся.

**23 чэрвеня 1921 г.**

18 июня 1921 г. на заседании исполкома рассматривался вопрос о продовольственном положении в Могилевском уезде.

Из доклада видно, что продовольственных запасов на складах уезда имеется 4400 пудов. Паек за месяц будет выдан, но на июнь месяц продовольственных запасов не хватит. Ожидать получения продуктов извне не приходится. Поэтому необходимо обратить главное внимание на товарообмен, чтобы создать запас для общественного питания и выдачи пайки рабочим в течение июня и июля месяцев, т. е. до нового урожая. Содокладчик тов. Березкин сообщил, что для товарообмена в Могилеве организуется три товарообменных пункта. Необходимо усилить организацию товарообмена в деревне. Нельзя бороться с частными закупками, но необходимо запретить вывоз продовольственных продуктов за пределы уезда. Тов. Фейман указал, что при создавшемся положении продовольственных запасов до нового урожая не хватит и рассчитывать на товарообмен не представляется возможным, так как нельзя установить эквивалента, ибо цены растут с каждым днем.

Выступающий Гликин добавил, что для товарооборота с деревней заключено 6 договоров, организуются товарообменные пункты в Княжицах, Полыковичах и Сухоревской волости Чаусского уезда, организуются также передвижные лавки.

Тов. Бенск высказался против организации передвижных лавок, но предложил просить разрешения на закупку продуктов на Украине.

Тов. Березкин в заключительном слове сказал, что Райотделение еще недостаточно прониклось духом товарообмена, товарообмен передвижным способом на автомобилях будет иметь еще агитационный характер. Товарообмена на Украине не представляется возможным вести за неимением предметов местного производства. Тов. Березкин настаивает на усилении организации промысловой кооперации, усилив кустарную промышленность.

Для общественного питания имеется только 1500 пудов овса.

Тов. Потемкин указал, что нужно строго запретить продажу и обмен монополизированных продуктов соли и керосина и запретить вывоз по железной дороге продуктов из уезда.

Принята резолюция следующего содержания:

1) Ввиду громадного наплыва мешочников в уезд и неупорядоченности товарообмена запретить вывоз хлеба из пределов Могилевского уезда и товарообмен внутри

уезда на соль, керосин и другие монополизированные продукты, без особого разрешения на то райотделения Губсоюза.

2) Обратить особое внимание на развитие кооперации и товарообмена, для чего:

а) Для предоставления рабочим немедленного получения хлеба в обмен процентного отчисления продуктов своего производства выдать комитету рабкопа ЕПО авансом 500 пуд. хлеба, такое количество упродкомом выдать рабкопу взаимообразно.

б) Немедленно открыть товарообменные пункты в городе.

в) Предложить на Украине Райотделению Губсоюза для обмена выделить часть продуктов из отчислений Могилевского производства.

3) Для урегулирования вопросов товарообмена создать товарообменную коллегию в составе одного представителя от комитета рабкопа ЕПО и одного от Президиума упрофбюро.

4) Ввиду критического продовольственного положения Могилевскому уезду всемерно усилить товарообмен через многолавки.

5) Усилить общественное питание, отдав часть продуктов, полученных от товарообмена, в первую очередь для нужд общественного питания.

6) Впредь до улучшения положения с продовольственными запасами, выдачей продпайка за май месяц воздержаться, за исключением медперсонала и мелко выделенных групп.

7) Просить Губисполком и Губпродком ввиду незначительного количества продресурсов в Могилевском уезде оказать помощь продовольствием из запасов других уездов губернии на предмет снабжения Могилевского гарнизона, ибо дальнейшее снабжение последнего из местных продресурсов может оставить детское питание и больницы без удовлетворения продуктами.

**28 жніўня 1921 г.**

Свою задачу по отправке 35 000 пудов семенной ржи к 15 августа Могилевский уезд выполнил к сроку. Ныне получено новое задание: к 1 сентября погрузить и отправить еще 10 000 пудов семссуды в Башкирскую республику. Это задание, по словам упродкомиссара, будет выполнено к 28 августа, ибо время не терпит. Осень близко, до Башкирской республики дорога далека.

Упродкомом получен наряд на 150 000 пудов картофеля, 50 000 пудов этого картофеля пойдет общепиту, 25 000 пудов для сушки и 75 000 пудов для отправки в Петроград. Отправка картофеля должна начаться не позднее 15 сентября.

Сбор продналога на рожь по всем волостям идет успешно. Некоторые волости выполнили продналог на 95—96 процентов. Отношение крестьян хорошее.

## Калі раён быў паветам...

16 чэрвеня 1921 г. быў арганізаваны Магілёўскі павятовы эканамічны савет. У яго склад увайшлі К. Бенск (старшыня), Ф. Казлоў (намеснік старшыні), Кірзнер (загадчык прамысловага аддзела), Сухарэўскі (узначаліў упрпрафбюро), Механік (павятовы земаддзел), Дзем'янкоў (фінаддзел), Гальдштэйн (рабкрын) і 4 іншыя прадстаўнікі. Галоўную ўвагу ў сваёй рабоце павятовы эканамічны савет удзяляў пытанням арганізацыі вытворчасці. Неабходна было выдзеліць, акрамя ўвайшоўшых у Дзяржплан, тыя прадпрыемствы, якія прыносілі даход і маглі існаваць на пачатках самазабеспячэння, выпрацаваць для іх вытворчую праграму, нормы забеспячэння рабочых і інш. Работа павятовага эканамічнага савета дала адчувальныя вынікі. Прамысловы аддзел сканцэнтраваў сваю ўвагу толькі на некалькіх прадпрыемствах, астатнія здаў у арэнду. Пытанням сельскагаспадарчай вытворчасці павятовы эканамічны савет удзяляў найменш увагі. Усе пытанні

па ўздыму і арганізацыі сельскай гаспадаркі былі ўскладзены выключна на пастаянную камісію, якая называлася пасяўком. У той час у галіне гандлю і тавараабмену павятовы эканамічны савет праводзіў таксама значную работу. Быў рэгламентаваны прыватны гандаль. Дзякуючы добра пастаўленаму тавараабмену, паспяхова быў выкананы нарад на насенне жыта для галадаючага Паволжжа, вялася рэалізацыя прадуктаў прамысловасці ў лік заработнай платы рабочых. Рашаліся пытанні аб прафсаюзах. Удзел у арганізацыі вытворчасці, забеспячэнні рабочых, пытанні быту, забеспячэнне жыллём, ацяпленнем, асвятленнем і г. д.— гэта былі пытанні, якія адставалі ў агульным тэмпе гаспадарчай работы, паколькі яны маглі быць вырашаны галоўным чынам цэнтралізавана.

Пасля атрымання з цэнтра распараджэння прыступіць да дзяржаўнага тавараабмену ў адпаведнасці з новымі прынцыпамі эканамічнай палітыкі павятовы эканамічны савет правёў вялікую растлумачальную работу з прадстаўнікамі спажывецкіх таварыстваў. Вялікую ролю ў развіцці тавараабмену адыгрывалі ў павеце і горадзе пастаянныя тавараабменныя пункты. У сельскай мясцовасці сялян абслугоўвалі дробныя млыны і кузні. Цікава, што кузні знаходзіліся ў руках прыватных асоб, а млыны былі здадзены ў арэнду васьмі кааператывам, 25 прыватным асобам, двум саўгасам і двум арцелям. Абслугоўваннем вясковых жыхароў займаліся, акрамя таго, 128 гандлёвых лавак. На працягу 1921 г. кааперацыя павета аддала ў абмен і атрымала: 83 834 аршыны мануфактуры (атрымала за гэта 23 469 пудоў жыта), 11 455 пудоў солі (атрымала 3146 пудоў аржаной мукі), 956 літраў газы (атрымала 191 пуд круп), 160 плугоў (атрымала 222 сотні яек), 2820 кос (атрымала 18 пудоў сметанковага масла). Тавараабменныя аперацыі вяліся праз спажывецкія таварыствы: з імі заключаліся дагаворы, па якіх яны атрымлівалі вызначаную колькасць тавараў, а самі ў сваю чаргу абавязаліся ў пэўны тэрмін дастаўляць патрэбную колькасць сельскагаспадарчых прадуктаў. Адметна, што пратэрміновак у рэалізацыі дагавораў не было адзначана ніводнага разу.

У справаздачы павятовага эканамічнага савета Савету працы і абароны РСФСР на 1 кастрычніка 1921 г. ёсць звесткі аб развіцці народнай асветы, культуры, сеткі аховы здароўя на Магілёўшчыне. З вышэйшых навучальных устаноў у павеце працаваў Магілёўскі хіміка-механічны тэхнікум, які з 1 верасня 1921 г. утварыўся на аснове Практычнага інстытута. Яго наведвалі 199 слухачоў. У асноўным гэта былі сяляне, гарадскія грамадзяне, служачыя, невялікі працэнт складалі рабочыя. Працавалі ў павеце ў той час таксама тры прафесіянальна-тэхнічныя школы. 154 чалавекі папаўнялі свае веды і атрымлівалі прафесію на пастаянна дзеючых курсах, якіх у горадзе было трое: агульныя педагагічныя, яўрэйскія педагагічныя і курсы гарбарнай вытворчасці. Вучэбнымі дапаможнікамі навучэнцы тэхнікума, школ і курсаў былі забяспечаны дрэнна. Таму адным падручнікам адначасова карысталіся 20—30 чалавек.

Прафсаюзы актыўна ўдзельнічалі ў дзейнасці навучальных устаноў. Выражалася гэта ў сумесным (разам з павятовым прафбюро) вырашэнні ўсіх прынцыповых пытанняў. Нядрэнна для таго часу была развіта ў павеце і самім Магілёве сетка вышэйшай народнай адукацыі. Інстытут народнай адукацыі не толькі вучыў пісьменнасці, прафесіі, але і аб'ядноўваў аматараў прыродазнаўства, якія вялі збор навуковых матэрыялаў аб прыродзе роднага краю. Дзве партыйна-савецкія школы (агульная і яўрэйская) рыхтавалі 76 спецыялістаў адпаведнай адукацыі.

З 1 верасня 1921 г. у сістэме народнай асветы праведзена рэформа. Да яе ў горадзе было адкрыта 49 школ першай ступені і 20 школ другой ступені. Аднак, як відаць з справаздачы, у папярэднім, 1920 г., 30 школ з гэтай колькасці не працавалі. Прычын было многа, асноўныя з іх — адсутнасць кваліфікаваных спецыялістаў-настаўнікаў, недахоп памяшканняў і падручнікаў. У мэтах аблягчэння становішча навучэнцаў павятовы выканком няўхільна праводзіў у жыццё палажэнне губернскага выканкома аб школьна-гаспадарчых камітэтах. Акрамя таго, вялікія надзеі ўскладаліся на дадатковае самаабкладанне сельскага насельніцтва для культурна-асветных мэт, на ўтрыманне навучэнцаў школ. Непасрэдна для патрэб школ і іх вучняў у некаторых валасцях павета насельніцтва па ўласнаму жаданню ўстанаўлівала самаабкладанне. Бібліятэчная справа ў павеце была на вельмі нізкім узроўні. Гэта тлумачылася недахопам кадраў. Кампенсавала ў нейкай меры такое становішча спраў тэатральнае жыццё горада, павета. У гарадскім тэатры праводзіўся цыкл гістарычных і іншых канцэртаў сімфанічнага аркестра. У Народным доме выступала трупа «Шуканне», якая ставіла для гараджан выключна новыя работы, у асноўным рэвалюцыйнага зместу. У вёсцы для сялян спектаклі ставіліся валаснымі драматычнымі гурткамі. У 1921 г. у Магілёўскім павеце працавала 5 бальніц на 140 ложкаў. Насельніцтва абслугоўвалі 11 урачоў і 19 фельчараў. Амбулаторны прыём і дапамогу на доме аказвалі людзям 5 участковых урачоў і 12 фельчарскіх пунктаў.

*В. Ігнацьеў «За камуністычную працу».*
*12 студзеня 1988, 28 мая 1988.*

**З справаздачы Магілёўскага павятовага эканамічнага савета працы і абароны на 1 кастрычніка 1921 года**

АДНОСІНЫ ДЗЯРЖАВЫ ДА КАПІТАЛІСТАЎ

У сувязі з заменай развёрсткі падаткам і дазволам свабоднага гандлю прадуктамі сельскай гаспадаркі і саматужнай дробнай прамысловасці прыватны гандаль у павеце значна развіўся. Паддаецца ўліку толькі адзін бок гандлю — якасць, колькасны бок (абарот, памеры, прыбытак і інш.) уліку не паддаецца. Трэба дадаць, што аптовага гандлю і не відаць, бо ўсякі больш або менш буйны гандаль у межах павета носіць характар спекуляцыі. У сувязі са свабодным гандлем павялічыўся рост махлярства, якое прымае часам вялікія памеры, забяспечваючы мясцовы рынак тымі прадуктамі, якіх тут няма, а значыць, дыктуючы на іх цэны. Рэгістрацыя гандлю праводзіцца асобай камісіяй пры камунаддзеле.

Выпадкі прапановы з боку капіталістаў і прадпрымальнікаў узяць у арэнду прадпрыемствы, установы і гандлёвыя памяшканні былі. Некаторыя з іх насілі яўна не дзелавы, а спекулятыўны характар, напрыклад прапанова гр. Пясельніка аб здачы яму ў арэнду Копыскіх заводаў (кафельных). Больш за ўсё прапановы арэнды датычылі такіх прадпрыемстваў, якія адраджаюць прыбытак (млыны). Прадпрыемствы, якія патрабуюць папярэдняй затраты капіталу, арандатараў не прываблiваюць. Тлумачыцца гэта, напэўна, адсутнасцю сродкаў у сапраўдных прадпрымальнікаў і канцэнтрацыяй сродкаў у спекулянтаў, якія аддаюць перавагу спекулятыўным прыбыткам перад прадпрымальніцкімі.

Прапановы камісійнага характару былі і датычылі збору і закупак прадуктаў у карысць дзяржавы і дастаўкі сыравіны. Была прапанова, напрыклад, дастаўляць і нарыхтоўваць ільняное семя для маслабойнага завода. Семя дастаўлялася не ніжэй 87 працэнтаў чысціні. За гэта плацілі 6 фун. масла і 15 фун. жмыху. Прапанова была адвергнута дагаворнай камісіяй і заменена другой...

Саматужная прамысловасць, хоць і вельмі марудна, але развіваецца. Павялічылася колькасць саматужных прадпрыемстваў. Праўда, побач з імі пад выглядамі

саматужных узнікаюць спекулятыўныя арганізацыі. Асноўная прыкмета такіх спекулятыўных саматужнікаў заключаецца ў тым, што яны пад фірмай «працоўнага саматужніцтва» вядуць спекулятыўны гандаль, карыстаючыся, як саматужнікі, льготамі дзяржавы. Прыкладам можа служыць «Днепрапустпромсаюз». З саматужнай прамысловасці, якая мела пад сабой глебу для далейшага развіцця, трэба адзначыць дрэваапрацоўчую і ганчарную.

## ЗААХВОЧВАННЕ САМАСТОЙНАГА ПАЧЫНУ Ў СПРАВЕ ТАВАРААБМЕНУ І ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА НАОГУЛ

1. У гэтай галіне пакуль яшчэ нічога не зроблена. Ні ў галіне тавараабмену, ні ў галіне гаспадарчага будаўніцтва ніякіх заахвочванняў не рабілася.

## ПАЛЯПШЭННЕ СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ І СЯЛЯН

1. Умовы гаспадарчага будаўніцтва пакуль такія нязначныя, што істотнага ўплыву на паляпшэнне становішча рабочых да гэтага часу не аказалі. Становішча сялян у гэтых адносінах ніколькі не лепшае. Замена развёрсткі харчпадаткам дае сялянам магчымасць рэальна палепшыць становішча ўжо зараз.

2. Паляпшэнне быту рабочых праводзілася часткова ў перыяд з мая па жнівень камісіяй па паляпшэнню быту рабочых. Цяпер гэта камісія ўжо не працуе. Але за перыяд дзейнасці ёй усё ж праведзена даволі значная пры існуючых умовах работа. Было перасялена некалькі сот рабочых у лепшыя кватэры. Пад кіраўніцтвам камісіі былі арганізаваны дамы адпачынку, праз якія прайшлі ўжо некалькі сот чалавек. Камісія адправіла некалькі дзесяткаў чалавек у санаторыі на поўдзень. Праводзілася забеспячэнне рабочых адзеннем і абуткам.

3. Работа камісіі па паляпшэнню быту рабочых праводзілася толькі прафсаюзамі.

4. Сельскагаспадарчая кааперацыя ў павеце слабая, і ніякага ўплыву на паляпшэнне становішча сялян не мае.

## УЗДЫМ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

І с н а в а л і: а) сялянская гаспадарка, б) саўгасы, в) камуны, г) арцелі, д) таварыствы, е) іншыя віды грамадскай гаспадаркі.

1. Пасяўная плошча 1921 г. у параўнанні з 1920 г. дакладна не ўстаноўлена. За 1921 г. ёсць дакладныя звесткі, правераныя месцамі. Даюцца яны ў наступным выглядзе:

а) У сялян і сельскіх абшчынах пасяўная плошча 1921 г. была такой: азімы клін — 33 334 дзесяціны, яравы — 27 887 дзесяцін. Азімы клін 1921 г. павялічаны да нормы 1916 г., а яравы — да 1917 г. Для азімага прыблізны працэнт павелічэння — 10 працэнтаў, для яравога — 15 працэнтаў.

б) У сельскіх гаспадарках азімы клін у 10 саўгасах у 1920 г. складаў 204 дзесяціны, а ў 1921 г. у 6 саўгасах — 220 дзесяцін (4 саўгасы расфарміраваны, што дае абсалютны працэнт павелічэння 8 працэнтаў і адносны — 47). Яравы клін 1920 г. склаў 207 дзесяцін (10 саўгасаў), а ў 1921 г. — 242 дзесяціны (6 саўгасаў).

в) Камун у павеце няма.

г) У арцелях азімы клін быў у 1920 г. 66 дзесяцін, у 1921 г. — 248 дзесяцін, што складае павелічэнне 290 працэнтаў. Яравы клін у 1920 г. — 100 дзесяцін, у 1921 г. — 124, што складае павелічэнне на 27 працэнтаў.

2. У параўнанні з 1920 г. колькасць рабочай і прадуктыўнай жывёлы, прымаючы пад увагу ўсе гаспадаркі павета, павялічылася мала. Прычыны: хвароба чума, якая лютавала ў павеце некалькі месяцаў, а таксама кароста, ад якой пацярпела многа коней, падзёж свіней. Дакладных звестак тут няма. Па сялянскіх гаспадарках ёсць даныя перапісу мінулага года. Там такія лічбы: коней старэй чатырох гадоў — 21 753, разам з больш маладымі — 28 489; кароў — 28 534; авечак і баранаў — 27 311; свіней і баранаў старэй аднаго года — 21 300, разам з больш маладымі — 44 253. Для бягучага года колькасць коней трэба павялічыць на 2—3 працэнты, для буйной рагатай жывёлы — 3—4 і для дробнай — на 4—5 працэнтаў.

У савецкіх гаспадарках колькасць рабочай і прадуктыўнай жывёлы даецца ў наступных лічбах:

| 1920 г. | 1921 г. |
|---|---|
| Коней — 74 | 84 (павеліч. на 13 прац.) |
| Кароў — 73 | 69 (зменшылася 5 прац.) |
| Цялят — 36 | 61 (павелічэнне на 70 прац.) |
| Свіней — 22 | 24 (павелічэнне на 8 1/2 прац.) |
| Парасят — 8 | 33 (павелічэнне на 266 прац.) |

У арцелях колькасць рабочай і прадуктыўнай жывёлы ў 1921 г. (да справаздачнага перыяду) выглядае так: коней — 168, маладняку — 29; кароў — 231, маладняку — 62; свіней — 251, авечак — 249.

Звестак за 1920 г. няма, таму параўнанне правесці цяжка, але агульны працэнт павелічэння можна лічыць ад 5 да 7.

У справе паляпшэння сялянскай гаспадаркі саўгасы адыгрываюць пакуль нязначную ролю. Яны толькі часткова, у абмежаванай колькасці, забяспечваюць сялянскія гаспадаркі адборным насеннем, прычым абменна. Дрэнная пастаноўка справы ў саўгасах і іх арганізацыі перашкаджала тое, што павет амаль на працягу трох гадоў быў прыфрантавым. Здараліся такія выпадкі: агент Паветпрадарма з'яўляецца з атрадам у саўгас і на працягу 3 гадзін вывозяць тут жа, на месцы, пагалоўна ўсю жывёлу, без уліку, прадуктыўнай і племянной...

Найбольш жыццёвымі і стойкімі з'яўляюцца саўгасы, якія знаходзяцца ў веданні Земаддзела (вёскі Буйнічы, Крывое). Слабае прыцягненне сялянскіх гаспадарак у калектыўныя тлумачыцца часткова дрэннай арганізацыяй існуючых калектыўных гаспадарак, якія пакуль не могуць быць узорам. Зямля да гэтага часу не раздзелена па цвёрдых нормах. Гэта вымушае сялян ускладаць перабольшаныя надзеі на правядзенне Закона аб сацыялістычным землеўпарадкаванні.

Трэба як мага хутчэй для ўздыму сельскай гаспадаркі правесці перазмеркаванне зямлі па адпаведнаму плану: павысіць узровень агранамічных ведаў на вёсцы, звярнуць больш увагі на сельгаскааперацыю, забяспечыць статкі племяннымі вытворнікамі, арганізаваць дзяржаўны насенны фонд на крэдытных асновах; упарадкаваць справу з працагужпадаткам.

## УЗДЫМ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Па перапісу 1920 г. у Магілёўскім павеце знаходзіліся наступныя прадпрыемствы (усе нацыяналізаваны, за выключэннем аднаго паліграфічнага і 5 хімічных прадпрыемстваў): будаўнічыя — 7 (колькасць рабочых — 144), вінакурныя — 10 (-), запалкавая фабрыка — 1 (115), металаапрацоўчыя — 2 (153), мукамольныя — 14 (116), паліграфічныя — 2 (105), кравецкія — 4 (629), пісчапапяровая фабрыка — 1 (115), скарняжныя — 2 (165), скураныя — 16 (306), смалакурныя — 76 (186), торфазавод — 1 (звыш 100), тэкстыльная прамысловасць — 3 (70), утылізацыйная — 3 (34), харчовая — 6 (127), хімічная — 6 (-), электрастанцыі — 1 (44).

У межах Магілёўскага павета існавалі і часткова існуюць наступныя саматужныя промыслы: дрэваапрацоўчы, выраб рэчаў з ільну і пянькі, шарсцяны і валяны промыслы, маслабойны, крупадзёрная і мукамольная прамысловасць, скураная; промыслы: скарняжны, рымарскі, клеяварны, грабенны, ганчарных вырабаў, пляценне кошыкаў, кавальскі промысел, слясарны, кравецкі, шапачны, абутковы, мылаварны, смалакурны, наогул перапрацоўка прадуктаў драўніны.

## КОЛЬКАСЦЬ САМАТУЖНІКАЎ ПА ПРАФЕСІЯХ:

краўцоў і швачак — 322, шаўцоў — 235, кавалёў — 61, скураапрацоўшчыкаў — 50, хімікаў — 49, гадзіннікавых спраў майстроў — 47, нарыхтоўшчыкаў — 37, слесараў — 35, сталяроў — 35, шапачнікаў — 33, мылавараў — 34, ганчароў — 29,

бляхароў і дахаўшчыкоў — 32, крупадзёраў — 10, майстроў пляцення кошыкаў — 16, цырульнікаў — 12, ювеліраў — 15, фатографаў — 11, жывапісцаў — 3 і інш.

## АБ ЛЯСІСТАСЦІ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЕТА

| Назва воласці | Колькасць зямлі ў дзесяцінах | | | | Працэнт лясістасці |
|---|---|---|---|---|---|
| | прыдатнай | непрыдатнай | пад лесам | Усяго | |
| Бялыніцкая | 11 337 | 2862 1/2 | 9000 | 23 199 1/4 | 39 |
| Вендаражская | 19 677 | 1751 | 7300 | 28 728 | 25 |
| Вяйнянская | 10 500 1/4 | 302 1/4 | 6500 | 17 302 1/2 | 37 |
| Княжыцкая | 9592 1/2 | 1343 | 3500 | 14 435 1/2 | 24 |
| Круглянская | 19 257 1/2 | 1725 | 7200 | 28 182 1/2 | 26 |
| Нежкаўская | 15 299 | 1672 | 3600 | 20 571 | 18 |
| Палыкавіцкая | 14 189 1/2 | 12 | 3600 | 17 802 1/4 | 20 |
| Паўлавіцкая | 15 335 | 228 | 6800 | 24 419 | 28 |
| Таўпечыцкая | 11 936 1/2 | 552 1/2 | 4500 | 16 999 | 26 |
| Царковіцкая | 8206 | 531 1/2 | 5600 | 14 337 1/2 | 39 |
| Цяцерынская | 18 844 | 1772 1/2 | 7500 | 28 116 1/2 | 27 |
| Чарнаруцкая | 14 629 | 1042 1/4 | 3400 | 19 071 1/4 | 18 |
| Шклоўская | 15 235 1/2 | 1218 | 3500 | 19 958 1/2 | 18 |
| Усяго: | 1 840 150 1/4 | 17 069 | 72 900 | 273 119 1/4 | 26 |

## НАРОДНАЯ АДУКАЦЫЯ

Школ 1-ай ступені ў павеце 316, 2-ой — 6. Ліквідацыя непісьменнасці ў горадзе і павеце праходзіць непаспяхова. Адносіны да ліквідацыі непісьменнасці сялян і рабочых пасіўныя. Для поўнай ліквідацыі непісьменнасці насельніцтва разбіта на 4 групы, па паўгода на кожную (4 сесіі).

Барацьба з дзіцячай злачыннасцю вядзецца камісіяй па разгляду спраў непаўналетніх. За апошні год колькасць спраў павялічылася з 19 да 300. Для маральна дэфектных дзяцей у павеце ёсць адна калонія для хлопчыкаў на 30 чалавек, дзе вядуцца сельскагаспадарчыя работы і дзе дзеці вучацца кавальскаму, слясарнаму, сталярнаму і шавецкаму майстэрству.

## АХОВА ЗДАРОЎЯ

У павеце функцыяніруе 5 бальніц на 140 ложкаў. Лячэбныя ўстановы забяспечаны медыкаментамі і прадуктамі харчавання крайне недастаткова. Асабліва востра адчуваецца недахоп перавязачных матэрыялаў, лекаў для спецыяльнага лячэння сіфілісу, прадметаў догляду хворых.

У павеце амбулаторны прыём і дапамога на доме аказваюцца ўчастковымі ўрачамі і фельчарамі. Усяго ўчастковых урачоў — 5, самастойных фельчарскіх пунктаў — 12.

За апошнія два-тры гады халерных захворванняў у павеце не было. За 1-ае паўгоддзе 1921 г. хворых сыпным тыфам у Магілёўскім павеце было 1901, а зваротным — 1306 выпадкаў.

Урачоў усяго: у горадзе 39, у павеце — 11, фельчараў у горадзе 43, у павеце — 19; ніжэйшага медыцынскага персаналу (павівальных бабак, акушэрак, сясцёр міласэрнасці) у горадзе і павеце — 113.

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 769, воп. 1, спр. 1.*

## Магілёўшчына ў гады новай эканамічнай палітыкі

Пасля грамадзянскай вайны ў жыцці краіны пачаўся новы перыяд, вядомы як новая эканамічная палітыка (нэп). Абвешчаная ў сакавіку 1921 г. на X з'ездзе РКП(б), яна дала магчымасць за даволі кароткі час аднавіць разбураную гаспадарку, вырашыць іншыя праблемы. Вялікую цікавасць у вырашэнні гэтых праблем уяўляюць дадзеныя статыстыкі, якія доўгі час не афішыраваліся, былі «для службовага карыстання». У артыкуле, абапіраючыся ў асноўным на матэрыялы «Статистического ежегодника БССР за 1923—1924 гг.» робіцца спроба высветліць становішча на Магілёўшчыне ў першыя гады нэпа. Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. на тэрыторыі былой Магілёўскай губерні адбыліся адміністрацыйныя змяненні. 26 красавіка 1919 г. губерня была ліквідавана і большасць яе паветаў увайшла ў склад Гомельскай губерні, якая знаходзілася ў межах РСФСР. Магілёў стаў цэнтрам павета. Пасля першага ўзбуйнення БССР павет зноў увайшоў у склад БССР. З 17 ліпеня 1924 г. была ўтворана Магілёўская акруга ў складзе 10 раёнаў: Магілёўскага, Бялыніцкага, Чачэвіцкага, Быхаўскага, Кармянскага, Прапойскага, Шклоўскага, Чавускага, Лупалаўскага і Журавіцкага. Па адміністрацыйнаму падзелу ў акругу ўваходзілі 161 сельсавет, 4 гарады (Магілёў, Быхаў, Чавусы, Шклоў) і 3 пасяленні гарадскога тыпу з насельніцтвам больш за 2 тыс. чалавек (Бялынічы, Карма, Прапойск), 1575 населеных пунктаў з насельніцтвам да 2 тыс. чалавек. Агульная плошча акругі складала 11 601,78 кв. км, насельніцтва — 545 535 чалавек, у тым ліку 470 921 сельскіх (86,32 працэнта) і 74 614 (13,68 працэнта) гарадскіх жыхароў.

На 1 студзеня 1925 г. у акрузе пражывала 337 576 (61,88 працэнта) беларусаў, 146 590 (26,87 працэнта) рускіх і ўкраінцаў, 6769 (1,24 працэнта) палякаў, 51 083 (9,36 працэнта) яўрэяў.

Новая эканамічная палітыка дапускала існаванне прыватнаўласніцкага сектара, выкарыстанне наёмнай працы. Гэта непазбежна прыводзіла да пэўнай класавай дыферэнцыяцыі. Па гарадскому перапісу 1923 г. сярод насельніцтва гарадоў і пасяленняў гарадскога тыпу (81 560 чалавек) налічвалася 22 028 занятых наёмнай працай. Адным з вынікаў станаўлення рыначнай эканомікі было беспрацоўе, чаму паспрыялі дэмабілізацыя арміі, адыход у горад малабеззямельнага сялянства, закрыццё нерэнтабельных прадпрыемстваў, скарачэнне бюракратычнага апарату. У 1923 г. у акрузе налічвалася 3401 беспрацоўны з 27 136 чалавек самадзейнага насельніцтва (больш за 12 працэнтаў). Беспрацоўным аказвалася самая разнастайная дапамога: грашовая, арганізацыя грамадскіх работ, працоўных калектываў і арцеляў беспрацоўных, стварэнне новых працоўных месцаў. Але асноўнай крыніцай аслаблення і ліквідацыі беспрацоўя з'яўлялася аднаўленне эканомікі.

Галоўнай галіной народнай гаспадаркі на Магілёўшчыне, як і раней, заставалася сельская гаспадарка. Яна знаходзілася ў пачатку 1920-ых гг. у цяжкім крызісе. Пасяўныя плошчы скараціліся ў параўнанні з даваенным перыядам па збожжавых культурах амаль на 40 працэнтаў, бульбы — на 55 працэнтаў, а валавы збор адпаведна знізіўся на 50 і 65 працэнтаў. Новая эканамічная палітыка пачалася з адмены харчразвёрсткі і ўвядзення харчпадатка, дазвола сялянам свабодна гандляваць. Гэта садзейнічала паступоваму аднаўленню вёскі. Аднак сур'ёзнай праблемай заставалася малазямелле. Не так даўно агульнапрынятым лічыўся тэзіс аб тым, што ў выніку ажыц-

цяўлення Дэкрэта аб зямлі адбылося «асераднячванне» сялянства. Статыстычныя даныя адмаўляюць гэты ўстойлівы пастулат. На самой справе землезабеспячэнне сялян скарачалася. Калі ў 1917 г. на адну працоўную сялянскую гаспадарку прыходзілася 10,51 дзесяціны зямлі, то ў 1922 г. па дадзеных 10-працэнтнага перапісу толькі 8,84 дзесяціны. Пасля з'яўлення ў 1922 г. дэкрэта аб вольным выбары форм землекарыстання пачала імкліва павялічвацца колькасць хутароў. Яны, як правіла, былі лепш забяспечаны зямлёй — на адну хутарскую гаспадарку прыходзілася 10,6 дзесяціны.

Трэба адзначыць, што да 1925 г. новая эканамічная палітыка арыентавалася на стрымліванне і абмежаванне рыначных адносін у сельскай гаспадарцы. Арэнда і купля зямлі, прымяненне наёмнай працы афіцыйна абмяжоўваліся. Яны дапускаліся для гаспадарак, якія часова аслаблі ў выніку стыхійных бедстваў або недахопу рабочай сілы. Арэнда дазвалялася на тэрмін не больш аднаго севазварота або 3 гадоў. Арандатар павінен быў апрацоўваць сваю зямлю сваёй працай. Наёмная праца дапускалася пры ўмовах, калі ўсе працаздольныя члены гаспадаркі працавалі разам з наёмнымі рабочымі.

Сяляне паступова аднаўлялі закінутыя раней пасяўныя плошчы (у 1923 г. яны дасягнулі ўзроўню 1916 г., калі ў 1922 г. складалі ўсяго 50 працэнтаў да 1914 г.). Толькі 1,2 працэнта гаспадарак у 1924 г. засталіся без пасеваў.

Цяжкія страты ў выніку сусветнай і грамадзянскай войнаў панесла жывёлагадоўля Магілёўшчыны. Аднак пераход да новых форм гаспадарання дазволіў адносна хутка аднавіць гэтую важную галіну. Ужо ў 1924 г. 82 672 індывідуальныя сялянскія гаспадаркі мелі 108 190 коней, 1 517 465 галоў буйной рагатай жывёлы, 244 374 авечкі, 154 032 свінні. Разам з тым 1188 гаспадарак наогул былі без жывёлы. Даволі слабай была забяспечана гаспадарка рабочай жывёлай. 9046 гаспадарак (10,8 працэнта) не мелі рабочых коней. У 7,1 працэнта гаспадарак не было кароў. На вельмі нізкім узроўні знаходзілася матэрыяльна-тэхнічная база сельскай гаспадаркі. Так, наогул без інвентару было 7,9 працэнта гаспадарак. Яшчэ менш было складанай тэхнікі. На 100 гаспадарак прыходзілася 0,6 малацілак, 1,1 веялкі. Ва ўмовах малазямелля і недахопу рабочай жывёлы і інвентару частка гаспадарак вымушана была іх наймаць. У формах платы за найм рабочай жывёлы пераважалі адпрацоўкі.

Паспяхова была адноўлена ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. Збор з адной дзесяціны ў 1924 г. складаў: жыта азімага 49,4 пуда (у 1905—1913 гг. у сярэднім 43,6 пуда), жыта яравога — 47,7 пуда (у 1905—1913 гг. — 38 пудоў), лёну — 31,7 пуда (у 1905—1913 гг. — 32,8 пуда), бульбы — 592,3 пуда (у 1905—1913 гг. — 498,4 пуда). У цяжкім стане знаходзілася пасля заканчэння грамадзянскай вайны прамысловасць Магілёўшчыны. Былі парушаны або значна аслаблены ўнутраныя і знешнія эканамічныя сувязі. Прамысловая прадукцыя ў Магілёўскім павеце ў 1920 г. складала каля 15 працэнтаў да 1913 г. У многім гэта было вынікам палітыкі ваеннага камунізму, якая суправаджалася нацыяналізацыяй прамысловасці і гандлю. Па даных перапісу 1920 г., з 132 прадпрыемстваў у павеце было нацыяналізавана 126. Новая эканамічная палітыка абвясціла пераход прамысловасці на іншыя гаспадарчыя адносіны. Прадпрыемствы здымаліся з дзяржаўнага забеспячэння і пераводзіліся на гаспадарчы разлік. Толькі найбольш жыццяздольныя і важныя прадпрыемствы засталіся на дзяржаўным бюджэце. Астатнія здаваліся ў арэнду або зачыняліся як нерэнтабельныя. Аднаўляўся прыватны сектар, перш за

ўсё з дробных прадпрыемстваў, саматужных і рамесных майстэрняў.

Круты паварот ад ваеннага камунізму да новай эканамічнай палітыкі садзейнічаў аднаўленню эканомікі. Аднак новы шлях суправаджаўся шэрагам крызісаў. Першым выпрабаваннем сталі так званыя нажніцы цэнаў. Восенню 1923 г. разыходжанне цэнаў прыняло значныя памеры. Пуд жыта на рынках Магілёва каштаваў у кастрычніку 1923 г. 0,43 руб., а пуд гатунковага жалеза — 3,40 руб., мужчынскія боты — 10 руб., дзесятак запалак 0,2 руб., аршын паркалю 0,50 руб.

Галоўнымі прычынамі крызісу з'явілася тое, што прамысловасць краіны стала ў значнай ступені манапалізаванай. Пры слабым рэгуляванні цэнаў трэсты сталі на шлях іх павышэння. Гэта прывяло да крызісу збыту ва ўмовах, калі толькі пачалося аднаўленне гаспадаркі і існавала вострая патрэба ў самых неабходных таварах. Былі і іншыя прычыны павелічэння цэнаў на прамысловыя тавары: больш павольнае аднаўленне прадукцыйнасці працы ў прамысловасці і востры недахоп прамтавараў, крэдытаванне прамысловасці праз выпуск чырвонцаў, якія амаль не паступалі ў вёску. Склалася такая сітуацыя, калі цэны на рынку сталі ніжэй дзяржаўных. Гэта запатрабавала ўмяшання дзяржавы, якая пайшла на непасрэднае ўстанаўленне цэнаў. На працягу 1924 г. разрыў паміж цэнамі паволі скараціўся.

Дапушчэнне пэўнай рыначнай свабоды стварыла ўмовы для ажыўлення гандлю. Дзейнічалі дзяржаўныя, кааператыўныя і прыватныя гандлёвыя ўстановы. Колькасна і па гандлёваму звароту значна пераважыў прыватнік. Калі ў 1923 г. дзяржаўных гандлёвых устаноў налічвалася 22 са зваротам за кастрычнік—снежань 120 225 руб., то кааператыўных — 30 са зваротам 66 208 рублёў, а прыватных — 1278 са зваротам 832 996 рублёў.

Пэўныя змены адбываліся і ў сферы працы. Умацоўвалася працоўная дысцыпліна, памяншалася колькасць прастояў прадпрыемстваў. Пераход да рыначнай эканомікі ўключаў перагляд сістэмы заработнай платы. На змену ўраўнілаўцы ваеннага камунізму прыходзіла здзельная форма аплаты, уводзіліся тарыфныя стаўкі дзевяці разрадаў. У 1924—1925 гг. месячная зарплата аднаго рабочага складала 48,6 руб. Існавала даволі істотная дыферэнцыяцыя ў аплаце працы ў залежнасці ад галіны і разраду. У ліпені 1924 г. сярэдняя тарыфная стаўка 6-га разрада на транспарце складала 37,39 руб., 9-га разрада — 52,33 руб. Параўнаем гэтыя заробкі з сярэднімі рыначнымі цэнамі жніўня 1924 г. Фунт жытняга печанага хлеба каштаваў 3,5 кап., пуд бульбы — 0,40 руб., фунт ялавічыны — 0,23 руб., свежага сметанковага масла — 0,8 руб., цукру-пяску — 0,28 руб., дзесятак яек — 0,35 руб.

Аднаўленне эканомікі стварыла магчымасць для адраджэння культуры, асветы. Калі ў 1897 г. на 477 пісьменных у горадзе прыходзілася 143 у вёсцы, то ў 1920—1924 гг. іх было адпаведна 584 і 270. Нязначнай была сетка культурна-асветніцкіх устаноў. На ўсю Магілёўскую акругу прыходзілася 10 народных дамоў, 4 бібліятэкі, 30 хат-чытальняў, 1 музей.

Даволі трывалымі ў тыя гады былі сем'і. На 6089 браўшых шлюб у 1923 г. прыходзілася ўсяго 196 разводаў. Колькасць дзяцей, якія нарадзіліся ў гэтым годзе (15 502), значна перавышала колькасць людзей, якія памерлі (4763). Аднак высокай была смяротнасць сярод нованароджаных: з 15 502 немаўлят 1216 дзяцей ва ўзросце да 1 года памерлі. Гэта тлумачылася недастатковай сеткай устаноў аховы здароўя. У акрузе налічвалася ўсяго 13 бальніц на 461 ложак, 38 урачоў.

Статыстычныя даныя сведчаць пра тое, што новая эканамічная палітыка спрыяла гаспадарчаму аднаўленню. Магілёўская акруга, як і ўся рэспубліка, хутка падыходзіла да даваеннага ўзроўню эканомікі, пачаўся ўздым добрабыту гарадскога і сельскага насельніцтва. Дасягнута гэта было дзякуючы свабоднаму прадпрымальніцтву і свабоднаму рынку, пераход да змешанай эканомікі. Тады назапашваўся каштоўны вопыт гаспадарчай дзейнасці ва ўмовах існавання канкурэнцыі розных форм уласнасці.

*В. Маразевіч*
*Магілёўская даўніна. Магілёў, 1993.*

## Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні і культурнае будаўніцтва ў сяле Сідаравічы

Пасля грамадзянскай вайны краіна перайшла да мірнага будаўніцтва. Паступова залечваліся раны, нанесеныя вайной, жыццё ўсё больш наладжвалася.

Не абышоў гэты працэс і сяло Сідаравічы. У 1923—1924 гг. тут праводзілася землеўпарадкаванне. Тая частка зямель памешчыка Кутлярскага, якая адносілася да Сідаравічаў, і іншыя панскія землі былі выдзелены беззямельным і малазямельным сялянам. На выдзеленыя землі пачалі пераязджаць сяляне, сярод якіх былі Скуратаў Фама, браты Майсеевы, Цімафей і Аляксандр Архіпавічы, браты Аўсейкавы Яфім і Ніканор і многія іншыя. Майсееў Цімафей многія гады быў пастухом, атрымаўшы зямлю, стаў самастойным гаспадаром. Атрымалі зямлю на «панскім полі» і браты Лаўрэн і Іван Зямцовы. Іх бацька яшчэ ў 1909 г. па Сталыпінскай аграрнай рэформе паехаў на пасяленне ў Сібір, але вымушаны быў, як і многія іншыя, вярнуцца назад.

У выніку землеўпарадкавання сяло Сідаравічы моцна разраслося. Калі раней яно размяшчалася ў межах двух могілак, то цяпер сяло выцягнулася ад вёсак Слабодка і Нова-Мілееўка да ракі Пална і вёскі Прыбярэжжа. Утварыліся новыя пасёлкі: «Панскае поле», Шылаў Вугал, Пална, Антонаў Вугал, Чорны Брод, Машнішча, Зарэчча, Пушное Балота. Калі ў 1917 г. у Сідаравічах было 220 двароў, то ў 1927 г. іх стала каля 300.

Раней да рэвалюцыі жанатыя сялянскія сыны, як правіла, жылі з бацькамі ў адной сям'і, а ў новы час, атрымаўшы зямлю, яны адыходзілі ад бацькоў, будавалі сабе дамы і станавіліся самастойнымі гаспадарамі. Для іх адкрываліся вялікія гаспадарчыя магчымасці, але выкарыстаць іх маглі не ўсе, не хапала коней, прадуктыўнай жывёлы, сельскагаспадарчага інвентару, насення. У такіх умовах у Сідаравічах пачалі стварацца кааператыўныя арганізацыі, такія, як «Крэдытнае таварыства», «Машыннае таварыства», «Камітэт сялянскай грамадскай узаемадапамогі». Старшынёй апошняга быў малады ініцыятыўны камсамолец М. Ц. Каралёў. Камітэтам у крэдыт была набыта малацілка, многім сялянам былі выдадзены пазыкі на набыццё жывёлы, інвентару, насення і інш. У 1925 г. узнікла новае таварыства «Меліярацыйнае», якое ўзначаліў С. М. Івашкоў. Меліяратары выканалі комплекс работ па асушэнні нізкіх месцаў ворных зямель і паляпшэнні заліўных лугоў. У 1925 г. у Сідаравіцкай хаце-чытальні быў арганізаваны агранамічны гурток, у якім маладыя гаспадары атрымлівалі веды па агратэхніцы. Асноўнымі дапаможнікамі для слухачоў з'яўляліся часопіс «Сам сабе аграном» і газеты «Беднота» і «Крестьянская газета». Загадчыкам хаты-чытальні і саката-

ром камсамольскай арганізацыі ў Сідаравічах у 1925 г. быў Міхаіл Палякоў — разумны, энергічны, абаяльны юнак, сапраўдны важак моладзі (у 1929—1931 гг. М. К. Палякоў працаваў сакратаром ЦК ЛКСМБ, пазней быў рэпрэсіраваны і трагічна загінуў). Вечарамі ў хаце-чытальні збіралася моладзь, прыходзілі пажылыя і старыя людзі. Усім тут было цікава. Наладжваліся вечары мастацкай самадзейнасці, чыталіся ўголас газеты, часопісы, кнігі. Настаўнікі і вучні мясцовай школы праводзілі вялікую работу па ліквідацыі непісьменнасці. У 1925 г. школу лікбезу ў Сідаравічах закончылі каля 50 маладых хлопцаў і дзяўчат, у тым ліку Шаршнёва Фёкла, Башарымаў Навум, Гаўрылін Парфен, Жыганаў Сідар, Івашкова Вера, Носікаў Харлам і многія іншыя. Некаторыя з іх працягвалі самаадукацыю. Фёкла Фёдараўна Шаршнёва ў 1929 г. стала слухачом Магілёўскай саўпартшколы, а Кузьма Пракопавіч Малахаў — студэнтам Магілёўскага педвучылішча.

Магілёўская саўпартшкола і 33-і артылерыйскі полк, які дыслацыраваўся ў Магілёве, былі шэфамі сяла Сідаравічы. Шэфы арганізоўвалі культурна-масавую работу і палітычнае выхаванне моладзі. Ваенныя шэфы вялі актыўную абаронна-масавую работу: вывучалі з моладдзю вінтоўку, вучылі страляць, чыталі лекцыі, праводзілі гутаркі аб грамадзянскай вайне, вывучалі песні таго перыяду. Некалькі разоў ваенныя шэфы запрашалі сельскіх хлопцаў да сябе. Па ўспамінах П. А. Пшанічнага, калі яны ад'язжалі ад шэфаў, то гаварылі, што таксама хочуць стаць чырвонаармейцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі. І гэта мара для многіх юнакоў аказалася явай. З тых хлопцаў кадравымі ваеннымі сталі І. М. Панкратаў, П. М. Івашкоў, П. А. Пшанічны, М. Ц. Каралёў і іншыя. Актыўна вялася масава-палітычная работа, добра працавала і камсамольская арганізацыя. У хаце-чытальні ставіліся п'есы антырэлігійнага характару. Аднак не абышлося і без злоўжыванняў, парушэнняў законнасці. Так, у 1920-ыя гг. моладзь Сідаравічаў самавольна захапіла палавіну дома папа Наўроцкага. Тут наладжваліся шумныя вечарынкі, ставіліся п'есы. Поп вымушаны быў пакінуць свой дом. Потым гэты дом стаў сельскім клубам, які хтосьці падпаліў, і ён згарэў.

## І глядзяць анёлы з купала...

Калісьці ў нашай вёсцы Сідаравічы на беразе рэчкі Пална стаяў вадзяны млын. Але згарэла яго будыніна, і не было сродкаў аднавіць. І тады іншую будыніну для млына прыстасавалі: былую царкву — высокую, прасторную, прыгожую. У 1941 г. па ёй немцы з пушак палілі, у 1944-ым нашы па ёй білі: выбівалі ворага з вёскі. А царква стаіць, як стаяла!

Такі «абноўлены» млын абслугоўваў калгас і мясцовае насельніцтва, але пазней пацягнуліся сюды жыхары іншых вёсак і нават гараджане прыязджалі. У асобныя дні каля млына збіралася многа падвод, машын, трактароў з мяшкамі.

Калі завоз зерня вялікі, і трэба чакаць чаргі, — самы час спакойна пагаварыць пра жыццё... Старажылы расказваюць тады, якой была царква да яе закрыцця ў 1929 г.: усё тут ззяла чысцінёй і парадкам. Плошча была агароджана, разбіта на сектары зялёнай травы і белай канюшыны. Да царквы вялі роўныя дарожкі. Вакол шумелі ліпы, пахла мёдам, хлебам...

Расказваюць і пра тое, як прыгажуню-царкву, якая выстаяла у час баёў, спрабавалі разбурыць ужо пасля вай-

ны магутнымі трактарамі С-100, што працуюць на балотах. Трактары торгаліся, буксавалі, пакуль не спалілі фрыкцыёны. А царква стаяла...

Расказваюць і аб трагічным лёсе святара, які служыў у Сідаравіцкай царкве ў першыя гады Савецкай улады. Ім быў Мікалай Аляксандравіч Наўроцкі. Звалі яго айцец Мікалай, а часцей проста бацюшка. Гэта быў мужчына трыццаці гадоў з правільнымі рысамі твару і добра пастаўленым голасам. Ён стварыў пры царкве хор, богаслужэнні праводзіў урачыста, з натхненнем. Яго жонка, матушка Вольга, была сапраўднай прыгажуняй. На святы яна прыходзіла ў царкву. І хоць апраналася ў доўгія закрытыя сукенкі, у постаці яе ўгадвалася жаноцкасць і надзвычайная прывабнасць. Пасля богаслужэння ўгаваркія кабеты і мужыкі нярэдка пляткарылі: сусед Іван (у другі раз гэта быў Пётр ці Фядот) на абедні глядзеў не на папа і святых, а на пападдзю...

У сярэдзіне дваццатых гадоў у Сідаравічах была створана камсамольская арганізацыя. Яна вяла актыўную антырэлігійную прапаганду сярод моладзі і мясцовага насельніцтва. Камсамольцы «пацяснілі» святара, захапіўшы лепшую палову дома, наладжвалі там шумныя вечары, ставілі п'есы, пелі антырэлігійныя песні і частушкі. У такіх умовах бацюшка не мог жыць, і сям'я пераехала на новае месца, за раку. У гэты час пачалася калектывізацыя. Царкоўную зямлю аб'явілі ўласнасцю калгаса, царкву закрылі. Найбольш каштоўную маёмасць — дарагія іконы, кнігі, званы кудысьці звезлі. Коней, гаспадарчы інвентар і пабудовы забралі ў калгас, астатняе парасцягвалі.

Па ўсёй краіне праводзілася антырэлігійная кампанія, і — пачалася траўля святара. Аднойчы зімнім марозным вечарам, у суботу пасля лазні, трое мужыкоў запрасілі Наўроцкага да сябе ў госці (як потым стала вядома, гэта была змова), а тым часам, калі яго не было дома, у кватэру пастукалі двое маладых хлопцаў. Яны схапілі ледзь апранутую жонку святара, ухуталі яе коўдрай і пакацілі на падводзе да лясной старожкі. Жанчына крычала. Яе пачулі, арганізавалі пагоню. Там, у лясной старожцы, і знайшлі яе — перапалоханую, дрыжачую ад холаду. Атрымаўшы двухбаковае запаленне лёгкіх, Вольга хутка памерла. Але выпрабаванні Наўроцкага на гэтым не скончыліся. Ішоў 1931 год. Былога святара ў калгас не прынялі, зямлі не далі, і ён стаў жабраком. Неяк пайшоў у сельсавет прасіць дапамогі і абароны. Там сабраліся сяляне. Адзін з іх трымаў нейкую паперу і з цяжкасцю чытаў па складах. Наўроцкі вырашыў дапамагчы: «Давай я прачытаю», — і пацягнуў паперку да сябе. Ці то мужык не зразумеў, ці то не пачуў — толькі тарганўў ліст, — папера разарвалася. Гэта быў загад ваеннага камісара аб мабілізацыі насельніцтва. Наўроцкага абвінавацілі ў антысавецкай дзейнасці, асудзілі і адправілі на будаўніцтва Беламора-Балтыйскага канала.

Вярнуўся ў Беларусь былы святар зусім хворым і памёр. За некалькі хвілін да смерці, кажуць, вымавіў: «Жыў як на востраве, акружаны пустатой...»

А царква ўсё стаіць. Яшчэ жывы былы званар. І хоць яму далёка да восемдзесят, даволі рухавы. Разгаварыць яго цяжка: за службу ў царкве столькі крыўдзілі і зневажалі, што цяжка забыць. Стары па-ранейшаму набожны. Ён добра памятае малітвы. Расказваў, як айцец Мікалай тлумачыў яму сутнасць калакольнага звону: калакольны звон не проста «гонг», які ззывае людзей у царкву, а мелодыя. Яна адухатварае наваколле, напамінае аб жыцці духа, аб малітве, нясе благасць, будзіць сумленне. Вялікі сэнс

заключаны ў слове «благавешчанне»: калакольны звон — гэта музычная прапаведзь, вынесеная за парог царквы...

Аднойчы мне давялося пазнаёміцца з архіўнымі дакументамі Баркалабаўскага манастыра, і я даведаўся пра тое, што мураваная царква ў нашых Сідаравічах была пабудавана ў 1861—1865 гг.

Асноўная частка будынка мае форму роўнавялікага васьміграннікa, утвараючага ўверсе купал. Як адзінае цэлае да будынка з усходу прымыкае алтар. Як і ва ўсіх праваслаўных храмах, ён мае кубічную форму — біблейскі сімвал «Сусветнасці». З захаду ідзе выцягнутая ў даўжыню прамавугольная прыбудова, якая служыць асновай двух'яруснай званіцы. Адначасова гэтая ж прыбудова ўтварае партал цэнтральнага ўвахода. Маюцца два бакавыя ўваходныя парталы. Царква асвятлялася 12 паўцыркульнымі вокнамі. Асноўны будынак і званіцы накрыты ў форме шатроў, увенчаных меднымі цыбулепадобнымі галоўкамі. Унутранае ўбранне храма не захавалася. Старыя расказваюць, што іканастас складаўся з многіх вельмі прыгожых абразоў. Найбольшае ўражанне пакідалі два вялікія з залатой аправай абразы з выявамі Хрыста і Багародзіцы.

На купале, які абазначае «твердь небесную», да сённяшняга дня захаваліся фрэскі з лікамі анёлаў і святых. З вялікім смуткам яны глядзяць на нас... Калі на заходняй сцяне сцерці пыл ад мукі, можна разабраць напісаную карціну Страшнага Суда.

І стаіць такая прыгажосць даўніны — млынам...

*І.Гуркоў*

### З энцыклапедычнай даведкі

Магілёўскі павет 20.08.1924 г. раздзелены на 19 сельсаветаў: Бракаўскі, Вендаражскі, Вішоўскі, Вяліка-Бялевіцкі, Гарадзішчанскі, Гаранскі, Дабрасневіцкі, Дасовіцкі, Дашкаўскі, Карабанаўскі, Княжыцкі, Коцнінскі, Навасёлкаўскі-1 (Навасёлкі-1), Навасёлкаўскі-2 (Навасёлкі-2), Палыкавіцкі, Пашкаўскі, Рафалаўскі, Сялецкі, Цішоўскі.

25.08.1925 г. адбыліся перайменаванні сельсаветаў: Карабанаўскі — у Краснапольскі, Коцнінскі — у Хонаўскі, Навасёлкаўскі-2 (Навасёлкі-2) — у Гуслішчанскі, Навасёлкаўскі-1 (Навасёлкі-1) — у Навасёлкаўскі (Навасельскі).

24.09.1926 г. арганізаваны Хрыпялёўскі нацыянальны польскі сельсавет. У 1927 г. створаны Чарназёмаўскі сельсавет, 02.03.1931 г. да раёна далучаны Амхаўскі, Грабянёўскі, Махаўскі, Мастоцкі, Машынацкі, Слабодкаўскі (Слабодскі), Таранаўскі, Шчэжарскі сельсаветы ліквідаванага Лупалаўскага раёна.

### Ад губерні — да акругі

Пасля кастрычніцкага ўзброенага паўстання 1917 г. Магілёўская губерня ўваходзіла ў склад Заходняй вобласці РСФСР (1917—1918 гг.), Заходняй Камуны РСФСР (1918), Беларускай ССР (студзень—люты 1919), РСФСР (1919).

Пад пагрозай акупацыі буржуазнай Польшчай 02.02.1919 г. Магілёўская, Віцебская і Смаленская губерні адыйшлі непасрэдна да РСФСР. 25 красавіка 1919 г. Магілёўская губерня спыніла сваё існаванне. 9 паветаў Магілёўшчыны ўвайшлі ў склад зноў утворанай Гомельскай губерні. У выніку Магілёўшчына зноў зменшылася да памераў павета. За менш чым 5 гадоў існавання Магілёўскага павета ў складзе

Гомельскай губерні РСФСР склад яе абласцей змяняўся некалькі разоў. 7 сакавіка 1924 г. Магілёўскі, Быхаўскі, Клімавіцкі, Рагачоўскі, Чавускі, Чэрыкаўскі паветы і частка Рэчыцкага Гомельскай губерні ў межах адміністрацыйнага падзелу 1920 г. былі перададзены Савецкай Беларусі. 17.07.1924 г. пастановай 2-ой сесіі ЦВК БССР 6-га склікання на Беларусі ліквідаваўся стары адміністрацыйны падзел і ўтвараліся акругі, раёны і сельсаветы. Магілёў стаў цэнтрам адной з дзесяці акругаў Беларусі. У складзе Магілёўскай акругі было ўтворана 10 раёнаў.

Сельскія Саветы як установы дзяржаўнага кіравання былі ўтвораны па ініцыятыве сялянскіх мас у межах абласцей, яны былі вельмі дробнымі і ў некаторых выпадках уключалі толькі адно сельскае паселішча. Так, у Магілёўскім павеце, адным з 15 паветаў БССР, з 3 сакавіка 1924 г. да 20 снежня 1924 г. было 15 абласцей і 1412 сельсаветаў. У 10 раёнах новай Магілёўскай акругі захаваўся толькі 161 сельсавет. Унутранае дзяленне акругі было менш удалым. Так, напрыклад, Лупалаўскі раён меў сваім цэнтрам вёску Лупалава, якая стала часткай Магілёва ў 1926 г. Вялікая колькасць сельсаветаў і дробнасць раёнаў былі абумоўлены эканамічнай палітыкай савецкай дзяржавы. У акругах пачынаўся працэс калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, і сельскія Саветы на месцах сталі праваднікамі гэтай акцыі.

## Па новым шляху

**У фондах абласнога дзяржаўнага архіва захоўваюцца «Весткі Магілёўскага акрвыканкома аб стане калектыўных гаспадарак акругі за 1924—1926 гг.»**

У 1926 г. быў абвешчаны лозунг «Тварам да вёскі». Сельгаскааператаваннем ужо ахоплена было 1/3 сялянскіх гаспадарак краіны. Аднак многія з аб'яднанняў рабілі першыя крокі на шляху калектыўнага вядзення гаспадаркі і мелі патрэбу ў дапамозе і крэдытах. У 1926 г. Магілёўскі акрвыканком правёў абследаванне гаспадарак раёна. Быў складзены акт праверкі стану сельскагаспадарчай арцелі «Саха і молат» у студзені 1926 г. Арцель «Саха і молат» займала ў той час былы маёнтак Пусты Асавец. У яе карыстанні было 77,3 дзесяціны зямлі. Устаноўлена, што арцель створана з мясцовага маладзёжнага насельніцтва і двух сямействаў батракоў гэтага маёнтка. У састаў арцелі ўваходзіла 9 сем'яў. Сяляне — члены арцелі — вялі сумесна ўсе палявыя работы. Хлеб пасля ўборкі ў засыпкі насеннага фонду дзялілі «па рабочых сілах». Жывёлу кармілі грамадскімі кармамі, але даенне і догляд праводзіліся індывідуальна. Кожная сям'я арала плугам і сама рамантавала яго.

Праверыўшы стан арцелі «Серп і молат», камісія зрабіла вывад, што арцель дзеяздольная. Стройнасць і ўзгодненасць грамадскай працы варта пераймання. Былі намечаны і канкрэтныя меры дапамогі арцелі. Таму камісія зрабіла заключэнне, што неабходна наладзіць правільны ўлік працы і прадуктаў. Дапамагчы арцелі сродкамі ў выглядзе крэдытаў на рамонт пабудоў, куплю жывёлы, сельскагаспадарчых прылад і машын, меліярацыю. Усяго 5300 рублёў.

Такому ж дэталёваму абследаванню былі падвергнуты ўсе калектыўныя гаспадаркі акругі. У выніку яго Магілёўскі акрвыканком даў звесткі аб тым, што ў 1926 г. у акрузе маецца 42 калектыўныя гаспадаркі (з іх 32 арцелі, 5 сельскагаспадарчых камун і 5 та-

варыстваў па апрацоўцы зямлі). У іх карыстанні знаходзілася 5133 дзесяціны ворнай зямлі па 160 дзесяцін у сярэднім на гаспадарку. Калгасы забяспечаны пабудовамі на 60, рабочай жывёлай на 95 і палявым інвентаром на 90 працэнтаў. Разам з тым было ўстаноўлена, што ў параўнанні з 1925 г. колькасць сельскагаспадарчых арцеляў у акрузе рэзка знізілася (з 59 да 32). Тлумачылася гэта тым, што скарачэнне адбылося за лік узбуйнення калектыўных гаспадарак.

*У. Агурцоў*

## Калектывізацыя ў раёне

1928 – 1932 гг. увайшлі ў гісторыю Магілёўшчыны, як і ўсёй рэспублікі, як гады карэнных эканамічных, сацыяльных і культурных змен у вёсцы, гады трагізму і ломкі чалавечых лёсаў, звязаных з усталяваннем і ўзмацненнем таталітарнага рэжыму. З аднаго боку, быў відавочны прагрэс у развіцці вытворчых сіл (калі ў 1924 г. у рэспубліцы мелася ўсяго 13 трактароў, то да канца першай пяцігодкі іх налічвалася ўжо каля 300; колькасць МТС з адной у 1930 г. павялічылася да 16 у 1932 г.), з другога боку, ішоў працэс скочвання краіны да беззаконнасці і ўмацавання асабістай дыктатуры, якія скончыліся масавымі рэпрэсіямі і генацыдам супраць свайго народа.

**З успамінаў былога старшыні Дашкаўскага сельсавета Цітова:**

Мне давялося быць сведкам і непасрэдным удзельнікам калектывізацыі ў Магілёўскім раёне. У 1929 г. я быў старшынёй Дашкаўскага сельсавета. У лістападзе 1929 г. мы правялі адкрыты партыйны сход, на якім абмеркавалі, як лепш арганізаваць масава-растлумачальную работу сярод сялян, разгарнуць агітацыю за стварэнне калгасаў. На сходзе беднякоў сяла Дашкаўка, якое даручылі весці мне, я расказаў аб задачах сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне і перавагах калектыўнай гаспадаркі, унёс прапанову арганізаваць у Дашкаўцы калгас і першым выказаў жаданне ўступіць у яго. Мяне падтрымалі Павел Панфіловіч і Карп Цыркуноў. Затым падалі заявы Л. К. Рошчын і яго брат Я. К. Рошчын, І. З. Хадановіч, І. Я. Ярошчанка. У гэты дзень запісалася ў калгас каля 40 сем'яў. Мне даверылі быць старшынёй арцелі, якую назвалі «Чырвоны спаборнік». Членамі праўлення былі выбраны Іван і Апанас Хадановічы, Леў і Яфім Рошчыны, Карп Цыкуноў і Павел Панфіловіч. На першым пасяджэнні праўлення мы паставілі пытанне аб абагульненні жывёлы, інвентару і насення. У агульным карыстанні членаў арцелі было 60 гектараў зямельных угоддзяў, 15 коней, некаторы сельгасінвентар і невялікі насенны фонд. На чарговым пасяджэнні прэзідыума сельсавета было вырашана пытанне аб перадачы калгасу «Чырвоны спаборнік» 50 гектараў сенакосных угоддзяў з дзяржфонду і 45 гектараў былой царкоўнай зямлі.

Арганізоўваліся калгасы і ў іншых вёсках нашага сельсавета. Так, у вёсцы Стайкі ўзнікла арцель «Чырвоны працаўнік» на чале з П. В. Балашэнкам. Калгас «Відны шлях» быў створаны ў гэты час у вёсцы Лежнеўка. Старшынёй выбраны Н. І. Машэеў. П. М. Леаненка стаў першым старшынёй калгаса «Арлен» у вёсцы Навасёлкі. У вёсцы Боўшава арганізаваны калгас «Чырвоная Дуброва» (старшыня І. Дз. Васількоў). Для арганізацыі калгаса ў Княжыцах быў прысланы саратаўскі рабочы-дваццаціпяцітысячнік Сакалоў. І ў 1929 г. узнік калгас «Гігант»,

які аб'яднаў вёскі Княжыцы, Горная і Нізкая Вуліцы, Сумарокава, Лубнішча, Нікіцінічы, Пясчанка. Першымі ўступілі ў калгас Ярашавы Міхаіл, Мікалай і Фёкла, Старажалкавы Галіна і Варвара, Усава Ганна, Казлова Ксенія і іншыя. Старшынёй быў абраны Міхаіл Ярашаў.

**З успамінаў ураджэнца вёскі Семукачы С. Зубарава**

У 1928 г. у Семукачах мясцовыя актывісты пачалі арганізоўваць калгас «Колас». Адным з першых у яго ўступілі Лаўрэн Гаравы з сынам Мікалаем, Міхалка Буры, Ягор Харламаў, Дзяніс Саладухін, Павел Садоўскі. Угаварыў жонку Агаф'ю Піменаўну (да таго часу быў ужо жанаты і расціў пяцёра дзяцей) уступіць у калгас і я. Сказаць, што ўсім быў даспадобы арганізуемы калгас, нельга. Знаходзіліся і такія, хто падбіваў людзей супраць. Яны перашкаджалі працаваць землямерам, шкодзілі на іншых участках. Але мы верылі ў калектыўную гаспадарку. З года ў год раслі на нашых палях ураджаі, прыбаўлялася жывёлы ў калгасных табунах. Бачачы гэта, цягнуліся да нас людзі. У 1933 г. калгас трывала стаў на ногі. З'явіўся першы трактар «Фардзон». Яго «асядлаў» наш семукацкі каваль Фёдар Харламаў. Потым трактарыстамі сталі Апанас Гаравы, мой брат Барыс Зубараў і іншыя. Праз два гады з'явілася ў калгасе і першая машына-палутарка, асвойваць якую зноў узяўся Харламаў.

* * *

...Арганізацыя калгасаў і іх станаўленне праходзілі ў абстаноўцы вострай класавай барацьбы. У 1930 г. у Дашкаўцы дзейнічала контррэвалюцыйная група на чале з былым белагвардзейскім афіцэрам Чыгіром. Да яе прымкнулі дашкаўскія кулакі. Ворагі забівалі актывістаў калгаснага ладу, падпальвалі калгасныя будынкі, рабілі дыверсіі... Нялёгка праходзіла калектывізацыя ў вёсцы Палыкавічы. У 1933 г. быў забіты ў сваім доме з кулацкага абрэза член сельсавета І. Куканкоў, прозвішча якога стаяла першым у спісе ўступіўшых у калгас «Чырвоны баец». Перад гэтым вяскоўцы выбралі яго брыгадзірам.

## Арганізацыя калгасаў у сяле Сідаравічы, вёсках Бароўка, Слабодка, Нова-Мілееўка

Арганізатарам калгаса ў Сідаравічах была партыйная ячэйка, у састаў якой уваходзілі М. П. Жукаў, П. А. Дземідзенка, С. Н. Мельнікаў, А. М. Топалеў, Ф. Ф. Шаршнёва, І. Ф. Шаршнёў, А. Е. Шляханаў. Іх актыўнымі памочнікамі з'яўляліся камсамольцы М. Ц. Каралёў, У. М. Кавалёва, К. П. Малахаў, Я. Ф. Мельнікаў, С. Ф. Мельнікава, Ф. С. Мельнікава, С. С. Мельнікаў, І. П. Панкратаў, І. Ц. Пшанічны, М. І. Топалеў, Ф. Ф. Шаршнёў і інш. Многія сяляне-беднякі дапамагалі арганізатарам калгаснага ладу ў будаўніцтве новага жыцця. Такімі ў Сідаравічах былі Н. М. Башарымаў, І. А. Бецкаўскі, М. Я. Зузін, Р. І. Кавалёў, У. Л. Кандрычын, А. А. Панкратаў, Ф. В. Селівееў, Х. З. Носікаў, Я. С. Шалкуноў.

У кастрычніку 1929 г. з камуністаў, камсамольцаў і сялян-беднякоў узнікла ініцыятыўная група па стварэнню калгаса. 5 лістапада 1929 г. у клубе адбыўся сход грамадзян сяла Сідаравічы з павесткай дня: арганізацыя калгаса.

Сход вялі старшыня Слабодкаўскага сельсавета С. Н. Мельнікаў, сакратар сельсавета Я. І. Топалеў, старшы-

ня камітэта сялянскай грамадскай узаемадапамогі М. Ц. Каралёў. На сходзе прысутнічалі першы сакратар Лупалаўскага райкома партыі Шпак і старшыня Лупалаўскага райвыканкома Еўдасьеў. З дакладам аб арганізацыі калгаса выступіў сакратар райкома партыі Шпак.

Сход праходзіў бурна. Было прынята рашэнне: арганізаваць калгас у Сідаравічах і даць яму назву «Камінтэрн». У лістападзе – снежні 1929 г. у калгас уступілі 36 гаспадарак. Да вясны 1930 г. у калгасе налічвалася 65 гаспадарак, а да вясны 1932 г. калектывізацыя ў асноўным завяршылася. У Сідаравічах заставалася ўсяго 9 аднаасобнікаў.

На першым арганізацыйным сходзе калгаснікаў абралі праўленне, у якое ўвайшлі М. П. Жукаў, Н. М. Башарымаў, М. Я. Зузін, М. С. Прасніцкі, Ф. В. Селіваеў, М. Е. Фралоў, Я. С. Шалкуноў. Першым старшынёй калгаса стаў М. П. Жукаў, загадчыкам гаспадаркі – М. Я. Зузін, галоўным аграномам – М. С. Прасніцкі, загадчыкам жывёлагадоўчай фермы – Я. С. Шалкуноў, брыгадзірам агароднай брыгады – М. Е. Фралоў, брыгадзірам цесляроў – С. Р. Мельнікаў, рахункаводам – М. Ц. Каралёў.

Арганізаваліся таксама калгасы ў суседніх гаспадарках: калгас імя Варашылава ў вёсцы Бароўка, «Чырвоны партызан» у Слабодцы, імя Дзімітрава ў Нова-Мілееўцы.

Агульная колькасць сялянскіх двароў у Сідаравічах, Бароўцы, Слабодцы, Нова-Мілееўцы ў 1929 г. – 412. Уступілі ў калгасы: у 1929 г. – 36 двароў (8,7%), у 1930 г. – 98 (23,7%), у 1931 г. – 284 (68,9%), у 1932 г. – 392 двары (95,1%).

Засталося аднаасобнікаў па вёсках: Сідаравічы – 9 двароў, Нова-Мілееўцы – 11, Бароўцы – 0, Слабодцы – 0, усяго 20 двароў.

## Першыя крокі калектыўнага жыцця

У першыя гады свайго існавання калгас «Камінтэрн» у сяле Сідаравічы становіцца адным з лепшых калгасаў Лупалаўскага раёна. Яго вызначала высокая арганізацыя працы, дысцыпліна. Адышлі ў нябыт беднасць і жабрацтва. Калгасны лад забяспечыў значнае павышэнне жыццёвага ўзроўню сялян. У 1935 г. калгасу «Камінтэрн» уручаны «Акт на вечнае карыстанне зямлёй». Калгас атрымаў 2045 гектараў зямлі. У гэтым жа годзе калгас рапартаваў: «Веснавая сяўба на плошчы 618 гектараў завершана. Пасеяна збожжавых 330 гектараў, 32 – лёну, бульбы – 250 гектараў. Калгас па ўсіх галінах выйшаў у перадавыя. У вёсцы былі пабудаваны новыя дабротныя дамы. Восенню 1935 г. на працадзень калгаснікі атрымалі па 3 кг збожжавых і па 8 кілаграмаў бульбы. У калгасе былі пабудаваны клуб, лазня, куплена ўласная грузавая аўтамашына».

## Вёска Сухары ў перыяд калектывізацыі

Першым старшынёй валаснога выканкома ў Сухарах стаў І. А. Паўракоў, сакратаром партячэйкі быў піцерскі матрос Чарноў. У лістападзе 1929 г. у вёсцы яўрэі арганізавалі калгас «Камуністычны маніфест», старшынёй якога абралі рабочага Магілёўскай стужкаткацкай фабрыкі дваццаціпяцітысячніка Аранзона (імя не захавалася). Першымі ўступілі ў калгас Дудкін Маісей, Даніловіч Янкель, Мерамінская Рохля, Казлоў Ціхан, Мядзведскі Фелікс, Аўчыннікаў Мікіта, Баркоў Сямён.

У былым маёнтку пана Чахоўскага адкрыта бальніца, урачом у якой працаваў Я. Ю. Міркін, фельчарам Шлендаў. Замест царкоўнапрыходскай школы была арганізавана школа новага тыпу, пабудаваны клуб, у якім размясцілася бібліятэка. Працавалі масла завод, хлебапякарня, сельпо. У вёсцы было 144 дамы, у якіх жылі больш за 700 чалавек. Аднак усё жыццё было парушана вайной, што пачалася ў 1941 г.

*Н. Валюжэніч*

## З гісторыі Магілёўскага раёна

26.07.1930 г. акругі ў рэспубліцы былі ліквідаваны. Магілёўшчына зноў скарацілася да памераў раёна. Не стала акруг — стала занадта многа раёнаў, таму зноў паўстала праблема ўзбуйнення раёнаў. 2 сакавіка 1931 г. Лупалаўскі раён быў скасаваны і частка яго сельсаветаў адышла да Магілёўскага раёна (Амхаўскі, Грэбянёўскі, Мастоцкі, Машанацкі, Махаўскі, Слабодскі, Таранаўскі, Шчэжарскі). Такім чынам, у Магілёўскім раёне стала 29 сельсаветаў. У 1935 г. пачалася новая рэформа адміністрацыйнага падзелу — разбурэнне раёнаў. У выніку рэформы быў створаны Круглянскі раён, ліквідаваны ў 1931 г. У Круглянскі раён былі ўключаны некаторыя сельсаветы Бялыніцкага раёна, які стаў вельмі малым па плошчы і да яго 05.04.1935 г. далучылі тры сельсаветы Магілёўскага раёна (Вішоўскі, Навасёлкаўскі (Навасельскі) і Рафалаўскі). 23.08.1937 г. Хрыпялёўскі нацыянальны польскі сельсавет рэарганізаваны ў беларускі. Увогуле Магілёўскі раён непасрэдна ўваходзіў у склад БССР з 26.07.1930 па 15.01.1938 г.

Паводле пастановы І сесіі Вярхоўнага Савета СССР ад 15 студзеня 1938 г. было зацверджана ўтварэнне ў рэспубліцы пяці абласцей: Мінскай, Гомельскай, Віцебскай, Палескай і Магілёўскай. Пачаўся новы этап існавання Магілёўшчыны — яна стала вобласцю.

20.02.1938 г. пастанова Прэзідыума ЦВК БССР вызначыла раёны, якія ўключаліся ў склад абласцей. Да Магілёўскай вобласці быў аднесены 21 раён, у тым ліку Магілёўскі. Тады ж вырашалася пытанне аб пераносе сталіцы Беларусі з Мінска ў Магілёў.

## Магілёўскі раён у 1930-ыя гг.

На 1 мая 1930 г. у раёне налічвалася 10 380 гектараў абагуленай зямлі. Калектыўныя гаспадаркі мелі ў сваім распараджэнні 1408 коней, 1730 кароў, 1651 галаву свіней.

Адбываецца некаторая спецыялізацыя гаспадарак. У раёне — 6 саўгасаў з малочным напрамкам і 11 калгасаў, якія таксама спецыялізуюцца на вытворчасці малака. У саўгасах — 790 кароў, плануецца павялічыць пагалоўе да 1625. Акрамя таго, у раёне — 10 свінаводчых калгасаў з пагалоўем 821 свіння.

Колькасць прамысловых прадпрыемстваў на 1933 г. — 155.

Буйныя прадпрыемствы на 1934 г.: торфазавод «Грэбянёва», фабрыка штучнага валакна, машынабудаўнічы завод, трубаліцейны імя Мяснікова, лесазавод арц. імя Сталіна, мэблевая фабрыка імя Халтурына, друкарня імя Молатава, гарбарны завод імя Сталіна, рымарна-сядзельная фабрыка, кравецкая фабрыка імя Валадарскага, мясакамбінат, сушыльны завод «Пучынелі», хлебакамбінат, кандытарская фабрыка імя X Кастрычніка, піваварны за-

вод «Пралетарый», Магілёўскі хімлесгас, Магілёўскі леспрамгас.

Па стану на 1 студзеня 1935 г. у раёне было: саўгасаў — 10, калгасаў — 210 (у іх гаспадарак — 11 247). Колькасць МТС — 1, трактароў — 34, колькасць абслугоўваемых калгасаў — 71.

Працэнт калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на 1 ліпеня 1935 г. — 76,0.

На 1 лістапада 1934 г. дзейнічала: пачатковых школ — 94, няпоўных сярэдніх — 42, сярэдніх — 5; усяго вучняў — 26 256, выкладчыкаў — 694. Дзіцячых садоў было 47, дзіцячых дамоў — 8.

Працавалі педінстытут, палітасветны інстытут, Белпедтэхнікум, палітасветтэхнікум, газетны тэхнікум, медтэхнікум, а таксама рабфак Ленінградскага інстытута воднага транспарту і рабфак заавет інстытута.

На 1 студзеня 1935 г. мелася 9 клубаў і 23 хаты-чытальні.

Выходзіла газета «Камунар Магілёўшчыны» на беларускай і яўрэйскай мовах.

Сістэма аховы здароўя налічвала на 1 студзеня 1935 г.: бальніц — 3, у іх ложкаў — 413, урачэбных амбулаторый — 12, кансультацый — 2, здраўпунктаў пры прадпрыемствах — 14, здраўпунктаў пры саўгасах і МТС — 6, фельчарскіх пунктаў — 2, меддактароў — 79, зубдактароў — 18, фельчараў — 35, акушэрак — 44, медсясцёр — 212.

*Раёны БССР. Мн., 1936. С. 273–277.*

## Культурнае жыццё вёскі, умацаванне калгаснага ладу ў раёне ў 1935—1940 гг.

У сярэдзіне 1930-ых гг. востра паўстала пытанне аб павышэнні ўзроўню пісьменнасці насельніцтва. Вучоба, ліквідацыя непісьменнасці перастаюць быць асабістай справай кожнага. У студзені 1935 г., напрыклад, агульны сход членаў калгаса імя Сталіна Шчэжарскага сельсавета вынес пастанову: «Усім членам калгаса малапісьменным і непісьменным... у абавязковым парадку наведваць вячэрнія заняткі ў Падгорскай школе. За няяўку накладваць штраф працаднямі, даручыўшы гэту справу праўленню калгаса».

Пытанне аб ліквідацыі непісьменнасці сялян стала на парадак дня ў калгасе імя Якаўлева Шчэжарскага сельсавета, на пленуме Гуслішчанскага сельсавета, у вёсцы Масток на агульным сходзе жыхароў вёскі, на якім была заслухана справаздача старшыні Мастоцкага сельсавета. Названыя ў гэтай справаздачы лічбы сведчылі аб відавочных пераменах у культурным жыцці вёсак, размешчаных на тэрыторыі сельсавета: «У сельсавеце ёсць дзве няпоўныя сярэднія школы з ахопам 600 чалавек і тры трохкамплектныя школы з ахопам 400 чалавек. Пабудаваны два новыя памяшканні для Мастоцкай і Грыбанаўскай няпоўных сярэдніх школ. Адрамантаваны медпункт. У трох калгасах пабудаваны новыя клубы».

У 1937 г. былі адкрыты Дамы сацыялістычнай культуры ў вёсках Дабрасневічы і Дашкаўка. На новыя рэйкі пастаўлена і сельская гаспадарка. У гэтыя гады ўсё большае значэнне набыла сельскагаспадарчая навука. Многа ўвагі ўдзялялася абагульненню і распаўсюджванню вопыту лепшых гаспадарак. Асобныя дакументы данеслі да нас сведчанне таго, як ішло распаўсюджванне ў тыя гады ў раёне сельскагаспадарчых ведаў. Так, у «Праекце

пастановы прэзідыума Магілёўскага райвыканкома аб арганізацыі хат-лабараторыяў па калгасах раёна», датаваным 1935 г., гаварылася: «Канцэнтрацыя ўсяго вопыту павінна сканцэнтравацца ў калгасных і саўгасных хатах-лабараторыях, якія павінны стаць галоўным ачагом усёй культуры вядзення сельскай гаспадаркі». Такіх агралабараторый у раёне планавалася арганізаваць, як мінімум, 26 і замацаваць за кожным сельсаветам спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Вялікая ўвага ў гэтыя гады ўдзялялася навуковай пастаноўцы насенняводства. У пратаколе ад 8 кастрычніка 1937 г. «Аб арганізацыі сортавыпрабавальнага ўчастка пры калгасе імя Сталіна Цішоўскага сельсавета гаварылася: «Мы, калгаснікі, для гэтай важнай справы з вялікім жаданнем выдзяляем:

1. 100 га лепшай ворнай зямлі, прыгоднай для сортавыпрабавальных мэт...

2. Пастаянную брыгаду з 25 лепшых правераных калгаснікаў».

Далей пералічваліся адведзены ўчастку інвентар, сельскагаспадарчыя машыны і цяглавая сіла.

У 1940 г. для распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў і перадавога вопыту ў раёне адпаведна пастанове Магілёўскага райвыканкома арганізавана 10 стаханаўскіх школ па вывучэнню агратэхнікі.

Зімой 1940 г. Магілёўскі райвыканком выдаў пастанову «Аб арганізацыі стаханаўскай школы па жывёлагадоўлі ў калгасе імя Валадарскага Пашкаўскага сельсавета». Райвыканком пастанавіў: «Рэкамендаваць усім старшыням калгасаў і старшыні Пашкаўскага сельсавета, а таксама прылягаючых да яго Краснапольскага, Палыкавіцкага і Гаранскага сельсаветаў арганізаваць рэгулярнае наведванне гэтай школы даяркамі».

*У. Агурцоў*

* * *

1935—1940 гг. — апошняя перадваенная пяцігодка. Да гэтага часу ў краіне завяршылася калектывізацыя. У калгасы аб'ядналіся 19,5 мільёна сялянскіх двароў — 93 працэнты агульнай колькасці іх. У 1935 г. адбыўся II Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў, які прыняў новы Статут сельгасарцелі.

У зводцы ад 10 чэрвеня 1935 г. «Аб стане падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю 1935 г. па раёну» Магілёўскі райземаддзел даў звесткі аб тым, што ў раёне налічваецца да гэтага часу 209 калгасаў, у якіх было засеяна 14 364 гектары азімых, 15 395 га каласавых і 2511 га тэхнічных культур. Умацоўвалася арцельная гаспадарка: у сакавіку 1935 г. Магілёўскі райземаддзел паведаміў, што ў калгасы будзе завезена 2370 плугоў, 1500 барон, 510 калёс, 15 сеялак, 108 тон рамонтнага жалеза. Машынны парк раёна за год вырас на 16 трактароў. Да 1939 г. машынна-трактарны парк раёна налічваў 183 трактары, 42 камбайны, 60 малацілак, 50 сеялак, 73 аўтамашыны. Па даных 1967 г., у калгасах і саўгасах Магілёўскага раёна ўжо было 700 трактароў, 232 збожжавыя камбайны, 465 грузавых аўтамашын.

З 1934 па 1939 г. у раёне прырост буйной рагатай жывёлы склаў 44,8 працэнта.

Па звестках Магілёўскага райземаддзела, з 1934 па 1937 г. у раёне павялічылася колькасць трактароў з 79 у 1934 г. да 169 у 1937 г., аўтамашын з 5 у 1934 г. да 17 у 1936 г., трактарных сеялак з 18 у 1934 г. да 33 у 1937 г. і інш.

Расшырыліся і пасяўныя плошчы ў калгасах раёна з 42 200 га ў 1934 г. да 62 774 га ў 1937 г. Значныя поспехі былі дасягнуты ў 1937 г. і ў жывёлагадоўлі: на 100 кароў было атрымана

75 цялят, на 100 свінаматак 608 парасят, на 100 авечкаматак 110 ягнят.

У 1940 г. Галоўны камітэт Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ўзнагародзіў малым сярэбраным медалём і грашовай прэміяй перадавікоў сельскай гаспадаркі Магілёўскага раёна: Ц. А. Кардзянкова (калгас імя Валадарскага), І. М. Кадзетава (калгас імя Валадарскага), П. С. Міңькову (саўгас «Буйнічы»).

Па стану на 1 студзеня 1941 г. у раёне было: калгасаў — 194, саўгасаў — 2, МТС — 5, трактароў — 155, камбайнаў — 44, грузавых аўтамабіляў — 22; кароў — 18 109, коней — 11 711, свіней — 22 582, авечак і коз — 18 118; пасяўных плошчаў — 67 049 га, у тым ліку пад азімыя — 17 192 га, пад яравыя — 49 857 га; колькасць школ — 113, бібліятэк — 184, кінаустановак — 2, клубаў — 53 (у тым ліку і хат-чытальняў); бальніц — 5, амбулаторый-паліклінік — 7.

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 84, воп. 1, спр. 418, л. 14; ф. 9, воп. 4, спр. 3, л. 3—4.*

*Матэрыял падрыхтаваў У. Агурцоў*

## Няхай не паўторыцца

Гісторыя нашай краіны мае нямала светлых і цёмных старонак. Адна з цёмных — рэпрэсіі. Мне, як і ўсім людзям майго пакалення, давялося быць сведкам тых жудасных падзей, калі сотні тысяч ні ў чым не вінаватых людзей былі арыштаваны і асуджаны як «ворагі народа». Не прайшла гэта «хваля» злачынстваў і міма маіх землякоў — жыхароў Палыкавіцкага сельсавета. Колькі іх было, каму навешалі кляймо «ворага», каго саслалі, закатавалі, расстралялі, чые лёсы бесчалавечна растапталі — дакладна невядома і зараз. Справядлівасць, аднак, бярэ верх і цяпер у нашым сельскім Савеце, як, дарэчы, і ў іншых, створана і працуе спецыяльная камісія па рэабілітацыі пацярпеўшых ад рэпрэсій. Сумленным людзям вяртаюцца іх гонар, добрыя імёны.

Перада мною дакументы — скупыя матэрыялы на бязвінна пацярпеўшых, іх сем'і. Знаёмыя і незнаёмыя прозвішчы. Згублена, страчана, забыта многае. У іншых, акрамя прозвішча, нічога і нікога не засталося. Вырубілі ў свой час, як кажуць, пад самы корань увесь род. Хто выжыў, па свету раскіданы. Некаторыя, напалоханыя на ўсё жыццё, і зараз з недаверам ставяцца да ўсіх работ, што вядуцца па рэабілітацыі рэпрэсіраваных і іх сем'яў. Улічваючы гэта, няцяжка ўявіць, што вельмі няпроста працаваць у такіх умовах камісіі, адшукваць «сляды» таго ці іншага чалавека. Таму ў папцы, з якой мне дазволілі азнаёміцца ў Палыкавіцкім сельскім Савеце, матэрыялаў па рэпрэсіраваных сабрана нягуста. Усе яны, аб кім размова, былі, як правіла, добрымі гаспадарамі ў сваіх дамах, але і ў грамадскім жыцці не пасіўнічалі. Людзі думаючыя, супастаўляючыя факты навакольнага жыцця, яны міжволі задаваліся пытаннямі: што робіцца ў свеце, чаму раптам уся краіна Саветаў аказалася ў сетцы «ворагаў народа». Апошняе ўспрымалі з недаверам. За тое, відаць, і паплаціліся браты Мікалай і Уладзімір Арлоўскія, Адольф Савіцкі, мясцовыя «кулакі» Мікіта Князеў, Цімафей Мацыкаў, Емяльян Кузьмянкоў, Адам Шарубін, Піліп Казакоў і многія-многія іншыя. Толькі аднаго даносу хапала, каб падкасіць ахвяру, зруйнаваць жыццё і лёс чалавека. Вынішчаліся, як правіла,

лепшыя з лепшых, людзі працавітыя, высокасумленныя.

Як зараз бачу заплаканыя твары жанчын-маці і жонак, спалоханыя вочы дзяцей. Уганялі з роднай зямлі, ад сем'яў, а іншы раз і сем'ямі. Пусцелі вёскі. Затое можна ўявіць, як па дарогах краіны дзень і ноч ішлі натоўпы змучаных і галодных, распранутых людзей, якіх потым зганялі ў турмы, канцлагеры, на немаверна цяжкія будоўлі, лесапавалы, у руднікі, якіх цкавалі сабакамі, білі, зневажалі, ператваралі ў бяспраўных рабоў.

Такі лёс чакаў, безумоўна, не толькі вясковых людзей. Я ў 1938 г. заканчваў апошні курс Магілёўскага пединстытута, калі і сюды дацягнуліся рукі выслужнікаў НКУС. Амаль адначасова забралі тады рэктара Дзмітрыя Зверава (імя па бацьку, на жаль, запамятаў) — цудоўнага чалавека, любімца студэнтаў, былога камісара дывізіі ў гады грамадзянскай вайны, а разам з ім яшчэ чатырнаццаць выкладчыкаў, траіх студэнтаў. Інстытут агалілі настолькі, што працяглы час заняткі ў нас былі толькі па фізкультуры і ваеннай падрыхтоўцы. Потым ужо пачалі прыязджаць да нас выкладчыкі з Мінска, Масквы, Ленінграда.

Дарэчы, значна пазней сустрэў жонку Зверава і яна расказала, што арыштоўваў мужа, зневажаў і біў ужо пры затрыманні былы выпускнік інстытута, які выдатна ведаў рэктара, яго славу, яго чалавечнасць. Што было з людзьмі, з народам? Хто вінаваты ў тым? Каму выгадна гэта было? Дзеля чаго рабілася? Як ні ламаю галаву, адказ і тлумачэнне ўсяму таму, што рабілася, знайсці не магу.

Няхай жа болей ніколі такога не паўторыцца...

*В. Дзівакоў, настаўнік-пенсіянер,*
*в. Калхнавая «За камуністычную працу».*
*24 жніўня 1991.*

## Вернутыя імёны

### Спіс грамадзян
### Магілёўскага раёна, неабгрунтавана асуджаных у 1930—1980-ых гадах і рэабілітаваных (па архіўных дадзеных КДБ)

**АБАКАНОВІЧ Мікалай Рафаілавіч,** 1863 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Лікершчына Лупалаўскага раёна, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 12 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую дзейнасць да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**АБАКАНОВІЧ Станіслаў Вікенцьевіч,** 1904 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Лікершчына Лупалаўскага раёна, сям'я — бацька, маці, сёстры. Арыштаваны 12 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**АГІНСКІ Васіль Пятровіч,** 1884 года нараджэння, аднаасобнік, жыў на хутары Хонава, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 18 мая 1929 г. за контррэвалюцыйную агітацыю супраць мерапрыемстваў у вёсцы, распаўсюджванне падманных чутак. Справа закрыта ў ходзе следства 18 чэрвеня 1929 г. Магілёўскім акружным аддзелам ДПУ БССР.

**АДЫСЕЎ Андрэй Савельевіч,** 1883 года нараджэння, жыў у в. Сенькава, рабочы лясніцтва. Арыштаваны 29 ліпеня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за контррэвалюцыйную агітацыю, распаўсюджванне чутак аб блізкасці вайны да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у лагеры Сіблаг 27 ліпеня 1940 г. Рэабілітаваны 31 ліпеня 1964 г.

лепшыя з лепшых, людзі працавітыя, высокасумленныя.

Як зараз бачу заплаканыя твары жанчын-маці і жонак, спалоханыя вочы дзяцей. Уганялі з роднай зямлі, ад сем'яў, а іншы раз і сем'ямі. Пусцелі вёскі. Затое можна ўявіць, як па дарогах краіны дзень і ноч ішлі натоўпы змучаных і галодных, распранутых людзей, якіх потым зганялі ў турмы, канцлагеры, на немаверна цяжкія будоўлі, лесапавалы, у руднікі, якіх цкавалі сабакамі, білі, зневажалі, ператваралі ў бясправўных рабоў.

Такі лёс чакаў, безумоўна, не толькі вясковых людзей. Я ў 1938 г. заканчваў апошні курс Магілёўскага пединстытута, калі і сюды дацягнуліся рукі выслужнікаў НКУС. Амаль адначасова забралі тады рэктара Дзмітрыя Зверава (імя па бацьку, на жаль, запамятаў) — цудоўнага чалавека, любімца студэнтаў, былога камісара дывізіі ў гады грамадзянскай вайны, а разам з ім яшчэ чатырнаццаць выкладчыкаў, траіх студэнтаў. Інстытут агалілі настолькі, што працяглы час заняткі ў нас былі толькі па фізкультуры і ваеннай падрыхтоўцы. Потым ужо пачалі прыязджаць да нас выкладчыкі з Мінска, Масквы, Ленінграда.

Дарэчы, значна пазней сустрэў жонку Зверава і яна расказала, што арыштоўваў мужа, зневажаў і біў ужо пры затрыманні былы выпускнік інстытута, які выдатна ведаў рэктара, яго славу, яго чалавечнасць. Што было з людзьмі, з народам? Хто вінаваты ў тым? Каму выгадна гэта было? Дзеля чаго рабілася? Як ні ламаю галаву, адказ і тлумачэнне ўсяму таму, што рабілася, знайсці не магу.

Няхай жа болей ніколі такога не паўторыцца...

*В. Дзівакоў, настаўнік-пенсіянер,*
*в. Калхнавая «За камуністычную працу».*
*24 жніўня 1991.*

## Вернутыя імёны

### Спіс грамадзян Магілёўскага раёна, неабгрунтавана асуджаных у 1930—1980-ых гадах і рэабілітаваных (па архіўных дадзеных КДБ)

**АБАКАНОВІЧ Мікалай Рафаілавіч,** 1863 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Лікершчына Лупалаўскага раёна, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 12 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую дзейнасць да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**АБАКАНОВІЧ Станіслаў Вікенцьевіч,** 1904 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Лікершчына Лупалаўскага раёна, сям'я — бацька, маці, сёстры. Арыштаваны 12 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**АГІНСКІ Васіль Пятровіч,** 1884 года нараджэння, аднаасобнік, жыў на хутары Хонава, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 18 мая 1929 г. за контррэвалюцыйную агітацыю супраць мерапрыемстваў у вёсцы, распаўсюджванне падманных чутак. Справа закрыта ў ходзе следства 18 чэрвеня 1929 г. Магілёўскім акружным аддзелам ДПУ БССР.

**АДЫСЕЎ Андрэй Савельевіч,** 1883 года нараджэння, жыў у в. Сенькава, рабочы лясніцтва. Арыштаваны 29 ліпеня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за контррэвалюцыйную агітацыю, распаўсюджванне чутак аб блізкасці вайны да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у лагеры Сіблаг 27 ліпеня 1940 г. Рэабілітаваны 31 ліпеня 1964 г.

**АКУЛАЎ Андрэй Іванавіч,** 1882 года нараджэння, жыў у в. Бракава, аднаасобнік. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую прапаганду да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 18 чэрвеня 1965 г.

**АКУЛАЎ Андрэй Давыдавіч,** 1892 года нараджэння, жыў у в. Савасцянавічы, працаваў старшынёй калгаса ў в. Сялец. Арыштаваны 2 мая 1945 г. Рэабілітаваны 9 лютага 1946 г.

**АКУЛЕНКА Клім Сямёнавіч,** 1888 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Прысна. Сям'я — 5 чалавек. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за контррэвалюцыйную работу на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 30 жніўня 1989 г.

**АКУЛІЧ Міхаіл Іванавіч,** 1904 года нараджэння, вартаўнік саўгаса «Давыдаўка» Магілёўскага р-на, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 22 жніўня 1937 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 2 студзеня 1938 г. Рэабілітаваны 11 лютага 1960 г.

**АКУНЁЎ Антон Апанасавіч,** 1892 года нараджэння, жыў у в. Агееўка, аднаасобнік. Арыштаваны 13 студзеня 1933 г. Асуджаны рашэннем тройкі ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 7 кастрычніка 1960 г.

**АКЦІСТАЎ Васіль Андрэевіч,** 1904 года нараджэння, жыў у в. Рэчкі, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 31 снежня 1932 г. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1957 г.

**АЛЁХІН Іван Фёдаравіч,** 1902 года нараджэння, без пэўных заняткаў, жыў у в. Сафіеўка, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 26 верасня 1989 г.

**АЛЬШЭЎСКІ Адольф Нікадзімавіч,** 1865 года нараджэння, жыў у в. Паўлінка, сям'я — жонка, дачка. Арыштаваны 21 лютага 1930 г. Рэабілітаваны 27 сакавіка 1989 г.

**АЛЬШЭЎСКІ Аляксандр Іванавіч,** 1899 года нараджэння, жыў у в. Сялец, калгаснік калгаса імя Варашылава. Арыштаваны 6 лістапада 1937 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10 студзеня 1938 г. Рэабілітаваны 27 лістапада 1984 г.

**АЛЬШЭЎСКІ Мікалай Сямёнавіч,** 1862 года нараджэння, жыў у в. Сухары. Арыштаваны 12 лютага 1930 г. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**АЛЬШЭЎСКІ Яфрэм Карпавіч,** 1914 года нараджэння, цясляр маста-цягніка № 421 МШЗ СССР, сям'я — жонка, дачка. Арыштаваны 28 лютага 1945 г. Асуджаны ваенным трыбуналам Калінінскай чыгункі за антысавецкую агітацыю да 7 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 29 лютага 1964 г.

**АЛЯКСЕЙЧЫКАЎ Архіп Міхайлавіч,** 1882 года нараджэння, жыў у в. Палыкавічы, хлебароб. Арыштаваны 20 красавіка 1935 г. за членства ў контррэвалюцыйнай арганізацыі. Вызвалены з-пад варты 10 чэрвеня 1935 г.

**АЛЯКСЕЙЧЫКАЎ Павел Фядосавіч,** 1885 года нараджэння, жыў у в. Палыкавічы, калгаснік. Арыштаваны 19 красавіка 1935 г. за членства ў контррэвалюцыйнай арганізацыі. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1935 г.

**АНДРОСАЎ Іван Сідаравіч,** 1890 года нараджэння, рабочы участка дарог 704, жыў у в. Буйнічы, сям'я — 5 чалавек. Арыштаваны 22 чэрвеня 1941 г. Асуджаны нарадай пры НКУС СССР за антысавецкую агітацыю і прапаганду на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр 22 красавіка 1942 г. Рэабілітаваны 26 мая 1989 г.

**АНДРЭЕВА Еўдакія Васілеўна,** 1924 года нараджэння, жыла ў в. Амхавая, калгасніца. Арыштавана 23 снежня 1944 г. Рэабілітавана 23 кастрычніка 1945 г.

**АНДРЭЕЎ Якаў Адамавіч,** 1911 года нараджэння, калгаснік калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 25 лютага 1947 г. Рэабілітаваны 17 верасня 1947 г.

**АНДРЫЯНАЎ Дзямід Мікалаевіч,** 1978 года нараджэння, жыў у в. Нядашава, сям'я — жонка, 6 дзяцей. Арыштаваны ў 1930 г. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**АНДРЫЯНАЎ Іван Мікалаевіч,** 1884 года нараджэння, жыў у в. Нядашава. Арыштаваны 17 лютага 1930 г. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**АНІСІМАЎ Аляксандр Сямёнавіч,** 1887 года нараджэння, жыў у в. Казіміраўка, калгаснік. Арыштаваны 31 снежня 1944 г. Асуджаны за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 11 лістапада 1945 г.

**АНІСІМАЎ Емяльян Сямёнавіч,** 1882 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Ільінка, сям'я — 3 чалавекі. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за контррэвалюцыйную работу на 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 30 жніўня 1989 г.

**АНОШКА Андрэй Антонавіч,** 1876 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына, вартаўнік шашы Магілёў—Бабруйск. Арыштаваны 7 ліпеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за ўдзел у шпіёнскай дыверсійнай рэзідэнтуры да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 5 сакавіка 1957 г.

**АНОШКА Альфонс (Альфунс) Францавіч,** 1889 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына, аднаасобнік. Арыштаваны 6 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 18 ліпеня 1989 г.

**АНОШКА Аляксандр Якаўлевіч,** 1905 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына. Арыштаваны 4 студзеня 1933 г. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**АНОШКА Браніслаў Фаміч,** 1888 года нараджэння, жыў у в. Пушча, рахункавод саўгаса «Батунь». Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за антысавецкую прапаганду да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 25 лістапада 1939 г.

**АНОШКА Вітольд Рамуальдавіч,** 1903 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына, калгаснік калгаса імя Сталіна. Арыштаваны 5 ліпеня 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 27 лістапада 1989 г.

**АНОШКА Ісідар Карлавіч,** 1878 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына, аднаасобнік. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 18 ліпеня 1989 г.

**АНОШКА Марыя Дзянісаўна,** 1900 года нараджэння, жыла ў в. Вендараж, з сялян. Арыштавана 29 снежня 1932 г. Асуджана пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітавана 31 мая 1989 г.

**АНОШКА Павел Нікадзімавіч,** 1874 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына, паляк, цясляр, сям'я — 3 чалавекі. Арыштаваны 4 ліпеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 3 ліпеня 1958 г.

**АНОШКА Уладзімір Паўлавіч,** жыў у в. Паплаўшчына, сям'я — 7 чалавек. Раскулачаны ў 1929 г. Разам з гаспадаром раскулачаны члены сям'і:

**АНОШКА Клеатыльда Іосіфаўна,** 1883 года нараджэння;

**АНОШКА Адэльфіна Уладзіміраўна,** 1920 года нараджэння;

**АНОШКА Ніна Уладзіміраўна,** 1923 года нараджэння;

**АНОШКА Ванда Уладзіміраўна,** 1925 года нараджэння;

**АНОШКА Павел Уладзіміравіч,** 1929 года нараджэння.

У сям'і канфіскаваны дом, жывёла. Усе члены сям'і сасланы ў Хабараўскі край, Свабодненскі раён. Рэабілітаваны 26 лютага 1993 г.

**АНОШКА Якаў Пятровіч,** 1873 года нараджэння, жыў у в. Паплаўшчына, калгаснік калгаса імя Сталіна. Арыштаваны 5 ліпеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за ўдзел у шпіёнскай дыверсійнай рэзідэнтуры да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 5 сакавіка 1957 г.

**АНТОНЕНКА Іван Мікалаевіч,** 1901 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Князеўка, сям'я — 6 чалавек. Арыштаваны 30 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую

агітацыю на 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 11 ліпеня 1989 г.

**АНЦІПЕНКА Васіль Фёдаравіч,** 1979 года нараджэння, жыў у в. Брады, аднаасобнік. Арыштаваны 1 лістапада 1929 г. Асуджаны асобай нарадай пры калегіі АДПУ за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край на 3 гады. Рэабілітаваны 23 чэрвеня 1989 г.

**АРЛОЎСКІ Альфонс Фердынандавіч,** 1904 года нараджэння, аднаасобнік, жыў на хутары Куты, сям'я — 5 чалавек. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую дзейнасць на 3 гады канцлагераў. Рэабілітаваны 20 верасня 1989 г.

**АРЛОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч,** 1879 года нараджэння, жыў у в. Палавінны Лог, сям'я — жонка, дачка. Арыштаваны ў 1937 г. Рэабілітаваны 21 красавіка 1989 г.

**АРЛОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч,** 1876 года нараджэння, жыў у в. Палавінны Лог, сям'я — жонка, дзве дачкі. Арыштаваны ў 1937 г. Рэабілітаваны 21 красавіка 1989 г.

**АРЛОЎСКАЯ Яўгенія Мікалаеўна,** 1917 года нараджэння, жыла ў в. Палавінны Лог, сям'я — 5 чалавек. Арыштавана 14 лютага 1938 г. Рэабілітавана 18 кастрычніка 1955 г.

**АРЦЮШАНКА Кузьма Карнеевіч,** 1897 года нараджэння, жыў у в. Макаранцы. Арыштаваны 9 студзеня 1933 г. Рэабілітаваны 19 кастрычніка 1989 г.

**АСТАПЕНКА Захар Іванавіч,** 1878 года нараджэння, жыў у в. Галубаўка, з сялян. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. за агітацыю супраць нарыхтовак і калектывізацыі. Рэабілітаваны 24 красавіка 1933 г.

**АСТРОЎСКІ Сцяпан Васілевіч,** 1897 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, медработнік Вендаражскай бальніцы. Арыштаваны 20 студзеня 1937 г. за антысавецкую агітацыю. Справа спынена за недастатковасцю матэрыялаў для аддання суду 28 сакавіка 1937 г.

**АЎСЕЕНКА Аляксандр Фёдаравіч,** жыў у в. Казіміраўка, сям'я — 5 чалавек. Раскулачаны ў 1930 г. Разам з гаспадаром раскулачаны члены сям'і:

**АЎСЕЕНКА Праскоўя Кузьмінічна,** жонка;

**АЎСЕЕНКА Васіль Аляксандравіч;**

**АЎСЕЕНКА Пелагея Аляксандраўна;**

**АЎСЕЕНКА Рыгор Аляксандравіч.**

У сям'і канфіскаваны дом, жывёла. Далейшы лёс сям'і невядомы. Рэабілітаваны 15 лютага 1993 г.

**АЎСЕЕНКА Настасся Сцяпанаўна,** 1923 года нараджэння, жыла ў в. Казіміраўка. Арыштавана 31 снежня 1944 г. Рэабілітавана 2 кастрычніка 1945 г.

**АЎСІЕВІЧ Клім Сцяпанавіч,** 1881 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Прысна, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 26 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за контррэвалюцыйную работу. Пазбаўлены правa пражывання ў 12 пунктах краіны на 3 гады. Вызвалены з-пад варты 28 студзеня 1933 г. Рэабілітаваны 30 жніўня 1989 г.

**АЎЧЫННІКАЎ Мікалай Цімафеевіч,** 1876 года нараджэння, жыў у в. Супонічы. Раскулачаны ў 1933 г. Канфіскаваны дом, жывёла. Рэабілітаваны 23 лістапада 1992 г.

**АФАНАСЕНКА Апанас Філімонавіч,** 1878 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай дзейнасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 12 снежня 1960 г.

**АФАНАСЕНКА Кузьма Філімонавіч,** 1883 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай дзейнасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 12 жніўня 1960 г.

**АФАНАСЬЕЎ Макар Рыгоравіч,** 1872 года нараджэння, жыў на хутары Кадзіна, калгаснік калгаса «1 Мая». Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю. Расстраляны. Рэабілітаваны 24 лютага 1962 г.

**АФАНАСЕНКА Сцяпан Філімонавіч,** 1869 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай дзейнасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 12 жніўня 1960 г.

**АФАНАСЕНКА Фёдар Філімонавіч,** 1867 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 24 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай дзейнасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 12 жніўня 1960 г.

**АФАНАСЕНКА Якаў Еўдакімавіч,** 1875 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**АФІТАЎ Фёдар Кірылавіч,** 1875 года нараджэння, жыў у в. Брылі Лупалаўскага р-на, аднаасобнік. Арыштаваны 3 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20 верасня 1989 г.

**АХРАМКОЎ Кірыла Іванавіч,** 1869 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Шапчыцы, сям'я — 2 чалавекі. Арыштаваны 4 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**БАБІЦКІ Сямён Іванавіч,** 1888 года нараджэння, рабочы, жыў на раз'ездзе Ямніца, сям'я — 6 чалавек. Арыштаваны 1 лютага 1938 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 22 красавіка 1938 г. Рэабілітаваны 12 красавіка 1989 г.

**БАГАМАЗАЎ Ілля Васілевіч,** 1891 года нараджэння, жыў у в. Мяжысеткі, аднаасобнік. Арыштаваны 30 красавіка 1935 г. Асуджаны за ўдзел у арганізаванай антысавецкай дзейнасці. Вызвалены за недаказанасцю абвінавачвання 25 мая 1935 г.

**БАГАМАЗАЎ Трафім Васілевіч,** 1897 года нараджэння, жыў у в. Мяжысеткі, аднаасобнік. Арыштаваны 30 красавіка 1935 г. Асуджаны за ўдзел у арганізаванай антысавецкай дзейнасці. Вызвалены за недаказанасцю абвінавачвання 25 мая 1935 г.

**БАГДАНАЎ Пётр Стэфанавіч,** 1914 года нараджэння, жыў у в. Малыя Бялевічы. Арыштаваны 7 жніўня 1937 г. Рэабілітаваны 16 красавіка 1938 г.

**БАДЭРКА Іван Васілевіч,** 1876 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Прысна, сям'я — жонка, дачка. Арыштаваны 26 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за контррэвалюцыйную работу на тры гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 30 жніўня 1989 г.

**БАЛАХОНАЎ Ягор Паўлавіч,** 1886 года нараджэння, жыў у в. Раманавічы, калгаснік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 15 лістапада 1989 г.

**БАЛАШЭНКА Герасім Лаўрэнавіч,** 1889 года нараджэння, жыў у в. Стайкі, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі. Расстраляны 19 сакавіка 1933 г. Рэабілітаваны 10 сакавіка 1962 г.

**БАЛАШЭНКА Ігнат Еўдакімавіч,** 1899 года нараджэння, жыў у в. Стайкі, аднаасобнік. Арыштаваны 23 чэрвеня 1941 г. Рэабілітаваны 13 ліпеня 1962 г.

**БАЛАШЭНКА Лаўрэн Аўрамавіч,** 1865 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Стайкі, сям'я — 9 чалавек. Арыштаваны 6 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую дзейнасць на 1 год пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 27 ліпеня 1989 г.

**БАЛАШЭНКА Сяргей Еўдакімавіч,** 1897 года нараджэння, жыў у в. Стайкі, аднаасобнік. Арыштаваны 26 чэрвеня 1941 г. Рэабілітаваны 13 ліпеня 1962 г.

**БАЛОД Альвіна Фрыцаўна,** 1909 года нараджэння, жыла ў в. Латрошча. Абвінавачвалася за аказанне дапамогі буржуазіі. Справа спынена ў ліпені 1929 г.

**БАЛОД Франц Янавіч,** 1878 года нараджэння, жыў у в. Латрошча, сям'я — жонка, дзве дачкі. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Рэабілітаваны 11 ліпеня 1989 г.

**БАЛОД Эма Марцаўна,** 1879 года нараджэння, жыла ў в. Латрошча, сям'я — 2 чалавекі. Абвінавачвалася за аказанне дапамогі буржуазіі. Справа спынена ў ліпені 1929 г.

**БАЛОД Эмілія Фрыцаўна,** 1913 года нараджэння, жыла ў в. Латрошча, абвіна-

вачвалася за аказанне дапамогі буржуазіі. Справа спынена ў ліпені 1929 г.

**БАЛОД Фрыц Янавіч,** 1878 года нараджэння, працаваў у абшчыне хлебаробаў, жыў у калоніі Латрошча, сям'я — 6 чалавек. Арыштаваны 17 красавіка 1929 г. Асуджаны калегіяй АДПУ за антысавецкую агітацыю супраць мерапрыемстваў савецкай улады на тры гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 16 чэрвеня 1989 г.

**БАНДАРЭНКА Мікалай Міхайлавіч,** 1910 года нараджэння, працаваў старшым заатэхнікам саўгаса «Вейна», жыў у саўгасе «Вейна», халасты. Арыштаваны 19 лютага 1934 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю на 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**БАНДАРЭНКА Сямён Захаравіч,** 1865 года нараджэння, жыў у в. Галынец, калгаснік. Арыштаваны тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 2 красавіка 1938 г. Рэабілітаваны 17 верасня 1989 г.

**БАНЕЦКІ Баляслаў Канстанцінавіч,** 1890 года нараджэння, жыў у в. Зацішша. Арыштаваны 12 ліпеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіянаж да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 30 верасня 1989 г.

**БАНІН Індрык Карлавіч,** жыў у Пашкаўскім сельсавеце, адзінокі, арыштаваны ў ліпені 1938 г. Асуджаны асобай тройкай пры НКУС БССР за шпіёнскую дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 18 лістапада 1938 г. у Мінску. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**БАНІН Эвальд Карлавіч,** 1888 года нараджэння, жыў у в. Казіміраўка. Арыштаваны 31 снежня 1944 г. Рэабілітаваны.

**БАНЬКОЎСКІ Піліп Іванавіч,** 1892 года нараджэння, жыў у в. Халмы, з сялян. Асуджаны асобай нарадай пры НКУС СССР за здраду Радзіме да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 4 верасня 1946 г.

**БАРАБАНАЎ Васіль Мітрафанавіч,** 1887 года нараджэння, жыў у в. Косцінка, аднаасобнік, сям'я — 3 чалавекі. Арыштаваны 19 лістапада 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 9 сакавіка 1959 г.

**БАРАВЕЦКІ Яўген Міхайлавіч,** 1902 года нараджэння, жыў у в. Сумарокава, інструктар райкаапсаюза, сям'я — 6 чалавек. Арыштаваны 20 ліпеня 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 11 мая 1965 г.

**БАРАНАЎ Павел Аляксандравіч,** 1913 года нараджэння, жыў у в. Туманаўка, калгаснік. Арыштаваны 22 жніўня 1940 г. Асуджаны асобай нарадай пры НКУС СССР за здраду Радзіме да 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 23 снежня 1957 г.

**БАРАНОЎСКІ Ігнат Дзянісавіч,** 1866 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Туманаўка, сям'я — 3 чалавекі. Арыштаваны 16 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 12 верасня 1989 г.

**БАРАНОЎСКІ Пётр Савельевіч,** 1897 года нараджэння, жыў у в. Засценкі, падатковы агент райфінаддзела, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 20 чэрвеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 19 сакавіка 1959 г.

**БАРОДЗІЧ Іван Мікітавіч,** 1892 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Цішоўка, халасты. Арыштаваны 13 лістапада 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за арганізаваную антысавецкую дзейнасць на 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 21 кастрычніка 1988 г.

**БАРОДЗІЧ Якаў Мікітавіч,** 1892 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Цішоўка, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 18 лістапада 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за арганізаваную антысавецкую дзейнасць на 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 21 кастрычніка 1988 г.

**БАРОДЗІЧ Якаў Мікітавіч,** 1893 года нараджэння, жыў у в. Цішоўка, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 28 кас-

трычніка 1945 г. Рэабілітаваны 2 снежня 1988 г.

**БАРТАСЕВІЧ-ШАЎЦОЎ Уладзімір Данілавіч,** 1904 года нараджэння, жыў у в. Карабанаўка, слесар аўтагаража, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 28 жніўня 1937 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 31 кастрычніка 1937 г. Рэабілітаваны 2 кастрычніка 1959 г.

**БАРЧУК Аляксандр Васілевіч,** 1909 года нараджэння, жыў у в. Княжыцы, загадчык пункта Княжыцкага маслазавода, сям'я — 3 чалавекі. Арыштаваны 23 жніўня 1937 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 31 кастрычніка 1937 г. Рэабілітаваны 7 верасня 1965 г.

**БАРЫСЕВІЧ Андрэй Феліксавіч,** 1870 года нараджэння, жыў у в. Кліны, з сялян. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. за ўдзел у антысавецкай арганізацыі. Рэабілітаваны 24 красавіка 1933 г.

**БАРЫСЕНКА Фёдар Аляксеевіч,** 1867 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі. Рэабілітаваны 12 жніўня 1960 г.

**БАРЫСЕНКА Цімафей Фёдаравіч,** 1884 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны постановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 12 жніўня 1960 г.

**БАТУРА Павел Лазаравіч,** 1899 года нараджэння, жыў у в. Галяні, з сялян. Арыштаваны 7 мая 1928 г. Асуджаны за антысавецкую прапаганду. Рэабілітаваны 24 жніўня 1928 г.

**БАТУРА Уладзімір Цімафеевіч,** 1918 года нараджэння, жыў у в. Шчэжар, хлебароб калгаса імя Кагановіча. Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны пастановай тройкі НКУС па БССР за антысавецкую агітацыю і прапаганду да 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 26 мая 1989 г.

**БАТУРЫН Гаўрыла Тарасавіч,** 1896 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Куты. Сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 27 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за контррэвалюцыйную дзейнасць на 6 месяцаў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 20 верасня 1989 г.

**БАТУРЫН Іван Тарасавіч,** 1885 года нараджэння, аднаасобнік, жыў у в. Куты. Сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 2 красавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за контррэвалюцыйную дзейнасць на 3 гады канцлагераў. Рэабілітаваны 20 верасня 1989 г.

**БАХАНЬКОЎ Лаўрэнцій Піменавіч,** 1885 года нараджэння, жыў у в. Навасёлкі, аднаасобнік. Арыштаваны 26 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 15 красавіка 1961 г.

**БАЯНКОЎ Ігнат Фядотавіч,** 1902 года нараджэння, жыў у в. Куты, аднаасобнік. Арыштаваны 11 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 11 ліпеня 1989 г.

**БАЯРАЎ (Баярын) Браніслаў Іванавіч,** паляк, 1891 года нараджэння, рабочы саўгаса «Вейна». Арыштаваны 2 лютага 1938 г. Асуджаны па рашэнні асобай нарады пры НКУС СССР за шпіянаж да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**БАЯРЧУ-РОКАШ Іван Канстанцінавіч,** 1910 года нараджэння, загадчык склада саўгаса «Давыдаўка», сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 22 жніўня 1937 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 2 студзеня 1938 г. Рэабілітаваны 11 лютага 1960 г.

**БЕДУЛЕНКА Рыгор Фролавіч,** 1905 года нараджэння, жыў у в. Цішоўка, сям'я— жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 2 верасня 1937 г. Рэабілітаваны 30 жніўня 1985 г.

**БЕЗРУКАЎ Ермалай Мінавіч,** 1885 года нараджэння, жыў у в. Мацееўшчына.

Арыштаваны 17 ліпеня 1937 г. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**БЕЙМАНАЎ Фёдар Васілевіч,** 1871 года нараджэння, жыў у в. Акулінцы, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 9 лютага 1930 г. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**БЕЛАЧКІН Фёдар Карпавіч,** 1925 года нараджэння, жыў у в. Мішкаўка, нёс службу ў 344-ым гвардзейскім палку Рыжскай марской дывізіі. Арыштаваны 20 студзеня 1945 г. Рэабілітаваны 7 чэрвеня 1945 г.

**БЕЛАЧКІН Фёдар Карпавіч,** 1925 года нараджэння, ураджэнец в. Мішкаўка, памочнік камандзіра роты сувязі. Арыштаваны 9 студзеня 1948 г. Асуджаны ваенным трыбуналам за антысавецкую дзейнасць да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 19 чэрвеня 1973 г.

**БЕЛЯКОВІЧ Пётр Мітрафанавіч,** 1870 года нараджэння, жыў у в. Пушча, з сялян. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. за антысавецкую агітацыю і прапаганду. Рэабілітаваны 24 красавіка 1939 г.

**БЕЛЯКОЎ Карп Сямёнавіч,** 1888 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, з кулакоў. Арыштаваны 13 студзеня 1933 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**БЕЛЯСАЎ Патап Цімафеевіч,** 1895 года нараджэння. Арыштаваны 18 лістапада 1930 г. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**БЕЛЯСАЎ Фёдар Цімафеевіч,** 1908 года нараджэння, аднаасобнік. Арыштаваны 12 лістапада 1930 г. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**БЕЛЯЦКІ Міхаіл Іванавіч,** 1896 года нараджэння, жыў у в. Ямніца. Арыштаваны 13 сакавіка 1938 г. Рэабілітаваны 16 ліпеня 1938 г.

**БЕРАСНЁЎ Іван Васілевіч,** 1898 года нараджэння, жыў у в. Макаўня, аднаасобнік. Арыштаваны 12 студзеня 1935 г. Асуджаны за контррэвалюцыйную дзейнасць. Рэабілітаваны 8 сакавіка 1935 г.

**БІБІЛЬНІКАЎ Васіль Сямёнавіч,** жыў у в. Сінюга. Раскулачаны ў 1930 г. Канфіскаваны дом, жывёла. Рэабілітаваны 24 ліпеня 1993 г.

**БІЗУНОЎ Цімафей Паўлавіч,** 1870 года нараджэння, жыў у в. Грыбаны, калгаснік, сям'я — 4 чалавекі. Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС па БССР за контррэвалюцыйную прапаганду да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 19 лістапада 1966 г.

**БІРУКОЎ Міхаіл Рыгоравіч,** 1882 года нараджэння, жыў у в. Батунь, земляроб. Арыштаваны 16 мая 1932 г. Асуджаны пастановай СПО Магілёўскага аперсектара ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 2 ліпеня 1932 г. Следчая справа спынена і асуджаны вызвалены з-пад варты.

**БІРУКОЎ Міхаіл Рыгоравіч,** 1882 года нараджэння, жыў у в. Батунь, сям'я — жонка, дачка, сын. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Рэабілітаваны 8 чэрвеня 1989 г.

**СПАСЦЁНАЎ Самуіл Мікалаевіч**, 1904 года нараджэння, жыў у в. Лавец Вендаражскага сельсавета, аднаасобнік. Арыштаваны 22 сакавіка 1933 г. Асуджаны пастановай АН пры ПП АДПУ па БССР за контррэвалюцыйную дзейнасць. Рэабілітаваны 15 мая 1933 г.

**СТАНКЕВІЧ Клемянціна Паўлаўна,** 1888 года нараджэння, жыла ў в.Паплаўшчына, з дваран, сям'я — муж, сын, дачка. Арыштавана 28 снежня 1932 г. Асуджана тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 3 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітавана 16 студзеня 1989 г.

**СТАНКЕВІЧ Леанід Іосіфавіч**, 1923 года нараджэння, жыў у в. Сідаравічы, шафёр, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 26 красавіка 1947 г. Асуджаны ваенным трыбуналам за здраду Радзіме і про-

даж дзяржаўнай маёмасці да 25 гадоў паправуча-працоўных лагераў. Вызвалены 1 лістапада 1955 г. Рэабілітаваны 12 ліпеня 1982 г.

**СТАНКЕВІЧ Марыя Мацвееўна**, 1901 года нараджэння, жыла ў в. Туманаўка, старшыня касцёльнага камітэта. Арыштавана 20 чэрвеня 1934 г. Рэабілітавана 4 кастрычніка 1936 г.

**СТРАВЕ Пётр Карлавіч**, 1879 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, аднаасобнік. Арыштаваны 15 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю і прапаганду да высылкі ў Паўночны край па 2-ой катэгорыі. Рэабілітаваны 6 чэрвеня 1989 г.

**СТРАЖНІКАЎ Якуб (Якаў) Піліпавіч**, 1889 года нараджэння, жыў у в. Дары, аднаасобнік, сям'я — чатыры чалавекі. Арыштаваны 26 лістапада 1931 г. Вярхоўны суд БССР апраўдаў. Вызвалены 25 студзеня 1932 г.

**СТРАЖЭВІЧ Іван Эдуардавіч**, 1890 года нараджэння, жыў у в. Засценак-Сумарокава, сям'я — жонка, сын, дачка. Арыштаваны 29 чэрвеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіёнскую дзейнасць на карысць Польшчы да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у лагеры 4 сакавіка 1939 г. Рэабілітаваны 8 кастрычніка 1959 г.

**СТРАЖЭВІЧ Станіслаў Эдуардавіч**, 1896 года нараджэння, жыў у в. Гаі, шафёр-інструктар абласнога савета АТ. Арыштаваны 29 чэрвеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС СССР за шпіянаж. Расстраляны 18 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 18 красавіка 1962 г.

**СТРАЖЭВІЧ Уладзімір Эдуардавіч**, 1898 года нараджэння, жыў у в. Гаі, паляк, старшыня калгаса імя 1 Мая, сям'я — жонка, два сыны. Арыштаваны 1 ліпеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР як агент польскай разведкі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 18 лістапада 1938 г. Рэабілітаваны 8 кастрычніка 1959 г.

**СТРАКУНОЎ (Стрыкуноў) Аляксандр Сілавіч**, 1893 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, вартаўнік Вендаражскай бальніцы, сям'я — жонка, чатыры сыны, дзве дачкі. Арыштаваны 20 студзеня 1937 г. Асуджаны выязной сесіяй спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 13 студзеня 1960 г.

**СТРЫКУНОЎ Ігнат Захаравіч**, 1893 года нараджэння, земляроб. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 13 сакавіка 1933 г.

**СУДЗЯНКОЎ Гаўрыла Іосіфавіч**, 1901 года нараджэння, жыў у в. Сухары, аднаасобнік, сям'я — два чалавекі. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 30 студзеня 1960 г.

**СУШЧЭЎСКІ Павел Міхайлавіч**, 1902 года нараджэння, жыў у в. Брылі, чырвонаармеец. Арыштаваны 9 чэрвеня 1942 г.

**СЦІБЛІНСКІ Ціт Яфімавіч**, 1882 года нараджэння, жыў у в. Дабрасневічы, калгаснік. Арыштаваны 28 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 14 чэрвеня 1989 г.

**СЦІШАНКОЎ Макар Канстанцінавіч**, 1908 года нараджэння, жыў у в. Коркаць, аднаасобнік, сям'я — сем чалавек. Арыштаваны 12 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 чэрвеня 1989 г.

**СЦІШАНКОЎ Павел Дзмітрыевіч**, 1890 года нараджэння, жыў у в. Коркаць, аднаасобнік, сям'я — пяць чалавек. Арыштаваны 6 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю і ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 чэрвеня 1989 г.

**СЦІШАНКОЎ Ягор Іванавіч**, 1884 года нараджэння, жыў у в. Коркаць, сям'я — пяць чалавек. Арыштаваны 12 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 чэрвеня 1989 г.

**СЦЯПАНАЎ Архіп Якаўлевіч**, 1872 года нараджэння, жыў у в. Ходнева, аднаасобнік. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Асуджаны пастановай тройкі ПП АДПУ

па БССР за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край па 2-ой катэгорыі. Рэабілітаваны 7 ліпеня 1989 г.

**СЯМАШКА Пётр Парфёнавіч**, 1895 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, ветфельчар Вендаражскага ветпункта. Арыштаваны 10 сакавіка 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за прыналежнасць да агентуры польскай разведкі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 13 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 26 сакавіка 1950 г.

**СЯМЁНАЎ Барыс Лукіч**, 1894 года нараджэння, жыў у в. Булыжыцы, ляснік, сям'я — восем чалавек; Арыштаваны 22 снежня 1944 г. Асуджаны ваенным трыбуналам войск НКУС за сувязь з нямецкай паліцыяй, збіццё савецкіх грамадзян да 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 12 ліпеня 1947 г.

**СЯНКЕВІЧ Ганна Іванаўна**, жыла ў в. Бароўка, аднаасобніца, сям'я — чатыры чалавекі. Арыштавана 28 снежня 1932 г. Асуджана за агітацыю супраць калгасаў. Вызвалена і справа спынена за недаказальнасцю абвінавачвання 3 сакавіка 1933 г.

**ТАДЭУШ Іван Якаўлевіч**, 1885 года нараджэння, жыў у в. Паўлаўка, сплаўшчык лесу сплаўканторы, сям'я — жонка, чатыры дачкі, тры сыны. Арыштаваны 19 жніўня 1936 г. Асуджаны народным судом г. Магілёва за антысавецкую агітацыю да 2 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 14 мая 1937 г.

**ТАМІЛІНА Ганна**, жыла ў в. Нядашава. Асуджана 22 сакавіка 1930 г. тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да 1 года пазбаўлення волі (умоўна). Рэабілітавана 31 жніўня 1989 г.

**ТАРАСАЎ Андрэй Аляксеевіч**, 1898 года нараджэння, жыў у в. Пясчанка, загадчык магазіна, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 25 кастрычніка 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР як агент польскай разведкі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 7 ліпеня 1958 г.

**ТАРАСАЎ Ларывон Іванавіч**, 1910 года нараджэння, жыў у в. Палыкавічы, кандуктар ст. Магілёў. Асуджаны па арт. 70 Крымінальнага кодэкса БССР. Рэабілітаваны 26 студзеня 1932 г.

**ТАРАСЕНКА Дзмітрый Мікітавіч**, 1895 года нараджэння, жыў у в. Ермалавічы, аднаасобнік. Арыштаваны 10 кастрычніка 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 20 лістапада 1989 г.

**ТОКАРАВА Зінаіда Іванаўна.** У сям'і канфіскаваны дом, жывёла. Усе члены сям'і сасланы ў Пермскую вобласць (г. В. Губаха). Іншых дадзеных аб іх не значыцца. Рэабілітаваны 12 кастрычніка 1992 г.

**ТРАФІМАЎ Мікіта Сцяпанавіч**, 1872 года нараджэння, жыў у в. Дары, аднаасобнік. Арыштаваны 27 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за арганізаваную антысавецкую дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 6 красавіка 1930 г. Рэабілітаваны 9 чэрвеня 1989 г.

**ТРАЦЦЯКОЎ Васіль Мікалаевіч**, 1886 года нараджэння, жыў у в. Тарасавічы. Арыштаваны 1 студзеня 1933 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай групе да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 15 красавіка 1961 г.

**ТРУСАЎ Дзяніс Кузьміч**, 1889 года нараджэння, жыў у в. М. Асавец, аднаасобнік, сям'я — жонка, сямёра дзяцей. Арыштаваны 7 студзеня 1933 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў папраўчапрацоўных лагераў. Рэабілітаваны 17 кастрычніка 1989 г.

**ТРУТНЕЎ Сямён Емяльянавіч**, 1917 года нараджэння, жыў у в. Купёлы, чырвонаармеец. Арыштаваны 25 верасня 1940 г. Асуджаны за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у турме г. Тыраспаля 17 сакавіка 1944 г. Рэабілітаваны 4 чэрвеня 1958 г.

**УКРУЖСКІ Емяльян Рыгоравіч**, 1881 года нараджэння, жыў у п. Сенькава, калгаснік, сям'я — чацвёра дзяцей. Арыштаваны 1 жніўня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю і прапаганду да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 8 мая 1959 г.

**УСАЎ Пётр Мікалаевіч**, 1901 года нараджэння, ураджэнец в. Княжыцы, з ся-

лян, сям'я — чатыры чалавекі, салдат 370-ай стралковай дывізіі 940-га артпалка. Арыштаваны 9 верасня 1942 г. Асуджаны ваенным трыбуналам за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 19 кастрычніка 1942 г.

**УСОЎСКІ Аляксандр Канстанцінавіч**, 1896 года нараджэння, земляроб. Арыштаваны 10 верасня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 30 ліпеня 1960 г.

**УСОЎСКІ Рыгор Канстанцінавіч**, 1889 года нараджэння, жыў у в. Туманаўка, земляроб. Асуджаны тройкай НКУС БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 30 ліпеня 1960 г.

**УСОЎСКІ Сцяпан Канстанцінавіч**, 1894 года нараджэння, жыў у в. Туманаўка, калгаснік. Арыштаваны 28 жніўня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі да 10 гадоў папраўчапрацоўных лагераў. Рэабілітаваны 30 ліпеня 1960 г.

**ФРЫГІН Аляксандр Іосіфавіч**, 1877 года нараджэння, жыў у в. Сафіеўка, аднаасобнік. Арыштаваны 6 лютага 1935 г. Рэабілітаваны 26 снежня 1962 г.

**ФРЫГІН Сцяпан Парфёнавіч**, 1901 года нараджэння, жыў у в. Сафіеўка. Арыштаваны 6 лютага 1935 г. Рэабілітаваны 29 мая 1935 г.

**ФРЫГІН Фёдар Кузьміч**, 1901 года нараджэння, жыў у в. Сафіеўка. Арыштаваны 6 лютага 1935 г. Рэабілітаваны 29 мая 1935 г.

**ФРЫГІН Фёдар Кузьміч,** 1890 года нараджэння, ураджэнец в. Палыкавічы, бухгалтар. Арыштаваны 8 лютага 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17 сакавіка 1938 г. Рэабілітаваны 20 чэрвеня 1989 г.

**ФРЫГІН Фядос Арцёмавіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Сафіеўка, рабочы саўгаса. Арыштаваны 6 снежня 1935 г. Рэабілітаваны 26 снежня 1962 г.

**ФРЫГІН Яўмен Іванавіч**, 1886 года нараджэння, жыў і працаваў у в. Сафіеўка. Арыштаваны 6 лютага 1935 г. Рэабілітаваны 29 мая 1935 г.

**ФУРМАНАЎ Рыгор Апанасавіч**, 1886 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, калгаснік. Арыштаваны 27 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ФЯДКОВІЧ Антон Ільіч**, 1889 года нараджэння, жыў у в. М. Бялевічы, аднаасобнік. Арыштаваны 15 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 10 ліпеня 1989 г.

**ФЯДКОВІЧ Вікенцій Іванавіч**, 1893 года нараджэння, жыў у в. Журава Хрыпялёўскага сельсавета, старшыня калгаса імя Сталіна. Арыштаваны 19 сакавіка 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіянаж. Расстраляны 8 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 23 лістапада 1960 г.

**ФЯДКОВІЧ Іван Андрэевіч**, 1847 года нараджэння, жыў у в. М. Бялевічы, аднаасобнік. Арыштаваны 13 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 10 ліпеня 1991 г.

**ФЯДКОВІЧ Станіслаў Іванавіч**, 1896 года нараджэння, жыў у в. М. Бялевічы, аднаасобнік. Арыштаваны 13 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 10 ліпеня 1989 г.

**ФЯДКОВІЧ Стась Ільіч,** 1892 года нараджэння, жыў у в. М. Бялевічы, аднаасобнік. Арыштаваны 18 сакавіка 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 10 ліпеня 1989 г.

**ФЯДКОВІЧ Уладзімір Іванавіч**, 1886 года нараджэння, жыў у в. Журавец, настаўнік Кутаўскай няпоўнай сярэдняй школы. Арыштаваны 15 сакавіка 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Рас-

страляны 5 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 8 жніўня 1989 г.

**ХАДАНОВІЧ Іван Аляксеевіч,** 1877 года нараджэння, жыў у в. Дашкаўка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі. Расстраляны 19 сакавіка 1933 г. Рэабілітаваны 10 сакавіка 1962 г.

**ХАДАРОВІЧ Пётр Якаўлевіч**, 1893 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, старшыня Хрыпялёўскага сельсавета. Арыштаваны 15 сакавіка 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 15 лютага 1961 г.

**ХАЛАДЦОЎ Піліп Баніфатавіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Дабрасневічы, працаваў у мясцовым калгасе «Парыжская камуна». Арыштаваны 2 сакавіка 1938 г. Расстраляны 2 красавіка 1938 г. Рэабілітаваны 22 мая 1963 г.

**ХАЛАДЦОЎ Піліп Баніфацьевіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Дабрасневічы, калгаснік. Арыштаваны 31 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую дзейнасць да 3 гадоў канцлагераў з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 14 чэрвеня 1989 г.

**ХАЛЕЦКІ Мікалай Іванавіч**, 1896 года нараджэння, жыў у в. Пясчанка, калгаснік, сям'я — чатыры чалавекі. Арыштаваны 26 студзеня 1933 г. Асуджаны за антыкалгасную агітацыю. Вызвалены і справа спынена за адсутнасцю доказаў віны 29 красавіка 1933 г.

**ХАЛЬЧЫЦКІ Васіль Антонавіч,** 1910 года нараджэння, жыў у в. Галынец, рабочы УВСР-86, адна дачка. Арыштаваны 26 ліпеня 1938 г. за шпіёнскую дзейнасць. Вызвалены і справа спынена за адсутнасцю доказаў віны 15 лістапада 1938 г.

**ХАРКЕВІЧ Альберт Адамавіч**, 1861 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, аднаасобнік, жанаты. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Антон Адамавіч**, 1866 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, аднаасобнік, жанаты. Арыштаваны 24 жніўня 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Антон Іванавіч**, 1888 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, аднаасобнік, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 24 жніўня 1929 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Браніслава Мацвееўна**, 1870 года нараджэння, жыла ў в. Хрыпялёва, аднаасобніца, замужняя. Асуджана тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітавана 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Іван Іванавіч**, 1882 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, аднаасобнік, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 7 жніўня 1929 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Камалія Іосіфавна**, 1898 года нараджэння, жыла ў в. Хрыпялёва, аднаасобніца, замужняя. Асуджана тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітавана 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Лізавета Адамаўна,** 1876 года нараджэння, жыла ў в. Хрыпялёва, аднаасобніца, замужняя. Асуджана тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітавана 31 мая 1989 г.

**ХАРКЕВІЧ Станіслаў Уладзіміравіч**, 1907 года нараджэння, жыў у в. Пушча, калгаснік калгаса «Ударнік». Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны за ўдзел у антысавецкай групоўцы. Рэабілітаваны 24 красавіка 1933 г.

**ХАРКЕВІЧ Франц Вікенцьевіч**, 1871 года нараджэння, жыў у в. Халмы, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 1 кастрычніка 1937 г. Асуджаны за контррэвалюцыйную дзейнасць. Вызвалены і справа спынена за адсутнасцю доказаў віны 29 лістапада 1937 г.

**ХАТАНЦОЎ (Хатамцоў) Рыгор Лукіч**, 1884 года нараджэння, жыў у в. Грыбаны, рабочы торфазавода «Фойна-Масток». Арыштаваны 8 верасня 1937 г. Рас-

страляны 4 лістапада 1937 г. Рэабілітаваны 6 кастрычніка 1963 г.

**ХАТАМЦОЎ Ягор Гардзеевіч**, 1892 года нараджэння, жыў у в. Грыбаны. Арыштаваны 16 лютага 1930 г. за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 8 сакавіка 1930 г.

**ХЛІМАНКОЎ Кузьма Тарасавіч**, 1901 года нараджэння, жыў у в. Галяні, калгаснік, служыў у Чырвонай Арміі. Арыштаваны 2 лістапада 1942 г. за антысавецкую агітацыю. Справа спынена за адсутнасцю саставу злачынства 26 лістапада 1942 г.

**ХОМЧАНКА Павел Аксёнавіч**, 1878 года нараджэння, жыў у в. Мікалаеўка, рабочы, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 2 лютага 1963 г.

**ХОМЧАНКА Павел Аксёнавіч**, 1878 года нараджэння, жыў у в. Мікалаеўка, сям'я — сем чалавек. Раскулачаны ў 1930 г. Разам з ім раскулачаны члены сям'і:

**ХОМЧАНКА Марфа Сямёнаўна**, жонка.

**ХОМЧАНКА Васіль Паўлавіч.**

**ХОМЧАНКА Ганна Паўлаўна.**

**ХОМЧАНКА Міхаіл Паўлавіч.**

**ХОМЧАНКА (Фяськова) Надзея Паўлаўна**.

**ХОМЧАНКА Пётр Паўлавіч**.

У сям'і канфіскаваны дом, жывёла, сельскагаспадарчы інвентар. Усе члены сям'і высланы на Урал на 5 гадоў. Вызвалілі іх у 1932 г. Рэабілітаваны 8 ліпеня 1963 г.

**ХРАБТОВІЧ Мікалай Мікалаевіч**, ураджэнец в. Барсукі, ваеннаслужачы. Арыштаваны 6 лістапада 1948 г. Асуджаны за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 26 чэрвеня 1990 г.

**ХРАНОЎСКІ Вікенцій Іосіфавіч**, жыў у в. Любуж, аднаасобнік, сям'я — тры чалавекі. Раскулачаны ў 1930 г. Разам з ім раскулачаны члены сям'і:

**ХРАНОЎСКАЯ Марыя Рыгораўна.**

**ХРАНОЎСКІ Іван Вікенцьевіч**, 1910 года нараджэння.

У сям'і канфіскаваны дом, жывёла, маёмасць. Дадзеных аб месцы, дзе адбывала пакаранне сям'я, і іншых дадзеных няма. Рэабілітаваны 5 кастрычніка 1992 г.

**ХРУЦКАЯ Вера Сяргееўна**, 1923 года нараджэння, жыла ў в. Макаўня, рахункавод калгаса «Пераможац». Арыштавана 23 сакавіка 1945 г. за дапамогу нямецкім акупантам. Рэабілітавана 26 чэрвеня 1945 г.

**ЦАЛАБЁНАК Іосіф Кальянавіч**, 1899 года нараджэння, жыў у в. Бракава. Раскулачаны ў 1939 г. Рэабілітаваны 7 ліпеня 1992 г.

**ЦАЛАБЁНАК Кандрат Антонавіч**, 1862 года нараджэння, жыў у в. Альхоўка, аднаасобнік, сям'я — пяць чалавек. Арыштаваны 6 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 20 ліпеня 1989 г.

**ЦАЛАБЁНАК Павел Кандратавіч**, 1895 года нараджэння, жыў у в. Альхоўка, аднаасобнік, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 6 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 20 ліпеня 1989 г.

**ЦАРЫКАЎ Парфен Дзям'янавіч**, 1872 года нараджэння, жыў у в. Дасовічы, калгаснік калгаса «Чырвоны кастрычнік», сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 27 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў, з заменай на высылку ў Паўночны край на той жа тэрмін. Рэабілітаваны 16 студзеня 1989 г.

**ЦЕЛЯПНЁЎ Іван Пятровіч**, 1916 года нараджэння, ураджэнец в. Таранава, інжынер. Арыштаваны 28 мая 1945 г. Асуджаны за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 28 лістапада 1945 г.

**ЦЕЛЯПНЁЎ Мітрафан Сяргеевіч**, 1884 года нараджэння, жыў у в. Лубнішча, аднаасобнік, сям'я — жонка, пяць сыноў, дзве дачкі. Арыштаваны 21 лістапада 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 19 верасня 1964 г.

**ЦЕПЛЯКОЎ Антон Аляксеевіч**, 1893 года нараджэння, жыў у в. Коцны, працаваў старшынёй сельскага Савета. Арыштаваны 23 чэрвеня 1941 г. Рэабілітаваны 19 лютага 1964 г.

**ЦЕПЛЯКОЎ Мікалай Сяргеевіч**, 1899 года нараджэння, жыў у в. Коцны, калгаснік. Арыштаваны 27 сакавіка 1946 г. за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 6 жніўня 1946 г.

**ЦЕПЛЯКОЎ Цімафей Іванавіч**, 1876 года нараджэння, жыў у в. Астраўшчына, калгаснік калгаса «Чырвоны барацьбіт». Арыштаваны 18 мая 1932 г. Асуджаны пастановай СПО Магілёўскага аперсектара ПП ГОПУ БССР за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 23 чэрвеня 1932 г.

**ЦЕЦЕРУКОЎ Павел Давыдавіч**, 1894 года нараджэння, жыў у в. Навасёлкі, земляроб. Арыштаваны 4 верасня 1930 г. Асуджаны за антысавецкую агітацыю. Рэабілітаваны 25 лістапада 1930 г.

**ЦІКАЛАЎ Аляксандр Герасімавіч**, 1874 года нараджэння, жыў у в. Раманавічы, аднаасобнік. Арыштаваны 26 лістапада 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую дзейнасць да 5 гадоў канцлагераў. Пазней мера пакарання заменена на высылку у Сібір. Рэабілітаваны 29 верасня 1964 г.

**ЦІКУНОЎ Фёдар Яфімавіч**, 1895 года нараджэння, жыў у в. Грыбаны, аднаасобнік, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 9 верасня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за паклёп на калгасы, антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 18 ліпеня 1964 г.

**ЦІМОШЧАНКАЎ Аўсей Аксёнавіч**, 1902 года нараджэння, жыў у в. Раманавічы, калгаснік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 15 снежня 1991 г.

**ЦІТОЎ Васіль Аляксандравіч**, 1899 года нараджэння, жыў у в. Жукава, аднаасобнік. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай групе да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 15 красавіка 1961 г.

**ЦІТОЎ Мікалай Сяргеевіч**, 1892 года нараджэння, жыў і працаваў у в. Сафіеўка. Арыштаваны 6 лютага 1935 г. Рэабілітаваны 29 мая 1935 г.

**ЦІТОЎ Палікарп Сяргеевіч**, 1898 года нараджэння, жыў у в. Сафіеўка, аднаасобнік. Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28 верасня 1937 г. Рэабілітаваны 22 лютага 1989 г.

**ЦЫБУЛЬСКАЯ Аляксандра Пятроўна**, 1894 года нараджэння, жыла ў в. Цішоўка, настаўніца, сям'я — дзесяць чалавек. Арыштавана 23 жніўня 1937 г. Асуджана як польскі агент. Рэабілітавана 15 лютага 1938 г.

**ЦЫГАНКОЎ Іван Данілавіч,** 1873 года нараджэння, жыў у в. Сташына, аднаасобнік, сям'я — жонка, чатыры сыны, дачка. Арыштаваны 30 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за арганізаваную антысавецкую прапаганду да высылкі ў Паўночны край на 3 гады. Рэабілітаваны 2 ліпеня 1966 г.

**ЦЫГАНКОЎ Максім Данілавіч**, 1881 года нараджэння, жыў у в. Дабрасневічы, аднаасобнік. Арыштаваны 28 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 3 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 14 чэрвеня 1989 г.

**ЦЫГАНКОЎ Нічыпар Іванавіч,** 1893 года нараджэння, жыў у в. Пашкава, калгаснік калгаса імя Валадарскага, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 10 жніўня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіёнскую дзейнасць да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Вызвалены 15 студзеня 1940 г.

**ЦЫМБАРЭВІЧ Антон Станіслававіч**, 1890 года нараджэння, жыў у в. Пашкава Заціша, цясляр, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 1 лютага 1934 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за членства ў контррэвалюцыйнай групе, шкодніцкую дзейнасць да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 12 сакавіка 1957 г.

**ЦЫРУЛЬНІКАЎ Павел Мартынавіч**, 1874 года нараджэння, жыў у в. Хонава, аднаасобнік. Арыштаваны 12 красавіка

1935 г. за дыверсію. Справа закрыта за адсутнасцю доказаў віны 5 мая 1937 г.

**ЦЮЛЬМЯНКОЎ Піліп Ануфрыевіч**, 1883 года нараджэння, жыў у в. Бракава, аднаасобнік, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую прапаганду да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 18 чэрвеня 1965 г.

**ЦЮЛЬМЯНКОЎ Раман Мікітавіч**, 1886 года нараджэння, жыў у в. Бракава, аднаасобнік, сям'я — жонка, дзевяцёра дзяцей. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую прапаганду да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 18 чэрвеня 1965 г.

**ЦЯРПІНСКІ Уладзімір Цярэнцьевіч**, 1921 года нараджэння, агент па нарыхтоўцы раймінзага. Арыштаваны 22 сакавіка 1947 г. Асуджаны за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 8 чэрвеня 1947 г.

**ЦЯРЭШЧАНКА Нічыпар Ануфрыевіч**, жыў у в. Слабодка, калгаснік. Арыштаваны 3 красавіка 1945 г. Асуджаны ваенным трыбуналам г. Сталіна за здраду Радзіме да 15 гадоў катаржных работ. Памёр у месцах зняволення. Рэабілітаваны 1 сакавіка 1955 г.

**ЧАКАНАЎ Іван Ермалаевіч**, 1889 года нараджэння, жыў у в. Нізкая Вуліца, аднаасобнік, сям'я — жонка, пяцёра дзяцей. Арыштаваны 27 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую прапаганду да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 18 чэрвеня 1965 г.

**ЧАКАНАЎ Фрол Савельевіч**, 1887 года нараджэння, жыў у в. Нікіцінічы, калгаснік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны па рашэнні асобай тройкі пры ПП АДПУ па БВА за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 2 верасня 1963 г.

**ЧАРВОННІКАЎ Ізот Мікалаевіч**, 1874 года нараджэння, жыў у в. Сенькава, калгаснік. Арыштаваны 18 ліпеня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за контррэвалюцыйную агітацыю, распаўсюджванне чутак аб набліжэнні вайны да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 31 ліпеня 1964 г.

**ЧАРНЕГІН Мітрафан Кірылавіч**, 1887 года нараджэння, жыў у в. Раманавічы, калгаснік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 15 лістапада 1989 г.

**ЧАРНЕГІН Павел Кірылавіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Раманавічы, калгаснік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю, удзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 15 лістапада 1989 г.

**ЧАРНОЎ Лазар Іванавіч**, 1874 года нараджэння, жыў у в. Грыбачы, аднаасобнік, сям'я — жонка, сын. Арыштаваны 26 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за членства ў контррэвалюцыйнай групе да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў 1933 г. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1957 г.

**ЧАРНЯЎСКІ Франц Францавіч**, 1887 года нараджэння, жыў у в. Палавінны Лог, калгаснік. Арыштаваны 6 снежня 1937 г. Расстраляны 25 лютага 1938 г. Рэабілітаваны 20 чэрвеня 1962 г.

**ЧАХОЎСКІ Пётр Піліпавіч**, 1906 года нараджэння, жыў у в. Палавінны Лог, бухгалтар. Арыштаваны 16 студзеня 1938 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26 красавіка 1938 г. Рэабілітаваны 31 ліпеня 1989 г.

**ЧМАРАДКОЎ Якаў Міхайлавіч**, 1886 года нараджэння, жыў у в. Грыбаны, земляроб, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 6 жніўня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за антысавецкую прапаганду да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 18 верасня 1956 г.

**ЧУДЗЯНКОЎ Мартын Іванавіч**, 1904 года нараджэння, ураджэнец Гаранскага сельсавета, жыў у Магілёве, працаваў у дэпо ст. Магілёў-1. Арыштаваны 23 чэрвеня 1941 г. Рэабілітаваны 9 кастрычніка 1941 г.

**ЧУЛКЕВІЧ Фёдар Ісаакавіч**, 1878 года нараджэння, жыў у в. Нічыпаравічы, свяшчэннік. Арыштаваны 5 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА

за антысавецкую дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ЧЫЖКОЎСКІ (Чышкоўскі) Іван Адамавіч**, 1900 года нараджэння, жыў у пас. Грабянёва, электраманцёр гаркамгаса. Арыштаваны ў 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР як агент Польшчы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 4 лютага 1958 г.

**ЧЫРВОННІКАЎ Сцяпан Мікалаевіч**, 1871 года нараджэння, жыў у в. Сенькава, аднаасобнік, сям'я — жонка, тры сыны, дзве дачкі. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 27 сакавіка 1989 г.

**ЧЫКСТ (Чыкстэ) Эдуард Мартынавіч**, 1901 года нараджэння, жыў у в. Валокі, калгаснік калгаса «1 Мая», сям'я — жонка, сын. Арыштаваны 20 ліпеня 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС СССР за шпіёнскую дзейнасць на карысць Латвіі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29 лістапада 1938 г. Рэабілітаваны 21 снежня 1965 г.

**ЧЫЧЫКАЎ Пётр Стэфанавіч**, 1894 года нараджэння, жыў у в. Пашкава, настаўнік школы. Арыштаваны 19 ліпеня 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР як агент Польшчы, удзельнік дыверсійнай групы да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 14 жніўня 1958 г.

**ЧЭКЕТЭ Карл Якаўлевіч**, 1898 года нараджэння, жыў у в. Пятровічы, працаваў кавалём у латышскай калоніі в. Грудзінаўка. Арыштаваны 31 ліпеня 1938 г. Расстраляны 11 лістапада 1938 г. Рэабілітаваны 14 верасня 1962 г.

**ЧЭПЕЛЕЎ Іван Міхайлавіч**, 1890 года нараджэння, жыў у в. В. Бялевічы, рабочы смалакурнага завода, сям'я — два чалавекі. Арыштаваны 6 верасня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за контррэвалюцыйную дзейнасць да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 15 лютага 1986 г.

**ЧЭПЕЛЕЎ Навум Яфімавіч (Аўрамавіч)**, 1907 года нараджэння, жыў у в. Аляксандраўка, калгаснік. Арыштаваны 5 жніўня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю і прапаганду да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 8 мая 1959 г.

**ШАБАН Рыгор Цярэнцьевіч**, 1881 года нараджэння, жыў у в. Зацішша, бухгалтар аблздраўаддзела. Арыштаваны 22 снежня 1944 г. Асуджаны за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 12 лістапада 1945 г.

**ШАГАЎ Кірыл Аляксеевіч**, 1874 года нараджэння, жыў у в. Жукава, аднаасобнік. Арыштаваны 26 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай групе да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 15 красавіка 1961 г.

**ШАГІНАЎ Пётр Елісеевіч**, 1879 года нараджэння, жыў у в. Дары, аднаасобнік. Арыштаваны 27 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю, спробу ўчыніць тэрарыстычны акт да 5 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 9 чэрвеня 1989 г.

**ШАРОВА Ганна Пятроўна**, у сям'і канфіскаваны дом, жывёла. Дадзеных аб месцы, дзе адбывала пакаранне сям'я, іншых дадзеных няма. Рэабілітавана 27 кастрычніка 1992 г.

**ШАРШНЁЎ Мікіта Мікалаевіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Коркаць, аднаасобнік, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 7 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16 чэрвеня 1989 г.

**ШАТУРГІН Іван Архіпавіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Грабянёва, земляроб у калгасе, сям'я — дзевяць чалавек. Арыштаваны 19 лістапада 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за агітацыю супраць калгасаў, распаўсюджванне чутак аб вайне да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Адбываў пакаранне ў Мардовіі. Памёр 27 красавіка 1940 г., пахаваны на месцы зняволення. Рэабілітаваны 20 ліпеня 1986 г.

**ШАЎЦОЎ Андрэй Малахавіч**, 1890 года нараджэння, жыў у в. Мікалаеўка, калгаснік. Арыштаваны 23 снежня 1944 г. Асуджаны за здраду Радзіме. Рэабілітаваны 4 красавіка 1945 г.

**ШАЎЦОЎ Самсон Пахомавіч**, 1877 года нараджэння, жыў у в. Мяжысеткі, рабочы Забалоцкай дачы, сям'я — жонка, дачка, два сыны. Арыштаваны 9 верасня 1937 г. Асуджаны тройкай пры НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Тэрмін адбываў у Каргапольлагу НКУС. Памёр у спецізалятары 5 ліпеня 1942 г. Рэабілітаваны 11 мая 1989 г.

**ШАЎЦОЎ Сямён Іванавіч**, 1877 года нараджэння, жыў у в. Савасцянавічы, аднаасобнік, сям'я — жонка, сын. Арыштаваны 30 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за арганізацыю антысавецкай прапаганды да 3 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 2 ліпеня 1966 г.

**ШАЎЧЭНКА Андрэй Іванавіч**, 1904 года нараджэння, жыў у в. Грыбачы, аднаасобнік, сям'я — жонка, два сыны. Арыштаваны 24 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай групе да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1957 г.

**ШАЎЧЭНКА Іван Парфіравіч**, 1872 года нараджэння, жыў у в. Гарбачы, аднаасобнік. Арыштаваны 6 ліпеня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10 верасня 1937 г. Рэабілітаваны 15 мая 1989 г.

**ШАЦІКАЎ Іван Платонавіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Дубінка. аднаасобнік. Арыштаваны 5 сакавіка 1933 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 12 жніўня 1960 г.

**ШКУРАТАЎ Міхаіл Фёдаравіч**, 1905 года нараджэння, жыў у в. Малая Дубраўка, калгаснік калгаса імя Варашылава, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 11 лістапада 1950 г. Асуджаны Вярхоўным судом СССР за здраду Радзіме да 25 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 24 верасня 1964 г.

**ШКУРЫНСКАЯ Вікторыя Станіславаўна**, 1908 года нараджэння, ураджэнка в. Туманаўка, без пэўнага месца жыхарства. Арыштавана 5 ліпеня 1938 г. Асуджана асобай тройкай НКУС БССР за ўдзел у шпіёнскай дыверсійнай рэзідэнтуры да 8 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітавана 5 сакавіка 1957 г.

**ШКУТАЎ Аляксандр Піліпавіч**, 1890 года нараджэння, жыў і працаваў у в. Сафіеўка. Арыштаваны 6 лютага 1935 г. Рэабілітаваны 29 мая 1935 г.

**ШКУТАЎ Іван Піліпавіч**, 1902 года нараджэння, жыў у в. Сафіеўка, калгаснік калгаса «Прамень абуджэння». Арыштаваны 21 красавіка 1935 г. Рэабілітаваны 14 снежня 1939 г.

**ШПАКАЎ Адам Сцяпанавіч**, 1884 года нараджэння, жыў у в. Сумарокава, калгаснік. Арыштаваны 9 жніўня 1932 г. Асуджаны Вярхоўным судом БССР за агітацыю на развал калгаса да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў.

**ШПАКАЎ Максім Герасімавіч**, 1903 года нараджэння, жыў у в. В. Бялевічы, пячнік, сям'я — жонка, два сыны, дачка. Арыштаваны 6 верасня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Адбываў пакаранне ў Сегежскім лагеры НКУС, дзе памёр 2 студзеня 1942 г. Рэабілітаваны 30 студзеня 1960 г.

**ШПАКАЎ Сяргей Сцяпанавіч**, 1892 года нараджэння, жыў у в. Сумарокава, калгаснік калгаса «Новы свет». Арыштаваны 9 жніўня 1932 г. Асуджаны Вярхоўным судом БССР за агітацыю на развал калгаса да 3 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 31 ліпеня 1990 г.

**ШПАКАЎ Яфрэм Лаўрэнавіч (Лаўрэнцьевіч)**, 1887 года нараджэння, жыў на пас. Сенькава, сям'я — два сыны і дачка. Арыштаваны 1 жніўня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю і прапаганду да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 8 мая 1959 г.

**ШПАКАЎ Яфрэм Лаўрэнцьевіч**, 1887 года нараджэння, жыў у в. Александрова, цясляр, сям'я — сын і дачка. Арыштаваны 6 верасня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю і прапаганду да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 8 мая 1959 г.

**ШУБАДЗЁРАЎ Іван Ісаакавіч**, 1902 года нараджэння, жыў у в. Нядашава, ад-

наасобнік, сям'я — жонка, трое дзяцей. Арыштаваны 19 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**ШУБАДЗЁРАЎ Пракоп Нічыпаравіч**, 1862 года нараджэння, жыў у в. Нядашава, аднаасобнік, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**ШУБАДЗЁРАЎ Самуіл Пятровіч**, 1900 года нараджэння, жыў у в. Нядашава, аднаасобнік, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 10 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**ШУБАДЗЁРАЎ Сцяпан Фядотавіч**, 1883 года нараджэння, жыў у в. Нядашава, аднаасобнік, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 31 жніўня 1989 г.

**ШУНАЕЎ Фёдар Пятровіч**, 1888 года нараджэння, жыў у в. Агееўшчына, аднаасобнік, сям'я — жонка, шасцёра дзяцей. Арыштаваны 25 верасня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую прапаганду да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 11 ліпеня 1964 г.

**ШУРЫНАЎ Мікіта Яфімавіч**, 1905 года нараджэння, жыў у в. Фойна, калгаснік. Арыштаваны 11 студзеня 1933 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за контррэвалюцыйную прапаганду і агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 2 верасня 1963 г.

**ШУСЦІКАЎ Васіль Іванавіч**, 1898 года нараджэння, жыў у в. Грыбачы, з кулакоў, аднаасобнік, сям'я — жонка, два сыны, дачка. Арыштаваны 17 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў 1933 г. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1957 г.

**ШУСЦІКАЎ Пётр Іванавіч**, 1904 года нараджэння, жыў у в. Грыбачы, з кулакоў, аднаасобнік. Арыштаваны 17 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў 1933 г. Рэабілітаваны 10 чэрвеня 1957 г.

**ШУТАЎ Гардзей Іванавіч**, 1907 года нараджэння, жыў у в. Дубінка, аднаасобнік. Арыштаваны 25 снежня 1932 г. Асуджаны пастановай асобай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі да 5 гадоў папраўча-працоўны лагераў. Рэабілітаваны 1 жніўня 1960 г.

**ШЧАМЯЛЁЎ Ціхан Ульянавіч**, 1890 года нараджэння, жыў у в. Княжыцы, калгаснік. Арыштаваны 21 лютага 1938 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29 красавіка 1938 г. Рэабілітаваны 26 ліпеня 1989 г.

**ШЧАМЯЛЁВА (Шчамель) Эрна Карлаўна**, 1901 года нараджэння, жыла ў в. Княжыцы, немка, калгасніца, сям'я — двое дзяцей. Арыштавана 21 лютага 1938 г. Асуджана па рашэнні камісіі НКУС і пракурорам СССР за антысавецкую агітацыю і як шпіён Германіі да вышэйшай меры пакарання. Прыгавор адменены ў сувязі з нараджэннем дзіцяці. Рэабілітавана 8 сакавіка 1939 г.

**ШЧЭРБА Аляксандр Феліксавіч**, 1871 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, паляк, аднаасобнік, сям'я — жонка, двое дзяцей. Арыштаваны 7 жніўня 1929 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 23 лютага 1930 г. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ШЧЭРБА Вільгельм Антонавіч**, 1888 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, калгаснік калгаса імя Дзяржынскага. Арыштаваны 15 студзеня 1938 г. Асуджаны па рашэнню НКУС БССР і пракурорам СССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 14 сакавіка 1938 г. Рэабілітаваны 28 лістапада 1957 г.

**ШЧЭРБА Георгій (Ягор) Антонавіч**, 1887 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, конюх калгаса імя Дзяржынскага. Арыштаваны 21 студзеня 1937 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР як польскі агент да вышэйшай меры пакарання.

Расстраляны 14 сакавіка 1938 г. Рэабілітаваны 19 чэрвеня 1956 г.

**ШЧЭРБА Домна Емяльянаўна,** 1900 года нараджэння, жыла ў в. Хрыпялёва, полька, аднаасобніца, замужняя. Асуджана тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Паўночны край. Рэабілітавана 31 мая 1989 г.

**ШЧЭРБА Іван Андрэевіч**, 1864 года нараджэння, жыў у в. Палавінны Лог, калгаснік калгаса імя Леніна. Арыштаваны 7 верасня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за контррэвалюцыйную дзейнасць да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 4 ліпеня 1959 г.

**ШЧЭРБА Станіслаў Антонавіч**, 1870 года нараджэння, паляк, з дваран, аднаасобнік, сям'я — чатыры чалавекі. Арыштаваны 6 жніўня 1929 г. за антысавецкую агітацыю. Справа спынена за адсутнасцю саставу злачынства 20 жніўня 1929 г.

**ШЧЭРБА Фелікс Адамавіч**, 1884 года нараджэння, жыў у в. Хрыпялёва, аднаасобнік. Арыштаваны 15 лістапада 1929 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за контррэвалюцыйную дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 15 студзеня 1965 г.

**ШЫНКЕВІЧ Іван Васілевіч**, 1895 года нараджэння, ветфельчар саўгаса «Вейна». Арыштаваны 29 лістапада 1933 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі да 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 17 чэрвеня 1957 г.

**ШЭВЕЛЕЎ Іосіф Сямёнавіч**, 1879 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, рабочы Вендаражскай сельскай бальніцы. Арыштаваны 20 студзеня 1937 г. Асуджаны выязной сесіяй спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР за антысавецкую агітацыю да 7 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у лагеры. Рэабілітаваны 13 студзеня 1960 г.

**ШЭВЕЛЕЎ Фёдар Андрэевіч**, 1899 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, калгаснік калгаса «Пралетарый», сям'я — жонка, дзве дачкі, сын. Арыштаваны 19 студзеня 1937 г. Асуджаны выязной сесіяй спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 13 студзеня 1960 г.

**ШЭЙНІН Альберт Эрнеставіч**, 1905 года нараджэння, жыў у в. Латрошча. Арыштаваны 11 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны ў 1957 г.

**ЭЙЗЕНГРАУД Віль Фрыцавіч**, 1905 года нараджэння, жыў у в. Латрошча, аднаасобнік, халасты. Арыштаваны 6 ліпеня 1929 г. Асуджаны асобай нарадай калегіі пры АДПУ за дапамогу міжнароднай буржуазіі да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 13 чэрвеня 1989 г.

**ЭЙЗЕНГРАУД Лізета Карлаўна**, 1893 года нараджэння, жыла ў в. Латрошча, аднаасобніца, сям'я — муж, трое дзяцей. Арыштавана 6 ліпеня 1929 г. Асуджана асобай нарадай калегіі пры АДПУ за дапамогу міжнароднай буржуазіі да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 13 чэрвеня 1989 г.

**ЭЙЗЕНГРАУД Ліпа Янаўна**, 1873 года нараджэння, жыла ў в. Латрошча, хатняя гаспадыня, сям'я — муж, сын. Арыштавана 6 ліпеня 1929 г. Асуджана асобай нарадай калегіі пры АДПУ за дапамогу міжнароднай буржуазіі да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 13 чэрвеня 1989 г.

**ЭЙЗЕНГРАУД Фама Мартынавіч**, 1912 года нараджэння, жыў у в. Латрошча, халасты. Арыштаваны 6 ліпеня 1929 г. Асуджаны асобай нарадай калегіі пры АДПУ за дапамогу міжнароднай буржуазіі да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 13 чэрвеня 1989 г.

**ЭЙЗЕНГРАУД Юлія Эрнестаўна**, 1887 года нараджэння, жыла ў в. Латрошча, аднаасобніца. Сям'я — пяцёра дзяцей. Арыштавана 6 ліпеня 1929 г. Асуджана асобай нарадай калегіі пры АДПУ за дапамогу міжнароднай буржуазіі да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 13 чэрвеня 1989 г.

**ЭЙНДЛІН Анатоль Рыгоравіч**, 1904 года нараджэння, ураджэнец в. Сухары, працаваў у эвакашпіталі № 1271. Арыштаваны 28 кастрычніка 1942 г. Асуджаны ваенным трыбуналам Туркестанскай ваеннай акругі за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 26 снежня 1957 г.

**ЯЗВІНСКІ Вікенцій Адамавіч**, 1898 года нараджэння, жыў у в. Буйнічы, электраманцёр Магілёўскага ўчастка сельэлектра, сям'я — жонка, два сыны, дачка.

Арыштаваны 12 лютага 1938 г. Асуджаны камісіяй НКУС і пракурорам СССР за шпіёнскую дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9 мая 1938 г. Рэабілітаваны 28 снежня 1959 г.

**ЯЗІКАЎ Ісак Фёдаравіч**, 1902 года нараджэння, жыў у в. Макаўня, земляроб, трое дзяцей. Арыштаваны 13 студзеня 1935 г. Асуджаны за контррэвалюцыйную дзейнасць. Вызвалены з-пад варты 8 сакавіка 1935 г.

**ЯКАВІЦКІ Васіль Нічыпаравіч**, 1860 года нараджэння, жыў у в. Кадзіна, аднаасобнік. Арыштаваны 20 лютага 1930 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БВА за антысавецкую агітацыю да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 9 чэрвеня 1989 г.

**ЯКІМЦАЎ Цярэнцій Аляксандравіч**, 1889 года нараджэння, жыў у в. Раманавічы, аднаасобнік. Арыштаваны 18 лістапада 1937 г. Асуджаны асобай тройкай пры НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 23 жніўня 1985 г.

**ЯКУШАЎ Адам Якаўлевіч**, 1892 года нараджэння, жыў у в. Вендараж, з сялян. Арыштаваны 29 снежня 1932 г. Асуджаны тройкай пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 3 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 31 мая 1989 г.

**ЯКУШАЎ Стэфан Трафімавіч**, 1903 года нараджэння, жыў у в. Масток, калгаснік калгаса імя Сталіна. Арыштаваны 9 лістапада 1934 г. Асуджаны за замах на жыццё селькораў. Рэабілітаваны 9 снежня 1934 г.

**ЯКШТО Нікадзім Станіслававіч**, 1897 года нараджэння, жыў у в. Ямніца, паляк, з рабочых, сям'я — тры чалавекі. Арыштаваны 7 жніўня 1938 г. за шпіянаж. Рэабілітаваны 13 студзеня 1939 г.

**ЯНКОЎСКІ Віктар (Вікенцій) Францавіч**, 1900 года нараджэння, жыў у в. Княжыцы, старшыня Княжыцкага сельсавета, сям'я — жонка, чацвёра дзяцей. Арыштаваны 10 жніўня 1938 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР як агент Польшчы да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Адбываў пакаранне ў Каргапольлагу Архангельскай вобласці, дзе памёр 27 чэрвеня 1942 г. Рэабілітаваны 15 кастрычніка 1965 г.

**ЯНСАН Анс Францавіч**, 1872 года нараджэння, жыў у в. Латрошча, калгаснік калгаса «Цыне». Арыштаваны 17 ліпеня 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за антысавецкую агітацыю да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 11 ліпеня 1989 г.

**ЯНСАН Ян Фрыцавіч**, 1868 года нараджэння, жыў у в. Латрошча, аднаасобнік, сям'я — жонка, чатыры сыны. Арыштаваны 28 снежня 1932 г. Асуджаны калегіяй АДПУ за антысавецкую дзейнасць. Рэабілітаваны 11 ліпеня 1989 г.

**ЯНУКОВІЧ (Пайсей) Пётр Цімафеевіч**, 1880 года нараджэння, жыў у в. Амхавая, ігумен-свяшчэннік. Арыштаваны ў 1937 г. Асуджаны тройкай НКУС БССР за контррэвалюцыйную дзейнасць да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 9 красавіка 1966 г.

**ЯРМОЛЕНКА Максім Сямёнавіч**, 1882 года нараджэння, жыў у в. М. Бушкава, аднаасобнік. Арыштаваны 7 лютага 1930 г. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АДПУ па БССР за антысавецкую агітацыю да 3 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 7 ліпеня 1989 г.

**ЯРМУШЭЎСКІ Вячаслаў Іванавіч**, 1892 года нараджэння, жыў у пас. Чамярычнае, лесавод Магілёўскага лясгаса. Арыштаваны 1 мая 1938 г. Асуджаны асобай тройкай НКУС БССР за шпіянаж да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 8 кастрычніка 1938 г. Рэабілітаваны 27 лістапада 1989 г.

## Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гг.



Ф. Е. Восіпаў

### ВЕНДАРАЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ
в. ВАРАТЫНШЧЫНА

**ВОСІПАЎ Фама Емяльянавіч,** 1911 года нараджэння, загінуў у 1939 г.

### ВЯЙНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ
в. ВЕЙНА

**ПАРХОМЕНКА Якаў Фёдаравіч,** 1910 года нараджэння, загінуў у 1939 г., падарваўся з гранатамі пад танкам.

### ПАЛЫКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ
в. ПАЛЫКАВІЧЫ

**АЎДЗЕЕНКА Яфім Іванавіч,** 1918 года нараджэння, прапаў без вестак.

### СІДАРАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ
в. СІДАРАВІЧЫ

**ПАНКРАТАЎ Цімафей Мікалаевіч,** 1910 года нараджэння, загінуў у 1939 г.

### СУХАРЭЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ
в. БУШКАВА

**АЎДЗЕЕНКА Нікіфар Іванавіч,** 1911 года нараджэння, загінуў у 1939 г.

**ЗАЙЦАЎ Арцём Дзям'янавіч,** 1909 года нараджэння, загінуў у 1939 г.

**ЗАЙЦАЎ Іоў Маісеевіч,** 1906 года нараджэння, прапаў без вестак.

**ЛОСЕЎ Фёдар Карпавіч,** 1908 года нараджэння, загінуў у 1940 г.

**МАРЧАНКА Захар Рыгоравіч,** 1906 года нараджэння, загінуў у 1939 г.

**ПУНТУСАЎ Уладзімір Мартынавіч,** 1907 года нараджэння, прапаў без вестак.

**ЧАРНЯКОЎ Іван Ільіч,** 1903 года нараджэння, загінуў у 1940 г.

**ЧАРНЯКОЎ Міхаіл Карпавіч,** 1907 года нараджэння, прапаў без вестак.

**ЧАРНЯКОЎ Сігней Усцінавіч,** 1904 года нараджэння, загінуў у 1940 г.

в. ВАСІЛЕВІЧЫ

**СЕНЦЮРОЎ Давыд Парфенавіч,** загінуў.

**СЕНЦЮРОЎ Ягор Емяльянавіч,** 1914 года нараджэння, загінуў.

в. ЗАРЭСЦЕ

**ХАЗЯІНКАЎ Іван Парфілавіч,** 1909 года нараджэння, загінуў.

в. СУПАНІЧЫ

**ДЗЯРУЖЫН Яфім Фёдаравіч,** загінуў у 1939 г.

в. ЦЕЦЯРЭЎНІК

**КАШТАНАЎ Ігнат Васілевіч,** 1917 года нараджэння, загінуў.

# 1941
# 1945

## У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

### Абарона

**Успамінае Андрэй Ільіч Марозаў, былы начальнік штаба атрадаў народнага апалчэння**

22 чэрвеня. Нядзеля. Спякотны летні дзень. Магіляўчане адпраўляліся адпачываць на Дняпро. Моладзь актыўна рыхтавалася да фізкультурнага парада.

У дванаццаць гадзін радыё перадало ўрадавае паведамленне аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. Адразу ж было склікана пасяджэнне бюро Магілёўскага абкома партыі. Першы сакратар абкома І. М. Макараў паставіў задачы па пераходзе ад мірнага на ваеннае становішча.

У дзве гадзіны дня адбыўся гарадскі партыйна-камсамольскі сход. На сходзе прынята рашэнне аб стварэнні знішчальнага батальёна па барацьбе з дэсантнікамі і фашысцкімі лазутчыкамі. У батальён запісаліся больш за 500 камуністаў і камсамольцаў. Камандаваць ім стаў тав. Калугін, камісарам — тав. Бандарэнка, загадчык аддзела прапаганды гаркома КП(б)Б.

Рабочыя прадпрыемстваў абавязаліся не выходзіць з фабрык і заводаў, захоўваць жалезную дысцыпліну ваеннага часу, арганізоўваць ахову прадпрыемстваў, даваць больш прадукцыі фронту.

Пачаўся масавы прызыў ваеннаабавязаных у армію. Паралельна паступалі заявы з просьбамі адправіць на фронт добраахвотнікамі.

На рабочых сходах і мітынгах узнікла прапанова аб стварэнні з ліку добраахвотнікаў атрадаў народнага апалчэння. Па рашэнню абласнога камітэта партыі былі створаны абласны і гарадскі штабы. У той жа дзень у партыйныя арганізацыі Магілёва паступіла 2500 заяў з просьбай аб залічэнні ў народнае апалчэнне. Толькі на адной шаўковай фабрыцы было каля 800 заяў. Тут адразу ж пасля мітынгу сфарміравалася баявое падраздзяленне.

Атрады народнага апалчэння былі створаны на трубаліцейным, гарбарным, цагельным, аўтарамонтным заводах, мясакамбінаце, у дэпо чыгункі і на чыгуначным вузле, у педагагічным інстытуце, на торфазаводзе «Грабянёва». Колькасць народных апалчэнцаў дасягнула 12 тысяч.

*А. Марозаў*
*«Магілёўская праўда». 16 чэрвеня 1964.*

## Загад: трымаць абарону

Яна абрушылася так знянацку, што людзі нават не паверылі, што гэта — вайна! Вайна, якая будзе грымець не недзе далёка, а тая, якая прыйдзе ў кожную вёску, у кожную хату. І яна прыйшла — у першыя ж дні вайны. Яшчэ не было выбухаў, яшчэ па-мірнаму ўзыходзіла сонца, але ў кожным доме галасілі: праважалі ў салдаты дзе бацьку, дзе сына ці брата. Яшчэ спадзяваліся: вось адгоняць немца і вернуцца, скончыцца гэты кашмар.

Але пайшлі па дарогах бежанцы. Ішлі ўдзень і ўначы. Многа іх ішло... Знясіленыя, абыякавыя. А на ўзбочынах шашы Мінск—Магілёў, перамяшаўшыся з бежанцамі, ішлі чырвонаармейцы, хто з вінтоўкамі, хто не. Ішлі панура, не падымаючы галоў, не адказваючы на пытанні, бо самі не ведалі, дзе той штаб, дзе той тыл, куды трэба патрапіць на перафарміраванне...

Так прыйшла вайна для мірных грамадзян Магілёўскага раёна. Была яшчэ надзея: Чырвоная Армія моцная, яна абароніць...

Ішоў 12-ы дзень вайны. Гітлераўцы здолелі прайсці за гэтыя дні ад Брэста да р. Бярэзіны і нават перайсці яе. Але тут, у міжрэччы Бярэзіны і Дняпра (за 35—50 км да Магілёва) яны спатыкнуліся. 3 ліпеня разведвальныя атрады 172-ой стралковай дывізіі (генерал-маёр М. Ц. Раманаў), якімі камандавалі капітан М. В. Мяцельскі і ст. лейтэнант А. П. Ваўчок, уступілі ў сустрэчныя баі з перадавымі падраздзяленнямі нямецкага 46-га танкавага корпуса 2-ой танкавай групы генерала Гудэрыяна. Савецкія воіны знішчылі 14 танкаў і каля роты варожай пяхоты. 5 ліпеня камандзір артдывізіёна Б. Л. Хігрын, які замяніў параненага наводчыка, асабіста знішчыў яшчэ 6 танкаў. На цэлыя суткі затрымалі воіны на гэтым участку гітлераўцаў. Так пачалася абарона Магілёва, якая працягвалася 23 дні: з 3 па 26 ліпеня 1941 г.



Генерал-маёр
М. Ц. Раманаў

Абараняўся Магілёў часцямі 61-га стралковага корпуса, якім камандаваў генерал-маёр Ф. А. Бакунін, 13-ай арміі (генерал-лейтэнант П. М. Філатаў; з 9.07.1941 г. — генерал-лейтэнант Ф. М. Рэмізаў; з 14.07.1941 г. — генерал-лейтэнант В. П. Герасіменка) Заходняга фронту і апалчэнцамі.

План абароны быў распрацаваны штабам 61-га стралковага корпуса, разгледжаны і ўхвалены 1 ліпеня на нарадзе з удзелам прадстаўнікоў Стаўкі Галоўнага Камандавання — Маршалаў Савецкага Саюза К. Я. Варашылава і Б. М. Шапашнікава, 1-га сакратара ЦК КП(б)Б, члена Ваеннага Савета Заходняга фронту П. К. Панамарэнкі, 1-га сакратара Магілёўскага абкома КП(б)Б І. М. Макарава і камандзіра корпуса Бакуніна, прызначанага начальнікам абароны Магілёўскага раёна.

Вырашана было стварыць вакол горада абарончыя збудаванні, на іх будаўніцтве з 26 чэрвеня па 10 ліпеня штодзённа працавала ад 30 да 40 тыс. гараджан і жыхароў навакольных вёсак. За кароткі тэрмін быў выкапаны процітанкавы роў працягласцю больш за 25 км, пабудаваны бліндажы, дзоты, траншэі і эскарпы, устаноўлены мінныя проціпяхотныя і процітанкавыя палі, на некаторых вуліцах — барыкады; у асобных дамах абсталяваны

артылерыйскія і кулямётныя агнявыя кропкі; у сценах прабіты байніцы.

На прадпрыемствах, у арганізацыях і ў вучэбных установах фарміраваліся атрады народнага апалчэння.

У адпаведнасці з планам непасрэдная абарона горада ускладвалася на 172-ую стралковую дывізію (генерал-маёр М. Ц. Раманаў) з прыдадзенымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі.

Прыдадзенымі да 172-ой дывізіі часцямі былі і воінскія падраздзяленні, і атрады народнага апалчэння. 26 чэрвеня 1941 г. быў створаны знішчальны батальён, у які запісалася 500 камуністаў і камсамольцаў. Камандзірам яго стаў нач. школы НКУС М. І. Калугін, камісарам — супрацоўнік гаркома КП(б)Б С. К. Бандарэнка.

Стварэнне знішчальнага батальёна паклала пачатак фарміраванню атрадаў народнага апалчэння. Да 10 ліпеня ў іх налічвалася больш за 12 тыс. чалавек. З работнікаў аблупраўлення НКУС і міліцыі быў сфарміраваны батальён пад камандаваннем К. Р. Уладзімірава і атрад капітана Дз. С. Вольскага. Камандаваў народным апалчэннем І. П. Ваяводзін. Быў створаны зводны полк пад камандаваннем маёра В. А. Кацюшына, у які ўвайшлі батальёны Калугіна, Уладзімірава, некаторыя атрады народнага апалчэння.

Падраздзяленні народнага апалчэння ваявалі ў саставе 388-га, 747-га, 394-га стралковых палкоў. Зводны полк Кацюшына займаў абарону на пазіцыі Казіміраўка—Пашкава—Гаі—Мікалаеўка—Палыкавічы; 394-ы стралковы полк прыкрываў флангі і тыл 172-ой дывізіі на левым беразе Дняпра.

Апалчэнцы змагаліся разам з воінамі мужна і самаахвярна. З 250 байцоў батальёна Уладзімірава засталося ў жывых 19; атрад Вольскага, абараняючы дняпроўскі мост, загінуў увесь...

На Магілёў наступалі 4 пяхотныя і танкавыя дывізіі з 2-ой танкавай групы



І. П. Ваяводзін

Гудэрыяна: на Бабруйска—Магілёўскім напрамку — палкі 23-ай і 7-ай пяхотных дывізій; на Мінска—Магілёўскім — 263-ай і 15-ай пяхотных дывізій. Іх падтрымлівала 3-яя танкавая дывізія. Калі гітлераўцы фарсіравалі Дняпро, у тыл 172-ой стралковай дывізіі Раманава выйшлі 258-ая і 78-ая пяхотныя дывізіі; 17 ліпеня — часці 34-ай і 10-ай пяхотных дывізій.

15 ліпеня адбылася нарада камандавання 172-ой дывізіі, камандзіраў, камісараў, нач. штабоў вайсковых часцей з удзелам сакратароў гаркома КП(б)Б, на якой было вырашана працягваць абарону. І яна працягвалася да 28 ліпеня.

Немцы авалодалі Смаленскам, падышлі да Ельні і Вязьмы, а Магілёў змагаўся — у глыбокім тыле праціўніка, пазбаўлены магчымасці атрымаць падтрымку рэзервамі і боепрыпасамі. Жменькі байцоў, якія заставаліся ад палкоў, прабіваліся праз кальцо акружэння, каб зліцца з войскамі Чырвонай Арміі і працягваць бой.

У адным з артыкулаў, апублікаваным у газеце «Красная звезда» (4.06.1963), Маршал Савецкага Саюза А. І. Яроменка пісаў, што абарона Магілёва заслугоўвае таго, каб аб ёй сказаць у поўны голас.

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 315—316*
*«Магілёўская праўда». 3 чэрвеня 1966.*

## Дваццаць тры дні стаялі насмерць, не здаваліся

**З успамінаў Маршала Савецкага Саюза, Героя Савецкага Саюза А. І. Яроменкі**

Поруч з легендарнай абаронай Брэста і Ліепаі ў гісторыю першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны залатымі літарамі ўпісана гераічная абарона Магілёва часцямі 61-га стралковага корпуса генерал-маёра Ф. А. Бакуніна, і ў першую чаргу 172-ой стралковай дывізіі генерал-маёра М. Ц. Раманава.

Абарону Магілёва можна падзяліць на тры этапы. Першы працягваўся з 3 па 9 ліпеня 1941 г., калі адыходзячыя часці 13-ай арміі, а таксама карпусы, занаўшыя абарону на дняпроўскім рубяжы, разведвальныя і перадавыя атрады вялі напружаныя баі на далёкіх і бліжніх подступах да горада. Злучэнні, якія атрымалі задачу абараняць дняпроўскі рубеж, высылалі разведвальныя групы і атрады, каб сабраць неабходныя дадзеныя аб непрыяцелі. Следам за разведгрупамі ішлі перадавыя атрады ў саставе ўзмоцненага батальёна, кожны — з задачай разведкі боем. Гэтыя атрады ў 20—25 км наперадзе асноўнай лініі абароны сустракалі праціўніка дзёрзкімі ўдарамі, прымушалі яго разгарнуцца ў баявы парадак і прыпынялі рух гілтэраўцаў, выйграючы каштоўны час, неабходны для стварэння абароннага рубяжа на Дняпры і канцэнтрацыі войскаў, якія падцягваліся з тылу.



Камандзір разведбатальёна А. П. Ваўчок

З 9 па 16 ліпеня ўпартыя абарончыя баі ішлі ўжо ў перадполлі Магілёва; прадпрымаліся шматлікія контратакі з мэтай ліквідаваць плацдармы, захопленыя непрыяцелем на ўсходнім беразе Дняпра на абодвух флангах корпуса. Важнейшым вынікам баёў другога этапа было выматванне і перамолванне жывой сілы ворага і ягонай тэхнікі.

Трэці этап працягваўся з 16 па 27 ліпеня, калі войскі, гераічна абараняўшыя Магілёў, аказваліся поўнасцю акружанымі. 172-ая стралковая дывізія і адзін полк 110-ай стралковай дывізіі былі адрэзаны ад астатніх часцей корпуса. На гэтым этапе з асобай сілай праявіліся самаадданасць і гераізм абаронцаў дняпроўскага рубяжа. Да гэтага ж этапа адносяцца і спробы вырвацца з акружэння. Часці непакорнага магілёўскага гарнізона прыкавалі да сябе цэлы армейскі корпус ворага, збілі тым самым яго наступальны парыў на галоўным напрамку.

Вакол Магілёва працягласцю 25 км быў створаны абаронны абвод з больш ці менш шырокай паласой перадполля. Абарона была, такім чынам, кругавой і мела мэтай не даць ворагу ўварвацца ў горад.

Усе 23 дні дальняй і бліжняй абароны баі вяліся на зямлі Магілёўскага раёна, уцягваючы ў жорсткую бойку мясцовае насельніцтва акаляючых Магілёў вёсак і пасёлкаў. Гарэлі дамы, узрываліся масты, густа пасыпаліся свінцом куль і асколкаў засеяныя хлебам палі, гатовыя да сенакосаў лугі.

Неабходна было спыніць ворага хоць на дзень…

Генерал-маёр Раманаў у адпаведнасці з указаннямі камандзіра 61-га корпуса генерал-маёра Бакуніна ўдакладніў задачы, арганізаваў узаемадзеянне паміж часцямі, сістэму агню і забеспячэння ўсімі відамі бая-

войтэхнікі. Для разведкі лініі абароны камандзір дывізіі выдзеліў стралковае падраздзяленне 514-га палка пад камандаваннем старшага лейтэнанта А. П. Валчка і асобны разведвальны атрад пад камандаваннем капітана М. В. Мяцельскага. З ліпеня яны ўступілі ў сустрэчныя баі з передавымі падраздзяленнямі нямецкага 46-га танкавага корпуса 2-ой танкавай групы Гудэрыяна. У баях воіны знішчылі 14 гітлераўскіх танкаў каля Бялыніч і в. Чачэвічы. Яны выкарыстоўвалі не толькі супрацьтанкавую зброю, але і звязкі гранат, бутэлькі з гаручай сумессю. У палках пасля гэтага ўзнікла ідэя ствараць каманды знішчальнікаў танкаў. На добраахвотных пачатках яны былі створаны ў кожным палку. У такія каманды ўступалі і байцы народнага апалчэння, якія добра ведалі мясцовасць. Знішчальнікі нападалі на пункты размяшчэння гітлераўскіх войск і наносілі ім вялікія страты, асабліва ўдалымі іх дзеянні былі ноччу.

Вельмі жорсткія баі пачаліся з 5—8 ліпеня. Непрыяцель адцясніў наша баявое прыкрыцце і выйшаў на блізкія подступы да горада. Чатыры дні фашысцкія танкі з мотапяхотай бесперапынна атакавалі пазіцыі 388-га палка. Воіны палка наносілі вялікія страты ворагу і ўтрымлівалі свае пазіцыі. Спробы танкавых часцей гітлераўцаў з ходу захапіць Магілёў былі сарваны. Затым настала часовае зацішша, але 11 ліпеня аднавілася моцнае наступленне ворага на ўсім фронце дывізіі. Тры дні ішлі бесперапынныя баі. Глыбіня нашай абароны была каля 25 км. Вораг укліні ўся ў яе месцамі кіламетраў на 16. Але, выкарыстоўваючы рэзервы, умела манеўруючы сіламі, генерал Раманаў арганізаваў рад контратак, у выніку якіх вораг быў адкінуты і лінія абароны выраўнена. 11 ліпеня гітлераўцы фарсіравалі Дняпро на поўдзень ад Быхава, пачалі пашыраць



А. В. Шчаглоў



С. П. Манахаў

плацдарм у раёне в. Сідаравічы. Асабліва адказная задача лягла на 747-ы полк.

З 17 ліпеня баі разгарнуліся ў глыбіні абароны. І тут выключную ўпартасць і сапраўдны гераізм праявіў 747-ы полк з камандзірам А. В. Шчагловым, начальнікам штаба Г. І. Златаустаўскім, камісарам С. П. Манахавым.

15—19 ліпеня абстаноўка крайне абвастрылася ў раёне в. Буйнічы на ўчастку 388-га стралковага палка, якім камандаваў палкоўнік С. Ф. Куцепаў. Кожны дзень па некалькі разоў атакаваў вораг пазіцыі батальёна капітана Абрамава. Байцы біліся амаль да апошняга. Разам з апалчэнцамі байцы батальёна ў жорсткіх баях знішчылі 39 фашысцкіх танкаў. Смерцю храбрых загінуў капітан Абрамаў. Героямі палеглі амаль усе байцы... Нягледзячы на вялізныя страты, тыя, хто застаўся ў страі, былі поўныя мужнасці і гатоўнасці працягваць няроўную барацьбу. Але камандзір дывізіі М. Ц. Раманаў разумеў, што ў ходзе баёў надышоў такі момант, калі далейшая абарона дняпроўскага рубяжа на абмежаваным участку не магла ўжо больш мець аператыўнага значэння. Спроба заставацца далей на займаемых пазіцыях пагражала знішчэннем падначаленых яму войскаў. Боепрыпасы і харчаванне былі

зрасходаваны, папоўніць іх не было ніякай магчымасці. Лінія фронту адкацілася далёка на ўсход... І Раманаў аддаў загад з надыходам цемнаты ў ноч на 26 ліпеня нанесці ўдар па ворагу і вырвацца з акружэння. Але сілы былі вельмі няроўныя, большасць байцоў пры прарыве загінула, астатнія вымушаны былі прабірацца праз лясы на ўсход. Цяжка паранены быў і М. Ц. Раманаў. Загінулі камандзіры 388-га стралковага палка палкоўнік С. Ф. Куцепаў, 340-га лёгкага артылерыйскага палка палкоўнік І. С. Мазалаў і многія, многія іншыя...

*Еременко А. И. Героический Могилев.*
*У кн.: Солдатами были все.*
*Мн., 1972. С. 55—62.*

**Приказание по 3/388-му стрелковому полку. 2.07.41**

**Роща у разъезда Буйничи**

Командир батальона приказал:

1. Роты остаются в своих районах; районы совершенствовать в инженерном отношении.
2. Организовать тыл таким образом, чтобы в случае сбора батальона для движения сам сбор занял не более 30—40 минут.
3. Каждому взводу в тылу иметь ровики для отправления естественных надобностей.
4. Оружие ни на одну секунду не выпускать из рук: где боец — там винтовка.
5. Организовать учебу во взводах и отделениях, главным образом обратить внимание на умение пользоваться винтовкой С. В. Т.
6. Командирам рот учить свои управления.
7. Провести беседу с бойцами о борьбе с танками, обратив особое внимание на то, что стрелки и ручные пулеметчики стреляют только по амбразурам и щелям. Приготовить в окопах связки гранат.
8. Командирам рот и подразделений выбрать свободное время для проведения смотра своих подразделений. Смотр проводить в закрытой местности в масштабах взвода.
9. Обдуманно и планово организовать работу и отдых, занятия; иметь на сон 4—6 часов в сутки.
10. Категорический приказ: ни одного болтающегося в районе занимаемой обороны. За нарушение командование полка будет принимать самые строгие меры.
11. Без разрешения командира батальона ни одного кусочка сухаря из выданных на руки н. з. (продуктов) никому не расходовать.

*Подпись*

*ЦАМО РФ, ф. 388 сп., оп. 12711, спр. 1.*
*Выявіў і падрыхтаваў да друку М. Барысенка*

**Из Доклада пом. нач. штаба 172-й стрелковой дивизии майора В. А. Катюшина**

В районе Барсуков прорвалось до 100 танков пр-ка на уч-ке 187 сд. Во взаимодействии с б-нами 172-й уничтожает пр-ка в р-не Сидоровичи.

### Из Донесения командира 2-го дивизиона 601-го ГАП капитана Шпакова

На ю. опушке ур. Шаблевщина, к 19.00 11.07.41.

С рассветом 11/7.41 на рубеже Сидоровичи обнаружено до батальона пехоты пр-ка с 2-мя артбатареями и минометами. Боем выявлено 16—17 пулем. гнезд в лощинах и высотах, прилег. к д. Сидоровичи.

В 3.00 11/7 1/747 сп со 2/601 ГАП заняли 6. поз. приступили к вып. поставленных 6. задач. Бой продолжался непрерывно до 13.00 по уничтож. пр-ка. Пр-к открыл сильный руж.-пулеметн. и арт. огонь, который длился в течен. всего дня.
Ввиду превосх. сил у пр-ка овладеть д. Сидоровичи нам не удалось. Б-н, неся потери
от руж.-пулем. огня и авиации, отошел к д. Слободка. Д-н (дивизион) был оставлен
без пехоты на ОП и находился в окружении в течение 3 часов... Д-н вступил в
неравную схватку. 3 орудиями прямой наводкой шрапнелью и гранатами отражал
атаки пр-ка.
Искл. героизм проявил огневой взвод 4 бат. л-та Романенко. Точно был выполнен
приказ ком. д-на не отступать, а поставить ор. на прямую наводку. Громили пр-ка
во всех направлениях шрапнелью и гранатой.
Отважно действовал адъютант старший л-т Пушков — организовал группу стрел-
ков и пулеметчиков, которые вели огонь... с огн. взводом...
Мат. часть исправна. Обеспечен выход полковой и ПТ артиллерии 747 сп., ко-
торая находилась в руках пр-ка без ком. состава и бойцов. П/прикрытием огня д-на
были вынесены с поля боя раненые пульроты и стрелки 747 сп и отправлены в ПМП
(полевой медпункт). Д-н организованно вышел из боя на шоссе Слободка
д/перегруппировки сил.

Потери.

Геройски погиб нач. связи д-на мл. л-т Барсуков (взвод управления) — исключительно стойкий, умелый, беспредельно преданный Родине командир, беспартийный большевик. Ранен (4 бат.) красноармеец Гапуляк Степ. Iв. На 5 бат. 6 чел. ранено.

Прошу представить к правит. награде:

Ст. адъютанта д-на л-та Пушкова; к-ра (командира) 4-й бат. л-та Романенко Ив. Тимоф.; к-ра орудия серж. Гришина Алексея Вас.; кр-ца (красноармейца) Савичева Ив. Вас. — взв. упр.; наводчика I ор. (орудия) кр-ца Келлера Ив. Март.; наводчика 3 ор. кр-ца Губера Давида Давид.; к-ра взвода мл. л-та Тригуб.; к-ра отд-я разведки с-та Карпенка Фед. М.; мл. политрука Анохина Виктора Мих. (4-я бат.); оруд. номера кр-ца Бибикова; кр-ца ездового Крейнера Эмануила Александровича.

Прошу объявить благ. в приказе по полку отличившимся в бою 11.07.41.

Ружичу Андр. Вас. — к-ру огн. взвода; Бано Степ. Ив. — к-ру орудия; Канцурову Фед. Иосиф. — к-ру оруд. номер; Хасамутдинову Зейнуле Гумаровичу — к-ру езд.; Бобылеву Никол. Ив. — к-ру езд.; Дейтхе Ив. Ив. — к-ру ор. номер; Калмыкову Никол. Григ. — ор. номер; Рыжеволову Ив. Вас. — кр-ц связисту; Гуцуляк Стеф. Ив. — кр-цу; Аипову Катай — кр-ц езд.; Кунгурцеву Никол. Анд. — кр-ц езд.; Сухомлину Петр. Зин. — кр-ц связной.

### Из Доклада нач. штаба 601-го ГАП и ПП-747 капитана Алешина

14.07.41 15.00 Группа ПП занимает прежний боевой порядок. 1/747 со 2/601 ГАП под давлением превосходящих сил пр-ка отошел на основной рубеж обороны. Пр-к занял Вильчицы, Затишье, Быстрик. По сведениям местных жителей, в р-не Сидорович — танки пр-ка неустановленной численности. Пр-к одиночными выстрелами обстреливает р-н 7-й батареи 3/601 ГАП (четыре выстрела снарядами 155 мм калибра). Стрельба велась в направлении д. Лыково и по р-ну с радиомачтами, что 1 км зап. д. Гребенево.

Наши части отошли на рубеж: д. Новоселки — совхоз Вейно — опушка рощи,
что с-западнее в. Подгорье. Артиллерия группы ПП в р-не Затишье, Колос.
Потери на 14.07.41 г.: ранено ср. комсостава 2 чел., рядовых 3 чел., без вести
пропавших 2 чел. При отходе на основной рубеж обороны подорвана автомашина с

оборудованием — автомастерская, 2 ор. 122 мм, уничтожен пр-ком один зар. ящик, повреждены одна стереотруба и 2 буссоли.

Вывод: сведения о пр-ке подлежат уточнению. Группа ПП вполне боеспособна, имеет 11 ор. 122 мм и два ор. 152 мм. Снарядов 122 мм кол. 2094, 152 мм 200. Пол.-моральное сост. личного остава хорошее.

### Из боевого донесения ПНШ-1 601-го ГАП и группы ПП-747 сп капитана Локтионова

15.07.1941 г. 747 с полк на ю/зап. опушке леса юго-вост. Затишье.

1) 11.07.41 г. группа ПП занимает б/порядок на прежнем месте. В 11.00 высланы 1/747 сп со 2/601 ГАП для ликвидации десанта пр-ка в р-не Сидоровичи. В 16.00... вошел подчинением группы 747 3/493 ГАП.

2) 12.07.41 г. в 21.00 1/747 сп со 2/601 ГАП вошел в соприкосновен. с пр-ком и утром вступил в бой на рубеже д. Ново-Милеевка. В раз-ре боя под воздействием сильного руж.-пулемет. и арт. огня, а также обстрела с самолетов 1/747 сп, не предупредив ком. д-на, отошел, в результате чего 4-й батарее 2/601 ГАП пришлось вести бой с фашистами одной... Батарея вела огонь прямой наводкой, нанося большие потери пр-ку. В это время НШ группы ПП 747 к-н Алешин ехал к дивизиону. Получив сведения о состоянии д-на, принял меры для вывода д-на на новый рубеж, заставив прикрывать отход д-на собранные им подразделения 1/747 сп.

Благодаря стойкости и решительности д (действий) с/4-й батареи, возглавляемой л-том Романенко и его заместителем по п/ч мл. политруком Анохиным и принятых реш. мер нач. штаба, д-н был выведен на новый рубеж и сохранен д/дальнейших действий.

Потеряно: один убит, 6 чел. ранено. Убито 2 лошади, уничтожена 1 автомашина с боеприпасами. Повреждено 1 орудие.

13.07.41 г. Пр-к силой до батареи и 8 танков занимал рощу «Квадратная», что юго-западнее Буйничи в 1 км (квадрат 1970). В рез-те обстрела 6-й батареей подбито 1 орудие.

### Из Донесения ПНШ-1 601-го ГАП и ПП-747 сп капитана Локтионова

15.07.41. Противник силой до 2 б-нов с артиллерией и 60 танков занимают Вильчицы, Князевку, Быстрик.

1/747 сп со 2/601 ГАП наступает совхоз «Вейно» — зап. окраина Князевка. Запрудье (ближняя задача овладеть Запрудьем, в дальнейшем овладеть южной окраиной леса севернее Ново-Милеевки).

12.30 по донесению штаба 747 сп сосед справа 507-й сп (их 187-й сд 45-го ск-авт.) успеха не имел, залег и окопался. Ввели в действие 3/493 ГАП для поддержки 507-го сп. Идет ожесточенный бой. Сведений о потерях и трофеях нет.

Опер. сводки и донесения ежедневно высылаем через опер. дежурного 172-й сд.

### Из распоряжения командования 601-го ГАП

Штаб группы ПП. Лес ю.-в. Затишье 1 км. 19.07.41 г. 20.00 Карта 50 000.

К-рам 2/601-го ГАП, 3/601-го ГАП, штабной батарее 3/493-го ГАП.

Объявляю б/распоряжение № 13 штаба НАД 172-й сд.

«Начальнику артиллерии боевого участка № 3 п-ку Якушеву, боевое распоряжение № 13, штаб НАД 172 сд. южн. окр. Могилева, ул. Менж. шк. № 11. 19.07.41 г. карта 50 000.

Во исполнение приказания нач-ка артиллерии 61 ск приказываю:

1. Д/борьбы с танками, бронемашинами и автомашинами пр-ка немедленно организовать в автополках и отд. д-нах по 1 истребит. группе в составе: 1 ср. к-р и 4 кр-ца (жел. добровольцы).

Вооружение истребит. группы: пистолеты-автоматы, автом. винтовки, р-е п-ты (ручные пулеметы), связки гранат, бытулки с бензином или «КС».

Задача: п/рук-вом и по указ-ю шт. див-ии уничтожение танков и бронемашин в полосе об-ны див-ии путем активного выдв-я истребит. отрядов в районы сосред-я пр-ка.

2. Создать в артполках и отд. д-нах по одной диверс. группе в составе: 1 ср. к-р и 3—4 кр-ца. Вооружение группы — винтовки-автоматы, р. пулеметы, мины, ВВ.

Задачи: п/рук-вом и по указ. шт. дивизии минир. дорог и путей сообщения на территории, занятой противником в полосе обороны дивизии, подрыв складов, хранилищ, боеприпасов, горючего и т. д.

3. О сформировании группы донести мне к 4.00 20.07.41 Нач. арт. 172 сд п-к Соловьев. Нач. штаба арт. 172 сд под-к Перминов».

Во исп-е данного б/распоряжения приказываю:

1. Назначить к-ром истребит. группы полка, изъявившего добр. согласие ком-ра взвода ПВО шт. батареи мл. л-та Куменкова.

2. Назначение к-ра диверс. группы до изъявлен. добр. согласия со стороны к-ров оставить открытым.

3. Объявить всему л. с. (личному составу) дивизиона настоящее расп-е и составить списки добр-цев, желающих вступить в организуемые группы и составленные списки в штаб полка к 2.00 20.07.41.

Окончательно отобранные добр-цы в группы будут объявлены дп-ным распор-ем.

К-р полка п-к Якушев.

Военком полка бат. ком-р Милютин.

НШ полка к-н Алешин.

## Из боевого донесения ПНШ-1 601-го ГАП и ПП-747 сп капитана Локтионова

21.07.41 г. ...На участке 747 сп и 601 ГАП в районе ю-в Луполово сбито 2 фашистских бомбардировщика типа «Юнкерс». Самолеты сгорели, взято в плен 3 герм. летчика. Во время взрыва бомбы под горящим самолетом ранено 4 чел.

*ЦАМО РФ, ф. 12884, спр. 280436, с. 1—11*

*Матэрыял выявіў і падрыхтаваў да друку Б. Гардзееў*

## Из донесения командующего тылом группы армии «Центр» главному командованию сухопутных войск вермахта (генерал-квартирмейстру)

Перевод с немецкого
10-дневная сводка по состоянию на 29.09.41

В отчетном периоде повсюду на территории тыла группы армий «Центр» появились разрозненные партизанские группы, которые немедленно беспощадно подавлялись и в большинстве случаев уничтожались. В то время как в ходе боев противник нес большие потери в живой силе, к нашей радости собственные потери были совершенно незначительными. Это свидетельтствует о том, что войска постепенно изучили партизанскую тактику и достигли в борьбе с ними хороших успехов. В ходе одной из таких операций удалось взять в плен раненого бывшего защитника Могилева, командира 172-й стрелковой дивизии генерала Романова.

*За командующего тылом группы армий «Центр»*
*Начальник штаба Рюбезам*

*НАРБ. ф. 4683, воп. 3, спр. 1017, л. 92.*

*Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак*

**Успамінае Іван Мікалаевіч Макараў, былы сакратар абкома КП(б)Б**

Часці 172-ой стралковай дывізіі размеркаваліся для абароны на наступных участках: у раёне вёсак Цішоўка — Буйнічы заняў абарону 388-ы полк С. Ф. Куцепава. Яго падтрымліваў 340-ы легкі артылерыйскі полк І. С. Мазалава. Рубеж іх абароны пачынаўся ў в. Цішоўка і заканчваўся ў в. Сяльцы. На заходнім беразе Дняпра (раён вёсак Пашкава — Цішоўка) дзейнічалі 514-ы стралковы і 493-і гаўбічны артылерыйскі палкі. На паўднёвы ўсход ад Магілёва, на левым беразе Дняпра, заняў абарону 747-ы стралковы полк А. В. Шчаглова. Ён меў задачу абараняць участак на поўдзень ад Магілёва — у раёне в. Дашкаўка. Занялі свае агнявыя пазіцыі артылерысты 340-га, 443-га і 601-га палкоў. Процітанкавая артылерыя асядлала ўсе дарогі, якія падыходзілі да абласнога цэнтра.

Гэтыя часці і адбілі першы, лабавы ўдар гітлераўцаў. Калі з 3 па 9 ліпеня баі ішлі на дальніх подступах да Магілёва, то з 9 ліпеня абаронцы горада змагаліся ўжо на асноўным рубяжы.

Фашысцкія войскі разгарнулі наступленне на акружэнне горада. Пад прыкрыццем артылерыйскага агню 12 ліпеня яны паспрабавалі прарвацца ў Магілёў з поўдня, у раёне в. Буйнічы. Стаўка рабілася галоўным чынам на ашаламляльнай моцы танкавы ўдар.



С. Ф. Куцепаў

Жорсткі бой працягваўся 14 гадзін. Браніраваныя пачвары, здавалася, занялі ўсё поле, але ні жахлівы роў матораў, ні кулямётна-гарматны агонь не пахіснуў баявога духа байцоў палкоўніка Куцепава і народных апалчэнцаў. Падпусціўшы машыны на блізкую адлегласць, яны закідвалі іх гранатамі і бутэлькамі з гаручай сумессю, ва ўпор расстрэльвалі пяхоту непрыяцеля. Выключную адвагу праявілі ў гэтым баі артылерысты палкоўніка І. С. Мазалава.

Адразу пасля таго, як варожая атака захлынулася, мы з І. П. Ваяводзіным прыбылі сюды, на Буйніцкае поле, выказаць падзяку, сваё захапленне стойкасцю, мужнасцю, уменнем змагацца тым, хто ўтрымаў тут абарону. Апалчэнцы таксама дзякавалі — за добра наладжаную сувязь, за боепрыпасы, медыцынскую дапамогу.

Гледзячы на палаючыя танкі, я думаў аб выключнай мужнасці нашых байцоў і камандзіраў. Адна з варожых машын застыла ля самага бліндажа. Расказвалі, што фашысты выпусцілі па ім амаль ці не ўвесь боекамплект, але разбурыць так і не змаглі. Затое не вытрымаў сам танк — яму хапіла некалькі гранат...

16 ліпеня непрыяцель акружыў Магілёў. Пачалася барацьба за важныя прыгарадныя населеныя пункты: Пашкава, Гаі, Казіміраўку, Цішоўку, Буйнічы, Вейна, Грабянёва, Любуж, Халмы, Лупалава. Некалькі разоў за дзень з рук у рукі пераходзілі Грабянёва і Вейна.

17 ліпеня штаб 172-ой дывізіі і яго тылавыя падраздзяленні, медсанбат перамясціліся ў горад. Варожыя войскі накіравалі ўдар на Палыкавічы, Пашкава, Лупалава. Раніцай пасля бамбёжкі і артпадрыхтоўкі пачалося наступленне непрыяцеля і на ўчастку 388-га палка С. Ф. Куцепава. Вечарам немцы атакавалі зводны полк В. А. Кацюшына.

18 ліпеня жорсткія бai праходзілі па ўсёй паласе абароны дывізіі. Увесь час узнікалі рукапашныя схваткі. Дывізія несла значныя страты, але свае пазіцыі адстаяла. На правым беразе Дняпра ў цяжкім бai адбілі танкавую атаку, знішчыўшы 19 танкаў, але праціўніку амаль удалося разрэзаць нашу абарону па Дняпры. Адзін толькі мост злучаў цяпер артылерыйскі полк Шчаглова з правым берагам.

19 ліпеня варожыя войскі зноў атакавалі полк Кацюшына і, страціўшы 20 танкаў, занялі в. Гаі. Атрымаўшы дапамогу, кацюшынцы ў гэты ж дзень выбілі непрыяцеля з Гаёў, але 20 ліпеня фашысты зноў завалодалі в. Гаі, захапілі Нова-Пашкава, Казіміраўку. З вялікімі стратамі зводны полк адыйшоў да в. Яснае...

21 ліпеня паўсюды панавала зацішша: немцы хавалі загінуўшых. Горад апаясаўся могілкамі з бярозавымі крыжамі.

22—23 ліпеня Магілёў днём і ноччу бамбілі. Гарэлі дамы ў цэнтры і па ваколіцах. Каб стрымаць ворага, палкоўнік І. П. Ваяводзін паслаў да р. Дубравенкі рэзервную роту апалчэнцаў і выдзеліў ім лёгкі танк.

24 ліпеня з вялікімі стратамі немцам удалося заняць станцыю Лупалава і выйсці на шашу Магілёў—Орша. Уздоўж яе абарону трымала ўзмоцненая група лейтэнанта Пугачова, якой дапамагалі батарэі двух гаўбічных палкоў — 473-га і 601-га.

25—26 ліпеня бai вяліся ўжо на вуліцах горада. У штабе дывізіі адбылася нарада. Камісар дывізіі Л. К. Чарнічэнка зачытаў загад Генштаба: «Пакінуць горад». Генерал М. Ц. Раманаў прапанаваў план прарыву: зводнаму палку В. А. Кацюшына працягваць вулічныя бai і прыкрываць адыход калоны; перад світаннем, 26-га, узарваць мост. Аперацыю назначылі ў ноч на 26 ліпеня. Пасля выхаду асноўных сіл з акружэння бой у Магілёве працягваўся яшчэ да 28 ліпеня. Затым рэшткі абаронцаў горада пераправіліся праз раку і аб'ядналіся пазней з войскамі 13-ай арміі.

*Макаров И. Н. Флаги над городом.*
*У кн.: Солдатами были все. Мн., 1972.*
*С. 48—54.*

## Бai ішлі ў тыле ворага

У асаджаным горадзе і яго ваколіцах засталіся 172-ая дывізія, сфарміраваны ў Магілёве батальён пад камандаваннем Кавалёва, полк НКУС, які складаўся з двух батальёнаў (першы — з курсантаў Магілёўскай школы НКУС, мясцовых работнікаў НКУС і НКДБ; другі — з работнікаў міліцыі) і Магілёўская дывізія апалчэнцаў. На працягу 12 сутак яны адбівалі ярасныя варожыя атакі.

17 ліпеня пад прыкрыццем артылерыйскага агню 100 варожых танкаў зноў спрабавалі прарвацца ў раёне саўгаса Буйнічы. І зноў храбрасцю і адвагай праславілі сябе воіны палка Куцепава і народныя апалчэнцы шаўковай фабрыкі Магілёва пад камандаваннем Кандрацьева. Падпусціўшы варожыя войскі на блізкую дыстанцыю, яны закідалі фашысцкія танкі звязкамі гранат і бутэлькамі з бензінам, ва ўпор расстрэльваючы нямецка-фашысцкую пяхоту. Вораг пакінуў на полі 40 падбітых танкаў, сотні трупаў сваіх салдат і афіцэраў. Нямецка-фашысцкія войскі былі адкінуты на 15 кіламетраў.

У ноч на 18 ліпеня гітлераўцы фарсіравалі Дняпро і захапілі Лупалава. Восем дзён воіны Чырвонай Арміі і апалчэнцы адбівалі жорсткія атакі, абараняючы тут перадмоставае ўмацаванне.

На світанні 22 ліпеня сотні п'яных фашысцкіх салдат і афіцэраў кінуліся праз мост у атаку, але воіны, апалчэнцы пад камандаваннем Цярэнцьева і рота міліцыі пад камандаваннем Вольскага сустрэлі іх магутным шквалам ружэйна-кулямётнага агню.

24 ліпеня — новыя баі. У гэты дзень фашысты шаснаццаць разоў кідаліся ў атаку на цэнтральную частку горада з боку Лупалава. Але абаронцы стаялі насмерць.

Не менш ярасна атакі фашысцкіх войскаў у гэтыя дні адбівалі воіны Чырвонай Арміі і народныя апалчэнцы ў раёне Машакоўкі, Пашкава, вакзала, дзіцячага дома № 4 і цагельнага завода № 7. Асабліва вызначыліся ў гэтых баях апалчэнцы магілёўскага чыгуначнага вузла.

*М. Каралёў*

## Бой за вёску Сідаравічы

11 ліпеня 1941 г. фашысцкія войскі пераправіліся праз Дняпро ў раёне ст. Барсукі і ўкліміліся ў нашу абарону каля вёсак Следзюкі — Сідаравічы — Прыбярэжжа. У 14 гадзін варожы батальён пяхоты з танкамі і бронемашынамі, падтрыманы дэсантам, які высадзіўся ля вёсак Косцінка і Махава, захапіў в. Сідаравічы і пачаў пашыраць у гэтым раёне плацдарм.

Камандзір 747-га стралковага палка падпалкоўнік А. В. Шчаглоў дакладваў, што ў раёне Сідаравічаў з'явіліся буйныя варожыя сілы. Генерал-маёр М. Ц. Раманаў загадаў яму знішчыць фашыстаў, перашкодзіць пераправе, вызначыць сілы і намер праціўніка. Падпалкоўнік Шчаглоў сфарміраваў зводны атрад на чале з начальнікам штаба палка маёрам Г. І. Златаустаўскім. Палітруком быў назначаны І. А. Берук. Атрад уключаў у сябе стралковы батальён курсантаў палкавой школы, дзве артылерыйскія батарэі, дывізіён 493-га артылерыйскага палка, а таксама разведатрад капітана М. В. Мяцельскага. Трэба было дзёрзка контратакаваць пераўзыходзячыя сілы ворага.


Г. І. Златаустаўскі

На світанні 12 ліпеня атрад Златаустаўскага скрытна заняў зыходнае становішча ля паўднёвай ускраіны в. Слабодка. Нечакана для ворага наша артылерыя і мінамёты адкрылі моцны сканцэнтраваны агонь па мотапяхоце і танках праціўніка. Адразу загарэліся 3 танкі, падбітыя батарэяй капітана Трафімава. Гарэлі варожыя аўтамашыны і бензацыстэрны, аблітыя бензінам узарваных бензазапраўшчыкаў, палалі браневікі і танкі.

Пяхота і разведчыкі ўварваліся ў Сідаравічы, няшчадна знішчаючы фашыстаў. Вораг адступіў да Дняпра, але на наступны дзень падрыхтаваўся да адказнага ўдару, сканцэнтраваўшы свае танкі і пяхоту на заходнім узлеску ля Сідаравічаў.

Атаку ворагі пачалі з моцнай артпадрыхтоўкі. Зараўлі матory танкаў, у паветры з'явіліся бамбардзіроўшчыкі. Да 40 танкаў і да палка пяхоты рушылі па двух кірунках: па прасёлкавай дарозе з Сідаравічаў на Нядашава і па Гомельскай шашы на Магілёў. Завя-

заўся жорсткі бой, які пераходзіў у рукапашны. Стойка і мужна змагаліся нашы воіны. У варожыя танкі ляцелі звязкі гранат і бутэлькі з гаручай сумессю. Адкрылі агонь процітанкавыя гарматы.

Да акопаў, дзе размясцілася рота лейтэнанта Давыдава, у разгорнутым баявым парадку на вялікіх скарасцях ішлі танкі з чорнымі крыжамі. За імі беглі гітлераўскія аўтаматчыкі, усё перад сабой паліваючы свінцом. «Танкі прама», — падаў каманду Давыдаў і спакойна, быццам на занятках агнявой падрыхтоўкі, пайшоў па акопу з бутэлькай «КС» насустрач браніраванай машыне. Танк рухаўся ўперад. Гарматы і кулямёты палівалі ўсё вакол смяротным агнём. Вось высунулася з акопа галава Давыдава, мільганула загарэлая рука. Кінуўшы бутэльку, лейтэнант схапіўся за акрываўленую галаву. Машына яшчэ некаторы час рухалася, але вось па яе брані пабег агонь: танк запалаў. Па прыкладу камандзіра кулямётчык малодшы сяржант Кабаўны, а за ім іншыя байцы працягвалі лік падбітых і знішчаных фашысцкіх танкаў. Праціўнік прадпрымаў атаку за атакай, але воіны стаялі насмерць...

У баях пад Сідаравічамі вызначылася першая кулямётная рота 1-га батальёна пад камандаваннем старшага лейтэнанта Бордуна. Сам ён у разгар бою быў кантужаны і паранены, але калі апрытомнеў, заўважыў, што змоўк апошні кулямёт. Пераадольваючы боль, старшы лейтэнант падпоўз да яго. З узгорка з крыкам: «Рус, здавайся!» беглі гітлераўцы. Падпусціўшы іх на крокаў сорак, Бордун падрэзаў варожы ланцуг доўгай і трапнай кулямётнай чаргой. Калі скончыліся патроны, камандзір пусціў у ход гранаты. Апошняй падарваў сябе і абступіўшых яго гітлераўцаў.

Амаль поўнасцю загінуў разлік адной з гармат — у жывых застаўся толькі паранены Варанкоў. Да апошняй хвіліны ён вёў агонь.

На станіне гарматы памёр смяротна паранены палітрук Аляксандр Паўлавіч Смірноў, падбіўшы перад гэтым два варожыя танкі.

Салдат Крылоў на трафейнай бронемашыне ўварваўся ў стан ворага і раздавіў варожую гармату разам з немцамі.

Напружанне бою дасягнула крытычнага моманту, калі на правы фланг, дзе абараняліся курсанты палкавой школы, прарваліся танкі праціўніка. Усё патанула ў дыме і агні. Дзень стаў падобны на ноч. Маёр Златаустаўскі быў сур'ёзна паранены, але поле бою не пакідаў. Па яго загаду на правы фланг была накіравана процітанкавая батарэя. Курсанты палкавой школы, прапусціўшы танкі праз свае акопы, падбілі тры з іх. Яшчэ тры танкі адбілі батарэйцы, нечакана абрушыўшы на іх свой агонь. Варожая атака захлынулася.

13 ліпеня бой без перапынку працягваўся 10 гадзін. За два дні воіны 747-га палка разам з артылерыстамі 493-га артпалка падбілі і спалілі да 20 танкаў, знішчылі 30 аўтамашын і бензазапраўшчыкаў, шмат гармат і мінамётаў праціўніка. Значныя страты панёс і атрад Златаустаўскага. Пад покрывам ночы ён адышоў на зыходныя пазіцыі свайго палка. Сам Златаустаўскі быў накіраваны ў шпіталь. Крыху пазней ён трагічна загінуў пры спробе прарвацца з акупіраванага немцамі Магілёва.

*Падрыхтаваў да друку паводле матэрыялаў краязнаўчага музея сярэдняй школы в. Сідаравічы*

*І. Гуркоў*

**З успамінаў Рыгора Маісеевіча Ганчара, Героя Савецкага Саюза, былога палітрука палкавой школы**

Я быў палітруком палкавой школы 747-га стралковага палка 172-ой стралковай дывізіі. Камандаваў палком падпалкоўнік А. В. Шчаглоў. Палкавая школа, якая рыхтавала малодшы камандны састаў, была гонарам палка.

Так здарылася, што курсанты школы ў саставе палка Шчаглова сталі абаронцамі Магілёўшчыны і заслужылі асаблівую славу легендарных герояў. Без страху глядзелі юнакі ў вочы смерці.

Пасля жорсткага бою пад Сідаравічамі курсанты змагаліся ў раёне Лупалава. Сюды фашысты кінулі вялікія сілы, пацяснілі нашы падраздзяленні, захапілі станцыю. Неабходна было высветліць, дзе знаходзяцца танкі і артылерыя праціўніка. На разведку быў накіраваны камандзір аддзялення палкавой школы Беккожын. Хлопец з далёкага Казахстана абышоў непрыкметна баявое ахраненне ворага, пранік у размяшчэнне баявых пазіцый і штабоў. Назад давялося прабівацца гранатамі. Па разведчыку адкрыла агонь батарэя. Шалёна білі аўтаматы. Асколак міны навылет прабіў грудзі Беккожына. Сцякаючы крывёю, абяссілены, здзейсніўшы, здавалася б, немагчымае, ён поўз да сваіх пазіцый і выканаў абавязак воіна.

Найцяжэйшыя крывапралітныя баі вяліся ля маста, які звязваў горад з прыгарадам Лупалава. Сабраўшы апошнія сілы курсантаў, мы павялі іх у бой, каб разам з іншымі падраздзяленнямі выбіць ворага з Лупалава. З клічам «За Радзіму!», ведучы агонь на хаду, побач са мною беглі камуніст Юрчанка, намеснік палітрука нашай школы Валодзя Возны. Контратака скончылася рукапашнай схваткай. У бой былі ўведзены ўсе сілы палка. Там, дзе было асабліва цяжка, я бачыў падпалкоўніка Шчаглова і камісара Кузняцова. У гэтым баі мой друг Уладзімір Возны загінуў...

Вырваўшыся з невялікай групай курсантаў далёка ўперад, мы былі адрэзаны ад іншых падраздзяленняў. Лупалава і мост ужо былі заняты ворагам. З горсткай цяжка параненых, адстрэльваючыся, мы адыходзілі ўздоўж прыбярэжных зараснікаў у напрамку чыгуначнага маста праз Дняпро. Немцы неадступна праследавалі нас. Ззаду Дняпро. Злева ўзарваны чыгуначны мост. Прыйшло адзінае рашэнне — выкарыстаць яго некаторыя пралёты, якія знаходзіліся ў вадзе. Прыкрываючыся невялікім заслонам, раненыя па мосце і па вадзе прабіваліся ў Магілёў...

Хутка мы апынуліся ў горадзе, а ноччу яго пакінулі.

У час прарыву я быў цяжка паранены кулямётнай чаргой. Мяне выратавала жонка сельскага камуніста Марыя Дзмітраўна Варанкова з в. Журавец Вендаражскага сельсавета Магілёўскага раёна. Два тыдні (у мяне пачыналася газавая гангрэна) Марыя Дзмітраўна рабіла ўсё магчымае, каб выратаваць маё жыццё, рызыкуючы жыццём сваёй сям'і. А калі я трошкі ачуняў, вырашыў зноў помсціць ворагу.

Уперадзе былі доўгія гады вайны: Беларусь, Украіна, Польшча, Румынія, Германія.

*«Магілёўская праўда». 3 ліпеня 1966.*

## У сініх шынялях



К. Р. Уладзіміраў

...Пацярпеўшы няўдачу на заходнім напрамку, гітлераўцы сканцэнтравалі вялікія сілы ў раёне в. Пашкава, пасёлка Гаі і цагельнага завода № 8. На гэты важны ўчастак быў накіраваны батальён міліцыі пад камандаваннем капітана К. Р. Уладзімірава. 250 байцоў і камандзіраў батальёна перад адпраўкай на пярэднюю лінію далі клятву: змагацца да апошняга патрона, да апошняй кроплі крыві, але не адступаць. Батальён заняў абарону на высотцы ў напрамку в. Пашкава і пасёлка Гаі.

Кровапралітныя бані пачаліся тут у ноч на 17 ліпеня. Імкнучыся авалодаць чыгуначным вузлом, праціўнік пасля доўгай артпадрыхтоўкі кінуў сюды вялікую колькасць танкаў, але батальён Уладзімірава адбіў усе атакі і ўтрымаў займаемыя пазіцыі.

Раніцай два батальёны немцаў пад прыкрыццем моцнага мінамётнага і артылерыйскага агню аднавілі наступленне. Байцы міліцэйскага батальёна не толькі самаададана ўтрымлівалі свае рубяжы, але наступнай ноччу трыма ўзводамі на чале з капітанам Уладзіміравым атакавалі гітлераўцаў і выбілі іх з Пашкава. Гэты рубеж утрымліваўся ўвесь дзень. Толькі вечарам, кінуўшы ў бой свежыя сілы, пры падтрымцы танкаў і артылерыі праціўніку ўдалося адбіць вёску. Паранены Уладзіміраў павёў байцоў у контратаку з крыкам: «Загінем за Радзіму, але не прапусцім фашысцкую гадзіну!» За камандзірам кінуліся ўсе, хто мог стаяць на нагах і трымаць зброю. Гэта быў апошні бой бясстрашнага батальёна ў сініх шынялях. З 250 у жывых засталося 19...

Камандзір аднаго з аддзяленняў батальёна, былы работнік упраўлення міліцыі Ігнат Піліпавіч Савіч успамінае аб тых гераічных днях:

— Наш батальён быў слаба ўзброены. Мы мелі вінтоўкі, некалькі трафейных аўтаматаў, трохі гранат, адзін кулямёт і бутэлькі з сумессю — супраць танкаў, мінамётаў і артылерыі. Аднак доўгі час утрымлівалі свой рубеж, не адступаючы ні на крок. Параненыя не пакідалі поле бою. Міліцыянеры Кутанаў, Бурмістронак і многія іншыя, прозвішчы якіх не памятаю, пасля цяжкіх раненняў адмовіліся эвакуіравацца ў шпіталь. Атрымаўшы медыцынскую дапамогу ў траншэях, яны да апошняга дыхання знаходзіліся ў страі. Я таксама быў паранены, але ў рашаючую хвіліну кінуўся з таварышамі на ворага і звязкай гранат знішчыў яшчэ некалькі фашыстаў.

*Сыромолотов В. И., Клугман З. З. В синих шинелях. У кн.: Солдатами были все. Мн., 1972. С. 283—290.*

### Успамінае Іван Мартынавіч Іваноў, былы супрацоўнік Магілёўскага сельскага райкома КП(б)Б

Стаялі цёплыя летнія дні. На калгасных палях паспяваў багаты ўраджай. У суботу 21 чэрвеня 1941 г. у райкоме партыі праходзіла нарада партыйнага актыву, на якой абмяркоўваліся пытанні догляду за пасевамі і падрыхтоўкі да ўборкі. Было прапанавана ў панядзелак выехаць у калгасы і давесці да ўсіх хлебаробаў рашэнні раённага камітэта партыі. Але ... пача-

лася вайна, і ў калгасы мы адправіліся ў нядзелю ўжо з іншай мэтай — праводзіць мітынгі, дапамагаць ваенкамату па мабілізацыі.

Па прапанове райкома партыі, мы — Ягудзін, Савінаў, Глушко і інш. мабілізоўвалі насельніцтва раёна на будаўніцтва абаронных збудаванняў і процітанкавых ірвоў. Старыя жанчыны, падлеткі з прыгарадных калгасаў Пашкаўскага, Княжыцкага, Цішоўскага, Палыкавіцкага, Грабянёўскага сельсаветаў на працягу тыдня днём і ноччу капалі траншэі і бліндажы. Я працаваў з жанчынамі за два кіламетры ад Магілёва, каля Гарадшчыны. Нямецкія сцярвятнікі абстрэльвалі нас з самалётаў, кідалі бомбы. З'явіліся першыя параненыя і забітыя. Але работу мы не спынялі.

За тыдзень для абароны горада быў выкапаны роў працягласцю больш за 30 км. А радыё перадавала трывожныя весткі…

Стала вядома, што немцы для дыверсій скідваюць на нашу тэрыторыю парашутыстаў, і на чарговай нарадзе райкома партыі быў арганізаваны знішчальны атрад па барацьбе з імі. У выпадку акупацыі раёна мы абавязаны былі застацца ў тыле ворага для падпольнай барацьбы.

У ноч з 17 на 18 ліпеня наш знішчальны атрад на чале з першым сакратаром райкома партыі Ф. А. Журавым, узброіўшыся вінтоўкамі, гранатамі і бутэлькамі з гаручай сумессю, размясціўся на ўскрайку в. Шчэжар. Пад вечар з'явіліся два нямецкія самалёты і выкінулі чатырох парашутыстаў. Двух мы знішчылі. 22 ліпеня наш атрад перабазіраваўся ў Магілёў на вуліцу Пушкіна і размясціўся ў двары сярэдняй школы.

Каля шашы Гомель—Магілёў у раён Лупалава прарваліся нямецкія танкі, а за імі і матацыклісты, мы адкрылі па іх агонь. Фашысты стралялі з кулямётаў. У гэтым баі загінулі наш камандзір Жураў, а таксама Ягудзін, Крэдзік, Каспяровіч, Валахановіч. Ягудзін, расстраляўшы ўсе патроны, кінуў у гітлераўцаў, што набліжаліся, гранату.

Застаўшыся ў жывых, мы з дырэктарам Лупалаўскай МТС Лацапнёвым ноччу пераправіліся праз Дняпро і накіраваліся да Шчэгліцы. Тут сустрэліся з воінамі 172-ой дывізіі — М. С. Зубковым, І. А. Петраковым, А. А. Ільінскім. Нам прадстаяла арганізоўваць барацьбу супраць акупантаў на нашай зямлі.

**Успамінае Васіль Дзмітрыевіч Гузаў, в. Падбелле**

Закончыўшы Шчэжарскую сямігадовую школу, мы рыхтаваліся да выпускнога вечара. Усе былі просценька апрануты, але шчаслівыя і радасныя: мы ўжо не школьнікі — наперадзе цэлае жыццё! На вечары многія хлопцы і дзяўчаты ўпершыню пaглядзелі адзін на аднаго закаханымі вачыма. І ніхто з нас не думаў, што праз тыдзень усе планы рэзка зменяцца: пачнецца вайна…

У в. Падбелле не было ні тэлефона, ні радыё, таму вестка пра вайну прыйшла да нас у другой палове дня 22 чэрвеня 1941 г. Прывёз яе старшыня калгаса імя Мічурына Фядот Мікітавіч Сідарэнка, які толькі вярнуўся са Шчэжарскага сельсавета. Увесь навакольны свет змяніўся — усе адчулі небяспеку, што навісла над намі, над краінай. Пачалася мабілізацыя калгаснікаў у Чырвоную Армію. На ўсю вёску галасілі жанчыны, і наступаў час раставання, час цяжкага чакання невядомасці…

На другі дзень пачалі прыбываць таварныя эшалоны на чыгуначны раз'езд Дары, якія прыпыняліся на запасных пуцях. Днём і ноччу ішла выг-

рузка боепрыпасаў і ваеннай маёмасці. Некалькі грузавых аўтамабіляў бесперапынна рухаліся ад паўстанка да невысокага ельніку, што знаходзіўся каля раз'езда і называўся Юсупавым лесам. Праз тры-чатыры дні пасля пачатку вайны фашысцкія самалёты пачалі бамбіць і абстрэльваць раз'езд. Бомбы траплялі і на хаты нашага Падбелля…

Па Чавускай шашы ішлі тысячы бежанцаў: жанчыны, дзеці, старыя. Людскі паток дапаўнялі воіны адступаючых разбітых часцей, астаткі якіх выходзілі з баямі з акружэння. Салдаты ішлі зморанныя, з абмоткамі на нагах (такі быў абутак на час вайны — бацінкі і абмоткі), многія з іх — павязаныя акрываўленымі бінтамі…

Хутка на вуліцах з'явіліся фашысты. Яны рухаліся з боку Мядзвёдаўкі на вёскі Кадзіна і Таранава. Да вайны, каля дарогі, што злучала гэтыя вёскі, стаялі тры дамы: Таранаўскі сельскі Савет, сельскі клуб і магазін. На поўдзень ад іх, на жытнёвым полі, адбыўся тады бой. У ім загінула да сотні савецкіх воінаў. Пасля бою некалькі дзён і начэй фашысты абстрэльвалі нашу мясцовасць з гармат. Некалькі сутак сядзелі мы ў наспех зробленых акопах. Над галовамі пралятаі снарады і міны, якія разрываліся зусім побач.

Гітлераўцы распалажыліся за чыгункай супраць в. Падбелле — там, куды некалькі дзён назад нашы салдаты вазілі з эшалонаў боепрыпасы. У Падбеллі іх яшчэ не было, але аднойчы ў апошні дом вёскі зайшоў чырвонаармеец і сказаў, што тут адбудзецца бой, таму ўсім жыхарам Падбелля неабходна пайсці адсюль, знайсці больш бяспечнае месца. Мы тут жа падаліся ў Шчэжар, хаця вёска ўжо была акупіравана фашыстамі. У Шчэжары было многа бежанцаў, назад дарога была перарэзана. У лесе, каля калгаснага двара, знаходзілася некалькі сот палонных чырвонаармейцаў. Многія з іх былі паранены. Палонныя прасілі: «Хлебушка, вады…» Шчэжарцы прыносілі хто што мог: адвараную бульбу, хлеб, сухары. Хтосьці перадаў салдатам некалькі кавалкаў сала. Дзеці прыносілі ваду. Гітлераўцы дазвалялі па чарзе падыходзіць да палонных адной-двум жанчынам з вёдрамі.

А на полі каля Кадзіна ірваліся снарады, міны, ішоў рукапашны бой.

**Успамінае Ніна Аляксандраўна Цяраева, удзельніца баёў пад Магілёвам**

Наш медсанбат размясціўся ў лесе недалёка ад Магілёва. Лес абстрэльвалі і бамбілі кожны дзень па некалькі разоў, і нам даводзілася мяняць месца знаходжання. Мы, дзяўчаты, пад агнём непрыяцеля перавязвалі, выносілі з поля бою параненых.

Памятаю бой каля в. Сідаравічы. Свісцелі кулі, ірваліся міны і снарады, а я перавязвала параненых. Сярод іх былі начальнік штаба палка маёр Златаустаўскі, лейтэнанты Кавалеўскі, Пугачоў, байцы Сідараў і Каноў, старшына Пятроўскі і інш. Звычайна параненыя, калі маглі трымаць зброю, не хацелі, каб іх вывазілі, заставаліся ў страі, разам з таварышамі адбівалі атакі. Мы, медыкі, таксама нярэдка ўдзельнічалі ў баях. Калі недалёка ад Вейна прарваліся танкі ворага, начальнік нашай санчасці І. І. Пулін падпа-



Н. А. Цяраева

ліў адзін з іх, кінуўшы бутэльку з гаручай сумессю.

У ноч з 25 на 26 ліпеня медсанбат знаходзіўся ўжо ў карпусах 1-ай Савецкай бальніцы Магілёва. У гэту ноч ніхто не спаў. Параненых было вельмі многа. Урачы аперыравалі, мае сяброўкі Марыя Галота і Наташа Бязручанка перавязвалі параненых, рабілі ін'екцыі. Раніцай даведаліся, што сувязь з палком страчана, санчасць акружана. Нашымі баявымі камандзірамі сталі ваенныя ўрачы С. А. Нельга і І. І. Пулін: неабходна было хутка эвакуіраваць параненых — гэта быў наш бой. Многія ў ім загінулі: Бяляўскі, Барынаў і інш. Разам са штабам пад камандаваннем падпалкоўніка А. В. Шчаглова, адбіваючы атакі, рушылі на Лупалава. У гэты час другі раз былі паранены лейтэнант Пугачоў, маёр Златаустаўскі, але яны заставаліся са сваімі байцамі.

Памятаю момант, калі, перавязваючы параненых, я ўзняла галаву. У гэты момант мяне параніла. Бой працягваўся. Байцы ірваліся ў контратаку: мы ж павінны былі прарвацца. Цырульнік штаба палка І. М. Навуменка замяніў загінуўшага кулямётчыка, падпалкоўнік А. В. Шчаглоў вёў агонь з гарматы, разлік якой загінуў.

Згушчаўся змрок. Камандзір палка аддаў загад падрыхтавацца да прарыву. У яго руках трапятаў чырвоны палкавы сцяг. Камісар В. Ф. Кузняцоў гучна сказаў:

— Мы клянёмся да апошняй кроплі крыві змагацца з фашысцкімі забойцамі!

Нам усё ж удалося выйсці з акружэння і вынесці ўсіх параненых...

## Канстанцін Сіманаў на Магілёўшчыне (чэрвень — ліпень 1941-га)

Так сталася, што наша Беларусь увайшла ў жыццё рускага пісьменніка Канстанціна Сіманава. Менавіта тут ён сустрэў вайну, тут былі яго першыя баі, пра якія ён пісаў як карэспандэнт газеты «Известия», тут, можна сказаць, нарадзіўся ваенны паэт Сіманаў. Гэтыя першыя баі на Беларусі на ўсё жыццё прывязалі сэрца Сіманава да тых, хто змагаўся ў акопах, на ўсё жыццё зрабілі яго франтавіком.

Апошнім жаданнем Канстанціна Сіманава было — каб прах яго развеялі над Буйніцкім полем. Там засталася душа яго...

Замалёўкі ваеннага карэспандэнта К. Сіманава сёння, праз паўстагоддзя, даюць магчымасць, як на кінаплёнцы, убачыць адзін з баёў на Буйніцкім полі, пазнаёміцца з абаронцамі, што там ваявалі.

Ваенныя замалёўкі К. Сіманава — гэта нерукатворныя абеліскі і помнікі тым, хто абараняў нашу Бацькаўшчыну.

**З успамінаў К. Сіманава**

А по дорогам шли беженцы... Ехали и шли старики, усталые, рано постаревшие женщины. И дети, дети, дети... Детишки без конца. На каждой подводе шесть — восемь — десять грязных, черномазых, голодных детей.

Наконец, мы заехали в такую глушь, где не было даже беженцев. По проселкам шли только мобилизованные. В деревнях остались женщины. Они выходили на дорогу, останавливали машину, выносили из погребов крынки с холодным молоком, поили нас, крестили, говорили: «Спаси вас господи...» — и долго смотрели вслед...

Деревни были маленькие и около них, обычно на косогорах, виднелись

большие кладбища, на которых было похоронено столько безвестных предков, дедов и прадедов… Я понял, насколько сильно во мне чувство родины, насколько я чувствую эту землю своей и как глубоко корнями ушли в нее все эти люди, живущие на ней. Горести первых двух недель войны убедили меня в том, что и сюда могут прийти немцы, но представить себе эту землю немецкой было невозможно…

Когда мы ехали обратно, увидели двух женщин, державших на руках ребятишек. Детишки махали руками вслед машинам. Не знаю, почему именно в тот момент меня прошибла слеза. Я думал о том, что будет с этими ребятишками через неделю…

…Мы ехали в полк полковника Кутепова. На пятом или шестом километре за Могилевом свернули и въехали в какие-то заросли, где нас сейчас же задержали. Всех троих под конвоем доставили в штаб полка. Из окопа поднялся очень высокий человек и спросил, кто мы такие. Это был Кутепов.

— Какие корреспонденты? — закричал он. — Какие корреспонденты могут быть здесь в два часа ночи?..

…Даже когда полковник говорил с нами сердитым голосом, в манере его говорить было что-то привлекательное. А сейчас он окончательно сменил гнев на милость и стал рассказывать нам о только что закончившемся бое. Он рассказывал об этом с мальчишеским задором — о том, как трудно было сохранить боевой дух в полку, когда мимо проходили с запада на восток сотни и тысячи окруженцев — кто с оружием, кто без оружия. Пропуская их в тыл, надо было не дать упасть боевому духу полка, на глазах у которого шли эти тысячи людей…

…Это был высокий худой человек с усталым лицом, с ласковыми не то голубыми, не то серыми глазами и доброй улыбкой. Старый служака, прапорщик военного времени в первую мировую войну, настоящий солдат, полковник Кутепов как-то сразу стал дорог моему сердцу.

Как я потом понял, Кутепов, очевидно, уже знал, что ему со своим полком придется остаться в окружении. Он говорил:

— Мы так уж решили тут между собой: что бы там кругом ни было, кто бы там ни отступал, мы стоим вот тут и будем стоять, пока живы…

Тогда, в 1941 году, на меня произвела сильное впечатление решимость Кутепова стоять насмерть. Недолгая встреча с Кутеповым для меня была одной из самых значительных за годы войны.

…Мы зашли на командный пункт батальона. Командир батальона капитан Гаврюшин, человек лет тридцати, уже два или три дня не бритый с усталыми глазами. На лице его было странное выражение одинаковой готовности еще сутки вести бой, говорить и действовать и в то же время готовность уснуть в любую минуту.

…Командир роты Хоршев был еще совсем молодой, в сбитой набок пилотке, такой молодой, что было странно, что он тут дрался до последнего патрона и потерял половину роты.

…Пишу это, а передо мной лежат переснятые из личных дел старые предвоенные фотографии командира полка Семена Федоровича Кутепова, комиссара Василия Николаевича Зобнина, нач. штаба Сергея Евгеньевича Плотникова, командира батальона Дмитрия Степановича Гаврюшина, командира роты Михаила Васильевича Хоршева…

Самому старшему из них — Кутепову — было тогда сорок пять лет, а всем остальным гораздо меньше. Гаврюшину — тридцать шесть, Плотникову — тридцать один, Зобнину — двадцать восемь, Хоршеву — двадцать три.

…14 июля, когда мы уезжали, из полка Кутепова, когда во второй

половине дня еще разговаривали под Могилевом с комиссаром 61-го корпуса, немецкие танки подходили к Чаусам; 29-я мотодивизия немцев уже подошла передовыми частями к Смоленску. Могилевская оборона оказалась в тылу врага...

...Бакунин Федор Алексеевич к началу войны уже 2 года командовал своим 61-м стрелковым корпусом. Вот как он сам вспоминает о боях под Могилевом:

«15 и 16 июля войска 61-го стрелкового корпуса остались в окружении. ...Корпус оказался в глубоком тылу врага. 16 июля я получил короткую радиограмму... «Бакунину. Приказ Верховного Главнокомандующего — Могилев сделать неприступной крепостью!»

Бой в окружении — самый тяжелый бой. Окруженные войска должны или сдаваться, или драться до последнего. Я понял приказ так: надо возможно дольше на этом рубеже сдерживать вражеские войска, с тем чтобы дать возможность нашим войскам сосредоточить свои силы для решительного перехода в наступление».

Из окружения генерал-майору Бакунину удалось прорваться к своим во главе группы в сто сорок человек только в конце ноября.

При выходе из окружения погиб в боях комиссар 61-го стрелкового корпуса И. В. Воронов — между Могилевом и Чаусами — и его заместитель полковой комиссар Турбинин — под Могилевом.

*Константин Симонов. Разные дни войны: Дневник писателя. М., 1982. Т. 8. С. 75, 77, 103—112, 136.*

## Рэпартаж «Гарачы дзень»

«...Полк закапаўся ў зямлю. Дарэмна спрабавала выкалупаць яго нямецкая авіяцыя, артылерыя і танкі. Глыбокія, поўнага профілю акопы забяспечаны моцнымі бліндажамі і моцнымі перакрыццямі. Надзейна абсталяваны назіральныя пункты. Многія кіламетры хадоў зносін забяспечваюць бесперабойную сувязь. І полк адбівае адну за другой усе атакі немцаў з жорсткімі для іх стратамі.

...Ноччу разведка даставіла дадзеныя, што ў лесе, у двух яшчэ раней прыстрэляных намі пунктах, сканцэнтраваны гатовыя да атакі нямецкія танкі. Начальнік артылерыі палкоўнік Мазалаў загадаў адкрыць па гэтых пунктах агонь.

Тры гаўбічныя батарэі ўдарылі адначасова. Снарады ірваліся на лясных лагчынах, дзе стаялі танкі ворага. Выбухі следавалі адзін за другім, зліваючыся ў агульны грохат. Праз 15 хвілін усё зноў сцішылася. Разведка данесла, што 8 танкаў знішчаны. Астатнія, паспешна зняўшыся з месца, ідуць уперад, да ўзлеску. За 3 гадзіны 30 хвілін 70 нямецкіх танкаў выйшлі на ўзлесак і адкрылі шквальны агонь з гармат і кулямётаў. Нашы процітанкавыя гарматы пакуль маўчалі, не раскрываючы сваіх пазіцый. Але артылерыя падтрымкі, не марудзячы, адкрыла адказны агонь.

Страціўшы яшчэ некалькі танкаў, немцы вымушаны былі перайсці ў атаку раней, чым ім удалося падрыхтаваць яе сваім агнём. Яны развярнуліся і ўжо без прыцэлу на хаду працягвалі абстрэл. Цяпер на іх шляху быў процітанкавы роў. Абыходзячы яго, самкнутая група машын наткнулася на міннае поле. 7 танкаў былі падарваны за некалькі секунд. З акопаў было добра відаць, як праз люкі выскокваюць фашысцкія танкісты і падаюць побач з

машынамі, скошаныя агнём нашых кулямётаў. Астатнія танкі абышлі роў з двух бакоў і з'явіліся перад пярэднім краем абароны. Адначасова злева з-за лесу, напэўна, лічачы перамогу ўжо забяспечанай, выскачылі на шашу нямецкія машына і некалькі грузавікоў з салдатамі. Левафланговая рота па загаду свайго камандзіра лейтэнанта Хоршава адкрыла па іх перакрыжаваны кулямётны агонь. Праз паўтары хвіліны ўвесь узлесак быў усеяны трупамі нямецкіх салдат. Сядзеўшыя ў штабной машыне аказаліся забітымі на месцы.

Такі ж лёс напаткаў і нямецкую пяхоту, якая ў саставе двух самкнутых строем рот выйшла з лесу, напэўна, з намерам правесці псіхічную атаку. Толькі блізкасць лесу выратавала частку гэтай калоны. Большая ж палова яе казалася зрэзанай кулямётным агнём. Але танкі тым часам працягвалі рухацца. Некаторыя з іх выйшлі на шашу. Заўважыўшы гэта, лейтэнант Хоршаў праз сувязіста Громава загадаў сапёрам узарваць загадзя замініраваны мост на шашы. Вось першы цяжкі танк праскочыў мост. Яшчэ некалькі секунд і... Але менавіта гэтых некалькі секунд і не далі немцам сапёры. Прапусціўшы першы танк, яны ўзарвалі мост перад носам у астатніх.

Батарэя лейтэнанта Возгрына, якая стаяла каля дарогі, адкрыла па спыніўшыхся танках агонь прамой наводкай. За кароткі час яна разбіла тры з іх і, падпусціўшы цяжкі танк, які праравўся на блізкую дыстанцыю, пашкодзіла яму гусеніцы снарадам. Танк спыніўся, працягваючы страляць. Тады сяржант Тарасевіч ушчыльную падабраўся да танка, кінуў бутэльку з бензінам на распаленую выхлапную трубу. Танк загарэўся. Экіпаж выскачыў на дарогу. Тарасевіч улажыў аднаго фашыста з нагана, а затым гранатай — астатніх. Нямецкая пяхота, якая рыхтавалася выступіць з лесу, убачыўшы палаючыя машыны, залягла на ўзлеску.

Між тым у цэнтры танкі ўсё яшчэ рухаліся. Яны абагнулі процітанкавыя равы і міннае поле і выйшлі за 300—400 метраў ад нашай пяхоты. За танкамі следавалі прычэпленыя да іх браніраваныя пляцоўкі з пяхотай. Частка пяхоты сядзела ззаду на саміх танках, прыкрытая іх бранёй. Дачакаўшыся, пакуль танкі падыйдуць зусім блізка, адкрылі па іх агонь процітанкавыя гарматы. Вось яны падбілі адзін танк, другі, трэці, чацвёрты. Гаўбіцы ўжо не стралялі па машынах. Яны перанеслі агонь наперад, на ўзлесак, адразаючы ад танкаў пяхоту. Нямецкія рэзервы не маглі прайсці. Цяпер засталося справіцца з тымі танкамі і пяхотай, якія прарваліся ўперад. Процітанкавыя гарматы расстралялі каля дзесятка танкаў, але ў сваю чаргу таксама былі большай часткай выведзены са строю. Астатнія танкі ўжо пераходзілі пярэднюю лінію акопаў. Справа была за нашай пяхотай. Бясстрашна выскоквалі з акопаў байцы і кідалі бутэлькі на танкі, якія прарваліся. Адна з бутэлек, няўдала кінутая, саскальзнула. Нямецкі афіцэр адкрыў верхні люк, пагардліва паглядзеў ёй услед і падкруціў вусы. Гэты жэст выдатна бачыў лейтэнант Хоршаў, які сядзеў са снайперскай вінтоўкай на сваім камандным пункце.

Стрэл. Не паспеўшы зачыніць люк, немец усім целам перваліўся вонкі. Башанны стралок падняўся, каб уцягнуць яго, але таксама быў забіты куляй снайпера Сербіенкі.

Танкаў заставалася ўсё менш і менш. Астаткі іх былі ўжо ў нашым распалажэнні. З браніраваных пляцовак і танкаў саскоквала пяхота, закідваючы нашы акопы гранатамі. Камандзір батальёна капітан Гаўрушын рашыў, што час дзейнічаць, загадаў адкрыць агонь сваім процітанкавым гарматам і кулямётам, якія былі размеш-



Капліца ў в. Буйнічы, пабудаваная ў памяць аб абарончых баях за Магілёў

чаны ў глыбіні абароны. Адначасова кінулася ў атаку і наша пяхота. Не вытрымаўшы агню і баючыся прыняць штыкавы ўдар, нямецкая пяхота стала адыходзіць у беспарадку. Загарэліся яшчэ тры танкі. Уцалелыя танкі таксама адыходзілі, агнём прыкрываючы бегства сваёй пяхоты. Немцы ўцякалі па высокаму жыту, кідаючы зброю і зрываючы знакі адрознення. На ўзлеску іх сустракаў і праводзіў агонь нашых гаўбіц. Толькі адзін танк застаўся яшчэ ў нашым размяшчэнні. З падбітай гусеніцай ён стаяў за 40 метраў ад каманднага пункта і страляў па бліндажы, у якім сядзелі лейтэнант Хоршаў і капітан Гаўрушын. Але і гэты танк быў разбіты трыма снарадамі з процітанкавай гарматы.

З назіральнага пункта палка было добра відаць поле бою. Прымяўшы жыта, групамі ляжалі мёртвыя нямецкія салдаты. Чырвонаармейцы прынеслі кінутыя немцамі ў жыце жалезныя крыжы і медалі. Разведчыкі падвозілі да штаба ўзятыя матацыклы і самакаты. Расла куча трафеяў. Палкоўнік Куцепаў, камісар Зобнін і начальнік штаба капітан Плотнікаў падводзілі вынікі дня: 39 разбітых варожых танкаў, да двух рот знішчанай пяхоты, 2 грузавікі, штабная машына. Дзень быў гарачы.

*Константин Симонов. Горячий день. «Известия». 20 июля 1941.*

## Акупацыя

### Тры гады жаху...

Да канца ліпеня 1941 г. уся тэрыторыя Магілёўскага раёна была акупіравана гітлераўскім войскам. Фашысцкая ўлада адразу ж пачала ўстанаўліваць «новы парадак» — рэжым страху, рабства, заложніцтва, рэжым крывавых забойстваў. Гітлераўцы наладжвалі аблавы; захопленых хлопцаў, дзяўчат і маладых жанчын з дзецьмі, дзяцей без бацькоў вывозілі на прымусовыя работы ў Германію. Яны ўвялі працоўную павіннасць нават на дзяцей

і старых, займаліся грабяжом і разбоем.

Тэрарыстычныя дзеянні акупантаў не былі стыхійнымі, яны былі спланаванымі наперад. У інструкцыі гітлераўскага кіраўніцтва ад 23 мая 1941 г., якая датычылася ўсходніх акупіраваных раёнаў, гаварылася: «Многія мільёны людзей стануць лішнімі на гэтай тэрыторыі, яны павінны будуць памерці або перасяліцца ў Сібір» (1, с. 100)[1]. Па генеральнаму плану «Ост» прадугледжвалася «высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі; 25 працэнтаў беларусаў па плану галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягала анямечванню» (1, с. 115).

Вынікам рэалізацыі намечанага і было знішчэнне нацыстамі мірнага насельніцтва. Гэта былі: масавыя расстрэлы, вынішчэнне ў канцлагерах і гета, катаванне ў турмах, забойства дзяцей і хворых, спаленне населеных пунктаў і інш.

Да такой «дзейнасці» нацысты рыхтаваліся задоўга. Так, Гімлер у маі 1940 г. піша сакрэтны мемарандум у якім, акрамя ўсяго, устанаўліваюцца метады германізацыі шляхам адбору дзяцей, якія павінны забірацца ў бацькоў, атрымліваць новыя імёны, пасяляцца ў Германіі. У выніку чаго праз 10 гадоў на захопленых тэрыторыях засталося б толькі «непаўнацэннае насельніцтва», прыгоднае для выканання чорных работ (5, с. 6).

10 ліпеня 1943 г. з'явіўся загад Гімлера, у якім ён са спасылкамі на Гітлера прадпісваў ачышчаныя ад насельніцтва тэрыторыі «часткова засеяць кок-сагызам і, наколькі магчыма, выкарыстоўваць іх для сельскай гаспадаркі». У якасці рабочай сілы прапаноўвалася скарыстоўваць дзяцей, змешчаных у спецыяльныя лагеры (2, с. 499).

Нацысцкае камандаванне заклікала салдат і афіцэраў праяўляць неабходную жорсткасць да насельніцтва. 13 мая 1941 г. фельдмаршал Кейтэль падпісаў дырэктыву «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і аб асобных паўнамоцтвах войск». У ёй гаварылася, што ўзброеныя сілы Германіі вызваляюцца ад усякай адказнасці за любыя злачынствы на акупіраванай тэрыторыі (3, с. 31—32).

Восенню 1943 г. франтавы ўпаўнаважаны нацыянальнага камітэта «Свабодная Германія» Ганс Госенс, які пабываў на Беларусі, гаварыў па радыё: «Мы праехалі сотні кіламетраў і на месцы добраўпарадкаванага жылля бачылі кучы камянёў, попелу і абгарэлых бярвенняў... За ўсё гэта прыйдзецца плаціць...» (4, с. 312).

Палітыка генацыду — знішчэнне насельніцтва, населеных пунктаў разам з жыхарамі або з часткай іх, тактыка «выпаленай зямлі» — усё гэта было характэрным у час гітлераўскай акупацыі на Магілёўшчыне. У Магілёўскім раёне было знішчана 27 населеных пунктаў, з іх 6 — цалкам, да апошняй хаты. Было знішчана 2499 мірных жыхароў, з іх больш за 700 спалена жывымі...

Адным са спосабаў знішчэння людзей на акупіраванай тэрыторыі былі так званыя месцы прымусовага ўтрымання і знішчэння — г. зн. лагеры. Яны былі рознымі па назве: «для ваеннапалонных», «жаночыя», «шталагі», «перасылачныя», «гета» і інш., — але сутнасць была адна — зняволенне, катаванне, смерць. Адным з першых, хто зведаў жудасці фашысцкіх лагераў, былі ваеннапалонныя — воіны Чырвонай Арміі. Многа іх ішло ў чэрвені—ліпені праз Магілёўскі раён...

З-за злачынных пралікаў Сталіна і яго акружэння, якія не падрыхтавалі краіну і армію да вайны, з-за недарэч-

[1] Глядзі спасылкі ў канцы артыкула.

ных загадаў у першы дзень вайны, хранічнага недаходу ў арміі вопытных камандзіраў — у першыя ж месяцы вайны ў палон трапіла каля 3 млн. байцоў і камандзіраў. Як яны маглі спыніць узброеных да зубоў гітлераўцаў, калі ў чэрвені—ліпені 1941-га нярэдка на двух байцоў выдавалася адна вінтоўка. І гэта — супраць танкаў... (5, с. 281).

Мусіць, і гітлераўцы не былі гатовымі да такой колькасці ваеннапалонных. Лагеры для іх ствараліся проста ў полі, на плошчах і іншых вялікіх абцягнутых калючым дротам тэрыторыях — пад адкрытым небам: проста загоны. Там палонныя трымаліся без усялякай ежы, без вады. Становішча ваеннапалонных было жудасным. Гітлераўскі чыноўнік Дорш у данясенні рэйхсляйтэру Розенбергу паведамляе: «У лагеры ...памерам з плошчу Вільгельмплац знаходзіцца прыблізна 100 тыс. ваеннапалонных, 140 тыс. грамадзянскіх палонных. Палонныя, загнаныя ў гэтую цесную прастору, ледзьве маюць магчымасць рухацца і вымушаны адпраўляць натуральныя патрэбы там, дзе стаяць...» (6, с. 201).

Каля 100 тыс. ваеннапалонных і цывільных жыхароў прайшлі праз Грабянёўскі перасыльны лагер смерці, што быў у Магілёўскім раёне... У 1941 г. на ўскраіне Магілёва быў створаны Лупалаўскі лагер смерці (шталаг № 813) для масавай загубы савецкіх ваеннапалонных. Ён быў агароджаны калючым дротам, праз які прапускаўся электрычны ток. У лагеры панаваў тыф. Людзей катавалі, да смерці марылі голадам, расстрэльвалі. У Лупалаўскім лагеры загублена больш за 40 тыс. чалавек... (7, с. 308, 316).

На адносна невялікай тэрыторыі Магілёўскага раёна гітлераўцы стварылі 5 лагераў смерці. Сярод іх у раёне р. Дубровенка быў і лагер для яўрэйскага насельніцтва — гета. Нельга не сказаць, што цікавым заняткам лагернай аховы наогул з'яўлялася стральба па жывых мішэнях. У кожным лагеры былі нават свае «снайперы». Але асабліва забаўляльным быў гэты занятак для пачвар у гілтераўскай форме, якія ўдзельнічалі ў пагромах і расстрэлах яўрэяў. Адзін са сведкаў, урач Г. І. Тайц, расказваў, як «дзяцей падкідвалі і расстрэльвалі на ляту. Калі выстрал быў «няўдалым», дзіця хапалі за ножку і аб што-небудзь разбівалі галаву» (8, спр. 66).

У гета Магілёўскага раёна ўтрымлівалася яўрэйскае насельніцтва з Магілёва і навакольных вёсак. У верасні—кастрычніку ўсіх знішчылі. Расстрэльвалі каля в. Казіміраўка і ў Магілёве. Было загублена 7,5 тыс. чалавек (9, с. 14, 15).

У лагерах смерці Магілёўскага раёна загінула 70 тыс. чалавек; больш за 40 тыс. з іх расстралялі каля вёсак Пашкава і Палыкавічы.

Сёння ў 12 вёсках Магілёўскага раёна стаяць помнікі загінуўшым у час вайны 1941—1945 гг. мірным грамадзянам (11, с. 285—299):

**Алень** — Семукацкі с/с;
**Барсукі** — Вендаражскі с/с;
**Вендараж** — цэнтр с/с;
**Гараны** — Пашкаўскі с/с;
**Дубінка** — Нядашаўскі с/с;
**Дашкаўка** — цэнтр с/с;
**Заводская Слабада** — цэнтр с/с;
**Залубнішча** — Княжыцкі с/с;
**Малыя Бялевічы** — Семукацкі с/с;
**Палыкавічы** — цэнтр с/с;
**Старое Пашкава** — Пашкаўскі с/с;
**Туманаўка** — Дашкаўскі с/с.

*С п і с вёсак, знішчаных разам з жыхарамі ці з часткай іх у час карных аперацый*

| Назва населенага пункта | Колькасць | | |
|---|---|---|---|
| | двароў/насельніцтва да вайны | двароў/насельніцтва знішчана | Час знішчэння |
| **Вёскі, знішчаныя разам з жыхарамі** | | | |
| Гарадзішча | 182/743 | 69/138 | Верасень, 1943 |
| Гараны | 67/249 | 67/195 | Верасень, 1943 |
| Дубінка | 83/409 | 72/186 | Люты, 1943 |
| Залубнішча | 42/185 | 28/61 | Студзень, 1944 |
| Масток | 271/965 | 258/227 | Снежань, 1943 |
| Пясчанка | 89/437 | 70/52 | Студзень, 1944 |
| Туманаўка-2 | 17/58 | 15/38 | Лістапад, 1943 |
| **Вёскі, знішчаныя з часткай жыхароў** | | | |
| Буйнічы | 141/765 | 118/95 | Красавік, 1944 |
| Вялікія Бялевічы | 131/654 | 128/16 | Верасень, 1943 |
| Гарадок | 9/80 | 9/4 | Кастрычнік, 1942 |
| Журавец 1-ы | 55/248 | 43/29 | Жнівень, 1943 |
| Закуцце | 11/60 | 10/2 | Жнівень, 1943 |
| Залессе | 64/321 | 53/7 | Жнівень, 1943 |
| Захват, пас. | 35/205 | 31/... | Чэрвень, 1944 |
| Курган | 37/167 | 37/... | Кастрычнік, 1942 |
| Лубнішча | 62/267 | 62/... | Май, 1944 |
| Малое Бушкава | 202/504 | 102/40 | Снежань, 1943 |
| Малыя Бялевічы | 73/565 | 69/... | Верасень, 1943 |
| Мікалаеўка | 11/45 | 11/... | Верасень, 1943 |
| Міхайлаўск | 37/177 | 35/2 | Верасень, 1943 |
| Незаўка | 60/268 | 59/... | Кастрычнік, 1942 |
| Пусты Асавец | 90/350 | 81/2 | Жнівень, 1942 |
| Савасцянавічы | 52/184 | 46/16 | Красавік, 1944 |
| Сенькава | 97/488 | 87/14 | Верасень, 1942 |
| Сташына | 50/251 | 50/9 | Красавік, 1944 |
| Таўпечыцы | 80/394 | 70/50 | Май, 1944 |
| Язершчына, пас. | 35/203 | 35/10 | Май, 1944 |

*Спіс ураджэнцаў Магілёўскага раёна — воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў лагеры для ваеннапалонных (шталаг № 352) у Мінскай вобласці (р-н Масюкоўшчыны)*

**ВАНЬКОВІЧ Фелікс Адамавіч** — 1908, в. Чырвоная Слабада. Загінуў 23.11.42 г.

**КАЗЛОЎ Іван Захаравіч** — 1900, в. Бракава. Загінуў 7.11.42 г.

**КАМАСІН Аляксей Іванавіч** — 1922, в. Слабада. Загінуў 27.07.42 г.

**КІРПІЧОЎ Яўсей Сяргеевіч** — 1902, в. Стайкі. Загінуў 16.11.41 г.

**ЛАЎРЫШКА Сяргей Цімафеевіч** — 1901, в. Хавычацы. Загінуў 28.11.41 г.

**МЕЛЬНІКАЎ Пётр Іванавіч** — 1917, торфазавод «Грабянёва». Загінуў 10.11.42 г.

**ЦІШКОЎСКІ Мірон** — 1908, в. Маяк. Загінуў 29.05.42 г.

1. «Совершенно секретно! Только для командования!». Стратегия фашистской Германии в войне против СССР: Документы и материалы. М., 1967.
2. СС в действии: Документы о преступлениях СС. М., 1969.
3. Преступные цели — преступные средства: Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944). М., 1968.
4. Мюллер Н. Вермахт и оккупация. М., 1971.
5. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995. С. 3, 6, 7, 31—280.
6. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1945. Мн., 1965.
7. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945: Энцыклапедыя. Мн., 1990.
8. НАРБ, ф. 750, воп. 1.
9. ДА Магілёўскай вобл., ф. 9, воп. 1.
10. Памяць. Беларусь. Рэспубліканская кніга. Мн., 1995.
11. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобл. Мн., 1986.

*Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995. С. 324—343.*

### Акт Магілёўскай раённай камісіі

4 снежня 1944 года

Магілёўская раённая камісія садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі па расследаванню і ўстанаўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе:

Старшыні камісіі — сакратара РК КП(б)Б Мазура С. А.; членаў камісіі: старшыні райвыканкома Салдаценкі І. С., сакратара райвыканкома Дзмітрыева В. Ф., начальніка РАНКУС Ягорава С. В., начальніка РАНКДБ Страбыкіна А. І., дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Харытановіч Ю. К.

правяла расследаванне фактаў зверскага знішчэння савецкіх грамадзян нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці за перыяд нямецкай акупацыі з 20.07.41 г. па 28.07.44 г.

Матэрыяламі следства, пратаколамі апытанняў, заявамі і паказаннямі сведак, аглядам месцаў знішчэння і захавання трупаў мірных жыхароў раённая камісія ўстанавіла:

за ўвесь перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі па Магілёўскаму раёну, па няпоўных дадзеных, па-зверску знішчана нямецка-фашысцкімі захопнікамі больш

за 2000 чал., у тым ліку жанчын — 820 чал., дзяцей 233 чал., сілаю вывезена ў нямецкае рабства каля 2643 чал. савецкай моладзі.

Метады знішчэння савецкіх грамадзян, якія прымянялі нямецка-фашысцкія каты, былі разнастайнымі, але ў большасці сваёй праводзіліся шляхам зверскіх катаванняў, здзекаў, масавых расстрэлаў і спальвання, як жывых, так і трупаў, з мэтай схаваць сляды злачынстваў. Аб фактах зверскага знішчэння ні ў чым не павінных савецкіх грамадзян нямецка-фашысцкімі нелюдзямі і ўгнання ў нямецкае рабства сведкі паказалі наступнае.

**Дзегцярова Ганна Кузьмінічна,** в. Гараны Гаранскага сельсавета:

— 15 верасня 1943 г. узброены нямецкі атрад карнікаў, у колькасці дакладна не ўстаноўлена, але на 40 поўнасцю загружаных нямецкімі салдатамі машынах, папярэдне акружыўшы, прыехаў у нашу вёску. У тых, хто спрабаваў уцячы ці схавацца, нямецкія варвары тут жа стралялі. Затым пачалі зганяць усё насельніцтва спачатку на вуліцу ў адно месца, потым усіх загналі ў некалькі хат і лазню, закрылі ўсе выхады. Пасля гэтага фашысцкія нелюдзі пачалі рабаваць жывёлу і маёмасць жыхароў. Закончыўшы грабяжы, пачалі падпальваць усе будынкі і ў першую чаргу тыя, у якіх знаходзіліся людзі. У час пажару працягвалі адшукваць тых, хто схаваўся. Так знайшлі мяне і яшчэ 50 чалавек. Нас падвялі да хаты, дзе была салома, і пачалі расстрэльваць. Я ўпала, прыкінуўшыся мёртвай. На нас, расстраляных, накідалі салому і падпалілі. Я выратавалася тым, што з абгарэлымі рукамі і тварам непрыкметна адпаўзла. Такім чынам нямецка-фашысцкімі нелюдзямі былі забіты і спалены трупамі і жывымі больш за 200 чалавек нашай вёскі.

**Вярбіцкая Фядора Іванаўна,** в. Дубінка Вендаражскага сельсавета:

— Я сведка таго, як 18 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія бандыты, акружыўшы нашу вёску, адкрылі кулямётны агонь з усіх бакоў, затым увайшлі ў вёску і пачалі зганяць насельніцтва ў два хлявы. Сагнаных (прыкладна 155 чал.) нямецкія нелюдзі катавалі і дапытвалі: шукалі звязаных з партызанамі. Нічога не дабіўшыся, усіх расстралялі. У ліку тых, каго расстрэльвалі, была і я, але мяне толькі параніла, я ляжала сярод забітых.

**Казачэнка Марцін Фёдаравіч,** в. Заврэжжа Вендаражскага сельсавета:

— 12 верасня 1941 г. нямецкі атрад карнікаў наехаў у нашу вёску, затым сабралі з усёй вёскі 97 чал. і пад узмоцненай аховай павялі ў Карчомскі лес. Там, у лесе, нямецкія варвары прымусілі выкапаць ямы, а затым усіх расстралялі і закапалі ў гэтых ямах.

**Якушка Аляксандра Міхайлаўна,** в. Малыя Бялевічы Бялевіцкага сельсавета:

— Я сведка таго, як у студзені—лютым 1943 г. нямецка-фашысцкія гады наехалі ў нашу вёску, пачалі зганяць усё насельніцтва ў адно месца. Пасля праверкі дакументаў вылучылі 34 чал. і павялі іх у хлеў. Уводзілі ў хлеў па 3 чалавекі і расстрэльвалі. Я выратавалася толькі таму, што стаяла апошняй у шостым радзе, і калі дзве жанчыны кінуліся ўцякаць, нямецкія каты пабеглі за імі, а я ў гэты час забегла ў хлеў і лягла сярод забітых.

**Дзятлікава Варвара Фядосаўна,** в. Бялевічы Бялевіцкага сельсавета:

— У лютым 1944 г. у нашу вёску наехалі немцы, папярэдне акружыўшы яе, пачалі зганяць на вуліцу ўсю моладзь, мужчын і жанчын. Другая частка салдат выганяла жывёлу, выносіла з хат адзенне і інш. У гэты дзень узялі ў рабства з нашай вёскі 25 чал., сярод якіх быў і мой муж Дзятлікаў Васіль Сямёнавіч.

**Горская Ева Феафанаўна,** в. Красніца Чарназёмаўскага сельсавета:

— 15 студзеня 1944 г. у нашу вёску прыехаў узброены нямецкі атрад карнікаў. У сувязі з партызанамі падазравалі маю дачку Таццяну. Пасля зверскай расправы над жыхарамі вёскі Таццяну павезлі ў Магілёў. Чатыры месяцы яе дапытвалі ў турме, потым адправілі ў Германію на катаржныя работы. Па дарозе Таццяна выскачыла з вагона і вярнулася дамоў. У маі 1944 г. гітлераўцы зноў яе арыштавалі. Дачку павялі ў Дашкаўскі лес. Пасля доўгіх здзекаў і зверскіх катаванняў — Таццяне выкалалі вочы, адрэзалі вуха, выкруцілі абедзьве рукі, адрэзалі грудзі, чатыры разы стралялі ў спіну — яе закапалі ў яме.

**Усава Аляксанра Самсонаўна,** в. Княжыцы Княжыцкага сельсавета:

— У лютым 1944 г. я даведалася, што людзі ў двары старасты в. Княжыцы Байдукова адкопваюць трупы сваіх блізкіх, якіх закатавалі нямецкія карнікі. Я пайшла з суседкай Лініч А. А. дапамагчы ёй адкапаць трупы закатаваных яе дачок Таісы і Зінаіды. Выкапаўшы яму, заўважыла, што ў магіле знаходзілася прыкладна

30 трупаў. Яма была завалена смеццем, гноем, бітым шклом і інш. Дастаўленыя дамоў трупы дзяўчат абмыла і апранула. У Зіны галава была прабіта куляй, каля левай грудзі — знак ад удару штыком і на спіне шэсць круглых адтулін. У Таісы ўся галава была так разбіта, што мы абвязалі яе хусткай, каб не распалася. Правае вока было выкалана, на левай руцэ выкручаны два пальцы.

На падставе вышэйпададзенага раённая камісія знаходзіць, што прамымі віноўнікамі знішчэння мірнага насельніцтва Магілёўскага раёна з'яўляюцца:

1. Мясцовы камендант маёр Кранц; 2. Мясцовы камендант маёр Люст; 3. Гуптман Ілле; 4. Начальнік зямельна-гаспадарчага ўпраўлення зондэрфюрэры: Ротман і Арнольц; 5. Начальнік раённай паліцыі штабс-фельдфебель жандармерыі Веселі; 6. Шэфы паліцыі лейтэнанты Арнольд і Форверк; 7. Цэнтральнае гандлёвае таварыства — Шаф; 8. Начальнік раёна Базыленка К. П.

Усе яны павінны панесці суровае пакаранне за свае пачварныя злачынствы.

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 5, воп. 4, спр. 3, с.1—2.*

## Мы прайшлі праз турму і рабства

**Манёнак Лідзія Мікалаеўна,** в. Гуслішча Вендаражскага сельсавета:

— 14 лютага 1944 г. ноччу ў дом да нас зайшлі паліцаі і забралі мяне, завезлі ў Магілёў. Змясцілі ў турму. Там знаходзіліся многія мае аднавяскоўцы — моладзь вёсак Гуслішча і Барсукі: Максімава Надзея Паўлаўна, Бяседа Надзея Ягораўна, Мельнікава Надзея Сяргееўна, Ігнацьева Антаніна Мацвееўна, Раманёк Пётр, Храбтовіч Надзея Кузьмінічна, Кухарава Кацярына Ягораўна.

Потым нас пагрузілі ў закрытыя таварныя вагоны і павезлі. Ехалі тры тыдні. Абыходзіліся з намі, як з жывёлай, не кармілі. Абяздоленыя, мы адчувалі сябе зняважанымі. У Германіі некаторых забралі на заводы, мяне адправілі да пана ў в. Легніц. Працавала я і ў полі, і ў доме. Спаць даводзілася па тры гадзіны ў суткі. Было вельмі цяжка. Так я пражыла два гады.

У 1946 г. вярнулася дамоў. Працавала да 1978-га ў калгасе.

**Максімава Марыя Ісакаўна,** в. Гуслішча Вендаражскага сельсавета:

— 14 лютага 1944 г. да нас у хату зайшлі паліцаі. Дома, акрамя мяне, былі маці і брат. Мне тады было 17 гадоў. Мяне вывелі з хаты і павезлі ў Глускую Сялібу. Памясцілі ў халодную хату. Сядзелі там тры дні. Кожны дзень прыводзілі моладзь з навакольных вёсак. Калі набралася чалавек 35, пасадзілі ў машыну і прывезлі ў Магілёў. Там пагрузілі ў таварныя вагоны і прывезлі ў Оршу. Тут наш поезд бамбілі. Самаадчуванне было — горш не прыдумаеш. За людзей нас не лічылі...

Потым ехалі толькі ноччу, удзень поезд стаяў. Праз нейкі час прыехалі ў Беласток. Там нас прадавалі як рабочую сілу. Я трапіла ў канцлагер у Нарвегію. Жылі ў бараках. Людзі хварэлі, паміралі. Хворых не лячылі. Адным словам — канцлагер...

У 1945 г. нас вызвалілі. Выдалі прадукты, грошы і на параходзе даставілі ў Мурманск. Потым цягніком прывезлі ў Магілёў.

З 1946 г. працавала ў калгасе «Светлы прамень», за што маю ўзнагароды.

**Максімава Надзея Паўлаўна,** в. Гуслішча Вендаражскага сельсавета:

— У 1944 г. мне было толькі 13 гадоў. 14 лютага ноччу немцы забралі мяне і прывезлі ў Магілёў. Змясцілі ў турму, дзе я прабыла каля трох тыдняў. Я ўвесь час плакала, бо была яшчэ зусім малой, вельмі цяжка было без бацькоў і дома, але хто лічыўся з гэтым? Умовы ў турме былі жахлівыя.

Нас амаль не кармілі. Холад страшэнны. Здавалася, не вытрымаю...

Праз некаторы час, які здаваўся вечным, нас прывезлі ў Германію, у г. Берлін-буг. Жыла ў баўэра, на ўскрайку горада. Працавала на полі. Рабочы дзень працягваўся 12–13 гадзін.

У 1945 г. нас вызвалілі, і я вярнулася дамоў. Працавала ў калгасе — 30 год, рабіла на ферме. За працу ўзнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Гузаў Васіль Дзмітрыевіч,** в. Падбелле Шчэжарскага сельсавета:

— Па распараджэнню валасной улады адзін з сям'і павінен быў працаваць, але ні тэрмін, ні месца працы не ўказвалася. Аднойчы і да нас у хату зайшоў паліцэйскі: «Хто сабраўся на работу?» Усе маўчалі. Я сядзеў каля печы з забінтаванымі на назе пальцамі. Паліцэйскі падышоў, дзернануў мяне за нагу: «Пайшлі!» Я нерухома сядзеў. «Пайшлі, табе сказана!»

Я падняўся, надзеў чаравікі, паддзёўку. Мы выйшлі з хаты. Хлеба не было, а бульбы яшчэ не зварылі. Сястра пабегла да суседзяў узяць кавалак хлеба мне на дарогу. Паліцэйскі ішоў ззаду, трымаючы на плячах свой паўаўтамат.

Цераз дзве–тры гадзіны я быў дастаўлены ў Магілёў, а яшчэ гадзіны праз дзве нас, некалькі дзесяткаў юнакоў, мужчын і жанчын, памясцілі за калючы дрот на адным з двароў па Пажарнаму завулку. Было холадна (марозы даходзілі да 18 °С). Потым нас, галодных, загналі ў памяшканне і нікуды не выпускалі. На выхадзе стаяў вартавы.

Галодныя, на халоднай падлозе, мы прабылі сутак пяць. Кожны дзень прыводзілі новых. Паявіліся сярод нас хворыя. Адчувалася слабасць, некаторыя гублялі прытомнасць. Мы станавіліся абыякавымі да свайго лёсу. Страшэнна хацелася есці. Нарэшце нас пагналі на чыгуначную станцыю, пагрузілі ў вагоны і адправілі на захад. Ехалі доўга. Цягнік часта спыняўся, затрымліваўся ў тупіках, мяняў кірунак. У транзітных лагерах выганялі з вагонаў, кармілі. За некалькі тыдняў пакармілі пяць разоў: у Мінску, Сувалках, Варшаве і два разы ў Чэхаславакіі, дакладней у Судэцкай вобласці, якая была перад вайной далучана да Германіі. Харчаванне было лагернае: 200 грамаў хлеба з пілавіннем і баланда з бручкі.

Аднойчы вечарам загадалі выйсці з вагонаў і павялі пад канвоем з сабакамі-аўчаркамі. Ішлі доўга. Нарэшце мы ўбачылі вышкі і калючы дрот — атрыбутыку ўсіх лагераў.

Лагер быў падзелены на некалькі секцый. Адна з іх — з высокай, метраў 10–12 трубой. З-за калючага дроту я бачыў некалькі разоў, як заводзілі ў гэтую секцыю старых, жанчын і дзяцей. Ніхто не падазраваў, што вялі людзей на знішчэнне. Многія з нас думалі, што гэта транзітны лагер, што праводзіцца санітарная апрацоўка. А дым ішоў і ішоў з высокага коміна, а людзі думалі... топяць лазню фашысты, каб памыць людзей. Ніхто яшчэ не ведаў пра крэматорыі...

Прыкладна праз тры месяцы, як пакінуў родную хату, у мяне наступіла крайняя слабасць, абыякавасць. Схуднела цела, высахлі рукі і ногі. Наступіў параліч волі, згубілася памяць. Ва ўспамінах заставаліся толькі праблескі кароткіх жыццёвых момантаў.

Нарэшце быў зроблены адбор на здольнасць жыць і працаваць: кожны павінен быў прабегчы метраў 15. Хто пераадольваў (слова прабегчы тут не падыходзіць) гэтую адлегласць, ішоў налева. Хто не — таго фашысты цягнулі, або сам поўз, управа, пад плот. Іх мы ўжо больш не бачылі.

Праз некалькі дзён нас размясцілі ў лагеры з моцнымі кратамі. На другі ці трэці дзень павесілі на грудзі кавалак матэрыі са словамі ОСТ, што азначала «чалавек з усходу»...

## Расстраляць, павесіць, забараніць!

Пасля акупацыі Магілёўскага раёна фашысты пачалі насаджаць тут свае органы ўлады. Тэрыторыя раёна з'яўлялася вобласцю армейскага тылу групы армій «Цэнтр». У Магілёве размясціўся штаб камандуючага тылам генерала фон Шэнкендорфа і палявая камендатура з камандай тайнай палявой паліцыі. Органы паліцыі бяспекі і СД прадстаўлялі: штаб кіраўніцтва СС і паліцыі на чале з обергрупенфюрэрам СС Бах-Залеўскім; айнзатцкаманда-8, а з канца 1943 г.— зондэркаманда-7 «Б»; органы контрразведкі (абвергрупа № 316). Для аховы жыццёва важных аб'ектаў служылі падраздзяленні 286-ай ахоўнай дывізіі. Пад кіраўніцтвам нямецкай адміністрацыі ствараліся і органы грамадзянскага кіравання — гарадская і валасная ўправы, паліцэйскія гарнізоны; у вёсках прызначаліся старасты.

Ужо ў пачатку восені 1941 г. немцы праводзілі ў Магілёўскім раёне карныя аперацыі. Пачынаў іх 322-і батальён нямецкага паліцэйскага палка «Цэнтр». З 16 да 18 верасня фашысты прачосвалі тэрыторыю паміж Дняпром, вёскамі Палыкавічы, Княжыцы і Магілёвам.

З дапамогай здраднікаў гітлераўцы выяўлялі людзей, якія засталіся для падпольнай работы, і жорстка з імі расправуляліся. Так, яны расстралялі ў в. Шчэжар кіраўніка падпольнай групы С. І. Каралёва і яго жонку.

22 верасня карнае падраздзяленне захопнікаў уварвалася ў в. Барсукі. Тут сям'я Асмалоўскіх хавала папаўшага ў акружэнне цяжка параненага камандзіра 172-ой стралковай дывізіі генерал-маёра М. Ц. Раманава. Захапіўшы яго, гітлераўцы расстралялі 13 жыхароў, у тым ліку шасцярых з сям'і Асмалоўскіх.

М. Ц. Раманава фашысты закатавалі ў лагеры смерці...

Уся дзейнасць акупантаў на захопленай тэрыторыі з першых дзён была накіравана на знішчэнне партыйна-савецкага актыву, байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі — як патэнцыяльных партызанаў і змагароў падполля.

Такая дзейнасць была невыпадковай, але мэтанакіраванай. Аб гэтым сведчаць дакументы.

*А. Ярохін*

### З трафейных дакументаў часцей вермахта

(Ліпень — лістапад 1941)

256-я пехотная дивизия. Разведовательный отдел штаба.
№ 2025-41. Секретно. 22 июля 1941 г.

...Согласно приказу Верховного командования сухопутной армии участников так называемых «партизанских» отрядов, которые появляются перед нашим фронтом или в тылу и не соблюдают надлежащим образом законов войны, не выполняют правил обмундирования, снаряжения или опознаваемости и нарушают этим самым предпосылки, обязательные для ведущих войну регулярных войск, милиции и добровольческого корпуса, членов таких отрядов, следует рассматривать, как вооруженных бандитов. При этом безразлично, называют ли они себя солдатами, поскольку прежде были таковыми, или являются не солдатами.

Гражданских лиц, которые каким бы то ни было способом оказывают содействие таким партизанским отрядам, поддерживая этим нерегулярные военные действия, следует, согласно военному обычаю, точно так же рассматривать, как вооруженных бандитов.

Разослать: во все роты.

*НАРБ, ф. 4, воп. 33[a], спр. 83, л. 8—9.*

З Загада па 26-ай пяхотнай дывізіі ад 11 верасня 1941 г.

...б) расстреливать лиц в гражданском платье, которые подозреваются в хранении оружия или в том, что они принимали участие во враждебных действиях против германской армии;

в) вешать лиц, уличенных в явной принадлежности к партизанам. Устрашение усиливается путем вывешивания надписи (например, «Так наказываются партизаны!»);

г) кто предоставит советским военнослужащим или лицам, находящимся на службе у России, убежище, питание или какую-либо другую поддержку, будет **расстрелян.**

*НАРБ, ф. 4, воп. 33$^{a}$, спр. 30, л. 71—79.*

## З матэрыялаў надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванню і ўстанаўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Жывапісныя ваколіцы Палыкавічаў, Казіміраўкі, Пашкава з 1941 г. сталі месцам смерці мірных савецкіх грамадзян.

Жыхар в. Палыкавічы **Новікаў Карней Арцёмавіч** расказвае: «Пад узмоцненай аховай сюды падвозілі на некалькіх машынах мірных грамадзян рознага полу, узросту і нацыянальнасці. Сярод іх былі і дзеці ад груднога ўзросту. Недалёка ад падрыхтаваных ям арыштаваных прымушалі распранушча, тых, хто марудзіў, падганялі гумовымі дручкамі і прыкладамі. Потым невялікімі групамі падводзілі іх да ямы і стралялі ў патыліцу. За дарослымі ў яму кідалі дзяцей. Некаторых з іх расстрэльвалі на ляту, астатніх — у ямах...

Калі да ўсведамлення ахвяр даходзіла разуменне рэчаіснасці, пачыналіся душараздзіраючыя крыкі, адны высока падымалі на руках малых дзяцей, другія пасылалі праклящце гітлераўскім катам».

— Быў такі выпадак, — расказвае **Маломчанка Ева Максімаўна**, — у час чарговага расстрэлу каля ямы з'явіўся малады чалавек у штацкім. Спакойна ён вынуў з кішэні расчоску, задумліва ўглядаючыся ўдаль, пачаў прычэсвацца. Нямецкі афіцэр, гледзячы на гэтага дзіўнага смяротніка, усміхнуўся. Малады чалавек крута павярнуўся назад і наводмаш рэзка ўдарыў немца ў морду. Прайшло некалькі мінут, пакуль адзін з катаў выпусціў у спіну героя чаргу з аўтамата. Група чакаўшых расстрэлу цвёрдым крокам, абняўшыся, са спакойнымі тварамі накіраваліся да ямы...

Восенню 1942 г. немцы пачалі прымяняць душагубкі.

Вось што расказвае аб гэтым жыхар в. Палыкавічы **Васькоў Аляксей Андрэевіч:**

— Прыйшла вялікая чорная машына. Не спыняючыся, яна заднім ходам шчыльна падышла да краю падрыхтаванай ямы. Калі адчынілі кораб, афіцэр загадаў мне ўзлезці туды і выкідваць трупы. Мне кінулася ў вочы прыхіліўшаяся да сцяны жанчына, яна трымала на руках дзіцё і карміла яго груддзю. Я сказаў, што жывых людзей скідаць у яму не буду. Мяне пачалі збіваць, пасля чаго я зноў падышоў да машыны і залез у яе. Тут толькі ўпэўніўся, што ўсе мёртвыя...

Пры раскопцы магіл у раёне Казіміраўкі была выяўлена ў адной з іх вялікая колькасць трупаў. Выбралі толькі два верхнія пласты — 76. Усе яны, як устанавіла медыцынская экспертыза, былі атручаны вокіссю вуглярода.

З моманту паражэння пад Сталінградам нямецкія бандыты сталі выкапваць і спальваць трупы забітых.

Тых, хто ў гэты момант трапляўся на вочы, расстрэльвалі. Так загінулі жыхары в. Пашкава Пракопенка, Аўсеенка і інш.

*«Сацыялістычная праца». 6 сакавіка 1945.*

## Таня

Яна была любіміцай у сям'і. Яе любілі жыхары вёскі Красніца. Любілі вучні Ялоўскай школы, дзе яна вучылася. Любілі за весялосць, за добрую ўсмешку на вуснах, за жывы і дапытлівы погляд карых вачэй. Тані Горскай было 15 гадоў. Яна была камсамолкай, горача любіла Радзіму. І калі ў родную вёску зайшлі немцы, Таня ведала, што ёй рабіць. Усе здольныя, моцныя людзі з яе вёскі ўсталі на барацьбу з ворагам. Усюды гаварылі аб народных мсціўцах. Моладзь пайшла ў партызанскія атрады. Пайшлі і браты Тані — Мікалай, Дзмітрый і Міхаіл. Хутка па іх слядах выршыла пайсці і Таня. Развіталася з роднымі. Ні бацька, ні маці не сказалі ёй: «Не хадзі, Таня». Бацька моўчкі пагладзіў светларусыя валасы дачкі, а маці заплакала...

Пасля таго як Таня пайшла, у дом уваліліся цэлай гурбой немцы і вытурхнулі з дому яе бацькоў. Яны крычалі: «Мы ведаем, дзе твая дачка! Яна партызанка!»

Старыя пайшлі мыкаць сваё гора па чужых хатах...

Аднойчы Таня зайшла праведаць сваіх і была арыштавана. Турма. Здзекі. Зняволеных пагрузілі на поезд для адпраўкі ў Германію. Таня збегла з поезда. І зноў родны партызанскі атрад. І зноў гарачая работа. І новы арышт. Фашысцкі звер быў узлаваны няўдачамі на фронце і ярасным націскам партызан. «Дзе партызаны?» — з пенай на губах дапытваліся нямецкія жандары. Таня маўчала...

Пры першым допыце 60 разоў гумовы нямецкі бізун прайшоўся па кволаму целу дзяўчыны. Таня маўчала. Звяры ў нямецкіх мундзірах калолі цела Тані шылам, палілі распаленым жалезам, білі дзяўчынку палкамі: «Дзе партызаны?» Таня маўчала.

Дзяўчыне адрэзалі вушы, рэзалі грудзі: «Дзе партызаны?» Таня стагнала ад невыноснай болі, крычала нечалавечым крыкам, але з яе вуснаў не зляцела ніводнага слова. Семнаццацігадовая камсамолка аказалася мацней жалеза, якім крамсалі яе цела, вышэй пакут і смерці. Закатаваную, але яшчэ жывую дзяўчыну кінулі ў яму і засыпалі зямлёй.

У чэрвені 1944 г. родная вёска Тані была вызвалена ад нямецкіх забойцаў.

Ева Феафанаўна — маці Тані, вызваленая Чырвонай Арміяй з канцэнтрацыйнага лагера, знайшла сваю дачку ў глыбокай яме ў лесе. Дрыжачымі рукамі зняла зямлю з дарагога твару. Яна не плакала. Пры вялікім горы звычайна не плачуць...

22 ліпеня Таню пахавалі на могілках ля роднай вёскі. Пахавалі па-ваеннаму, як партызанку, як гераіню. Па баках магілы стаялі партызаны і воіны Чырвонай Арміі. Палкоўнік заклікаў байцоў да помсты. А потым прагрымеў салют у гонар маленькай гераіні...

*І. Шклярэўскі*

*«Сацыялістычная праца». 8 студзеня 1945.*

## Мы горка плакалі...

У вёсцы Шапчыцы стаяў нямецкі штаб. Кожную раніцу немцы палявалі на людзей. Усіх жыхароў выганялі на вуліцу пад халодны асенні дождж, выстрайвалі ў шарэнгу і пачынаўся адбор. Людзей выбіралі, як жывёлу. Вымяралі, абмацвалі, глядзелі ў зубы. Маладых адпраўлялі ў Германію. Старых і падлеткаў скарыстоўвалі на цяжкіх работах па рамонту дарог і пабудове бункераў.

Прымушалі працаваць ад цёмнага да цёмнага. Людзей падганялі прыкладамі, нярэдка пускалі ў ход бізуны. Мяне і маіх падруг-аднавясковак вызначылі да адпраўкі ў Германію. Мы пачалі хавацца па розных схованішчах. Аднойчы ноччу нас злавілі. Гэта было сцюдзёнай зімой. Нас пасадзілі ў скрынку, зробленую ў выглядзе клеткі. Скрыню выставілі сярод вуліцы. Больш за суткі мы прастаялі ў гэтай клетцы, лёгка апранутыя. Мароз сціскаў сэрца, карчанелі ногі. А немцы хадзілі вакол клеткі і дзіка рагаталі.

А мы горка плакалі...

Праз суткі нас выпусцілі з клеткі і заперлі ў зямлянку. Але ноччу мы разабралі столь і ўцяклі ў лес.

*Е. Самусёва*

*«Сацыялістычная праца». 5 снежня 1944.*

## Павіннасць

Аднойчы да нас у хату зайшоў паліцай. Ён прынёс з воласці паперу: кожны мужчына нашай сям'і павінен быў нарыхтаваць па сем кубаметраў дроў. Даводзіўся сціслы тэрмін нарыхтоўкі. Указваўся нават участак леса за восем кіламетраў — в. Падгор'е. Адбылася сямейная нарада: што рабіць? «Трэба ісці, — сказаў бацька. — Літасці не будзе». І раніцай, паснедаўшы, мы адправіліся ў лес. Ішлі па глыбокаму снегу восем (магчыма і больш) кіламетраў. Ад зморанасці адчувалася вяласць, апатыя да ўсяго. Балелі рукі, ногі. Хацелася аднаго — кінуцца на снег і ляжаць нерухома.

Пачалі рэзаць лес. На трэці дзень з гушчару да нас выйшлі два чалавекі. Яны размаўлялі са старэйшымі. Я прыблізіўся і пачуў словы бацькі: «Будуць біць — вытрымаем». Гэта былі партызаны. Пасля сустрэчы з імі мы некалькі дзён не хадзілі на нарыхтоўку дроў. На пяты дзень з'явіліся чатыры паліцаі. Яны прыехалі на двух санях. Відаць, ляснік напісаў у воласць, што мы спынілі работу. Я ў гэты час быў у суседняй хаце, дзе сабралася вясковая моладзь. Праз акно ўбачыў паліцаяў. Усе хуценька пачалі разыходзіцца па дамах. Пабег і я. Убачыўшы мяне на парозе ў вайсковым шынялі (другога адзення ў мяне не было), паліцай зароў на бацьку: «А гэта хто?». «Сын».

Кат падскочыў і моцна рвануў за каўнер шыняля. Я ледзь не паваліўся. Адарваны ласкут боўтаўся ў мяне на плячах. «Бальшавіцкая морда! — закрычаў ён. — На работу! У лес!»

Назаўтра раніцой мы зноў ішлі па дровы...

Гэтая працоўная павіннасць станавілася ўсё больш цяжкай. Па загаду валаснай управы паліцаі збіралі па 10—12 падвод-саней з вёскі і суправаджалі вераніцу ў Магілёў. За сімуляцыю страшэнна білі. На падводах людзі везлі торф з торфазавода, які размяшчаўся каля в. Бароўка, цераз Лупалаўскі аэрадром. Тут размяшчаўся лагер для ваеннапалонных. У час паездак мы многа жудаснага наглядзеліся з жыцця чырвонаармейцаў у нямецкай няволі...

Кожны дзень прыносіў новыя жудасныя чуткі. Людзей забіралі баранаваць дарогі, на аўтарамонтны завод, увозілі ў Германію, гналі з коньмі ў Смаленскую вобласць будаваць аэрадром, бралі ў нейкія падводы. Гэта ўсё называлася працоўнай павіннасцю, якую мы павінны былі паслухмяна выконваць — без ропату і пратэсту. Усякая незадаволенасць лічылася сабатажам, а гэта не падабалася ні акупацыйнай уладзе, ні карнікам.

*В. Гузаў*

## Агонь па жывых мішэнях

...28 верасня 1941 г. Дзень прайшоў адносна спакойна. Але пакой і цішыня неяк насцярожвалі. Прадчувалася нешта нядобрае. Адразу ж як толькі пачало цямнець, людзі клаліся спаць, не запальваючы святла. Чуйна спала ў тую ноч вёска Дашкаўка...

У 3 гадзіны раніцы сон быў парушаны гулам цягніка, незвычайным стукам колаў. Цягнік рабіў прыпынкі на перагонах і зноў рухаўся далей. Тое, што прыпынкі рабіліся на перагонах, насцярожвала людзей. Многія выйшлі на вуліцу і ўбачылі, як па гародах рухаўся ланцуг фашыстаў. Чуўся брэх аўчарак.

Як потым стала вядома, 150 карнікаў наляцелі з боку Быхава. Цягнік тройчы рабіў прыпынкі: на Боўшаўскім, Лежнёўскім пераездах і непадалёку ад станцыі Дашкаўка. Тут высадзіліся групы, якія акружылі вёску. Як толькі пачало днець, карнікі і паліцаі пачалі выганяць жыхароў з хат. Чуліся крыкі, плач жанчын і дзяцей. Мужчын аддзялілі і пагналі да царквы. Там іх сартавалі на дзве калоны. Адну пасля нядоўгай цырымоніі разагналі, а групу ў 52 чалавекі акружылі шчыльным колам. То былі камуністы, камсамольцы, чырвонаармейцы, якія не змаглі прабрацца да сваіх, ці параненыя не маглі ісці з адыходзячымі часцямі Чырвонай Арміі. Некалькіх мужчын з гэтай групы прымусілі збіраць па хатах рыдлёўкі. Калі яны вярнуліся, усіх пастроілі ў калону і павялі да жывёлагадоўчай лячэбніцы. Адтуль, загадаўшы распрануцца, пагналі ў невялікі гай. Людзей паставілі каля ям і адкрылі агонь...

Многія жыхары Дашкаўкі чулі стрэлы, крыкі і стогны параненых, але падысці да лесу было немагчыма: карнікі паставілі там вартавых. Толькі вечарам фашысты пакінулі вёску. Некалькі дашкаўчан пайшлі на месца расстрэлу і ўбачылі жудасную карціну: многія былі закапаны ў ямы параненымі і зямля час ад часу калыхалася...

Ахвярамі гэтай расправы сталі камуніст, былы афіцэр Чырвонай Арміі Сцяпан Стасевіч, яго цесць Парфірый Бараноўскі — удзельнік рэвалюцыйных выступленняў 1905 г., Андрэй Бондараў, Міхаіл Дваранчук і інш.

Прайшлі гады, але зберагаюць дашкаўчане памяць аб сваіх загінуўшых земляках. Магілы дагледжаны, у кветках. 29 верасня ідуць людзі на могілкі, дзе на гранітнай пліце выбіты словы: «Тут пахаваны мірныя жыхары вёскі Дашкаўка, па-зверску расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі 29 верасня 1941 года».

*В. Мартынкоў*

## Жыве ў душы тая Туманаўка...

Каля вёскі Сялец Магілёўскага раёна ёсць помнік, звязаны з падзеямі Айчыннай вайны. Стаіць ён непадалёку ад дарогі, якая выходзіць з вёскі Туманаўка да лесу. Непрыкметны з выгляду помнік агароджаны кустамі, бярозамі і ліпамі.

«Спыніся, прахожы! — напісана на пліце, — ушануй памяць 38 зажыва спаленых, закатаваных і расстраляных мірных савецкіх жыхароў: жанчын, старых і дзяцей вёскі Туманаўка. Тут квітнеючая вёска была сцерта з твару зямлі фашыстамі ў бяссільнай злосці перад стойкасцю і мужнасцю савецкіх людзей».

Мы, студэнты палітэхнікума, даведаліся, што да вайны было дзве Туманаўкі, але адну з іх спалілі фашысты, і вырашылі ісці ў паход на месца тых далёкіх і горкіх падзей.

Недалёка ад уцалелай Туманаўкі сустрэлі з поўнымі вёдрамі вады пажылую жанчыну і запыталі ў яе пра тую іншую Туманаўку.

— Так, яе спалілі, жывымі спалілі і людзей,— казала Антаніна Уладзіміраўна Грышанкова.— Як гэта здарылася, многія старыя памятаюць, і наш ляснік можа расказаць — Вашкевіч Мікалай Емяльянавіч. У Красніцы Яніна Іванаўна Бегунова жыве, у Сяльцы — Вікторыя Іванаўна Радзькова, а ў Чарназёмаўцы — Ржэуцкі Станіслаў Іванавіч. Вы іх спытайце...

Станіслава Іванавіча Ржэуцкага мы засталі, калі ён збіраўся ў госці. Даведаўшыся, з якой прычыны мы да яго завіталі, нікуды не пайшоў.

— Даўно гэта было, а як быццам учора,— пачаў Станіслаў Іванавіч, і твар яго пахмурнеў.— На двары стаяў снежань 1943 года. Тыя, хто заставаўся ў вёсцы, падтрымлівалі сувязь з партызанамі. У нас стаяла тэхнічная часць гітлераўцаў. Каб мы не збеглі ў лес, фашысты зрабілі падворны перапіс і час ад часу правяралі: ці ўсе на месцы. Як у турме. Папярэдзілі: калі каго не далічацца, расстраляюць усю сям'ю. І вось аднойчы ад партызанаў мы атрымалі заданне ўзяць «языка». Валя Падольская, сувязная, аб'явіла быццам у яе дзень нараджэння, а яе сяброўка Надзя Нядзвецкая, настаўніца, прывяла ў госці гітлераўца. На імяніны, значыць. У доме ж была засада. Тут мы яго і ўзялі, але без шума не абыйшлося. Акружылі нас, закідалі хату гранатамі. Мы ў адказ таксама стралялі. Потым усё сціхла. Мой сябар Васіль кажа: «Ухадзіць трэба...»

Валю паранілі, дзеда забілі... Зараз на месцы гэтага дома помнік стаіць з



Абеліск у в. Туманаўка

надпісам: «15 снежня 1943 года тут загінулі Падольскі Ягор Станіслававіч — 1890 года нараджэння, Падольская Праскоўя Іванаўна — 1905 года нараджэння, Падольская Валянціна Ягораўна — 1922 года нараджэння, Міхайлік Дзіяна Ягораўна, 1940 года нараджэння».

Станіслаў Іванавіч перавёў дыханне.

— Раніцой усе даведаліся, што «языка» партызаны ўзялі. Многія з вёскі пайшлі ў лес. А некаторыя і зас-

таліся. Прыйшлі немцы, прайшліся па хатах, паглядзелі, што амаль нікога няма, і пайшлі. Усё ціха, спакойна. На наступны дзень усе вярнуліся дамоў. А немцы тут як тут. І пачалося. Спалілі ўсіх — прама ў хатах... Да аднаго. Нас у сям'і было 12 — адзін я застаўся. Калі немцы пайшлі, сабраў усіх сваіх па костачках. Вось тады ўпершыню не захацелася жыць... Колькі гадоў прайшло! А душа баліць. Толькі ў Туманаўцы і жыў я. Усё галоўнае там згарэла...

Ад Туманаўкі, яе квітнеючых садоў засталіся чорныя папялішчы...

*Л. Бакланава*

*«Магілёўская праўда». 27 ліпеня 1989.*

## Успамінаюць жыхары в. Дубінка

**Цітоў Мікалаў Харытонавіч:**

— Байцы 121-га партызанскага атрада Асмана Касаева, што базіраваўся непадалёку, у любы час маглі знайсці прыстанішча ў Дубінцы. Для іх жыхары збіралі зброю, медыкаменты, лячылі параненых.

Аднойчы раніцой у вёску прыбыў атрад з Княжыцкага гарнізона. Быў аддадзены загад: усім мужчынам збірацца ў Германію. На катаргу, думалі мы, і кожны з трывогай чакаў, што будзе з тымі адзінаццацю хлопцамі-партызанамі, што засталіся на ноч ў нашых хатах.

Вось падышоў фашыст да першай. Адчыняе дзверы. І раптам — моцны ўдар. Ад нечаканасці гітлеравец паваліўся. Гэта дванаццацігадовы партызан Паўлік кінуўся насустрач і адкрыў стральбу з аўтамата. Адразу ж за ім пачалі страляць і астатнія. Шум, крыкі на вуліцах. Фашыстам здалося, што тут вялікі партызанскі атрад. Яны кінуліся да падвод, захапілі з сабой сваіх забітых, параненых. Мы ж адправіліся ў лес да партызан.

**Сямёнава Ганна Іосіфаўна:**

— Дубінка лічылася партызанскай вёскай. У наш дом нярэдка заходзілі партызаны. Сам Асман Касаеў бываў. Ішоў 1943 год. Рыхтаваўся прарыў блакады. Мы ўсёй сям'ёй пайшлі ў суседнюю в. Журавец да сваякоў. І там даведаліся, што блакаду прарвалі. У другой палавіне дня ў Журавец панаехала многа фашыстаў і паліцаяў. Усіх сагналі ў адзін двор і сказалі: калі хоць адзін стрэл пачуецца з лесу, лічыце, што вы мёртвыя. Прайшла гадзіна, пяць. Цішыня. Мы не верым сваім вушам. Няўжо бяда мінула? Аднак не...

Раніцой 18 лютага 1943 г. над Дубінкай узнялося полымя. Гарэлі дамы. Людзей выганялі на вуліцу і па спісу выводзілі ўсіх падазроных. Вывелі 16-гадовую Ніну Філімонаву: яе бацька быў на фронце, а дзядзька — партызанскі камісар. Прывязалі дзяўчыну да каня і пусцілі па калгаснаму замерзламу полю. Так загінула Ніна Філімонава... Астатніх дзяцей, жанчын і старых сагналі ў дзве пуні і спалілі...

Зноў **Мікалай Харытонавіч Цітоў:**

— Памятаю гэты дзень... Атрад адступіў у глыбіню леса. На краю засталіся дазорныя і я з імі. Тут і ўбачылі, як успыхнулі дамы і адна пуня. Спачатку не зразумелі, у чым справа. А калі разабраліся, гарэла другая пуня. Здалёк было бачна, як хтосьці спрабаваў выбегчы з пуні, яго зноў кідалі ў агонь. Выбег яшчэ нехта, бліжэй, бліжэй да лесу. Пазнаў: Вера Кавалёва, суседка. Раптам Вера ўпала, а фашысты стралялі па ёй, ужо па мёртвай. Потым падбеглі і кінулі на Веру салому, падпалілі, каб гарэла, як у пуні...

## Я помсціла за ўсіх забітых...

Гэта было ў яркі сонечны дзень 15 верасня 1943 г. Жыхары в. Гараны спяшаліся ўбраць ураджай і захаваць яго ад немцаў. Людзі радасна прыслухоўваліся да кананады, якая грымела на ўсходзе: гэта быў голас савецкіх гармат. Набліжалася доўгачаканае вызваленне.

І раптам пачуўся грукат аўтамашын.

— Немцы! Ратуйцеся! — панеслася па дварах.

Але ратавацца было позна. Фашысты ў момант акружылі вёску і пачалі дзікую расправу.

Яны сагналі ўсіх ў адзін натоўп. Пачалі падпальваць гумны з хлебам, нашы родныя хацінкі. Загрымелі першыя стрэлы, палілася першая кроў...

Дзесяткі маіх землякоў і зямлячак ужо мёртвымі вачыма глядзелі ў блакітнае вераснёўскае неба. Дайшла чаргa і да маёй сям'і. Чатыры немцы ўварваліся ў наш дом, выгналі ўсіх на вуліцу. Майго брата Уладзіміра забілі на маіх вачах. Яму было 18 гадоў. Паміраючы, ён сказаў: «Бывай, родная беларуская зямля. Смерць гадам!».

Надыходзіў апошні, самы страшны акт трагедыі. Застаўшыхся ў жывых людзей склалі ў кучу, як дровы ў скірду, і пачалі страляць у яе з кулямётаў, аўтаматаў, пісталетаў. З-пад гэтага складзенага з чалавечых цел кургана цяклі ручаі крыві... У ліку гэтых ахвяр была і я. Ляжала я побач з маці і братам Мішам. Маці была ўжо мёртвая, і я адчувала, як халадзела яе цела. Міша быў паранены ў шчаку. Ён толькі ціха



Абеліск у в. Гараны

застагнаў: «Сястрычка...» Яго голас заціхаў, слабеў, а хутка і зусім заціх.

А нямецкія звяругі тым часам пацяшаліся стралянінай па безабаронных людзях. Яны прывезлі некалькі вазоў саломы, накінулі яе на нас, запалілі. Пад пакрыццём дыма выпаўзла я з вялікай брацкай магілы. Адпаўзла ў бок...

*М. Жогава*

*«Сацыялістычная праца». 9 верасня 1944.*

## Загінуў ён сумленным чалавекам

На пачатак Вялікай Айчыннай вайны мне было 15 гадоў, і я нараўне з дарослымі рабіў у калгасе, які да вайны насіў імя Сталіна. Старшынёй яго ў той час працаваў камуніст Давыд Войнер. У чэрвені 1941 г. па рашэнню

раённай улады калгас павінен быў эвакуіраваць грамадскую жывёлу ў бяспечнае месца. Сярод добраахвотнікаў-пагоншчыкаў быў і сам старшыня калгаса. Калі стала вядома, што вайна зацягваецца і да нас сталі даходзіць чуткі пра жорсткасць, якую ўчынялі фашысцкія каты над сем'ямі яўрэяў, Войнер рашыў вярнуцца дадому, каб забраць сям'ю. Разумеючы стан яго душы, мы яму не пярэчылі і пажадалі хутчэй вярнуцца назад. Калгасную жывёлу дагналі мы да Манастыршчыны, што ў Смаленскай вобласці, але далей дарогу адрэзаў фашысцкі дэсант, і мы вымушаны былі вярнуцца.

Чуткі пра асаблівую жорсткасць акупантаў да яўрэяў спраўдзіліся. Давыда Войнера схапілі разам з яго сям'ёй. Катавалі. Але загінуў камуніст Войнер сумленным чалавекам, перанёс усе пакуты, не здрадзіў ні сабе, ні Айчыне.

Добра ведаў я Войнера, як чалавека шчырага, добразычлівага, выдатнага арганізатара і кіраўніка. Такім яго запомнілі і іншыя калгаснікі даваенных гадоў, жыхары нашай вёскі Масток.

*А. Волкаў*

## Нізкі паклон вам, жыхары Агееўкі

У 1941 г. непадалёку ад беларускага горада Чавусы 411-ы полк 110-ай стралковай дывізіі, у якой ваяваў наш бацька, трапіў у акружэнне. Нягледзячы на пераўзыходзячыя сілы ворага, байцы пайшлі на прарыў. У гэтым баі і быў цяжка паранены наш бацька. Асколак міны трапіў яму ў нагу. Разам з некалькімі цяжкапараненымі яго пакінулі ў адной з вёсак. А назаўтра тут ужо гаспадарылі немцы. Фашысты звезлі параненых у жывёлагадоўчае памяшканне в. Сухары, адтуль праз нейкі час у шпіталь для ваеннапалонных, што размяшчаўся ў Магілёве. У гэтым шпіталі байцы, знясіленыя ад ран, паміралі ад голаду, бо іх амаль не кармілі. Праз пяць месяцаў, як потым расказваў бацька, ад ваеннапалонных засталіся толькі скура ды косці. Па хадайніцтву ўрача шпіталя Цішчанкі іх, непрыгодных да службы, развезлі па навакольных вёсках.

Так, дзякуючы догляду жыхароў в. Агееўка Мастоцкага сельсавета наш бацька застаўся жывым. У Агееўцы ён жыў да прыходу Чырвонай Арміі. У канцы 1944 г. бацька вярнуўся дадому ў г. Серпухаў Маскоўскай вобласці і пражыў паўнацэннае жыццё, можна сказаць, падоранае яму жыхарамі беларускай вёскі Агееўка. Вырасціў дзвюх дачок, сына.

Бацькі зараз ужо няма, але мы, яго дзеці і ўнукі, вельмі ўдзячны беларускім людзям за клопат і ўвагу да бацькі ў ліхую ваенную гадзіну. Шчыры паклон вам, жыхары Агееўкі!

*Лідзія Храмава, Вольга Храмава*

## Гарэла зямля пад нагамі захопнікаў

### Ад маленькіх атрадаў —да партызанскіх брыгад і злучэнняў

Ішоў другі месяц вайны. Фашысты ўжо захапілі Гродна (23 чэрвеня), Мінск (28 чэрвеня), імкліва рухаліся ў Магілёўскім напрамку да р. Беразіны. Фронт набліжаўся да Магілёва. Не выключалася магчымасць яго акупацыі. Часу заставалася мала, але ён пакуль быў, і неабходна было праду-

маць, спланаваць падпольную барацьбу з ворагам, вылучыць лідэраў, якія б змаглі арганізаваць і павесці за сабой людзей. Ніякага сумневу не было, што трагедыя гэта — часовая...

З 25 чэрвеня па 3 ліпеня 1941 г. у Магілёве знаходзіліся ЦК КП(б)Б і СНК БССР. За кароткі тэрмін імі і Магілёўскім абкомам партыі для барацьбы з ворагам на акупіраванай тэрыторыі былі створаны 78 груп і атрадаў, у якія ўваходзілі 2369 чалавек.

Для кіраўніцтва падполлем, у тым ліку і камсамольскім, павінны былі застацца сакратары гаркома партыі А. І. Марозаў, І. Л. Хаўкін і сакратар гаркома ЛКСМБ П. Ф. Валожын.

1 ліпеня 1941 г. у лесе каля Магілёва сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка правёў нараду з партыйнымі і савецкімі работнікамі, якім прадстаяла застацца ў варожым тыле для разгортвання падпольнай і партызанскай барацьбы. На нарадзе прысутнічалі Маршалы Савецкага Саюза К. Я. Варашылаў і Б. М. Шапашнікаў.

Але не ўсё задуманае здзейснілася... Да 26 ліпеня працягвалася абарона Магілёва, да таго ж 15 ліпеня былі акупіраваны Чавусы. Магілёў апынуўся ў акружэнні, і многія з тых, хто павінен быў застацца на нелегальным становішчы, загінулі ў баях. У першыя дні акупацыі фашысты арыштавалі і адправілі ў канцлагер А. І. Марозава і І. Л. Хаўкіна. П. Ф. Валожын пайшоў у Мінскую вобласць.

Пасля акупацыі Магілёва ў Шчажарскім лесе засталася для разведкі чэкісцкая група К. С. Прыбыля. Але яна не мела радыёстанцыі і ў верасні 1941 г., узарваўшы з дапамогай падпольшчыкаў склад гаручага на ўскрайку Магілёва, пайшла прабірацца за лінію фронту ў тыл.

Знішчальны атрад сельскага раёна ўдзельнічаў разам з падраздзяленнямі 477-га стралковага палка 172-ой стралковай дывізіі ў цяжкіх абарончых баях



П. Ф. Валожын

і не змог перайсці да партызанскай барацьбы. Загінулі сакратары райкома партыі Ф. А. Жураў, Ш. І. Ягудзін, многія байцы.

Але становішча не было безнадзейным. Тыя, хто застаўся ў жывых, разам з загадчыкам ваеннага аддзела РК КП(б)Б І. М. Івановым ноччу пераплылі Дняпро і хаваліся ў горадзе. 28 ліпеня група Іванова выбралася ў лес і сваю партызанскую дзейнасць пачала з устанаўлення сувязі з мясцовым насельніцтвам, збору зброі. Восенню да групы Іванова далучылася невялікая група (3 чал.) ваеннаслужачых са старшым сяржантам М. Д. Зубковым. Сумесна яны правялі першыя ў раёне аперацыі: на чыгунцы Магілёў — Асіповічы разабралі рэйкі і пусцілі пад адхон паравоз і тры вагоны. Гэтай жа групай былі спалены масты на р. Сянна ў вёсках Вендараж і Карчомка, а таксама мост на р. Лахва ў Дабрасневічах.

З сярэдзіны ліпеня 1941 г. з-пад Ліды рухалася ў Магілёўскім напрамку група акружэнцаў. Ёй належала адыграць вялікую ролю ў развіцці партызанскага руху ў Магілёўскім і Бялыніцкім раёнах. Ідучы на ўсход, воіны рабілі засады на адзіночныя фашысцкія аўтамашыны, накоплівалі вопыт партызанскай вайны. У групу ўваходзілі старшы лейтэнант К. М. Белавусаў, лейтэнант В. І. Хорсаў, малодшы лейтэнант М. У. Абрамаў, малодшы палітрук М. І. Кавешнікаў. У жніўні

да іх далучыліся лейтэнант А. М. Касаеў і старшына І. Ф. Хазаў. Да верасня 1941 г. за кошт прымкнуўшых акружэнцаў-ваеннаслужачых група Белавусава вырасла да 11 чалавек. Партызаны ўстанавілі сувязь з насельніцтвам навакольных вёсак, якое дапамагала ім прадуктамі і аддзеннем, вяло разведку, здабыла радыёпрыёмнік. Гэтая група разабрала 4 масты на шашы Магілёў—Мінск, зрабіла некалькі засад. Найбольш буйная з іх была засада ў пачатку жніўня паміж вёскамі Пільшычы (Бялыніцкі р-н) і Гарадзішча (Магілёўскі р-н). Нечаканым агнём партызаны знішчылі 2 аўтамашыны, забілі 25 нямецкіх салдат і афіцэраў, захапілі 4 аўтаматы, пісталет і 15 вінтовак. У адказ на гэта з Бялынічаў прыбыў карны атрад. Фашысты расстралялі ў в. Пільшычы па даносу здраднікаў звыш 30 жыхароў — настаўнікаў, членаў праўлення калгаса, камуністаў і камсамольцаў.

Карнікі ўжо ведалі пра партызан Белавусава. Яны праследавалі групу. У адной з перастрэлак быў цяжка паранены партызан М. І. Кавешнікаў. Не змог выратаваць яго доктар Дашкевіч з в. Вендараж, і гэта была першая страта ў групе Белавусава.

Восенню 1941 г. у Магілёўскім і Бялыніцкім раёнах з'яўляецца яшчэ адна партызанская група — група Авяр'янава. Яна была створана ў жніўні 1941 г. у Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці таксама з ваеннаслужачых (5 чалавек). Узначальваў яе ваенінжынер 2-га рангу М. Д. Авяр'янаў. У верасні група размясцілася каля в. Барок і ўстанавіла сувязь з групай Белавусава.

У кастрычніку, баючыся цяжкасцей зімы, група Белавусава вырашыла прабіцца за лінію фронта. Перад адыходам партызаны знішчылі абсталяванне маслазавода ў в. Вендараж і легкавую аўтамашыну з афіцэрамі на шашы Магілёў—Бабруйск. Група дайшла да в. Гіжэнка Слаўгарадскага раёна, але там сустрэлася з карнікамі і павярнула назад. Шашу Магілёў—Гомель прыйшлося пераадольваць з боем. У канцы кастрычніка партызаны вярнуліся ў Вугальшчынскі лес.

Зіма 1941/42 г. была вельмі цяжкай для партызан. Групы былі яшчэ малакалькасныя, не мелі вопыту. Да таго ж немцы ўжо стварылі ўправы і паліцыю, для барацьбы з партызанамі вылучаліся карныя атрады. Так, у в. Барок была акружана група Авяр'янава. З боем яна перайшла ва Усакінскі лес (мяжа Клічаўскага і Бялыніцкага р-наў). Некалькі разоў карнікі блакіравалі групу Белавусава. У адным з баёў у сярэдзіне 1942 г. загінуў партызан В. І. Хорсаў. Толькі дапамога мірнага насельніцтва выратоўвала партызан ад разгрома, давала магчымасць выжыць у цяжкіх зімовых умовах.

З падыходам вясны партызанскі рух у раёне ўжо сфарміраваўся, набыў вопыт барацьбы. 10 сакавіка 1942 г. у групе Белавусава адбыўся першы партыйны сход: з 14 партызанаў 8 былі камуністамі. Сакратаром партарганізацыі абралі В. Ц. Някрасава. Сход вырашыў актывізаваць барацьбу з гітлераўцамі, пашырыць работу сярод насельніцтва для папаўнення атрада. Камандзірам застаўся К. М. Белавусаў. 3 мая 1942 г. у атрадзе, які значна вырас, абралі камісара і начальніка штаба. Камісарам стаў З. П. Гапонаў, начальнікам штаба — В. Ц. Някрасаў.

У сярэдзіне сакавіка партызаны Белавусава разграмілі паліцыю ў в. Вуглы. Вугальшчынскі лес ужо стаў малы для размяшчэння атрада, і 20 сакавіка 1942 г. партызаны перайшлі ў Сіпайлаўскі лес (Бялыніцкі р-н). На месцы застаўся М. І. Абрамаў, які да сярэдзіны красавіка стварыў новую групу (7 чал.). Для яе ўмацавання з атрада Белавусава сюды пераходзяць партызаны Касаеў і Мацярэнка. У маі група Абрамава вырасла да 18 чалавек і аформілася ў атрад (камандзір

М. І. Абрамаў, камісар А. М. Касаеў, начальнік штаба Н. Ф. Шчакалюкоў).

Такім чынам, да лета 1942 г. на мяжы Бялыніцкага і Магілёўскага раёнаў акрамя атрадаў Белавусава і Абрамава дзейнічалі яшчэ тры групы: М. А. Авяр'янава, І. М. Іванова і старшага лейтэнанта І. З. Камарова. Дзве апошнія ўлетку 1942 г. аб'ядналіся ў атрад (камандзір І. З. Камароў, камісар І. М. Іваноў, начальнік штаба Драздоў). У выніку дзейнасці партызан поўдзень Бялыніцкага раёна і частка Гарадзішчанскага і Вялікабялевіцкага сельсаветаў выйшлі з-пад кантролю акупантаў.

Ад 3 да 16 мая 1942 г. фашысты з артылерыяй і танкамі з боку Бялынічаў, Магілёва, Чачэвічаў праводзілі буйную карную экспедыцыю. Да зыходу 3 мая карнікі блакіравалі трохвугольнік Цяхцін – Гарадзішча – Куты, але атрады фарсіравалі р. Друць і да пачатку наступлення выйшлі ў Сіпайлаўскі лес, а потым, разгрупаваўшыся, хаваліся ў балотах. Такая тактыка сябе апраўдала. Фашыстам не ўдалося навязаць партызанам баі. Карная аперацыя правалілася.

Тым часам у раёне пачынае дзейнічаць партыйна-камсамольскае падполле, якое было створана Магілёўскім абкомам партыі. Вясной 1942 г. каля 40 падпольных груп (больш за 400 чалавек) аб'ядналіся ў арганізацыю «Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі». Некаторыя члены «Камітэта» ўжо былі звязаны з партызанамі раёна. Вялікую ролю ў станаўленні падполля і стварэнні «Камітэта садзейнічання Чырвонай Арміі» адыграла газета «За Родину» (з восені 1942 г. – «За советскую Родину»).

У сакавіку 1942 г. «Камітэт» пачынае наладжваць сувязь, а ў чэрвені пасылае сваіх падпольшчыкаў у партызанскія атрады. Трывалая сувязь была ўстаноўлена праз Я. Я. Слёзкіну (в. Навасёлкі), камуніста І. Я. Буякова (в. Гуслішчы), Н. І. Піцукову (в. Гарадзішча). Праз іх «Камітэт» забяспечваў партызан разведінфармацыяй, зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі, соллю і наогул прадуктамі, адзеннем; пасылаў з горада папаўненне; адпраўляў да партызан падпольшчыкаў; праводзіў дыверсіі па загаду камандавання атрадаў.

У чэрвені партызаны разграмілі гарнізон у в. Аксенькавічы Бялыніцкага раёна. 16 чэрвеня для засады на партызан з гарнізона в. Калічэнка выйшла нямецкае падраздзяленне (36 афіцэраў і салдат). Каля п. Будзённы Магілёўскага раёна іх сустрэла частка (23 чал.) атрада Белавусава, што знаходзілася ў запасным лагеры каля в. Вялікія Бялевічы. Партызаны ўступілі ў бой, на дапамогу падышлі атрад Абрамава і група Авяр'янава. Немцы былі поўнасцю разгромлены. Народным мсціўцам дасталіся 2 кулямёты, 1 аўтамат, 28 вінтовак, 5 пісталетаў. Прыйшоўшаму на наступны дзень на месца боя карнаму атраду засталося толькі забраць сваіх забітых. Гэты бой яшчэ больш падняў прыстыж партызан. Многія паліцэйскія гарнізоны баяліся з імі сутыкацца. Так, у канцы чэрвеня гарнізон в. Пясчанка, даведаўшыся пра набліжэнне атрада Белавусава, разбегся без боя.

## Стварэнне Клічаўскага аператыўнага цэнтра

У ліпені 1942 г. адбылася важная падзея ў жыцці партызан Магілёўскага і Бялыніцкага раёнаў. З атрада В. П. Свістунова прыйшла група партызан. Яны расказалі, што ў Клічаўскім раёне створана партызанскае злучэнне, што яно мае радыёсувязь з савецкім тылам. Камандзіры атрадаў выехалі на сустрэчу з камандзірам злучэння палкоўнікам У. І. Нічыпаровi-

чам. Атрады ўвайшлі ў склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра. Атрад Белавусава стаў называцца атрад № 113; атрад Абрамава — № 121; група Авяр'янава пераўтварылася ў атрад № 600 (камандзір М. Д. Авяр'янаў, камісар І. П. Станкевіч, начальнік штаба А. М. Шалдаеў).

Цяпер уся баявая дзейнасць атрадаў падпарадкоўвалася Клічаўскаму цэнтру, які ажыццяўляў арганізацыйнае і аператыўнае кіраўніцтва. У склад Цэнтра (ці злучэння) уваходзіла 10 партызанскіх брыгад (43 атрады), якія налічвалі 6,5 тыс. чалавек.

У чэрвені — жніўні 1942 г. нямецкае камандаванне вырашыла правесці шэраг карных аперацый супраць атрадаў Клічаўскага аператыўнага цэнтра, якія дзейнічалі на тэрыторыі Магілёўскага раёна. Ад шашы Бялынічы — Беразіно наступалі два варожыя батальёны і 102-і атрад 286-ай ахоўнай дывізіі. У трохвугольніку Магілёў — Бялынічы — Чачэвічы — два батальёны 2-га паліцэйскага палка.

113-ы атрад на гэты час меў 65 байцоў, адзін батальён і адзін ротны мінамёт, 2 станкавыя і 5 ручных кулямётаў, саракапяціміліметровыя гарматы, 10 аўтаматаў, 45 вінтовак. 600-ы атрад налічваў 45 партызан, адзін батальённы мінамёт, 5 ручных кулямётаў, аўтаматы і вінтоўкі. 121-ы — 25 байцоў, 3 ручныя кулямёты, 4 аўтаматы, 18 вінтовак. Спыніць буйную экспедыцыю такімі сіламі было нельга, але пры выгадных умовах можна было і даць бой.

1 ліпеня буйныя нямецкія сілы пачалі акружаць лясы, у якіх размяшчаліся атрады, але партызаны без бою паатрадна выйшлі з раёна блакады.

121-ы нават у гэтых умовах знаходзіў магчымасць змагацца. У в. Вендараж партызаны разграмілі маслазавод і МТС; 27 ліпеня — паліцыю ў в. Пясчанка. 27 ліпеня па даносу былога паліцэйскага, што быў у атрадзе, немцы (каля 100 чал.) акружылі партызан у лесе каля в. Шчэгліца. У няроўным баі і ў час прарыву 7 партызан загінулі, 4 былі паранены. Загінуў камандзір атрада М. І. Абрамаў. Камандаванне прыняў А. М. Касаеў. Ён вывеў атрад да в. Дабрасневічы.

У канцы ліпеня 1942 г. з Быхаўскага раёна пасля баёў з карнікамі ў Сіпайлаўскі лес прыйшоў 425-ы атрад (камандзір М. П. Куракін, камісар К. Л. Адасёў, начальнік штаба Ф. Ф. Сукаў), у якім было каля 40 чалавек.

У жніўні перад партызанамі паўстала задача — не даць фашыстам забраць ураджай у зоне дзейнасці атрадаў. У сярэдзіне жніўня менавіта з гэтай мэтай немцы з гарнізона ў в. Вендараж накіраваліся на Вялікія і Малыя Бялевічы. Але гітлераўцы не толькі не вывезлі адтуль ні кілаграма збожжа, але яшчэ і папоўнілі зброяй і боепрыпасамі 113-ы атрад. Партызаны спалілі 8 аўтамашын, захапілі 5 ручных кулямётаў, 5 аўтаматаў, 36 вінтовак, 6 тысяч патронаў. Пасля гэтага фашысты ўжо не рызыкавалі канфіскоўваць прадукты ў партызанскай зоне.

З канца жніўня атрады Магілёўскага раёна ўключыліся ў барацьбу з ворагам на чыгуначных камунікацыях. Першай выйшла група А. Я. Зарыцкага з 113-га атрада. У ноч на 28 жніўня на чыгунцы Жлобін — Магілёў яна спусціла пад адхон паравоз і 10 вагонаў. Трэба адзначыць, што да злучэння з Чырвонай Арміяй А. Я. Зарыцкі меў на асабовым рахунку 15 падарваных эшалонаў, за што быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

У пачатку восені атрады 113-ы, 121-ы, 600-ы, 425-ы, а таксама атрад І. З. Камарова разграмілі гарнізон у в. Падзевічы Бялыніцкага раёна. У баі загінулі Камароў і яго начальнік штаба Драздоў. Застаўшыеся байцы гэтага атрада ўвайшлі ў састаў 121-га. І. М. Іваноў стаў у ім камісарам.

Буйную аперацыю правялі магілёўскія партызаны ў лістападзе 1942 г. Яшчэ з вясны немцы спрабавалі аднавіць рух на чыгунцы Магілёў—Асіповічы. Для гэтага адбудоўвалі ўзарваныя масты. Найбольш буйным быў мост праз р. Друць. Яго ахоўваў добра ўмацаваны гарнізон. Партызаны праз падпольшчыцу М. М. Бабарчык устанавілі сувязь з афіцэрскай ротай дружыны Гіль-Радзіёнава (была сфармавана з савецкіх ваеннапалонных; у жніўні 1943 г. перайшла на бок партызан). У выніку рота павярнула зброю супраць немцаў, і 25 лістапада 113-ы, 121-ы, 425-ы, 600-ы атрады з дапамогай паўстаўшай роты разгрэмілі гарнізон і ўзарвалі мост. Да партызан перайшло 86 чалавек. У якасці трафеяў дасталіся 3 станкавыя і 12 ручных кулямётаў, 5 аўтаматаў, каля 100 вінтовак. Гітлераўцы так і не змаглі аднавіць рух на гэтым напрамку чыгункі.

На зіму партызаны размясцілі асноўныя лагеры ў Сіпайлаўскім лесе. Запасліся харчаваннем, нават адбудавалі баню.

Загадам Клічаўскага аператыўнага цэнтра 27 лістапада 1942 г. атрады 113-ы, 121-ы, 425-ы, 600-ы аб'ядналіся у 6-ую Магілёўскую брыгаду. Камандзірам быў прызначаны К. М. Белавусаў, камісарам — З. П. Гапонаў, начальнікам штаба — падпалкоўнік С. Г. Сідарэнка-Салдаценка. У студзені 1943 г. у брыгаду ўвайшоў і атрад «За Радзіму». У брыгадзе налічвалася амаль 500 чалавек; дзейнічала яна ў Бялыніцкім і Магілёўскім раёнах.

У ноч на 1 студзеня 1943 г. атрады 113-ы, 121-ы, 425-ы пад камандаваннем С. Г. Сідарэнкі-Салдаценкі без страт разграмілі буйны гарнізон у в. Вендараж, знішчылі 45 гітлераўцаў, захапілі 2 станкавыя і 2 ручныя кулямёты, каля 50 вінтовак.



І. П. Станкевіч

З пачатку 1943 г. пачынаецца другі этап падпольна-партызанскай барацьбы ў раёне. У 1943 г. па заданню падпольнага абкома КП(б)Б І. П. Станкевіч узначаліў падпольную работу ў Магілёўскім раёне. Быў створаны падпольны райком КП(б)Б. У лютым 1943 г. з дапамогай Магілёўскага падпольнага абкома камсамола быў створаны Магілёўскі падпольны райком ЛКСМБ.

У канцы 1942 — пачатку 1943 г. у брыгаду Белавусава ў сувязі з пагрозай арышта прыйшлі многія падпольшчыкі Магілёва, у тым ліку А. І. Шубадзёраў, В. А. Швагрынаў і інш. РК КП(б)Б вясной 1943 г. наладзіў выхад газеты «Партызанская праўда».

Усё гэта садзейнічала больш дакладнай арганізацыі падпольна-партызанскага руху ў раёне, каардынацыі работы груп і атрадаў.

## Магілёўскае партызанскае злучэнне

2 красавіка 1943 г. аднавіў сваю работу падпольны абком КП(б)Б. Ён стварыў і накіроўваў дзейнасць 18 падпольных райкомаў, у тым ліку і Магілёўскага.

Клічаўскі аператыўны цэнтр быў расфарміраваны і замест яго створана Магілёўскае абласное партызанскае злучэнне. Кіравала ім Ваенна-аператыўная група (ВАГ) пры абкоме партыі.

Была створана і раённая ваенна-аператыўная група — на базе 113-га, 121-га і асобнага 61-га атрадаў. Камандзірам яе быў прызначаны К. М. Белавусаў. Цяпер усе баявыя аперацыі, збор разведдадзеных на тэрыторыі Магілёўскага раёна ўзначальвала Магілёўская ВАГ. Партызанская дзейнасць накіроўвалася на знішчэнне ваенных, паліцэйскіх, ахоўных гарнізонаў ворага, парушэнне тэлефоннай і інш. сувязі, узрыў стратэгічна важных мастоў, чыгуначнай лініі і эшалонаў з ваеннай тэхнікай і войскам, разгром складаў і інш.

Час наступаў цяжкі. Гітлераўцы рыхтаваліся да шырокамаштабных карных аперацый. Так, на пачатак мая 1943 г. гітлераўскае камандаванне планавала правядзенне карных аперацый у Клічаўскім, Бялыніцкім, Магілёўскім і інш. раёнах. Для гэтага сканцэнтравала ў Бабруйску, Асіповічах, Магілёве і інш. 5 пяхотных палкоў, 2 матарызаваныя палкі, авіяцыю, артылерыйскі полк, шэраг іншых падраздзяленняў агульнай колькасцю да 45 тыс. салдат і афіцэраў. З мая варожыя калоны выступілі з Бялыніч, Быхава і Чачэвіч. Яны запаланілі населеныя пункты на заходнім беразе р. Друць, каб адрэзаць адыход 6-ай Магілёўскай брыгадзе, якая размяшчалася на ўсход ад ракі. У ноч на 4 мая ўсе атрады 6-ай брыгады, не чакаючы, пакуль карнікі створаць шчыльную абарону, фарсіравалі Друць і выйшлі на Усакінскія лясы, схаваўшы ў Сіпайлаўскім лесе гарматы, мінамёты і станкавыя кулямёты. У балотах заставаліся параненыя з абслугай і аховай.

Усакінскія лясы таксама былі блакіраваны. Прарыў у ноч на 6 мая разам з 5-ай Клічаўскай брыгадай праз р. Ольса закончыўся няўдала; камандаванне 6-ай брыгады вырашыла разбіць атрады на невялікія групы і вяртацца ў Сіпайлаўскі лес, які карнікі ўжо прачасалі. 6 мая нямецкая авіяцыя падпаліла лес. Партызаны прарываліся праз агонь. Становішча было цяжкае. З гарэлага лесу групы пападалі ў акружэнне карнікаў. Многія загінулі, у тым ліку камандзір 122-га атрада «За Радзіму» Ф. М. Тарасаў.

Блакада працягвалася да 18 мая. У другой палове мая рэшткі брыгады сабраліся ў Сіпайлаўскім лесе. Страты былі вялікія: каля 40 чалавек забіты, 18 — прапала без вестак, сярод іх — камісар атрада А. Я. Барбікаў, каля 100 параненых...

Партызаны адбудавалі разбураныя лагеры, і ўжо 27 мая на лініі Орша—Магілёў дыверсійная група 122-га атрада спусціла пад адхон эшалон з гарматамі, бронемашынамі, танкеткамі і салдатамі.

Актывізавалі сваю дзейнасць у пачатку лета дэсантныя групы. У маі 1943 г. аператыўнай групе А. І. Адзінцова стала вядома, што ў чэрвені для агітацыі фарміравання часцей «РВА» ў Магілёў прыляціць генерал Власаў. Вырашана было знішчыць здрадніка, для чаго ў асабняк, дзе ён павінен быў начаваць, служанка, звязаная з аператыўнай групай, у аўтамашыне бургамістра горада даставіла 4 магнітныя міны. У намечаны час у асабняку раздаўся выбух. Загінула ахова Власава і некалькі гестапаўцаў, сам ён выпадкова застаўся начаваць у Пашкаве.

Разведчыкі атрада І. Навумовіча выявілі, што каля Магілёва немцы стварылі вучэбны цэнтр па падрыхтоўцы танкавых экіпажаў. Там знаходзіліся 75 танкаў «Тыгр», «Пантэра», Т-IУ і каля дзвюх тысяч ваеннаслужачых вермахта. Гэта інфармацыя паступіла ў штаб Заходняга фронта, дзе было вырашана разбамбіць цэнтр. Група дэсантнікаў і байцоў 121-га атрада асвятляльнымі ракетамі паказвала савецкай авіяцыі знаходжанне аб'екта. У выніку было знішчана каля 50 танкаў, забіта і паранена больш 500 немцаў.

У красавіку—маі гітлераўцы раскрылі шэраг падпольных груп Магілёва. Быў арыштаваны і загінуў кіраўнік «Камітэта садзейнічання Чырвонай Арміі» П. І. Крысевіч. «Камітэт» перастаў існаваць. Уцалеўшыя і занава створаныя групы дзейнічалі цяпер самастойна, падтрымліваючы сувязь з партызанамі асобна адна ад другой. Гэта памяншала рызыку правалаў, але ў многіх выпадках уносіла паралелізм і неапраўданыя страты сіл. Магілёўскі падпольны абком партыі вырашыў ускласці кіраўніцтва падпольнай барацьбой на Магілёўскі падпольны РК КП(б)Б (сакратар І. П. Станкевіч).

У канцы ліпеня 1943 г. партызаны атрымалі загад на «рэйкавую вайну». Магілёўская і Бялыніцкая ВАГ павінны былі ў ноч правесці масавае знішчэнне рэек на чыгунцы Быхаў—Рагачоў. Для гэтага трэба было прайсці звыш 80 кіламетраў. Да месца дыверсіі першай выйшла разведка. 29 ліпеня 113-ы, 121-ы, 122-і і 600-ы атрады пад агульным камандаваннем Белавусава рушылі ў паход і 2 жніўня дасягнулі зыходных пазіцый. У прызначаны час партызаны атакавалі ахову чыгуначнага палатна, разбурылі 3 бункеры, знішчылі 3,6 км лініі сувязі, падарвалі 1031 рэйку. У баі загінулі тры партызаны.

Для аднаўлення чыгункі фашысты вырашылі зняць рэйкі на лініі Магілёў—Асіповічы. Для гэтага 7 жніўня з Магілёва на ст. Друць прыбыў бранянпоезд з нямецкай рабочай камандай. Каля в. Будоўля 113-ы атрад замініраваў чыгунку і зрабіў засаду. Бой ішоў 2 гадзіны. Партызаны разбілі паравоз, 3 браніраваныя вагоны, 9 платформ з рэйкамі, забілі 35 фашыстаў, захапілі 2 ручныя кулямёты, 3 аўтаматы і 15 вінтовак. У баі загінуў партызан П. В. Жукаў, двое былі паранены.

На тэрыторыі Магілёўскага раёна «рэйкавую вайну» вялі і іншыя партызанскія фарміраванні вобласці. Так, 980 рэек падарваў у ноч на 2 жніўня 208-ы атрад на чыгунцы Магілёў—Шклоў. У ноч на 9 жніўня 1-ая рота гэтага ж атрада на тым жа чыгуначным участку перабіла яшчэ 518 рэек; а 3-яя рота на чыгунцы каля в. Семукачы — 695 рэек.

У жніўні—кастрычніку 1943 г. атрады актыўна папаўняліся за кошт насельніцтва. Так, 113-ы атрад у ліпені налічваў 310 байцоў, а да пачатку лістапада — 750. Не хапала зброі. Але і не прымаць людзей было нельга: яны маглі быць вывезены ў Германію або знішчаны карнымі атрадамі. Толькі ў 1942—1943 гг. у Магілёўскім раёне фашысты спалілі поўнасцю або часткова больш за 20 вёсак, згубілі сотні жыхароў. З «бяззбройных» партызан ствараліся партызанскія рэзервы, якія разбіралі масты, перакопвалі дарогі. Так, у сярэдзіне кастрычніка на некалькі сутак была выведзена з карыстання шаша Магілёў—Мінск паміж вёскамі Княжыцы (Магілёўскі р-н) і Ермалавічы (Бялыніцкі р-н).

Добрае папаўненне атрымаў 61-ы атрад. У склад яго ўвайшла група Д. Ф. Вайстрова з 19-га атрада Быхаўскага раёна. Ва ўсходняй частцы Магілёўскага раёна з-за адсутнасці лясных масіваў і густой сеткі вайсковых і паліцэйскіх гарнізонаў падраздзяленні партызан не размяшчаліся. Сюды заходзілі групы для разведкі і дыверсіі.

У ноч на 11 верасня 1943 г. ВАГ пры падпольным Магілёўскім АК КП(б)Б распрацавала буйную аперацыю па адначасоваму разгрому 11 нямецкіх гарнізонаў. У аперацыі павінны былі браць удзел больш за 4 тыс. партызан. ВАГ пры Магілёўскім РК КП(б)Б дастаўся гарнізон у в. Дашкаўка. Непадалёк стаялі яшчэ некалькі гарнізонаў, праходзіла чыгунка і дарога Магілёў—Быхаў, шаша Магілёў—Бабруйск. Партызаны скрытна прайшлі па рэдкалессю каля 30 км, з боем

знішчылі бункер, пераадолелі чыгунку і разграмілі гарнізон. Акрамя гэтага, пашкодзілі на чыгунцы 125 рэек. У якасці трафееў захапілі 73 коней і 100 галоў рагатай жывёлы. Адыходзілі групамі, бо нямецкая авіяцыя імкнулася нанесці ўдар партызанам на маршы.

Не засталася без увагі і шаша Мінск – Магілёў. Час ад часу яе мініравалі. 19 верасня на шашу выйшлі ў засаду асобыя падраздзяленні ўсіх трох атрадаў — каля тысячы партызан. У выніку разграмілі аўтакалону, якая ішла з Беразіно, спалілі 6 аўтамашын і 2 захапілі. У баі вылучыліся А. Касаеў, А. Ільінскі, І. Іваноў, В. Матусевіч, І. Балуеў, П. Кулікоў і інш.

У канцы 1943 г. прайшлі некаторыя змяненні ў складзе ВАГ. У лістападзе колькасна вырасшы 121-ы атрад (камандзір А. М. Касаеў) быў разгорнуты ў 121-ы полк 3-батальённага складу. 8 студзеня 1944 г. палком стаў і 113-ы атрад (камандзір К. М. Белавусаў). 15 снежня 1943 г. з часткі (200 чал.) ВАГ фарміруецца 200-ы атрад (камандзір В. П. Дрожнікаў, камісар П. Я. Гаро, начальнік штаба М. В. Белакураў).

Чырвоная Армія набліжалася, і Магілёў станавіўся прыфрантавым горадам. Раён навадніўся рэгулярнымі часцямі вермахта; узмацнілася ахова перавозак на дарогах. Цяжэй станавілася біць акупантаў. Але і партызаны ўжо былі не тыя, што ў 1941 г. Яны значна выраслі колькасна, накапілі багаты вопыт партызанскай вайны. Кожны дзень, не даючы супакою ворагу, яны праводзілі дыверсіі, знішчалі невялікія яго падраздзяленні. У снежні 1943 г. раптоўнай атакай Магілёўская ВАГ разграміла гарнізон у в. Вендараж. Дзёрскую аперацыю здзейсніў 121-ы полк: пад выглядам немцаў і паліцэйскіх партызаны ліквідавалі гарнізон у в. Мяжысеткі на шашы Магілёў – Бабруйск. 9 студзеня батальён гэтага палка выбіў карнікаў з в. Пясчанка, якую фашысты спрабавалі спаліць разам з в. Жакоры. 24 студзеня 121-ы полк напаў на гарнізоны ў вёсках Галынец-1 і Галынец-2. Па дадзеных разведкі, у іх размяшчалася 120 немцаў і 120 салдат «Рускай народнай арміі». Да ночы 23 студзеня замест «народнікаў» у вёскі на адпачынак прыбылі падраздзяленні вермахта — каля 500 немцаў. Не ведаючы гэтага, партызаны пайшлі ў атаку. Каб не даць своечасова падысці варожаму падмацаванню, яны пашкодзілі чыгунку з боку Магілёва, знішчылі сувязь і абстралялі фашыстаў у п. Ямніцы. Пасля паўтарагадзіннага бою стала відавочна, што сіламі палка гарнізон не разграміць, і па сігналу камандзіра палка батальёны выйшлі з бою. Трапілі ў палон цяжка параненыя байцы Фаталеў, Васільеў, медсястра Еўдакіменка, якіх фашысты падверглі зверскім катаванням. Загінула 13 і было паранена 14 партызан. Значныя страты панёс і вораг: забіта і паранена было каля 200 салдат і афіцэраў, спалена 10 складоў, гараж з 18 аўтамашынамі і інш.

Нямецкае франтавое камандаванне вырашыла пакончыць з партызанамі. У канцы студзеня 1944 г. было сцягнута каля 40 тысяч салдат і афіцэраў для наступнай карнай аперацыі. Гэта была цяжкая блакада: у ёй удзельнічалі часці дзвюх рэгулярных дывізій з артылерыяй, танкамі, самалётамі; стаялі моцныя маразы, ляжаў глыбокі снег, і маршы праводзіліся па бездарожжы.

1 лютага фашысты выбілі 121-ы полк з вёсак Пясчанка, Хвашчаўка, Дубінка, Паддуб'е, Ямніца, Міхалёва, Карчэмка. Дзве апошнія былі спалены. 4 лютага карнікі з артылерыяй і танкамі ўварваліся ў партызанскую зону — гэта была разведка. Авіяцыя бамбіла наўздагад. 9 лютага праціўнік заняў вёскі на захад ад Друці. У ноч на 10 лютага раённая ВАГ (2300 чала-

век) выйшла за р. Друць і накіравалася на Усакінскія лясы. Пасля ўходу партызан карнікі падпалілі вёскі Дубінку і Навабеліцу.

Каб пазбегнуць акружэння, у ноч на 17 лютага Магілёўская ВАГ, 122-і полк «За Радзіму» разам з Бялыніцкай ВАГ рушылі ў Градзянскія лясы. Па бездарожжы за ноч партызаны не змаглі дайсці да лесу за в. Сяліба. Світанак застаў іх у чыстым полі. Тут атрады ВАГ падвергліся бамбардзіроўцы. Загінула 11 чалавек, смяротна быў паранены камандзір 121-га палка А. М. Касаеў. Замест яго камандзірам прызначылі А. А. Ільінскага (пазней палку прысвоена імя Касаева).

Двое сутак партызаны ў невялікім лесе каля в. Сяліба адбівалі асобныя групы карнікаў. Двое сутак бамбёжкі... Немцы сцягвалі сілы, і партызанскае камандаванне прыняло рашэнне — выходзіць з акружэння, але там, дзе іх не чакаюць: па адкрытаму полю праз р. Клява ў напрамку в. Пагост. І гэта ўдалося: без страт з абозам у моцныя маразы выйшлі ў Высакагорскія лясы. У канцы лютага партызаны вярнуліся ў прачасаныя Усакінскія лясы, а адтуль — на свае базы.

У сакавіку 1944 г. для барацьбы з партызанамі Магілёўскага і Бялыніцкага раёнаў прыбыў 61-ы полк 286-ай ахоўчай гітлераўскай дывізіі. Асобныя яго падраздзяленні рабілі засады для знішчэння невялікіх партызанскіх груп. 27—28 сакавіка нямецкія самалёты бамбілі партызанскія вёскі, у тым ліку Семукачы і Малыя Бялевічы. Да зыходу 28 сакавіка каля дзвюх тыс. варожай пяхоты пры падтрымцы танкаў і артылерыі захапілі шэраг вёсак, каб блакіраваць 121-ы, 122-і, 600-ы палкі, якія знаходзіліся на ўсход ад р. Друць, у раёне вёсак Вялікія і Малыя Бялевічы, Паддуб'е. Каб пазбегнуць страт, партызаны адышлі за Друць да в. Аксенькавічы. Ад злосці немцы рабавалі


А. М. Касаеў

сялян, адбіралі жывёлу, забіралі моладзь у Германію.

5 красавіка ў в. Гарадзішча прыбыў карны атрад да 400 гітлераўцаў. На досвітку наступнага дня 113-ы і 121-ы палкі атакавалі праціўніка, але выбіць з вёскі не змаглі. І ўсё ж гітлераўцы пакінулі Гарадзішча і больш не рызыкавалі з'яўляцца блізка ад размяшчэння партызанскіх лагераў.

У красавіку цяжка захварэў і быў перапраўлены за лінію фронту К. М. Белавусаў. Магілёўскую ВАГ пры падпольным РК КП(б)Б узначаліў З. П. Гапонаў. Пад яго кіраўніцтвам партызаны працягвалі актыўныя баявыя дзеянні. 9 мая 2-і батальён 113-га палка разграміў нямецкі гарнізон у в. Гуслішчы; 21 мая — гарнізон у в. Балонаў Сялец Быхаўскага раёна.

Вясной 1944 г. дзейнасць Магілёўскага падпольнага РК КП(б)Б і камандавання ВАГ у многім накіроўвалася на правядзенне пасяўной. Было відавочна, што ўраджай будзе збірацца ўжо на вызваленай тэрыторыі, таму засявалі як мага большую плошчу. ВАГ задзейнічала амаль усіх сваіх коней — каля 300. У першую чаргу дапамогу аказвалі сем'ям партызан, чырвонаармейцаў і ўдовам. Засеялі ў тую вясну звыш 5300 га.

Поспехі Чырвонай Арміі на фронце яскрава сведчылі аб хуткім вызваленні. Перад пачаткам наступальнай аперацыі «Баграціён» Магілёўская ВАГ па заданню БШПР і камандавання 2-га Беларускага фронту праводзіла

актыўную разведку ў раёне Магілёва. Каштоўныя звесткі збірала Магілёўскае падполле.

Буйную аперацыю правялі атрады Магілёўскай ВАГ у час апошняга этапа «рэйкавай вайны». Пры разбурэнні чыгункі Магілёў—Шклоў перад партызанамі 113-га, 121-га палкоў і 61-га атрада ставілася задача баявымі дзеяннямі пры падтрымцы армейскай авіяцыі скаваць рухомасць 60-ай матарызаванай нямецкай дывізіі. Сувязь з аэрадромамі 2-га Беларускага фронту ажыццяўляла група капітана Барысава. У ноч на 20 чэрвеня ВАГ павінна была разграміць штаб дывізіі ў ваенным гарадку і гарнізон у в. Ямніца, напасці на падраздзяленні ворага ў вёсках Галынец-1, Галынец-2 і Гуслішча, каб не даць ім прыйсці на дапамогу штабу дывізіі. З-за дрэннага надвор'я авіяцыя не змагла правесці бамбардзіроўку, і партызаны без падтрымкі павялі бой. 61-ы атрад атакаваў штаб у ваенным гарадку; 121-ы полк — падраздзяленні ў вёсках Галынец-1, Галынец-2 і Ямніца; 113-ы полк перакрыў шашу Магілёў—Бабруйск і напаў на гарнізон у в. Гуслішчы. На досвітку партызаны адышлі. І хоць разграміць гарнізоны не змаглі, асноўную задачу выканалі: дзеянні 60-ай нямецкай дывізіі былі скаваны.

28 чэрвеня 1944 г. Чырвоная Армія вызваліла горад Магілёў, а 30 чэрвеня, утрымаўшы пераправу праз Друць, магілёўская ваенна-аператыўная група ў складзе 113-га, 121-га палкоў і 61-га атрада агульнай колькасцю 2639 партызан злучылася з часцямі Чырвонай Арміі.

Не вярнуліся з баявых заданняў 320 байцоў, многа было параненых, хворых...

Вялікую ролю ў барацьбе атрадаў ВАГ адыграла мясцовае насельніцтва. Гэта яно карміла і апранала партызан, збірала для іх зброю, разведінфармацыю; за кошт яго папаўняліся атрады. Партызанамі з дапамогай насельніцтва было сабрана ў фонд абароны 150 тыс. рублёў, 30 тыс. рублёў аблігацыямі, каля 2 кг залатых і срэбраных рэчаў.

За мужнасць і гераізм многія магілёўскія партызаны і падпольшчыкі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а камандзіру 121-га палка А. М. Касаеву і ўдзельніку Магілёўскага падполля партызану 600-га атрада Л. Д. Лорчанку пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

*У. Бурачонак,*
*А. Ярохін*

## Арганізацыя падпольнай работы ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Падрыхтоўка да падпольнай барацьбы пачалася ў Магілёве яшчэ да акупацыі яго непрыяцелем. Але часу было вельмі недастаткова. Ужо ў час баёў пад Магілёвам абком, гарком, райкомы партыі пачалі падбіраць і рыхтаваць да падпольнай работы камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных актывістаў, ствараць падпольныя арганізацыі, намячаць явачныя кватэры і паролі.

Кіраўніцтва працэсам ажыццяўлялі сакратар ЦК КП(б)Б І. П. Ганенка і сакратар абкома КП(б)Б І. М. Макараў. Яны давалі ўказанні сакратарам райкомаў партыі заставацца ў тыле праціўніка, ствараць партызанскія атрады.

Акупацыя прыпыніла гэтую работу. Станаўленне падполля адбывалася ўжо ў абставінах барацьбы з захопнікамі, якія з першых дзён праявілі сваю жорсткасць і бязлітаснасць.

Па даручэнню ЦК КП(б)Б актыўную работу па арганізацыі падполля на Магілёўшчыне праводзіў з ліпеня 1942 г. Іосіф Мітрафанавіч Кардовіч. Менавіта пад яго кіраўніцтвам на тэрыторыі вобласці былі створаны падпольныя райкомы і ў красавіку 1943 г.— абласны камітэт КП(б)Б.

І. М. Кардовіч назначыў памочнікам па Магілёўскаму, Бялыніцкаму, Быхаўскаму, Круглянскаму і Шклоўскаму раёнам І. П. Станкевіча.

У сакавіку 1943 г. упаўнаважаны ЦК КП(б)Б зацвердзіў састаў Магілёўскага падпольнага райкома КП(б)Б. Часова выконваў абавязкі сакратара райкома І. С. Зычкоў, а ўжо 12 сакавіка на гэтай пасадзе быў зацверджаны В. І. Падаляка.

У ліпені 1943 г. была створана ваенна-аператыўная група пры Бялыніцкім райкоме КП(б)Б. І. Падаляку перавялі сакратаром Бялыніцкага падпольнага райкома партыі; сакратаром Магілёўскага падпольнага райкома абком зацвердзіў І. П. Станкевіча, вызваліўшы яго ад абавязкаў камісара 600-га партызанскага атрада.

Падпольны РК КП(б)Б спачатку базіраваўся ў партызанскім атрадзе № 113.

## Састаў падпольнага райкома КП(б)Б

**Сакратары:** *Зычкоў* Іван Самсонавіч (8.03.1943—12.03.1943, часова); *Падаляка* Васіль Іванавіч (12.03.1943—жнівень 1943); *Станкевіч* Іван Паўлавіч (жнівень 1943—30.06.1944).

**Члены райкома:** *Белавусаў* Канстанцін Міхайлавіч (8.03.1943—26.04.1944); *Някрасаў* Васіль Цімафеевіч (5.06.1943—31.08.1943); *Дубнеў* Іван Васілевіч (8.03.1943—2.05.1944); *Адасеў* Карп Лаўрэнавіч *(17.03.1943—26.04.1944); Зычкоў* Іван Самсонавіч *(12.03.1943—5.06.1943); Новікаў* Віктар Іванавіч *(30.06.1943—30.06.1944); Касаеў* Асман Мусаевіч *(31.08.1943—02.1944, загінуў); Гапонаў* Захар Платонавіч *(2.05.1944—30.06.1944); Гурыеў* Ілья Гаўрылавіч *(2.05.1944—30.06.1944); Іваноў* Іван Мартынавіч *(2.05.1944—30.06.1944); Пакатаеў* Мітрафан Васілевіч *(2.05.1944—30.06.1944).*

Друкаваным органам падпольнага РК КП(б)Б была газета «Партызанская праўда».

У в. Майшчына Семукацкага сельсавета на доме А. А. Стрыканава ў 1984 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. Менавіта ў гэтым доме з сакавіка 1943 па ліпень 1944 г. размяшчаліся штаб Магілёўскай ВАГ і Магілёўскі падпольны райком КП(б)Б.




Мемарыяльная дошка на доме ў в. Майшчына, дзе размяшчаліся Магілёўскі падпольны райком КП(б)Б і штаб ВАГ

*Падпольныя партыйныя органы КПБ у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.). Мн., 1975. С. 198—199*

*Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 1986. С. 292.*

## Магілёўскі падпольны райком ЛКСМБ

Магілёўскі падпольны райком ЛКСМБ у гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічаў з лютага 1943 г. па 30 чэрвеня 1944 г. пад кіраўніцтвам Магілёўскага падпольнага абкома ЛКСМБ. Праводзіў палітыка-выхаваўчую і арганізацыйную работу па далучэнню камсамольцаў і моладзі да барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

**Сакратар** райкома *В. І. Новікаў.*

**Члены райкома:** *М. Е. Кулікаў* (да 21.06.1943); *С. І. Маскалькоў, П. Л. Кулікаў* (з 21.06.1943); *Б. З. Сцяблінскі* (1.09–1.12.1943).

Асноўная база знаходзілася ў Магілёўскай ваенна-аператыўнай групе (Магілёўскі раён). Да стварэння падпольнага райкома камсамольскай работай у раёне кіравалі Магілёўскі падпольны абком ЛКСМБ (з жніўня 1942) і ўпаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па Магілёўскаму раёну (з снежня 1942).

*Магілёў: Энцыкл. давед. Мн., 1990. С. 278.*

## Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Магілёўскага раёна

**Магілёўская ваенна-аператыўная група (ВАГ).**

Створана ў ліпені 1943 г. у адпаведнасці з пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загадам Магілёўскай абласной ВАГ на базе 113-га і 121-га атрадаў 6-ай Магілёўскай брыгады і 61-га асобнага. Пры стварэнні аператыўнай групы кіраванне Магілёўскай брыгады было ліквідавана, а яе атрады ўключаны ў склад ВАГ самастойнымі баявымі адзінкамі.

У лістападзе 1943 г. па загаду Беларускага штаба партызанскага руху 121-ы атрад перватвораны ў 121-ы партызанскі полк (пазней 121-ы імя Асмана Касаева); у студзені 1944 г. — 113-ы атрад у 113-ы партызанскі полк. ВАГ дзейнічала ў Магілёўскім, Бялыніцкім, Клічаўскім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 30 чэрвеня 1944 г. у складзе двух палкоў і брыгады агульнай колькасцю 2639 партызан.

Кіраўнікамі ВАГ былі: **сакратар** падпольнага райкома КП(б)Б *Станкевіч* Іван Паўлавіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944); **камандзіры**: *Белавусаў* Канстанцін Міхайлавіч (ліпень 1943 — красавік 1944); *Гапонаў* Захар Платонавіч (май 1944 — чэрвень 1944). **Начальнікі штаба:** *Дрожнікаў* Васіль Пятровіч (ліпень 1943 — снежань 1943); в. а. *Немалаеў* Цімафей Іванавіч; *Конанаў* Васіль Сцяпанавіч (май 1944 — чэрвень 1944).

**6-ая Магілёўская брыгада.**

Створана ў лістападзе 1942 г. загадам Клічаўскага аператыўнага цэнтра на базе 113-га, 121-га, 425-га, 600-га асобных атрадаў.

У студзені 1943 г. у яе склад увайшоў асобны атрад «За Радзіму» (пазней — 121-і «За Радзіму»); у маі 1943 г. — атрад 760-ы імя М. Беразоўскага 5-ай Клічаўскай брыгады. У красавіку 1943 г. 425-ы атрад быў перададзены 11-ай Быхаўскай брыгадзе.

Брыгада дзейнічала ў Магілёўскім і Бялыніцкім раёнах. У ліпені 1943 г. у сувязі са стварэннем Магілёўскай раённай ВАГ брыгаду расфарміравалі.

Атрады 122-і «За Радзіму», 760-ы імя М. Беразоўскага і 600-ы былі пазней перададзены Бялыніцкай ВАГ; 133-і і 121-ы — Магілёўскай раённай ВАГ.

На дзень расфарміравання брыгада налічвала 1377 партызан.

**Камандзір** – *Белавусаў* Канстанцін Міхайлавіч (лістапад 1942 – ліпень 1943). **Камісар** – *Гапонаў* Захар Платонавіч (лістапад 1942 – ліпень 1943). **Начальнікі штаба:** *Сідарэнка-Салдаценка* Савелій Герасімавіч (лістапад 1942 – красавік 1943); *Фядотаў* Давыд Ільіч (красавік 1943 – ліпень 1943).

**113-ы партызанскі полк.**

Створаны ў студзені 1944 г.

У Бялыніцкім раёне ў ліпені 1941 г. пачала дзейнічаць партызанская група вайскоўцаў на чале з К. М. Белавусавым. Да сакавіка яна перарасла ў атрад, які да 21 ліпеня 1942 г. праводзіў баявыя аперацыі самастойна, потым увайшоў у склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра пад нумарам 113. 27 лістапада 1942 г. атрад уключаны ў 6-ую Магілёўскую брыгаду; у ліпені 1943 г. – асобным атрадам у Магілёўскую раённую ВАГ.

**Камандзір** атрада – *Белавусаў* Канстанцін Міхайлавіч (сакавік 1942 – студзень 1944). **Камісары:** *Гапонаў* Захар Платонавіч (май 1942 – жнівень 1943); *Канавалаў* Кандзід Фёдаравіч (жнівень 1943 – лістапад 1943). **Начальнікі штаба:** *Някрасаў* Васіль Цімафеевіч (май 1942 – красавік 1943); *Фядотаў* Давыд Ільіч (красавік 1943 – жнівень 1943); *Хазаў* Іван Фёдаравіч (кастрычнік 1943 – студзень 1944).

У адпаведнасці з пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загадам абласной ваенна-аператыўнай групы атрад у студзені 1944 г. пераўтвораны ў 113-ы полк, які складаўся з трох батальёнаў.

Полк дзейнічаў у Магілёўскім, Бялыніцкім, Клічаўскім і Быхаўскім раёнах. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 30 чэрвеня 1944 г. у складзе трох батальёнаў агульнай колькасцю 920 партызан.

**Камандзіры:** *Белавусаў* Канстанцін Міхайлавіч (студзень 1944 – красавік 1944); *Гапонаў* Захар Платонавіч (май 1944 – чэрвень 1944). **Камісар** – *Альховік* Дзмітрый Ягоравіч (студзень 1944 – чэрвень 1944). **Начальнік штаба** – *Хазаў* Іван Фёдаравіч (студзень 1944 – чэрвень 1944).

**1-ы батальён** створаны 8 студзеня 1944 г. з партызан 1-ай роты 113-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 207 партызан.

Камандзір – Сяргееў Уладзімір Арсеневіч (студзень 1944 – чэрвень 1944). Камісар – Кулікоў Пётр Лук'янавіч (студзень 1944 – чэрвень 1944). Начальнік штаба – Гарохаўскі




Абеліск партызанам 121-га партызанскага атрада ў в. Будзішча

Павел Мікітавіч (люты 1944 — чэрвень 1944).

**2-і батальён** створаны 8 студзеня 1944 г. з партызан 2-ой роты 113-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 229 партызан.

Камандзір батальёна Матусевіч Уладзімір Сямёнавіч (студзень 1944 — чэрвень 1944). Камісар — Спірыдонаў Уладзімір Сяргеевіч (студзень 1944 — чэрвень 1944).

**3-і батальён** створаны 8 студзеня 1944 г. з партызан 3-яй роты 113-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 220 партызан.

Камандзір — Фурсаў Іван Фёдаравіч (студзень 1944 — чэрвень 1944). Камісар — Кулікоўскі Павел Францавіч (студзень 1944 — чэрвень 1944). Начальнік штаба — Балажэнка Анатоль Антонавіч (студзень 1944 — чэрвень 1944).

**121-ы партызанскі полк імя А. М. Касаева.**

Створаны ў лістападзе 1943 г.

У красавіку 1942 г. у Бялыніцкім раёне з вайскоўцаў, якія трапілі ў акружэнне і не змаглі выйсці, стварылася група на чале з М. І. Абрамавым. У маі 1942 г. яна пераўтворана ў 121-ы атрад, які быў уключаны ў склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра. З 27 лістапада 1942 г. па чэрвень 1943 г. атрад уваходзіў у 6-ую Магілёўскую брыгаду, затым перададзены Магілёўскай раённай ВАГ.

**Камандзіры:** *Абрамаў* Міхаіл Ігнатавіч (май 1942 — ліпень 1942 г., загінуў); *Касаеў* Асман Мусаевіч (ліпень 1942 — лістапад 1943). **Камісары:** *Касаеў* Асман Мусаевіч (май 1942 — ліпень 1942); *Іваноў* Іван Мартынавіч (ліпень 1942 — чэрвень 1944). **Начальнікі штаба:** *Шчакалюкоў* Мікалай Фёдаравіч (май 1942 — студзень 1943); *Саўчанка* Мікалай Васілевіч (студзень 1943 — снежань 1943).

У адпаведнасці з пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загадам Магілёўскай абласной ВАГ у лістападзе 1943 г. атрад пераўтвораны ў 121-ы полк. Пры яго фарміраванні роты 121-га атрада пераўтвораны ў 1-ы, 2-і, 3-і батальёны. Камандзірам застаўся Касаеў.

18 лютага 1944 г. А. М. Касаеў загінуў, і ў сакавіку полк стаў называцца яго імем.

А. М. Касаеву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Полк падначальваўся Магілёўскай раённай ВАГ, дзейнічаў у Магілёўскім, Бялыніцкім і Быхаўскім раёнах. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 30 чэрвеня 1944 г. у складзе трох батальёнаў агульнай колькасцю 1149 партызан.

Пасля таго як загінуў А. М. Касаеў, **камандзірам** палка стаў *Ільінскі* Аляксандр Аляксеевіч (люты 1944 — чэрвень 1944). **Камісарам** — *Іваноў* Іван Мартынавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944). Са снежня 1943 па чэрвень 1944 г. **начальнікам штаба** быў *Гарусаў* Міхаіл Мікалаевіч.

**1-ы батальён** створаны 15 лістапада 1943 г. з партызан 1-ай роты 121-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 272 партызаны.

Камандзір — Жолабаў Аляксей Якаўлевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944). Камісар — Філімонаў Сямён Максімавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба: Конанаў Васіль Сцяпанавіч (лістапад 1943 — снежань 1943); Хмяльніцкі Андрэй Фёдаравіч (снежань 1943 — чэрвень 1944).

**2-і батальён** створаны 15 лістапада 1943 г. з партызан 2-ой роты. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 292 партызаны.

**Камандзіры**: Ларыёнаў Аляксей Прохаравіч (лістапад 1943—сакавік

1944); Шчокін Барыс Яўгенавіч (красавік 1944 — чэрвень 1944). Камісар — Езік Апанас Рыгоравіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944). Начальнік штаба: Бязмен Леанід Іванавіч (лістапад 1943 — снежань 1943); Саўчанка Мікалай Васілевіч (снежань 1943 — чэрвень 1944).

**3-і батальён** створаны 15 лістапада 1943 г. з партызан 3-яй роты. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 289 партызан.

Камандзір — Мулераў Піліп Якаўлевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944). Камісар — Салаўёў Пётр Еўдакімавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944). Начальнік штаба — Кузін Андрэй Мікалаевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

**61-ая брыгада.**

У ліпені 1941 г. на станцыі Мілое Клічаўскага раёна была створана партызанская група з вайскоўцаў, якія не вырваліся з варожага тылу, на чале з Р. К. Паўлавым. 22 мая 1942 г. група пераўтворана ў 61-ы атрад і ўключана ў склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра. 27 лістапада 1942 г. атрад перададзены 5-ай Клічаўскай брыгадзе. З 20 мая па ліпень 1943 г. праводзіў баявыя аперацыі самастойна, потым увайшоў у склад Магілёўскай раённай ВАГ.

Атрад дзейнічаў у Магілёўскім, Бялыніцкім і інш. раёнах. Загадам Беларускага штаба партызанскага руху з кастрычніка 1943 г. атрад быў вызначаны як 61-ая брыгада ў складзе трох атрадаў. Агульная колькасць партызан на дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі склала 568 чалавек.

**Камандзір** — *Паўлаў* Р. К. (май 1942 — чэрвень 1944). **Камісары:** *Кальчук* Ф. Ц. (май 1942 — чэрвень 1942); *Хачатран* А. А. (ліпень 1942 — сакавік 1943); *Гаро* П. Я. (сакавік 1943 — снежань 1943). **Начальнікі штаба:** *Цівін* Г. А. (чэрвень 1942 — лістапад 1942); *Белабародаў* В. П. (лістапад 1942 — люты 1943); *Міраповіч* М. Ф. (люты 1943 — чэрвень 1944).

**122-і партызанскі полк «За Радзіму» (Бялыніцкая ВАГ)**

Створаны ў кастрычніку 1943 г.

У маі 1942 г. адпаведна пастанове ЦК КП(б)Б у савецкім тыле з выпускнікоў «Асабовага беларускага збору» сфарміраваўся партызанскі атрад «За Радзіму». 6 чэрвеня 1942 г. ён перайшоў лінію фронту і ў верасні прыбыў у Бялыніцкі раён, дзе быў уключаны ў Клічаўскі аператыўны цэнтр. Са студзеня 1943 г. дзейнічаў у саставе 6-ай Магілёўскай брыгады. 17 красавіка 1943 г. загадам Магілёўскай абласной ВАГ атраду прысвоены нумар 122-і.

У ліпені 1943 г. перададзены Бялыніцкай ВАГ.

**Камандзіры** атрадаў: *Тарасаў* Фёдар Міхайлавіч (чэрвень 1942 — май 1943, загінуў); *Рагатка* Мікалай Мартынавіч (май 1943 — жнівень 1943, загінуў); *Лінскі* Антон Іванавіч (жнівень 1943 — кастрычнік 1943). **Камісары**: *Барбікаў* Аляксандр Якаўлевіч (чэрвень 1942 — май 1943, загінуў); *Кручынін* Мікалай Фёдаравіч (май 1943 — кастрычнік 1943). **Начальнікі штаба**: *Баранаў* Уладзімір Іванавіч (чэрвень 1942 — красавік 1943); *Рагатка* Мікалай Мартынавіч (красавік 1943 — май 1943); *Сікорскі* Павел Андрэевіч (май 1943 — кастрычнік 1943).

На падставе пастановы Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б ад 21 кастрычніка 1943 г. атрад разгорнуты ў 122-і партызанскі полк «За Радзіму» ў саставе 3 батальёнаў.

Полк дзейнічаў у Бялыніцкім, Шклоўскім, а таксама Магілёўскім раёнах. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 30 чэрвеня 1944 г. у колькасці 1133 партызан.

**Камандзір** — *Лінскі* Антон Іванавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

**Камісар** — *Кручынін* Мікалай Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944). **Начальнікі штаба:** *Сікорскі* Павел Андрэевіч (кастрычнік 1943 — лістапад 1943); *Салтаказін* Мікалай Аляксандравіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

**1-ы батальён**. Камандзіры: Баранаў В. І., Дадзіцкі Г. В. Камісар — Старасотнікаў А. Е. Начальнік штаба — Малько А. І.

**2-і батальён**. Камандзір — Чупрынскі Т. П. Камісар — Саўкін Я. А. Начальнікі штаба: Кашкароў С. І., Кавалёў І. С.

**3-і батальён.** Камандзір — Кашкан М. Р. Камісар — Марозаў Ф. Л. Начальнік штаба — Іваноў В. В.

**425-ы партызанскі полк (Быхаўская ВАГ)**

5 мая 1942 г. у Быхаўскім раёне пачала дзейнічаць група вайскоўцаў, якія не выйшлі з варожага тылу, пад камандаваннем Ф. Ф. Сухава. Значна вырасшая колькасна група ў чэрвені 1942 г. стала атрадам, які пад № 425 увайшоў у жніўні 1942 г. у састаў Клічаўскага аператыўнага цэнтра. Да 27 лістапада 1942 г. 425-ы атрад дзейнічаў самастойна, затым — у саставе 6-ай Магілёўскай брыгады.

З красавіка 1943 г. атрад увайшоў у 11-ую Быхаўскую брыгаду, затым у састаў Быхаўскай ВАГ. У кастрычніку 1943 г. атрад быў разгорнуты ў 425-ы партызанскі полк.

На тэрыторыі Магілёўскага раёна 425-ы дзейнічаў, калі яшчэ быў атрадам.

**Камандзіры** атрада: *Куракін* Н. Н., *Фядотаў* Д. І. **Камісары:** *Адасеў К. Л.*, *Ляўшынскі* Т. Г. **Начальнікі штаба**: *Сухаў* Ф. Ф., *Бабкоў* М. В., загінуў.

*Партызанскія фарміраванні Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941 — ліпень 1944). Мн., 1983. С. 320, 521, 538, 540, 549, 561.*

**З Загада № 43 па ваенна-аператыўнай групе пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б ад 23.09.43 г.**

...Отступая, враг еще более усиливает свой кровавый террор.

Во имя спасения мирного населения от зверского гитлеровского истребления, сохранения сел, деревень, городов и материальных ценностей

приказываю:

1. Командно-политическому составу ...проводить разъяснительную работу среди мирного населения — прятать все движимое имущество в лесах, зарывая его в землю, не давать ни грамма хлеба, ни фунта мяса, ни килограмма картошки врагу.

2. В момент надвигающейся опасности заставить население создать продовольственную базу и землянки в лесах и при случаях налета карателей убегать в лес и до их ухода скрываться там, ведя разведку наблюдением.

В целях организованного руководства населением подобрать из мирных жителей надежных руководителей, проинструктировать их. Обратить особое внимание на места укрытия, на оповещение населения, на организацию разведки, на маскировку при побеге в лес и в лесу, на обеспечение продовольствием.

...Открытыми боями не дать угона и истребления мирных жителей. ...Старикам и детям оказывать всемерную помощь в спасении.

Секретарям РК КП(б)Б, командно-политическому составу ...быть готовым возглавить командование всем народом, который открыто вступит на вооруженную борьбу, для этого предусмотреть развертывание отрядов в полки, бригады. Лучшим рапортом правительству будет тот, кто больше сохранит и выведет мирного населения из лап гитлеровского разбоя.

Секретарь Могилевского подпольного обкома КП(б)Б Мовчанский, командир ВОГ Солдатенко, начальник штаба отряда Георгиевский

*НАРБ, ф. 4227, воп. 1, спр. 1, л. 2.*

## Справаздача начальніка штаба партызанскай брыгады № 6 Магілёўскай вобласці С. Г. Салдаценка-Сідарэнкі аб разгроме варожага гарнізона ў в. Пашкава Магілёўскага раёна 11 лютага 1943 г.

...8 лютага 1943 г. праведзены падбор людзей, выключна з добраахвотнікаў, па 15 чалавек з кожнага атрада брыгады, а з атрада тав. Тарасава — 10 чалавек. Усяго 70 чалавек.

З гэтым саставам праведзены 4-гадзінныя заняткі на тэму «Бой унутры памяшкання»...

Атрад рухаўся да месца аперацыі па маршруту Пільшычы, Малыя Бялевічы, Хрыпялёва (вялікі прывал-днёўка ў Жураўцэ), у далейшым — Дубінка, Савасцянавічы, Казіміраўка.

Пачатак выступлення з лагера — 18 гадзін 8 лютага 1943 г.

У зыходнае становішча — лес паўднёва-ўсходней Пашкава — прыбылі ў 22.30 10 лютага 1943 г. Звязаліся праз агентурную разведку з групай байцоў і камандзіраў 53-га батальёна, якія даклалі аб тым, што 10—20 чалавек батальёна настроены на карысць партызан. Па майму загаду яны былі выкарыстаны для знішчэння аховы (часавых) і як праваднікі груп да пад'ездаў тых будынкаў, у якіх жылі немцы, бо планам прадугледжвалася знішчэнне ў першую чаргу немцаў і толькі потым, калі будуць аказваць групе партызан супраціўленне здраднікі 53-га батальёна, то знішчаць і іх.

Штурм і агнявы бой у памяшканнях пачаўся ў 0.55 11 лютага 1943 г. Раптоўнага нападзення не адбылося менавіта таму, што да нямецкага камандавання прыехалі госці з горада Магілёва, якія ў адным з пакояў у гэты момант п'янствавалі. Калі пачулі начны шорах (шум), то маёр Грот, немец, стаў асвятляць ліхтарыкам праз вакно двор, дзе знаходзілася група камандзіра ўзвода Немалаева, і спытаў пароль. Пароль быў «Корсіка».

Калі ён пераканаўся, што тут чужыя, падаў каманду «Трывога». У гэты момант маёр быў забіты, былі забіты і ўсе госці.

На працягу 4,5 гадзіны ішоў жорсткі бой. Партызаны адваёўвалі пакой за пакоем, захапілі і знішчылі ўпарта супраціўляўшыхся немцаў, якія вялі кулямётны, аўтаматны агонь скрозь дзверы і вокны. Амаль на ўсім працягу ішла гранатамётная дуэль.

Група партызан, якая дзейнічала ў казармах, дзе размяшчаліся роты 53-га батальёна, у першыя дзве гадзіны захапіла кулямёты з патроннымі стужкамі, правяла пад'ём асабовага саставу і поўнасцю абяззброіла яго. Зброю выдалі 20 чалавекам батальёна, якія былі яшчэ да разгрома настроены на карысць партызан. На іх была ўскладзена задача сачыць за асабовым саставам батальёна, каб ніхто не збег.

У 4.30 11 лютага пачала нясмела падыходзіць група СС з Пячэрска. Пры падыходзе яна была сустрэта кулямётным агнём нашай засады і затрымана да 5.00, пакуль ім не падыйшло падмацаванне, якое шырокім фронтам вяло наступленне, што прымусіла нас паскорыць адыход па зваротнаму маршруту...

Сілаю (70 чал.) 6-ай брыгады пад камандаваннем начальніка штаба брыгады падпалкоўніка Салдаценкі знішчаны ваенны гарнізон немцаў... Абяззброены і ўзяты ў палон 250 здраднікаў, гэта значыць поўнасцю 53-і батальён, акрамя тых, хто быў у камандзіроўцы...

Трафеі: узяты 3 станкавыя кулямёты, 4 ручныя кулямёты, 15 пісталетаў, 128 вінтовак, 8 тысяч розных патронаў, 11 коней, медыкаменты і шмат рознага.

Страцілі аднаго забітага, цяжка паранены адзін, сярэдняе раненне атрымалі 5 чалавек і лёгка параненых 4 чалавекі.

С. Г. Салдаценка, начштаба 6-ай брыгады

*НАРБ, ф. 4232, воп. 1, спр. 3, л. 40—41.*

## З Данясенння сакратару Магілёўскага падпольнага РК КП(б)Б Станкевічу (аб разгроме воінскага гарнізона ў в. Ямніца)

У ноч на 20.06.44 г. сіламі атрада ў саставе 1-ай, 3-яй рот ва ўзаемадзеянні з двума батальёнамі 121-га п. быў нанесены ўдар па гарнізону г. Ямніца.

...У ходзе боя роты прабраліся да дротавай агароджы і вялі кулямётна-аўтаматны агонь па казармам немцаў. Пры святле нямецкіх ракет 1-ая рота вяла огонь па немцам,

якія выбягалі з казармаў, а маладыя байцы Зычкоў і Вараб'ёў лапатай парушылі дротавую агароджу і ўжо на тэрыторыі гарадка вялі агонь па немцам.

Немцы, якія выбягалі з казарм, на хаду перагрупаваліся, заселі ў танкі і вуглавыя дзоты і адкрылі агонь па партызанах.

Камандзір 61-га атрада Паўлаў

*НАРБ, ф. 4227, воп. 1, спр. 1, л. 18.*

## Из отчета группы ГФП[1] № 723 о деятельности за январь 1943 года

Перевод с немецкого 26.01.43

В тюрьме СД[2] в Могилеве работающий там слесарь молотком убил охранника и открыл все камеры арестованных. Последние напали на охрану и обезоружили ее. Двое полицейских службы порядка были тяжело ранены; один из них скончался по дороге в лазарет, а второй умер после операции 27.12. Ефрейтор вермахта, который находился в этом же здании, был смертельно ранен выстрелом в шею. Число бежавших арестованных составляет 7 чел., но, возможно, много больше, так как бежавшие заключенные захватили с собой все регистрационные книги и тюремные документы. Бежавшие заключенные присоединились к бандам[3].

## Из отчета группы ГФП № 723 о деятельности за апрель 1943 года

Перевод с немецкого 26.04.43

Местная комендатура Могилева доставила в периферийную команду ГФП Могилева русских Терещенко Александра и Смирнова Юрия, которые изъявили желание вступить в национальную армию. В ходе их проверки было установлено, что речь идет о бандитах, которые получили задание вступить в национальную армию для проведения там разложенческой работы, а также для вербовки новых людей в банду. Подробных показаний о лицах, давших им задание, от них нельзя было добиться. Названные лица были расстреляны...

Местная комендатура Могилева передала периферийной команде ГФП в Могилеве арестованную по подозрению в связи с бандитами русскую Артюш Анну. Осенью прошлого года, не выписавшись, она выехала из Могилева, но время от времени снова стала появляться в городе. После первоначального вранья она вынуждена была сознаться, что работает на бандитов, в частности, имеет задание доставать для них оружие. По ходу следствия были арестованы русские Старовойтов Симон и Николай, которые поддерживали связь с Артюш и передали ей в обмен на продовольствие одну винтовку. Все трое отказались давать какие-либо показания об известных им связниках и лицах, давших им задание, и на основании приказа были расстреляны.

Комиссар тайной полевой полиции и начальник группы Робраде

## Из отчета за июль 1943 года

5-м эскадроном 600-го батальона в секретариат ГФП в Могилеве были доставлены 6 русских из бандитского района, которые подозревались в поддержке банд и

---

[1] ГФП (гехаймефельдпаліцай – ням., тайная палявая паліцыя) — выканаўчы орган ваеннай контрразведкі ў дзеючай арміі гітлераўскай Германіі. Займалася барацьбой супраць падполля і партызан. Група № 723 дзейнічала ў Магілёўскім, Аршанскім і інш. раёнах.

[2] СД (зіхерхайстдзінст — ням.) палітычная служба бяспекі нацыянал-сацыялісцкай партыі гітлераўскай Германіі . Ахоплівала ўсе сферы грамадскага і дзяржаўнага жыцця як у Германіі, так і ў захопленых краінах. На часова акупіраваных тэрыторыях былога Савецкага Саюза гэта фашысцкая арганізацыя кіравала масавым знішчэннем грамадзян, разграбленнем і спусташэннем гарадоў і вёсак.

[3] Каб дыскрэдытаваць партызанскі рух, гітлераўцы называлі партызан і падпольшчыкаў «бандытамі», а іхнія фарміраванні — «бандамі».

антинемецкой агитации. Во время обыска их домов был обнаружен станковый пулемет, а также антинемецкие пропагандистские материалы. Один из арестованных обвинялся также в уводе казаков в бандиты. 4 арестованных на основании собранных улик, свидетельских показаний, допросов и показаний возвратившегося от бандитов уведенного казака были изобличены в преступной деятельности и на основании приказа расстреляны.

### Из отчета за август 1943 года

10.08.1943 г. на бензоскладе «Бригитта» в Могилеве совершена диверсия. Ночью со стороны дороги в проволочном заграждении была проделана дыра и заложена взрывчатка в штабель из 50 бочек с бензином. Взрывом полностью уничтожены 6 бочек и 4 бочки повреждены. Потеряно примерно 1000 литров бензина. Бензин не вспыхнул.

Комиссар тайной полевой полиции и начальник группы Робраде

### Из отчета за сентябрь 1943 года

На рассвете 5.09.43 г. на электростанции в Могилеве произошли 2 взрыва. Командой секретариата в Могилеве установлено, что взрывами полностью разрушены подвесные дороги. Взрывы совершены минами замедленного действия, которые со знанием дела были заложены в приводные механизмы. Исходя из этого факта и того, что посторонний человек был бы замечен, следует предполагать, что преступника или преступников следует искать среди русских рабочих или охраны. Возникший в результате взрыва пожар был быстро потушен. Со времени взрыва город на длительное время оставлен без электроэнергии, тем более, что доставка запасных частей взамен выведенных из строя связана с большими трудностями. До восстановления электростанции город должен ориентироваться на электроснабжение через кабель с гомельской электростанции, а это требует усиленной охраны кабеля.

В ходе расследования, проведенного Могилевским секретариатом ГФП, был арестован один рабочий электростанции, который в ночь диверсии самовольно ушел с работы. Вследствие передачи дел группы 716 группе ГФП следствие по этому делу не закончено. Оно передано упомянутой группе.

12.09.43 г. секретариату ГФП в Могилеве сообщили о возникшем пожаре на вокзале в Могилеве. Проведенным расследованием установлено, что речь идет о диверсии. Пожаром уничтожено одно депо полностью, а второе сгорело частично. Проведенным расследованием во втором депо выяснено, что преступник поджег депо в нескольких местах, использовав для этой цели масло, масленые тряпки, стружки и т. п., а также порох... В диверсии подозревается работающий на железной дороге вагонный мастер, а также 5 семей, которые проживали на территории станции, а затем со всем своим скарбом бежали к бандитам. Следствие по делу ко времени передачи дел группе ГФП 716 не было закончено. Причиненный ущерб оценивается примерно в 100 000 марок.

Графундер комиссар полевой полиции и заместитель начальника группы
Квартирное расположение, 26.09.43

*НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 963, л. 10–11, 49–50, 70, 77, 130–131, 150, 175–176.*

*Дакументы выявіў і падрыхтаваў да друку*
*доктар гістарычных навук У. Лемяшонак*

### Справаздача кіраўніка групы Магілёўскай падпольнай арганізацыі «Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі» І. Г. Гурыева аб рабоце групы (лістапад 1941 — сакавік 1943)

10 жніўня 1944 г.

...Падпольшчыкі аказвалі вялікую дапамогу партызанскім атрадам зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі і каштоўнымі агентурнымі данымі. У выніку праведзенай растлумачальнай работы, асабліва ў лагерах ваеннапалонных, палонныя штодзённа ўцякалі ў партызанскія атрады...

13 сакавіка 1943 г. асноўныя кіруючыя кадры маёй групы, разбурыўшы агароджы і драцяныя загароды шпіталя, перабіўшы нямецкую ахову з 8 чалавек, у тым ліку двух афіцэраў (трох чалавек рускай аховы з палонных узялі з сабой), і ў складзе 42 чалавек з поўнай экіпіроўкай і боепрыпасамі, захапіўшы з сабой шмат медыкаментаў з перавязачным матэрыялам, пайшлі ў 121-ы партызанскі атрад.

З першых жа дзён у атрадзе падпольшчыкі паказалі сябе адважнымі народнымі мсціўцамі. Многія адразу былі вылучаны на кіруючыя і камандныя пасады і смела вялі ў бой свае падраздзяленні супраць нямецкіх захопнікаў.

9 лепшых падпольшчыкаў: Бойка, Еўдакіменка, Бурмістраў, Захаран, Зубовіч, Ралдугін, Ндарадзе, Мінчанка, Варанкоў палі смерцю мужных у баях з ворагамі нашай Радзімы...

Адважная медсястра Еўдакіменка ў баі пры разгроме нямецкага гарнізона ў в. Галынец Магілёўскага раёна 24 студзеня 1944 г. павяла за сабой байцоў, была цяжка паранена і трапіла ў рукі немцаў. Ёй прапанавалі аказаць медпапамогу, калі яна ўсё раскажа, але яна адмовілася. «Мне з вамі, нелюдзямі, няма пра што размаўляць, прыйдзе час і з вас саміх спытаюць за ўсё».

Так за Радзіму гінулі падпольшчыкі...

*НАРБ, ф. 4289, воп. 1, спр. 1, л. 203—205.*

### З Дакладной запіскі сакратара Магілёўскага падпольнага абкома ЛКСМБ Ф. М. Іванова ў ЦК ЛКСМБ

Не пазней 1 верасня 1943 г.

...Камсамольцы-падпольшчыкі Магілёўскага раёна ўзарвалі чыгунку на шляху Магілёў — раз'езд Семукачы, спыніўшы такім чынам рух цягнікоў на 5 гадзін.

*НАРБ, ф. 63, воп. 5, спр. 45, л. 41*

### З успамінаў Канстанціна Міхайлавіча Белавусава, былога камандзіра Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы

Вайна застала мяне на пасадзе начальніка штаба асобнага танкавага батальёна ў званні старшага лейтэнанта ў Лідзе. Першыя баі для нас склаліся вельмі драматычна. Мы іх вялі з пераўзыходзячымі сіламі ворага, несучы вялікія страты.

У пачатку ліпеня сорак першага ў складзе невялікай групы ваеннаслужачых прабіраліся на ўсход. Я трапіў у лясы, якія былі паблізу вёскі Хатушчына Бялыніцкага раёна. У групу ўваходзілі палітрук Мікалай Кавешнікаў, лейтэнант Віктар Хорсаў, малодшы лейтэнант Міхаіл Абрамаў, ваентэхнік Сямён Лагуцін, чырвонаармеец Іван Цітоў. Тут сустрэліся з некалькімі пагранічнікамі, якія адыходзілі з-пад Беластока. Як і мы, яны імкнуліся дагнаць адступаючы фронт, злучыцца са сваімі войскамі.

...Відаць, той факт, што нас стала больш, і тое, што... знайшлі многа зброі, пакінутай адступаючымі часцямі... прымусіў... не імкнуцца даганяць фронт... а тут, у тыле ворага, стварыць баявую групу.

На былым палігоне падабралі два станкавыя кулямёты, адзін батальённы і два ротныя мінамёты з дастатковай

колькасцю боепрыпасаў, многа лёгкай зброі. Усё гэта перабазіравалі ў глухія Угольшчынскія лясы, размешчаныя на правым беразе звілістай і глыбокай рэчкі Друць. Яна с таго часу надоўга стала партызанскай сястрой.

На першай жа нашай нарадзе ў агульных рысах абмеркавалі задачы групы на бліжэйшы перыяд. Акрамя збору зброі і боепрыпасаў вялікую ўвагу надзялілі ўстанаўленню сувязі з насельніцтвам навакольных вёсак, выяўленню рэзерваў для папаўнення атрада і, вядома, зрыву мерапрыемстваў нямецкіх улад.

...Восенню сорак першага ў нашы рады ўлілося нямала савецкіх ваеннаслужачых, якія групамі, а то і па аднаму, прабіраліся ад граніцы на ўсход у надзеі дайсці да лініі фронту. Так трапілі да нас камандзір батарэі 383-га палка 121-ай стралковай дывізіі лейтэнант Асман Касаеў, старшына таго ж палка Іван Хазаў, чырвонаармеец 628-га стралковага палка Фёдар Шагалін, пагранічнік Георгій Меднікаў і многія іншыя.

Вясна сорак другога азнаменавалася новым папаўненнем партызанскіх радоў. У наш 113-ы атрад, які арганізацыйна аформіўся да пачатку сакавіка 1942 г., прыйшлі Сідар Церахаў з вёскі Бялевічы, каму партызанскія дарогі былі вядомы яшчэ з грамадзянскай вайны, ваеннаслужачыя з акружэнцаў Цімафей Немалаеў, Васіль Някрасаў, Кірыл Мацярэнка і інш. Прыліў новых людзей хутка дазволіў, гаворачы тэрмінам пчаляроў, «аддзяліць рой».

Так з красавіка з'явіліся яшчэ два атрады, якія ўзначалілі нашы баявыя таварышы Міхаіл Абрамаў, Мікалай Авяр'янаў.

Дзейнічалі мы то сумесна, калі праводзілася буйная аперацыя, то ў адзіночку, калі бой так званага мясцовага значэння. У хуткім часе гэтыя атрады разграмілі валасныя ўправы і паліцэйскія ўчасткі ў вёсках Вялікія Бялевічы, Семукачы, Хрыпялёва, Аксенькавічы, Заполле і інш.

У канцы вясны 1942 г. у нас наладзілася сувязь з партызанамі 61-га атрада, якім камандаваў Рыгор Кузьміч Паўлаў. Атрад дзейнічаў паблізу чыгуначнай станцыі Мілое. А яшчэ праз нейкі час завязаліся кантакты і з партызанамі Клічаўскай зоны. Тады ж, дарэчы, усе атрады, якія дзейнічалі ў Бялыніцкім і Магілёўскім раёнах, згодна загаду камандзіра Клічаўскага аператыўнага цэнтра палкоўніка Уладзіміра Іванавіча Нічыпаровіча атрымалі свае нумары: наш атрад стаў называцца 113-ым, атрад Міхаіла Абрамава — 121-ым, а Мікалая Авяр'янава — 600-ым.

— Паколькі вы маеце агульную зону дзеянняў, — сказаў у гутарцы з намі Нічыпаровіч, — магчыма, што з цягам часу ўсе нашы атрады аб'яднаем у адну партызанскую брыгаду. Але гэта справа будучага, а пакуль трымайце паміж сабой цесную сувязь, сумесна задумвайце і ажыццяўляйце буйныя аперацыі.

Такім чынам, ужо з вясны 1942 г. вызначыўся той састаў атрадаў, якія праз паўгода аб'яднаюцца ў 6-ую Магілёўскую партызанскую брыгаду і правядуць нямала баёў.

...Вясной і летам 1943 г. фашысцкае камандаванне кінула супраць магілёўскіх партызан буйныя воінскія часці. Усё гарэла вакол, дым выядаў вочы. Адзіным месцам для выратавання былі балоты.

Пасля майскай блакады 1943 г. 6-ая партызанская брыгада недалічылася больш за 30 чалавек. Не стала камандзіра 122-га атрада лейтэнанта Ф. М. Тарасава, камісара гэтага ж атрада А. Я. Барбікова, сакратара партбюро В. І. Кудлова, камсамольца Васіля Восіпава, нашага партызанскага паэта Уладзіміра Сурнова, медсясцёр Надзеі Захаравай і Марыі Універсал, украінскага хлопца Антона Лушчэнка з Днястроўскай вобласці, татарына Іс-

з Дняпроўскай вобласці, татарына Іскандзера Іскакава, загінулі і іншыя любімцы нашай сям'і. Але фашысцкія карнікі не дасягнулі сваёй мэты — ім не ўдалося ліквідаваць партызанскія атрады на тэрыторыі правабярэжнай Магілёўшчыны (а майская блакада мела на ўвазе менавіта такую мэту). І як толькі рэгулярныя гітлераўскія часці адправіліся з гэтых месц на фронт, народныя мсціўцы аднавілі сваю баявую дзейнасць.

...У в. Дашкаўка акупанты арганізавалі штосьці накшталт буйной конефермы. Мы рашылі ліквідаваць яе, але дабрацца да Дашкаўкі аказалася не так проста — трэба было пераадолець дзве добра ахоўваемыя і даволі ажыўленыя магістралі: шашу і чыгунку Магілёў—Рагачоў.

Напярэдадні аперацыі ў партызанскі лагер прыбылі чатыры хлопцы-перабежчыкі з дашкаўскай гаспадаркі. Яны згадзіліся быць праваднікамі. У адну з цёмных начэй канца жніўня атрады 113-ы і 121-ы пайшлі на аперацыю. Шашу ўдалося перайсці без бою, але ахова чыгункі сустрэла нашых байцоў ружэйна-кулямётным агнём. Аднак мы здолелі хутка падавіць супраціўленне гітлераўцаў. Шлях да Дашкаўкі быў свабодны. А праз гадзіну—паўтары з вёскі да чыгункі ўжо імчала конніца. Гэта партызаны 113-га атрада — хто паспеў асядлаць каня, хто проста з іншым — вярталіся назад. Хутка прыбыў на ўмоўленае месца збору Асман Касаеў са сваімі байцамі, якія ў час аперацыі скоўвалі сілы дашкаўскага гарнізона. Захопленыя ў тую ноч каля сотні коней саслужылі партызанам добрую службу. Іх выкарыстоўвалі на работах не толькі ў партызанскім лагеры, але і размяркоўвалі сярод жыхароў вёсак нашай зоны ў час уборкі ўраджаю і сяўбы азімых.

...Насельніцтва зоны аказвала нам вялікую дапамогу. Прыкладаў таму многа. Жыхары вёсак Паддуб'е і Семукачы выбралі старастамі сваіх аднасяльчан — П. М. Несцяровіча і М. А. Воднева, у вёсцы Гарадзішча — І. Я. Іўчына. У самыя цяжкія дні, калі пасля блакады партызаны вярталіся на старыя месцы, Несцяровіч, Воднеў і Іўчын арганізавалі нам цёплую сустрэчу: з хлебам і іншымі прадуктамі харчавання, добраахвотна сабранымі ў падведамасных ім вёсках, накіравалі падводы ў лагер. Гэтыя таварышы з'яўляліся і нашымі сувязнымі.

У сакавіку 1943 г. І. Я. Іўчын, западозраны акупантамі ў сувязі з партызанамі, вымушаны быў пайсці ў 113-ы атрад, а П. М. Несцяровіч і М. А. Воднеў працягвалі выконваць нашы заданні, застаючыся ў сваіх вёсках аж да сустрэчы з Чырвонай Арміяй.

*Белавусаў К. Друць — сястра партызанская. Мн., 1981. С. 205—224.*

**З успамінаў Івана Мартынавіча Іванова, былога камісара 121-га палка імя Асмана Касаева**

Палком мы сталі ўжо ў 1943-ім. А ў 1942-ім былі невялікім атрадам. Першапачаткова ён стварыўся па ініцыятыве вайскоўцаў, якія папалі пасля абарончых баёў у акружэнне і не змаглі прарвацца да лініі фронту. Вельмі хутка мы зразумелі, што жыць, а тым больш што-небудзь рабіць у тыле ворага без сувязі з мясцовымі жыхарамі немагчыма. А тут яшчэ набліжаліся халады...

Першымі, з кім мы звязаліся, былі камсамольцы в. Масальшчына — Ф. В. Акулаў, В. І. Іваноў, В. П. Аляксейчыкаў. Яны дастаўлялі нам ежу, адзенне, вялі разведку, збіралі зброю, боепрыпасы. На ўскрайку в. Бялевічы жыла са сваёй маці калгасніца М. С. Ліпай. Яна ноччу прабіралася ў лес і ў дамоўленае месца прыносіла ежу, соль, тытунь, рамантавала наша адзенне.

Насельніцтва раёна пастаянна дапамагала нам. Многія добраахвотна ўступалі ў наш 121-ы партызанскі атрад. Напрыклад, з вёсак Дубінка, Карчомка, Міхалёва, Ямніца амаль усе мужчыны пайшлі ў партызаны. Толькі ў 121-ым шматнацыянальным палку было каля 400 мсціўцаў з жыхароў Магілёўскага раёна. З іх 250 загінулі ў партызанскай барацьбе і на франтах пасля злучэння народных мсціўцаў з часцямі Чырвонай Арміі ў 1944 г.

Па меры таго як раслі рады партызан, павялічвалася колькасць камуністаў і камсамольцаў. У 1942 г. у нашым атрадзе было нават выбрана партыйнае бюро на чале з Аляксеем Плошкіным, зацверджаны састаў рэдкалегіі газеты «Смела ў бой!». З-за адсутнасці паперы газета-партызанка выпускалася на яловай ці бярозавай кары. Але гэта ніколькі не змяншала яе значэнне. Газета дапамагала арганізацыі атрада, стварэнню добрага настрою ў партызан. З 1943 г. газета «Смела ў бой!» і партызанскі часопіс «Да бою гатовы» друкаваліся на нармальнай паперы машынкай. Рэдактарам газеты з 1943 г. быў адзін са старэйшых камуністаў Карп Лаўрэнцьевіч Адасеў. У партгрупах са снежня 1943 г. члены рэдкалегіі выпускалі «баявыя лісткі». Яны заклікалі партызан да барацьбы з ворагам. Самым актыўным рэдактарам такіх лісткоў быў Еўдакім Макаравіч Чмыхуноў. Да вайны ён быў намеснікам рэдактара раённай газеты. Смелы і рашучы быў гэты чалавек. На жаль, не дажыў да Перамогі... Не дажылі і многія з тых, каму прысвячаліся цёплыя радкі партызанскіх газет і лістовак. Але мы памятаем іх усіх пайменна...

**З успамінаў Леаніда Іванавіча Бязмена, былога начштаба 2-га батальёна 121-га партызанскага палка**

...Яшчэ жывыя ўспаміны аб жорсткім начным баі асманаўскага палка з атрадам карнікаў войск СС, які размяшчаўся ў вёсках Галынец-1 і Галынец-2. Баявая аперацыя была старанна распрацавана штабам палка, дэталёва прадумана і зацверджана самім Асманам.

Ноччу 24 студзеня 1944 г. партызаны, апранутыя ў маскхалаты, акружылі гарнізон і па камандзе Асмана Мусаевіча нечакана напалі на праціўніка. Асман, як заўсёды, быў наперадзе. У маскхалаце, толькі капюшон з папахі зняты. (Касаеў заўсёды злаваўся, калі яму лішні раз напаміналі аб небяспецы.) Адначасова з перадавымі групамі ён вёў прыцэльны агонь па фігурах, якія мітусіліся на фоне пажарышча.

— Таварыш камандзір, — прасіў я яго. — Адыдзіце направа, там добры акопчык, не вылазце...

— Зноў з парадамі! А сам куды лезеш? Наперад, хлопцы! Давід! Падшавялі ўзвод Шахалы, чаго топчацца на месцы? Жывей... Туды і назад! — кінуў ён праз плячо свайму ад'ютанту Давіду Давадзе.

Бой быў нялёгкі. Фрыцы спачатку адышлі ад раптоўнага ўдару, але потым адкрылі шквальны агонь... Сувязныя дакладваюць абстаноўку, аб нашых стратах, аб стратах ворага: гарань склад ГЗМ, гараж з аўтамашынамі, склад з харчаваннем. Асман дае каманду ўсё неабходнае забраць і вывезці ў лагер.

Бой працягваўся ўжо больш дзвюх гадзін. Касаеў паклікаў артылерыста старшага лейтэнанта Аўчарэнку.

— На адыход! Пару беглых па Ямніцкаму гарадку!

Там размяшчаліся танкі.

У гэтым баі загінулі смерцю храбрых Аляксандр Сцяпанавіч Прут, Мі-

калай Якаўлевіч Дабрапольскі, Віктар Канстанцінавіч Рауцкі, Кузьма Васілевіч Радэка, Мікалай Пятровіч Таптуноў, Уладзімір Іванавіч Васільеў, Леў Пятровіч Сухараў, Шахалы Асультан Фаталіеў, Леанід Мікалаевіч Кулькоў, Дзяніс Мацвеевіч Бульвачоў, Аркадзь Якаўлевіч Жыдц, Ілля Ягоравіч Краўцоў, Прохар Ігнатавіч Духовіч, Георгій Георгіевіч Варанкоў, Лізавета Фёдараўна Еўдакіменка.

Аднак дарагой цаной заплацілі за іх жыцці ворагі. 121-ы партызанскі полк знішчыў 180 фашысцкіх салдат і афіцэраў, спаліў склады, 19 аўтамашын. Было захоплена 2 мінамёты, 6 аўтаматаў, 55 вінтовак і іншыя трафеі.

Мы ведалі, што немцы будуць помсціць за дзёрзкі налёт і партызанам, і насельніцтву партызанскай зоны. Нашы падазрэнні спраўдзіліся. Аднойчы, ужо ў лютым, наляцелі самалёты і пачалі скідваць звязкі гранат. Асабліва цікавіла немцаў галава калоны і фігура з чырвонаверхай папахай.

— Асман! Бяжы направа, кладзіся ў кювет, — крычаў Кірыла Мацерынка і сам кінуўся ў кювет ад лятучай звязкі гранат.

...Так і запомніўся Асман — ва ўвесь рост на снежным палатне дарогі... Выбух... Ён захістаўся, схапіўся за кабуру, выцягнуў маўзер і... маруд-на споўз на заснежаную дарогу... Гэта здарылася 17 лютага 1944 года...

...Сцямнела. Немцы спынілі паветраныя атакі. Да нас прыехалі К. М. Белавусаў, І. П. Станкевіч, Р. К. Паўлаў. Правялі кароткую нараду. Вырашылі перайсці шашу Магілёў—Мінск і ісці на поўнач.

Асман Касаеў загінуў. Пахавалі яго 18 лютага 1944 г. часова на могілках в. Улессе Бялыніцкага раёна. Камандаванне палком прыняў А. Ільінскі.

**З данясенняў камандзіру і камісару 121-га партызанскага палка**

9.12.43 г. ...При отходе немцы жгут деревни, забирают имущество граждан. ...Свозят все в Княжицы, упаковывают в ящики для отправки в Германию. ...Угоняют скот в Княжицы.

12.12.43 г. ...В Казимировке все мужское население от 14 до 65 лет немцы увели...

14.12.43 г. ...В Казимировке были убиты партизанами три немца. Карательный отряд собрал все население, приказали выкопать яму. Мужчин постреляли (до 30 чел.), а женщин заставили закапывать.

Немцы приехали в д. Сеньково, забрали молодежь и увезли в неизвестном направлении.

14.12.43 г. ...Группа немцев 25—30 человек вывели мужское население деревень Бруски, Барсуки, Гуслянки, Гуслище и увезли в Голынец. Немцы сожгли часть д. Тумановка.

15.12.43 г. ...В д. Ракузовка, не застав никого из населения, немцы сожгли часть деревни.

17.12.43 г. ...Тумановка-2. Трудоспособное население увезли в город. Остальные 18 вместе с деревней сожжены.

*НАРБ, ф. 4254, воп. 1, спр. 6, л. 18, 30, 40, 46, 47.*

...27.12.43 г. по решению командира 2-го батальона была проведена операция по захвату коменданта д. Голынец-2 и переводчика. Была выделена группа партизан в количестве 6 человек и связная, указывавшая путь и местонахождение коменданта, — Рябцева Мария Николаевна.

...Группа выступила из д. Михалево. С помощью связной удачно добрались до дома коменданта. Командир группы Поповский В. Я. принял следующее решение: 3 партизана охраняли окна и двери, Поповский с остальными вошли в дом. Связная открыла дверь в комнату и сразу раздались голоса. Переводчик спросил: «Кто во-

шел?» Комендант схватил автомат. В это время патрули обнаружили во дворе партизан и открыли огонь. Им ответил автоматной очередью Борисенко В. Б.

Сложившаяся обстановка не дала возможности взять коменданта живым.

...В результате операции убиты комендант д. Голынец-2, переводчик и патрульный. С нашей стороны ранен Борисенко. Он был вынесен из боя, ему была оказана помощь. Он направлен в д. Хрипелево в санчасть полка.

Командир 6-на ст. сержант Жолобов
Комиссар 6-на Филимонов
Нач. штаба ст. л-нт (подпись неразборчива)

*НАРБ, ф. 4254, воп. 1, спр. 4, л. 173.*

9.01.44 г. ...Карательный отряд силою до 120 чел. прибыл в д. Песчанка, собрал трудоспособное население для угона в Германию и, забрав скот, поджег деревню.

3-й батальон в составе трех рот пулеметного взвода внезапно напали на уходившего противника. В результате уничтожено 11 немцев, один взят в плен, освобождены уводимые крестьяне, отбит обоз и крестьянский скот.

Трофеи: 3 винтовки, 4 диска к РПД, пистолет, 7 гранат, 150 патронов. Наши потери: два партизана ранены. Остальные немцы бежали.

*НАРБ, ф. 4254, воп. 1, спр. 4, л. 18.*

14.01.44 г. ...В районе Заболотье—Досовичи с поселками ежедневно наезжает карательный отряд в количестве 50 чел. Их вооружение: 2 миномета, 3 пулемета, остальные — автоматчики.

15.01.44 г. ...В 7 утра через Щеглицу проехали 16 подвод из отряда предателя Панфеловича, которые направились на Песчанку, Заборье, Ильинка. Эти деревни были окружены ...и подожжены. В д. Н. Заборье схватили одну девушку и двух мужчин. Девушку сожгли, мужчин забрали с собой.

15.01.44 г. ...Полностью немцами были сожжены д. Песчанка, Залубнище. В д. Песчанка карателями были сожжены 8 крестьян. В д. Залубнище убито 82 местных жителя. Сожжено 53 чел., в основном — захваченные в д. Песчанка.

20.01.44 г. ...В д. Межисятки прибыло 16 танков и бронемашины.

*НАРБ, ф. 4254, воп. 1, спр. 7, л. 53, 54, 70.*

19.01.44 г. ...При разгроме немецкого гарнизона в д. Голынец-2 партизаны 2-го батальона уничтожили, по сведениям агентурной разведки, ...34 немца, в т. ч. генерала, приехавшего на отдых. Ранены орскомендант и его переводчик. Сожжены склады — с горючим и вещевой. Наши потери: убитых 11, трое взяты... тяжелоранеными.

1. Фатальева Мишу избивали при допросе. Он показал себя как патриот. Когда его били, он говорил: «Вы меня забьете, но тов. Сталин будет жить и отомстит за меня». Фатальев ругал немцев, называл фашистами и другими словами. ...Пока неизвестно, убили его или нет. Действовал он в бою смело и решительно, выстрелив все патроны.

2. Ржеутский Виктор, несмотря что молодой по годам, в п. о. пришел еще 16.05.43 г. Когда батальон получил боевой приказ, Виктор находился в лагерях. ...Узнав, что батальон ушел на боевую операцию, он догнал. ...Командир роты хотел его отослать назад, но Виктор пошел в бой. В бою он действовал как патриот и погиб. Партизан Козел Иосиф и политрук Широких вынесли труп Виктора из Голынца. Он будет похоронен 21.01.44 г. на кладбище д. Белявщина.

3. Евдокименко Лиза, по словам местных жителей, подобрана немцами живой, но тяжело раненной. При допросе ее сильно избили, а потом пристрелили в саду. Никаких показаний о партизанах она не дала.

В боях она быстро оказывала помощь раненым. Погибла как патриотка.

4. Васильев Владимир Иванович. ...Подобрали тяжело раненного. При допросе о партизанах ничего не показал. И его пристрелили в саду.

В бою он стрелял до последнего патрона.

5. Топтунов Николай Нестерович тоже был тяжело ранен и умер в Ямницком саду...

С группой партизан Топтунов первым ворвался в деревню. Уже тяжело раненный в живот, с криком «Ура!» продолжал вести бой...

...1.02.44 г. ...Оставив боевое охранение ...произвел разведку (вторично). Первая попытка подойти к д. Михалево не удалась — был с группой обстрелян.

От Михалево немцы отошли на д. Карчемка. В бою принимали участие до 10 танков, шедших курсом Песчанка — Хвощевка — Дубинка, и 300 чел. пехоты. Заняв в 13.00 сад в д. Дубинка, танки, выйдя с исх. позиций, прошли по полю южнее Михалево, уничтожая пулеметным огнем жителей ...отходящих по лощине в лес.

...Как рассказывают жители, немцы, отобрав всю молодежь, угнали ее с собой, оставив стариков и детей.

...В д. Михалево сожжено около 15 дворов. Количество убитых людей и сожженных домов еще не установлено.

...Жду ваших распоряжений.

Л. Безмен

*НАРБ, ф. 4254, воп. 1, спр. 4, л. 100, 103—104*

10.02.44 г. ...Немцы в деревнях Городище, Каменка, Дубно, Алексеевичи, Сермяженка, Кр. Слобода. Полностью заблокирована узкоколейка.

...По шоссейной дороге Могилев—Минск большое движение по направлению Белынич. Движутся груженые машины, обратно — в меньшем количестве — пустые.

...Все группы нашей части, оставшиеся здесь, находятся при батальоне и используются для разведки. По данным агентурной разведки, на блокировку брошено до 95 тысяч немцев и до 120 танков. Срок блокировки — до 26.02.44 г.

Командир 1-го батальона 121-го п. п. Жолобов

*НАРБ, ф. 4254, воп. 1, спр. 4, л. 197*

*Падрыхтавала да друку І. Кісялёва*

## Наш сябар Фрыдрых Піетцка

У партызанскіх атрадах Магілёўскай вобласці змагаліся супраць фашызму прадстаўнікі многіх народаў Еўропы: чэхі, палякі, венгры, аўстрыйцы, датчане, галандцы, французы і нават немцы. Аб партызанах-інтэрнацыяналістах і іх важаку Фрыдрыху Піетцка ведалі многія.

Снежань 1942 г. У рабочы пасёлак Халмы Магілёўскага аўтарамонтнага завода на працяглы тэрмін прыбыў на пастой 68-ы дывізіён сувязі 3-яй горнай дывізіі гітлераўскай арміі. Кватэрмайстар штаба дывізіёна з невялікай камандай прыбыў на суткі раней і склікаў педагогаў школы пасёлка.

— Школу мы займаем пад казарму,— заявіў ён на рускай з акцэнтам мове.— Гэта пытанне вырашана камандаваннем і абмеркаванню не падлягае. Я агледзеў будынак. У бібліятэцы вельмі многа карысных кніг, вы іх можаце забраць.— Падумаўшы, дадаў: — Вы іх павінны забраць... Забярыце сёння ж, заўтра можа быць позна, прыедуць афіцэры, яны будуць гаварыць з вамі па-іншаму...

Гэтым кватэрмайстрам быў унтэр-афіцэр гітлераўскай арміі аўстрыец Фрыдрых Піетцка. Кнігі сапраўды разабралі, а гэты дзіўны унтэр-афіцэр рабіў выгляд, што нічога не заўважае.

У Халмах Фрыдрых хадзіў з хаты ў хату, завязваў сяброўскія сувязі і, сустракаючы маладога здаровага чалавека, задаваў адны і тыя ж пытанні:

— Як жыццё, як здароўе, чаму не на фронце?

— Мяне не прызывалі,— звычайна адгаварваўся малады чалавек.

— А чаму не пайшоў у партызаны?— дапытваўся Фрыдрых, уганяючы ў пот субяседніка.

Неяк, гуляючы ля Дняпра, Фрыдрых сустрэў аднаго з мясцовых падпольшчыкаў — Мікалая Харкевіча і завёў з ім самую мірную размову.

— Глыбокая рака Дняпро?

— Ды не, не вельмі.

— А рыба ёсць?

— Ёсць і рыба, але летам вашы салдаты многа папсавалі, глушылі.

— А чым яны глушылі?

— Ручнымі гранатамі і толам.

— А вы ўмееце глушыць рыбу?— не адставаў Фрыдрых.

— Не ўмею і няма чым. Не трэба мне гэта,— адказаў Мікалай, каб адвязацца ад назойлівага унтэра.

Фрыдрых памаўчаў, паглядзеў дапытліва на Харкевіча і прапанаваў:

— Я дам табе гранат і толу, многа дам... Глушы рыбу. Ты павінен глушыць рыбу, зразумеў?— тонам загаду заключыў размову Фрыдрых і, не чакаючы адказу, хуценька пайшоў...

У хуткім часе Фрыдрых завёў сваю звычайную размову з падпольшчыкам Батурай.

— Я б ніколі не даў веры, каб мне хтосьці сказаў раней, што сярод рускіх ёсць шкурнікі, якіх не хвалюе лёс Радзімы.

— Што і каго вы маеце на ўвазе?— асцярожна спытаў Батура.

— Многіх і вас таксама,— адказаў унтэр.

— Нічога не разумею, пан унтэр-афіцэр.

— Чаго не разумееце? Разумееце вы ўсё. Гітлер дайшоў да Масквы, да Волгі, а вы, маладыя, здаровыя, у тыле прахлаждаецеся, ды яшчэ дапамагаеце яму. Баязлівасць гэта ці адкрытая здрада — адна цана гэтаму.

— Ведаеце, пан афіцэр, дзіўна чуць такое ад немца.

— Па-першае, я не немец, я аўстрыец. Я не прыхільнік Гітлера, я камуніст,— горача загаварыў Фрыдрых.— Хопіць гульні ўцёмную, вы мяне маглі даўно прадаць, але калі вы сумленны чалавек і патрыёт, я вам друг. Маё імя Фрыдрых.

З гэтага дня ваеннаслужачы гітлераўскай арміі унтэр-афіцэр Фрыдрых Піетцка стаў актыўным удзельнікам антыфашысцкага падполля. Праз сваіх шматлікіх сяброў ён даставаў са склада ручныя гранаты, тол, збіраў і перадаваў кіраўнікам падполля весткі аб гарнізоне, аб руху воінскіх часцей праз Магілёў.

Фрыдрых уцягнуў у падпольную дзейнасць яфрэйтара Отта Нікеля. І калі Батура прапанаваў Фрыдрыху і Отта пайсці ў лес да партызан, яны з радасцю згадзіліся. 18 сакавіка 1943 г. сакратар Магілёўскага падпольнага райкома партыі Іван Паўлавіч Станкевіч прымаў у сваёй зямлянцы незвычайных гасцей — ваеннаслужачых гітлераўскага вермахта унтэр-афіцэра Фрыдрыха Піетцка і яфрэйтара Отта Нікеля.

— Раскажыце, калі ласка, аб сабе,— папрасіў сакратар аўстрыйскіх таварышаў. І Фрыдрых пачаў:

— Я аўстрыйскі камуніст, у свой час адзін з кіраўнікоў камсамола Аўстрыі. У 1935 г. быў дэлегатам шостага Кангрэса Камуністычнага Інтэрнацыянала Моладзі, які праходзіў у Маскве. Калі Гітлер захапіў маю радзіму, мяне і многіх іншых таварышаў судзілі ваенным трыбуналам. Пачалася вайна і нас паслалі на фронт. І вось я тут, з вамі, савецкімі патрыётамі...

— У мяне такая думка, таварыш сакратар. Хачу стварыць партызанскі атрад з немцаў,— паясніў Фрыдрых.

Падумалі, параіліся і дазволілі Фрыдрыху набіраць салдат і камплектаваць інтэрнацыянальны ўзвод пры 600-ым партызанскім атрадзе Магілёўскага раёна. Камандзірам прызначылі Фрыдрыха Піетцка, яго памочнікам — Отта Нікеля.

Не прайшло і паўмесяца, як Фрыдрых да сарака чалавек набраў — немцаў, венграў. Фрыдрых і яго сябры прымалі ўдзел у сутычках з гітлераўцамі. Гэта былі сапраўдныя партызаны.

...У канцы 1943 г. уздоўж шасэ Магілёў—Бабруйск, асабліва яго прыгараднага ўчастка — ад Магілёва да Дашкаўкі — было вельмі многа дзотаў з буйнымі варожымі гарнізонамі. Прайсці праз шасэ па гэтаму участку можна было толькі з боем, з ахвярамі. Фрыдрыха папрасілі паспрабаваць расчысціць невялікі кавалак шасэ ля в. Малціннік.

У двух кіламетрах ад вёскі Фрыдрых вывеў сваю каманду на шашу і павёў прама да гарнізона. Усе яны, як мае быць — у нямецкай форме, з нямецкай зброяй. На аколіцы вёскі іх сустрэла застава — тры салдаты з кулямётамі. Але каманда Фрыдрыха не выклікала ў іх ніякіх сумненняў, нават пароль не спыталі...

Спыніўшы строй насупраць казармы, Фрыдрых увайшоў у памяшканне і далажыў камандзіру прыкладна наступнае: едзем з Бабруйска ў Магілёў, па шляху на нас напалі партызаны, машына знішчана, ёсць параненыя, людзі знясілелі і замерзлі. Прашу дазволу ўвесці людзей у казарму сагрэцца, а я ў той час пазваню ў Магілёў, папрашу выслаць машыны. Афіцэр дазволіў, і ўзвод Фрыдрыха ўвайшоў у казарму.

Далей усё было зроблена хутка і проста. Гітлераўцы не змаглі нават схапіцца за зброю. Толькі адзін шалёны гранатай узарваў сябе і параніў Отта. Бой працягваўся менш мінуты. Тым часам была абяззброена і застава. Так, у ланцугу фашысцкіх дзотаў стварылася «акно», праз якое ў першую ж ноч 600-ы атрад без перашкод выйшаў на чыгуначную лінію ля Дашкаўкі.

Аб баявых справах інтэрнацыянальнага ўзвода складаліся легенды, іх слава перашагнула праз лінію фронту і дайшла да Масквы. У пачатку 1944 г. Фрыдрыха запрасілі ў Маскву. З ім разам уляцеў і паранены Отта...

У жніўні 1961 г. Фрыдрых з жонкай прыязджаў адпачываць у нашу краіну і, вядома, заехаў на тыдзень да сваіх баявых сяброў на Магілёўшчыну. У маі 1965 г., у дзень дваццацігоддзя вялікай перамогі, Фрыдрых зноў быў сярод сяброў...

*І. Крыскавец*

**З успамінаў Фёдара Міхайлавіча Іванова, былога сакратара Магілёўскага падпольнага абкома ЛКСМБ**

...Вясной 1942 г. партызанскі рух на Магілёўшчыне пашыраўся. Пашыраліся і рады камсамольцаў. Звыш 200 юных партызан і партызанак, якія асабліва вызначыліся ў баях, падпольны райком прыняў у члены ЛКСМБ. Да лета 1944 г. у партызанскіх атрадах і палках Магілёўскага раёна налічвалася 560 камсамольцаў. 20 чалавек за гэты час былі прыняты ў Камуністычную партыю.

Камсамольцы добра праяўлялі сябе ў барацьбе з ворагам. Асабліва актыўна прымалі ўдзел у барацьбе юнакі і дзяўчаты вёсак Гарадзішча, Семукачы, Хонава, Вендараж, Дабрасневічы і інш. Яны распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, збіралі зброю, вялі разведку, падбіралі надзейных людзей для партызанскіх атрадаў.

Падпольная арганізацыя в. Каменка пад кіраўніцтвам Канстанціна Яш-

кова актыўна дзейнічала ўжо з восені 1941 г.

Камсамольцы і моладзь вёсак Гарадзішча і Семукачы (кіраўнік Т. Цмыкаў) чатыры разы разбуралі мост праз Друць, выводзілі са строю чыгунку. Вялікую разведвацельную работу праводзілі Жэня Слёзкіна, Лена Аблажная і яе муж Сямён.

У ліпені 1942 г. камсамолец Аляксандр Зарыцкі пусціў пад адхон першы варожы поезд, а ўсяго ён знішчыў 15 цягнікоў, 20 аўтамашын. Аляксандр узнагароджаны ордэнам Леніна.

240 партызан-камсамольцаў Магілёўскага раёна пусцілі пад адхон каля 50 варожых эшалонаў, знішчылі 5 танкаў і бронемашын, звыш 150 аўтамашын, дабылі дзесяткі «языкоў». Камсамольцы Жукаў і Караўка з 61-га партызанскага атрада ў гонар 25-годдзя ВЛКСМ знішчылі варожы эшалон з тэхнікай і жывой сілай.

На жаль, яны гераічна загінулі пры выкананні задання…

*«За камуністычную працу».*
*18 жніўня 1988.*

**З успамінаў Канстанціна Яшкова, былога сакратара камсамольскай падпольнай арганізацыі в. Каменка**

Вялікая Айчынная вайна застала мяне ў арміі. Наша часць адступала. Дайшлі да Дняпра ў раёне Кіева. Нам было даручана навесці пантонны мост праз Дняпро і пераправіць адступаючыя часці. Немцы пастаянна бамбілі пераправу. Пры адным з налётаў мяне кантузіла. Я аказаўся ў палоне, але збег і вярнуўся у в. Каменку, дзе жылі мае бацькі. Бацька пры сустрэчы сказаў: «Будзем ваяваць тут». Ён ужо тады збіраў зброю і боепрыпасы, аказваў дапамогу байцам, якія прабіраліся з акружэння да лініі фронту. Бацьку ва ўсім дапамагала мая маці Дар'я Пятроўна. Пазней, як у нашых лясах з'явіліся партызаны, яна выпякала ім хлеб.

Бацька Георгій Ільіч Яшкоў, у якога была за плячыма не адна вайна, падключыў да барацьбы ўсю сям'ю, акрамя братоў Фёдара і Дзмітрыя, якія былі на фронце і там загінулі. З сястрой Евай мы падабралі надзейных людзей у бліжэйшых вёсках — Бокатаўцы, Астраўшчыне, Незаўке і ў сваёй Каменцы. Стварылі падпольную камсамольскую групу. У вёсках Арлянка, Коцны, Хонава, дзе не было надзейных камсамольцаў, падключылі да работы людзей рознага ўзросту. Сярод такіх быў Цімафей Цеплякоў, які лічыўся паліцаем гарнізона в. Хонава. З мэтай канспірацыі мы не збіраліся разам, не праводзілі ніякіх нарад. Усе загады і рашэнні перадавалі з вёскі у вёску самі. Дзе збіралася моладзь, былі свае людзі, якія праводзілі агітацыю. Кожны падпольшчык быў папярэджаны не праводзіць ніякіх дзеянняў самастойна, каб не паставіць пад удар астатніх.

Да восені 1941 г. у в. Каменка была створана камсамольская арганізацыя. Мяне выбралі сакратаром. Падпольшчыкі сабралі многа зброі і боепрыпасаў. У Кучынскім лесе адбылася сустрэча з групай партызан, сярод якіх быў сакратар падпольнага райкома партыі І. П. Станкевіч. Некалькі пазней мы сустрэліся з сакратаром падпольнага райкома камсамола В. І. Новікавым. Са студзеня 1942 г. наша падпольная камсамольская арганізацыя пачала праводзіць акцыі супраць нямецкіх захопнікаў: поўнасцю сарвала



К. Я. Яшкоў

мерапрыемствы нямецкай улады па збору прадуктаў, па арганізацыі так званай паліцэйскай самаабароны ў вёсках Каменка, Астраўшчына, Арлянка, Бокатаўка, Коцны. З нашым удзелам былі знішчаны пяць мастоў, па якіх вораг атрымліваў падмацаванне, і паліцэйская вышка. Працавалі мы спачатку пад кіраўніцтвам 113-га партызанскага атрада, а пазней — Магілёўскага падпольнага райкома камсамола.

Мужна дапамагалі граміць ворага Антон Аўсейкаў, Сяргей Скварцоў, Платон Крупянькоў, Аляксандр Красоўскі, Еўдакім Маркаў, Фёдар Самалазаў, Іван Цыкуноў і інш.

Складаная задача была ў сястры Евы. Яна дастаўляла лістоўкі, перапісаныя ад рукі, і зводкі Саўінфармбюро ў Магілёў. З Магілёва праз верных людзей прымала для партызан дадзеныя аб дыслакацыі нямецкіх войск, іх колькасці, а таксама ўзбраенне, медыкаменты, перавязачныя матэрыялы.

Паліне, самай малодшай у нашай сям'і, давяралася падтрымліваць сувязь з сястрой Марыяй. Яна жыла ў в. Цішоўка. Паліна дастаўляла сюды падпольную партызанскую газету, якую Марыя потым перапраўляла па адрасах. Трэба было, каб людзі ведалі, якая барацьба ідзе з ворагам. Акрамя таго, да Марыі паступалі звесткі па іншых каналах — аб дыслакацыі нямецкіх войск у Магілёве.

Па заданню камандавання Марыя не раз хадзіла на ст. Буйнічы і вёскі, дзе былі нямецкія гарнізоны, — Гуслішчы, Галынец. Тут распаўсюджвала лістоўкі, збірала дадзеныя аб колькасці ворагаў і іх узбраенні. А Паліна хадзіла ў вёскі Дасовічы, Хонава, Вендараж, Сяліба, дзе таксама стаялі нямецкія гарнізоны. Вясной 1943 г. Паліна, якая ў чарговы раз прыйшла ў Цішоўку да сястры, ледзь засталася жывой. Выратавала яе Кацярына Сяргееўна Блахіна, якая ноччу правяла Паліну цёмнымі сцежкамі ў партызанскую зону. Усё складаней станавілася падпольная работа. Аднойчы Еву тэрмінова паслалі ў Магілёў. Вяртаючыся назад, яна зайшла да сястры Марыі. Нехта данёс аб прыходзе Евы і абедзвюх арыштвалі. Марыю доўга білі, яе і дзяцей ставілі да сцяны, параджалі расстрэлам, потым адпусцілі з разліку на тое, што хтосьці яшчэ прыйдзе да яе. У той жа дзень ноччу Марыя з дзецьмі збегла ў партызанскі атрад.

Еву ж цэлы месяц каталі фашысты. Відавочцы расказвалі, што яе білі, падвешвалі, на ёй не засталося жывога месца. Але сястра нікога не выдала. Як потым паведаміла партызанская разведка, Еву жывой спалілі ў Пашкаўскім нямецкім гарнізоне...

Еву Яшкову, маю сястру, пасмяротна ўзнагародзілі медалём «Партызану Айчыннай вайны»...

## Яна была яшчэ школьніцай...

У нашу вялікую Перамогу зрабілі значны ўклад і зусім маладыя грамадзяне краіны. Сярод юных мсціўцаў была і Аня Карабцова, якая ў 1941 г. толькі закончыла сем класаў Бароўскай школы.

Аня была камсамолкай. Жыла ў бабулі ў в. Вялікая Бароўка. Люта ненавідзела фашыстаў. Гэтымі сваімі думкамі аднойчы падзялілася са сваёй любімай настаўніцай Серафімай Васілеўнай Каманскай. Праз нейкі час Серафіма Васілеўна адкрыла дзяўчынцы сваю тайну: у яе ёсць рацыя, яна і група таварышаў аказваюць пасільную дапамогу партызанам. Так Аня знайшла дарогу да народных мсціўцаў. Спачатку выконвала нескладаныя заданні: збірала звесткі аб фашыстах, передавала

сваім. А пасля таго як надзейна схавала ў сябе дома ўцекшага з палону палітрука Віктара Іванавіча Новікава, дзяўчыне сталі давяраць больш адказныя справы. З яе дапамогай не аднаму ваеннапалоннаму ўдалося ўцячы з лагера, які знаходзіўся каля завода імя Кірава, і знайсці дарогу да партызан.

В. І. Новікаў арганізаваў невялікі атрад з 18 чалавек, але не паспеў разгарнуць барацьбу, бо яго высачылі. Толькі дзякуючы Ані (яна паспела папярэдзіць) яму ўдалося збегчы.

Аня насіла лістоўкі ў лагер ваеннапалонных. Многія з іх, пачытаўшы палымяныя звароты партызан, добраахвотна запісваліся ў паліцаі, каб потым, атрымаўшы зброю, перайсці на бок партызан.

Аню арыштавалі 18 мая 1943 г. Яе адвезлі ў магілёўскае гестапа і шэсць тыдняў катавалі. Потым перавялі ў турму.

Аднойчы я наведала яе ў турме. Аня непрыкметна выкінула пакецік. Гэта быў невялікі шматок бялізны, на якім яна напісала, што ў яе дапытваліся, дзе яна брала лістоўкі, хто яшчэ распаўсюджваў іх. «Але я нічога не сказала гэтым гадам. Шкада толькі, што родныя не будуць ведаць, дзе мая магіла...»

У турме Аню трымалі тры месяцы. Восенню 1943 г. расстралялі. Таварышы не змаглі нічым дапамагчы і Ані, і яшчэ 18 патрыётам, якія былі схоплены з ёю ў адзін дзень: турма вельмі моцна ахоўвалася. Арганізаваць на яе нападзенне — значыць загадзя павесці людзей на пагібель. Так мая сястрычка загінула, толькі пачаўшы жыць...

*А. Карабцова*

## Зброю даставілі своечасова

Калі пачалася вайна, 16-гадовы Генадзь Дзям'янаў жыў з маці на чыгуначнай станцыі Дашкаўка. Юнак збіраў зброю і звесткі аб размяшчэнні гітлераўцаў, а потым перадаваў іх партызанам. Не раз даводзілася рызыкаваць жыццём. Аднойчы народныя мсціўцы далі заданне даставіць з в. Галынец у партызанскі атрад зброю. Са сваім сябрам Віктарам Аляксеевым Генадзь падрыхтаваў падводу. Загрузілі ў яе вінтоўкі, гранаты, патроны і адправіліся ў дарогу. Спачатку ўсё ішло добра. Але праз некалькі кіламетраў на адным з крутых пад'ёмаў конь спыніўся, заўпарціўся і ніяк не хацеў рухацца наперад. Тут, як на ліха, на вяршыне гары паказалася каля дзесяці гітлераўцаў. Хлопцы заціхлі. Трынаццацігадовы Віця сказаў:

— Усё прапала.

— Не звяртай увагі,— падбадзёрыў Генадзь і з усёй сілы ўпёрся плячом у павозку.

Конь зрабіў некалькі крокаў, а затым зноў стаў, як укопаны. Немцаў, напэўна, такая сцэна забаўляла. Яны гучна рагаталі. Потым, крыкнуўшы некалькі незразумелых для хлопчыкаў слоў і нічога не падазраючы, праехалі міма.

Хлопцы з палёгкай уздыхнулі... Зброя, такая неабходная партызанам, была своечасова дастаўлена ў лес.



Г. Я. Дзям'янаў

Генадзя залічылі ў партызанскі атрад. Разам з дарослымі ён удзельнічаў у засадах, хадзіў у разведку.

Калі прыйшла Чырвоная Армія, Дзям'янава накіравалі ў школу малодшых камандзіраў. Пасля яе заканчэння Генадзь удзельнічаў у вызваленні Польшчы. За мужнасць і адвагу Генадзь Яўсеевіч Дзям'янаў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені і медалямі.

*В. Какорыч*
*«За камуністычную працу». 2 ліпеня 1964.*

## Ішлі браты дарогамі вайны

Павел імкнуўся быць падобным на старэйшага брата Дзмітрыя. Вось толькі цягнуцца за ім было нялёгка. Старэйшы вучыўся на апошнім курсе артылерыйскага вучылішча, а малодшы — толькі ў шостым класе Грабянёўскай сямігодкі. Але Павел ужо тады марыў стаць камандзірам Чырвонай Арміі. Вайна пераблытала ўсе планы. Дзмітрыя Чэшку пасля вучылішча накіравалі ў воінскую часць, а Павел застаўся ў роднай в. Навасёлкі.

Баявое хрышчэнне лейтэнант Дзмітрый Чэшка атрымаў пад горадам Залатаноша на Палтаўшчыне. Потым было горкае адступленне і зноў бой. На гэты раз Дзмітрый быў цяжка паранены і кантужаны. Яго падабралі жыхары в. Саўкіўна. Амаль паўтара месяцы выходжвалі яго ў сям'і Ягора Паўлавіча Панамарэнкі. Калі ўстаў на ногі, разам са старшынёй калгаса Мікалаем Будко і дзвюма медсёстрамі, якія збеглі з лагера смерці, адправіўся да лініі фронту.

Цяжкі быў шлях, аднак напярэдадні новага 1942 г. ён дабраўся да родных Навасёлак.

Павел, можна сказаць, ужо ваяваў: разам з падлеткамі збіралі зброю, хавалі ў надзейных месцах. У гэты час сюды вярнуліся воіны, якія трапілі ў акружэнне і не змаглі прарвацца праз варожае кола: лейтэнант Мікалай Кароткін, палітрук Іван Пархоўчанка. Разам з Дзмітрыем яны пачалі шукаць сувязь з магілёўскім падполлем. І неўзабаве была ўстаноўлена сувязь з падпольнай групай афіцэра Чырвонай Арміі капітана Паўла Хахлова.

З дапамогай мясцовых камсамольцаў Аляксандра Жалябідкі, Пятра Вераценнікава, Дзмітрыя Зайцава, Ягора Калеснікава навасёлкаўцы даставілі сабраную зброю ў лес на Цярэхаў хутар, дзе жыў Церах Храмцоў па мянушцы Сівая Барада. Вялікую дапамогу аказалі дарослым падлеткі — Грыша Храмцоў, Ягор Пралейчык, Мікалай Кірэенка, Іван Камедзька і інш. Была ўстаноўлена сувязь з падполлем магілёўскага лагера ваеннапалонных, які размяшчаўся ў бараках Грабянёўскага торфазавода. Арганізоўвалі ўцёкі вязняў, іх размяшчэнне, забяспечвалі вопраткай і харчаваннем. Гэтым займаўся Чэшка.

Вясной 1942 г., калі ўсё было гатова для адыходу ў лес, на след падполля натрапілі гітлераўцы. Пачаліся арышты. Дзмітрый у гэты час быў у раёне размяшчэння партызанскага атрада. Даведаўшыся аб арыштах, пайшоў у бок Оршы, каб прабіцца праз лінію фронту. Браты зноў разлучыліся...

У красавіку немцы правялі шэраг карных аперацый і аблаў у лясах левабярэжжа Дняпра ў Магілёўскім раёне. Тады былі зверскі забіты Аўдзей Волкаў, Васіль Пралейчык, Іван Скавародкін, Васіль Пахомаў, Пётр Кароткін і інш.

Пазней гітлераўцы пачалі рабіць 200-мятровую прасеку ўздоўж шашы Магілёў — Гомель. На гэтыя работы трапіў і Павел Чэшка. 16 красавіка,

калі машыны з рабочымі даехалі да развілкі Навасёлкі – Вільчыцы, каля ну спынілі гітлераўцы. Яны шукалі сярод рабочых Паўла Чэшку, Дзмітрыя Пахомава, Ягора Калеснікава. Хтосьці папярэдзіў Паўла, і ён, выкарыстоўваючы шум, які наўмысна ўчынілі рабочыя, кінуўся у бок міннага поля. Немцы спрабавалі дагнаць яго, але ўбачыўшы ўказальнік «мінён», далі некалькі чэргаў з аўтаматаў і вярнуліся да машын.

Павел не загінуў. Ён хаваўся ў лесе, потым перабраўся да родных у в. Заппруддзе. Сюды ж прыйшлі Ягор Калеснікаў, Дзмітрый Пахомаў, Аляксандр Храмцоў, якіх таксама шукалі гестапаўцы. Разам камсамольцы ўчынілі некалькі дыверсій на шашы Магілёў – Гомель, арганізавалі налёт на паліцэйскі ўчастак у в. Князеўка (у гэтым баі загінуў Ягор Калеснікаў). Хутка тут паявіўся атрад народных мсціўцаў з Клічаўскай зоны, і Павел стаў сувязным.

Далей здарылася так, што летам 1943 г., нічога не ведаючы адзін пра другога, браты далучыліся да партызан палка Грышына: лёс звёў іх блізка, але сустрэцца не даводзілася. І толькі ў ноч на 18 верасня, калі ў баі быў цяжка паранены Дзмітрый, яны сустрэліся.

Пасля шпіталя, адпраўляючыся ў дзеючую армію, Дзмітрый заехаў у родныя Навасёлкі, дзе сустрэў брата. Разам яны пайшлі ў райваенкамат, і Павел быў афармлены ў полк са старэйшым братам.

Браты разам дайшлі да Чэхаславакіі і — далей, далей. Шлях Паўла адзначаны двума медалямі «За адвагу», медалямі «За ўзяцце Кенігсберга», «За ўзяцце Берліна» і інш. Дзмітрый Чэшка працягваў служыць у радах Савецкай Арміі да 1959 г. Маёр запасу таксама мае баявыя ўзнагароды — ордэны Баявога Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалі.

*М. Койда*

## Слова пра Анастассю Фёдараўну

Вялікая Айчынная вайна застала Анастассю Фёдараўну Шанцаву ў Бракаве, дзе яна працавала завучам сямігадовай школы.

Лінія фронту ўсё набліжалася. Аднойчы баі развязаліся за ваколіцай іх сяла. Рэальнасцю стала жудаснае слова «акупацыя».

Фашызм, яго варварскія парадкі ніяк не сумяшчаліся з тым разумным, добрым і вечным, чаму вучыла Анастасся Фёдараўна сваіх вучняў. Суровыя выпрабаванні выпалі на долю гэтых юнакоў і дзяўчат. І настаўніца, як маці, перажывала за іх лёс. Яна ведала: яе выхаванцы не схіляць галавы перад ворагам, і лепей, калі на суровым шляху барацьбы побач з імі будзе старшы таварыш — педагог.

З другога боку, каму, як не ёй лепш было ведаць, на каго з падлеткаў можна спадзявацца, хто здольны вытрымаць цяжкасці барацьбы, смяротную рызыку. Яна перабірала ў памяці школьныя характарыстыкі і была ўпэўнена, што яе выхаванцы не падвядуць і што такіх, каму можна верыць, большасць. Так Анастасся Фёдараўна стала арганізатарам і кіраўніком бракаўскай падпольнай камсамольскай групы.

Першым яе жаданнем было — звязацца з Вялікай зямлёй, ведаць, як абстаяць справы на франтах, як жыве і змагаецца савецкі народ. З дэталей, што засталіся ў школьным фізічным кабінеце, а таксама з тых, што прынеслі з дому вучні, сабралі радыёпрыёмнік. З хваляваннем слухалі го-

лас Масквы. Наладзілі рэгулярны прыём зводак Саўінфармбюро, сталі перапісваць іх і распаўсюджваць.

Юныя падпольшчыкі перажывалі, што ў Княжыцах, суседняй з Бракава вёскай, размясціўся паліцэйскі гарнізон, яны люта ненавідзелі гэтых здраднікаў, фашысцкіх прыхвасняў...

Аднойчы Анастасся Фёдараўна нечакана загадала Уладзіміру Цюльмянкову, Мікалаю Рэпетуеву, Міхаілу Прыснакову заваяваць давер'е паліцэйскіх і ўладкавацца на работу ў іхні гарнізон. Юнакі заўпарціліся. Падзейнічала толькі тое, што Анастасся Фёдараўна растлумачыла: аб гэтым просіць штаб партызанскага атрада «За Радзіму». Юных падпольшчыкаў вельмі ўзрадавала тое, што ўстаноўлена сувязь з партызанамі і што яны, юнакі, будуць змагацца ў адным з імі раду. І хлопцы далі згоду.

Якая гэта была знаходка! Праз іх партызаны папаўнялі запасы зброі і ўзрыўчаткі, своечасова дазнаваліся аб рыхтуемых у гарнізоне аперацыях.

Вясной 1943 г., калі нашы войскі разгарнулі наступленне па ўсяму фронту, партызаны і падпольшчыкі актыўна ўключыліся ў вайну на рэйках. Для яе патрэбна была ўзрыўчатка. Анастасся Фёдараўна перадала просьбу партызан усім падпольным групам. Прыйшла яна і да мяне, у Княжыцы, каб я мог паведаміць аб новым заданні сваім таварышам.

Як цяпер памятаю той яе прыход. Гітлераўцы якраз бегалі па хатах у пошуках ежы. Прыйшлі і да нас. І раптам нечаканы стук у дзверы: на парозе Анастасся Фёдараўна Шанцава! Імгненна прыняў рашэнне і закрычаў жонцы: «Хутчэй, хутчэй, мая сястра прыйшла. Дай ёй што-небудзь сухое на ногі — бачыш, яны ў яе мокрыя». Фрыцы, не ведаючы расейскай мовы, падумалі, што тут нейкая сямейная сцэна, і не звярнулі на госцю ніякай увагі.

Колькі разоў трапляла Анастасся Фёдараўна ў такія рызыкоўныя сітуацыі, але не гублялася, зноў і зноў бралася за чарговыя заданні. А ў яе, між іншым, на акупіраванай ворагам зямлі было двое маленькіх дзетак. У выпадку правала ім таксама пагражала гібель. Мы ніколі не напаміналі аб гэтым Анастассі Фёдараўне, бо ведалі, што яна адказала б: «Я выконваю свой абавязак».

*І. Пратасеня,*
*былы партызан 122-га палка народных мсціўцаў*

## Пра яе і зараз успамінаюць толькі з пяшчотай...

На чорна-белым здымку, адзіным, які захаваўся ў родных Алёны Міхайлаўны Фокінай, толькі блізкія і аднапалчане прызнаюць бялявую, блакітнавокую весялуху-пявунню Леначку. За вясёлы характар і добрае жаласлівае сэрца ўсе называлі яе пяшчотна — Леначка.

Першае баявое хрышчэнне 18-гадовая Лена Фокіна з-пад Тулы атрымала каля в. Сідаравічы. Іх 224-ы медсанбат быў залічаны ў састаў 172-ой стралковай дывізіі, якая з першых дзён вайны абараняла дняпроўскія рубяжы ля Магілёва.

Цяжкія баі ішлі каля в. Вейна. Параненыя ўсё прыбывалі. 25 ліпеня медсанбат размясціўся ў корпусе Першасавецкай бальніцы. Вораг шалёна рваўся ў Магілёў, і прабіцца з цяжкапараненымі не было ніякай магчымасці. Камандаванне дывізіі загадала некалькім урачам і медсёстрам заставацца з імі ў горадзе. Трэба было ратаваць камандзіраў, камуністаў і камсамольцаў. Сярод сясцёр была і Лена Фокіна.

Разам з урачамі В. П. Кузняцовым, А. І. Паршыным і Ф. І. Пашаніным яна ўсю ноч перапісвала іхнія гісторыі хвароб на беспартыйных радавых салдат, а часам і мірных жыхароў, быццам выпадкова атрымаўшых раненні пры бамбёжцы горада. Такім чынам, з вялікай рызыкай было выратавана многа воінаў. Выздараўліваючых належала адпраўляць у Лупалаўскі канцлагер. І зноў медыкі, рызыкуючы жыццём, многіх з іх перапраўлялі ў партызанскія атрады. Рабілася гэта так: выздараўліваючых тайна зносілі ў морг, адтуль санітары разам з памершымі вывозілі іх на могілкі, дзе чакалі ўжо свае. У далейшым, калі над медыкамі навісла смяротная небяспека, такім жа чынам была перапраўлена ў 113-ы партызанскі полк і Лена Фокіна.

Яе залічылі медсястрой 5-ай роты, камандзірам якой быў Уладзімір Пятровіч Харытонаў, былы падпольшчык, з якім Лена падтрымлівала сувязь яшчэ ў падполлі. Вельмі палюбілі Леначку ў атрадзе. Усім сэрцам пакахаў яе і прыгажун палка Міхаіл Вішнеўскі з в. Гарадзішча. Здавалася, і Леначка аддавала яму перавагу. Міша не раз гаварыў, што дзеля Леначкі пасля вайны гатовы пакінуць сваю беларускую вёску і адправіцца з каханай на яе радзіму. Але лёс распарадзіўся інакш...

Стаяла вясна 1944-га. Прыемна пахла вызваліўшаяся ад снегу зямля. У блакітнай вышыні спявалі жаваранкі. У такі час не думалася аб смерці. Назаўтра быў назначаны штурм варожага гарнізона ў в. Гарадзішча. Па дадзеных партызан, там знаходзілася сотні чатыры фашыстаў у чорнай форме з эмблемай смерці на рукавах. У партызан з гэтымі катамі быў асобны рахунак. Менавіта такія ў час апошняй блакады спалілі Дубінку разам з яе жыхарамі, сцёрлі з твару зямлі некалькі іншых вёсак раёна.

...Белая ракета ўзляцела роўна ў пяць гадзін раніцы. І адразу ж ад лесу,



А. М. Фокіна

праз поле, на паўночную ўскраіну Гарадзішча кінуліся байцы 113-га палка. Яшчэ ноччу, зрабіўшы марш-кідок уздоўж берага Вялікага балота, адрэзалі праціўніку адыход да станцыі Друць батальёны 121-га партызанскага палка. Меркавалася раптоўна загнаць праціўніка да разбухшай ад паводкі Друці. Там гітлераўцы павінны былі знайсці сабе магілу.

— За мной! — падаў каманду камісар 113-га палка Дзмітрый Альховік.

Але здарылася нечаканае. Варожы гарнізон не спаў. Праціўнік адказаў шквальным агнём. Што ж такое? Хтосьці папярэдзіў?

Леначка Фокіна бегла за байцамі і бачыла, як падалі яны пад фашысцкімі кулямі на сырую зямлю. Першым яна, перавязаўшы наспех, адцягнула да лесу Арсенція Аверчука. Сама ж зноў бегам вярнулася на поле, дзе дапамогі чакалі іншыя. Густыя кулямётныя варожыя чэргі не давалі партызанам узняцца ў атаку. Лена паўзком прабіраецца да аднаго, другога, трэцяга, але... Напавал забіты Максім Дзянісаў, нічым ужо не дапамагчы Вячаславу Стрыжэўскаму, Ваню Какцібнікаву, Мішу Вішнеўскаму. І яна паўзла далей...

Ля яра, дзе размясціліся павозкі медсанчасці, параненым дапамагалі ўрачы Ілья Астапенка, Уладзімір Кургановіч, мядсёстры. Санітары вынеслі сюды з-пад куль ужо больш за 30 чалавек. Восем з іх прыцягнула Леначка

Фокіна. Пятра Бондасева Леначка знайшла ў канцы агарода, пад яблыней. Дзевятнаццацігадовы хлопец з в. Кастрыца зыходзіў крывёю. «Зараз, родненькі, зараз, пацярпі крышачку»,— гаварыла яму дзяўчына. «Заб'юць... Бяжы адсюль. Мне ўжо не дапаможаш... Наскрозь прашыла»,— ледзь чутна шаптаў хлопец.

Але сэрца ж хлопца білася. І яна не магла яго пакінуць... «Нічога. Я хуценька дастаўлю цябе ў часць, там заштопаюць»,— супакойвала яна хлопца.

А вакол кіпеў бой. Над галавою свісцелі кулямётныя чэргі, уздымалі слупы зямлі міны, побач ірваліся гранаты. Леначка адцягнула абмякшае цела Пятра да агароджы. Трэба было неяк яе пераадолець. Сабраўшы ўсе сілы, дзяўчына ўзняла раненага байца. У гэты момант ззаду звонка ахнула. Заззвінела. Рассыпалася... Асколак міны трапіў Леначцы пад лапатку левага пляча...

...У самым цэнтры Гарадзішча стаіць гранітны абеліск. На ім словы: «Слава савецкім партызанам» і пералік прозвішчаў... Сярод іншых — імя медсястры з-пад Тулы Леначкі Фокінай...

*Успаміны Н. А. Цяраевай*
*запісала Г. Сідарэнка*

## Аперыця «Стол»

Ішоў люты 1943 г. У адзін з гэтых дзён невялікая група партызан, якую ўзначальваў І. Я. Пархоўчанка, атрымала заданне ўзарваць каля Дашкаўкі варожы эшалон. Аперацыю выканалі ўдала. Вяртаючыся дамоў, зайшлі да сувязных. І тут пачулі навіну, якая вельмі ўсхвалявала кожнага з партызан. Аказваецца, у в. Нядашава мясцовы сталяр-чырванадрэўшчык Якаў Арлоў сабраў унікальны інкруставаны двухтумбавы стол, які быў зроблены з тысяч кавалачкаў дрэў розных парод. Паверхня крышкі стала была аздоблена арыгінальным беларускім арнаментам.

Імя майстра было вядома на Магілёўшчыне яшчэ да вайны. Яго работы экспанаваліся на выставах прыкладнога мастацтва ў Магілёве, Мінску, Маскве. Ён быў удастоены прыза міжнароднай выстаўкі работ мастацкай творчасці, якая праходзіла ў Парыжы. Гэты славуты мазаічны стол Якаў Арлоў майстраваў у падарунак савецкаму ўраду, аднак закончыць работу і адправіць стол у Маскву не паспеў: перашкодзіла вайна.

У Нядашава прыйшлі фашысты. У першы ж дзень яны сабралі жыхароў. Немалады нямецкі афіцэр патрабаваў як мага хутчэй даставіць да яго славутага Якава Арлова. Майстра знайшлі дома.

— Ты гэты стол будзеш рабіць, як скажам,— загадалі «госці» з Берліна.— Хутка сюды прыедуць нашы спецыялісты, мы даставім табе ўвесь неабходны для работы матэрыял.

Праз некалькі дзён Арлоў атрымаў вестку, што стол трэба заканчваць, як ён яго і задумаў. Але надпіс неабходна змяніць... Падарунак планавалася адправіць у Берлін у красавіку.

Арлоў даведаўся, што шэфства над яго работай узяў вярхоўны правіцель Беларусі гаўляйтар Вільгельм Кубэ. За домам майстра быў устаноўлены нагляд.

Не спяшаўся закончыць сваю работу Якаў. Рызыкуючы жыццём, у сваё апраўданне прыдумваў розныя прычыны.

Менавіта аб гэтым і паведамілі сувязныя партызанам групы Пархоўчанкі. Рашэнне народных мсціўцаў было адзіным — нельга дапусціць, каб стол

вывезлі ў Германію. Трэба выкрасці і захаваць работу майстра. Калі гэта не ўдасца — знішчыць.

Стаяла ноч з 13 на 14 лютага. Была адліга. Дарогі развязло. Прабірацца на санях партызанскім разведчыкам да месца стаянкі было вельмі цяжка. Тым больш, што намечаную аперацыю неабходна было правесці да раніцы. Акрамя таго, на зваротным шляху пад покрывам ночы трэба было адарвацца як мага на большую адлегласць ад пагоні.

Не даязджаючы да вёскі, спыніліся. Праваднік паказаў дом Арлова. Коней прывязалі і замаскіравалі. Далей васьмёра адважных прабіраліся паўзком. Высланыя ўперад разведчыкі хутка паведамілі, што ў вёсцы ідзе гульба: немцы і паліцаі арганізавалі п'янку. Каля дома майстра адзін вартавы.

Усё складалася добра. Узяўшы з сабою кулямётчыка Івана Кавалеўскага, Пархоўчанка адправіўся ў вёску. Паставога ўдалося зняць лёгка, без адзінага стрэлу.

Дзверы адчыніў сам Якаў. З яго дапамогай разведчыкі хутка разабралі стол, вынеслі з дому, асцярожна падагналі сані. Разам са сваім сталом ад'язджаў да партызан і Арлоў.

Калі немцы спахапіліся, было ўжо позна. А «выкрадальнікі» працягвалі шлях толькі наступнай ноччу: увесь светлы час прасядзелі, замаскіраваўшыся, у лесе.

Вельмі стомленыя, але шчаслівыя, вярнуліся ў лагер толькі 16 лютага. Арлова і яго работу самалётам адправілі ў Маскву.

Немцы лютавалі. Камендант Магілёва загадаў расстраляць сваіх салдат, якія павінны былі ахоўваць дом майстра. Арыштавалі сям'ю Арлова — жонку, трох дзяцей. Не знайшоўшы Арлова, фашысты расстралялі іх. Цудам выратавалася толькі дачка Ліля, якой не было дома, калі фашысты забіралі астатніх... На сённяшні дзень стол захоўваецца ў запасніку музея Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску.

*І. Бяляеў*

*«За камуністычную працу».20 снежня 1983.*

## Па старонках газеты «Партизанская правда» (пры Магілёўскім падпольным райкоме КП(б)Б)

### Партизаны «пошутили»

6 июля партизаны Н-ского отряда шли на боевую операцию. По пути они установили, что по железной дороге около поселка 1 Мая идет группа немцев. Решено было «пошутить». Бойцы незаметно подползли вплотную к дороге и ловко заложили мины.

Немцы приближались к этому месту. Тогда партизаны зашли им в тыл и заминировали еще одно место. Вскоре показалась вторая группа гитлеровцев.

Наши смельчаки зашли в тыл и этой группе, заминировали в третьем месте.

Вдруг раздался сильный взрыв — это первая группа немцев подорвалась на минах. К ней на помощь поспешила вторая группа, но второй взрыв и ее уничтожил. Через некоторое время раздался и третий взрыв — это следовавший за немцами поезд тоже наскочил на мины.

В результате было уничтожено более 10 гитлеровцев, разбиты 2 вагона, получил повреждение паровоз.

Но партизаны этим не удовлетворились. Они порезали телеграфные провода на расстоянии 3 км и спалили столбы. Так «пошутили» партизаны над немчурой. Остроумие и находчивость в этой «шутке» проявили Александр З., Семен К. и другие.

18.07.43 г. *Партизан А.*

**Наглость врага**

Стремительные и могучие удары Красной Армии в районах Орла, Белгорода, Брянска и Харькова расстроили планы гитлеровской грабармии. Фашисты оставляют свои укрепления, сдают город за городом, несут большие потери в людях и технике. Бандит Гитлер, пытаясь спасти себя от неминуемой гибели, приказал своим ставленникам срочно провести «мобилизацию» в занятых областях Белоруссии и отправляют их воевать против их же отцов и братьев. Гнусно и подло творят фашистские головорезы свои дела по городу Могилеву и району. Они производят «мобилизацию», устраивая облавы на людей по домам, на улицах, базарах, по кварталам города и по деревням. Насильно загоняют в лагерь и пачками отправляют на фронт и против партизан. Вонючая немчура советскими людьми старается заткнуть прорывы на фронте. Она насильно угоняет мужчин и женщин на каторгу в Германию.

Гитлеровские зверюги спешат провести эту «мобилизацию», ибо они знают, что им приходит конец на русской земле, что белорусский народ не простит им за их издевательства и мучения.

Граждане! Не попадайте фашистам в руки. Прячьтесь, переходите к партизанам, мстите озверелой немчуре!

Красная Армия у ворот нашей родной Белоруссии.

04.08.43 г. *В. Лесной*

**Прячьте хлеб**

Гитлер попытался и в этом году наступать летом, но получил по зубам и откатывается на Запад. Теперь он спешит забрать наш хлеб, не взирая ни на какие «нормы». Его фрицы, «народники» и полиция увозят с полей рожь в снопах. Так было в дер. Сенькове, Шеглицы, Песчанка и многих других. Крестьяне, прячьте хлеб! Хлеб — это ваша жизнь и жизнь ваших детей. Помогайте партизанам кормить немчуру свинцом и осиновым колом!

11.08.43 г.

**Боевой путь отряда**

Вечной славой покрыли себя сыны и дочери Белоруссии — партизаны и партизанки. В ожесточенных боях трудящиеся Могилевского района организовали отряды народных мстителей и беспощадно уничтожают немецких захватчиков. Они мстят за кровь и слезы своих братьев и сестер, за поруганную родную Беларусь.

На днях один из партизанских отрядов Могилевского района отмечал двухлетие своего существования, подвел итоги двухлетней борьбы с гитлеровскими мерзавцами. В двухлетней ожесточенной, тяжелой борьбе отряд вырос в несколько раз, хорошо вооружился, вырастил много преданнейших, храбрых и умелых бойцов и командиров. Он уже насчитывает немало отличившихся в боях партизан, он гордится ими, как лучшими сынами нашей любимой Родины.

Н-ский партизанский отряд за 2 года своего боевого пути разгромил 18 вражеских гарнизонов, уничтожил 2828 гитлеровцев, спустил под откос 12 вражеских эшелонов, уничтожил 12 паровозов, 111 вагонов, 23 автомашины, 42 мотоцикла и велосипеда, взорвал 5 железнодорожных и 24 шоссейных моста, 11 км ж.-д. полотна, уничтожил 30 км телеграфно-телефонной связи.

Отряд создан народом. Население его ценит, любит и оказывает ему всемерную помощь. Ежедневно в него вливается пополнение из лучших людей нашего района.

Славные народные мстители нанесли уже много смертельных ударов

по врагу, они оказывают большую помощь наступающей Красной Армии. В наступивших решительных схватках они еще больше усиливают свои боевые действия, еще больше увеличивают свои героические подвиги.

Народ, Родина вечно будут помнить своих героев!

20.09.43 г. *Б-в*

**Больше мести!**

Кровожадный Гитлер чувствует свою близкую и неизбежную гибель. Но ярость этого бешеного зверя не только не уменьшается, а, наоборот, стала еще беспощаднее по своей жестокости.

За последнее время в деревнях и в городе Могилеве особенно усилился шпионаж за всем мирным населением. Полиция усилила надзор за людными местами: кино, театр, закусочные, базар и другие, за каждым жителем.

В Могилеве гестапо проводит беспрерывные массовые аресты, хватает людей, бросает их в свои подвалы — эти гробы для заживо погребенных.

Люди, попавшие в фашистские когти, изнывают от нечеловеческих мучений, гниют от ран, погибают страшной смертью от голода, полома костей, побоев, зверских пыток и издевательств кровожадных палачей.

Тех же, кого фашистские звери еще не добили, полуживыми, голыми берут из Могилевской тюрьмы, загоняют в закрытые автомашины и увозят. Через некоторое время машины останавливаются в Палыковичском лесу, и из них выбрасывают трупы черные, как уголь.

22 июня с. г., справляя кровавый свой праздник — двухлетие подлого нападения на мирные наши города и села, немецкие захватчики таким образом нагрузили арестованными 12 автомашин и уничтожили их. Кровью нашего народа они отмечают свой праздник людоедов.

26 июля еще 10 автомашин арестованных были таким же способом уничтожены.

Палыковичский лес — этот безмолвный свидетель, сколько сотен и тысяч он видел таких черных трупов, трупов наших дорогих отцов и матерей, братьев и сестер, трупиков маленьких невинных деток!

Остервенелый бандит Гитлер стал в тысячу раз хуже самого страшного лютого зверя. Не хватает человеческих слов, чтобы рассказать о тех зверствах, на которые способны гитлеровские людоеды и их цепные собаки — полицейские.

Но все их старания, вся их лисья хитрость, наглый обман, ложь, вся их собачья брехня и никогда в мире невиданные чудовищные зверства не смогут предотвратить неминуемый их конец.

Палыковичский лес видит и слышит, но молчит, а народ же наш не молчит. Все шире и шире разгорается неудержимое пламя народного гнева и беспощадной мести. Народ мстит за сожженные немецкими захватчиками города и села, за зверски замученных братьев и сестер, мстит за их слезы и кровь, за сожженных невинных деток.

Товарищи, больше мести!

Больше беспощадной мести за наши семьи, за наш советский народ, за любимую Родину нашу!

Пусть пламенем народной кары горит земля под ногами немецко-фашистских захватчиков, их помощников — полицейских и других немецких холуев и собак.

Пусть земля наша станет их могилой, а проклятье преследует их в веках.

04.08.43 г. *Игорь Зоркин*

**Из Докладной секретаря Могилевского подпольного райкома КП(б)Б И. П. Станкевича и командира ВОГ К. М. Белоусова секретарям ЦК КП(б)Б П. К. Пономаренко и П. З. Калинину**

26 марта 1944 г.

Коммунистами, комсомольцами, партизанами Могилевского района с 10 марта производится сбор средств в фонд обороны СССР. По 25 марта среди партизан и населения собрано наличными деньгами — 96 тыс. руб., облигациями займов — 75 тыс. руб. Серебра (лом) и денег — около 5 кг. Золота (лом) — 30 г. Зерна свыше 500 пуд. Средства сданы подпольному обкому... Сбор средств продолжаем.

Секретарь подпольного РК КП(б)Б И. П. Станкевич
Командир ВОГ [при] РК КП(б)Б К. М. Белоусов

*НАРБ, ф. 4160, оп. 1, спр. 12, л. 19.*

## Вызваленне

**Сводка Совинформбюро за 28 июня 1944 г.**

Войска 2-го Белорусского фронта, форсировав реку Днепр на участке протяжением в 120 километров, прорвали вторую оборонительную полосу немцев, подготовленную ими по западному берегу реки, и штурмом овладели крупным областным центром Белоруссии — городом Могилевом, а также с боями заняли районные центры Могилевской области город Шклов, город Быхов и более 450 других населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Подкняженье, Уланово, Черное, Сеньково, Дубровка, Браково, Голынец 1-й и 2-й, Новая и Старая Лежневка, Бовшев, Липовка, Ходутичи, Мокрое и железнодорожные станции Копысь, Шклов, Лотва, Полыковские Хутора, Буйничи, Дашковка, Барсуки, Борколабово, Ямница, Быхов. В бою за Могилев разгромлена 12-я пехотная дивизия немцев, командир которой генерал-лейтенант Бамлер взят в плен вместе с его штабом. Взят также в плен комендант города Могилева генерал-майор Эрдмансдорф...

## Магілёўская аперацыя 1944 г.

Магілёўская наступальная аперацыя войск 2-га Беларускага фронту (генерал-палкоўнік Г. Ф. Захараў) 23—28 чэрвеня была састаўной часткай Беларускай аперацыі 1944.

У аперацыі ўдзельнічалі арміі: 49-ая (генерал-лейтэнант І. Ц. Грышын), 50-ая (генерал-лейтэнант І. В. Болдзін); 33-яя (генерал-лейтэнант В. Дз. Кручонкін); 4-ая паветраная (генерал-палкоўнік авіяцыі К. А. Вяршынін). Войскам 2-га Беларускага фронту ставілася задача — ва ўзаемадзеянні з войскамі левага крыла 3-га і правага крыла 1-га Беларускага франтоў разграміць магілёўскую групоўку праціўніка, вызваліць Магілёў і выйсці на р. Бярэзіна. Партызаны Магілёўскай і ўсходніх раёнаў Мінскай вобласцей атрымалі заданне разбураць камунікацыі праціўніка і аказваць садзеянне савецкім войскам пры фарсіраванні водных перашкод.

На Магілёўскім напрамку Чырвонай Арміі процістаялі 8 пяхотных і 2 матарызаваныя дывізіі 4-ай арміі ня-

мецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр», якія займалі глыбокаэшаланіраваную (60 км) абарону. Магілёў быў аперазаны трыма абарончымі рубяжамі. Праціўнік падрыхтаваўся да кругавой абароны. За 6—10 сутак да пачатку наступлення савецкая авіяцыя далёкага дзеяння правяла аперацыю па знішчэнню варожых самалётаў на аэрадромах. У ноч напярэдадні аперацыі часці авіяцыі далёкага дзеяння і бамбардзіроўшчыкі нанеслі ўдар па вузлах абароны і артылерыйскіх пазіцыях праціўніка.

Галоўны ўдар у напрамку на Магілёў наносілі войскі 49-ай арміі. Для ажыццяўлення прарыву на гэтым участку была створана франтавая рухомая група, у якую ўвайшлі 2 танкавыя брыгады, самаходны артполк, стралковая дывізія, штурмавая сапёрная і знішчальнапроцітанкавая арт. брыгада. Рухомая група павінна была фарсіраваць Днепр на поўнач ад Магілёва, захапіць плацдарм і ўтрымліваць яго да падыходу галоўных сіл 49-ай арміі. Войскі 33-яй і 50-ай армій трывала ўтрымлівалі рубяжы, якія займалі і былі гатовы праследваць праціўніка пры яго адыходзе.

23 чэрвеня раніцай войскі 49-ай арміі перайшлі ў наступленне: фарсіравалі р. Проня, прарвалі абарону ворага на 12-кіламетровым участку, аднак прасунуліся толькі на глыбіню 5—8 км. Узнікла пагроза леваму флангу 49-ай арміі з боку чавускай групоўкі праціўніка, і 24 чэрвеня ў бой быў уведзены правафланговы 121-ы стралковы корпус 50-ай арміі. У ноч на 24 чэрвеня часці корпуса пераправіліся цераз Проню, зламалі супраціўленне праціўніка, разам з часцямі 49-ай арміі фарсіравалі р. Бася і 25 чэрвеня вызвалілі Чавусы.

Войскі 49-ай арміі да зыходу 25 чэрвеня дасягнулі р. Рэста; на гэты ж рубеж падышлі і правафланговыя часці 50-ай арміі. У выніку 3-дзённых цяжкіх баёў пазіцыі праціўніка былі прарваны па фронту да 70 км і на глыбіню да 30 км. 26 чэрвеня, пасля прарыву абарончага рубяжа праціўніка на р. Рэста, войскі 33-яй і 49-ай армій праследавалі праціўніка ў напрамку Шклова і Магілёва. Увечар 49-ая армія выйшла на поўнач ад Магілёва да Дняпра і часткай сіл фарсіравала яго з ходу на захад ад Плешчыцы. У той жа дзень праследаванне праціўніка пачалі весці войскі 50-ай арміі. 27 чэрвеня яны фарсіравалі Дняпро на поўдні ад Магілёва, авалодалі прадмесцем Лупалавам і злучыліся з часцямі 49-ай арміі. Спробы праціўніка затрымаць наступленне савецкіх войск поспеху не мелі, і 28 чэрвеня ў выніку штурму быў вызвалены Магілёў. Праціўнік страціў каля 6 тыс. забітымі, каля 3400 палоннымі.

Чырвонай Арміі дапамагалі партызаны: за тры дні да аперацыі метадам «рэйкавай вайны» яны пачалі разбураць чыгуначныя камунікацыі ворага, паралізавалі яго перавозкі (толькі на чыгунцы Орша—Магілёў падарвалі больш за 5 тыс. рэек і два масты), захоплівалі і ўтрымлівалі да падыходу савецкіх войск зручныя рубяжы, пераправы, плацдармы на рэках.

У ходзе Магілёўскай аперацыі войскі 2-га Беларускага фронту скавалі на Магілёўскім напрамку значныя сілы ворага, пазбавіўшы яго магчымасці ажыццявіць манеўр рэзервамі на галоўным напрамку — у паласе наступлення 1-га і 3-га Беларускіх франтоў, а таксама арганізавана адвесці свае часці за Бярэзіну, што ў далейшым садзейнічала акружэнню і знішчэнню групоўкі праціўніка ў раёне на ўсход ад Мінска.

За гераізм у Магілёўскай аперацыі 92 савецкім воінам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза; 21 вайсковае злучэнне і часць атрымалі ганаровыя назвы «магілёўскіх»; 32 — «верхнеднепроўскіх».

*У. І. Лемяшонак. Магілёўская аперацыя. 1944. У кн.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945. Энцыкл. С. 319—320.*

## Напярэдадні Магілёўскай аперацыі

Яшчэ вясной 1943 г., пасля паражэння пад Сталінградам, нямецка-фашысцкае камандаванне прыняло ўсе меры для ўмацавання правага берага Дняпра. 11 жніўня 1943 г. Гітлер аддаў загад аб тэрміновым будаўніцтве так званага «ўсходняга валу», галоўнай часткай якога былі абарончыя збудаванні па Дняпры. Менавіта Днепр, які меў у сваім сярэднім цячэнні вялікую шырыню і глыбіню, а ў дадатак да гэтага і высокі правы бераг, уяўляў сур'ёзную натуральную перашкоду для наступаючых войск. «Скорее Днепр потечет обратно, нежели русские преодолеют его», — заявіў Гітлер на адной з нарад у Берліне.

Вораг разумеў, што з Дняпра адкрываюцца шляхі ў Польшчу, Карпаты і на Балканы.

Поспехі Чырвонай Арміі прымусілі штаб вермахта пайсці на неардынарныя меры. На Усходні фронт былі перакінуты з Заходняй Еўропы тры танкавыя і некалькі пяхотных дывізій, а таксама шматтысячныя маршавыя папаўненні. Пасляваенны германскі гісторык Рыкер сведчыць, што «Лінія Дняпро — Сож павінна была стаць тым «валам», аб які рускія зламалі б сабе шыю...».

Стаўка ВГК, улічваючы больш-менш спрыяльную абстаноўку, што склалася, па яе меркаванню, к канцу жніўня 1943 г. на савецка-германскім фронце, загадала войскам усіх франтоў перайсці ў агульнае наступленне ў паласе ад Вялікіх Лук да Чорнага мора. Ставілася мэта пазбавіць праціўніка магчымасці замацавацца на абарончых рубяжах, нанесці яму сакрушальны ўдар і выгнаць за лінію Смаленск — рака Сож — сярэдняе і ніжняе цячэнне Дняпра.

У гэтай сітуацыі рашаючае значэнне набываў **фактар часу**. З улікам менавіта гэтага і планавалася аперацыя, яе тэрміны і тэмпы. Вялікую ролю ў выкананні запланаванага адыграла дырэктыва Стаўкі ВГК ад 9 верасня 1943 г., у якой звярталася асаблівая ўвага на фарсіраванне буйных водных перашкод **з ходу** і прадпісвалася прадстаўляць найбольш вызначыўшых байцоў і камандзіраў да звання Героя Савецкага Саюза.

Нямецкае камандаванне лічыла, што падрыхтоўка рускіх для фарсіравання Дняпра зойме як мінімум месяц. Генералам вермахта і ў галаву не магло прыйсці, што савецкія войскі пасля грандыёзнай Курскай бітвы, а затым цяжкага наступлення па выхаду да Дняпра, кінуцца з ходу фарсіраваць такую сур'ёзную перашкоду, як Днепр, на бярвеннях, плоціках, рыбацкіх лодках і інш. У гэтым была іх галоўная памылка.

Савецкія войскі амаль адначасова выходзілі да Дняпра шырокім фронтам — ад Лоева да Запарожжа.

Першымі ў Беларусі фарсіравалі Дняпро на тэрыторыі Беларусі войскі 13-ай арміі (камандуючы генерал-лейтэнант М. П. Цухаў) непадалёку ад вусця Прыпяці. Выкарыстоўваючы захопленыя партызанамі пераправы, некаторыя перадавыя падраздзяленні арміі ўжо 21 верасня пераадолелі раку і замацаваліся на яе правым беразе. К зыходу 23 верасня яны адкінулі праціўніка на 35 км ад Дняпра.

Ужо за першыя баі на беларускай зямлі 12 байцоў і камандзіраў 360-га стралковага палка на чале з яго камандзірам былі прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх быў і наш зямляк — камандзір роты беларус Ігнат Мацкевіч.

24 верасня 1943 г. дзве стралковыя дывізіі 50-ай арміі — 108-ая і 110-ая (камандзіры — палкоўнікі П. А. Церамаў і В. А. Гужавін) фарсіравалі беларускую раку Іпуць, а 26 верасня

вызвалілі першы раённы цэнтр Магілёўскай вобласці — Хоцімск.

Да канца лістапада 1943 г. усе войскі 10-ай, 49-ай і частка сіл 50-ай армій выйшлі к р. Проня. Наперадзе быў Магілёў. На подступах да яго 50-ая армія атрымала загад замацавацца на дасягнутых рубяжах. У магілёўскай аперацыі на першую ролю выходзілі войскі 49-ай арміі генерал-лейтэнанта Грышына І. Ц.

*Болдин И. В. Страницы жизни. М., 1961. С. 221—222.*

*Долготович Б. Величие духа // Гомельскія ведамасці. 11 снежня 1993.*

*А. Ярохін*

**З Загада Гітлера № 11 ад сакавіка 1944 г.**

Ряд городов на Восточном фронте предназначается для создания укрепленных районов и оборудуются всеми силами и средствами в крепости.

Укрепленными районами командуют генералы. Управление личных дел назначает начальников штабов. Остальные офицеры, унтер-офицеры и солдаты откомандировываются от армий. Укрепленные районы могут быть подчинены только армии. Войска, находящиеся в укрепрайонах, обучить. Группам армий определить, сколько войск должно состоять в постоянном гарнизоне и сколько должно быть подброшено при наступлении противника. Комендант укрепрайона получает дисциплинарные права командующего корпусом только в случае окружения. При этом он ручается своей офицерской честью, что укрепрайон будет удержан во что бы то ни стало, даже при полном окружении его. Один лишь фюрер по ходатайству группы армий может дать приказ об оставлении укрепрайона.

*ЦАМО РФ, ф. 32, воп. 11309, спр. 211, л. 277.*

**Сведчыць генерал-маёр фон Эрдмансдорф[1] (12.07.1944 г.):**

...22.03. Я выехал на автомашине в штаб армии. Генерал-полковник Хейнрици (командующий 4-й армией.— *В. Л.*) принял меня только вечером, штаб армии находился в то время в лесу северо-восточнее Орши, непосредственно к югу от шоссе Смоленск—Минск, вблизи километрового столба 201. Хейнрици с самого начала отстаивал мнение, что устраивать из Могилева крепость и дать себя там окружить не имеет никакого смысла. Если нельзя будет удержать теперешнюю линию фронта, следовало бы держать рубеж по Днепру. Там якобы уже строятся позиции. Если и эту линию нельзя будет удержать, следует держать Березину, но в этом случае бессмысленно будет позволить противнику окружить города Могилев и Оршу... Он посоветовал мне не делать наружное кольцо обороны слишком большим. ...Начальником штаба я должен был взять подполковника Шербаума, бывшего до сих пор боевым комендантом Могилева.

23.03. Я выехал в Могилев.

В начале апреля пришел ...приказ Центральной группы армий: ...к строительству укрепрайонов приступить немедленно. Учитывая условия местности, следует соорудить несколько укрепленных рубежей: ...центральный, окраинный и наружный. ...К очистке поля обстрела приступить немедленно[2]. Затем начать строительство сооружений. Прежде всего — противотанковые препятствия на улицах и дорогах. Подготовить мосты к взрыву; соз-

[1] Генерал-маёр фон Эрдмансдорф 15.03.1944 г. быў прызначаны Галоўным камандаваннем сухапутных сіл Германіі камендантам умацаванага раёна Магілёва.

[2] Для гэтай мэты было знішчана больш за 600 дамоў, у тым ліку цэрквы, школы.

дать бетонированные наблюдательные пункты, убежище для раненых, хранилища боеприпасов, горючего и продовольствия. Подготовить командные пункты для различных командных инстанций; наладить проволочную связь; превратить отдельные дома и группы домов в опорные пункты и т. п.

Для обороны строительства сооружений в распоряжение предоставляются все силы германской армии, в том числе и вольнонаемные... Кроме того, — составить список предприятий, имеющих военное значение и требующих подрыва[1].

7.04. Я был вызван в Минск для дачи обязательства фельдмаршалу Бушу. Насколько я припоминаю, там присутствовали ...коменданты Витебска ...Минска ...Орши ...Борисова ...и др. Фельдмаршал ...подчеркнул, что при строительстве и при обучении войск, а также позднее в бою, нам следует действовать с беспощадной суровостью...

7.04.1944 г. Я ...подписал в штабе Центральной группы армий обязательство примерно следующего содержания: «С приказом фюрера № 11 ознакомился. Обязуюсь удерживать укрепрайон Могилев до последнего солдата, даже при условии окружения».

Это обязательство, данное мною, было подписано в трех экземплярах. Первый, предназначенный для фюрера, был, вероятно, отослан в Верховное командование вооруженных сил Германии или в Управление личных дел; второй оставался в штабе Центральной группы армий; третий экземпляр получил я и хранил в своих делах. 28.06.44 г. я сжег его вместе с другими документами.

Причину того, что Гитлер отдал приказ о создании укрепрайонов я вижу в том, что благодаря этому наиболее продолжительное время противник не может использовать железнодорожные и шоссейные пути, большая часть которых пересекает города, что благодаря этому как можно дольше сковываются значительные неприятельские силы и этим облегчается натиск их на другие войска, которым предоставляется возможность занять новые рубежи, находящиеся в тылу. В конце концов, это нужно и для того, чтобы иметь базу, использовав которую, при наличии достаточных сил можно будет вернуть потерянную позицию...

...26.06 примерно в 3.15 ночи мне доложили, что противник вторгся в город с юга и востока. Связи с какимилибо частями у меня уже не было. Считая дальнейшее сопротивление бессмысленным, я и генерал-майор Бамлер сдались в плен первому же русскому солдату...

Вышеизложенное написано мною собственноручно.

фон Эрдмансдорф,
генерал-майор...

*ЦАМО РФ, ф. 32, воп. 11309, спр. 211, л. 276—283.*

Генерал фон Эрдмансдорф праходзіў на судовым працэсе ў Мінску 15—29 студзеня 1946 г. па справе аб злачынствах, якія ўчынялі нямецка-фашысцкія захопнікі на Беларусі, як ваенны злачынец і быў прысуджаны да пакарання смерцю праз павешанне. Прысуд прыведзены да выканання 30 студзеня 1946 г. на іпадроме Мінска.

*Падрыхтаваў да друку і пракаменціраваў доктар гістарычных навук У. Лемяшонак*

[1] Меліся на ўвазе 25 прамысловых прадпрыемстваў Магілёва. Былі нават назначаны спецыяльныя атрады, якія павінны былі іх узарваць.

## Мы ішлі толькі наперад

**З успамінаў генерал-лейтэнанта Дз. І. Смірнова, Героя Савецкага Саюза**

У пачатку 1944 г. войскі 121-га стралковага корпуса, якім мне давялося камандаваць, рыхтаваліся да летняга наступлення па вызваленню Беларусі. Мяне выклікалі да камандуючага 50-ай арміі. Сустрэча праходзіла ў паласе будучага наступлення корпуса. Камандарм Іван Васілевіч Болдзін падрабязна пазнаёміў з задумай маючай адбыцца аперацыі, сутнасць якой заключалася ў наступным: галоўны ўдар па магілёўскай групоўцы непрыяцеля наносяць войскі 49-ай арміі; 50-ая ж армія ўтрымлівае займаемую паласу абароны і адначасова з гэтым павінна быць гатовай перайсці ў наступленне, маючы адзін стралковы корпус у другім эшалоне для ўвода яго ў бой — ці ў паласе 49-ай арміі (паўночны варыянт), ці ў паласе сваёй арміі (паўднёвы варыянт). Гэтым корпусам і з'яўляўся наш 121-ы. У яго састаў уваходзілі: 238-ая стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр І. Д. Краснаштанаў); 139-ая стралковая дывізія (камандзір палкоўнік В. А. Гусеў). З пачаткам наступлення корпуса былі перададзены з 49-ай арміі 144-ая гарматная артылерыйская брыгада, 81-ы гаўбічны артылерыйскі полк, 325-ы гвардзейскі мінамётны полк і армейскія танкавыя і артылерыйска-процітанкавы палкі, 2 сапёрных батальёны. Авіяцыйнае і зенітнае прыкрыццё войск корпуса павінна было ажыццяўляцца загадам камандуючага арміяй. Асаблівая ўвага камандзіраў злучэнняў і прыдадзеных часцей звярталася на дэтальную маскіроўку ў час руху і скрытае распалажэнне войск у раёнах сканцэнтравання.

Раніцай 27 чэрвеня 238-ая і 139-ая стралковыя дывізіі выйшлі да Дняпра, авалодалі Лупалавам і **сходу на падручных сродках** пачалі пераправу праз Дняпро: на бочках, варотах, звязаных у платы бярвеннях, на рыбацкіх лодках і проста ўплаў. Падраздзяленні і часці абедзвюх дывізій з кулямётамі, батальённымі і палкавымі мінамётамі, батальённай і палкавой артылерыяй да 12 гадзін пераправіліся праз Дняпро, але рухацца далей не маглі з-за моцнага артылерыйскага мінамётнага і кулямётнага агню непрыяцеля. Мы ж не змаглі разам з пяхотай пераправіць карпусную армейскую артылерыю, гаўбічныя артылерыйскія дывізіёны і танкі, бо не было закончана будаўніцтва маста. Але, каб падтрымаць агнём часці, якія пераправіліся, мы пусцілі танкі і гарматы ўздоўж шашы ля Дняпра на прамую наводку. Падтрыманыя такім чынам дывізіі па рэчышчу Дняпра падышлі ўшчыльную да Магілёва. Не чакаючы будаўніцтва маста, сапёры і выдзеленыя для гэтай мэты нашы часці пачалі рабіць платы вялікай грузападымальнасці, на якіх і пераправілі дывізіённую процітанкавую артылерыю, акрамя гаўбічнай артылерыі дывізій, танкаў і армейскай артылерыі.

Да 17 гадзін часці абедзвюх стралковых дывізій і процітанкавая артылерыя занялі зыходнае становішча для штурму Магілёва. Агнявыя налёты змяняліся атакамі, баі ішлі бесперапынна. Да 21-ай гадзіны фарсіравалі Дняпро і часці 330-ай стралковай дывізіі палкоўніка Гусева. На гэты раз атака завяршылася паспяхова. Войскі трох стралковых дывізій уварваліся ў цэнтр Магілёва.

28 чэрвеня ў 6 гадзін раніцы камандзіры дывізій генералы Краснаштанаў, Кірылаў і палкоўнік Гусеў дакладвалі, што горад поўнасцю ачышчаны ад ворагу, узята ў палон звыш 3 тысяч салдат і афіцэраў, захоплены штаб 12-ай нямецкай пяхотнай дывізіі на чале з яе камандзірам, а таксама камендант ма-

гілёўскага ўмацаванага раёна. Я загадаў даставіць палонных на КП.

Мужна змагаліся пры фарсіраванні Дняпра байцы і камандзіры 238-ай стралковай дывізіі. У баях за в. Палавінны Лог загінуў смерцю героя камуніст Дудакоў, які паўтарыў подзвіг Матросава. Камандзір коннай разведкі 830-га стралковага палка 238-ай стралковай дывізіі старшы лейтэнант Мікалай Іванавіч Яшын першым са сваімі байцамі фарсіраваў Дняпро у раёне Магілёва. Воіны ўварваліся ў горад і ўступілі ў рукапашны бой; яны ўтрымалі захоплены плацдарм і забяспечылі пераправу часцям дывізіі. Старшы лейтэнант М. І. Яшын загінуў на правым беразе ракі смерцю храбрых. За мужнасць і гераізм яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Калі 1-ы батальён 843-га стралковага палка 238-ай стралковай дывізіі фарсіраваў Днепр і вымушаны быў пад моцным агнём непрыяцеля залегчы, санітарка Васільева першая паднялася ў атаку і падняла за сабой байцоў батальёна, камандзір якога загінуў.

Пры фарсіраванні Дняпра вызначыліся 837-ы стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Разумава, а таксама 2-і батальён 843-га стралковага палка, якім камандаваў маёр Хвосцікаў.

Гераічна змагаліся ў Магілёўскім раёне воіны 330-ай стралковай дывізіі. 1113-ы стралковы полк, якім камандаваў падпалкоўнік Касовічаў Я. Ф., вызваліў саўгас «Буйнічы», імкліва выйшаў на шашу Магілёў — Мінск і разам з перадавым атрадам 64-ай стралковай дывізіі знішчыў сотні немцаў і вялікую колькасць баявой тэхнікі. Умела вёў бой камандзір 2-га батальёна старшы лейтэнант Гурэвіч. Байцы гэтага батальёна за чатыры гадзіны бою знішчылі да 500 немцаў, якія спрабавалі вырвацца з Магілёва на Мінск.

Тут жа, на месцы боя, уручаліся ўзнагароды. За разумны, без страт ход бою і за разгром варожай групоўкі, падпалкоўніку Касовічаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

*Смирнов Д. И. 121-й стрелковый корпус в боях за освобождение Белоруссии. У кн.: Освобождение Белоруссии. 1944. М., 1974. С. 646—651.*

## Вёска Сухары ў агні

Жорсткія баі ішлі за в. Сухары, якая знаходзілася ўздоўж важнай магістралі Рэсна — Магілёў. Утрыманню яе непрыяцель прыдаваў вялікае значэнне і надзейна тут умацаваўся. У Сухарах размяшчаўся вялікі нямецкі гарнізон. Уся мясцовасць прастрэльвалася. Фашысты нават высеклі кусты ля рэчышча. Кулямётчыкі абаснаваліся ў царкоўным купале і палівалі свінцовым агнём савецкіх салдат, як толькі яны падымаліся ў атаку. Тады на дапамогу прыйшлі артылерысты, агнём праклаўшы калідор для новай атакі. І зноў падымаліся ў бой батальёны, і зноў моцны агонь спыняў іх. Тады ноччу ў тыл праніклі разведчыкі. Мясцовыя жыхары, якія хаваліся ў лесе, паказалі ім, дзе знаходзяцца агнявыя кропкі гітлераўцаў. Па іх ударыла артылерыя, і новы штурм вышыні, на якой стаяць Сухары, прынёс у вёску радасць вызвалення. У гэтым цяжкім кровапралітным баі загінулі смерцю герояў 60 савецкіх воінаў. Сярод іх — Герой Савецкага Саюза Ю. М. Двужыльны.

*Г. Сідарэнка*

**Успамінаюць ветэраны тых далёкіх баёў**

**Фёдараў М.,** ветэран 369-ай стралковай дывізіі:

— У Магілёўскай наступальнай аперацыі ў складзе 49-ай арміі генерал-лейтэнанта І. Г. Грышына 2-га Беларускага фронта актыўны ўдзел прымала 369-ая Крычаўская стралковая дывізія. На працягу ночы з 26 на 27 чэрвеня 1944 г. пасля ўдзелу ў вызваленні Чавускага раёна дывізія перанесла ваенныя дзеянні на тэрыторыю Магілёўскага раёна. Непрыяцель моцна супраціўляўся паўночней в. Бароўка, але часці дывізіі, зноў і зноў атакуючы яго, у 7 гадзін 30 хвілін 27-га прыціснулі ворага на ўчастку Любуж да ўсходняга берага Дняпра і імклівым ударам адкінулі на заходні бераг.

Першымі фарсіравалі Дняпро на гэтым участку раніцой 27 чэрвеня 4-ая стралковая рота старшага лейтэнанта Казлова 2-га стралковага батальёна 1227-га стралковага палка і разведатрад гэтага ж палка пад камандаваннем намесніка камандзіра палка маёра Голубева. Яны занялі і ўтрымлівалі плацдарм на правым беразе.

У 12 гадзін поўнасцю фарсіравалі Дняпро 1227-ы, 1225-ы, а трохі пазней 1223-і стралковыя палкі, якія затым працягвалі наступленне ў напрамку Магілёва. Да 14 гадзін савецкія часці занялі выгадныя пазіцыі на рубяжы в. Палавінны Лог. У 19 гадзін пасля артпадрыхтоўкі пачаўся штурм, і ў 19.20 1225-ы стралковы полк заняў усходні ўскраек Магілёва. Увечары 28 чэрвеня горад быў поўнасцю вызвалены.

Напярэдадні вызвалення Магілёва 25 чэрвеня ў раёне в. Драчкава геройскі загінуў камандзір 369-ай стралковай дывізіі генерал-маёр І. С. Лазарэнка. Пасля яго камандзірам дывізіі быў прызначаны палкоўнік П. С. Галайка.

Пры вызваленні населеных пунктаў Магілёўскага раёна і фарсіраванні Дняпра вызначыліся стралкі 1227-га стралковага палка С. М. Кавалёў, П. І. Беражных, кулямётчыкі Н. І. Уладзіміраў, Н. І. Крынчанка, сяржант К. М. Таўрыдзян, санінструктар Р. С. Аляксеенка і інш. Мужнасць і адвагу праявілі ў баях за Магілёўскі раён стралкі В. В. Бучнёў, А. Ф. Завілішын, камандзір узвода Н. М. Стральцоў, наводчык станкавага кулямёта І. А. Шалашоў і інш. Так, напрыклад, старшы сяржант Таўрыдзян, камандзір кулямётнага разліку, знішчыў 20 агнявых кропак непрыяцеля. Ён быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Такой жа ўзнагароды ў баях на Магілёўшчыне быў удастоены радавы А. В. Далгаполаў, які адным з першых уварваўся ў траншэю фашыстаў, сваім прыкладам узняў у атаку таварышаў.

Знаходлівасць і смеласць праявіў пры фарсіраванні Дняпра заражаючы батарэі радавы Ф. Г. Тараненка. Пераправіўшы гармату на супрацьлеглы бераг ракі, ён садзейнічаў знішчэнню двух стратэгічна важных для фашыстаў агнявых кропак, знішчыў некалькі нямецкіх салдат. Аўтаматчык А. І. Бацанаў дваіх гітлераўцаў захапіў у палон. Камандзір Н. М. Стральцоў разам са сваім узводам забяспечыў бесперабойную дастаўку на нашы агнявыя пазіцыі боепрыпасаў; наводчык станкавага кулямёта І. А. Шалашоў, знішчыўшы на беразе Дняпра каля дзесяці нямецкіх салдат і афіцэраў, дваіх узяў у палон.

**Шнаркевіч М. М.,** былы разведчык:

— За 34 дні да пачатку аперацыі «Баграціён», 19 мая 1944 г. пасля шпіталя я зноў прыбыў на перадавую. Залічылі мяне старшым разведчыкам. І хаця пазней, калі наш камандзір выбыў са строю, мяне прызначылі на



М. М. Шнаркевіч

яго месца, тады я быў у разведцы навічком, камандаваў да гэтага кулямётным аддзяленнем. І тут я вельмі ўдзячны Якаву Усіку, з якім моцна пасябраваў. Ён быў старэйшы за мяне па ўзросту і меў вялікі вопыт разведчыка, адчуваў сябе ў разведцы як рыба ў вадзе. Мы сталі разведпарай, гэта значыць, напарнікамі па разведцы. Якаў многаму навучыў мяне.

Раніцою 25 чэрвеня, за суткі да фарсіравання Дняпра перадавым атрадам дывізіі, мы з ім здолелі захапіць і даставіць у штаб двух «языкоў» — немца і чэха.

Асабліва засталіся ў памяці баі за Сухары. Некалькі разоў мы ішлі ў атакі, палягло многа хлопцаў. У баі за вёску цяжка паранілі і майго сябра Якава Усіка. Мы аднеслі яго на палявы медпункт, а самі ўсю ноч прарываліся са сваім падраздзяленнем да Дняпра. Я быў упэўнены, што як толькі Якаў падлечыцца, ён пастараецца мяне адшукаць.

Раніцой 26 чэрвеня перадавы атрад дывізіі фарсіраваў Дняпро паўднёвей в. Трыбухі (зараз Калінавая) і заняў плацдарм на яго правым беразе. Цэлы дзень не змаўкаў агонь. Здавалася б, што там за плошча — нейкія два кіламетры ў шырыню і паўтара ўглыб, але гэта быў важны плацдарм: з яго напрамую можна было наносіць удар па фашыстах. Усё ж такі вораг пакаціўся назад, і раніцой 27-га Дняпро фарсіравала ўся наша 199-ая стралковая дывізія. Наступалі імгненна. Да 7 гадзін мы ўжо былі ў Палыкавічах, у 11.00 перарэзалі чыгуначную лінію Орша—Магілёў, што ў шасці кіламетрах паўночней Магілёва. Да 19.00 былі вызвалены Казіміраўка і Цішоўка. Такім чынам, замкнулася кола акружэння Магілёва. На наступны дзень, ледзь пачало світаць, сталі адбіваць атакі праціўніка, які хацеў прарвацца з горада. К зыходу дня фарсіравалі Вабіч, 28-га вызвалілі апошнія вёскі Магілёўшчыны — Асавец і Забалоцце...

У складзе дывізіі я прайшоў з баямі далей праз Беларусь, Польшчу, быў тройчы паранены.

Адразу пасля вайны некалькі разоў пачынаў шукаць Якава Усіка. Але ўсё было дарэмна. Цешыў сябе надзеяй на сустрэчу з ім у Сухарах, якую арганізавалі ветэраны дывізіі з выпадку 45-ай гадавіны вызвалення Магілёўскага раёна. І сустрэча адбылася, толькі зусім не такая, якую чакаў: разам з мясцовымі жыхарамі мы наведалі помнік загінуўшым байцам нашай дывізіі, што стаіць у вёсцы. Там, на абяліску, я прачытаў і прозвішча Якава Усіка... Аказваецца тая рана ў баі за Сухары аказалася смяротнай. Якаў Усік аддаў жыццё за гэтую зямлю, як і многія-многія нашы таварышы. Няхай жа яна памятае іх імёны...

**Чурыкаў М. С.,** былы камандзір разведузвода, Герой Савецкага Саюза:

— 95-ай дывізіі прадстаяла фарсіраваць Дняпро паўночней Магілёва, каля в. Калясішча. Камандаванне даручыла майму ўзводу (я тады быў малодшым лейтэнантам) на падручных сродках пераправіцца праз Дняпро каля галоўнай пераправы і захапіць плацдарм на заходнім беразе ракі.

Ноччу, 28 чэрвеня, узвод уброд перайшоў забалочаную мясцовасць і на бярвеннях і вязанках хмызняку, прыкрытых плашч-палаткамі, пераправіўся

праз раку. Вораг нічога не заўважыў. Замацаваўшыся, узвод падрыхтаваўся да бою, каб з надыходам раніцы адкрыць агонь па фашыстах. Я выжыдаў, пакуль на пераправе сканцэнтруецца як мага больш немцаў. Яны адыходзілі на заходні бераг ракі, не ведаючы, што там мы, спяшаліся хутчэй пераправіцца. У гэты час мой узвод адкрыў знішчальны агонь. На пераправе ўзнікла паніка. Апамятаўшыся, немцы адкрылі па ўзводу мінамётна-артылерыйскі агонь, варожыя роты пайшлі на нас. Сілы аказаліся няроўнымі. У нас ужо былі параненыя, усё менш заставалася патронаў, гранат. Калі боепрыпасаў амаль не стала, мы, а нас засталося толькі дзевяць, усталі ва ўвесь рост і пайшлі ў рукапашную. Перад гэтым пакляліся: «Загінем за Радзіму, але не адступім». Немцы не вытрымалі і пусціліся ўцякаць, тым больш што з процілеглага берага, дапамагаючы нам, адкрыў агонь наш мінамётны батальён. Да канца бою нас засталося трое: камандзір першага аддзялення Васільеў, мой сувязны і я...

30 чэрвеня я быў паранены, а 21 ліпеня 1944 г. даведаўся, што за бой на заходнім беразе ракі Дняпро мне прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

**Захараў А. М.,** удзельнік баёў пад Палыкавічамі, Герой Савецкага Саюза:

— Вы назіралі за разваротам птушкі? Вось ляціць яна, і раптам левае крыло плаўна ўзнімаецца ўверх, а правае стралою апускаецца ўніз...

Калі едзеш па дарозе праз Палыкавічы да Калінавай, успамінаецца гэта карціна: цела птушкі нагадвае вясковая вуліца, левае крыло — узвышша, якое абрамляе лясок, правае — стужка Дняпра, што цягнецца з невялікімі паваротамі амаль паралельна вёсцы. Калі стаяць на ўзвышшы, рака відаць як на далоні. Адсюль, з вышыні, яна здаецца ціхай і спакойнай, а пойма —



А. М. Захараў

зялёнай і роўнай, як водная паверхня. А якімі ж цяжкімі і доўгімі былі гэтыя нешматлікія кіламетры для воінаў 199-ай Смаленскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава і Кутузава стралковай дывізіі...

Летам 1944 г. менавіта ў гэтым месцы пад градам куль непрыяцеля, які размясціўся на ўзвышшы, яны фарсіравалі Дняпро. Прарываючыся нізінай, выбівалі ворага з вышыні і рухаліся з баямі на Магілёў. Колькі нашых палягло ў гэтым зялёным рэчышчы!

Стаялі цёплыя чэрвеньскія дні. Наш 2-і батальён 199-ай Смаленскай стралковай дывізіі пасадзілі на танкі і паставілі задачу: праследваючы непрыяцеля, з ходу фарсіраваць раку і заняць плацдарм. Вораг аказаўся на вышыні, мы ж фарсіравалі раку ў раёне в. Трыбухі (зараз Калінавая) і былі фактычна ў нізіне. План быў дзёрзкім. Мы кіраваліся двума момантамі. З аднаго боку, здаецца, непрыяцель і не чакаў нас тут: мы ж былі б у яго як на далоні. З другога боку — разлічвалі на раптоўнасць, нечаканасць удару. Але як бы там ні было, фарсіраваць раку на падручных сродках батальёну давялося пад моцным агнём непрыяцеля. Ледзь дабраўшыся да берага, мы ўступілі ў бой. Наш плацдарм пашыраўся. Немцы неаднаразова прадпрымалі контратакі. Мы іх адбівалі, але сілы нашы таялі. Мне як камандзіру

кулямётнага ўзвода даводзілася бегаць ад кулямёта да кулямёта і самому весці агонь, бо кулямётчыкі выходзілі са строю адзін за другім. Загінуў камандзір роты, і давялося прыняць камандаванне ротай на сябе. А вораг зноў атакаваў. Яго пяхоту прыкрываў танк, які ішоў якраз на нашу кулямётную кропку. Немцы пад абаронай свайго «тыгра» нагла крычалі. Я загадаў наводчыку працягваць агонь з кулямёта, каб адсячы пяхоту ад танка, а сам з процітанкавымі гранатамі папоўз насустрач «тыгру». Параўняўшыся з ім, кінуў гранату. Танк запылаў. Контратака ворага была адбіта. Мяне кантузіла, але я працягваў камандаваць ротай. Хутка падыйшла дапамога, і мы пайшлі ўперад. 27 чэрвеня Палыкавічы былі вызвалены.

**Вахненка В. А.,** былы камандзір роты 617-га палка 199-ай стралковай дывізіі:

— У ходзе баёў за вызваленне Беларусі нашы часці атрымалі папаўненне. Шмат маладых байцоў 1926 г. нараджэння ўлілося ў роту, якой я камандаваў. Мы вучылі іх ваеннай справе паблізу ад фронту, па сутнасці, у баявых умовах. У траншэях поўнага профілю «абкатвалі» танкамі, вучылі стральбе з імітацыяй выбухаў снарадаў і бомбаў.

За тры дні ўпартых баёў мы выйшлі да Дняпра паўночней Магілёва. Заняўшы выгаднае становішча на высокім беразе, гітлераўцы імкнуліся не дапусціць яго фарсіравання нашымі войскамі. Рота, якой я камандаваў, знаходзілася ў авангардзе. У 2—3 кіламетрах ад Дняпра нас нагнала калона танкаў Т-34. На «вілісе» ехаў камандзір дывізіі генерал-маёр Кананенка. «Роце разам з батальёнам танкаў захапіць драўляны мост ля вёскі Трыбухі і забяспечыць плацдарм на правым беразе Дняпра!» — загадаў ён.

З гэтай адказнай задачай я пазнаёміў сваіх байцоў. Разам з танкамі мы рухаліся наперад. Калі наблізіліся да Дняпра, гітлераўцы сустрэлі нас моцным агнём. Мост «узляцеў» у паветра. Танкі спыніліся. Як быць? Нельга губляць часу. Ля Дняпра ў кустах знайшлі старую лодку, скацілі ў ваду некалькі бярвенняў і на іх пачалі перапраўляцца. Са мной былі малодшы лейтэнант Рахлін, старшы сяржант Новікаў, салдат Аляксандраў і інш. — усяго 12 чалавек. Вораг заўважыў і пачаў абстрэльваць. Але танкі і артылерыя прыкрывалі нас. Марудна адваёўвалі метр за метрам, пашыраючы плацдарм. Калі падыйшла дапамога, мы ўжо выбілі ворага з траншэй на ўскрайку вёскі.

Гітлераўцы лютавалі. Некалькі разоў кідаліся ў атаку. Вакол усё стагнала ад артылерыйскай кананады. Сувязь з левым берагам перарвалася. Настала крытычная хвіліна. Я выскачыў з траншэі і кінуўся наперад. За мной — мая рота. Гітлераўцы не чакалі атакі і адышлі. Нашаму поспеху садзейнічала мясцовасць: Трыбухі размешчаны ў 12 кіламетрах паўночней Магілёва на беразе Дняпра. Мясцовасць вакол была зрытая глыбокімі рытвінамі, недасягальная для варожых танкаў.

Некалькі разоў немцы спрабавалі атакаваць, але беспаспяхова. Вёска аставалася ў нашых руках. 27 чэрвеня часці Чырвонай Арміі атакавалі другую вёску, размешчаную некалькі паўднёвей в. Трыбухі. На другія суткі мы выйшлі да чыгункі і з поўначы наступалі на Магілёў.

За гэтыя баі байцы маёй роты былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод, а мне прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

*Запісала ўспаміны Г. Сідарэнка*

## Яго помняць не толькі ў Буйнічах

У ноч на 23 чэрвеня 1944 г. 364-ы стралковы полк 139-ай стралковай дывізіі выйшаў да тэрыторыі Беларусі. Падраздзяленні яго занялі зыходнае становішча для наступлення.

Набліжаўся світанак, калі над пярэднім краем ворага пранесліся вогненныя каметы — гэта «Кацюшы» далі сігнал артпадрыхтоўкі. Паветра раскалолася ад залпаў соцен гармат. Байцы чакалі сігналу да атакі. Нарэшце лейтэнант Мяльноў падняў сваіх байцоў:

— Узвод! За Радзіму! — і кінуўся наперад.

Наступленне было незвычайным: пяхоту суправаджаў вогненны вал. Снарады клаліся метраў у двухстах наперадзе. Артылерысты вялі агонь «з дакладнасцю да сантыметра», як самі любілі жартаваць, але бой — ёсць бой. Былі ў ім і забітыя, і параненыя. Цяжка паранены камандзір роты капітан Яршоў тэрмінова паклікаў да сябе лейтэнанта Мяльнова і загадаў яму часова камандаваць ротай.

Наступленне ішло па ўсяму фронту. 27 чэрвеня 364-ы полк выйшаў да Дняпра на поўдзень ад Магілёва. Камандзір палка падпалкоўнік Пятроў і камандзір першага батальёна капітан Філонаў вызначылі месца фарсіравання — плацдарм каля в. Буйнічы. Першай вырашана было паслаць групу Мяльнова, які лічыўся смелым, ініцыятыўным камандзірам.

Мяльноў папрасіў даць сапёраў для размініравання, удакладніў сігналы для выкліку агня артылерыі з закрытых агнявых пазіцый. Затым дасканальна вывучыў процілеглы бераг, вызначыў месца высадкі, скрытыя выхады з вады на абрывісты бераг. Усё было гатова да дзеянняў. На падручных сродках група Мяльнова з шасці чалавек фарсіравала Днепр, маланкавым ударам захапіла плацдарм і знішчыла агнявыя кропкі фашыстаў. Такім чынам, была забяспечана пераправа ўсяго батальёна. Уварваўшыся ў Буйнічы, Мяльноў пранік у будынак, дзе засялі гітлераўцы. Агнём з аўтаматаў, гранатамі былі знішчаны рэшткі фашыстаў, і над будынкам воіны-вызваліцелі ўзнялі чырвоны сцяг.




Мемарыяльная дошка ў в. Буйнічы

Захапіўшы Буйнічы, 364-ы полк накіраваўся на Магілёў. Рота Мяльнова зноў ішла наперад...

Загінуў адважны афіцэр Іван Міхайлавіч Мяльноў у баі пры вызваленні гарадскога пасёлка Свіслач Гродзенскай вобласці. За адвагу і гераізм, праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра, вызваленне Беларусі яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Не забыты лейтэнант Мяльноў на Магілёўшчыне: у в. Буйнічы ўстаноўлена ў яго памяць мемарыяльная дошка.

*А. Ярохін*

### З журнала баявых дзеянняў войск 2-га Беларускага фронту

...26.06.44. 1. Войскі 49-ай арміі фарсіравалі Дняпро на ўчастку Рэпалава, Дабрэйка (20 км на поўнач ад Магілёва). 2. Авалодалі гор. Горкі...

27.06.44. Войскі 33-яй і 49-ай армій галоўнымі сіламі фарсіравалі р. Дняпро на поўнач ад Магілёва; войскі 50-ай арміі правафлангавымі злучэннямі фарсіравалі р. Дняпро ў раёне на поўдзень ад Магілёва.

28.06.44. Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага № 93: «Войскі 2-га Беларускага фронту, якія фарсіравалі Дняпро на ўчастку працягласцю 120 км, прарвалі другую абарончую паласу немцаў, падрыхтаваную на заходнім беразе ракі, і сёння, 28 чэрвеня, штурмам авалодалі буйным абласным цэнтрам Беларусі — горадам Магілёвам — аператыўна важным вузлом абароны немцаў на Мінскім напрамку, а таксама з баямі занялі гарады Шклоў і Быхаў».

*ЦАМО РФ, ф. 237, воп. 2394, спр. 758, л. 25—26.*

*Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак*

## Прайшлі чорныя дні

25 тысяч жыхароў Магілёва з удзелам воінаў-вызваліцеляў і партызан сабраліся 1 ліпеня 1944 года на мітынг, прысвечаны вызваленню горада. На трыбуне прысутнічалі Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Н. Я. Наталевіч, першы сакратар Магілёўскага абкома партыі І. М. Макараў, старшыня аблвыканкома І. М. Карповіч, камандуючы войскамі 2-га Беларускага фронту Г. Ф. Захараў.

Жыхары горада выказалі пачуцці вялікай падзякі воінам і партызанам за вызваленне з фашысцкага рабства. У пісьме воінам 2-га Беларускага фронту, прынятым на мітынгу, яны запэўнілі савецкіх воінаў, што не пашкадуюць сіл для аднаўлення разбуранай фашыстамі народнай гаспадаркі, дапамогі Чырвонай Арміі. «Прайшлі чорныя дні нямецка-фашысцкай акупацыі, — пісалі ўдзельнікі мітынгу. — Мы зноў уліліся ў дружную сям'ю народаў вялікага Савецкага Саюза, зноў сталі свабоднымі і шчаслівымі грамадзянамі любімай сацыялістычнай Радзімы... Мы запэўніваем Вас, доблесныя воіны, што цяпер на вызваленай зямлі мы аддадзім усе нашы сілы і здольнасці на дапамогу Чырвонай Арміі, на аднаўленне разбуранага ворагам горада. Будзем працаваць з такімі намаганнямі, з якімі Вы, франтавікі, граміце на фронце гітлераўскую нечысць.

*НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 7, л. 51—52.*

*Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак*

## Нашы землякі — Героі Савецкага Саюза

**Алейнікаў Сяргей Пятровіч** (14.02.1909, в. Зацішша Магілёўскага раёна — 01.02.1984). Герой Савецкага Саюза (19.08.1944). Беларус, член КПСС з 1940 г. Заслужаны штурман-выпрабавальнік (1964).

У Чырвонай Арміі з 1928 г. Праз год закончыў Маскоўскую школу ВПС. У 1939—1940 гг. удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне. Са жніўня 1941 г. знаходзіўся на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Штурман авіяцыі далёкага дзеяння маёр Алейнікаў зрабіў 240 вылетаў на разведку і бамбардзіроўку аб'ектаў праціўніка. Удзельнічаў у баях пад Масквой, Сталінградам, Арлом, Ле-



С. П. Алейнікаў



М. І. Кучынскі



М. Я. Раманькоў



І. М. Саламонікаў

нінградам, на Беларусі, бамбіў ваенна-прамысловыя аб'екты ў фашысцкай Германіі. Да 1974 г. знаходзіўся на лётна-выпрабавальнай рабоце.

**Кучынскі Міхаіл Іванавіч** (23.12.1911, в. Прысна Магілёўскага раёна). Герой Савецкага Саюза (23.02.1945). Беларус, член КПСС з 1944 г.

У Чырвонай Арміі з 1932 г. Служыў у авіяцыйных часцях РСЧА. Закончыў ваенную школу лётчыкаў. Перад вайной асвоіў самалёт-штурмавік ІЛ-2. З 1943 г. змагаўся на Варонежскім, Бранскім, Цэнтральным Беларускім і 1-ым Беларускім франтах. Удзельнічаў у вызваленні Гомеля, Жлобіна, Бабруйска, Слуцка. У баях за г. Ковель па разведдадзеных намесніка камандзіра штурмавой брыгады капітана Кучынскага савецкія штурмавікі ліквідавалі вялікае скапленне варожай артылерыі.

За гады вайны адважны лётчык-штурмавік здзейсніў 210 баявых вылетаў, збіў 7 фашысцкіх самалётаў, знішчыў 2 танкі, 52 аўтамашыны, 6 гармат, 2 склады з боепрыпасамі, 11 зенітных кропак ворага.

**Раманькоў Міхаіл Ягоравіч** (06.02.1926, в. Дубінка Магілёўскага раёна — 09.07.1966). Герой Савецкага Саюза (29.06.1945). Беларус, член КПСС з 1949 г.

З 1944 г. на 2-ім і 3-ім Беларускіх франтах. Камандзір кулямётнага разліку малодшы сяржант Раманькоў вызначыўся ў баях ва Усходняй Прусіі. 22 сакавіка 1945 г. пад Кёнігсбергам знішчыў 2 станкавыя кулямёты і каля 100 гітлераўцаў. 5 чэрвеня 1945 г. у баі на касе Фрыш-Нерунг са сваім разлікам абыйшоў в. Фогельзанд і ўдарам з тылу знішчыў каля 70 гітлераўцаў, што садзейнічала акружэнню і разгрому групоўкі праціўніка.

**Саламонікаў Іван Міхайлавіч** (20.02.1918, в. Калінавая Магілёўскага раёна — 22.10.1944). Герой Савецкага Саюза (15.01.1940). Беларус.

У Чырвонай Арміі з 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У ноч на 22 снежня 1939 г. у складзе стралковага батальёна атакаваў пазіцыю ворага на Карэльскім перашэйку, закідаў акоп гранатамі і заняў яго. У баі аказаў дапамогу параненаму камандзіру ўзвода.

У гады Вялікай Айчыннай вайны маёр Саламонікаў камандаваў зенітна-артылерыйскім палком. Загінуў 22 кастрычніка 1944 г. у баі на тэрыторыі Венгрыі.

**Юрчанка Ягор Арцёмавіч** (03.02.1919, в. Палыкавічы Магілёўскага раёна — 12.01.1981). Герой Савецкага Саюза (29.10.1943). Беларус, член КПСС з 1942 г.

Закончыў Барысаўскае ваенна-інжынернае вучылішча (1941), Маскоўскую вышэйшую афіцэрскую інжынерна-мінную школу (1945). У Чырвонай Арміі з 1938 г. На фронце з 1941 г. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, на Курскай дузе, па вызваленню Украіны, Польшчы, разгрому японскіх інтэрвентаў на Дальнім Усходзе.

Палкавы інжынер капітан Юрчанка вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра паўночней Кіева 26—27 верасня 1943 г. Падрыхтаваў сродкі для фарсіравання і паспяхова пераправіў праз раку роту. Паранены, кіраваў пераправай артылерыі і боепрыпасаў.



Я. А. Юрчанка

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 35, 289, 524, 553, 648.*

## Поўныя кавалеры ордэна Славы

**Кагуценка Аляксандр Гаўрылавіч** (11.02.1924. в. Акцябрына Магілёўскага раёна). Поўны кавалер ордэна Славы. Беларус.

З ліпеня 1943 г. на Паўднёва-Заходнім, 3-ім Украінскім, 1-ым Беларускім франтах. Камандзір аддзялення аўтаматчыкаў гвардыі старшы сяржант Кагуценка вызначыўся ў баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. 01.08.1944 г. у ліку першых фарсіраваў Віслу; у студзені 1945 г. у раёне в. Ліпскія Буды Радомльскага ваяводства з аддзяленнем уварваўся ў траншэі праціўніка, у рукапашным баі знішчыў чатырох фашыстаў, аднаго ўзяў у палон. 29 красавіка 1945 г. у баях на вуліцах Берліна з групай байцоў штурмам авалодаў вузлом супраціўлення праціўніка, які перашкаджаў руху наперад савецкай пяхоты.

**Сотнікаў Сяргей Трыфанавіч** (18.11.1920, в. Батунь Магілёўскага раёна). Поўны кавалер ордэна Славы. Беларус.

У Чырвонай Арміі з 1940 г. Вайну сустрэў у 1941 г. у Літве. Акружэнне, палон, лагер. Уцёкі. З канца 1943 па ліпень 1944 г. быў у партызанах. Санінструктар малодшы сяржант Сотнікаў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі.

16 жніўня 1944 г. у час атакі адным з першых уварваўся ў траншэі праціўніка, знішчыў 14 гітлераўцаў і 18 узяў у палон. 18—19 красавіка 1945 г. пад варожым агнём вынес з поля бою 30 параненых савецкіх воінаў, у баях за Берлін — 15.

*Навечна ў сэрцы народным Мн., 1984. С. 490.*



С. Т. Сотнікаў

## Слова пра земляка

Сяргей Трыфанавіч Сотнікаў — чалавек, якім ганарацца аднавяскоўцы. Першы дзень вайны застаў Сотнікава ў літоўскім горадзе Алітус. На часць, у якой служыў малады воін, фашысты абрушылі шквал артылерыйскага агню. Завязаўся бой. Хутка высветлілася, што фашысты акружылі падраздзяленне. Аднак чырвонаармейцы не палі духам. Прарваўшы кальцо, яны рушылі на ўсход. Амаль тры месяцы прабіваліся з акружэння. Пад Барысавам Сяргей Сотнікаў трапіў у палон, але пры першай жа магчымасці ўцёк з лагера.

Хутка Сяргею Трыфанавічу ўдалося трапіць у партызанскі атрад Грышына. Мужна змагаўся воін у радах народных мсціўцаў. Удзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях. Злучыўшыся з наступаючымі войскамі Чырвонай Арміі, Сотнікаў пайшоў на фронт.

Сапраўдны гераізм праявіў ён у 1944 г. пры вызваленні Польшчы. Пры ўзяцці крэпасці Ломжа непрыступным аказаўся дзот, у напрамку якога наступала часць Сотнікава. Моцным агнём гітлераўцы не давалі ўзняць галаву нашым воінам. Гэтую агнявую кропку трэба было ў што б там ні стала знішчыць. Адным з першых сярод добраахвотнікаў быў Сяргей Трыфанавіч. Разам з іншымі ён непрыкметна падпоўз да дзота і процітанкавымі гранатамі прымусіў яго замаўчаць. За праяўленую мужнасць і адвагу С. Т. Сотнікаў быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

Ордэн Славы II ступені Сотнікаў атрымаў у тым жа 1944 г. таксама пры вызваленні Польшчы. Камандаванне часці паслала ўзвод у разведку боем. Ставілася задача прарваць абарону і заняць варожы штаб. Лёс аперацыі вырашалі адвага і мужнасць воінаў. Яны закідалі траншэі фашыстаў гранатамі і, прарваўшыся праз іх абарону, захапілі штаб. Неўзабаве гітлераўцы, апамятаўшыся, акружылі смельчакоў, якіх засталося на той час усяго пяць. Аднак да падыходу асноўных сіл яны выстаялі.

У красавіку 1945 г. нашы часці падышлі да Одэра. У ноч на 16 красавіка 9 чалавек — сярод іх быў малодшы сяржант С. Т. Сотнікаў — першымі на лодках фарсіравалі раку і да падыходу падмацавання дзве гадзіны вялі бой. Пасля гэтага часць, у якой служыў малодшы сяржант, перакінулі на штурм Франкфурта-на-Одэры, які ў той час аказаўся ў нашым тыле. Трое сутак працягваўся бой. Па 10 – 12 разоў у дзень ішлі ў атакі фашысты, каб вырвацца з акружэння. Пры ўзяцці горада Сотнікаў тройчы быў ранены, але не пакінуў поля бою. За гераізм, праяўлены ў апошнія дні вайны, ён атрымаў трэці ордэн салдацкай Славы.

*І. Стражэвіч*

*«За камуністычную працу».6 мая 1966.*

## Вайсковыя злучэнні і часці, якія атрымалі найменні «Магілёўскіх»

У ходзе Магілёўскай аперацыі 1944 г. загадам ВГК ад 10.07.1944 г. ганаровае найменне «Магілёўскіх» за вызваленне Магілёва (28.06.1944) атрымалі 21 злучэнне і часць 49-ай і 50-ай армій 2-га Беларускага фронту.

Часці і злучэнні, якім нададзены ганаровыя назвы «Магілёўскіх»: 64-ая (ген.-маёр Ц. К. Шкрылёў); 290-ая (ген.-маёр І. Г. Гаспаран) і 330-ая (палкоўнік У. А. Гусеў) стралковыя дывізіі; 1-ая гвардзейская штурмавая

інж.-сапёрная брыгада (палкоўнік А. Ф. Візіраў); 2-ая карпусная артылерыйская брыгада (палкоўнік А. І. Малафееў); 5-ая асобная знішчальная процітанкавая арт. брыгада (палкоўнік Дз. У. Ушакоў); 143-ая армейская гарматная арт. брыгада (палкоўнік Я. К. Цюрын); 11-ая інж.-сапёрная брыгада (палкоўнік Г. Ц. Сакалоў); 33-яя асобная матарызаваная інж. брыгада (палкоўнік І. М. Гурэеў); 50-ая інж. сапёрная брыгада (палкоўнік І. А. Логінаў); 16-ы (падпалкоўнік З. М. Сундакаў) і 55-ы (падпалкоўнік М. Р. Грыголія) гвардзейскія гаўбічныя арт. палкі; 77-ы (падпалкоўнік П. А. Ялесін) і 325-ы (падпалкоўнік А. М. Кавалевіч) гвардзейскія мінамётныя палкі; 233-і асобны танкавы полк (палкоўнік Л. С. Тулоўскі); 722-і самаходны арт. полк (падпалкоўнік С. І. Капылоў); 1830-ы цяжкі самаходны арт. полк (падпалкоўнік В. С. Гаеўскі); 1099-ы карпусны арт. полк (падпалкоўнік М. С. Пянцяшкін); 1321-ы армейскі знішчальны процітанкавы арт. полк (палкоўнік А. А. Сцяпанаў); 96-ы асобны полк сувязі (падпалкоўнік І. С. Цярэшчанка); 414-ы асобны лінейны батальён сувязі (падпалкоўнік Ф. Р. Корбут). Войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Магілёва, загадам ВГК ад 28.06.1944 г. абвешчана падзяка, у Маскве дадзены салют 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат.

*М. Камінскі*

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 321.*

## Нашы землякі — удзельнікі Супраціўлення ў краінах Еўропы

### За вызваленне Югаславіі

Летам 1943 г. гітлераўцы вывезлі мяне з роднай в. Сідаравічы ў Аўстрыю, у канцлагер. З дапамогай югаслаўскіх патрыётаў, рускіх партызан, што былі ў Югаславіі мне ўдалося вырвацца з лагера і збегчы.

У партызаны прыйшоў 13 красавіка 1944 г. у другі рускі батальён 18-ай ударнай брыгады «Базавішка» 30-ай дывізіі IX корпуса. У канцы вайны батальён называўся — «Першая Руская Ударная брыгада Югаслаўскай Народнай Арміі». Радавым кулямётчыкам змагаўся ў Славеніі: наладжвалі мы рэйды ў Цэнтральную Славенію, раёны Гораньскае і Нятраньскае; прымалі ўдзел у вызваленні прыгарада Трыеста-Апчына, населеных пунктаў Айдзеўшчына, Вілева, г. Герыца, Отліца, Цэл, Штаніель і інш.



Г. П. Каралёў

Пасля перамогі быў удзельнікам парада войск Народна-Вызваленчай арміі Югаславіі ў Любліне, бачыў там Броз Ціта. Пасля праз Варну трапіў у Адэсу, быў прызваны адэскім ваенкаматам у Савецкую Армію. Да 1950 г. служыў у Ізмаіле ў рабочым батальёне, адкуль у тым жа годзе вярнуўся ў Сідаравічы. На ўсё жыццё запомніў я югаслаўскіх сяброў і цудоўную краіну Югаславію, якая ўзнагародзіла мяне трыма сваімі медалямі.

*Г. Каралёў*

## З брыгады імя Гарыбальдзі


М. С. Фралоў

Першае знаёмства з Мікалаем Сцяпанавічам адбылося завочна — у Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Там мяне зацікавіў стэнд, які расказваў аб удзеле савецкіх людзей у руху супраціўлення ў краінах Еўропы. Асобую ўвагу прыцягнуў фотаздымак, з якога глядзеў шыракаплечы юнак з адкрытым і смелым позіркам. Форма амерыканскага салдата на ім прымусіла падыйсці бліжэй і пацікавіцца: хто ж такі? Подпіс сведчыў: М. С. Фралоў — партызан 32-ой італьянскай брыгады імя Гарыбальдзі, ураджэнец Магілёўскага раёна.

Другая сустрэча з ім адбылася зімой у яго роднай в. Сідаравічы.

...Па дарозе, па абодва бакі ад якой стаялі пад снегам калгасныя палі, вёскі, імкліва каціўся самазвал. За рулём быў не па гадах рухавы вадзіцель. Некалькі глыбокіх маршчын і сівізна на скронях сведчылі аб нялёгкім лёсе. Гэта і быў Фралоў Мікалай Сцяпанавіч...

На пачатак вайны яму толькі споўнілася чатырнаццаць. Вёску акупіравалі немцы. Восенню 1943 г. мясцовых жыхароў з дзецьмі фашысты вывезлі ў Магілёў. Пры «сартыроўцы» маці Алёну Ануфрыеўну, бацьку Сцяпана Калістратавіча і дваіх сясцёр адвялі ўбок, а Мікалая штурхнулі за калючы дрот — лагер для ваеннапалонных. Адсюль немцы некалькі разоў ганялі на работы ў майстэрні, на разгрузку вагонаў. Тут аднойчы ён знайшоў нямецкі сцізорык. Потым да гэтай знаходкі прыбавіўся кавалак нажовачнага палатна па металу. Падабраў яго падлетак проста так, ад дзіцячага інтарэсу, не думаючы аб тым, што гэтыя рэчы могуць спатрэбіцца. Аднойчы пад пільнай аховай прыгналі немцы ваеннапалонных на станцыю. У таварны вагон, вокны якога былі забіты тым жа калючым дротам, разам з дарослымі ўпіхнулі і Мікалая. Куды іх везлі, ніхто не ведаў. У Югаславію? Францыю?..

Неяк на адной з незнаёмых станцый цягнік спыніўся. У вагон кімсьці з мясцовых жыхароў была кінута невялікая булачка. Калі ваеннапалонныя пачалі яе разламваць на кавалкі, каб хапіла кожнаму, заўважылі запіску на рускай мове: «Уцякайце, тут ёсць партызаны». Пачуў гэта Мікалай і ўспомніў пра свае знаходкі. Непрыкметна абмацаў фуфайку: усё на месцы. У той жа дзень расказаў аб гэтым двум ваеннапалонным Дзмітрыю і Пятру, з якімі пасябраваў яшчэ ў Магілёве.

— Чаго ж ты раней маўчаў? — спытаў Дзмітрый.— Так можна і ў канцлагер трапіць.

Увесь вечар і пачатак ночы да крывавых мазалёў на руках пілавалі падлогу ў вагоне. Нарэшце справа была зроблена. І ў гэты час, як спецыяльна, чыгунку наперадзе пачалі бамбіць амерыканскія самалёты. Поезд збавіў ход. На плячо падлетка лягла рука Пятра: «Давай, Коля,— ён падштурхнуў хлопца да лаза.— Мы за табой»...

Калі над галавой Мікалая адстукаў апошні вагон, ён кінуўся ўбок, хутка сустрэў сяброў. Разам пайшлі ў горы. Ішлі ўсю ноч і пад раніцу ў промнях узыходзячага сонца ўбачылі белы домік. Каля яго ў вінаградніку капалася жанчына.

— Трэба зайсці, — сказаў Дзмітрый. — Можа, паесці дадуць. Ды і партызан самім не знайсці...

— Я пайду, — ледзь чутна сказаў Мікалай.

Ім пашанцавала. Яны трапілі да італьянцаў, якія мелі сувязь з партызанамі. Праз трое сутак пастрыжаных, пераапранутых у цывільныя касцюмы, іх пераправілі ў партызанскі атрад. Фралову было выдадзена часовае пасведчанне № 17, у якім сказана: «Брыгада імя Гарыбальдзі. 32-і перасоўны атрад. Баявое імя — Мікалай. Званне — патрыёт. Час уступлення ў атрад — 7 ліпеня 1944 года».

Невялікага росту, рухавы, Фралоў часцей астатніх хадзіў у разведку, дабываў каштоўныя звесткі. За гэта італьянцы, нягледзячы на малады ўзрост, з павагай называлі яго «сіньёр Нікколо».

Удзельнічаў Фралоў у разгроме варожага гарнізона ў мястэчку Санта-Стэфане непадалёку ад г. Балонья. Не адзін фашыст быў зрэзаны аўтаматнымі чэргамі юнага патрыёта. Былі і страты. У адным з баёў загінуў рускі хлопец з Масквы Ягор (прозвішча памяць не захавала). Ён быў паранены ў жывот. Каб не здацца, застрэліўся...

У перапынках паміж баямі збіраліся змагары-інтэрнацыяналісты — рускія, італьянцы, французы, югаславы — і спявалі песні. Камандзір партызанскага атрада Джэскамін падыходзіў у такі час да Мікалая, клаў яму на плечы рукі і казаў: «Вось скончыцца вайна і паедзем мы, сіньёр Нікколо, у Венецыю, у дом адпачынку. Які гэта цудоўны горад! Ва ўсім свеце няма такой прыгажосці...»

Мікалай жа ў такія мінуты думаў аб сваіх родных Сідаравічах, аб грыбных лясах, невялікай светлай рачулцы Лазнёўцы, якая працякала праз вёску, аб бацьку і маці, што там засталіся, і думаў, што ва ўсім свеце няма такой прыгажосці...

*А. Церахаў*

*«За камуністычную працу». 12 мая 1985.*

## Магілёўшчына вызвалена — вайна працягвалася

### Па старонках раённай газеты «Сацыялістычная праца» (1944—1945)

#### Адновім жывёлагадоўлю ў нашым раёне

Да вайны наш раён займаў адно з першых месц у вобласці па жывёлагадоўлі. Не было калгаса, які б не меў жывёлагадоўчых ферм. Дзесяткі жывёлаводаў раёна былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і ўдастойваліся яе грамат. На ўсю вобласць грымела слава жывёлаводаў калгаса «Камінтэрн» Чырвонапольскага сельсавета, калгаса імя Валадарскага Пашкаўскага сельсавета і інш.

Фашысцкія захопнікі нанеслі цяжкія раны жывёлагадоўлі раёна. Знішчана і разрабавана жывёла, спалены сотні жывёлагадоўчых будынкаў.

Таварышы калгаснікі! Разам з аднаўленнем усёй грамадскай гаспадаркі хутчэй паднімем на ногі і нашу жывёлагадоўлю. Створым сотні новых ферм.

Таварышы жывёлаводы! Змагайцеся за тое, каб наш раён быў першым і вядучым раёнам вобласці па жывёлагадоўлі. Уключайцеся ў спаборніцтва на хутчэйшае аднаўленне калгасных ферм. Вярніце сабе мінулую славу лепшых жывёлаводаў!

*Што было.* Перад вайной наш раён быў узорным па жывёлагадоўлі. Нашы калгасы мелі 197 фермаў буйной рагатай жывёлы, свінагадоўчых і авечкагадоўчых ферм. Стваралiся птушкафермы. Мелася 23 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, 122 000 свіней, 17 700 авечак. На калгасных канюшнях стаялі 10 557 коней.

Заслужанае месца ў калгасах займала меданосная пчала. Былі ў калгасніка малако, масла, была і шкварка. Чаму ж не мець мёд да чаю? І ў калгасах стварылі 2500 пчаліных вулляў. За два прадваенныя гады было пабудавана 118 новых канюшань, кароўнікаў, свінарнікаў, кухань для прыгатавання стравы жывёле.

Былі створаны сотні сіласных веж і ям. Дзесяткі тон сала, мяса і масла, сотні літраў малака штогодна здавалі калгасы дзяржаве. На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1939, 1940 і 1941 гадах удзельнічалі 123 жывёлавода нашага раёна.

*Што ёсць.* Наляцела чорнае фашысцкае варанне на нашы квітнеючыя сацыялістычныя нівы. Як галодная саранча, накінуліся немцы на калгаснае дабро. Расклявалі, сажралі (словы аўт.), а лепшае ў сваю бярлогу, у Германію пацягнулі. Што пажраць і павывезці нельга было, бязлітасна ламалі, білі, палілі. Засталося толькі тое, што з вялікімі цяжкасцямі ўдалося захаваць ад гітлераўскіх бандытаў.

Зараз наш раён налічвае 2860 коней (разам з жарабятамі), 1280 кароў, 20 авечак. Свіней нідзе не ўбачыш — вельмі любіла нямецкая погань тлустае белае беларускае сала. Птушка знішчана да шчэнту. Пчаліны вулей — рэдкасць. На мёд фашысты мелі такую прагнасць, што паядалі яго ледзь не з самім вуллем, з пчоламі.

Многія калгасы не маюць зараз ні аднаго каня. У Махаўскім, Хрыпялёўскім, Бялевіцкім, Вендаражскім, Бракаўскім, Слабодскім сельсаветах ні аднай каравёнкі. Фашысцкія акупанты знішчылі, расцягнулі на бліндажы і спалілі каля 90 працэнтаў канюшань, свінарнікаў і іншых жывёльных пабудоў.

*Што будзе.* Агульнымі сіламі калгаснікаў будуць залечаны раны, нанесеныя фашысцкімі захопнікамі нашай жывёлагадоўчай гаспадарцы. У хуткім часе наш раён атрымае вялікую партыю жывёлы з іншых абласцей СССР: 2000 буйной рагатай жывёлы, 140 коней, 1000 свіней, 3800 авечак, 2500 курэй, гусей, качак, многа племяннай жывёлы ўсіх відаў. Ствараюцца першыя грамадскія жывёлагадоўчыя фермы.

Некаторая колькасць жывёлы для калгасных ферм будзе набыта шляхам кантрактацыі ў калгаснікаў.

*7 верасня 1944 г.*

## Нашы мінёры

Пасля вызвалення нашага раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў была створана раённая каманда па размініраванню тэрыторыі і збору ваенных трафеяў.

За перыяд работы каманды поўнасцю размініраваны пяць мінных палёў. Знята з іх 2420 мін, закладзеных немцамі, ачышчана ад усякага віду боепрыпасаў 16 сельскіх Саветаў.

Асабліва добра праводзілі гэту работу інструктары па размініраванню Алег Пятровіч Пятроў і Міхаіл Казлоў і іх байцы Іван Ягоравіч Заліўка і Сяргей Дзмітрыевіч Князеў. Яны знялі не менш чым па 200 мін кожны.

*Л. Т. Печкурэнка, старшыня раённага савета Асаавіяхіма. 1944 г.*

## У фонд Чырвонай Арміі

Калгаснікі нашага раёна горача адгукнуліся на зварот працоўных Украіны і ўнеслі ў фонд Чырвонай Арміі 15 800 пудоў хлеба.

* * *

Вучні з розных школ Мастоцкага сельскага Савета сабралі на пабудову санітарнага самалёта 2500 рублёў. Збор сродкаў працягваецца.

* * *

Калгаснікі сельгасарцелі імя Сталіна ўзялі шэфства над адным з вайсковых шпіталяў. Сабраны для раненых і хворых салдат і афіцэраў некалькі сотцен яек, малако, агуркі, бульба. Пад кіраўніцтвам калгасніцы Галіны Міхайлаўны Філіповіч створана брыгада па мыццю бялізны для шпіталя. У брыгадзе 10 чалавек.

**На пабудову баявога самалёта**

Перадавыя калгаснікі нашай сельгасарцелі атрымалі прэміі за перавыкананне сваіх заданняў у перадкастрычніцкім соцспаборніцтве. Калгаснікі Якаў Фядосавіч Жураў — бацька трох франтавікоў унёс прапанову перадаць атрыманыя грошы на пабудову баявога самалёта. Яго прапанову падтрымалі калгаснікі Акуліна Гаўрылькова, Журава Ганна, Раманава Ганна і інш.

Прэміяльны фонд у суме 4000 рублёў быў унесены ў фонд пабудовы баявога самалёта.

*І. Чарняўскі, старшыня калгаса імя Будзённага, Мастоцкага сельсавета. 1944 г.*

**На абарону краіны**

З вялікім уздымам па раёну прайшла падпіска на Трэцюю ваенную пазыку. Сума падпіскі складае звыш двух мільёнаў рублёў. Заканчваецца разлік па падпісцы.

* * *

Калгаснікі Мастоцкага сельскага Савета вырашылі пабудаваць за свой кошт самалёт і перадаць яго ваенна-паветраным сілам Чырвонай Арміі. Сабрана 100 500 рублёў.

* * *

Калгаснікі сельгасарцелі Палыкавіцкага сельскага Савета засеялі ў фонд абароны звыш плана 100 гектараў азімых культур.

* * *

Калгаснікі раёна з вялікім уздымам адгукнуліся на заклік працоўных краіны аб здачы хлеба звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі. Здадзена на гэты час 16 000 пудоў.

* * *

Па ініцыятыве калгасніцы калгаса «4 з'езд Саветаў» Дар'і Аляксееўны Аўдзеенкавай у фонд Чырвонай Арміі па нашаму раёну было сабрана каля 8000 літраў малака.

* * *

На пабудову танкавай калоны працоўныя нашага раёна сабралі звыш 80 тысяч рублёў.

* * *

Каля 40 000 рублёў калгаснікі раёна сабралі на будаўніцтва агітэскадрыллі «Савецкая Беларусь».

* * *

На грашова-вешчавую латарэю працоўныя нашага раёна падпісаліся на 70 тысяч рублёў.

*23 лютага 1945 г.*

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы.
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў вашай любові
да Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра вас у нас назаўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

# Партызаны-землякі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

## БРЫЛЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА КАМЕНКА

**КАВАЛЁЎ Мікалай Мікітавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 2 чэрвеня 1944.

### ВЁСКА МАШАНАКІ

**ПАЦЁМКІН Міхаіл Мікітавіч**, 1913 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 20 сакавіка 1944.

## ВЕНДАРАЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА АТНЯНКА

**КОТАЎ Мікалай Васілевіч**, 1922 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў 5 мая 1943.

### ВЁСКА БУДЗІШЧА

**БРУСОВІЧ Васіль Фёдаравіч**, 1893 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Княжыцы 22 чэрвеня 1943.

### ВЁСКА БЯЛЯЎШЧЫНА

**РАЦЬКОЎ Міхаіл Антонавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 340-га партызанскага атрада, загінуў 26 сакавіка 1944.

### ВЁСКА ВАРАТЫНШЧЫНА

**КАПОРЫКАЎ Пётр Дзмітрыевіч**, 1924 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Бракава 26 чэрвеня 1944.

**ЛЕБЕДЗЕЎ Віктар Герасімавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, трапіў у палон у Магілёве ў 1943.

### ВЁСКА ВЕНДАРАЖ

**ВОСІПАЎ Васіль Емяльянавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў каля в. М. Бялевічы 27 верасня 1942.

**СІДАРАЎ Фрол Іванавіч**, 1916 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў у в. Аксенькавічы Бялыніцкага р-на.

### ВЁСКА ДУБІНКА

**БАРАНОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч**, 1922 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Угольшчына 22 сакавіка 1943.

**ДРАЗДОЎ Уладзімір Ціханавіч**, 1923 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 20 мая 1944.

**ЛАЗІЦКІ Прохар Аляксеевіч**, 1900 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Угольшчына 22 сакавіка 1943.

### ВЁСКА ЖУРАВЕЦ

**АЎСЯННІКАЎ Уладзімір Герасімавіч**, 1921 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Дубінка 19 мая 1943.

**ІЎЦІН Аляксандр Васілевіч**, 1923 года нараджэння, партызан 61-га партызанскага атрада, загінуў 25 верасня 1943.

### ВЁСКА ЗАВЯРЭЖЖА

**КАШТАНАЎ Іван Данілавіч**, 1922 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў на чыгунцы Магілёў—Шклоў, пахаваны ў в. Завярэжжа 20 чэрвеня 1944.

**ОСІПАЎ Павел Якаўлевіч**, 1923 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, памёр 28 мая 1944.

### ВЁСКА ЗАЛЕССЕ

**САСКАВЕЦ Мікалай Лявонавіч,** 1921 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў 26 студзеня 1944.

### ВЁСКА ЗЯЛЁНАЯ СЛАБАДА

**ГАНЧАРОЎ Уладзімір Усцінавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Зялёная Слабада 15 красавіка 1943.

### ВЁСКА КАРЧОМКА

**ВАСІЛЬЕЎ Уладзімір Іванавіч**, 1921 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 24 студзеня 1944.

**ІВАНОЎ Іван Аляксеевіч**, загінуў 8 лютага 1944.

### ВЁСКА КОНЦЫ

**ГРЫНКЕВІЧ Емяльян Яўсеевіч**, 1910 года нараджэння, аперупаўнаважаны па Беластоцкай вобл., памёр ад ран ва Усакінскім лесе 25 сакавіка 1944.

### ВЁСКА КУТЫ

**ЛЯНЬКОЎ Уладзімір Калістратавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, прапаў без вестак каля в. Дручаны Бялыніцкага р-на 30 чэрвеня 1944.

**МЕДЗЯКОЎ Цімафей Рыгоравіч**, 1915 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Барок Бялыніцкага р-на 18 кастрычніка 1943.

**НОВІКАЎ Васіль Цярэнцьевіч**, 1925 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў 15 красавіка 1943.

### ВЁСКА МІХАЛЁВА

**КАНДРАЦЬЕЎ Уладзімір Фёдаравіч**, 1926 года нараджэння, партызан 760-га партызанскага атрада, загінуў у в. Голубаўка 24 мая 1944.

### ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

**БУКАЧОЎ Мікалай Ільіч**, 1917 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Маліннік, пахаваны ў в. Хрыпялёва 1 чэрвеня 1944.

**ГЕРЦАЎ Гаўрыла Захаравіч**, 1923 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Угалле 20 чэрвеня 1944.

**КОЙДА Сцяпан Фёдаравіч**, 1902 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, памёр ад ран ва Усакінскім лесе 22 верасня 1943.

### ВЁСКА ХВАШЧОЎКА

**ПЯТРОЎСКІ Мікіта Пятровіч**, 1908 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, памёр ад ран у в. Сярмяжанка 22 сакавіка 1943.

### ВЁСКА ХРЫПЯЛЁВА

**БЕЛЬСКІ Леанід Лаўрэнцьевіч**, 1908 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў у в. Аксенькавічы 11 верасня 1943.

**ДАМАРЭНКА Васіль Фёдаравіч**, 1915 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Сенькава, пахаваны ў в. Хрыпялёва 4 кастрычніка 1943.

**ЖАЛАВАНЧЫК Аляксей Фёдаравіч**, загінуў 4 кастрычніка 1943.

**ІГНАТОВІЧ Іна Максімаўна**, загінула ў в. М. Бялынічы 11 верасня 1943.

**ЛАПО Ісак Сідаравіч**, 1914 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, прапаў без вестак 29 снежня 1943.

**НЕВЯДОМСКАЯ Зоя Іванаўна**, 1926 года нараджэння, партызанка 121-га партызанскага атрада, прапала без вестак.

**НЕВЯДОМСКІ Іван Іванавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Угольшчына 22 сакавіка 1943.

**ШАСТАКОЎ Васіль Ціханавіч**, 1924 года нараджэння, загінуў у Усакінскім лесе ў маі 1943.

**ШАСТАКОЎ Кірыл Ціханавіч**, 1917 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай

занскай брыгады, загінуў ва Усакінскім лесе 11 мая 1943.

### ВЁСКА ШАРАЕЎКА

**ЖУЧАНКОЎ Лука Цярэнцьевіч**, 1913 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Рудня Бялыніцкага р-на 8 лютага 1944.

### ВЁСКА ЯЗЕРШЧЫНА

**КАЗЛОЎ Цімафей Уладзіміравіч**, 1903 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, памёр ад ран, пахаваны ў Бялыніцкім р-не.

### ВЁСКА ЯМНІЦА

**КРАЎЦОЎ Дзмітрый Васілевіч**, 1923 года нараджэння, партызан 61-га партызанскага атрада, загінуў у в. Гарадзішча 6 красавіка 1943.

**КРАЎЦОЎ Ілья Рыгоравіч**, 1922 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 24 студзеня 1944.

**СІМАНОВІЧ Васіль Кузьміч**, 1914 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 22 мая 1944.

## ВЯЙНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА ВЕЙНА

**ЛОНІЧКІН Міхаіл Сяргеевіч**, 1913 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, прапаў без вестак у красавіку 1944.

**САХНОЎ Якаў Парфёнавіч**, загінуў 6 кастрычніка 1943.

### ВЁСКА ГРАБЯНЁВА

**БАБРОЎ Пётр Браніслававіч**, 1926 года нараджэння, партызан 15-га партызанскага атрада, загінуў 30 жніўня 1943.

### ВЁСКА ЗАЦІШША

**ЛЕЎЧАНКА Марыя Кірылаўна**, 1920 года нараджэння, партызанка 15-га партызанскага атрада, прапала без вестак.

### ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

**КОЙДА Якаў Уладзіміравіч**, 1913 года нараджэння, партызан 15-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

**ПРАЛЕЙЧЫК Кірыл Сяргеевіч**, партызан 620-га партызанскага атрада, загінуў.

## ДАШКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА ДАШКАЎКА

**ГАЛЯНТАЎ Аляксандр Іванавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Малліннік 2 чэрвеня 1944, пахаваны ў в. Барок Бялыніцкага р-на.

**ДЗЯНІСАЎ Максім Іванавіч**, 1901 года нараджэння, партызан 113-ай партызанскай брыгады, загінуў у в. Гарадзішча 6 красавіка 1944.

**ЕЛІН Мітрафан Цімафеевіч**, 1913 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Батунь 19 красавіка 1944.

**ЛАГОЙКА Адам Піліпавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Семукачы 2 красавіка 1944.

**САКАЛОЎ Афанасій Сцяпанавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 61-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

**ХАДАНОВІЧ Пімен Васілевіч**, 1925 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Коркаць 24 снежня 1943.

**ШАРСТНЯКОЎ Пётр Мікалаевіч**, 1918 года нараджэння, загінуў, пахаваны ў в. Лавец у 1944.

### ВЁСКА КРАСНІЦА

**КАЗАКОЎ Пётр Паўлавіч**, загінуў 19 мая 1944.

### ВЁСКА ЛЕЖНЕЎКА

**ЛУСЦОЎ Аляксей Нічыпаравіч**, загінуў, пахаваны ў в. Боўшава ў сакавіку 1944.

### ВЁСКА МЯЖЫСЕТКІ

**НОВІКАЎ Яўген Радыёнавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Залессе 24 красавіка 1944.

### ВЁСКА СЯЛЕЦ

**МІРОНАЎ Андрэй Сямёнавіч**, 1923 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Рудня Бялыніцкага р-на 8 лютага 1944.

**ЦЕРАХАЎ Аляксандр Захаравіч**, 1925 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Рудня Бялыніцкага р-на 8 лютага 1944.

### ВЁСКА ЧАРНАЗЁМАЎКА

**САЙКОЎКІ Браніслаў Францавіч**, 1923 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у в. Балонаў Сялец.

## ЗАВОДСКАСЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА БАТУНЬ

**АЎРАМЕНКА Марыя Рыгораўна**, 1923 года нараджэння, партызанка 35-га партызанскага атрада, загінула 17 лютага 1944.

**ЛАПАЧАНКА Васіль Ермалаевіч**, 1925 года нараджэння, партызан 277-ай партызанскай брыгады, прапаў без вестак 7 кастрычніка 1943.

**САЎКІН Рыгор Паўлавіч**, прапаў без вестак.

### ВЁСКА ВЯЛІКАЕ ХОНАВА

**БАРЫСАЎ Міхаіл Рыгоравіч**, 1924 года нараджэння, партызан 120-га партызанскага атрада, загінуў 29 мая 1944.

**ДЗІЛЕНДЗІК Міхаіл Гаўрылавіч**, 1927 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў у Быхаўскім р-не 27 ліпеня 1943.

**ШЧАРБІНСКІ Андрэй Фёдаравіч**, 1923 года нараджэння, партызан 760-га партызанскага атрада, прапаў без вестак 5 красавіка 1944.

### ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

**КЛІМЯНКОЎ Мікалай Васілевіч**, 1923 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў каля в. Хаткі 22 лістапада 1943.

### ВЁСКА ЗАВОДСКАЯ СЛАБАДА

**БАРЫСЕНКА Мітрафан Мінавіч**, 1923 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў 15 лютага 1944.

**ЛОЦМАНАЎ Міхаіл Антонавіч**, 1918 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў каля в. Палессе Бярозаўскага р-на 24 лютага 1944.

**МАТЛАХОЎ Дзмітрый**, загінуў у Баранавіцкай вобл. 6 ліпеня 1944.

### ВЁСКА НЕЗАЎКА

**ДЗЯНІСАЎ Максім Іванавіч**, 1901 года нараджэння, партызан 113-га партызанскага атрада, загінуў 6 красавіка 1944.

## КАДЗІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА ГАРОДНЯ

**ДЗЯМІДАЎ Іван Піліпавіч**, 1916 года нараджэння, партызан 15-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

### ВЁСКА КАДЗІНА

**МАКАРЭВІЧ Емяльян Ануфрыевіч**, 1900 года нараджэння, прапаў без вестак у студзені 1943.

**УСІКАЎ Якаў Кірылавіч**, 1919 года нараджэння, партызан 15-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

### ВЁСКА МЯДЗВЁДАЎКА

**МАШКОЎ Васіль Іванавіч**, загінуў у Бенеўскім лесе Быхаўскага р-на 16 кастрычнка 1943.

### ВЁСКА ШЧЭЖАР

**БУДКІН Кірыл Міхайлавіч**, 1921 года нараджэння, партызан 15-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

**ВЕРАЦЕННІКАЎ Мікалай Іванавіч**, 1913 года нараджэння, загінуў у мястэчку Ямніца 20 чэрвеня 1944.

## КНЯЖЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА БРАКАВА

**АКУЛАЎ Іван Стэфанавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў 5 мая 1943.

**КАЗЛОЎ Уладзімір Цімафеевіч**, 1900 года нараджэння, партызан 208-га партызанскага атрада, загінуў каля в. Рудня Жалезінскага р-на Палескай вобл., пахаваны ў в. Рэчкі 16 чэрвеня 1944.

**КАЗЛОЎ Цімафей Васілевіч**, памёр 9 лютага 1944.

**МАНКЕВІЧ Іван Рыгоравіч**, 1924 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Селішча 6 чэрвеня 1944.

**МЕЛЯШКОЎ Іван Паўлавіч**, 1911 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Навасёлкі, пахаваны ў в. Бракава.

**МЕЛЯШКОЎ Канстанцін Іванавіч**, 1920 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Селішча 23 красавіка 1944.

**ПАЛЯКОЎ Фёдар Мікалаевіч**, 1908 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Боўшава 13 красавіка 1944.

**РЭПЯТУЕЎ Васіль Аляксандравіч**, 1926 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў у Пінскай вобл. 9 ліпеня 1944.

**РЭПЯТУЕЎ Іван Мікітавіч**, 1917 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Бракава 6 чэрвеня 1944.

**РЭПЯТУЕЎ Уладзімір Мікалаевіч**, 1925 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Нежкава Бялыніцкага р-на 2 верасня 1943.

**СЦЯПАНЧЫК Васіль Васілевіч**, 1925 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, прапаў без вестак 7 кастрычніка 1943.

**ТРЫШЧАНКОЎ Міхаіл Мікалаевіч**, 1924 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў, пахаваны ў в. Цяхцін Бялыніцкага р-на.

**ЦАЛАБЁНАК Павел Макаравіч**, 1924 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў на ст. Мосіна, пахаваны ў в. Яльва Ганцавіцкага р-на.

### ВЁСКА БУЛЫЖЫЦЫ

**ПАЛІТАЕЎ Міхаіл Сцяпанавіч**, 1923 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, прапаў без вестак.

### ВЁСКА ГОРНАЯ ВУЛІЦА

**МАЦЮШЫН Мікалай Сяргеевіч**, 1923 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Папоўка Шклоўскага р-на 30 снежня 1943.

**ОСІПАЎ Сяргей Гаўрылавіч**, 1922 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Дручаны Бялыніцкага р-на, пахаваны ў в. Цяхцін 30 чэрвеня 1944.

### ВЁСКА ЗАЛУБНІШЧА

**АХМЕТАЎ Васіль Мікалаевіч**, загінуў 5 красавіка 1944.

**СІДАРЭНКА Іван Ільіч**, 1924 года нараджэння, партызан 278-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

**СІДАРЭНКА Фёдар Акімавіч**, 1912 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў 21 лістапада 1943.

### ВЁСКА ІЛЬІНКА

**ГРЫГОР'ЕЎ Пётр Іванавіч**, прапаў без вестак у 1943.

**ЗАЙЦАЎ Аляксей Мікалаевіч**, 1922 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Бракава 26 ліпеня 1944.

**ЗАЙЦАЎ Сцяпан Мікалаевіч**, прапаў без вестак у 1944.

ВЁСКА КНЯЖЫЦЫ

**ГЛУШАКОЎ Пётр Емяльянавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, памёр 25 сакавіка 1944.

**СТАРАСЦІН Уладзімір Цімафеевіч**, 1911 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Рубеж.

ВЁСКА ЛУБНІШЧА

**БАРАНАЎ Аляксандр Дарафеевіч**, прапаў без вестак.

**КАНДРАЦЬЕЎ Рыгор Васілевіч**, 1915 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Хрыпялёва 1 чэрвеня 1944.

**ПАТАПЕНКА Аляксандр Мацвеевіч**, 1922 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў 19 мая 1944.

ВЁСКА НІЗКАЯ ВУЛІЦА

**КАНДРАЦЕНКА Уладзімір Яфімавіч**, 1925 года нараджэння, партызан 760-га партызанскага атрада, загінуў у в. Рубеж, пахаваны ў в. Глыбокі Брод Бялыніцкага р-на.

ВЁСКА НІКІЦІНІЧЫ

**ГАРБУНОЎ Васіль Фёдаравіч**, 1923 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Нікіцінічы 25 мая 1944.

**ГАРБУНОЎ Міхаіл Сяргеевіч**, 1926 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў 16 чэрвеня 1944.

ВЁСКА ПРОКШАНІЧЫ

**АСТАПКОЎ Васіль Пятровіч**, 1925 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў у в. Ямніца 20 чэрвеня 1944.

**СЯНКЕВІЧ Пётр Іванавіч**, 1910 года нараджэння, партызан 60-га партызанскага атрада, трапіў у палон у в. Прокшанічы 9 студзеня 1944.

ВЁСКА ПЯСЧАНКА

**КАВАЛЁВА Марыя**, партызанка 121-га партызанскага атрада, загінула ў Шчаглянскім лесе, там і пахавана.

**СІВАЛОЎ Іван Іванавіч**, партызан 208-ай партызанскай брыгады, прапаў без вестак 23 чэрвеня 1944.

**ЯКУШАЎ Дзяменцій Макаравіч**, 1926 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, памёр ад тыфу, пахаваны ў в. Рэчкі Жалезінскага р-на 12 чэрвеня 1944.

ВЁСКА СЕЛІШЧА

**ТРАШЧАНКОЎ Мікалай Іванавіч**, 1924 года нараджэння, партызан 122-ой партызанскай брыгады, загінуў у в. Селішча 6 чэрвеня 1944.

**ШАВЯЛЕВІЧ Віктар Робертавіч**, 1909 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, загінуў, пахаваны ў в. Аксенькавічы, Бялыніцкага р-на 11 верасня 1943.

ВЁСКА СЕНЬКАВА

**ЛАГУЦІН Васіль Аляксандравіч**, 1924 года нараджэння, партызан 760-га партызанскага атрада, загінуў 24 мая 1944.

**МІХАЙЛОЎСКІ Пётр Якаўлевіч**, 1923 года нараджэння, партызан 121-га партызанскага атрада, загінуў 12 мая 1944.

**ТАПТУНОЎ Мікалай Пятровіч**, 1924 года нараджэння, загінуў у в. Вендараж 24 студзеня 1944.

**УЛІЦЁНАК Ягор Васілевіч**, 1924 года нараджэння, партызан 600-га партызанскага атрада, загінуў у в. Пільшычы 31 сакавіка 1944.

ВЁСКА ШЧЭГЛІЦА

**КРУЧКОЎ Пётр Фёдаравіч**, 1906 года нараджэння, партызан 208-ай партызанскай брыгады, прапаў без вестак 29 снежня 1943.

**ПАЛАЗКОЎ Пётр Емяльянавіч**, 1907 года нараджэння, партызан 15-га партызанскага атрада, прапаў без вестак.

**МУРЗЯНКОЎ Міхаіл Сідаравіч,** чырвонаармеец, 1921 года нараджэння, прапаў без вестак у снежні 1943.

**МУРЗЯНКОЎ Пётр Міхайлавіч**, чырвонаармеец, 1911 года нараджэння, памёр у нямецкім палоне 5 лістапада 1941.

**МУРЗЯНКОЎ Сямён Міхайлавіч**, чырвонаармеец, 1897 года нараджэння, прапаў без вестак у ліпені 1944.

**ПАДЖАРАЎ Андрэй Фёдаравіч**, чырвонаармеец, 1913 года нараджэння, загінуў 24 ліпеня 1944.

**ПАДЖАРАЎ Васіль Сцяпанавіч**, чырвонаармеец, 1914 года нараджэння, прапаў без вестак 13 красавіка 1945.

**ПАДЖАРАЎ Карп Васілевіч**, чырвонаармеец, 1903 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ПАДЖАРАЎ Міхаіл Фёдаравіч**, чырвонаармеец, 1922 года нараджэння, памёр у нямецкім палоне 14 жніўня 1941.

**ПАДЖАРАЎ Сцяпан Васілевіч.**

**ПАДЖАРАЎ Сямён Фёдаравіч,** старшы сяржант, 1903 года нараджэння, загінуў 30 верасня 1942.

**ПАЛЯНСКІ Аляксей Сяргеевіч**, сяржант, 1913 года нараджэння, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**САСКАВЕЦ Ігар Рыгоравіч**, сяржант, 1902 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ФУРСАЎ Васіль Данілавіч**, чырвонаармеец, 1918 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ФУРСАЎ Васіль Мітрафанавіч**, чырвонаармеец, 1922 года нараджэння, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**ФУРСАЎ Віктар Самуйлавіч**, чырвонаармеец, загінуў у Венгрыі 8 сакавіка 1945.

**ФУРСАЎ Ілля Данілавіч**, чырвонаармеец, 1915 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ХАЛАДЦОЎ Мікалай Паўлавіч**, чырвонаармеец, 1926 года нараджэння, загінуў у Германіі 30 красавіка 1945.

ВЁСКА ЦІШОЎКА

**АРЛОЎСКІ Станіслаў Станіслававіч**, чырвонаармеец, загінуў ва Усходняй Прусіі 3 сакавіка 1945.

**АСІПЕНКА Прохар.**

**АТАЕЎ Уладзімір Пятровіч**, чырвонаармеец, загінуў у Аўстрыі 17 красавіка 1945.

**БАЗЫЛЕЎ Васіль Іванавіч**, чырвонаармеец, загінуў ва Усходняй Прусіі 13 лютага 1945.

**БАНКУЗАЎ Рыгор Ціханавіч**, чырвонаармеец, 1917 года нараджэння, прапаў без вестак у ліпені 1944.

**БАРОДЗІЧ Мікалай Рыгоравіч**, чырвонаармеец, 1922 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**БЛАХІН Мікалай Мікітавіч**, чырвонаармеец, 1905 года нараджэння, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ВАЙЦЯНКОЎ Павел.**



Помнік загінуўшым аднавяскоўцам у в. Цішоўка

**ВОРАНАЎ Фёдар Сямёнавіч,** чырвонаармеец, загінуў у в. Расасна Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. 27 сакавіка 1944.

**ГАЛКОЎСКІ Іосіф Станіслававіч**, малодшы сяржант, 1907 года нараджэння, загінуў 17 верасня 1942.

**ГАРБАЧЭЎСКІ Мікалай Іванавіч.**

**ГОЛЬМАН Барыс Цімафеевіч**, чырвонаармеец, 1913 года нараджэння, памёр ад ран у Беластоцкай вобл. 11 верасня 1944.

**ЕРМАКОЎ Міхаіл Іванавіч**, чырвонаармеец, памёр ад ран, пахаваны на ваенных могілках у г. Вільне (Літва) 16 жніўня 1944.

**ЖАДЗЕЦКІ Павел Данілавіч**, чырвонаармеец, 1922 года нараджэння, загінуў у г. Вілюкене (Усходняя Прусія) 27 кастрычніка 1944.

**ЖАЛЯВІНСКІ Даніїл Арцёмавіч.**

**ЖАЛЯВІНСКІ Іван Арцёмавіч**, чырвонаармеец, 1915 года нараджэння, памёр у нямецкім палоне 30 мая 1942.

**ЖАЛЯВІНСКІ Мікалай Арцёмавіч**, чырвонаармеец, 1897 года нараджэння, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**ЖАЛЯВІНСКІ Пётр Арцёмавіч.**

**ЖАРЫН Уладзімір Казіміравіч**, чырвонаармеец, 1900 года нараджэння, загінуў у 1944.

**ЖАРЫН Эдуард Іванавіч**, чырвонаармеец, 1921 года нараджэння, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ЖУДРО Цімафей Ісаакавіч.**

**ЖЫЛІВІНСКІ Уладзімір Мікалаевіч**, чырвонаармеец, памёр ад ран 10 верасня 1944.

**ЗАЙЦАЎ Лаўрэн Андрэевіч**, чырвонаармеец, 1904 года нараджэння, загінуў у Варшаўскім ваяводстве (Польшча) 15 верасня 1944.

**ЗАЙЦАЎ Уладзімір Лаўрэнавіч**, 1928 года нараджэння.

**КАЗЛОЎ Аляксандр Іванавіч**, чырвонаармеец, 1895 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**КАМАРЫШКІН Павел Аўдзеевіч**, чырвонаармеец, загінуў у Беластоцкай вобл. 22 жніўня 1944.

**КАМАРЫШКІН Фёдар Аўдзеевіч**, 1924 года нараджэння.

**КАРАТКЕВІЧ Іван Антонавіч**, чырвонаармеец, 1909 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**КАЦІБНІКАЎ Іван Адамавіч**, чырвонаармеец, загінуў ва Усходняй Прусіі 26 студзеня 1945.

**КАЦІБНІКАЎ Міхаіл Піліпавіч.**

**КОЗЫРАЎ Павел Сямёнавіч,** чырвонаармеец, 1915 года нараджэння, прапаў без вестак у снежні 1943.

**ЛОНСКІ Гаўрыіл Паўлавіч**, чырвонаармеец, загінуў у Латвіі 24 снежня 1944.

**ЛУКАШОЎ Мікалай Лазаравіч**, чырвонаармеец, прапаў без вестак у студзені 1945.

**МЯСНІКОЎСКІ Даніїл Піліпавіч**, чырвонаармеец, 1895 года нараджэння, загінуў у в. Хацінаўка Житомірскай вобл. (Украіна) 24 снежня 1942.

**ОКАЛА-КУЛАК Аляксей Іванавіч**, чырвонаармеец, 1917 года нараджэння, загінуў 30 верасня 1941.

**ОКАЛА-КУЛАК Іосіф Вікенцьевіч.**

**ПРАКАПЕНКА Міхаіл Міронавіч**, чырвонаармеец, 1921 года нараджэння, загінуў у в. Закшава Ломжынскага р-на Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 25 жніўня 1944.

**ПЯТРОЎ Міхаіл Цімафеевіч**.

**РАССОХІН Віктар Васілевіч**, чырвонаармеец, загінуў 11 чэрвеня 1944.

**РЫБЯНКОЎ Пётр Маркавіч**.

**СІПАЙЛА Аляксандр Віктаравіч**, чырвонаармеец, 1913 года нараджэння, памёр ад ран у г. Саратаве (Расія) 4 сакавіка 1943.

**СІПАЙЛА Васіль Віктаравіч**, чырвонаармеец, 1917 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**СІПАЙЛА Мікалай Міхайлавіч**, чырвонаармеец, загінуў 6 сакавіка 1945.

**СІПАЙЛА Пётр Міхайлавіч**, чырвонаармеец, 1913 года нараджэння, памёр ад ран у г. Саратаве (Расія) 4 сакавіка 1943.

**СТАНКЕВІЧ Іосіф Аляксандравіч**, 1912 года нараджэння.

**УЛІЦЁНАК Дзмітрый Цітавіч**, чырвонаармеец, 1896 года нараджэння, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**ХАРКЕВІЧ Іосіф Мацвеевіч**, чырвонаармеец, 1919 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ЦАРЫК Мікалай Дзмітрыевіч.**

**ЦАХАНСКІ Альберт Францавіч**, 1922 года нараджэння, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ЦВЯТКОЎ Пётр Андрэевіч**, чырвонаармеец, 1911 года нараджэння, памёр ад ран у Літве 2 верасня 1944.

**ШАЛКОЎСКІ Міхаіл.**

**ШАРСНЁЎ Захар Сямёнавіч,** чырвонаармеец, 1906 года нараджэння, загінуў у Беластоцкай вобл. 5 жніўня 1944.

**ШАРСНЁЎ Нестар Давыдавіч.**

**ШУРХАЕЎ Васіль Аляксандравіч,** чырвонаармеец, 1909 года нараджэння, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ШУРХАЕЎ Іван Аляксандравіч**, чырвонаармеец, загінуў у г. Рожане Варшаўскага ваяводства (Польшча) 14 верасня 1944.

**ЮНЕВІЧ Іван Карлавіч**, чырвонаармеец, загінуў у Польшчы 19 студзеня 1945.

**ЮРКЕВІЧ Канстанцін Мікалаевіч**, чырвонаармеец, 1925 года нараджэння, загінуў у в. Залужжа (Польшча) 5 лістапада 1944.

**ЯЎНЕВІЧ Іван Карлавіч**, чырвонаармеец, загінуў у Беластоцкай вобл. 29 жніўня 1944.

## Воіны-землякі, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, месца жыхарства якіх не ўстаноўлена

**АБАДКОЎ Васіль Калінавіч**, 1921 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у лістападзе 1945.

**АГАРОДНІКАЎ Аляксей Адамавіч**, 1903 года нараджэння, малодшы сяржант, прапаў без вестак 14 жніўня 1942.

**АГАРОДНІКАЎ Гаўрыіл Авяр'янавіч**, чырвонаармеец, загінуў у в. Сулькі Беластоцкай вобласці 12 верасня 1944.

**АДАЙКОЎ Сафрон Іванавіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Глюкац (Польшча) 20 сакавіка 1945.

**АЛЬХОВІК Пётр Пятровіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак.

**АНТОНАЎ Даніл Андрэевіч**, 1902 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў каля в. Бергаў Кёнігсбергскай правінцыі (Усходняя Прусія), пахаваны ў магіле № 68 6 красавіка 1945.

**АНУФРЫЕНКА Пётр Ільіч**, 1921 года нараджэння, старшы сяржант, памёр ад ран у в. Троіцкае (Польшча) 4 лютага 1945.

**АРЦЁМАЎ Леанід Рыгоравіч**, 1919 года нараджэння, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**АРЦЮХОЎ Васіль Кліменцьевіч**, 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Русь Ломжынскага р-на Беластоцкай вобл. 28 жніўня 1944.

**АСАВЕЦКІ Сяргей Мікалаевіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Цыбенгене Брандэнбургскай правінцыі (Германія) 22 красавіка 1945.

**АСТАПКОЎ Канстанцін Фёдаравіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1941.

**БАБКОЎ Адам Пятровіч,** 1923 года нараджэння, яфрэйтар, загінуў у в. Ліпнікі Варшаўскага ваяводства (Польшча) 13 кастрычніка 1944.

**БАДУНОЎ Пётр Іванавіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 кастрычніка 1944.

**БАЛУЦЕНКА Аляксей Міхайлавіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Колпіне (Расія) 9 лютага 1942.

**БАРЭЦКАЎ Пётр Піліпавіч**, 1908 года нараджэння, загінуў у в. Аляксандраўка Пушкінскага р-на Ленінградскай вобл. (Расія) 15 студзеня 1944.

**БАРКОЎ Васіль Яўсеевіч**, 1918 года нараджэння, лейтэнант, загінуў 1 жніўня 1942.

**БАРЫСЕНКА Аляксей Платонавіч**, чырвонаармеец, загінуў у жніўні 1941.

**БАТУРЫН Сяргей Цітавіч**, 1923 года нараджэння, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**БАЦЭВІЧ Мікалай Міхайлавіч**, 1912 года нараджэння, загінуў у в. Ташкоўка Варашылаўградскай вобл. (Расія) 2 лістапада 1943.

**БЕГАСАЎ Сцяпан Даянісавіч**, малодшы лейтэнант, прапаў без вестак 17 снежня 1941.

**БІБКІН Фёдар Іосіфавіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Шляхскае Астраленкскага р-на Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) у 1944.

**БІРУКОЎ Васіль Антонавіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**БЛАГАДЗЕРАЎ Сяргей Емяльянавіч**, 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Бытуў (Германія) 15 сакавіка 1945.

**БЛІН Антон Усцінавіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у Варшаўскім ваяводстве (Польшча) 16 студзеня 1945.

**БРАЦКЕВІЧ Аляксей Яфімавіч**, 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 20 верасня 1944.

**БУЛЬБА Міхаіл Дамітрыевіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Муры Лычкаўскага р-на Ленінградскай вобл., пахаваны ў брацкай магіле № 40 7 верасня 1942.

**ВАЛАДЗЬКО Сяргей Фёдаравіч**, 1922 года нараджэння, малодшы сяржант, прапаў без вестак у маі 1942.

**ВАЛАДЗЬКОЎ Мікалай Анісімавіч**, 1920 года нараджэння, малодшы сяржант, прапаў без вестак 14 лістапада 1945.

**ВАЛАТАЕЎ Васіль Фёдаравіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран каля г. Гродна 27 жніўня 1944.

**ВАЛУЕЎ Іван Мікітавіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў каля в. Хатаўня Журавіцкага р-на Гомельскай вобл.

**ВАРАБ'ЁВА Ганна Іванаўна,** чырвонаармеец, прапала без вестак у кастрычніку 1944.

**ВАРАПАЕЎ Кірыл Ільіч**, 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у жніўні 1941.

**ВАСІЛЕЎСКІ Аляксандр Іванавіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, пахаваны на гарадскіх могілках г. Швібуса (Германія) 16 сакавіка 1945.

**ВАСІЛЕЎСКІ Іван Нічыпаравіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у в. Канопка Яблань Замбраўскага р-на Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 2 верасня 1944.

**ВАСІЛЕЎСКІ Феафан Васілевіч**, 1900 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Каўнасе (Літва) 29 красавіка 1945.

**ВАРАНЦОЎ Канстанцін Кузьміч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у Касцюковіцкім р-не 12 жніўня 1941.

**ВЕРАЦЕННІКАЎ Ціт Сцяпанавіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у ліпені 1944.

**ВОЛКАЎ Якаў Іванавіч**, 1905 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 ліпеня 1943.

**ВЯРЭНЬЕЎ Сяргей Рыгоравіч**, 1898 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Познані (Польшча) 6 мая 1945.

**ГАЛАВАНАЎ Пётр Сямёнавіч**, 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак каля с. Фашаўка Варашылаўградскай вобл. (Расія) 11 ліпеня 1942.

**ГАНАКОЎ Яфім Лявонцьевіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак каля раз'езда Велішаў Вар-

шаўскага ваяводства (Польшча) 13 кастрычніка 1944.

**ГАРАДЗЕЦКІ Аляксандр Васілевіч,** 1896 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 4 жніўня 1942.

**ГАРБАЦЕНКА Уладзімір Андрэевіч,** 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў каля хутара Болас Сігулдзінскага р-на (Латвія) 30 верасня 1944.

**ГАРБАЧОЎ Канстанцін Антонавіч,** 1901 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр у лагеры для ваеннапалонных Славута 5 сакавіка 1943.

**ГАРБАЦКІ Уладзімір Мікалаевіч,** 1924 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 19 лютага 1944.

**ГАРБАЧЭЎСКІ Пётр Аляксеевіч,** 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**ГАЛУБЦОЎ Мікалай Іванавіч,** 1924 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Айзенберг каля г. Бранева (Польшча) 16 сакавіка 1945.

**ГАТОЎШЧЫКАЎ Яфрэм Васілевіч,** 1899 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у сакавіку 1944.

**ГАЙКЕВІЧ Ананій Якаўлевіч,** 1927 года нараджэння, памёр ад ран у г. Хошчана Шчэцінскага ваяводства (Польшча) 3 сакавіка 1945.

**ГАЙДОРАЎ Сцяпан Фёдаравіч,** 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у Заенбруве (Польшча), пахаваны на рускіх могілках 21 лістапада 1944.

**ГАЎРЫКАЎ Сямён Апанасавіч,** 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 лістапада 1942.

**ГАЎРЫЛЕНКА Уладзімір Арсенцьевіч,** 1907 года нараджэння, загінуў у в. Крэмніца (Польшча).

**ГЕРГЕНСОН Рыгор Антонавіч,** 1902 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у ліпені 1944.

**ГОЛУБЕЎ Аляксандр Мікалаевіч,** 1926 года нараджэння, сяржант, памёр ад ран у г. Бартэнштайне (Усходняя Прусія), пахаваны на панскіх могілках 28 сакавіка 1945.

**ГОМАНАЎ Міхаіл Ігнатавіч,** 1916 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 9 кастрычніка 1944.

**ГРАЖАС Антонас Іозасаў,** 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Цэнтэрдорф (Германія) 17 красавіка 1945.

**ГРАМЫКА Уладзімір Васілевіч,** 1920 года нараджэння, старшы сяржант, загінуў у г. Холме Калінінскай вобл. (Расія) 23 лютага 1942.

**ГРОДНІКАЎ Аляксей Адамавіч,** 1903 года нараджэння, малодшы сяржант, прапаў без вестак 14 жніўня 1942.

**ГРЫБУСАЎ Пётр Яфімавіч,** 1921 года нараджэння, малодшы сяржант, прапаў без вестак ва Усходняй Прусіі 22 кастрычніка 1944.

**ГРЫСІМЧУК Карнііл Кандратавіч,** 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ГРЫШЧАНКА Мікалай Міхайлавіч,** 1911 года нараджэння, старшы сяржант, загінуў у в. Майскі Болахаўскага р-на Тульскай вобл. (Расія) 9 ліпеня 1942.

**ДАВЫДАЎ Барыс Уладзіміравіч,** 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1941.

**ДАЛЕЦКІ Пётр Міхайлавіч,** 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 9 кастрычніка 1941.

**ДАШКЕВІЧ Сямён Пятровіч,** 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 29 снежня 1941.

**ДЗЕНІСЕНКА Ягор Мікалаевіч,** 1912 года нараджэння, загінуў на ст. Кашары Ковельскага р-на 7 красавіка 1944.

**ДЗЯМІДАЎ Кандрат Фёдаравіч,** 1902 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у пас. Кастрычніцкі Курскай вобл. (Расія) 25 сакавіка 1943.

**ДАЛГАЛЁЎ Сяргей Пятровіч,** 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Вене (Аўстрыя) 7 красавіка 1945.

**ДЫСЯНКОЎ Васіль Мацвеевіч,** 1924 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 25 кастрычніка 1943.

**ЕРАНКОЎ Аляксей Піліпавіч,** 1918 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў каля в. Узвоз Прачысцінскага р-на Смаленскай вобл. (Расія) 19 лістапада 1942.

**ЕРАФЕЕНКА Георгій Акімавіч,** 1919 года нараджэння, сяржант, загінуў на хутары Хлапоўскія Марозаўскага р-на Растоўскай вобл. (Расія) 8 студзеня 1943.

**ЕРАШКОЎ Яфім Рыгоравіч,** 1914 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў каля с. Хандрава Ленінградскай вобл. (Расія) 12 верасня 1942.

**ЕРМАЛОВІЧ Цімафей Пракопавіч**, 1925 года нараджэння, сяржант, загінуў у Папяляйскім павеце (Латвія) 5 кастрычніка 1944.

**ЖАЛЯЗНОЎ Барыс Фёдаравіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 20 ліпеня 1944.

**ЖАЦІКАЎ Віктар Баніфатавіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Двожэск Беластоцкай вобл. 22 ліпеня 1944.

**ЖЫЦЬКОЎ Сцяпан Спірыдонавіч**, 1926 года нараджэння, загінуў у Польшчы 19 кастрычніка 1945.

**ЗАЙЦАЎ Аркадзь Фёдаравіч**, загінуў на хутары Бекасава Ленінградскай вобл. (Расія) 28 лютага 1942.

**ЗАЙЦАЎ Васіль Піліпавіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 23 лютага 1945.

**ЗАЙЦАЎ Мікалай Дзмітрыевіч**, 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у в. Ляўшына Карманаўскага р-на Смаленскай вобл. (Расія) 14 жніўня 1942.

**ЗАЙЦАЎ Трафім Андрэевіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 5 ліпеня 1942.

**ЗІНКЕВІЧ Міхаіл Васілевіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Курску, пахаваны на Маскоўскіх могілках № 12 (Расія) 22 кастрычніка 1943.

**ЗІНОЎЕЎ Мікалай Паўлавіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў каля в. Чырвоная Слабада Прапойскага р-на Магілёўскай вобл. 25 кастрычніка 1943.

**ЗЫКУНОЎ Нічыпар Герасімавіч**, 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ІВАНОЎ Аляксандр Фадзеевіч,** 1913 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў у в. Пшэчышча Келецкага ваяводства (Польшча) 26 студзеня 1945.

**ІВАЦЭВІЧ Леанід Іосіфавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у Чэрвеньскім р-не 6 ліпеня 1944.

**ІГНАЦЕНКА Мікалай Есціф.,** 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран каля в. Раўдзянц Кучацкага сельсавета (Эстонія) 21 верасня 1944.

**ІОФЕ Тавель Сіманавіч**, 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, трапіў у акружэнне каля в. Семлева Смаленскай вобл. (Расія) 7 кастрычніка1941.

**ІВАНЦОЎ Савелій Іванавіч**, 1914 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Балашове Сaратаўскай вобл. (Расія), пахаваны на гарадскіх могілках 3 лютага 1943.

**КАВАЛЁЎ Андрэй Канстанцінавіч**, 1901 года нараджэння, старшына, загінуў у в. Нервіч Ольштынскага ваяводства (Польшча) 25 лютага 1945.

**КАВАЛЬКОЎ Віктар Васілевіч**, 1921 года нараджэння, старшына, памёр ад ран у в. Горкі Залуцкага р-на Ленінградскай вобл. (Расія) 14 красавіка 1943.

**КАЖАМЯКІН Іван Міхайлавіч**, 1919 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1941.

**КАЖАРАЎ Міхаіл Аляксеевіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў на хутары Разевагоддзі Ломжынскага р-на Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча), пахаваны ў брацкай магіле 13 верасня 1944.

**КАЗАКОЎ Ігнат Елісеевіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**КАЗЛОЎ Архіп Іванавіч**, 1919 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 29 сакавіка 1945.

**КАЗЛОЎ Елісей Карпавіч**, 1898 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Ліповік Ленінградскай вобл. (Расія).

**КАЗЛОЎ Міфодзій Аляксеевіч**, загінуў у в. Непарці Варшаўскага ваяводства (Польшча) 16 кастрычніка 1944.

**КАЗЛОЎ Міхаіл Ігнатавіч**, 1918 года нараджэння, лейтэнант, прапаў без вестак у в. Нева 22 красавіка 1942.

**КАЛАМІЕЦ Іван Фёдаравіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 22 чэрвеня 1941.

**КАНДРАТОВІЧ Гілер Яўсеевіч**, 1906 года нараджэння, памёр ад ран у г. Маскве (Расія) 5 жніўня 1941.

**КАРАЛЁЎ Георгій Васілевіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у верасні 1944.

**КАРАЛЁЎ Мікалай Мікалаевіч**, 1915 года нараджэння, загінуў у г. Серафімовіч 24 жніўня 1942.

**КАРАМАЗЕЎ Яўген Яфімавіч**, 1921 года нараджэння, малодшы лейтэнант, памёр ад ран у с. Зімовенька Троіцкага р-на Курскай вобл. (Расія) 7 ліпеня 1943.

**КАРАСЬ Іван Рыгоравіч**, 1920 года нараджэння, яфрэйтар, загінуў у в. Грос зернц (Германія) 16 лютага 1945.

**КАРКОЎСКІ Анатоль Багданавіч**, 1916 года нараджэння, лейтэнант, загінуў у г. Думінічы 5 студзеня 1942.

**КАРОТКА Уладзімір Фёдаравіч**, 1925 года нараджэння, малодшы сяржант, прапаў без вестак 9 студзеня 1944.

**КАРЫТАЎ Аляксей Міронавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Н. Каменаўка Канстанцінаўскага р-на Растоўскай вобл. (Расія) 17 студзеня 1943.

**КАСАЛАПАЎ Іван Цімафеевіч**, 1900 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Весесхофен (Германія) 13 сакавіка 1945.

**КАСТРУКОЎ Уладзімір Іванавіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Нара-Фамінску (Расія) 27 снежня 1941.

**КАТОЎСКІ Іван Харытонавіч**, чырвонаармеец, загінуў у Латвіі 19 кастрычніка 1944.

**КІРЫЛАЎ Іван Рыгоравіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Слізновізна Шакінскага р-на (Літва) 9 жніўня 1944.

**КІСЯЛЁЎ Піліп Кірылавіч**, 1909 года нараджэння, партызан, прапаў без вестак 15 жніўня 1943.

**КІСЯЛЁЎ Сямён Анісімавіч**, 1919 года нараджэння, яфрэйтар, загінуў у в. Рыжатва Смаленскай вобл. (Расія) 3 сакавіка 1943.

**КІЯЧАЎ Цімафей Мікітавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Вільдэнгоф (Усходняя Прусія), пахаваны на панскіх могілках, магіла № 56 26 красавіка 1945.

**КЛЮЧНІКАЎ Фёдар Якаўлевіч**, 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Ізабелік Родзымінскага павета Варшаўскага ваяводства (Польшча) 21 кастрычніка 1944.

**КЛЯТКОЎ Яўген Рыгоравіч**, 1911 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Карабцова Невельскага р-на Калінінскай вобл. (Расія) 1 лютага 1944.

**КОЖАЎ Мікалай Трафімавіч**, 1914 года нараджэння, старшы лейтэнант, загінуў у в. Кр. Ліман Сталінградскай вобл. (Расія) 25 жніўня 1943.

**КОЗЫРАЎ Фёдар Адамавіч**, 1916 года нараджэння, тэхнік-інтэндант, прапаў без вестак у 1944.

**КОМЛЕЎ Пётр Рыгоравіч**, 1924 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў каля г. Тухеля (Германія) 14 лютага 1945.

**КОТАЎ Дзмітрый Паўлавіч**, 1898 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Говарава Беластоцкай вобл. 5 верасня 1944.

**КРАСНІЦКІ Дзмітрый Андрэевіч**, 1907 года нараджэння, санітар, прапаў без вестак 11 кастрычніка 1944.

**КРАСОЎСКІ Мікалай Міронавіч**, 1918 года нараджэння, старшы лейтэнант, загінуў у г. Буланіне (Расія) 29 красавіка 1943.

**КРАТКОЎ Макар Сцяпанавіч**, 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 кастрычніка 1944.

**КРАЎЦОЎ Васіль Стэфанавіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 12 сакавіка 1942.

**КРАЎЧАНКА Васіль Цімафеевіч**, 1914 года нараджэння, сувязіст, прапаў без вестак 25 верасня 1944.

**КРАЎЧАНКА Ілля Яўціхавіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Аўгкене (Усходняя Прусія) 24 студзеня 1945.

**КРОТАЎ Анатоль Васілевіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Воранава Мгінскага р-на Ленінградскай вобл. (Расія) 23 сакавіка 1943.

**КРОТ Сямён Фёдаравіч**, загінуў у в. Герваты Астраленкскага р-на Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 12 студзеня 1945.

**КРУПЕНКІН Павел Мікалаевіч**, 1899 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у Беластоцкай вобласці 12 верасня 1944.

**КРЫМАЧОЎ Іосіф Клімавіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1941.

**КУДРАЎЦАЎ Янка Яфімавіч**, 1916 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Меламелаўская Сталінградскай вобл. (Расія) 31 кастрычніка 1942.

**КУДРАШОЎ Ягор Іванавіч**, чырвонаармеец, прапаў без вестак 20 кастрычніка 1944.

**КУДРЫЦКІ Леанід Іванавіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Сталінградзе (Расія) 27 жніўня 1941.

**КУЗНЯЦОЎ Іван Еўсцігнеевіч**, 1911 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 22 чэрвеня 1941.

**КУЗЬМІН Сяргей Акімавіч**, 1901 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Рудзева Беластоцкай вобл. 5 лістапада 1944.

**КУКЧАНКА Парфен Кузьміч,** 1897 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у с. Мелавая (Расія) 3 лістапада 1942.

**КУКШЫНАЎ Пётр Аксенцьевіч**, 1927 года нараджэння, сяржант, загінуў у с. Гіртсфдорф (Германія) 16 сакавіка 1945.

**КУКШЫНАЎ Сяргей Арсенцьевіч**, 1906 года нараджэння, памёр ад ран на ст. Домбкавізна Варшаўскага ваяводства (Польшча) 12 кастрычніка 1944.

**КУЛІКОЎСКІ Уладзімір Іванавіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 8 снежня 1941.

**КУНІЧКІН Павел Ільіч,** чырвонаармеец, загінуў у с. Красты Тульскай вобл. (Расія) 24 снежня 1941.

**КУХАРАЎ Андрэй Аляксеевіч**, 1924 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў на ст. Асавец Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 15 жніўня 1944.

**КУХАРАЎ Сцяпан Аляксеевіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 кастрычніка 1944.

**КУХАРЭНКА Пётр Паўлавіч,** 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**КУХАРЭНКА Яфім Ісофавіч**, 1897 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 19 ліпеня 1942.

**КЯКАЎ Васіль Сцяпанавіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Цыцэрка Беластоцкай вобл. 22 жніўня 1944.

**ЛАБАЧОЎ Аляксандр Васілевіч**, 1916 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Марцюкова Ржэўскага р-на Калінінскай вобл. (Расія) 27 жніўня 1942.

**ЛАЎРЫШКА Сяргей Цімафеевіч**, 1901 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр у 352-м нямецкім лагеры Шталаг 28 лістапада 1941.

**ЛЕАНЕНКА Іван Ерафеевіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у в. Белькава (Расія) 1 жніўня 1942.

**ЛЕАНЕНКА Канстанцін Максімавіч**, 1921 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 верасня 1942.

**ЛЕБЕДЗЕЎ Мікалай Васілевіч**, 1894 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў на ст. Джыкінская ў Краснадарскім краі (Расія) 29 верасня 1943.

**ЛЕБЕДЗЕЎ Раман Ягоравіч**, 1916 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў каля в. Уполазы Смаленскай вобл. (Расія) 4 верасня 1942.

**ЛЕВІН Міхаіл Лазаравіч**, 1910 года нараджэння, ваенны тэхнік 2-га рангу, памёр ад ран у пас. Бодрае Жыццё Малаяраслаўскага р-на Маскоўскай вобл. (Расія) 10 студзеня 1942.

**ЛЕГКІ Васіль Ціханавіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**ЛІННІК Пётр Андрэевіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 12 верасня 1944.

**ЛІХУНОЎ Канстанцін Пятровіч**, 1921 года нараджэння, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**ЛУДАРЭВІЧ Віктар Паўлавіч**, чырвонаармеец, прапаў без вестак у 1943.

**ЛУКАШОЎ Станіслаў Барысавіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Бартэнштайне (Усходняя Прусія) 27 сакавіка 1945.

**ЛУСЬКОВІЧ Нічыпар Міхайлавіч**, 1914 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 снежня 1944.

**МАЖЭЙКА Мікалай Сцяпанавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Пратасбрын (Аўстрыя) 6 мая 1945.

**МАІСЕЕНКА Нічыпар Фёдаравіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, за-

гінуў у в. Подлек (Усходняя Прусія) 13 лютага 1945.

**МАІСЕЕНКА Сямён Ягоравіч,** 1919 года нараджэння, старшы сяржант, прапаў без вестак 28 лістапада 1943.

**МАІСЕЕЎ Зусім Ісаакавіч**, чырвонаармеец, загінуў у с. Поды Харкаўскай вобл. (Украіна) 15 лютага 1942.

**МАКАРАЎ Дзмітрый Міхайлавіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1942.

**МАКАРОНАК Васіль Андрэевіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 11 жніўня 1942.

**МАКАРЭВІЧ Аляксандр Мікалаевіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 10 жніўня 1944.

**МАЛАШЭНКАЎ Яфім Кандратавіч**, чырвонаармеец, прапаў без вестак 20 ліпеня 1941.

**МАЛІНОЎСКІ Аркадзь Цімафеевіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Войтава 17 сакавіка 1942.

**МАЛЧАНАЎ Фёдар Антонавіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Петрыкі Смаленскай вобл. (Расія) 11 жніўня 1943.

**МАЛЫШКІН Цярэнцій Аляксандравіч**, чырвонаармеец, 1904 года нараджэння.

**МАЛЮК Ціхан Ігнатавіч,** 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у Арэхаўскім р-не Запарожскай вобл. (Украіна) 21 кастрычніка 1943.

**МАРМАЛЕЎСКІ Іосіф Фартунатавіч**, 1914 года нараджэння, старшына, загінуў на ст. Грады Чудаўскага р-на Ленінградскай вобл. (Расія) 19 ліпеня 1943.

**МАРОЗАЎ Пётр Ананьевіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Арэхаватка Варашылаўградскай вобл. (Расія) 28 студзеня 1942.

**МАРТЫНАЎ Сяргей Піліпавіч**, загінуў у с. Тацішча Харкаўскай вобл. (Украіна) 23 мая 1942.

**МАСКАЧОЎ Міхаіл Васілевіч**, 1919 года нараджэння, загінуў у в. Мураўчык Дзмітрыеўскага р-на Курскай вобл. (Расія) 18 сакавіка 1943.

**МАЦВЕЕЎ Канстанцін**, 1914 года нараджэння, загінуў 15 лютага 1944.

**МАЦЫЕВІЧ Тадэуш Аляксандравіч**, чырвонаармеец, прапаў без вестак у маі 1942.

**МЕДЗЯКОЎ Піліп Дзмітрыевіч**, 1915 года нараджэння, партызан, прапаў без вестак 15 жніўня 1943.

**МЕЛЬНІКАЎ Аляксандр Аляксеевіч**, 1922 года нараджэння, лейтэнант, загінуў у с. Ерзаўка Сталінградскай вобл. (Расія) 11 верасня 1942.

**МЕЛЬНІКАЎ Іосіф Фёдаравіч**, 1906 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў у в. Паляна Арлоўскай вобл. (Расія) 14 жніўня 1942.

**МЕРАНКОЎ Уладзімір Пракопавіч**, 1925 года нараджэння, сяржант, прапаў без вестак 31 кастрычніка 1944.

**МІКУШКІН Міхаіл Уладзіміравіч**, 1924 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў у Польшчы 20 жніўня 1944.

**МІСНІКАЎ Міхаіл Іванавіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у в. Дворск Беластоцкай вобл. 9 верасня 1944.

**МІХАЙЛІЧЭНКА Іван Ануфрыевіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Кірэева Аршанскага р-на 18 лістапада 1943.

**МУТАРЭНКА Якаў Іванавіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 25 чэрвеня 1941.

**НАВІЦКІ Аркадзь Іванавіч**, 1924 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у в. Альт-Тэмплін (Германія) 3 мая 1945.

**НАЗАРАЎ Сямён Іванавіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у верасні 1944.

**НАМАСТЫРАНКА Іосіф Клімавіч**, 1896 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**НАЎРОЦКІ Піліп Іванавіч**, 1898 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 27 ліпеня 1942.

**НОВІКАЎ Іван Пракопавіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у Растоўскай вобл. (Расія) 9 студзеня 1943.

**НОВІКАЎ Міна Максімавіч**, 1920 года нараджэння, малодшы сяржант загінуў у Быдгашчскім ваяводстве (Польшча) 11 лістапада 1945.

**НЫЦІКАЎ Улас Карнеевіч**, 1911 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 10 кастрычніка 1944.

**ПАДАШЭЎСКІ Уладзімір Архіпавіч**, 1923 года нараджэння, старшы сяржант, прапаў без вестак у 1945.

**ПАДРАБІНКІН Канстанцін Рыгоравіч**, 1905 года нараджэння, загінуў у в. Чырвоная Слабада Прапойскага р-на Магілёўскай вобл. 29 кастрычніка 1943.

**ПАДАЛЕВІЧ Антон Іосіфавіч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Эсціна Ленінградскай вобл. (Расія) 31 студзеня 1942.

**ПОДЗІНКАЎ Аляксандр Нічыпаравіч**, 1914 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Станіславу Варшаўскага ваяводства (Польшча) 13 лістапада 1944.

**ПАДШКРЭБКА Міхаіл Рыгоравіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Хатаўня Гомельскай вобл. 26 лістапада 1943.

**ПАЛІМКАЎ Іван Адамавіч**, 1918 года нараджэння, старшы сяржант, памёр ад ран у с. Віняры Сандамірскага р-на (Польшча) 23 лістапада 1944.

**ПАМОНЕНКА Ціхан Васілевіч**, 1902 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 15 кастрычніка 1943.

**ПАНОЎ Сяргей Дзмітрыевіч**, 1901 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Янбем'і (Латвія) 27 снежня 1944.

**ПАНЬКОВІЧ Аляксандр Фёдаравіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Зараве 28 мая 1945.

**ПАПАВІНСКІ Казімір Ігнатавіч**, 1920 года нараджэння, сяржант, загінуў у г. Малгабеку (Расія) 15 верасня 1942.

**ПАПОЎ Цімафей Іванавіч**, старшы сяржант, загінуў на хутары Альхоўскіх Ленінградскай вобл. (Расія) 16 красавіка 1942.

**ПАРФЕНАЎ Мікалай Ціханавіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Хараманы Беластоцкай вобл. 1 верасня 1944.

**ПАТКІН Павел Іванавіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Лебусе (Усходняя Прусія) 1 сакавіка 1945.

**ПАХАР Лука Іванавіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Безгачова Калінінскай вобл. (Расія) 20 жніўня 1942.

**ПАХОМАЎ Сямён Разумовіч**, 1898 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Ландэбургу (Усходняя Прусія) 10 лютага 1945.

**ПАШЧАНКА Павел Ціханавіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Кратшамберг (Германія) 14 лютага 1945.

**ПЛЕЦКІ Антон Цімафеевіч**, 1918 года нараджэння, старшы сяржант, загінуў на Касценьгскай шашы 1 мая 1942.

**ПІЧКОЎСКІ Мікалай Аляксеевіч**, 1921 года нараджэння, лейтэнант, прапаў без вестак у Расошскім р-не (Расія) 12 ліпеня 1942.

**ПЛАКСІН Аляксей Емяльянавіч,** 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 20 жніўня 1944.

**ПЛАТОНЕНКА Мікалай Аляксандравіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Прушкі Беластоцкай вобл. 23 жніўня 1944.

**ПЛОТАЎ Мацвей Іванавіч**, 1899 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр у г. Замбраве Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 18 кастрычніка 1944.

**ПОВАРАЎ Пётр Васілевіч**, 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран 13 кастрычніка 1943.

**ПРАКАПЕНКА Павел Кірылавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Горнастая-Пушча Беластоцкай вобл. 21 жніўня 1944.

**ПРАКОПІЕЎ Салко,** 1902 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр у лагеры ваеннапалонных у г. Славуце (Расія) 7 снежня 1942.

**ПРАСНАКОЎ Усцін Сямёнавіч**, 1924 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Элізангоф Кёнігсбергскай правінцыі (Усходняя Прусія) 1 лютага 1945.

**ПРАСЯНЕНКА Мікалай Барысавіч**, сяржант, прапаў без вестак 24 снежня 1941.

**ПРАФЯРЭНКА Пётр Васілевіч**, 1921 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у в. Вялікая Волга Маскоўскай вобл. (Расія), пахаваны на старых могілках.

**ПРЫВОЛЬНЕЎ Сяргей Мартынавіч**, 1898 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 14 жніўня 1942.

**ПУПІНСКІ Аляксей Іванавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Русь Ламжынскага р-на Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 25 жніўня 1944.

**ПУСКІНАЎ Дзмітрый Пракопавіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран ва Усходняй Прусіі 3 чэрвеня 1945.

**ПУЦІН Альберт Карлавіч**, 1913 года нараджэння, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ПШАНІЦА Фёдар Міхайлавіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Зябрава Арлоўскай вобл. (Расія) 10 красавіка 1942.

**ПЯЧКОЎСКІ Віктар Цімафеевіч**, чырвонаармеец, загінуў у в. Праслацен (Усходняя Прусія) 23 студзеня 1945.

**РАБАКОЎСКІ Мікалай Нілавіч**, 1919 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**РАБЦАЎ Фёдар Андрэевіч**, 1920 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў у в. Чарнышы Смаленскай вобл. (Расія) 19 верасня 1943.

**РАГАЎЦОЎ Раман Дзянісавіч**, 1912 года нараджэння, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**РАДОЎСКІ Сяргей Фёдаравіч**, 1914 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Эліхотава Арджанікідзенскага р-на (Расія) 4 кастрычніка 1942.

**РАЗІНСКІ Абрам Еўкавіч**, лейтэнант, загінуў у в. Ульшына Смаленскай вобл. (Расія) 26 студзеня 1942.

**РАЗУМАЎ Яфім Сямёнавіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1942.

**РАЗУМКОЎ Цімафей Кузьміч**, 1918 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у 1944.

**РАМАНЕНКА Міхаіл Васілевіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Гумбінене (Усходняя Прусія) 20 студзеня 1945.

**РАХМАНАЎ Мікалай Мяфодзьевіч**, 1924 года нараджэння, сяржант, памёр ад ран у г. Шахі (Чэхаславакія) 23 лютага 1945.

**РУДАК Сяргей Сцяпанавіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Абервальд (Усходняя Прусія) 26 студзеня 1945.

**РУСКЕВІЧ Міхаіл Васілевіч**, 1914 года нараджэння, лейтэнант, прапаў без вестак 5 ліпеня 1943.

**РУХАЛІН Веніямін Рыгоравіч**, 1906 года нараджэння, памёр ад ран у в. Захарава Звенігарадскага р-на Маскоўскай вобл. (Расія) 3 лютага 1942.

**РЫЖКОЎ Аляксандр Ігнатавіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 6 жніўня 1944.

**РЫЖКОЎ Рыгор Іванавіч**, 1891 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр у нямецкім лагеры Шталаг 28 мая 1942.

**РЫЖОЎ Ягор Арцёмавіч**, 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Лаўрова Курскай вобл. (Расія) 2 жніўня 1943.

**РЫЛЬКОЎ Іван Міхайлавіч**, 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у жніўні 1944.

**РЫШАТНЁЎ Канстанцін Яфімавіч**, 1911 года нараджэння, лейтэнант, прапаў без вестак 20 жніўня 1942.

**САВІЦКІ Іван Еўстаф'евіч**, чырвонаармеец, памёр ад ран у в. Заожэ Астраленскага павета (Польшча) 16 кастрычніка 1944.

**САМАРЭНКА Нічыпар Арцёмавіч**, 1911 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Гележунен (Усходняя Прусія) 25 кастрычніка 1944.

**САФРОНАЎ Пётр Іванавіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 11 кастрычніка 1944.

**СЕЛІХАЎ Ануфрый Іванавіч**, 1915 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Вілкавішкісе (Літва) 9 жніўня 1944.

**СЛАВІНКАЎ Васіль Азаравіч**, 1911 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Фюрстэнбергу (Германія) 1 сакавіка 1945.

**СЛЕСАРЧУК Пётр Іванавіч**, 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Станіслаўцаве (Польшча) 13 кастрычніка 1944.

**СОКАЛАЎ Ягор Сямёнавіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у верасні 1944.

**СОЛАДАЎ Анатоль Аляксеевіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Вярэі 15 студзеня 1942.

**СКЛЮДАЎ Васіль Сяргеевіч**, 1921 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**СТАРАСЦЕНКА Міхаіл Ільіч**, 1923 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў у с. Лігаўка Харкаўскай вобл. (Украіна) 6 сакавіка 1942.

**СТАЧКУС Адам Мартынавіч**, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Бохне (Польшча) 22 студзеня 1945.

**СТРОЦКІ Мікалай Іванавіч**, 1925 года нараджэння, сяржант, прапаў без вестак 15 студзеня 1945.

**СТРУКАЎ Іван Цімафеевіч**, 1905 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 1 мая 1942.

**СТРУКАЎ Павел Васілевіч**, 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Пясчанае Харкаўскай вобл. (Украіна) 19 сакавіка 1942.

**СТУМБЕРГ Голікс Эдуардавіч**, 1921 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**СТУМБЕРГ Рудольф Эдуардавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**СУГАВЕЦЬ Пётр Баніфатавіч,** 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у верасні 1944.

**СУДЗЯЛЕЎСКІ Аляксандр Іванавіч,** чырвонаармеец, загінуў у с. Сількавічы Смаленскай вобл. (Расія) 10 сакавіка 1942.

**СУМБЕРГ Юлій Эдуардавіч**, 1921 года нараджэння, малодшы лейтэнант, памёр ад ран у г. Маскве (Расія) 31 сакавіка 1942.

**СУСЛЯНКОЎ Іосіф Іванавіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у кастрычніку 1944.

**СЦЕПАНЕНКА Іван Дзям'янавіч**, 1893 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Харкаве (Украіна) 8 лютага 1945.

**СЦЕФАНОВІЧ Станіслаў Мікалаевіч**, 1900 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 23 ліпеня 1943.

**СЯБЕЦКІ Сцяпан Паўлавіч**, 1912 года нараджэння, партызан, прапаў без вестак 15 жніўня 1943.

**СЯРГЕЕЎ Пракоп Раманавіч**, 1906 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 17 лютага 1942.

**ТАРАНАЎ Дамітрый Савельевіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у верасні 1944.

**ТКАЧОЎ Аляксандр Макаравіч**, 1922 года нараджэння, малодшы сяржант, загінуў у в. Гутэнфельд (Усходняя Прусія) 28 студзеня 1945.

**ТРАПАЧОЎ Рыгор Дзмітрыевіч,** 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 9 жніўня 1944.

**ТРАЦЦЯКОЎ Міхаіл Кляменцьевіч**, 1918 года нараджэння, старшы сяржант, загінуў у в. Таўрава Датчынскага р-на (Расія) 7 студзеня 1942.

**ТУЗІКАЎ Фёдар Васілевіч**, 1910 года нараджэння, старшы сяржант, прапаў без вестак у Смаленскай вобл. (Расія) 28 лістапада 1942.

**ТУСКОЎ Андрэй Мікалаевіч,** 1903 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у Кнышынскім р-не Беластоцкай вобл. (цяпер Польшча) 16 кастрычніка 1944.

**УЖАКОЎ Віктар Ісакавіч**, 1914 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Бурбунгене (Усходняя Прусія) 25 студзеня 1945.

**УЛІЦЁНАК Аляксей Сцяпанавіч**, 1922 года нараджэння, малодшы лейтэнант, загінуў у с. Соф'еўка каля г. Ельні (Расія) 10 верасня 1943.

**УСІЛОВАЧЫК Васіль Міхайлавіч**, 1913 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 16 жніўня 1944.

**УСІКАЎ Якаў Іванавіч**, 1899 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ФЁДАРАЎ Мікалай М.**, 1921 года нараджэння, лейтэнант, загінуў у в. Макавае Смаленскай вобл. (Расія) 25 жніўня 1941.

**ФІЛІПЕНКА Аляксандр Трыфанавіч**, 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у 1943.

**ФІЛІПЕНКА Васіль Сідаравіч**, 1924 года нараджэння, сяржант загінуў у с. Штанбая (Аўстрыя) 10 красавіка 1945.

**ФІЛІПЕНКА Іван Герасімавіч**, 1897 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Калбасіна Нялідаўскага р-на Калінінскай вобл. (Расія) 7 лістапада 1943.

**ФІЛІПОВІЧ Іван Макаравіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Кранбургу (Усходняя Прусія) 12 сакавіка 1945.

**ФРАЛОЎ Уладзімір Фёдаравіч**, 1922 года нараджэння, старшы сяржант, прапаў без вестак 10 верасня 1943.

**ФЯСЬКОЎ Яфім Мікалаевіч**, 1909 года нараджэння, партызан, прапаў без вестак 15 жніўня 1943.

**ХАМРАЦІЕЎ Іван Аляксандравіч**, чырвонаармеец, памёр ад ран на ст. Крамест (Германія) 1 сакавіка 1945.

**ХАМУЦІКАЎ Якаў Паўлавіч**, 1922 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў 10 чэрвеня 1942.

**ХАРКЕВІЧ Віктар Іванавіч**, 1909 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Яленаўка Запарожскай вобл. (Украіна) 28 кастрычніка 1943.

**ХАРОШЧА Алег Уладзіміравіч**, 1916 года нараджэння, загінуў у в. Мертута Ленінградскай вобл. (Расія) 17 чэрвеня 1944.

**ХАРЫТОНАЎ Пётр Яфімавіч**, чырвонаармеец, загінуў у в. Чырвоная Слабада Прапойскага р-на Магілёўскай вобл. 31 кастрычніка 1943.

**ХАЦЯНКОЎ Пётр Іванавіч**, 1896 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Станіслева (Усходняя Прусія) 29 студзеня 1945.

**ХОДЧАНКАЎ Пётр Сцяпанавіч**, 1910 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Дамброўка (Польшча) 15 студзеня 1945.

**ХОРАЎ Раман Захаравіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Ніканава Смаленскай вобл. (Расія) 28 лістапада 1942.

**ХРАШЧАНКОЎ Іван Паўлавіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у ліпені 1944.

**ЦАЛАБЁНАК Віктар Уладзіміравіч**, 1923 года нараджэння, лейтэнант, загінуў у в. Рэўкі Сумскай вобл. (Украіна) 19 жніўня 1943.

**ЦЕЦЕРУКОЎ Андрэй Сцяпанавіч**, 1917 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў на хутары Чырвоны Нікалаеўскай вобл. (Украіна) 2 сакавіка 1944.

**ЦІМАШКОЎ Міхаіл Савельевіч**, 1904 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Гураве-Іславецкім (Польшча) 17 лютага 1945.

**ЦІМАШЭНКА Павел Ермалаевіч**, 1911 года нараджэння, сяржант, памёр ад ран у с. Антоў (Венгрыя) 3 красавіка 1945.

**ЦІМКОЎСКІ Павел Іванавіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у Гажэўскім ваяводстве (Польшча) 2 сакавіка 1945.

**ЦІМПЕР Барыс Ігнатавіч**, 1918 года нараджэння, сяржант, загінуў у Калінінскай вобл. (Расія) 24 лістапада 1943.

**ЦІТОЎ Пётр Касьянавіч**, 1911 года нараджэння, партызан, прапаў без вестак 6 ліпеня 1943.

**ЦІХАНОЎСКІ Фёдар Савасцьянавіч**, 1901 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у г. Ганендзе Беластоцкай вобл. 16 верасня 1944.

**ЦЭЙЦІН Яўсей Іосіфавіч**, 1907 года нараджэння, чырвонаармеец, памёр ад ран у г. Эберсдорфе (Аўстрыя) 19 красавіка 1945.

**ЧАМЯРЭДКАЎ Фёдар Кузьміч**, 1915 года нараджэння, старшы сяржант, загінуў каля хутара Грышкіна Краснадарскага краю (Расія) 10 сакавіка 1943.

**ЧЫСТОЎ Канстанцін Фадзеевіч**, 1908 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Дэкіша (Латвія) 21 студзеня 1945.

**ЧЭЧАЛЬ Іван Ягоравіч**, 1926 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Побален (Усходняя Прусія) 14 студзеня 1945.

**ШАВАНАЎ Пётр Яфрэмавіч**, 1921 года нараджэння, яфрэйтар, памёр ад ран у Арнсбургу (Усходняя Прусія) 16 лютага 1945.

**ШАЛАШКОЎ Фёдар Лукіч**, 1896 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Котава Віцебскай вобл. 10 лістапада 1943.

**ШАМІГА Васіль Еўдакімавіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Эсман-Мале Беластоцкай вобл. 17 ліпеня 1944.

**ШАНДЗЯКОЎ Васіль Сцяпанавіч**, 1921 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 9 ліпеня 1941.

**ШАШКОЎ Мікалай Раманавіч**, 1916 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Гронаў Ольштынскага ваяводства (Польшча) 26 студзеня 1945.

**ШАШНОЎ Сямён Антонавіч**, 1905 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у с. Грэшкіна Курскай вобл. (Расія) 10 жніўня 1943.

**ШАЎЦОЎ Мікалай Сямёнавіч**, 1920 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 26 чэрвеня 1941.

**ШАЎЧЭНКА Пётр Савельевіч**, памёр у палоне ў п. Радзіца Арлоўскай вобл. (Расія) 16 студзеня 1942.

**ШКАРУБА Іван Мікітавіч**, 1916 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак у кастрычніку 1944.

**ШОДАЎ Васіль Еўдакімавіч**, 1911 года нараджэння, сяржант, памёр ад ран у г. Вязьме (Расія) 4 верасня 1941.

**ШОРНІКАЎ Марк Герасімавіч**, 1902 года нараджэння, чырвонаармеец, прапаў без вестак 3 ліпеня 1942.

**ШЧЭПКА Мікалай Дзмітрыевіч**, 1912 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў на хутары Радзюш Беластоцкай вобл. 29 жніўня 1944.

**ШЫГЛОЎ Ульян Цімафеевіч**, 1904 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. Вяроўкіна Ленінградскай вобл. (Расія) 20 сакавіка 1943.

**ШЫНКЕВІЧ Мікалай Апанасавіч**, чырвонаармеец, загінуў у в. Калантаева Маскоўскай вобл. (Расія) 11 снежня 1941.

**ШЫРКО Іван Фядотавіч**, 1923 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у в. М. Вязавенка Калужскай вобл. (Расія) 3 красавіка 1942.

**ЯКУШЭНКА Васіль Карпавіч**, загінуў на ст. Пурмсеці (Латвія) 3 лютага 1945.

**ЯМШЧЫКОЎ Іван Ільіч**, 1923 года нараджэння, сяржант, загінуў у г. Шчытна (Польшча) 23 студзеня 1945.

**ЯНЧАНКА Васіль Фёдаравіч**, 1925 года нараджэння, чырвонаармеец, загінуў у мястэчку Юльненгсхоф (Усходняя Прусія) 30 студзеня 1945.

**ЯСЕНКА Яфім Арцёмавіч**, 1918 года нараджэння, старшы сяржант, памёр ад ран у г. Пензе (Расія) 12 чэрвеня 1943.

**ЯСКЕВІЧ Аляксей Макаравіч**, чырвонаармеец, прапаў без вестак 7 жніўня 1944.

**ЯЎМЕНКА Іван Цімафеевіч**, 1917 года нараджэння, малодшы лейтэнант, загінуў у г. Багародзіцк (Расія) 10 лютага 1942.

# 1945

# ДА НАШЫХ ДЗЁН

## У МІРНАЙ ПРАЦЫ

28 чэрвеня 1944 г. Чырвоная Армія вызваліла раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яшчэ не адгрымела вайна, ішлі далей на захад воіны-вызваліцелі, а нашы землякі ўжо ўзяліся за складаную і цяжкую працу — аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі.

За тры гады вайны акупанты ператварылі раён у груды развалін і попелу. Па няпоўных даных, па стану на 28 ліпеня 1944 г. па-зверску былі закатаваны і расстраляны 2558 чалавек. Сілай вывезены ў Нямеччыну звыш 1500 жыхароў раёна. Фашысты спалілі 2358 двароў калгаснікаў, забралі і знішчылі больш за 16 708 галоў буйной рагатай жывёлы, больш за 7450 коней. Разбурылі 5 МТС, спалілі 45 школ, 26 урачэбных пунктаў, шмат дзіцячых садоў і ясляў.

У першыя ж дні пасля выгнання фашыстаў райвыканком правёў шэраг пасяджэнняў са старшынямі сельсаветаў і калгасаў па пытаннях, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, падрыхтоўкі і правядзення ўборачнай кампаніі, нарыхтоўкі сельгаспрадуктаў, справах уліку. У выніку гэтай работы ў раёне па 11 сельсаветах (астатніх даных няма) былі ўлічаны і абагулены 5872 гектары азімых і 2363 гектары яравых культур, 2112 рабочых коней, 254 жарабяці, 55 галоў буйной рагатай жывёлы, 4 свінаматкі, з сельгасінвентару на улік былі ўзяты 940 калёс, 2567 плугоў, 2595 барон, 2245 хамутоў.

Няшмат што засталося з даваенных калгасных пабудоў: 15 кароўнікаў, 4 свінарнікі, 28 канюшняў, 96 свірнаў, 138 гумнаў. Асабліва пацярпелі ад акупантаў гаспадаркі Дабрасневіцкага, Гаранскага, Сялецкага, Гуслішчанскага, Бракаўскага, Бялевіцкага і некаторых іншых сельсаветаў. Тут пачынаць будаўніцтва новага жыцця літаральна не было чым: ні цяглавай сілы, ні сельгасінвентару, ні жывёлы, ні насення хлеба і бульбы. Але ж трэба было ладзіць калектыўную гаспадарку, а таму ўсімі сіламі шукалі сродкі і магчымасці для арганізацыі работы. Намаганні былі фантастычныя, вынікі — таксама. Людзі рабілі, бадай, немагчымае. Дзесьці праз месяц пасля вызвалення раёна ад фашыстаў была адноўлена работа 3 бальніц на 100 ложкаў (адна з іх асобная — на 50 ложкаў: у сувязі з эпідэміяй тыфу), пачалі працаваць 4 урачэбныя ўчасткі, 17 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, аптэка, 7 аддзяленняў сувязі. Поўным ходам ішла тэлефанізацыя сельсаветаў.

Адметны і той факт, што вялікая ўвага адразу ж пасля вызвалення надавалася так званаму дзіцячаму пытанню. Да 1 верасня вырашана было адкрыць 3 сярэднія, 19 няпоўных сярэдніх і 71 пачатковую школы. Загадзя былі прызначаны ў іх загадчыкі і дырэктары, падабраны настаўніцкія і вучнёўскія калектывы. Нашы землякі

з энтузіязмам прыняліся і за правядзенне рамонту школьных пабудоў, будаўніцтва новых школ.

Да лістапада 1944 г. у раёне было адноўлена 90 ферм буйной рагатай жывёлы (1055 галоў), 70 авечкаферм (1555 галоў), 28 птушкаферм. Восенню 1944 г. калектыў Гуслішчанскай МТС тэрмінова адрамантаваў два трактары і вывеў іх на палі. Гэта былі першыя трактары пасля акупацыі.

Актыўны ўдзел у аднаўленні народнай гаспадаркі прыняла моладзь. У раёне былі створаны 20 звенняў па ўборцы ўраджаю і правядзенню азімай сяўбы.

Нямалая цяжкасць лягла ў гэты час на плечы жанчын. 148 з іх былі старшынямі праўлення калгасаў, брыгадзірамі паляводчых брыгад, загадчыцамі ферм. У калгасе «Чырвоны пераўтваральнік», дзе старшынёй была Клаўдзія Кошалева, жанчыны будавалі жывёлагадоўчыя фермы, вырошчвалі ўраджай, выконвалі абавязкі калгасных брыгадзіраў.

Вярталіся дамоў франтавікі: 9 чалавек занялі ў раёне пасады старшынь сельсаветаў, 98 былі выбраны старшынямі калгасаў, 127 — сталі калгаснымі брыгадзірамі (па даных 1946 г.). У раёне былі пабудаваны 2523 жылыя дамы, з іх 860 у 1946 г.

24 кастрычніка 1948 г. на тэрыторыі калгаса «Камінтэрн» урачыста адкрылася раённая сельскагаспадарчая выстаўка. У ёй прынялі ўдзел калгасы адзінаццаці сельсаветаў.

Калгас «Камінтэрн» на выстаўцы прадстаўляла звяно М. Ф. Кузьмянкова, якое сабрала па 30,5 цэнтнеры жыта з гектара. Ільнаводы калгаса імя Кірава падзяліліся з удзельнікамі выстаўкі вопытам вырошчвання багатых ураджаяў ільну-даўгунцу. Сярод удзельнікаў выстаўкі быў таксама знакаміты авечкавод калгаса «Шлях сацыялізму» Краснапольскага сельсавета Е. Церашоў, які на працягу года дабіўся павелічэння пагалоўя на ферме на 250 працэнтаў. Ён захаваў і вырасціў увесь маладняк.

У 1949 г. за дасягнутыя поспехі ў вырошчванні льну-даўгунцу высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена звеннявым Л. В. Аўсеенцы і П. М. Аўсеенцы. За высокія ўраджаі група льнаводаў сельгасарцеляў імя Кірава і імя Валадарскага была ўзнагароджана ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга: Т. Г. Ярмоленка, А. Ф. Козырава, Ф. Н. Купцова, Е. Т. Ракава.

Аб новых поспехах працаўнікоў раёна сведчыла раённая сельскагаспадарчая выстаўка 1950 г. Свае экспанаты на яе прадставілі па жывёлагадоўлі 21 калгас і па паляводству 17. Былі дасягнуты больш высокія ў параўнанні з папярэднімі гадамі паказчыкі: ураджай збожжавых з гектара на 27, а бульбы на 23 працэнты больш, чым ў 1947 г.

У 50-ых гг. становішча сельскай гаспадаркі раёна значна палепшылася. Так, у калгасе «Камінтэрн» Мікалаеўскага сельсавета атрыманы ўраджай па 17 цэнтнераў збожжавых з гектара, а з асобных участкаў па 22 цэнтнеры. За атрыманне высокіх ураджаяў, павышэнне прадуктыўнасці грамадскай жывёлы калгас быў зацверджаны удзельнікам сельскагаспадарчай выстаўкі 1954 г. Лепшыя калгаснікі-перадавікі сельскагаспадарчай вытворчасці (92 чалавекі) Галоўным камітэтам сельскагаспадарчай выстаўкі ўзнагароджаны медалямі. За атрыманне высокіх ураджаяў збожжавых і тэхнічных культур, бульбы, гародніны 22 калгасы ўзнагароджаны дыпломамі. У 1958 г. за вялікія поспехі ў сельскагаспадарчай вытворчасці званне Героя Сацыялістычнай Працы было прысвоена Т. С. Зубаравай, І. В. Сяргееву.

У 60-ыя гады ўзрасла тэхнічная ўзброеннасць земляробства. Калі ў 1963 г. у раёне было 269 трактароў, то ў 1967 г. —

у тры разы больш. Са 109 да 232 узрасла колькасць камбайнаў.

У 1963 г. у гаспадарках раёна было атрымана ў сярэднім па 8,2 цэнтнера збожжавых, 72 цэнтнеры бульбы, 3,8 цэнтнера льновалакна з гектара. У 1966 г. з кожнага гектара атрымалі 11,5 цэнтнера збожжавых, 98,5 цэнтнера бульбы, 4,1 цэнтнера льновалакна.

Значна павялічылася пагалоўе буйной рагатай жывёлы — з 29 947 галоў у 1963 г. да 42 577 галоў у 1967 г. (на 42,1 працэнта). На 11,8 працэнтаў павялічылася колькасць свіней, на 31,2 працэнта авечак. Надой малака ў 1966 г. склаў 1914 кілаграмаў супраць 1363 кілаграмаў у 1963 г. На 100 гектараў сельгасугоддзяў у раёне атрымана 299 цэнтнераў малака, 53,2 цэнтнера мяса супраць 154 і 27,2 цэнтнера у 1963 г.

За вялікія вытворчыя справы сельгасарцель «Камінтэрн» удастоена высокай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Звання Героя Сацыялістычнай Працы былі ўдастоены Г. А. Пускін, П. Б. Пракапнёва.

У 60-ыя гады палепшылася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва раёна. З 275 у 1963 г. да 325 у 1967 г. павялічылася колькасць ложкаў ва ўчастковых і сельскіх бальніцах. Насельніцтва абслугоўвала 8 бальніц і 36 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, раённая туберкулёзная бальніца ў в. Семукачы.

На новыя рубяжы ў развіцці сельскай гаспадаркі падняўся раён у 70-ых гг. Вось даныя за 1976 г. З кожнага гектара было сабрана па 26,4 цэнтнера збожжавых і зернебабовых. Валавы збор збожжавых і зернебабовых склаў 107,2 тысячы тон пры абавязацельстве 100 тысяч тон. Працаўнікі раёна ўзялі павышаныя абавязацельствы па продажу збожжа дзяржаве і да 10 верасня датэрмінова выканалі план 1976 г. Засыпалі ў засекі 17 950 тон збожжа пры плане 17 000. Калгас «Авангард» сабраў з кожнага гектара па 43,6 цэнтнера. Больш 35 цэнтнераў збожжавых атрымалі калгасы «Камінтэрн» і «Зара». Пераступілі 30-цэнтнерны рубеж з гектара калгасы імя Калініна, імя Валадарскага, «Маяк камунізму», «Герой працы», імя Заслонава, імя Дзяржынскага, эксперыментальная база «Дашкаўка».

Сацыяльна-эканамічнае жыццё раёна ў 80-ыя гг. праходзіла ў складаных умовах. Крызіснае становішча ў рэспубліцы і краіне не абмінула і раён. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС стала цяжкім выпрабаваннем для яго жыхароў. Нягледзячы на гэта, працаўнікі раёна сталіся не зніжаць тэмпы вытворчасці ў народнай гаспадарцы. На працягу 1981—1983 гг. прамысловасць раёна забяспечыла выкананне заданняў па аб'ёму таварнай прадукцыі і тэмпах росту прадукцыйнасці працы. Намеціліся станоўчыя тэндэнцыі ў рабоце будаўнічых арганізацый, узраслі аб'ёмы рознічнага тавараабароту і бытавых паслуг. Пэўных поспехаў дабіліся працаўнікі сельскай гаспадаркі, выканаўшы планы па продажу дзяржаве асноўных відаў сельгаспрадукцыі.

У 1987 г. была створана аграгандлёвая фірма «Днепр» — прадпрыемства па вытворчасці агародніны ў адкрытым грунце, перапрацоўцы і рэалізацыі насельніцтву свежай і кансерванай прадукцыі.

У другой палове 1980-ых гг. намеціўся некаторы спад прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы.

Так, у 1986 г. у сярэднім па раёну з кожнага гектара было сабрана 21,5 цэнтнера збожжавых, 178 цэнтнераў бульбы, 5 цэнтнераў ільновалакна; у 1988 г. — 24,6 цэнтнера збожжавых, 123 — бульбы, 4,6 — ільновалакна.

У 1990 г. прамысловасць раёна, якая прадстаўлена лясгасам, поўнасцю выканала дагаворныя абавязацельствы па пастаўках прадукцыі. Аб'ём яе вытворчасці склаў 1 мільён 157 тысяч

рублёў. Гэта на 9 працэнтаў ніжэй за мінулагодні. Прадукцыйнасць працы ўзрасла на 17,1 працэнта.

За 1990 г. выпушчана тавараў народнага спажывання на 17 мільёнаў 654 тысячы рублёў, што на 2,6 працэнта ніжэй узроўню 1989 г. Харчовых тавараў выраблена на 17 мільёнаў 517 тысяч рублёў, што на 3 працэнты менш папярэдняга года. Прададзена дзяржаве 22 726 тон збожжа, 23 653 тоны бульбы, 25 891 тона гародніны, 481 тона ільноваланкна, гэта значна менш узроўню 1989 г. На 6 працэнтаў у параўнанні з мінулагоднім скарацілася вытворчасць мяса. Яго атрымана на 100 гектараў сельгасугоддзяў па 224,6 цэнтнера (238,5 у 1989 г.).

Дзяржаўныя нарыхтоўкі жывёлагадоўчай прадукцыі ва ўсіх гаспадарках раёна склалі ў 1989 і 1990 гг. адпаведна 26 945 і 26 041 тону мяса, 75 352 тоны малака.

У 1991 г. вытворчасць прамысловай прадукцыі лясгаса ў першым паўгоддзі скарацілася на 8 працэнтаў супраць мінулага года. У сярэднім па раёну надоена 1672 кілаграмы малака на адну карову, што на 45 кілаграмаў менш, чым за мінулы год.

За першае паўгоддзе 1992 г. аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі скараціўся на 18 працэнтаў, супраць 1991 года. Вытворчасць мяса, малака скарацілася на 20 працэнтаў у параўнанні з мінулагодняй.

У 1993 г. калгасамі і саўгасамі раёна атрымана 122 235 тон збожжа, што на 12,3 працэнта больш, чым у 1992 г., бульбы 45 779 тон, або на 39,1 працэнта больш мінулагодняга. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых у сярэднім па раёну склала 35,2 цэнтнера з гектара супраць 30,7 цэнтнера ў 1992 г., бульбы — 150,3 цэнтнера, што на 66,2 цэнтнера больш, чым у 1992 г. Вытворчасць мяса па раёну скарацілася на 11,6 працэнта, вытворчасць малака на 7 працэнтаў. Вытворчасць яек скарацілася ў абсалютнай большасці птушкафабрык.

Зніжэнне вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі з'явілася вынікам пастаяннага скарачэння колькасці грамадскага пагалоўя жывёлы. Буйной рагатай жывёлы на пачатак студзеня 1994 г. налічвалася 51 374 галавы супраць 55 561 на 1 студзеня 1993 г. (92 працэнты), у тым ліку кароў 17 260 супраць 18 147 галоў (95 працэнтаў), свіней 34 797 супраць 35 273 (99 працэнтаў).

На 1 студзеня 1994 г. у раёне зарэгістраваны 72 фермерскія гаспадаркі, за якімі замацаваны 1661 гектар зямлі, з іх 1292 гектары ворыўных.

*У. Агурцоў, Т. Чамрук*

**Выпіска са справаздачы аб рабоце выканкома Магілёўскага раёна Савета дэпутатаў працоўных за перыяд з ліпеня 1944 г. па ліпень 1947 г.**

...У перыяд Вялікай Айчыннай вайны гаспадарцы Магілёўскага раёна нямецкія захопнікі ўчынілі велізарныя страты.

У грашовым вызначэнні яны складаюць 1 мільярд 794 мільёны 44 тысячы рублёў.

...У кароткія тэрміны намі былі поўнасцю адноўлены 26 сельскіх Саветаў, 194 калгасы і 5 машынна-трактарных станцый. Раёну была аказана значная дапамога дзяржавай.

Для укамплектавання калгасных ферм у 1944 г. з усходніх абласцей СССР было атрымана 1097 галоў буйной рагатай жывёлы, з іх 112 кароў.

**Рост пасяўных плошчаў у 1946—1947 гг. у калгасах:**

| | |
|---|---|
| 1946 г. | 33285 га |
| 1947 г. | 42571 га |

**Сярэдняя ураджайнасць у 1946 г.**

| | |
|---|---|
| збожжавыя | — 4,4 цэнтнера |
| бульба | — 41,6 цэнтнера з гектара |

**Жывёлагадоўля**

**Наяўнасць на 1 ліпеня 1947 г.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Коні | — 4440 | Авечкі | — 6048 |
| Буйная рагатая жывёла | — 4141 | Свінні | — 220 |
| у тым ліку кароў | — 1587 | Птушка | — 1667 |

Нямецкія акупанты спалілі і разбурылі 4108 дамоў калгаснікаў. Дзяржавай для будаўніцтва выдзелена бясплатна 45 792 кубаметраў лесаматэрыялаў і выдадзена доўгатэрміновага крэдыту ў сумме 3 мільёны 88 тысяч рублёў. У выніку пабудавана дамоў: у 1944 г. — 985, у 1945 — 1123, у 1946 — 942 і з студзеня па 1 красавіка 1947 г. — 117 дамоў. Пераселена з зямлянак 3167 сем'яў калгаснікаў. У зямлянках і па падсяленні засталося пражываць адпаведна 243 і 698 сем'яў.

**Стан народнай адукацыі**

Каля сотні школьных будынкаў было разбурана і спалена. Знішчана ўся школьная маёмасць, хімкабінеты, фізкабінеты, бібліятэкі.

**Наяўнасць школ і вучняў**

| | 1944/45 г. | 1945/46 г. | 1946/47 г. |
|---|---|---|---|
| Пачатковыя школы | 82 | 84 | 87 |
| Вучні | 8031 | 8889 | 8785 |
| Няпоўныя сярэднія школы | 21 | 22 | 27 |
| Вучні | 9339 | 5743 | 6513 |
| Сярэднія школы | 3 | 3 | 3 |
| Вучні | 823 | 1041 | 948 |

**Ахова здароўя**

Для абслугоўвання насельніцтва раёна маецца: 4 бальніцы (74 ложкі), 5 урачэбных амбулаторый, 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 6 здраўпунктаў, 7 дзіцячых ясляў на 210 ложкаў.

**Выкананне плана выпуска валавай прадукцыі ў цэнах 1926—1927 гг. па райвыканкомам Магілёўскага аблмесцпрома на верасень па Магілёўскаму раёну**

| | |
|---|---|
| Гадавы план на 1947 г. у тыс. рублях | — 700 |
| працэнт выканання: | |
| месячны | — 88 |
| квартальны | — 105 |
| гадавы | — 81 |
| Тэмп росту ў працэнтах: | |
| справаздачны месяц і папярэдні | — 59 |
| справаздачны месяц і адпаведны перыяд 1946 г. | — 56 |
| з пачатку года да адпаведнага перыяду 1946 г. | — 70 |

*Дзяржархіў Магілёўскай вобл., ф. 9, воп. 4, спр. 18*

## Конезавод-95

**З успамінаў В. І. Мартынава, загадчыка гісторыка-краязнаўчага музея Дашкаўскай сярэдняй школы**

Конезавод, аб якім памятаюць сёння многія жыхары Дашкаўкі і з задавальненнем расказваюць маладому пакаленню, быў утвораны ў вёсцы ў 1934 г. Дырэктарам яго быў назначаны Пракоп Герасімавіч Балашэнка. Конезавод закупіў самцоў і матачнае пагалоўе коней англійскай пароды «тракены» для верхавой язды. Хутка ён меў 200 коней. З іх штогод рэалізоўвалі ў армію 50. Рэалізацыі падлягалі коні, якія былі падрыхтаваны і выпрабаваны на іпадромах краіны.

Конезавод быў гонарам не толькі Дашкаўкі, алі і ўсёй Беларусі. Коней да двух гадоў трымалі ў гаспадарцы, потым на год адпраўлялі для выпрабаванняў на дзяржаўныя іпадромы Кіева, Харкава, Рыгі, Таліна і іншых гарадоў. Выхаванцы конезавода-95 неаднаразова перамагалі на іх.

На заводзе былі свае жакеі і трэнеры. Некаторыя з іх да гэтага часу жывуць у Дашкаўцы. Гэта Мікалай Іосіфавіч Ярошчанка, Сямён Іосіфавіч Куковіч, Анатоль Іванавіч Харановіч. Трэнеры праходзілі падрыхтоўку ў Варонежскай вобласці, у так званай Хронеўскай школе трэнераў-наезднікаў (былы маёнтак графа Арлова пры конезаводзе-10). Адсюль і назва «Арлоўская порода рысакоў».

...Пры конезаводзе быў створаны свой іпадром. На ім трэніравалі, аб'язджалі коней і часта арганізоўвалі скачкі, якія былі цікаўнейшымі відовішчамі. Гэта былі святы з удзелам усяго насельніцтва Дашкаўкі.

Напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз прыпыніў мірную працу людзей. З ліпеня конезавод сваім ходам адправіўся ў далёкі шлях — на ўсход, у эвакуацыю. Фашысцкая авіяцыя пастаянна бамбіла. Першае хрышчэнне рабочыя конезавода атрымалі на другі дзень пад вёскай Сухары. Кругом гарэлі вёскі, але пагалоўе коней удалося правесці поўнасцю. У Ельні ледзь не трапілі ў акружэнне. Рухаліся па шляху размяшчэння конезаводаў: Мсціслаў — Ельня — Дарагабуж — Разань — Горкі.

Аднойчы зайшлі ў праўленне аднаго з калгасаў з просьбай даць трохі хлеба. Ішла ўборка. Старшыня папрасіў дапамагчы скасіць жыта. За аказаную дапамогу калгас выдаў дзве выпечкі хлеба. Пасля лістападаўскіх свят нарэшце дайшлі да конезавода-23 (у Горкаўскай вобласці). Многія засталіся там працаваць.

Вясной 1944 г. рабочыя конезавода на чале з дырэктарам пачалі шлях назад у Дашкаўку. У ліпені 1944 г. без коней прыбылі ў Дашкаўку. Толькі конюх Казлоўскі прывёў двух вытворнікаў.

Пасля вайны ўсе ўдзельнікі эвакапахода былі ўзнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчынай вайне 1941—1945 гг.».

Завод аднаўляў сваю работу. Стайні, на жаль, не уцалелі. Завезлі з Венгрыі пароду амерыканскага рысака і ў выніку селекцыйнай работы вывелі рускага рысака, які хадзіў у вупражы. Конезавод-95 яўляўся пастаянным удзельнікам ВДНГ СССР, а яго дырэктар быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У 1956 г. конезавод быў расфарміраваны і на яго аснове створана эксперыментальная база «Дашкаўка».

## Вызначыліся працай

### Героі Сацыялістычнай Працы

**АРСЕНЬЕВА Надзея Паўлаўна.** Нарадзілася 13 сакавіка 1929 г. у в. Заборанка Холмскага раёна Ленінградскай вобласці. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці. Працавала даяркай у саўгасе «Вейна» Магілёўскага раёна. У 1966 г. за дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак малака Н. П. Арсеньевай было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Памерла 21 студзеня 1989 г.



Л. В. Аўсеенка



П. М. Аўсеенка

**АЎСЕЕНКА *Лідзія Васілеўна*.** Нарадзілася 10 студзеня 1914 г. у в. Забор'е Магілёўскага раёна ў сям'і селяніна-бедняка.

З 1946 г. працавала звеннявой па вырошчванню льну. Лён апрацоўвалі ўручную і здавалі дзяржаве валакном, пазней пачалі здаваць валакном і трастой. На замацаванай за звяном плошчы атрымлівалі па 9 цэнтнераў ільну-даўгунцу і па 5,6 цэнтнера льносемя з гектара.

За высокія ўраджаі льну-даўгунцу ў 1949 г. Лідзіі Васілеўне Аўсеенцы было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

**АЎСЕЕНКА Паліна Максімаўна.** Нарадзілася 5 лістапада 1915 г. у в. Казіміраўка Магілёўскага раёна ў сям'і селяніна-бедняка.

З 1944 да 1946 г. П. М. Аўсеенка працавала брыгадзірам паляводчай брыгады; з 1946 г. — звеннявой па вырошчванню льну. У 1948 г. звяно атрымала 9 цэнтнераў льновалакна і 5,6 цэнтнера льносемя з гектара. У гэтым жа годзе за дасягнутыя поспехі ў вырошчванні льну Паліне Максімаўне Аўсеенцы было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

**БАНДАРЭНКА Зінаіда Васілеўна.** Нарадзілася 17 лютага 1937 г. у в. Машанакі Магілёўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1981). Ганаровы хімік (1976). З 1955 г. прадзільшчыца, а з 1975 г. апаратчыца фармавання хімвалакна прадзільнага цэха завода штучнага валакна імя Куйбышава Магілёўскага аб'яднання «Хімвалакно».

**ЗУБАРАВА Таццяна Сямёнаўна.** Нарадзілася 24 снежня 1916 г. у в. Мікалаеўка-2 Магілёўскага раёна. Працоўную дзейнасць пачала ў 1933 г. даяркай ў калгасе «Шлях да сацыялізму» Магілёўскага раёна. З 1950 г. працавала даяркай у калгасе «Камінтэрн» гэтага ж раёна. За вялікія поспехі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1958 г. Т. С. Зубаравай было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Памерла ў маі 1994 г.

**ПАРФЁНЕНКА Іван Якаўлевіч.** Нарадзіўся 10 лютага 1929 г. у в. Галяні-1 Магілёўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Заслужаны настаўнік рабочай моладзі БССР (1977). З 1946 г. працаваў на Мінскім трактарным заводзе (слесар, матарыст эксперыментальнага цэха). З 1964 г. матарыст, з 1975 г. выпрабавальнік рухавікоў Мінскага маторнага завода. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена за паспяховае выкананне вытворчых планаў.

**ПРАКАПНЁВА Пелагея Барысаўна.** Нарадзілася 14 кастрычніка 1914 г. у в. Масток Магілёўскага раёна ў беднай сялянскай сям'і. Працавала на торфзаводзе ў вёсцы Фойна-Масток. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пераехала на жыхарства ў вёску Мікалаеўка-2 Палыкавіцкага сельсавета Магілёўскага раёна і чатыры гады працавала конюхам ў калгасе «Камінтэрн». Потым займалася вырошчваннем агародніны.

У 1963 г. праўленне калгаса прызначы-



П. Б. Пракапнёва



Р. А. Пускін



С. І. Слабадзян



І. В. Сяргееў

ла П. Б. Пракапнёву звеннявой па вырошчванню льну. На падставе строгага захавання правіл агратэхнікі звяно П. Б. Пракапнёвай штогод атрымлівала амаль па тоне льнонасення і валакна з гектара.

За поспехі, дасягнутыя ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак ільну ў 1966 г. П. Б. Пракапнёвай было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Шмат разоў яна была ўдзельніцай Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, удастоілася некалькіх яе медалёў.

**ПУСКІН Рыгор Антонавіч.** Нарадзіўся 26 кастрычніка 1929 г. ў в. Палыкавічы Магілёўскага раёна ў сялянскай сям'і. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны закончыў чатыры класы, пасля вайны — шосты клас няпоўнай сярэдняй школы і пачаў працаваць ў мясцовым калгасе «Камінтэрн». Зімой 1947/48 гг. вучыўся на курсах пры Казіміраўскай МТС Магілёўскага раёна. Закончыўшы іх, працаваў трактарыстам. Вясной 1950 г. яго прызвалі ў рады Савецкай Арміі.

Восенню 1953 г. дэмабілізаваўся і зноў пачаў працаваць у калгасе па сваёй спецыяльнасці. На трактары «Беларусь» выпрацоўваў 1100—1200 гектараў умоўнага ворыва пры норме 900 гектараў. Старанна і ўмела выкарыстоўваў тэхніку. Таму яго трактар заўсёды служыў не менш 10 гадоў. Кожны сезон эканоміў сотні кілаграммаў гаруча-змазачных матэрыялаў.

Акрамя таго, узначальваў механізаванае паляводчае звяно і штогод атрымліваў з кожнага гектара па 170—180 цэнтнераў клубняў бульбы.

Шмат разоў быў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР і ўзнагароджваўся яе медалямі. За поспехі, дасягнутыя ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак жыта, пшаніцы, грачыхі і іншых збожжавых культур, у 1966 г. Р. А. Пускіну было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Памёр 30 красавіка 1978 г.

**СЛАБАДЗЯН Сяргей Ільіч.** Нарадзіўся 15 ліпеня 1907 г. у в. Бахматаўцы Праскураўскага раёна Кіеўскай вобласці ў сям'і селяніна-бедняка. У 1938 г. пераехаў у Магілёўскі раён у в. Мікалаеўка-2. Працаваў у калгасе да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

У чэрвені 1941 г. быў мабілізаваны ў Савецкую Армію, удзельнічаў у баях на Заходнім фронце, на 3-м Беларускім і на 1-ым Украінскім франтах, двойчы быў паранены. За выкананне баявых заданняў атрымаў некалькі ўзнагарод.

У лістападзе 1945 г. дэмабілізаваўся з радоў Савецкай Арміі. Вярнуўся ў в. Мікалаеўка-2 і стаў працаваць у калгасе конюхам на племяннной коневодчай ферме. На працягу многіх гадоў ферма мела высокія паказчыкі па атрыманню і захаванню маладняка.

За высокія паказчыкі ў развіцці коневодства С. І. Слабадзян у 1949 г. быў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.

**СЯРГЕЕЎ Ілья Васілевіч.** Нарадзіўся


З. П. Цітова

9 жніўня 1909 г. у Магілёве ў сям'і рабочага.

З кастрычніка 1932 да 1935 г. працаваў старшынёй праўлення калгаса ў вёсцы Паплаўшчына. Гаспадарка была эканамічна слабай, асноўнай цяглавай сілай былі коні, работы ўсе выконваліся ўручную і толькі ў час веснавой сяўбы з Магілёўскай МТС прысылалі адзін трактар «Фардзон». Як старшыня калгаса І. В. Сяргееў зарабляў 80 працадзён у месяц (на адзін працадзень выдавалі па 200 грамаў хлеба). У студзені 1935 г. Магілёўскі райком КПБ накіраваў яго ў в. Забалацце ў калгас «1 Мая», дзе ён працаваў старшынёй гаспадаркі да 1937 г., а ў лютым 1937 г. зноў пераехаў ў в. Паплаўшчына, дзе і працаваў старшынёй калгаса да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

З чэрвеня 1944 г. працаваў у в. Краснаполле старшынёй калгаса «Камінтэрн». Гаспадарка была насенняводчай, але разам з тым развіваліся жывёлагадоўля і раслінаводства, агароднінаводства.

З кожным годам калгас набіраў моц, стаў эканамічна развітай шматгаліновай гаспадаркай і выйшаў на ўзровень перадавых калгасаў рэспублікі. За выдатныя поспехі, дасягнутыя ў справе развіцця сельскай гаспадаркі па вытворчасці збожжа, бульбы, ільну, мяса, малака і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі, і ўкараненне ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыта ў 1958 г. І. В. Сяргееву было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

**ЦІТОВА Зоя Прохараўна.** Нарадзілася 1 студзеня 1919 г. у в. Галынец Магілёўскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1938 г. скончыла Магілёўскую фельчарска-акушэрскую школу.

Працавала ў Гомельскай вобласці (1938–1941). Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 па 1959 г. працавала ў Дабрасневіцкім медпункце. З 1959 г. працавала акушэркай у Ямніцкай бальніцы. У 1969 г. З. П. Цітовай было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы за поспехі ў галіне аховы здароўя нашага народа. Памерла 3 чэрвеня 1995 г.

## Узнагароджаны ордэнам Леніна

**БАЗЕКІН Цімафей Іванавіч** — дырэктар саўгаса «Вейна». 1966 г.

**БАЛАШЭНКА Марыя Антонаўна** — свінарка калгаса «Чырвоная зорка». 1966 г.

**ВОЙТАЎ Іван Ягоравіч** — даглядчык жывёлы калгаса «Маяк камунізму». 1973 г.

**ДЗЕНІСЕНКА Вера Елісееўна** — даярка калгаса «Камінтэрн». 1973 г.

**ЗАРЫПАВА Настасся Паўлаўна** — даярка саўгаса «Вейна». 1971 г.

**КОСТУСЕВА Соф'я Андрэеўна** — даярка калгаса імя Валадарскага. 1980 г.

**ЛАСУНОЎ Кузьма Нікіфаравіч** — старшыня калгаса імя Дзяржынскага. Буйнічы. 1966 г.

**ЛЕБЕДЗЕЎ Георгій Кузьміч** — упраўляючы райаб'яднаннем «Сельгастэхніка». 1971 г.

**НІЗАЎЦОЎ Рыгор Уладзіміравіч** — брыгадзір калгаса «Маяк камунізму». 1966 г.

**ПАЛЯКОЎ Сцяпан Мікітавіч** — брыгадзір калгаса імя Калініна. 1971 г.

**ПЕРАПЕТКІН Іван Савельевіч** — брыгадзір калгаса «Камінтэрн». 1971 г.

**ПРАЛЕЙЧЫК Сямён Васілевіч** — брыгадзір Магілёўскай птушкафабрыкі. 1971 г.

**РЫЖКОВА Фядора Міхайлаўна** — даярка калгаса імя Валадарскага. 1971 г.

**САМУСЕВА Марыя Якаўлеўна** — звеннявая па вырошчванню льну калгаса «Камінтэрн». 1978 г.

**СЯКАЦКАЯ Аляксандра Паўлаўна** — даярка калгаса «Камінтэрн». 1958 г.

**СЯМЕНКА Галіна Сцяпанаўна** — даярка эксперыментальнай базы «Дашкаўка». 1973 г.

**ФАМІН Аляксей Парфенавіч** — токар райаб'яднання «Сельгастэхніка». 1971 г.

**ХЛІМАНКОВА Марыя Ульянаўна** — даярка саўгаса «Магілёўскі». 1966 г.

**ЦАЛАБЁНАК Надзея Сяргееўна** — даярка калгаса імя Калініна. 1973 г.

**ЦІМАФЕЕВА Вольга Рыгораўна** — даярка калгаса «Камінтэрн». 1958 г.

**ШАБУЛДА Канстанцін Раманавіч** — сакратар Магілёўскага райкома КПБ. 1971 г.

**ШУМЯНКОЎ Мікалай Філімонавіч** — брыгадзір калгаса імя Калініна. 1966 г.

**ШЫРОКІ Генадзь Міхайлавіч** — машыніст экскаватара СМУ аблмеліятрэста. 1971 г.

**ЮРЧАНКА Елісей Андрэевіч** — механізатар калгаса «Камінтэрн». 1970 г.

**ЯКІРЭВІЧ Аркадзь Восіпавіч** — старшыня калгаса «Камінтэрн». 1966 г.

## Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

### Заслужаны аграном

**ШЫМАН Сяргей Аляксандравіч**

### Заслужаны майстар прафісіянальна-тэхнічнай адукацыі

**ЁЛАЧКІН Канстанцін Клімавіч**
**ЛЬВОЎ Аляксандр Вісарыёнавіч**
**РЫЖАНКОЎ Іван Аляксандравіч**

### Заслужаныя настаўнікі

**АЛЯКСЕЕНКА Таццяна Мікалаеўна**
**ВЯРБІЦКАЯ Ірына Іванаўна**
**ВАСІЛЬЕЎ Леанід Якаўлевіч**
**ВІШНЕЎСКІ Яраслаў Паўлавіч**
**ГУРКОЎ Іван Фаміч**
**ЖАРСКАЯ Вольга Іосіфаўна**
**ЕЛІСЕЕЎ Мікалай Апанасавіч**
**КАЗАКОВА Ульяна Канстанцінаўна**
**ЛАЗАРАВА Таццяна Прохараўна**
**ЛАТУШКА Сцяпан Мікітавіч**
**МЕЛЬНІКАВА Ангеліна Антонаўна**
**ПАЎЛАВА Ксенія Паўлаўна**
**ПІМОТА Віктар Пятровіч**
**ШАТУХІНА Лідзія Кузьмінічна**
**ШЛЫЧКОВА Ірына Іванаўна**
**ШЛЯХЦЕНКА Наталля Апанасаўна**
**ЯЗВІНСКАЯ Маіна Аляксандраўна**

### Заслужаны настаўнік працоўнай моладзі

**ДЗЯНІСЕНКА Вера Елісееўна**

### Заслужаныя работнікі аховы здароўя

**ДЗМІТРЫЕЎ Сяргей Усцінавіч**
**ЛАБКОЎ Васіль Паўлавіч**
**ЯФІМЕНКА Федар Паўлавіч**

### Заслужаныя работнікі бытавога абслугоўвання насельніцтва

**АГАРОДНІКАВА Тамара Барысаўна**
**ЧАШКОЎСКАЯ Валянціна Цярэнцеўна**
**ЯМЕЛЬЧЫКАВА Таццяна Мікалаеўна**

### Заслужаныя работнікі сельскай гаспадаркі

**АЎДЗЕЕНКА Ніна Дзмітрыеўна**
**ЕРМАЛАЕВА Францыска Пятроўна**
**МІЛЕЎСКІ Віктар Сямёнавіч**

### Заслужаны сувязіст

**ХАДАСЕВІЧ Рыгор Іосіфавіч**

## Ахвяры неаб'яўленай вайны

### Праз іх жыццё прайшла вайна

Пра вайну ў Афганістане, удзел ў ёй нашай арміі і сёння яшчэ вядома не ўсё. Але як бы там ні было, тая вайна прайшлася па лёсах многіх нашых землякоў. Аплакваюць і доўга яшчэ будуць аплакваць загінуўшых, цяжка жыць і застаўшымся інвалідам, і іх сем'ям. Душэўны дыскамфорт і сёння спытваюць, як прызнаюцца самі, амаль усе былыя ўдзельнікі афганскіх падзей. Жывуць яны сярод нас, не прэтэндуючы на асаблівыя ўвагу і клопат. Мноства сваіх праблем стараюцца вырашаць самастойна, хоць не заўсёды ў сілах справіцца з імі. Каб хоць неяк аблегчыць жыццё, больш поўна прадстаўляць свае інтарэсы, воіны-інтэрнацыяналісты аб'ядналіся ў адзін рэспубліканскі саюз. На месцах яны таксама маюць свае адпаведныя фарміраванні. Але і гэтых мер не заўсёды дастаткова, каб ўсё ў жыцці «афганцаў» ішло спакойна і добра. Не абысціся ім без увагі з боку мясцовых улад. Кіраўніцтва нашага раёна добра ведае і разумее праблемы воінаў-інтэрнацыяналістаў. Гэта яшчэ раз паказала сустрэча супрацоўнікаў райвыканкома, кіраўнікоў служб раёна з воінамі-інтэрнацыяналістамі, якая прайшла ў СПТВ № 1 імя К. П. Арлоўскага. Размова атрымалася шчырай і дзейнай. «Афганцы» высветлілі многае з таго, што іх цікавіла. Так, напрыклад, ваенком раёна У. М. Гарбаценка не толькі расказаў аб сучасным становішчы ў арміі, але і адказаў на шматлікія пытанні аб сацыяльнай абароненасці, ільготах і дапамогах воінам-інтэрнацыяналістам.

З цікавасцю слухалі воіны-інтэрнацыяналісты выступленні старшыні Магілёўскай асацыяцыі ветэранаў вайны ў Афганістане Мікалая Казлова і старшыні аб'яднання воінаў-інтэрнацыяналістаў «Афганветцэнтр» Валерыя Дулебенца, якія расказалі аб дзейнасці сваіх арганізацый, запрасілі «афганцаў» раёна прыходзіць у асацыяцыю і цэнтр з узнікаючымі пытаннямі, праблемамі, прапановамі.

У каго што баліць, той аб тым і гаворыць,— кажуць у народзе. Так і на гэтай сустрэчы было: набалелае і хвалюючае выплёсквалася цераз край. У асноўным гэта датычыла жыллёвых праблем. Яно і зразумела: маладым сем'ям былых «афганцаў» хочацца мець свой уласны кут. Вось толькі як? Перспектывы атрымаць дзяржаўныя кватэры ёсць рэдка ў каго, будавацца ўласнымі сіламі — не кожнаму па кішэні пры сённяшняй дарагоўлі на ўсё. Выйсце адно — узяць пазыку на будаўніцтва. Але і гэта, як гаварылі многія з прысутных,— даволі праблематычная справа. То ўзнікаюць праблемы з выдзяленнем зямлі пад будаўніцтва, то будматэрыялаў не набыць, то яшчэ што якое. А тым, хто пакуль не паспеў сям'ёй абзавесціся, і заікацца пра пазыку нельга — не дадуць.

Узнімаліся на сустрэчы і пытанні аб забеспячэнні палівам, набыцці машын, прыватызацыі і абмену жылля, харчовых «пайках», уладкаванні дзяцей у садкі.

Праблемы, праблемы, праблемы... Такое жыццё. Такі час. І ўсё ж прайшоўшыя праз пекла афганскіх падзей былыя воіны-«афганцы» даволі аптымістычна глядзяць ў будучае, верацъ у лепшае.

*Н. Міхайлава*

*«Прыднапроўская ніва». 21 красавіка 1993.*

## Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Магілёўскага раёна, якія загінулі ў Афганістане і пахаваны на радзіме

**КОНТЫЛЕЎ Віктар Міхайлавіч.** Нарадзіўся 2 верасня 1963 г. у в. Машанакі Магілёўскага раёна. Загінуў 7 верасня 1984 г. Пахаваны ў роднай вёсцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**ЛАЎРЭНАЎ Аляксандр Сяргеевіч.** Нарадзіўся 23 верасня 1961 г. у в. Булыжыцы Магілёўскага раёна. Загінуў 26 мая 1982 г. Пахаваны ў роднай вёсцы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**МАІСЕЕНКА Аляксей Сяргеевіч.** Нарадзіўся 10 марта 1963 г. у в. Лежнеўка Магілёўскага раёна. Загінуў 10 жніўня 1984 г. пахаваны ў роднай вёсцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**МАКАРАЎ Генадзь Фёдаравіч.** Нарадзіўся 24 сакавіка 1962 г. у в. Слабодка Магілёўскага раёна. Загінуў 28 лістапада 1981 г. Пахаваны ў роднай вёсцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**МАРЧАНКА Мікалай Міхайлавіч.** Нарадзіўся 22 верасня 1965 г. у в. Бушкава Магілёўскага раёна. Загінуў 12 верасня 1984 г. Пахаваны ў роднай вёсцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).



А. С. Маісеенка



М. М. Марчанка



А. М. Новікаў



С. С. Шапёткін



В. М. Контылеў



А. С. Лаўрэнаў

**НОВІКАЎ Аляксандр Мікалаевіч.** Нарадзіўся 14 кастрычніка 1957 г. у в. Салтанаўка Магілёўскага раёна. Загінуў 25 студзеня 1982 г. Пахаваны ў роднай вёсцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (пасмяротна).

**ШАПЁТКІН Святаслаў Сямёнавіч.** Нарадзіўся 2 верасня 1963 г. у в. Акулінцы Магілёўскага раёна. Загінуў 13 кастрычніка 1983 г. Пахаваны ў роднай вёсцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «За адвагу» (пасмяротна).

## Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы іншых мясцін, якія загінулі ў Афганістане і пахаваны ў Магілёўскім раёне

**БАДЗЕРКА Васіль Алегавіч.** Нарадзіўся 18 ліпеня 1965 г. у Магілёве. Загінуў 30 красавіка 1984 г. Пахаваны ў в. Прысна Магілёўскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**БУЙМІСТРАЎ Рыгор Васілевіч.** Нарадзіўся 14 красавіка 1964 г. у в. Сінілаўка Сурэйскага раёна Прыморскага краю. Загінуў 30 красавіка 1984 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**ГРОМАЎ Аляксандр Іванавіч.** Нарадзіўся 25 красавіка 1962 г. ў Магілёве. Загінуў 12 жніўня 1982 г. Пахаваны ў вёсцы Палыкавічы Магілёўскага раёна. Узнагароджаны Ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**ДАНКОЎ Аляксандр Анатольевіч.** Нарадзіўся 10 студзеня 1963 г. у г. Новашахцінску Растоўскай вобласці. Загінуў 17 чэрвеня 1982 г. Пахаваны ў в. Сялец Магілёўскага раёна. Узнагароджаны медалём «За адвагу» (пасмяротна).

**ЛУСЦЯНКОЎ Сяргей Аляксандравіч.** Нарадзіўся 13 чэрвеня 1966 г. у Магілёве. Загінуў 10 снежня 1986 г. Пахаваны ў вёсцы Дубінка Магілёўскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна).

**ШКУТАЎ Мікалай Іванавіч.** Нарадзіўся 4 красавіка 1965 г. у Магілёве. 4 лістапада 1984 г. памёр ад ран. Пахаваны ў в. Сафіеўка Магілёўскага раёна.



С. А. Лусцянкоў

## Чарнобыль

### Радыяцыя і здароўе

У выніку аварыі чацвёртага энергаблока Чарнобыльскай АЭС адбылося радыёактыўнае забруджванне многіх рэгіёнаў у рознай ступені. Найбольш выразна яно праявілася ў Кіеўскай, Житомірскай, Гомельскай, Магілёўскай і Бранскай абласцях, дзе ўзроўні забруджанасці паставілі перад медыцынскімі і іншымі службамі складаныя праблемы бяспекі насельніцтва.

Для насельніцтва раёнаў, якія падвергліся найбольшаму радыяцыйнаму ўздзеянню, былі ўстаноўлены аварыйныя межы доз агульнага індывідуальнага абпраменьвання: за першы год да 10 бэр (што ў 2,5 раза ніжэй дапушчальнага ўзроўню аварыйнага абпраменьвання персаналу), за другі — 3 бэры і за трэцці 2,5 бэра, што складае 15,5 бэра за тры пасляаварыйныя гады.

Якія ж рэальныя велічыні доз абпраменьвання ў розных груп насельніцтва?

У раёнах жорсткага кантролю, якія налічваюць 786 населеных пунктаў, 272,8 тысячы чалавек: за тры пасляаварыйныя гады ў 62,1 працэнта гэтага насельніцтва (у 431 населеным пункце)

дозы ў межах ад 1 да 5 бэр; у 33,6 працэнта (у 289 населеных пунктах) — 5—10 бэр; у 3,1 працэнта (у 47 населеных пунктах) — 10—15 бэр і 1,2 працэнты насельніцтва (у 19 населеных пунктах) — ад 15 да 17,3 бэра.

Зараз аб уплыве ёду-131. Тут ужо іншыя дапусцімыя межы.

У 1,5 млн. чалавек (з іх 160 тысяч дзяцей да сямі гадоў на момант аварыі), якія пражываюць у зонах найбольшай забруджанасці тэрыторыі ёдам-131, былі вызначаны дозы ўнутранага абпраменьвання шчытападобнай залозы. Адзнакі паказваюць, што ў 87 працэнтаў дарослых гэтыя дозы не перавысілі 30 бэр, у 11 працэнтаў знаходзіліся ў межах 30—100 бэр і ў 2 працэнтаў перавысілі 100 бэр. У дзяцей размеркаванне дозавых нагрузак на шчытападобную залозу аказалася некалькі іншым: доза не перавышала 30 бэр у 48 працэнтаў дзяцей, складала 30—100 бэр у 35 працэнтаў і вышэй 100 бэр — у 17 працэнтаў. Такім чынам, можна гаварыць аб наяўнасці людзей, маючых павышаныя дозы агульнага абпраменьвання і асабліва шчытападобнай залозы, менавіта ім надзяляецца першачарговая ўвага, праводзіцца паглыбленае абследаванне з удзелам эндакрынолагаў, гематолагаў і іншых спецыялістаў...

...Для аб'ектыўнай ацэнкі стана здароўя ўсяго насельніцтва, якое падверглася радыяцыйнаму ўздзеянню ў выніку аварыі, у кароткі тэрмін рознымі медыцынскімі абследаваннямі было ахоплена больш 600 тысяч чалавек (у тым ліку 215,3 тысячы дзяцей): амаль 25 тысяч дарослых і 12,6 тысячы дзяцей прайшлі абследаванні ў стацыянарных клініках і бальніцах. Ужо ў першыя дні для аказання аператыўнай медыцынскай дапамогі насельніцтва раёнаў з павышаным ўзроўнем радыеактыўнай забруджанасці была задзейнічана ўся сетка ўстаноў аховы здароўя Украіны, Беларусі і асобных раёнаў Расійскай Федэрацыі. Было створана каля 2 тысяч урачэбна-сястрынскіх брыгад, прыцягнута значная колькасць навуковых супрацоўнікаў, амаль 7 тысяч урачоў, 12,7 тысячы сярэдніх медыцынскіх работнікаў, больш 1200 студэнтаў старэйшых курсаў медыцынскіх інстытутаў, а таксама амаль 2 тысячы спецыялістаў інжынерна-тэхнічнага профілю для правядзення дазіметрыі...

...У перыяд чарнобыльскай аварыі ў зоне эвакуацыі пражывала больш 2,5 тысячы жанчын з рознымі тэрмінамі цяжарнасці. Ім былі створаны ўсе неабходныя ўмовы, за імі ажыццяўляўся пастаянны медыцынскі кантроль, многія на ўвесь перыяд цяжарнасці былі змешчаны ў санаторыі. Па даных спецыялістаў, цячэнне цяжарнасці ў іх не змянілася у параўнанні з дааварыйным перыядам (тым не менш значная колькасць жанчын адмовілася ад нараджэння дзіцяці). Нарадзілася каля 1600 дзяцей, стан іх здароўя не адрозніваўся ад стану нованароджаных у іншых раёнах. У арганізме нованароджаных радыёнукліды не выяўлены...

**Паказчыкі дзіцячай смяротнасці (на 1000 нарадзіўшыхся)**

| | Гады | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1985 | 1986 | 1987 | 1988 |
| Магілёўская вобласць | 14,2 | 12,8 | 11,9 | 13,0 |

*Доктар медыцынскіх навук, прафесар А. Пятак*
*Доктар медыцынскіх навук, прафесар АМН СССР В. Мацюхін*
*Член-карэспандэнт АМН СССР, прафесар А. Цыб*

*«Правда». 29 мая 1989.*

## Чорнае крыло Чарнобыля

На тэрыторыі раёна са шчыльнасцю забруджанасці ад 1 да 15 кюры на квадратны кіламетр размешчаны 106 населеных пунктаў. Гэта амаль 8 тысяч сем'яў, у якіх пражываюць каля 20 тысяч чалавек.

**У зону забруджанасці радыенуклідамі ад 1 да 5 кюры на квадратны кіламетр уключаны населеныя пункты:**

Вендаражскі сельсавет: Барсукі, Вясёлы, Вендараж, Гуслішча, Гуслянка, Залессе, Капейна, Карчомка, Новы Сінін, Навасёлкі, Панізоў, Паўночны Жабін, Бярозаўка, Бортнікі, Концы, Стары Сінін, Маяк, Паўднёвы Жабін.

Вейнянскі сельсавет: Вейна, Вільчыцы, Заракацце, Навасёлкі.

Дашкаўскі сельсавет: Дашкаўка, Мяжысеткі, Лежнеўка.

Заводскаслабодскі сельсавет: Будоўля, Бакатаўка, Батунь, Дасовічы, Маліннік, Коцны, Гарадок, Дуброўка, Незаўка, Пярсцілы, Вялікае Хонава, Жабін, Загрэззе, Заводская Слабада, Забалацце, Калаша, Каменка, Малое Хонава, Новая Культура, Падброддзе, Падбярэззе, Палявы, Сінінпічына, Старына, Чарнабель.

Княжыцкі сельсавет: Шчэгліца, Княжыцы, Баброва, Бабровічы.

Махаўскі сельсавет: Махава, Косцінка, Ліпец, Старая Мілееўка, Запруддзе.

Нядашаўскі сельсавет: Падгор'е.

Семукацкі сельсавет: Александроў, Гарадзішча, Алень, Семукачы, Малое Запаточча, Арлянка, Астраўшчына, Пушча, Вялікія Бялевічы, Барок, Вялікае Запаточча, Адраджэнне, Коркаць, Катвіна, Мікалаеўка, Новая Ніва, Навабеліца, Альхоўка, Перамога, Паддуб'е, Рог, Рубеж, Сінюга, Смалярня, Укружжа, Хімніца, Ямішча.

Сідаравіцкі сельсавет: Бароўка, Лыкава, пасёлак Мірны, Пална, Сідаравічы, Слабодка, Шылаў Вугал, Новая Мілееўка.

Цішоўскі сельсавет: Дабрасневічы.

**Населеныя пункты, уключаныя ў зону забруджанасці радыенуклідамі ад 5 да 15 кюры на квадратны кіламетр**

Дашкаўскі сельсавет: Боўшава, Досава Сяліба, Стайкі.

Заводскаслабодскі сельсавет: Паплаўшчына, Рэпішча.

Махаўскі сельсавет: Дуброўка, Малая Дуброўка, Малы Асавец, Пусты Асавец, Растаполле.

*Л. Маісеенка*

*«За камуністычную працу». 6 ліпеня 1991.*

## Чарнобыль: наш боль і нашы праблемы

Гутарка карэспандэнта А. І. Церахава з намеснікам старшыні Магілёўскага райвыканкома па ліквідацыі паследстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і надзвычайных сітуацыях Фёдарам Фёдаравічам Панчанкам.

— *Як будзе выраціацца дзяржаўная праграма ў раёне па ліквідацыі паследстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС?*

— Галоўнай задачай выканкома райсавета было і застаецца забеспячэнне жыццядзейнасці насельніцтва забруджанай радыенуклідамі зоны. Гэта будаўніцтва дарог, водаправодаў, падвядзенне прыроднага газу да кацельняў з мэтаю аціплення кватэр без прымянення дроў, задавальненне патрэб у таварах народнага спажывання, паляпшэнне гандлёвага абслугоўвання, забеспячэнне жыхароў прадуктамі харчавання па медыцынскіх нормах.

*— Фёдар Фёдаравіч, не маглі б вы больш падрабязна спыніцца на апошнім: забеспячэнні прадуктамі харчавання нашых людзей?*

— У мінулым годзе ў зону кантролю ад 1 кюры і вышэй на квадратны кіламетр штомесяц на кожнага пражываючага планавалася выдзяляць па 22 кілаграмы цукру, 3 кілаграмы мяса, па 1 кілаграму каўбасы па рознічных цэнах, 1 слоіку малочных кансерваў, 10 ўмоўных слоікаў на чалавека кожны квартал мясных кансерваў; ад 5 кюры і вышэй — па 31 кілаграму цукру, той жа аб'ём мяса, каўбасы і кансерваў, а таксама дадаткова штомесячна па кілаграму грэчневых круп і аўсянкі.

*— Ну так планавалася, планы мы ўмеем складаць, а што ж атрымалася на самой справе?*

— Каўбасных вырабаў рэалізавана на 124,9 працэнта ад гадавой нормы на чалавека, малочных прадуктаў на 103. А вось цукру пастаўлена было толькі на 72,9 працэнта. Вялікія цяжкасці ўзніклі і з забеспячэннем кансерваванай прадукцыяй, мінеральнай вадой. Па нехарчовых таварах прыярытэт зоны забеспечаны быў на 10 працэнтаў. Калі гаварыць аб дзецях, то нельга не адзначыць той факт, што ўсе вучні нашага раёна былі забяспечаны трохразовым харчаваннем. Для іх распрацаваны перспектыўныя меню, якія складаюцца з улікам харчовай каштоўнасці прадуктаў. Школьныя сталовыя забяспечваюцца мясам, сокамі, сухафруктамі, асабістай прадукцыяй грамадскага харчавання. Праўда, ёсць і тут праблемы. У недастатковай колькасці на сталах школьнікаў пакуль што дзіцячыя мясныя пладоваагародніныя кансервы. Што яшчэ трэба адзначыць. З дзяржаўнага бюджэту на харчаванне школьнікаў кампенсавана раёну 1,5 мільёна рублёў, на бясплатнае ўтрыманне дзяцей у дашкольных установах — 239,3 тысячы рублёў, 400 тысяч рублёў затрачана на набыццё абсталявання для піянерскага лагера ў г. Геленджыку. Дарэчы будзе сказаць, што 3485 дзяцей з зоны радыяцыйнага забруджання прайшлі аздараўленне за межамі рэспублікі. Вялася пастаянная работа па арганізацыі комплекснага медыцынскага агляду дзяцей і дарослага насельніцтва, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На працягу года агляд прайшлі 11 915 дарослых і 3993 дзіцяці.

*— Наконт перасяленцаў хацелася б спытаць, колькі і адкуль пераехала да нас сем'яў?*

— У асноўным гэта жыхары Слаўгарадскага, Касцюковіцкага, Чэрыкаўскага і Быхаўскага раёнаў. На пачатак бягучага года ў раёне зарэгістравана 202 сям'і. З іх працаздольных 396.

*— Усе гэтыя сем'і трэба некуды ўсяліць, у будаўніцтве раёна справы ідуць так, што асабліва хваліцца нечым.*

— Жыллё ўводзіцца, канешне, не так, як хацелася б. Летась за кошт сродкаў, выдзеленых раёну на ліквідацыю паследстваў аварыі, планавалася пабудаваць падрадным спосабам 62 кватэры, гаспадарчым спосабам — 78. Фактычна падрадчыкі здалі ўсяго толькі 42. Гэта 30-кватэрны жылы дом у калгасе «Беларусь» і 12-кватэрны дом у калгасе «Зара». Не здадзена дзесяць 2-кватэрных дамоў у калгасе імя Валадарскага. Гаспадарчым спосабам было ўзведзена 35 кватэр.

*— А сёлета што плануецца будаваць?*

— 47 кватэр гаспадарчым спосабам на суму 2 мільёны рублёў (цэны 1991 г.), падрадным — 24, на суму 624 тысячы рублёў. Акрамя таго, плануецца будаўніцтва пад'ездаў і добраўпарадкаванне населеных пунктаў 120 кіламетраў (19,5 мільёна рублёў), пракласці 15 кіламетраў водаправода (300 тысяч рублёў), прабурыць 14 свідравін, 1,63 мільёна рублёў затраціць на газазабеспячэнне раёна. І ўсё гэта за кошт срод-

каў ліквідацыі паследстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

*— Да нас едуць перасяленцы, а ёсць жа і ў раёне вёскі, дзе людзям жыць непажадана. Колькі такіх населеных пунктаў і ці высяляюцца адтуль жыхары?*

— Тэрыторыя, забруджаная радыенуклідамі ад 5 да 15 кюры на квадратны кіламетр, з'яўляецца зонай з правам свабоднага адсялення. Такіх у раёне 10 населеных пунктаў. Пасведчанне на адсяленне атрымалі 124 чалавекі.

*— А землі вакол гэтых вёсак папранейшаму засяваюць?*

— Вытворчасць чыстай сельскагаспадарчай прадукцыі з'яўляецца найбольш важнай задачай па пераадоленню паследстваў катастрофы і ўвесь час трымаецца на кантролі. З севазвароту ў раёне выключана 955 гектараў сельгасугоддзяў, 217 — сенажацяў і 738 гектараў пашы.

*— І яшчэ адна праблема непакоіць. Дзе можна праверыць сельскагаспадарчую прадукцыю ці, скажам, дары лесу на забруджанасць радыенуклідамі?*

— Нядаўна група лабарантаў нашага раёна прайшла абучэнне ў Мінскім інстытуце радыяцыйнай бяспекі. Зараз акрамя райсанэпідстанцыі і ветлабараторыі арганізаваны і дзейнічаюць радыялагічныя пасты ў Ваянянскім, Кадзінскім, Вендаражскім, Заводскаслабодскім, Сідаравіцкім, Нядашаўскім, Семукацкім сельскіх Саветах. Атрыманыя прыборы «Белград-І» і «Белград-ІІ» дапамогуць кантраляваць утрыманне радыенуклідаў у прадуктах харчавання грамадскага і індывідуальнага сектараў. Кожны жыхар гэтых сельсаветаў цяпер можа праверыць сабраныя ў лесе ягады і грыбы, сваю вырашчаную або купленую прадукцыю.

*«Прыдняпроўская ніва». 8 сакавіка 1992.*

## Няма гора страшней

Мільёны шчаслівых бацькоў, бабуль і дзядуль з надзеяй і радасцю глядзяць на сваіх дзяцей і ўнукаў. Аднолькава моцна любяць іх у сем'ях рабочых і міністраў, бізнесменаў і калгаснікаў, інжынераў і ўрачоў...

Ці магчыма выказаць словамі пачуцці маці ці бацькі, якія даведаліся, што ў любімага сына ці дачкі (нярэдка адзінага дзіцяці) — рак...

Кожны павінен усвядоміць, што падобнае можа адбыцца ў любой сям'і, ніхто не застрахаваны ад гэтай страшэннай хваробы.

Яшчэ некалькі гадоў назад гэты дыягназ быў смяротным прыгаворам для дзіцяці. Урачы і бацькі змагаліся толькі за прадаўжэнне жыцця малога, і нярэдка дзіця ў страшэнных муках само прасіла аб смерці, якая станавілася для яго пазбаўленнем ад кашмару. І зараз многія захварэўшыя на рак дзеці паміраюць... Але ў бацькоў з'явілася надзея. Рэспубліканскі дзіцячы анкалагічны цэнтр, дзякуючы намаганням кіраўніка цэнтра Алейнікавай Вольгі Вітальеўны і доктара Валянціна Герайна з універсітэтскай клінікі г. Франкфурт-на-Майне, перайшоў на новыя схемы лячэння дзіцячых лейкозаў, лімфом, некаторых пухлін. Медыкаментамі і абсталяваннем дапамагаюць Германія, Швейцарыя, Аўстрыя. Існуе рэальны (нягледзячы на ўсемагчымыя перашкоды і затрымкі) план будаўніцтва дзіцячага анкалагічнага цэнтра еўрапейскага значэння пад Мінскам. Неабходныя сродкі гатовы выдзеліць Беларусі ўрады Аўстрыі, Германіі (за кошт паставак калійнай солі).

Становішча ў гарадах рэспублікі працягвае заставацца цяжкім — ва

ўрачоў не хапае вопыту, ведаў, медыкаментаў, тэхнікі, сувязей з лепшымі клінікамі Еўропы і многа іншага.

Язва Чарнобыля працягвае пажыраць нашых дзяцей. Для таго каб дапамагчы ім выжыць, а ўрачам — іх лячыць, бацькі хворых ракам дзяцей рэспублікі 29 снежня 1990 года аб'ядналіся ў Беларускае рэспубліканскае таварыства «Дзеці ў бядзе».

Зараз БРТ «Дзеці ў бядзе» аб'ядноўвае больш за 800 сем'яў з хворымі дзецьмі і, мяркуючы па ўсяму, такіх сем'яў у Беларусі ўжо каля 1500.

Але гэта невялікая ў маштабе рэспублікі група трапіўшых у бяду людзей (і дзяцей) засталася практычна без дапамогі з боку органаў сацыяльнага забеспячэння і без элементарнага ўдзелу з боку працоўных калектываў, дзе працуюць бацькі, і нават з боку медыкаў.

Аб лёсе кожнай сям'і з хворым дзіцяці можна напісаць кнігу. Кнігу болю і горычы, раўнадушша і страху, адчаю і надзеі.

Што могуць зрабіць бацькі? Чым, акрамя любві і пяшчоты, могуць яны дапамагчы дзецям?

У першую чаргу неабходна прымусіць здрыгануцца тую сцяну раўнадушша, якую ўзвялі чыноўнікі ўсіх рангаў на жыццёвым шляху сем'яў, у якіх хвараюць дзеці.

Паглядзіце ў вочы тых людзей, якія перажылі рак і ў дзіцяці і ўявіце на імгненне, што ГЭТА адбылося з вамі... Магчыма гэта разбудзіць чалавечыя пачуцці і неабходнасць аказання дапамогі анкалагічна хворым дзецям не будзе здавацца другаснай справай.

Бацькі разумеюць, што цяжка прымусіць дзяржаву, якая распісалася ў поўным бяссіллі ўзяцца, нарэшце, за пытанні, якія патрабуюць неадкладнага рашэння — пытанні выжывання. Урад і дэпутаты, чыноўнікі і рэшткі арміі высвятляюць, «хто на свеце ўсіх патрэбней», але хто будзе паважаць рэспубліку і ўрад, якія расходваюць мільёны і мільярды на ўсё, што хочаць — на вытворчасць гарэлкі ці зброі, але не на харчаванне і аздараўленне захварэўшых на рак дзяцей.

Чаму на лячэнне і харчаванне ў бальніцах выдзяляюцца мізерныя сумы, а 14 мільёнаў рублёў, перададзеных Міністэрству аховы здароўя Дзяржкамчарнобылем у апошнія дні 1991 г., па словах «важных» прадстаўнікоў Міністэрства аховы здароўя, з-за адсутнасці часу не змаглі быць расходаваны на патрэбы хворых дзяцей і зніклі ў віру дэфіцыту дзяржбюджэту?

Чаму ўрачы, якія сапраўды займаюцца лячэннем дзяцей і аддаюць гэтаму лячэнню час і здароўе, не маюць нармальных умоў для жыцця і работы і павінны яшчэ змагацца з закасцянеласцю мыслення нейкіх прафесараў, ветэранаў ад сацыялістычнай медыцыны?

Чаму справа, неабходная тысячам і (не дай Бог) дзесяткам тысяч, робіцца рукамі і розумам адзінак?

Чаму з мільённых аб'ёмаў гуманітарнай дапамогі нашы дзеці атрымліваюць толькі тое, што іх бацькі змаглі атрымаць сваімі намаганнямі (а атрымана вельмі нямнога ў параўнанні з агульным аб'ёмам)?

Чаму людзі, забраўшыя мільёны і мільярды, за рэдкім выключэннем, не гатовы аказаць дапамогу тым, хто ў ёй мае найбольшую патрэбу?

Чаму ў рэспубліцы вялікая колькасць фондаў, фондзікаў і ім падобных структур крычаць аб зробленай рабоце, аб патрачаных мільёнах, аб вялікіх перспектывах, аб тысячах выратаваных дзяцей, але ніхто не гаворыць аб канкрэтных дзецях?

Чаму крычаць кіраўнікі, але не чуваць падзяк ад тых, каму яны дапамаглі?

*Пісьмо бацькоўскага камітэта*
*Беларускага рэспубліканскага таварыства*
*«Дзеці ў бядзе»*

*«Рэспубліка». 5 лістапада 1992.*

## Успрыняць чужы боль як свой

Хлебаробы калгаса імя Валадарскага, дыпламанта ВДНГ СССР, блізка да сэрца ўспрынялі боль пацярпеўшых ад чарнобыльскай трагедыі. Яны вырашылі аказаць ім сваю пасільную дапамогу. Аб гэтым іх пісьмо на імя старшыні аблвыканкома М. Ф. Грынёва. Вось што ў ім, у прыватнасці, гаворыцца: «Улічваючы складанае становішча ў Беларускай ССР з адсяленнем людзей з тэрыторыі, забруджанай радыенуклідамі, сход упаўнаважаных калгаснікаў прыняў рашэнне выдзеліць васемнаццаць кватэр агульнай плошчай 825 квадратных метраў у вёсцы Новае Пашкава сем'ям, якія падлягаюць адсяленню з забруджаных раёнаў Магілёўскай вобласці».

Прынятае рашэнне падмацоўваецца канкрэтнымі справамі. Нядаўна адбылося засяленне васьмікватэрнага жылога дома з усімі камунальнымі зручнасцямі, пабудаванага гаспадарчым спосабам.

Зараз у калгасе ўжо знайшлі прытулак семнаддцаць сем'яў перасяленцаў. Усім ім прадастаўлена работа па спецыяльнасці. Дзеці ходзяць у школу або наведваюць дзіцячы сад. Навасёлы атрымалі агароды, абзаводзяцца жывёлай.

Сёння ў стадыі будаўніцтва гаспадарчым спосабам знаходзіцца яшчэ адзін васьмікватэрны дом. Яго таксама вырашана перадаць чарнобыльцам. Намячаецца здаць яго пад ключ да 1 ліпеня. Часу застаецца нямнога, а спраў на аб'екце хоць адбаўляй. Стрымлівае будаўніцтва недахоп матэрыялаў, перш за ўсё адсутнасць пліт, перакрыццяў ПТ-2712 і ПТ60-12, нітрабітуму, дошак для падлогі, шкла, асфальту для добраўпарадкавання двух васьмікватэрных дамоў і г. д. Добра ведае аб гэтым упраўленне капітальнага будаўніцтва райвыканкома. Праўленне калгаса звярталася туды за дапамогай, але меры пакуль што ніякія не прыняты.

Для перасяленцаў, якія папоўняць сям'ю калгаснікаў, патрэбны рабочыя месцы, а іх дзецям — працягваць вучобу ў школе. Каб працаўладкаваць усіх, хто прыедзе, калгас у перспектыве намячае пабудаваць жывёлагадоўчыя памяшканні на малочнатаварнай і свінафермах. Аднак вырашыць гэта ўсё не так проста з-за адсутнасці будаўнічых матэрыялаў.

Узвядзенне жылля, гаспадарчых пабудоў, як і школы, у абжытай мясцовасці выгадна ва ўсіх адносінах. У вёсцы Новае Пашкава пракладзены добрыя дарогі. Ёсць гандлёвы цэнтр, камунікацыі. Гэта не тое, што на новым месцы. Улічваючы, што калгас узводзіць аб'екты гаспадарчым спосабам, неабходна паскорыць выдзяленне яму будаўнічых матэрыялаў. Ад гэтага сёння залежыць як хутка ў будучым людзі справяць наваселлі, атрымаюць работу. Вось чаму патрэбна, каб ўсе, ад каго гэта залежыць, успрынялі чужы боль, як свой. Так, як гэта зрабілі хлебаробы ардэнаноснага калгаса.

*У. Арцем'еў*

## Боўшаўскі эксперымент

Шмат населеных пунктаў нашага раёна ў рознай ступені забруджаны радыенуклідамі. Таму ўжыванне прадуктаў уласнай вытворчасці падлягае радыяцыйнаму кантролю. Ужо восьмы год аналізуецца на забруджанасць радыенуклідамі прадукцыя ферма ў і палёў, агародніна, лясная і іншая раслінасць, розныя дары прыроды.

Між тым у раёне ёсць і такія месцы, дзе патрэбен узмоцнены радыяцыйны кантроль. Да іх адносіцца ў прыват-

насці в. Боўшава Дашкаўскага сельсавета. Забруджанасць тут у сярэднім больш сямі кюры на квадратны кіламетр. Малако часам паступала з вельмі высокай колькасцю радыенуклідаў. Даводзілася не раз забараняць яго ўжыванне.

Каб высветліць залежнасць якасці малака ад чысціні фуражу, летась быў праведзены ў Боўшаве цікавы эксперымент. Па рэкамендацыі спецыялістаў праўленне мясцовага калгаса «Чырвоная зорка» выдала ўсім пяці дварам, якія трымаюць кароў, чыстае сена, нарыхтаванае на незабруджаным угоддзі брыгады в. Салтанаўка. Было гэта ў лютым. Да таго часу ў пробах малака знаходзіліся радыенукліды ў чатыры разы больш дапушчальнага. Праз два тыдні забруджанасць знізілася ў тры разы. А ў сакавіку якасць малака стала ў межах нормы. Кантрольныя пробы малака мы ўсё лета бралі ад каровы сяльчаніна А. С. Сакалова. А калі яго Буронка запусцілася, сталі браць малако на аналіз з падвор'я С. В. Іванова. Апошняя проба за студзень бягучага года паказала, што і гэта малако можна ўжываць.

Дарэчы, сена, якое было атрымана з асобных боўшаўскіх угоддзяў, не знішчылі. Яго выкарысталі на корм параважна для коней.

Характэрна, што малако з мясцовай грамадскай фермы ў апошнія гады прымаецца малочным камбінатам без абмежавання. Справа ў тым, што калгасных кароў кормяць прывазным чыстым сенам, летам пасвяць статак на папярэдне правераных чыстых угоддзях.

Трэба дадаць, што радыелагічная лабараторыя райсанэпідстанцыі правярае ў Боўшаве і якасць расліннай прадукцыі (бульбы, буракоў, морквы, фруктаў). Аднак за тры гады (час існавання лабараторыі) мы ні разу не выявілі раслінных проб, забруджаных радыяцыяй звыш дапушчальнага нарматыву. Тлумачыцца гэта, лічу, двума фактамі: па-першае, глеба забруджана неглыбока, і, па-другое, караняплоды, відаць, менш за некаторых іншых раслін успрымаюць радыенукліды. А што датычыцца фруктаў, то я не ведаю ніводнага моцна забруджанага населенага пункта, дзе б яблыкі ці грушы нельга было ўжываць. Відаць, карані пладовых дрэў знаходзяцца вельмі глыбока.

*Л. Дзямянкова*

## Знакамітыя людзі

### Вольфсан Фёдар Іосіфавіч

Нарадзіўся 25 лістапада 1907 года ў в. Сідаравічы Магілёўскага раёна. Прайшоў вялікі і слаўны шлях ад сялянскага хлопца да вядомага вучонага. У 1930 г. закончыў Ленінградскі горны інстытут, кіраваў разведкай поліметалічных радовішчаў у Кураміснкіх гарах. Пазней Ф. І. Вольфсан праводзіў пошукавыя работы на Ферганскім храбце, у Мугаджарах, дзе ім былі адкрыты флюарытавыя і свінцова-цынкавыя радовішчы, ацэнены перспектывы рудаsucceeded рудаcнасці гэтых тэрыторый. У 1941—1944 гг. Фёдар Іосіфавіч быў ініцыятарам прамысловага асваення Курусайскага свінцова-цынкавага і Чорухдайронскага вальфрамавага радовішчаў.

Ф. І. Вольфсан унёс вялікі ўклад у разведку і вывучэнне многіх радовішчаў Сярэдняй Азіі, Каўказа, Цэнтральнага Казахстана, Алтаю, Усходняга Забайкалля і іншых раёнаў СССР, а таксама Балгарыі і ГДР.

Ф. І. Вольфсан з'яўляецца адным з аснавальнікаў структурнага накіравання ў даследаванні рудных накірункаў, якое разглядвае станаўленне структур рудных



Ф. І. Вольфсан



Ю. Р. Камісараў

палёў і радовішчаў на фоне гістарычнага развіцця буйных геатэктанічных элементаў зямной кары. Вучонаму належыць больш 230 друкаваных работ. Ён з'яўляецца аўтарам рада падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па геалогіі. Многія яго навуковыя работы перакладзены на нямецкую, балгарскую, чэшскую, румынскую і іншыя мовы.

Ф. І. Вольфсан не толькі буйны вучоны, але і таленавіты педагог. Педагагічную дзейнасць пачаў у 1933 г. у якасці асістэнта кафедры карысных выкапняў Ленінградскага горнага інстытута. З 1935 па 1946 гг. Фёдар Іосіфавіч дацэнт, а з 1947 па 1963 гг. — прафесар Маскоўскага інстытута каляровых металлаў і золата. З 1965 г. чытаў курс лекцый па структурах рудных палёў і радовішчаў у Маскоўскім геолагаразведачным інстытуце, пазней ва ўніверсітэце Дружбы народаў ім. П. Лумумбы і ў іншых вышэйшых навучальных установах краіны. У ліку яго былых вучняў шмат дактароў і кандыдатаў навук.

Навуковая дзейнасць Фёдара Іосіфавіча Вольфсана цесна звязана з інтарэсамі практыкі геолагаразведачных работ і вырашэннем канкрэтных народнагаспадарчых пытанняў.

За распрацоўку геолага-хімічных асноў пошукаў і прагназіравання карысных выкапняў у 1965 г. Фёдар Іосіфавіч Вольфсан быў удастоены звання лаўрэата Ленінскай прэміі. Вучоны з'яўляецца адным з вядучых кансультантаў па каляровых і рэдкіх металах. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі СССР.

*А. Куксевіч*

**Грудзянкоў Андрэй Сцяпанавіч**

Нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Трыбухі (зараз Калінавая) Магілёўскага раёна. Закончыў царкоўнапрыходскую школу ў в. Палыкавічы. Быў дэлегатам з'езда моладзі ў 1920 г. У 1923 г. валасная партячэйка накіравала Грудзянкова на вучобу ў аднагадовую Саўпартшколу ў горадзе Магілёве.

У 1924 г. прызваны ў рады Чырвонай Арміі ў войскі АДПУ, дзе закончыў палітқурсы. У 1926 г. закончыў рабфак пры Кіеўскім медыцынскім інстытуце, а ў 1933 г. ваенна-медыцынскую акадэмію ў горадзе Ленінградзе.

Кандыдат медыцынскіх навук.

Узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Зараз жыве ў горадзе Кіраве.

*Н. Клепчукова*

**Камісараў Юрый Рыгоравіч**

Нарадзіўся 6 мая 1953 г. ў Магілёве. Самадзейны мастак. Работы Юрыя Камісарава прадстаўляліся на ўсесаюзным аглядзе народнай творчасці ў Лівадзійскім палацы ў Крыме, на выстаўцы ў Ленінградзе ў гонар 70-годдзя стварэння СССР.

У 1993 г. Юрый выстаўляў свае творы ў Германіі.

Высока адзначылі яго работы журы аглядаў. Ён узнагароджаны пяццю дыпломамі, ганаровымі граматамі і пасведчаннем удзельніка ВДНГ.

Працуе электразваршчыкам на Магілёўскай бройлернай фабрыцы.

## У творчым пошуку

Маляваць Юра пачаў з ранняга дзяцінства. Старэйшы брат Пётр і сястра Марыя займаліся ў студыі выяўленчага мастацтва пры Доме культуры чыгуначнікаў. Вось і ён часам браў аловак або пэндзаль. А аднойчы, яшчэ дашкольнікам, увязаўся за імі.

— Куды ты, Юра, ты ж яшчэ малы,— запярэчыў з усмешкай брат.— Ідзі дамоў.

— Не, я маляваць хачу,— упарта стаяў на сваім хлапчук.

У студыі спадабалася. Па-першае, тут было шмат дзяцей, зачараваных цудоўным светам мастацтва. Па-другое, быў кіраўнік Аляксандр Аляксандравіч Данілін, які вёў заняткі цікава і займальна, адкрываў рабятам вочы на тую ці іншую з'яву ў прыродзе — натхняў студыйцаў. Праз нейкі час з'явіўся ў Юры першы малюнак. Быў ён па-дзіцячаму наіўны: лес, рэчка, сонейка ў блакітным небе. Хутка ён ужо ўдзельнічаў у выстаўках студыйцаў. А потым... Потым здарылася бяда — ад франтавых раненняў памёр бацька Рыгор Пятровіч. Прыйшлося на нейкі час забыць аб сваім дзіцячым захапленні. Было ў яго жыцці і яшчэ адно захапленне. Убачыў неяк у блакітным небе маленькі крыжык самалёта. Серабрыстая птушка, асляпляльна пералівающыся ў сонечных промнях, то падала імкліва ўніз, то свечкай узмывала ўверх, робячы галавакружныя фігуры вышэйшага пілатажу. Юра (у гэты час ён быў студэнтам Магілёўскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума) «захварэў» небам. Аднойчы падгаварыў сяброў Аліноўскага і Мажэйку «падацца ў лётчыкі».

«Да лётчыкаў трэба яшчэ падрасці»,— расчаравалі іх у прыёмнай камісіі. Бачачы заклапочанасць хлопцаў, інструктар немаладых гадоў, з шапкай сівых валасоў, выйшаў з-за стала. Агледзеўшы юнакоў, задумліва прамовіў: «Вось парашутыстамі калі ласка...» Рамантычнасць характару ўзяла сваё. Рознакаляровы купал над галавой стаў сэнсам яго жыцця: 10 гадоў аддаў Юрый гэтаму мужнаму віду спорту, які падараваў яму блакітны прастор, вялікі і цудоўны свет. Больш за тысячу скачкоў зрабіў майстар спорту СССР Юрый Камісараў. Але прыйшоў час развітацца з небам. Нялёгка гэта было зрабіць. Не вабіла нават любімая работа электразваршчыка на заводзе «Строммашына», а потым на бройлернай фабрыцы. Нечага большага хацелася для душы. На дапамогу прыйшоў жывапіс. Той, каму давялося пабываць на бройлернай фабрыцы, не мог не пазнаёміцца з яго работамі. На працягу пяці гадоў жывапісныя палотны Камісарава ў пастаянна дзеючай экспазіцыі ўпрыгожваюць клуб птушкафабрыкі. Тут, у гэтым клубе тры гады назад адбылася і яго першая ў жыцці персанальная выстаўка. На ёй дэманстравалася каля 30 пейзажаў самадзейнага мастака.

У кнізе водгукаў, якая складалася з 50 лістоў агульнага сшытка, не засталося ніводнага без запісу. Шчыра, ад душы пісалі сябры, калегі па працы, пісалі тыя, каго закранула за сэрца прыгажосць роднага краю, адлюстраванага мастаком у сваіх работах.

Пабывала на той яго першай выстаўцы і вядомая беларуская паэтэса Яўгенія Янішчыц. У знак прызнання таленту мастака падаравала яму кнігу сваіх лірычных вершаў. Але Юрый не быў задаволены поспехам. Нечага зноў не хапала. «Вядома, пейзаж — справа добрая,— гаварыў ён неяк пры сустрэчы,— праз яго можна выказваць настрой, адносіны да людзей, да Радзімы, але ж гэтага недастаткова». Мастак шмат чытае, ездзіць па краіне. Пабываў на выстаўках у Траццякоўскай галерэі, музеі імя А. С. Пушкіна, Эрмітажы. Вызначаюцца ў гэты час і прыхільнасці: мастацтва Шышкіна, Куінджы, Саўрасава, савецкіх мастакоў Лакціёнава, Шылава, Савіцкага... Ю. Камісараў не сядзіць склаўшы рукі, працуе над удасканаленнем свайго стылю. З'явіліся работы новых жанраў, напрыклад нацюрморты. Ды і не толькі яны. Каля дзесяці работ прысвяціў Камісараў тэме Вялікай Айчыннай вайны. Вялікую прыцягальную сілу на выстаўцы мела карціна «Чэрвень 1941 года». На вясковым стале — бохан хлеба, побач — аўтамат, на

сцяне — сямейная фатаграфія, вышэй — насценны каляндар, адкрыты на дні пачатку вайны — 22 чэрвеня. Гэты дзень мастак намаляваў чорнымі фарбамі, падкрэсліваючы тым самым горкую памяць народа аб гэтай даце. Сімвалы карціны простыя і зразумелыя і разам з тым з філасофскім падтэкстам. Сюжэт, кампазіцыя, вытрыманы ў карычневых фарбах каларыт прымушаюць гледача задумацца аб тым, якую цяжкую вайну вынес наш народ на сваіх плячах.

Азоранае сонечным святлом поле спелай нівы, удалечыні — пералесак, да якога прытулілася вёсачка. На пярэднім плане — абеліск з зоркай. Каля падножжа замест кветак два жытнёвыя снапкі, зжатыя, магчыма, руплівай рукой удавы ці маці, сын якой не вярнуўся з палёў вайны. Сцяжынка ад помніка праз жытнёвае поле да вёскі сведчыць аб тым, што ніколі не загояцца раны, нанесеныя вайной, не згасне ў памяці подзвіг сыноў Радзімы. Такі лейтматыў карціны «Поле».

Нельга не сказаць некалькі слоў і аб пейзажах Юрыя Камісарава. Многія з іх гавораць аб тым, што мастаку ўласціва вострая назіральнасць, уменне прыкмячаць змены ў прыродзе. Аб гэтым сведчаць нават назвы работ «Цёплы кастрычнік», «Камяністы бераг». «Цішыня», «Бярозавы шэпат», «Разліў» і іншыя.

Разам з тым мастак не займаецца голым капіраваннем убачанага, ён аддае перавагу пачуццю і роздуму як у кампазіцыі, сюжэце, так і ў спалучэнні колераў. Прыкладам можа служыць невялікая карціна «Калі маўчаць гарматы». Перад намі луг, які патанае ў квецені. Ён радуе вока сваёй стракатасцю, і толькі потым позірк наш заўважае на гарызонце цёмна-сіняе воблака з фіялетавым адценнем. Яно і надае трывожнае гучанне ўсёй карціне. Мастак як бы пытае: а ці ўсё мы зрабілі і робім у наш мірны час, каб маўчалі гарматы, каб квітнеў луг усімі колерамі вясёлкі, каб не дратавалі яго гусеніцамі танкі?

Застаецца верным сваёй тэматыцы Юрый і сёння. За лепшую жывапісную работу «Вясна ў партызанскай зоне» на абласной выстаўцы, прысвечанай 40-годдзю Вялікай Перамогі, ён быў узнагароджаны Ганаровай граматай і сувенірам. Пяць работ самадзейнага мастака былі прадстаўлены на ўсесаюзны агляд народнай творчасці, які праходзіў у горадзе-героі Мінску.

*А. Цярахаў*

*«За камуністычную працу».*
*13 красавіка 1985.*

**Каргапольцаў Леў Мікалаевіч**



Л. М. Каргапольцаў

Нарадзіўся ў 1927 г. у г. Маскве. Вядомы вучоны-селекцыянер. Больш за сорак гадоў працуе ў Беларусі. Загадчык аддзела селекцыі і насенняводства Магілёўскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі.

## Прызванне вучонага

Колькі б спраў ні чакала гэтага чалавека за пісьмовым сталом, летам яго рабочы дзень пачынаецца на доследных дзялянках. У гадавальніку селекцыйнага адбору іх каля дзвюх тысяч. Тут выпрацоўваюцца новыя гатункі льну.

Валакністы, шаўкавісты, як дзявочая каса... Гэта адна з самых старажытных сельскагаспадарчых культур. У песнях і танцах народ любоўна адлюстраваў усе працэсы, звязаныя з яго выпрацоўкай. Здаўна жыла ў казках мара аб такім небы-

валым ільну, каб са жменькі яго валакна ўмелая майстрыца змагла саткаць тонкае палатно на мужчынскую кашулю...

Тут, на доследнай станцыі, сэнс казкі пераведзен вучонымі на строгую мову лічбавых паказчыкаў: гатункі, якія пасеяны на доследных дзялянках, праходзяць выпрабаванне на ўраджайнасць па валакну і насенню, устойлівасць да хвароб і неспрыяючага надвор'я, на якасць і трываласць валакна. У Рэспубліцы ўжо ёсць гатунак ільну, які па многіх паказчыках з'яўляецца як бы эталонам для селекцыянераў. Гэта распаўсюджаны «Светач». Аднак, нягледзячы на тое што лён гэтага гатунку з'яўляецца неперааўзыйдзеным па якасці валакна і ўраджайнасці насення, селекцыянеры працягваюць свае пошукі.

Пошукі селекцыянераў — гэта карпатлівая работа, якая працягваецца гадамі, і, на жаль, далёка не заўсёды заканчваецца поспехам. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі і насенневодства абласной доследнай станцыі Леў Мікалаевіч Каргапольцаў прысвяціў гэтай нялёгкай справе ўсё сваё жыццё. Селекцыяй ільну ён пачаў займацца адразу пасля заканчэння Новасібірскага сельскагаспадарчага інстытута.

Лён — гэта не выпадковае захапленне вучонага.

Неспакойная селекцыйная работа не заўсёды песціла вучонага лёгкімі поспехамі. Некалькі годоў запар вялікія надзеі падаваў гатунак «Беларускі», які, здавалася, па многіх паказчыках пераўзыходзіў «Светач» і з цягам часу мог замяніць яго на беларускіх землях. Аднак «Светач» аказаўся непераўзыдзеным па якасці валакна. Новы гатунак не стаў той знаходкай, аб якой марылі селекцыянеры.

Зараз на дзялянках праходзяць выпрабаванні, усебакова вывучаюцца яшчэ шэсць гатункаў ільну.

— Які з іх вы лічыце самым перспектыўным? — пытаем мы ў Л. М. Каргапольцава.

— Цікавасць прадстаўляе гатунак «ЗЗ-Л1-2-3-3», — адказвае ён.

— Гэты лён, выведзены метадам складанай гібрыдызацыі. Ён паспяхова спалучае ў сабе высокую ўраджайнасць насення з устойлівасцю да палягання і павышанай валакністасцю. Па ўраджайнасці насення гэты гатунак на 30 працэнтаў перавышае стандарт.

У гэтым годзе аддзел, якім загадвае Л. М. Каргапольцаў, пачаў займацца селекцыяй яшчэ адной культуры — грэчкі. Разам са Львом Мікалаевічам выпрабаваннем новых гатункаў грэчкі будзе займацца яго жонка — селекцыянер Ніна Сямёнаўна Каргапольцава.

*Н. Канстанцінава*

*«За камуністычную працу».*
*16 жніўня 1966.*

**Курапаценка Фёдар Кузьміч**

Нарадзіўся 2 сакавіка 1903 г. ў вёсцы Малыя Бялевічы Магілёўскага раёна. Вядомы вучоны ў галіне землеўпарадкавання. Прафесар (1961). Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР (1973).

Працаваў у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

Памёр у 1993 г.

## Светлы лёс

На ўсё жыццё звязаў свой лёс з навукай Фёдар Кузьміч Курапаценка. Нарадзіўся ён у Малых Бялевічах. Спачатку, як і яго браты, працаваў у сельскай гаспадарцы. Потым закончыў Магілёўскі педагагічны тэхнікум. Як выдатніка вучобы, яго накіроўваюць у сельскагаспадарчую акадэмію. Пасля заканчэння яе Фёдар Кузьміч працуе па землеўпарадкаванні ў розных раёнах Гомельскай вобласці.

Вялікая Айчынная вайна застала Фёдара Кузьміча ў Горках, дзе ён працаваў у акадэміі. Адтуль ён ідзе на фронт. Заканчвае вайну маёрам.

Пасля разгрому фашыстаў Фёдар Кузьміч зноў вяртаецца ў акадэмію, займаецца выкладчыцкай работай. Сем гадоў працуе дэканам розных факультэтаў, потым — прарэктарам па вучэбнай рабоце. Зараз з'яўляецца загадчыкам кафедры землеўпарадкавальнага праектавання.

Педагагічную дзейнасць Фёдар Кузьміч паспяхова спалучае з навуковай работай. За час работы ў акадэміі Ф. К. Курапаценка апублікаваў звыш 40 работ. Найбольш вядомыя з іх — «Комплексная арганізацыя тэрыторый калгасаў і саўгасаў», «Землеўпарадкавальнае картаграфаванне».

Перад самай вайной Ф. К. Курапаценку без абароны дысертацыі было прысвоена званне дацэнта. І толькі праз тры гады пасля дэмабілізацыі ён абараняе дысертацыю і становіцца кандыдатам тэхнічных навук. Сем гадоў назад яму прысвоена навуковае званне прафесара. Заслугі Фёдара Кузьміча высока ацэнены: два ордэны «Знак Пашаны», ордэн «Чырвонай Зоркі» і чатыры медалі. Тры разы прафесар узнагароджваўся Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

*І. Стражэвіч*

*«За камуністычную працу». 18 мая 1968 г.*

**Масленікаў Павел Васілевіч**

Нарадзіўся ў 1914 г. у в. Нізкая Вуліца Магілёўскага раёна. Тэатральны мастак, пейзажыст, мастацтвазнавец, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1954). Кандыдат мастацтвазнаўства (1960). Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1938) і інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе (1935). Удзельнік Айчыннай вайны. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1951 г. З 1938 г. у Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР (у 1946—1960 гг. — мастак-пастаноўшчык). З 1960 г. у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1960—1964 гг. — рэдактар, дацэнт — з 1961, у 1967—1979 гг. — загадчык кафедры.

Дэкарацыям Масленікава ўласцівы вобразнасць, маляўнічасць, арганічнае спалучэнне музыкальных і зрокавых вобразаў, у беларускіх спектаклях — яркасць нацыянальных характарыстак. Аформіў спектаклі: у тэатры оперы і балета «Трыльбі» А. Юрасоўскага (1940), «Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева і «Прададзеная нявеста» Б. Сметаны (1949), «Салавей» М. Крошнера і «Дэман» А. Рубінштэйна (1950), «Паяцы» Р. Леанкавалы і «Запарожац за Дунаем» С. Гулак-Арцямоўскага (1951), «Іаланта» П. Чайкоўскага і «Страшны двор» С. Манюшкі (1952), «Маладая гвардыя» Ю. Мейтуса (1954), «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага (1957), «Яснае світанне» А. Туранкова (1958), «Сцежкаю грома» Кара-Караева (1960), «Джаконда» А. Панкелі (1962) і інш.

У Беларускім тэатры імя Я. Купалы: «Цудоўны скарб» П. Малярэўскага (1949), «Шчасце паэта» В. Віткі (1952), «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча (1954).

Выразнасцю каларыту, паэтычнаю прыўзнятасцю і лірызмам адзначаны пейзажы «Жнівень» (1953), «Сосны» (1955), «Перад цвіценнем» (1957), «Золата бяроз» (1959), «Мінскае мора» (1960), «Пачатак вясны» (1961), «Беларускі пейзаж» (1963), «Над возерам» (1969), «Азёрны край» (1970), «На Вячы» і «Партызанскае Палессе» (1971).

Непаўторная прыгажосць зямлі паказана ў серыях работ: «Прыбалтыйскі цыкл», «Па зарубежных краінах» і «Зямля беларуская» (1973), «На раўнінах Палесся» (1980) і інш.

Шматгранна адлюстравана духоўнае жыццё чалавека ў тэматычных палотнах: «Апошні» (1967), «Дарогай смерці», «Жніво» і «Год 1929» (1977), «Вярнуўся» (1979), «У Дзень Перамогі» (1982), «Вызваленне Магілёва» (1983).

Аўтар раздзела «Мастацтва Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» для «Гісторыі мастацтва народаў СССР» (т. 8, М., 1977).

*Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1986. Т. 3. С. 462*

**Салодкі Уладзімір Іванавіч**

Беларускі спявак, заслужаны артыст Беларусі (1990). Нарадзіўся 1 верасня

1956 г. на станцыі Галынец Магілёўскага раёна. Неўзабаве сям'я пераехала ў Краснаполле. У 1973 г. закончыў Краснапольскую сярэднюю школу і паступіў у Магілёўскае культурна-асветнае вучылішча. Потым была служба ў арміі і зноў вучоба ў вучылішчы. Пасля заканчэння вучылішча ў 1979 г. быў накіраваны ў Дзяржаўны народны хор імя Г. Цітовіча.

Далей вучыўся ў Мінскім інстытуце культуры. З 1984 г. працуе ў ансамблі народнай музыкі «Свята» (кіраўнік В. Купрыяненка).

Разам з С. А. Салодкай спяваюць вясельныя, жніўныя, лірычныя, жартоўныя песні, балады.

*А. Ярохін*

**Мікола Янчанка**

Мікола (Мікалай Ігнатавіч) Янчанка нарадзіўся 22 чэрвеня 1931 г. у вёсцы Забалацце Магілеўскага раёна ў сям'і каваля.

Скончыў гістарычны факультэт Магілеўскага педагагічнага інстытута (1956). Настаўнічаў у Брожскай сярэдняй школе на Бабруйшчыне (1956—1961), у Дварэцкай сярэдняй школе Глускага раёна (1965—1966). Працаваў у раённых газетах у Рагачове, Жлобіне, Калінкавічах, Карме. З 1972 г. — адказны сакратар рагачоўскай раённай газеты «Камунар». Член СП СССР з 1979 г.

Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Разнотравье» (1971), «Кросны» (1980), «Жыцейка-жыта» (1990), кніжак апавяданняў для дзяцей «З людзьмі добра» (1973) і «Зраблю сонейка» (1978), «Жменька жалудоў» (1989), кніжкі-маляванкі «Лета ў серванце» (1981) і зборніка вершаў «Залаты вулей» (1986). На беларускую мову пераклаў кнігу вершаў Д. Кавалёва «Вечназяленая Ветка» (1990).

*Беларускія пісьменнікі (1917—1990). Даведнік. Мн., 1994.*

## Культурнае жыццё

### Іграй гармонік

Яркая, выкананая ў нацыянальным стылі аб'ява-плакат заклікала зазірнуць у Дом культуры на агляд-конкурс пад назвай «Іграй гармонік». Жыхары не без задавальнення адклікнуліся на запрашэнне.

Зала была перапоўнена, калі на сцэну запрасілі гарманістаў. Асабліва пастараліся ў пошуках майстроў музыкі і песні ў калгасе «Зара».

Зачаравалі сваімі выступленнямі этнаграфічныя калектывы Прыдняпроўскай птушкафабрыкі і саўгаса «Махава». Яны прадставілі на суд журы цэлыя праграмы, у якіх удала спалучаліся песні, прыпеўкі і ігра гарманістаў.

Цікавымі былі таксама выступленні фальклорнага ансамбля «Гусарыкі» з в. Харошкі, Ніны Пятрэнкі з аграфірмы «Днепр» і Ніны Івановай з саўгаса-камбіната «Усход», ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Ф. І. Кошалева з калгаса імя Леніна.

Асабліва вызначыліся сем'і Моцкіных і Гулевічэй — абедзьве з в. Міхалёва. У першай сям'і ігралі разам з бацькам тры дачкі, у другой — муж і жонка.

Выдатную падрыхтоўку, зладжанасць у ігры паказаў на аглядзе ансамбль гарманістаў калгаса імя Заслонава. У гэтым калектыве людзі самых розных узростаў і прафесій.

Шмат было на аглядзе-конкурсе салістаў — гэта Людміла Верамьева з в. Сялец, Марыя Алексяйчук з в. Амхавая, Галіна Гаўрыловіч з Рэчак.

Агляд-конкурс праводзіўся ў раёне ў 1991 годзе ўпершыню. Хочацца верыць, што ён быў не апошнім...

*Н. Міхайлава*

## Сталі артыстамі... настаўнікі

Прайшоў агляд-конкурс калектываў школьнай мастацкай самадзейнасці.

Добрых слоў заслугоўвае творчая работа многіх самадзейных настаўніцкіх калектываў. Так, напрыклад, педагогі Буйніцкай сярэдняй школы выбралі для свайго выступлення форму агітбрыгады, спецыяльна падрыхтавалі дэкарацыю на сцэне. Вершы, песні расказвалі пра Вялікую Айчынную вайну, франтавы і партызанскі быт, узаемаадносіны паміж людзьмі ў той цяжкі час. Усе падзеі вайны паказваліся ў зацемненай зале, а калі дайшла справа да пераможнай вясны 1945-га, у залу ўварваўся яркі сонечны прамень — прамень надзеі і жыцця.

Цікава быў прадстаўлены калектыў настаўнікаў Мяжысецкай сярэдняй школы. Гледачы мелі магчымасць паслухаць песні харавой групы, мужчынскага вакальна-інструментальнага ансамбля, у якім іграе і сам дырэктар А. Г. Зотаў.

Запамінальным атрымалася выступленне педагогаў Кадзінскай школы. Рэжысура іх праграмы, музычнае суправаджэнне, выканаўчае майстэрства, набор жанраў — усё было на вышыні.

Добрыя праграмы падрыхтавалі таксама калектывы Хонаўскай, Раманавіцкай, Семукацкай, Сухарэўскай, Нядашаўскай сярэдніх школ.

Пераможцамі агляду-конкурсу 1991 года былі прызнаны калектывы Буйніцкай, Раманавіцкай, Мяжысецкай і Семукацкай сярэдніх школ.

*Н. Міхайлава*

## Ой вы, Калядачкі,— бліны ды аладачкі

Каляды праваслаўныя вернікі святкуюць з 7 па 18 студзеня. Калісьці яны былі ў ліку самых чаканых і вясёлых свят. Калядамі заканчваўся шасцітыднёвы піліпаўскі пост, а разам з ім надыходзіў канец шматлікім абмежаванням, але потым традыцыя святкавання Каляд адышла. Толькі ўсё вяртаецца «на кругі свая». Светлае Ражаство Хрыстова, а разам з ім і Калядкі — добры абрад хаджэння з Віфліемскай зоркай (якая, па паданні, указвала вешчунам, што нарадзіўся Богачалавек, Збавіцель — выратавальнік свету), песнапеннем, вясёлымі жартамі, прымаўкамі, гуканнем, пажаданнямі зноў вяртаецца ў наша жыццё. І людзі праяўляюць вялікі інтарэс да адраджаючыхся традыцый, да іх маральных вытокаў. У гэтым давялося пераканацца, пабыўшы на Калядах у Раманавічах.

Мароз адпусціў, і вечар перад Калядамі выдаўся проста на дзіва. Сціх вецер. Пушысты сняжок падаў лёгка і загадкава. Здавалася, сама прырода садзейнічала таму, каб людзі змаглі без усялякіх перашкод сустрэць свята на вуліцы, ля ёлкі на пасёлку.

Мала хто пажадаў у такі цудоўны загадкава-таямнічы вечар сядзець дома. Расказвалі, што нават на Навагодняе свята ёлка не сабрала тут столькі людзей, колькі прыйшло іх на Калядкі.

Пад агульны смех, агульнае чаканне ўрачыстага адкрыцця Каляд неяк і не заўважылі, як на небе ўспыхнулі зоркі. Магчыма, дзесьці сярод іх свяціла і тая Віфліемская, якая амаль дзве тысячы гадоў назад, згодна паданню, апавясціла аб нараджэнні Ісуса Хрыста — Збавіцеля і Выратавальніка чалавецтва.

І вось, нарэшце, паказаліся ля ёлкі пераапранутыя ў народныя касцюмы ўдзельнікі «Вячорак» Прыдняпроўскай птушкафабрыкі. Наперадзе ішоў

Андрэй Панасюк. У яго руках вярцелбатлейка — эмблема славутай зоркі, упрыгожаная вянком, стужкамі.

Умеюць жа весяліць народ арганізатары свята! Яны апрануты ў маскарадныя касцюмы Мядзведзя, Чорта, Казы, Цыгана. Вядучая свята Марыя Казачонак звяртаецца да ўсіх са словамі:

А ў нас сягоння сход Каляд.
Сабірайцеся, дзеўкі, у рад.
Будзем зараз песні спяваць
Ды Калядачку ўслаўляць.

І дружны хор голасна падхапіў:

Ой рана, рана куры запелі.
Калядкі, святы вечар.
А раней за ўсіх Манечка ўстала.
Калядкі, святы вечар.
Рана Манечка ўстала,
У хаце прыбрала...

Пяюць удзельніцы «Вячорак» пра тое, як рыхтуюцца людцы да Калядак. А тут і сама Каляда, упрыгожаная і багатая маладзіца. Да яе звяртаецца вядучая:

Каляда-калядзіца, добрая
маладзіца, што ты нам прынесла?

А Каляда і адказвае:

Старым бабкам па кіёчку,
Маладым дзеўкам па сыночку,
Малым дзеткам па яечку.

Усім раздаюць гасцінцы Каляды. І зноў вядучая звяртаецца да прысутных: «Заспяваем-ка, дзяўчаты, каб Каляда павесялела».

Загучалі песні, прыпеўкі. Спявалі ўдзельніцы «Вячорак», малыя дзеткі ў касцюмах цыганятак.

Непрыкметна пачаўся новы абрад вячорак, які распачалі пераапранутыя ў маскарадныя касцюмы Мядзведзь, Чорт, Каза.

На першым плане сялянская хата. Тут і разадзетая гаспадыня. Да яе ў госці прыйшоў Мядзведзь. І, здаецца, не з вельмі добрымі намерамі. Раве басам:

Давай, Баба, каўбасу,
Не то хату разнясу.

А тут і Чорт стукае — просіць бліночка. Каза сваё патрабуе. Частуе іх гаспадынька і прыгаворвае: «Вось вам і каўбаска, і бліночак, і мёд... Не сярдуйце толькі, а добрым памінайце».

У гэтым абрадзе свая гісторыя. Калядаванне сапраўды прадугледжвае звычай хадзіць па хатах і, частуючыся там, праслаўляць гаспадароў, загаворваць, каб у іх радзіла ў полі, каб жывёла прыносіла добры прыплод, каб у сям'і панавалі лад і згода. Таму весела і задорна гучаць словы вядучай:

Дзевачкі, паненачкі, засцілайце
сталы, падавайце калядныя бліны.

У імгненне вока прыбіраецца святочны стол пад ёлкай. На бялюткі абрус, згодна з традыцыяй, кладзецца сена. На яго ўдзельніцы «Вячорак» з жартамі-прыгаворкамі ставяць казан з куццёй. Тут жа ладныя горкі бліноў, блюды з абаранкамі, каўбасой, рознай дамашняй выпечкай. Усіх запрашаюць да стала. Падсілкаваўшыся гарачымі бліночкамі ды аладкамі, весялей зайграў гарманіст, заспявалі жанчынкі... Праз пэўны час песні пачалі чаргавацца з гульнямі, пасыпаліся жарты, прыказкі, пажаданні...

*Г. Сідарэнка*

*«Прыдняпроўская ніва», 20 студзеня 1993.*

## А традыцыя жыве

Шмат святочных дзён адзначаем мы. Сваё дастойнае месца сярод іх займае прыгожае свята Пятра і Паўла. Гэта свята адлюстравана ў многіх трапных прыкметах. Напрыклад, такіх: «Як прыйдзе Пятро, так і будзе цяпло», «Пётр і Павел спякоты прыбавіў», «Пётр і Павел дзень убавіў», «Калі на Пятроў дзень дождж, то сенакос будзе мокры», «Пасля Пятрова дня зязюля перастае кукаваць».

З святкаваннем Пятра і Паўла ў народзе здаўна звязвалі не толькі шматлікія клопаты на сенакосах, але і падрыхтоўку да пасеву азімых: «Да Пятрова дня ўбраць, да Ільіна — забаранаваць, да Спаса — пасеяць».

У некаторых вёсках у Пятроў дзень жанчыны і дзяўчаты хадзілі на пасевы льну, бралі з сабой тварог. На льняным полі ставілі шост і гаварылі: «Дай Божа, каб лён быў доўгім, як шост, белым, як тварог!»

Пятровым днём у веруючых заканчваўся Пятроўскі пост. Таму арганізоўвалі святочныя трапезы. Прычым сямейныя стараліся ў гэты дзень быць дома, сталы пасля вячэры не ўбіралі, бо лічылася, што ў дом збіраюцца ўсе памёршыя. Моладзь жа, як правіла, яшчэ з вечара выходзіла ў поле і тут праводзіла ўсю ноч, чакаючы ўзыходу сонца. Па народнаму звычаю, сонца ў дзень Пятра і Паўла іграе асаблівым колерам, пераліваючыся рознымі колерамі вясёлкі. За вёскай маладыя палілі вогнішчы і гулялі ўсю ноч. Дзяўчаты варажылі. Збіралі па дванаццаць кветак з дванаццаці палёў і пад галаву клаўшы прасілі: «Дванаццаць кветак з розных палёў, дванаццаць малайцоў! Хто суджаны жаніх мне пакажыся і на мяне паглядзі!»

Да світанку гучалі над вёскамі песні. А яшчэ дзе-нідзе праходзілі рытуалы каля вады, бо дзень Пятра і Паўла лічыцца яшчэ і святам рыбакоў. З вадой, ачышчэннем ад грахоў і хвароб звязваюць ужо многія дзесяткі гадоў свята Пятра і Паўла жыхары вёсак Вільчыцы, Лыкава і некаторых іншых.

У невялікім лесе, што раздзяляе Вільчыцы і Лыкава, ёсць крынічка. Хтосьці зрабіў зруб для яе, тут жа стаіць крыж з іконамі. Вяскоўцы называюць гэту крынічку «капліцай». Месца каля яе найпрыгажэйшае. «Богу ўгоднае» — так гавораць старыя. Дрэвы тут як быццам расступаюцца. Усю невялікую паляну ў пагодны дзень шчодра залівае сонечнае святло. Тут кожны год на свята Пятра і Паўла шмат людзей. Пасля паклону вадзе, абмывання ў ёй распальваюць кастры, арганізоўваюць сталы. Уходзячы, кожны набірае ў сваю пасудзіну вады, якая лічыцца чудадзейснай.

*Н. Міхайлава*

## Жывы фальклор

Пра «Дуб-ветрадуб», «Птушку-перапялушку» і іншыя малюнкі свету ведаем мы з загадак дзядоў і прадзедаў.

Хто з нас у дзяцінстве не любіў, седзячы на печы альбо каля грубкі, прытуліцца да дзядулі, бабулі ці пяшчотнай бацькоўскай рукі, слухаць самыя неверагодныя гісторыі пра родныя мясціны, сваю Бацькаўшчыну, яе людзей?

Песні, казкі, паданні, быліны, загадкі... Як многа духоўных скарбаў захавалася ў народнай памяці. На іх выхоўвалася і пазнавала навакольны свет не адно пакаленне людзей. Сярод твораў беларускага фальклору загад-

ка — ці не самы любімы ў народзе жанр. Яна вылучаецца асаблівай дасціпнасцю, мудрасцю, трапнасцю, у ёй могуць быць зашыфраваны шматлікія і самыя нечаканыя вобразы, прадметы, дзеянні і г. д.

Па крупінках, з пакалення ў пакаленне у загадках адфільтроўвалася і назапашвалася народнае светаасэнсаванне і светапазнанне, здабытыя веды і вопыт. Разам з тым у іх праяўляўся ўзровень нацыянальнага мыслення і розуму. Вось, напрыклад, загадка, якая прыйшла да нас з мінулага стагоддзя. Здагадайцеся, што гэта: «Стаіць дуб-ветрадуб, на тым дубе-ветрадубе сядзіць птушка-перапялушка — не цар, не царыца, не прыгожая дзявіца». «Птушка-перапялушка» — гэта сонца. Як трапна перададзены ў гэтых радках вобраз нашай Галактыкі.

Большасць беларускіх загадак паэтызавана, дзякуючы чаму іх лёгка запомніць. Адметная з'ява загадак — асабліва разлічаных на дарослую аўдыторыю — двухсэнсоўнасць, не зусім быццам бы і прыстойны, на першы погляд, тэкст загадкі мае зусім «нявінную» адгадку. Многія загадкі пабудаваны так, каб з самага пачатку паставіць адгадчыка на падманны шлях пошуку ісціны. Гэта зроблена наўмысна — каб навучыць кемлівасці, лагічнаму мысленню. Людзей, якія ўмелі загадваць загадкі, заўсёды паважалі, яны былі жаданыя госці на вячорках, розных гулянях, сярод сяброў і знаёмых.

Актыўна бытуе загадка ў народным асяроддзі і ў нашыя дні. У час фальклорных вандровак у розныя рэгіёны роднага краю збіральнікі запісваюць мноства загадак. Прыемна, што ў нашым народзе і цяпер ёсць таленавітыя знаўцы загадак. У прапануемай да ўвагі чытачоў падборцы матэрыялаў, якія аўтар сабраў на працягу мінулага года, уключаны загадкі, запісаныя ад Міцьковай Ганны Максімаўны з в. Махава Магілёўскага раёна.

Ляціць арліца
З-за трыдзевятай зямліцы,
Крылы распластала,
Сонейка заслала.
*(Навальнічная хмара)*

На зямлі ляжыць,
А нікому не падняць,
Не ссячы і не забраць.
*(Цень)*

Сама гола, а рубаха ўсярэдзіне.
*(Свечка)*

Сухі таран па хаце скача.
*(Венік)*

Пад прыпечкам рубяжы,
хто ведае — не кажы.
*(Зубы)*

Вісіць сіта, не рукамі сшыта.
*(Павуцінне)*

Я нічога не раблю,
Але свет увесь кармлю.
*(Лыжка)*

Вісіць — вісіць, баўтаецца.
Ды кожны за яго хватаецца.
*(Вядро, якім выцягваюць ваду з калодзежа)*

*У. Сысоў*

*«Звязда». 12 лютага 1993.*

**Даведка ад 27 красавіка 1981 г. аб газеце Магілёўскага раёна «За камуністычную працу»[1]**

*Друкуецца са скарачэннямі*

Газета «Камунар Магілёўшчыны» ў 1931 г. зарэгістравана ў «Летапісу друку БССР» як газета Магілёўскага райкома КП(б)Б, райвыканкома, райпрофсавета. Першы нумар выйшаў 30 чэрвеня 1931 г. Са студзеня 1938 г. газета мяняе назву на «Бальшавік Магілёўшчыны», а з 16 красавіка таго ж года на «Сацыялістычную працу».

[1] З 2 лістапада 1991 г. газета мае назву «Прыдняпроўская ніва».

У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны, у ліпені 1943 г., пры падпольным райкоме партыі была створана тыпаграфія і пачала выходзіць раённая газета «Партызанская праўда». Слова газеты ўзнімала патрыётаў на свяшчэнную барацьбу за гонар, свабоду і незалежнасць любімай Радзімы, за вызваленне роднай зямлі ад гітлераўскіх акупантаў.

З 1944 г. газета зноў пачала звацца «Сацыялістычная праца». Шырокае адлюстраванне на яе старонках знайшоў бяспрыкладны подзвіг народа ў пасляваенныя гады, калі за кароткі тэрмін былі ўзняты з руін і попелу разбураныя гарады і вёскі.

З мая 1962 г. раённая газета атрымала новую назву «За камуністычную працу».

Пафас стварэння стаў вядучай тэмай газеты.

Рэдакцыйны калектыў знаходзіць дзейсныя формы паглыбленага асвятлення пытанняў павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і якасці работы, укаранення ў народную гаспадарку дасягненняў навукі і перадавой практыкі.

Калектыў рэдакцыі з года ў год дабіваецца вялікіх творчых поспехаў. У 1980 г. газеце прысвоена другая прэмія ва Усесаюзным конкурсе імя М. І. Ульянавай за лепшую пастаноўку масавай работы, першая прэмія ў Рэспубліканскім конкурсе за лепшае асвятленне пытанняў сацыялістычнага спаборніцтва. Двойчы, у 1979 і 1980 гг., газеце прысвойвалі першыя прэміі абласнога конкурсу за лепшае асвятленне пытанняў аховы прыроды. Асобныя публікацыі неаднаразова адзначаліся журы абласнога аддзялення Саюза журналістаў СССР, як лепшыя матэрыялы года.

В. П. Марцынкевіч, сакратар Магілёўскага райкома КП Беларусі

## Да 50-годдзя Вялікай Перамогі

### Удзячнасць франтавікоў

Вялікае ўсенароднае гора парадніла нас с Беларуссю. Было тое ў жорсткія дні Вялікай Айчыннай вайны. Так сталася, што нам давялося вызваляць прыгожую Беларусь ад фашысцкіх цемрашалаў. З тае пары і лічыць яе кожны з нас сваёй другой радзімай.

Баявы шлях нашай 385-ай стралковай дывізіі праходзіў па Магілёўшчыне: праз Крычаў, Чавусы, Днепр, Дашкаўку, Магілёў... Вёска Дашкаўка займае ў гэтым пераліку асаблівае месца для нас. Тут пры дапамозе беларускіх партызан дывізія 26—28 чэрвеня 1944 г. з боем фарсіравала Дняпро і разам з іншымі часцямі 49-ай арміі вызваліла Магілёўскі раён ад фашысцкіх захопнікаў. Тыя дні назаўсёды засталіся ў нашай памяці і памяці людзей, што з прыходам арміі-вызваліцельніцы дачакаліся вольнага жыцця. Жыхары вёскі заўсёды сардэчна сустракаюць нас. У чэрвені 1989 г. ў Дашкаўцы быў устаноўлены помнік нашай 385-ай стралковай дывізіі. Ідуць сюды людзі, каб пакланіцца тым, хто загінуў, успомніць добрым словам тых вызваліцеляў, хто застаўся жывым.

У гэтай цудоўнай вёсцы глыбока шануюць памяць аб земляках, якія загінулі. Аб тым сведчаць помнікі, абеліскі. У Дашкаўцы іх некалькі. Адзін — перад будынкам сельскага Савета. Мноства прозвішчаў выгравіравана тут. Толькі Хадановічаў налічылі ў тым журботным спісе больш 20.

На вясковых могілках у добрым стане ўтрымліваюцца магілы нашых былых аднапалчан, і ў прыватнасці магіла Героя Савецкага Саюза аўтаматчыка-ўзбека Шады Шаімава, які адным з першых фарсіраваў Дняпро.

Добрыя адносіны з жыхарамі Дашкаўкі ў нас склаліся даўно. Мы перапісваемся, часта бываем у гасцях у вяскоўцаў.

Многа карысных спраў робіць у школе для ўмацавання сувязі вучняў з ветэранамі настаўніца Святлана Анатольеўна Каржэвіч. Яе актыўнымі намаганнямі створаны і дзейнічае музей баявой славы нашай 385-ай стралковай дывізіі.

Патрэбнай і карыснай справай для дашкаўскай дзятвы стала правядзенне паходу па месцах баёў 385-ай стралковай дывізіі ў чэрвені 1990 г.

Рыхтаваць і праводзіць паход дапамагалі актыўныя ўдзельнікі баёў на гэтых рубяжах на рацэ Сож (г. Крычаў), рацэ Проня (г. Чавусы), рацэ Дняпро (в. Дашкаўка). Актыўны ўдзел у паходзе прынялі былыя франтавікі: палкоўнік В. І. Чарноў з Калінінграда, сувязіст П. В. Тамашэнка і кулямётчык М. Я. Кавалёў з Масквы, аўтаматчык В. А. Корабаў з Адыге-Хабль, артылерыст Н. М. Голышаў з Чавусаў. Яны расказалі школьнікам аб цяжкім баявым шляху дывізіі, які яна прайшла ад Масквы да Эльбы, аб баях, што вынеслі на Смаленшчыне, у Беларусі, Польшчы і Германіі. Дарэчы, баявыя дзеянні дывізіі неаднойчы адзначаліся камандаваннем. За вызваленне, напрыклад, Крычава дывізіі была прысвоена ганаровая назва «Крычаўская». І сёння адна з вуліц у гэтым горадзе носіць імя нашага камдзіва М. Ф. Супрунова. За паспяховае фарсіраванне Дняпра дывізія была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга, а дзевяць яе найбольш адважных воінаў сталі Героямі Савецкага Саюза. Іх прозвішчы — на помніку ў Дашкаўцы.

У ліпені 1944 г. наша дывізія вылучылася ў баях каля в. Самахвалавічы, што пад Мінскам. Тады намі было ўзята ў палон 6 тысяч нямецкіх салдатаў і афіцэраў разам са штабам і камандзірам корпуса. У гэтым была вялікая заслуга ўсіх салдатаў і афіцэраў і асабліва — нашага камдзіва М. Ф. Супрунова.

У баях за вызваленне польскіх гарадоў Ломжа, Астраленка, Асавец, Гданьск і прарыў нямецкай абароны ў раёне Мазурскіх азёраў многія палкі нашай дывізіі атрымалі ганаровыя назвы «Ломжынскіх» і «Мазурскіх», а асобны батальён сувязі стаў «Кёнігсбергскім». За свае выключныя баявыя заслугі дывізія была ўдастоена асобнага гонару, калі на заключным этапе Вялікай Айчыннай вайны ў саставе войск 2-га Беларускага фронту прымала ўдзел у берлінскай бітве. Тут дывізія была ўзнагароджана ордэнам Суворава, а тысячы салдат і афіцэраў — узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Дванаццаць разоў Вярхоўны галоўнакамандуючы аб'яўляў падзякі асабоваму саставу дывізіі. Дванаццаць разоў Масква салютавала баявым поспехам нашай 385-ай Крычаўскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава другой ступені стралковай дывізіі.

Мы, былыя франтавікі, бязмежна рады, што з гонарам пранеслі Чырвоны сцяг сваёй дывізіі да вялікай Перамогі.

*А. М. Міхайлаў, былы начальнік палітаддзела 385-ай Крычаўскай ордэнаў Чырвонага Сцяга і Суворава 2-ой ступені стралковай дывізіі*

*«За камуністычную працу». 8 мая 1991.*

## Подзвігу салдата жыць у вяках



А. М. Міхайлаў



В. П. Нізаўцова

Сустрэча з чалавекам, які прайшоў вайну, заўсёды хвалюе. У мінулую суботу жыхары вёскі Буйнічы сустракалі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны з усяго раёна. Пад гукі духавога аркестра з плакатамі, кветкамі яны прайшлі калонай ад СПТВ № 1 да Буйніцкага поля, каб адзначыць свята вызвалення роднай Беларусі, аддаць даніну павагі воінам 388-га стралковага палка 172-ой стралковай дывізіі і апалчэнцам Магілёва, якія ў суровыя дні 1941 г. сталі на гэтым рубяжы да апошняй кроплі крыві. За адзін толькі дзень 12 ліпеня, як сведчыць надпіс на помніку байцам дывізіі і апалчэнцам, яны знішчылі 39 фашысцкіх танкаў.

Гірлянды Славы, кветкі, якія прынеслі былыя воіны, ветэраны працы, маладыя працаўнікі сельскагаспадарчай вытворчасці, ускладаюцца да мармуровага абеліска. Гучаць жалобны матыў рэквіема і голас дыктара гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Памяць загінуўшых ушаноўваецца гарматным салютам і мінутай маўчання.

«Мы ніколі не забудзем сваіх вызваліцеляў — воінаў Савецкай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, мільёны патрыётаў, барацьбітоў і сціплых сельскіх працаўнікоў, мужчын і жанчын, састарэлых і дзяцей, антыфашыстаў усіх нацыянальнасцей, якія ў суровыя гады вайны праявілі сілу духа, веліч і маральную прыгажосць»,— сказаў на мітынгу старшыня райвыканкома В. І. Раўнейка.

Словы ўдзячнасці выказаў Васіль Іванавіч былым воінам і партызанам, палітрукам і камандзірам, камісарам і жыхарам раёна І. Я. Балуеву, М. Ф. Школьнікаву, І. М. Сяргейчыкаву, С. П. Папову , У. С. Спірыдонаву, П. Ф. Казіміраву, Ф. П. Ліпкіну, кавалеру ордэна салдацкай Славы трох ступеняў С. Т. Сотнікаву, В. М. Адзінцову, І. К. Карасёву і многім іншым.

З успамінамі аб мінулых баях выступіў госць святкавання, масквіч, былы намеснік камандзіра 385-ай Крычаўскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава 2-ой ступені стралковай дывізіі, якая ўдзельнічала ў вызваленні Магілёўскай вобласці і непасрэдна вёскі, А. М. Міхайлаў.

Аб жанчынах — франтавічках, падпольшчыцах, працаўніцах тылу — пранікнёна гаварыла былая партызанка В. П. Нізаўцова.

Ваенныя і пасляваенныя перыяды аднаўлення разбураных фашыстамі гаспадарак раёна ўспомнілі ў сваіх выступленнях ваенны камісар вобласці К. К. Грошаў і ветэран вайны і працы В. А. Паўлаў.

Са святам — 50-годдзем з дня вызвалення Магілёўскага раёна і горада Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — былых воінаў-вызваленцаў горача павіншавала вучаніца Буйніцкай сярэдняй школы Алеся Касцерава.

Шчырыя словы, віншаванні ветэранаў, слёзы ў многіх на вачах — гэта неад'емная частка суботняга святкавання.

...Свята працягвалася. Яго тэатралізаваная частка прайшла на стадыёне СПТВ № 1 імя К. П. Арлоўскага. Пе-

рад ветэранамі вайны выступалі фальклорны ансамбль «Вячоркі» Прыдняпроўскай птушкафабрыкі, фальклорны калектыў калгаса «Беларусь», калектыў Буйніцкай школы мастацтваў, фальклорны гурт «Спадчына» раённага аддзела культуры. А выступленне фальклорна-вакальнага ансамбля Брылёўскага СДК адзначылася прэм'ерай — была выканана новая песня на словы Янкі Купалы «Гэй, у лесе, пры даліне». Музыку да яе напісаў мастацкі кіраўнік гурта Мікола Яцкоў.

Сваё майстэрства на стадыёне дэманстравалі спартсмены, гімнасты і выхаванцы раённай конна-спартыўнай школы.

Удзельнікі святкавання маглі пакаштаваць гарачыя шашлыкі з півам і іншыя прысмакі. Працавала і палявая кухня.

*А. Церахаў*

*«Прыдняпроўская ніва». 29 чэрвеня 1994.*

## ...І на памяць кісет падарылі

Салдаты Вялікай Айчыннай вайны добра памятаюць тыя пасылкі, што адпраўлялі ім на фронт з тылу іх родныя, блізкія і нават зусім незнаёмыя людзі. Акрамя няхітрых прыпасаў абаронцы Радзімы знаходзілі ў пасылках рукавіцы, звязаныя вечарамі незнаёмымі дзяўчатамі і салдаткамі, шкарпэткі, розныя цёплыя рэчы. І амаль заўсёды ў пасылках былі старанна зробленыя вышытыя салдацкія кісеты.

На памяць аб тых ваенных вогненных гадах такія кісеты-сувеніры былі ўручаны і ўдзельнікам вызвалення Беларусі, што былі запрошаны на святкаванне 50-годдзя гэтай даты ў сталіцу нашай рэспублікі — горад Мінск.

Сярод тых, каму выпаў гонар удзельнічаць у гэтых урачыстасцях з нашага раёна, быў кавалер ордэна Славы трох ступеняў Сяргей Трыфанавіч Сотнікаў.

Акрамя імяннога гадзінніка ён прывёз дамоў кісет з надпісам «Абаронцу Радзімы 1944—1994» і вышытым васільком — сімвалам-кветкай роднай Беларусі.

Гэты кісет, па словах салдата, напомніў самым непасрэдным чынам аб вайне і цесных сувязях фронту з тылам.

І яшчэ адзін прыкметны напамінак аб мінулай вайне быў уручаны ўдзельнікам свята — гільза ад буйнакалібернага кулямёта з запіскай. У ёй значылася: «Мы, Вашыя нашчадкі, схіляем перад Вамі свае галовы ў знак падзякі за жыццё і мір, якія Вы падарылі нашаму пакаленню».

*С. Трацэўскі*

*«Прыдняпроўская ніва». 3 жніўня 1994.*

## Святкаванне 50-годдзя Перамогі ў раёне

8 мая 1995 года. Не па-веснавому хмурыцца неба, сее дробныя кроплі дажджу. Яны празрыстымі слязінкамі дрыжаць на метале ордэнаў і медалёў. Дзень не столькі смутку, колькі ўрачыстасці і радасці: «Гэта радасць са слязамі на вачах».

З раніцы ў в. Буйнічы сабраліся ўдзельнікі вайны з усяго раёна. На грудзях у большасці з іх баявыя і пра-

цоўныя ўзнагароды, у руках палымнеюць кветкі. Тут жа кіраўнікі гаспадарак, родныя і блізкія ветэранаў.

І вось пад урачыстую музыку духавога аркестра калона накіроўваецца на Буйніцкае поле да мемарыяльнага комплексу абаронцам горада Магілёва. Ён прызначаны сімвалізаваць патрыятызм, мужнасць, гераізм воінаў Чырвонай Арміі і апалчэнцаў, якія абаранялі Магілёў у ліпені 1941 г. Гэты комплекс — даніна павагі і памяці нашчадкаў тым, хто аддаў сваё жыццё за будучыя пакаленні.

11 гадзін. Старшыня Магілёўскага аблвыканкома А. М. Кулічкоў звярнуўся з прамовай да ўдзельнікаў жалобна-ўрачыстага мітынгу. Аляксандр Мікалаевіч адзначыў, што гэты кавалачак Магілёўшчыны памятны з першых дзён вайны. Было шмат гераічных падзей і сярод іх 23-дзённая абарона Магілёва. Тут быў зроблены першы крок да Перамогі.

Выконваючы волю магіляўчан, узводзіцца гэты комплекс. Ён навекі захавае ў чалавечай памяці подзвіг народа.

Старшыня савета ветэранаў 172-ой стралковай дывізіі В. А. Смірноў у сваёй прамове сказаў, што без падтрымкі магіляўчан войскі не змаглі б пратрымацца і некалькі дзён. Магілёў — першы горад у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, жыхары якога сталі ў рады яго абаронцаў.

Член пошукавай групы, студэнт будаўнічага каледжа А. Карастылёў расказаў аб высакароднай патрыятычнай рабоце энтузіястаў. Імі ўстаноўлены імёны 150 безыменных байцоў і камандзіраў, перазахаваны астанкі 39 загінуўшых, знойдзеных у выніку пошуку. На месцы апошняга бою генерала-маёра А. Ц. Раманава знойдзены астанкі васьмі загінуўшых. Устаноўлена адно імя. Астанкі будуць перазахаваны на Буйніцкім полі.

Наступіла хвіліна адкрыцця капліцы. Яе адкрываюць віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь У. Г. Гаркун, А. М. Кулічкоў, старшыня гарвыканкома Д. А. Савіцкі і В. А. Смірноў. Мітрапаліт Максім асвяціў яе.

Прысутныя праслухалі Пасланне Патрыярха Маскоўскага і Усяе Русі Алексія II, Свяшчэннага сінода ў сувязі з 50-годдзем Вялікай Перамогі.

Сотні вянкоў, тысячы кветак кладуцца да сцен капліцы, якая будзе цэнтрам завершанага мемарыяльнага комплексу.

Вядомы савецкі пісьменнік К. Сіманаў, ваенны карэспандэнт, у ліпені 1941-га наведаў абаронцаў горада, у прыватнасці байцоў 388-га стралковага палка, якім камандаваў С. Ф. Куцепаў. Карэспандэнцыі пісьменніка былі надрукаваны ў цэнтральнай прэсе. К. Сіманаў застаўся навекі з абаронцамі горада — тут, на Буйніцкім полі, развеяны яго прах. Так пажадаў Канстанцін Міхайлавіч. Аб гэтым сведчыць сімвалічны знак — камень на ўскрайку поля. Эпізоды баёў за Магілёў увайшлі ў яго знакамітую трылогію «Жывыя і мёртвыя».

*В. Міронаў*

*«Прыдняпроўская ніва». 13 мая 1995.*

# Шануем гісторыю

## Магілёўскі абласны краязнаўчы музей

Адкрыты ў 1919 г. як губернскі музей, у Вялікую Айчынную вайну разрабаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі. Аднавіў работу ў 1950 г. Экспануюцца матэрыялы пра абарону горада і вобласці ў пачатковы перыяд вайны (дырэктывы ЦК ВКП(б) і КП(б)Б, асабістыя рэчы і зброя савецкіх воінаў і байцоў народнага апалчэння, у тым ліку камандзіра 388-га стралковага палка палкоўніка С. Ф. Куцепава, дзённік начальніка Магілёўскага гарнізона І. П. Ваяводзіна, артыкул карэспандэнта газеты «Известия» пісьменніка К. Сіманава «Гарачы дзень» і фотапанарама фотакарэспандэнта ТАСС П. А. Трошкіна «Бой на Буйніцкім полі», фотаздымкі камандзіра апалчэнцаў батальёна міліцыі К. Р. Уладзімірава, камісара К. Ф. Чарнова і інш.

Матэрыялы аб узнікненні і разгортванні падполля і партызанскага руху ў вобласці: лістоўкі, падпольная абласная газета «За Радзіму», нумары падпольных раённых газет, партызанскія баявыя лісткі, рукапісныя часопісы баявых дзеянняў партызан Клічаўскага і Кіраўскага раёнаў, друкарскія станкі, шрыфты і каса для шрыфту, саматробная зброя зброевых майстэрняў партызанскай брыгады «Чэкіст» і партызанскага палка 122-га «За Радзіму», асабістыя рэчы, узнагароды, зброя, дакументы ўпаўнаважанага ЦК КП(б)Б І. М. Кардовіча, сакратара Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б Я. І. Зайца, камандзіра брыгады «Чэкіст» Г. А. Кірпіча, Героя Савецкага Саюза М. П. Каралёва, А. М. Касаева і інш., дакументы Клічаўскіх падпольных РК КП(б)Б і райвыканкома аб аднаўленні Савецкай улады ў Клічаўскай партызанскай зоне, матэрыялы аб Магілёўскай падпольнай арганізацыі «Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі», асабістыя рэчы патрыётак-падпольшчыц Хаўранковых, перадсмяротнае пісьмо М. Ф. Хаўранковай, перададзенае з Аршанскай турмы. Прадстаўлены матэрыялы аб вызваленні горада і вобласці ад акупантаў у ходзе Магілёўскай аперацыі 1944 г. і Беларускай аперацыі 1944 г., фатаграфіі сустрэчы мясцовымі жыхарамі воіна-вызваліцеля, франтавыя і партызанскія лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, карты, схемы ўзаемадзеяння вайсковых падраздзяленняў і партызанскіх фарміраванняў, асабістыя рэчы і дакументы камандзіра 369-ай стралковай дывізіі Героя Савецкага Саюза І. С. Лазарэнкі, які загінуў пры вызваленні Магілёўшчыны...

*Т. Палажэнцава*

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 321.*

## Настаўнік, краязнавец

**Гузаў Васіль Дзмітрыевіч.** Нарадзіўся 22 чэрвеня 1924 г. ў в. Падбелле Магілёўскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскі педінстытут. Працаваў у школе настаўнікам беларускай і нямецкай моў. У в. Галоўчын Бялыніцкага раёна ў 1989 г. стварыў краязнаўчы музей.

Памёр 26 чэрвеня 1995 г.



В. Д. Гузаў

## Работа працягваецца

На старонках нашай газеты чытачы ўжо прыкмецілі артыкулы за подпісам В. Д. Гузава. Асноўны іх змест — гісторыя роднага краю.

На свае сродкі Васіль Дзмітрыевіч выдаў з паўдзесятка брашур. Самі за сябе гавораць іх назвы. «Веянне далёкіх год», «Загартоўка ў агні», «Весці краязнаўчага музея»... Усе яны напісаны па архіўных дакументах. Яшчэ ў дзіцячыя гады, калі ён быў пастушком, палюбіліся яму народныя песні. Прыцягвалі яны хлапчука і ў выкананні жанчын-жней, і за святочным сталом. У 1939 г. (ён тады вучыўся у шостым класе Шчэжарскай сямігодкі) Васіль пачаў запісваць у сшытак песні сваёй маці Ксеніі Нікіфараўны. Потым да іх дабавіліся запісы 1949—1954 гг. жыхароў вёскі Галоўчын М. Р. Маслёнак і С. Р. Мельнікавай, а таксама А. Р. Ермачэнкі з вёскі Забалацце Бялыніцкага раёна.

У гэтым годзе паявілася яшчэ адна кніжка пад назвай «Песні сівой даўніны»... Ёсць тут песні пра Палтаўскую бітву пад «знамёнамі Пятра» і пра казака маладога, які загуляў за «Кубанню-ракой», успамінаецца «Херсонгорад» і «Ціхі Дунай». Не абыйдзены ўвагай і беларускія напевы «На Купала, на Івана», «Зялёная дубровачка».

Паглядзіце, якое хваляванне за прыроду, што губяць людзі, гучыць у словах апошняй песні:

Зялёная дубровачка,
Што рана зашумела?
Чаго так рана
Лісце тваё пажаўцела?
А як жа мне не шумець,
Лістам маім не жаўцець.
А ехалі злыя людзі,
Пада мною начавалі.
Пада мною начавалі
Пад карэннем агонь клалі.
Карэньчыкі мае папалілі
І лісцікі мае пасушылі.

Шырокая тэматыка і геаграфія песеннай народнай творчасці гавораць аб кроўных брацкіх сувязях трох народаў: рускага, украінскага і беларускага.

Удзячную справу зрабіў наш зямляк. Калі б не такія людзі, як Васіль Дзмітрыевіч, напэўна многія сабраныя ім песні зніклі б для нас бясследна.

*С. Трацэўскі*

*«За камуністычную працу». 12 чэрвеня 1991.*

## Вяртанне да храма

За ваколіцай в. Палыкавічы ў маляўнічым месцы на беразе сівога Дняпра калісьці стаяла царква. Яе ведалі і шанавалі не толькі мясцовыя жыхары, але і з далёкіх вёсак. Славу гэту несла ёй крынічка, вада якой лічылася цудатворнай. Мноства дарог схадзілася да брамы царквы. Сёння да месца, дзе яна стаяла, можна прайсці толькі вузенькай сцежкай. Іду па ёй і выходжу на бетонную пляцоўку, на якой размешчаны рэшткі будынка, пад імі — вада. Гэта і ёсць праслаўленая крыніца. Каля яе пліта са словамі «Крыніца. Апісана акадэмікам В. Севяргіным, як незвычайная для Беларусі крыніца вуглякіслых вод. 1802 г.». Тут жа на пляцоўцы стаіць лаўка, на якой ціха-мірна вядуць гаворку дзве пажылыя жанчыны. Аказаліся яны магіляўчанкамі. Заўважыўшы маю зацікаўленасць крыніцай, ахвотна ўступілі ў гутарку.

— Мы кожны раз прыязджаем сюды, каб напіцца гэтай вады, набраць

яе ў посуд. Яна вельмі карысная для здароўя...

Усяго хвілін дзесяць пабыў я каля крынічкі. Падыходзілі і пад'язджалі людзі, — хтосьці на веласіпедзе, хтосьці на машыне. Потым даведаўся, што крынічка знаходзіцца пад наглядам Магілёўскага лясгаса. Але трэба прызнаць, сапраўднага нагляду за ёй не відзецца. Між тым я падумаў: умелі ж святыя людзі выбіраць месца для пабудовы царквы. Той, хто пабудзе аднойчы ў такім маляўнічым кутку, захоча наведаць яго не раз, і не два, пабыць адзін на адзін са сваімі думкамі.

Ішлі гады, мяняліся погляды на царкву, рэлігійныя абрады. Рэлігію сталі лічыць дурманам для народа. Наступіў час, калі пачалі знішчаць і закрываць цэрквы і ўсё тое, што было звязана з імі.

У тыя жорсткія гады наша палыкавіцкая царква цудам захавалася. Не кранула святое месца і Вялікая Айчынная вайна. А вось у 1953 г. чыясьці злачынная рука ноччу падпаліла яе, і царква згарэла. Уцалеў толькі папоўскі дом. У ім у хуткім часе адкрылі пансіянат для састарэлых і інвалідаў. Нядаўна тут вырашылі пабудаваць новую царкву. Адбылося асвячэнне пляцоўкі, дзе яна будзе пабудавана. З раніцы, па просьбе веруючых, калгасная тэхніка даставіла іх на гэту цырымонію. Многія — і веруючыя і няверуючыя — ішлі і ехалі сюды сем'ямі, як на вялікае свята. На тварах людзей, асабліва пажылых, урачыстасць.

У знак удзячнасці за спагадлівасць архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Высокапраасвяшчэнны Максім падарыў старшыні калгаса В. М. Міргарадскаму чатыры кнігі Бібліі і знак «Тысячагоддзе хрышчэння на Русі».

*В. Дзівакоў*

## З гісторыі населеных пунктаў

Асобныя ўпамінанні аб населеных пунктах, што ўваходзяць зараз у склад Магілёўскага раёна, датаваны звычайна 14—15 стагоддзямі. Гэта даравальныя граматы рускіх і польскіх князёў, апісанні ваенных паходаў, перапісы прыгонных душ.

Узнікненнем і развіццём населеных пунктаў Беларусі, асабліва вёсак, у эпоху феадалізму займаецца гістарычная геаграфія. Вырашэнне складаных традыцыйных пытанняў аб часе заснавання або першага ўпамінання паселішчаў у розных пісьмовых крыніцах, што захаваліся да нашага часу,— адна з актуальнейшых задач гістарычнага краязнаўства. Яна можа быць вырашана толькі шляхам выяўлення і аналізу найбольш ранніх крыніц, што ўтрымліваюць адпаведныя гісторыка-геаграфічныя дадзеныя.

**БРАКАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1667 г. маёнтак у Аршанскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1777 г. сяло, якое ў 1785 г. было ў складзе маёнтка Галоўчына Магілёўскага павета, налічвала 28 двароў, 224 жыхары, з'яўлялася памешчыцкай уласнасцю, меліся вадзяны млын і драўляная царква. У 1847 г. цэнтр маёнтка, 39 двароў, 351 жыхар. У 1872 г. заснаваны суканавальны завод, які вырабляў 4500 аршынаў сукна ў год, пачала дзейнічаць гарбарня. У 1880 г. 75 двароў, 478 жыхароў. У 1894 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, якая на пачатку 1917 г. ператворана ў земскую. У 1897 г. сяло (105 двароў, 748 жыхароў, царкоўнапрыходская школа, пастаялы

двор, царква), сядзіба (2 двары, 34 жыхары, млын), другая сядзіба (1 двор, 4 жыхары) у Княжыцкай воласці Магілёўскага павета. У 1909 г. 97 двароў, 769 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1920 г. у былым маёнтку створана сельскагаспадарчая арцель «Азараўка». У 1926 г. 156 двароў, 833 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас «Гігант» (32 гаспадаркі). У пачатку 1930-ых гадоў 4-гадовая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 236 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На франтах загінулі 239 вяскоўцаў. У памяць аб іх каля будынка школы ў 1959 г. пастаўлена стэла.

**БРЫЛІ** — вёска, цэнтр сельсавета (з 09.12.1975 г.) і калгаса. Вядома па рукапісных крыніцах з 16 стагоддзя. У 1560 г. сяло, 45 «дымоў», у Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1580 г. аддадзена ў пажыццёвае валоданне памешчыку. У 1592 г. цэнтр войтаўства Магілёўскай воласці Аршанскага павета. У 1635 г. 48 двароў, меўся млын. У 1785 г. 49 двароў, 327 жыхароў, у складзе маёнтка Любуж Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка, які меў у 1866 г. у вв. Брылі і Любуж 2765 дзесяцін зямлі, 2 млыны, пастаялы двор. Частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. Па перапісу 1897 г. сяло (35 двароў, 201 жыхар, школа граматы, піцейны дом) і фальварак (1 двор, 11 жыхароў) у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. У 1909 г. 43 двары, 258 жыхароў, дзейнічала школа (народнае вучылішча).

У 1926 г. вёска (23 двары, 153 жыхары) і хутары (72 двары, 436 жыхароў). У 1929 г. арганізаваны калгас «Змагар». На пачатку 1930-ых гадоў 4-гадовая школа пераўтворана ў 7-гадовую (273 вучні). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі загінулі больш за 30 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле каля будынка школы. У памяць аб земляках, што загінулі ў гады вайны, у 1976 г. пастаўлена стэла.

**БУЙНІЧЫ** — вёска. На паўднёвай ускраіне размешчана стаянка эпохі мезаліту (8—5 тысячагоддзі да н. э.), а ва ўрочышчы Благадаць гарадзішча ранняга жалезнага веку. Гэтыя помнікі археалогіі сведчаць аб засяленні тутэйшых мясцін у далёкай старажытнасці. Вёска вядома з XV стагоддзя ў Вялікім княстве Літоўскім як цэнтр буйнога ўладання, што належала князям Фёдару і Льву Талочкавічам-Буйніцкім.

У другой палове 16 стагоддзя полацкі шляхціц Баркулаба Іванавіч Корсак заснаваў на буйніцкіх землях цэнтр уладання Баркалабава, у які ўвайшлі і Буйнічы. У час антыфеадальнага сялянска-казацкага паўстання ў 1595 г. на Буйніцкім полі адбыўся бой паміж казацка-сялянскім атрадам С. Налівайкі і войскамі Вялікага княства Літоўскага. У снежні 1595 г. атрад Налівайкі авалодаў Магілёвам. Феадалы Вялікага княства Літоўскага сабралі 18-тысячнае войска на чале з рэчыцкім старостам М. Буйвідам, 2 тысячы паўстанцаў, узброеных 20 гарматамі і ружжамі, прынялі бой і на працягу дня адбівалі атакі ворага, З-за недахопу сіл казакі адступілі да Быхава.

У 17—18 стагоддзях Буйнічы прыватнаўласніцкае мястэчка ў Аршанскім павеце, якое належала Саламярэцкім, Сцяцкевічам, князю А. Г. Палубінскаму, Сапегам. У 1633 г. заснаваны Буйніцкі Святадухаўскі манастыр. У 1630-ыя гады ў мястэчку працавала друкарня С. Собаля, дзе быў надрукаваны «Псалтыр» (1635 г.). У час

Паўночнай вайны 1700—1721 гг. каля Буйніч размяшчаўся лагер шведскіх войск на чале з Карлам XII (1708 г.), манастыр быў абрабаваны захопнікамі. Побач з мястэчкам існаваў фальварак, які здаваўся ў арэнду. Пасля далучэння да Расіі частка мястэчка была перададзена Кацярынай II беларускаму намесніку генерал-аншэфу П. Б. Пасеку. У 1878 г. фальварак набыў памешчык М. Марачэўскі. У 1880 г. у мястэчку 256 жыхароў, 2 царквы, жаночае вучылішча пры манастыры, яўрэйская малітоўная школа. Была наладжана палатняная і суконная вытворчасць, адкрыты пункт па вывядзенні чыстапародных рысістых коней, частка вяскоўцаў займалася кавальскім, сталярным, кравецкім і шавецкім промысламі. Апошняй уладальніцай маёнтка на пачатку 20 стагоддзя была Г. К. Радкевіч. У 1909 г. у мястэчку 427 жыхароў, 81 двор, царква, царкоўнапрыходская школа і яўрэйская малітоўная школа, казённая вінная крама, у маёнтку 6 жыхароў, 2 двары; у манастыры — 100 манашак. У 1901—1913 гг. у мястэчку дзейнічала цагельня з паравым рухавіком у 40 к. с. (1908 г.), дзе працавала 100 рабочых. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У лютым 1931 г. арганізаваны калгас «13 год Чырвонай Арміі». У 1933 г. вёска атрымала электрычнае святло. У 1940 г. 765 жыхароў, 141 двор.

У Вялікую Айчынную вайну вёска стала месцам жорсткіх баёў савецкіх воінаў 172-ой стралковай дывізіі і магілёўскіх апалчэнцаў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў час абароны Магілёва 1941 г. Найбольш цяжкія баі разгарнуліся на Буйніцкім полі, дзе праходзіў пярэдні край абароны 388-га стралковага палка пад камандаваннем палкоўніка С. Ф. Куцепава. 12 ліпеня бой працягваўся 14 гадзін. Савецкая артылерыя, апярэдзіўшы атаку праціўніка, нанесла ворагу значныя страты. Савецкія байцы мужна ўступалі ў бой з танкамі, закідвалі іх бутэлькамі з гаручай сумессю. За дзень было падбіта 39 варожых танкаў. Бітва на Буйніцкім полі адлюстравана ў рамане К. Сіманава «Жывыя і мёртвыя» і дзённіку «Розныя дні вайны». 13—14 ліпеня Сіманаў у якасці карэспандэнта газеты «Известия» знаходзіўся на Буйніцкім полі. Паводле завяшчання Сіманава, яго прах развеяны над Буйніцкім полем. У красавіку 1944 г. гітлераўцы спалілі 118 двароў, загубілі 96 жыхароў. Вёска вызвалена 27 чэрвеня 1944 г. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінула каля 100 вяскоўцаў. Пасля вайны вёска адбудавалася. У 1962 г. у гонар мужных байцоў устаноўлены абеліск.

**ВЕЙНА** — вёска, вядомая па рукапісных крыніцах з 16 стагоддзя. У 1560 г. сяло, 112 «дымоў», у Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. Побач было сяло Старая Вейна, якое таксама з'яўлялася дзяржаўнай уласнасцю. У 1604 г. цэнтр войтаўства Магілёўскага староства, 68 двароў, меліся царква, карчма, млын. У 1785 г. вёска у складзе маёнтка Вільчыцы. У 1806 г. пачаў дзейнічаць вінакурны завод (12 рабочых). Непадалёку ў 1834 г. быў фальварак (10 жыхароў), а ў 1850 г. у ім было 13 жыхароў, дзейнічалі ветраны млын, бровар, шынок. Мясцовы памешчык меў тут у 1873 г. 7453 дзесяціны зямлі, вінакурны завод, 4 вадзяныя млыны, 2 пастаялыя двары. У 1884 г. на вінакурным заводзе была пастаўлена паравая машына, у 1895 г. на ім працавала 14, а ў 1911 г. 11 рабочых. У 1890 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1922 г. на базе маёнтка, на былых памешчыцкіх землях, створаны саўгас «Вейна», які спачатку меў 267 га, а ў 1930 г. 792 га. У Вялікую Айчынную вайну ў час аба-

ронччых баёў у ліпені 1941 г. вёска некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі. Гітлераўцы спустошылі яе. Толькі страты, нанесеныя саўгасу, перавысілі 3 млн. рублёў. У баях за вызваленне вёскі ў 1944 г. загінула 38 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле ў цэнтры вёскі. На франтах загінула 68 вяскоўцаў, у памяць аб якіх у 1975 г. пастаўлены помнік.

**ВЕНДАРАЖ** — вёска. Заснавана ў 1568 г. «людзьмі прыхожымі», шляхецкая ўласнасць. У 1586 г. князем Багданам Саламярэцкім пабудавана царква. У 1604 г. сяло ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. У 1785 г. цэнтр маёнтка, у Магілёўскім павеце, 204 жыхары, меліся 2 млыны, царква. Памешчык меў тут у 1856 г. 895 дзесяцін зямлі, вінакурны завод і млын. У 1860 г. пачала дзейнічаць дзягцярнасмалярная мануфактура. У 1880 г. 38 двароў, 91 жыхар. Ва ўсіх дварах сяляне займаліся кавальскім промыслам, вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны, а таксама посуду і розных бытавых рэчаў з дрэва. У 1890-ых гадах валасны цэнтр Магілёўскага павета. У 1889 г. пабудавана на сродкі вяскоўцаў памяшканне і адкрыта школа. Па перапісу 1897 г. сяло, 55 двароў, 366 жыхароў, цэнтр воласці, меліся царква, народнае вучылішча (у 1889 г. навучалася 25 хлопчыкаў, у 1907 г.— 58 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі), хлебазапасны магазін, конны завод. Адзін раз у год (1 кастрычніка) праводзіўся таржок. Побач быў фальварак Вендараж (5 двароў, 15 жыхароў), урачэбны пакой, вадзяны млын, пастаялы двор, капліца. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. сяло (60 двароў, 397 жыхароў) і маёнтак (3 двары, 3 жыхары) у Магілёўскім павеце.

З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1919 г. дзейнічаў валасны рэўком. Было створана першае ў Магілёўскім павеце кааператыўнае таварыства. У 1926 г. 76 двароў, 401 жыхар. У 1928 г. арганізаваны калгас, які аб'ядноўваў 74 гаспадаркі. У 1931 г. пабудаваны мураваны будынак для 7-гадовай школы, якая ў 1938 г. пераўтворана ў сярэднюю. У 1932 г. пачаў дзейнічаць радыёвузел. Была створана машынна-трактарная станцыя, якая ў 1937 г. мела 38 трактароў. У 1936 г. пабудавана бальніца. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У снежні 1941 г. партызаны разграмілі паліцэйскі ўчастак, які тут размяшчаўся. У вёсцы і наваколлі базіраваўся 121-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы. Акупанты спалілі вёску. У баі за вызваленне вёскі загінула каля 60 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле, што паблізу вясковых могілак. На паўднёвай ускраіне пахавана больш за 100 жыхароў, расстраляных гітлераўцамі. Пасля вайны адбудавана.

**ВІЛЬЧЫЦЫ** — вёска. Упершыню ўпамінаецца ў фрагментах інвентара 1560 г. як сяло ў Магілёўскай воласці, дзяржаўнае ўладанне, налічвала 15 «дымоў». У 1580 г. перададзена ў валоданне шляхціцу, а ў 1635 г. сяло налічвала 36 двароў, было ў Вяйнянскім войтаўстве Магілёўскай воласці, з'яўлялася дзяржаўнай уласнасцю, меліся царква, млын, карчма. У 1742 г. 43 двары. У 1850 г. у складзе маёнтка Вейна Магілёўскага павета, 42 двары, 239 жыхароў, меліся шынок, млын, сукнавальня. Пасля пракладкі ў 1859 г. шашы Магілёў—Доўск у вёсцы размяшчалася паштовая станцыя, якая мела 16 коней. У 1880 г. у сяле 46 двароў, 231 жыхар. З пракладкай чыгункі пачала дзейнічаць чыгуначная станцыя (у 1880 г. быў 1 дом, 10 жыхароў). Апрача земляробства ва ўсіх дварах вяскоўцы займаліся вырабам ільняной і

пяньковай пражы і тканіны. У 1897 г. 63 двары, 429 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Дзейнічалі школа граматы і хлебазапасны магазін. На паштовай станцыі былі 2 жылыя пабудовы, 12 жыхароў. У 1909 г. 89 двароў, 466 жыхароў. Школа граматы была пераўтворана ў царкоўнапрыходскую.

У 1926 г. 103 двары, 618 жыхароў. У 1930-ых гадах арганізаваны калгас «Пралетарый». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 26 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У барацьбе супраць фашызму загінулі 74 вяскоўцы. На ўшанаванне іх памяці ў 1975 г. у цэнтры вёскі пастаўлены помнік.

**ВЯЛІКАЕ БУШКАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло Бушкова, 20 двароў, у Бардзілаўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі, дзяржаўная ўласнасць. У 1742 г. мелася царква. У 1785 г. 17 двароў, 119 жыхароў, у складзе маёнтка Ждановічы Чавускага павета, казённая ўласнасць, меўся млын. Па перапісу 1897 г. 30 двароў, 227 жыхароў, у Гладкоўскай воласці Чавускага павета. Меўся піцейны дом. У 1909 г. 30 двароў, 217 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 20 жніўня 1924 г. у Зарасцянскім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. Чавускага, з 12 лютага 1935 г. Дрыбінскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 40 двароў, 289 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Калгасны сцяг».

**ВЯЛІКАЕ ХОНАВА** — вёска. Па рукапісных крыніцах вядома з 1604 г. як сяло ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1758 г. 20 двароў, у Быхаўскім графстве. У 1785 г. 28 двароў, 211 жыхароў, млын, драўляная царква, уласнасць памешчыка, у Быхаўскім павеце. У 1878 г. гаспадар аднаго маёнтка меў тут 925 дзесяцін зямлі, дзягцярны завод, другога — 1845 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 53 двары, 399 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася бандарным і кравецкім промысламі. Па перапісу 1897 г. сяло Хонава — 84 двары, 565 жыхароў, царква, школа (народнае вучылішча, адкрыта не пазней 1884 г.), хлебазапасны магазін, карчма — і хутар Ханаў (5 двароў, 21 жыхар, млын) у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. Пазней сяло стала называцца Вялікае Хонава, а хутар — Малое Хонава. У 1909 г. 100 двароў, 642 жыхары. Побач быў маёнтак (1 двор, 7 жыхароў). Дзейнічала крэдытнае таварыства. У 1925 г. 10 гаспадарак аб'ядналіся ў сельгасарцель, якая затым была пераўтворана ў калгас. З 1938 г. 7-гадовая школа.

**ВЯЛІКІЯ БЯЛЕВІЧЫ** — вёска. За 1,5 км на захад ад вёскі, на левым беразе ракі Друць, знаходзіцца старажытны курганны могільнік (24 насыпы), які сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вёска вядома з 16 стагоддзя. У 1784 г. 37 двароў, 314 жыхароў, у Быхаўскім павеце. У 1880 г. 68 двароў, 466 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася калёсным, сталярным, бандарным, адхожым і кравецкім промысламі. У 1883 г. адкрыта школа на сродкі сялян. Па перапісу 1897 г. 99 двароў, 698 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся хлебазапасны магазін, 2 піцейныя дамы. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. 125 двароў, 777 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. З 20 жніўня 1924 г. да 16 ліпеня 1954 г. цэнтр сельсавета.

На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, якой у 1924 г. быў перададзены нацыяналізаваны будынак. У 1925 г. у школе было 60 вучняў. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 168 двароў, 893 жыхары. У 1930-ых гадах вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1940 г. 136 двароў, 654 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы дзейнічала камсамольская падпольная арганізацыя. У чэрвені 1942 г. партызаны разграмілі валасную ўправу акупантаў, якая тут знаходзілася. У вёсцы і наваколлі некаторы час базіраваўся 113-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-апаратыўнай групы і Магілёўскі падпольны РК КП(б)Б. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 128 двароў, загубілі 16 жыхароў. На франтах загінула 49 вяскоўцаў. У памяць аб іх у 1970 г. у цэнтры вёскі пастаўлены абеліск.

**ГАЛЫНЕЦ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1679 г. сяло Галынцы, шляхецкая ўласнасць. У 1758 г. 12 двароў, уласнасць памешчыка. У 1785 г. 18 двароў, 200 жыхароў, у складзе маёнтка Старыя Буйнічы Магілёўскага павета. У 1848 г. цэнтр маёнтка. У 1858 г. мелася карчма. У 1880 г. 45 двароў, 187 жыхароў. Ва ўсіх дварах сяляне займаліся вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны, а таксама посуду і розных бытавых рэчаў з дрэва. У 1888 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. Па перапісу 1897 г. 60 двароў, 401 жыхар, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. У 1909 г. 63 двары, 471 жыхар.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1926 г. 185 двароў, 1127 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «1 Мая». У 1932 г. вёска атрымала электрычнае асвятленне. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 24 студзеня 1944 г. 121-ы партызанскі полк разграміў варожы гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. Партызаны знішчылі каля 200 гітлераўцаў, спалілі 10 складоў, гараж і 9 аўтамашын. У гонар партызан 121-га палка ў 1971 г. каля будынка клуба пастаўлены абеліск.

**ГАЛЯНІ-1** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1560 г. як сяло Галянішчавічы-Галені, 13 «дымоў», у Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1580 г. аддадзена ў пажыццёвае валоданне памешчыку, уваходзіла ў Магілёўскую воласць-староства Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. У 1604 г. сяло Галені налічвала 46 двароў. У 1635 г. у Горбавіцкім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць, мелася царква. У 1742 г. дзейнічала карчма. У 1785 г. 76 двароў, 487 жыхароў, у Чавускім павеце, казённая ўласнасць, мелася пабудаваная з дрэва царква. У 1866 г. адкрыта школа і ў тым жа годзе для яе пабудавана памяшканне. Частка вяскоўцаў займалася кавальскім промыслам. Па перапісу 1897 г. 97 двароў, 614 жыхароў, цэнтр воласці Чавускага павета Магілёўскай губерні. Меліся хлебазапасны магазін, школа (народнае вучылішча), багадзельня, царква. Непадалёку былі аднайменныя хутар (2 двары, 7 жыхароў), сядзіба (2 двары, 2 жыхары), карчма. У 1903 г. на паўднёвай ускраіне вёскі пабудавана мураваная Успенская царква, якая зараз з'яўляецца помнікам архітэктуры. У 1909 г. 115 двароў, 775 жыхароў. У 1926 г. 91 двор, 633 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас.

**ГАРАДЗІШЧА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1745 г. вёска, 36 двароў, у Быхаўскім графстве. У 1858 г. сяло,

150 жыхароў мужчынскага полу, у Быхаўскім павеце, мелася карчма. Ў 1860 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), якая размясцілася ў наёмным памяшканні, а ў 1906 г. для яе ўзведзены будынак. Гаспадар маёнтка, які быў побач, меў тут у 1870 г. 7793 дзесяціны зямлі і млын. У 1880 г. 76 двароў, 455 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася бандарным, кавальскім, адхожым, шавецкім і кравецкім промысламі. Калі ў 1889 г. у школе навучалася 25 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак, то ў 1908 г. 59 хлопчыкаў і 11 дзяўчынак. Па перапісу 1897 г. 92 двары, 691 жыхар, цэнтр воласці, у Быхаўскім павеце. Меліся хлебазапасны магазін, піцейны дом, царква. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. 115 двароў, 771 жыхар. Дзейнічаў урачэбны пакой. Побач знаходзіліся аднайменныя фальварак (5 двароў, 22 жыхары, вядзерная лаўка) і маёнтак (1 двор, 3 жыхары). Дзейнічалі пастаялы двор, Анінскі шкляны завод.

У 1926 г. сяло, 175 двароў, 1044 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас. У 1940 г. 182 двары, 743 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 69 двароў і загубілі 138 жыхароў.

**ГРЫБАНЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1635 г. сяло, 38 двароў, у Плешчыцкім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1742 г. 29 двароў, мелася карчма. У 1847 г. 27 двароў, 144 жыхары, у складзе маёнтка Любуж, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 34 двары, 241 жыхар, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1900 г. пабудавана памяшканне для школы. У 1909 г. 44 двары, 313 жыхароў.

У 1936 г. у 7-гадовай школе было 199 вучняў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За вызваленне вёскі загінулі 11 савецкіх воінаў, якія пахаваны на вясковых могілках. На франтах і ў партызанскіх атрадах загінулі 173 вяскоўцы.

**ГРЫБАЧЫ** — вёска. У 1880 г. 22 двары, 141 жыхар. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся кушнерскім промыслам і вырабам розных бытавых рэчаў з дрэва. Па перапісу 1897 г. 34 двары, 221 жыхар, у Таўпечыцкай воласці Магілёўскага павета. Меліся хлебазапасны магазін, школа граматы. У 1913 г. адкрыта земская школа.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. былі 32 вучні, меўся драматычны гурток. У 1926 г. 75 двароў, 393 жыхары. З 1928 г. дзейнічала сыраробчае прадпрыемства. У 1933 г. арганізаваны калгас «2-ая пяцігодка», які ў 1933 г. аб'ядноўваў 23 гаспадаркі. Меліся нафтавы і ветраны млыны. У 1936 г. у пачатковай школе было 76 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ГУСЛІШЧА** — вёска. За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі захаваўся старажытны курганны могільнік (22 насыпы), які сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. У 1635 г. 36 двароў, 2 млыны. У сувязі з голадам і эпідэміяй у 1671 г. вёска пуставала, а затым была заселена татарскімі сем'ямі. У 1742 г. 11 двароў. У 1847 г. цэнтр маёнтка ў Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка, які меў тут у 1861 г. 1429 дзесяцін зямлі і млын.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупі-

равана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1943 г. партызаны разграмілі варожы гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. На вясковых могілках пахавана партызанка Н. М. Зайцава, якая была закатавана гітлераўцамі 15 мая 1944 г. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 115 вяскоўцаў. У памяць аб іх у цэнтры вёскі ў 1971 г. пастаўлены помнік.

**ДАРЫ-1** — вёска. У 1785 г. 38 двароў, 250 жыхароў, у складзе маёнтка Вільчыцы Магілёўскага павета Магілёўскага намесніцтва. У 1850 г. 32 двары, 183 жыхары, уласнасць памешчыка, меўся шынок. У 1880 г. 50 двароў, 283 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. Тут размяшчалася паштовая станцыя на тракце Магілёў—Чэрыкаў—Краснаполле, якая мела 14 коней. У 1892 г. адкрыта школа, для якой у 1905 г. пабудавана памяшканне. Па перапісу 1897 г. былі сяло Дары (67 двароў, 468 жыхароў, хлебазапасны магазін, піцейны дом) і паштовая станцыя Дары (1 двор, 6 жыхароў), кузня. У 1909 г. 85 двароў, 650 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1943 г. партызаны разграмілі паліцэйскі ўчастак, які размяшчаўся ў вёсцы. У баі за вызваленне вёскі загінулі 87 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле на заходняй ускраіне.

**ДАШКАЎКА** — вёска і чыгуначная станцыя на лініі Магілёў—Жлобін, цэнтр сельсавета (з 20 жніўня 1924 г.). За 0,3 км на поўнач ад вёскі размешчана гарадзішча ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі, за 1 км на поўнач ад вёскі на правым беразе Дняпра — старажытныя гарадзішча і селішча, а за 1,5 км на поўнач ад вёскі — стаянка каменнага веку. Гэтыя помнікі археалогіі сведчаць аб засяленні тутэйшых мясцін у далёкай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вядома з 1597 г. як сяло, заснаванае князем Багданам Саламярэцкім, старостам Крычаўскім і Слуцкім. У гэтым жа годзе тут пачата будаўніцтва царквы. У 1758 г. мястэчка, 50 двароў, у Быхаўскім графстве, уласнасць памешчыка. 8 ліпеня 1812 г. французы атакавалі горад Магілёў. Сілы былі далёка не роўнымі, і атрады абароны Магілёва пачалі адступаць да Дашкаўкі, куды ўжо паспеў падысці авангард корпуса Раеўскага. Менавіта тут, каля Дашкаўкі, адбыўся жорсткі бой. Французаў адбілі і адкінулі назад. Раніцай 11 ліпеня ля Дашкаўкі зноў сышліся рускія і французскія войскі. Раеўскі адкінуў французаў да Салтанаўкі і стаў прарывацца да Магілёва. Дашкаўка на гэты час стала як бы цэнтральным лазарэтам. 12 ліпеня Баграціён цэлы дзень прастаяў у Дашкаўцы, каб заблытаць французаў і стварыць уражанне, што рыхтуецца да атакі на Магілёў. На самой справе ў гэты час наладжваліся пераправы праз Дняпро, пасля чаго руская армія паспяхова фарсіравала раку і рушыла да Смаленска на злучэнне з 1-ай арміяй. У гонар рускіх войск, якія ў ліпені 1812 г. дыслацыраваліся тут і 11 ліпеня 1812 г. удзельнічалі ў бітве супраць французскіх войск каля в. Салтанаўка, на будынку канторы Магілёўскай абласной сельскагаспадарчай дзяржаўнай доследнай станцыі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Меліся 2 царквы, сінагога і чатыры карчмы, у 1860 г. — 75 двароў, 661 жыхар. Мястэчка з'яўлялася цэнтрам маёнтка, гаспадару якога ў 1831 г. належалі 3223 дзесяціны зямлі, 2 млыны, сукнавальня, 4 карчмы. У 1860 г. 138 двароў, 481 жыхар. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім, сталярным, ганчарным, кавальскім промысламі. Адзін вясковец займаўся вырабам скрыпак. Меліся адна мураваная і адна драўляная цэрквы. У 1889 г. у школе навуча-

ліся 40 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка, у 1907 г. — 40 хлопчыкаў і 7 дзяўчынак. Па перапісу 1897 г. 195 двароў, 1197 жыхароў. Дзейнічалі царква, народнае вучылішча, параходная прыстань, хлебны магазін, 2 кузні, млын, маслабойня, крупарушка, 10 лавак, 3 пастаялыя двары, этапны дом, карчма. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. Хлебазапасны магазін, млын. У 1909 г. у мястэчку 120 двароў, 757 жыхароў, былі адкрыты прыёмны пакой і малітоўны дом. За 1 вярсту ад вёскі знаходзілася станцыя Дашкаўка на Рыга-Арлоўскай чыгунцы. У фальварку было 3 двары, 23 жыхары.

З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1923 г. арганізаваны саўгас «Дашкаўка», які меў садова-агародны пітомнік, 440 га зямлі, набыў у 1925 г. трактар. У 1924 г. адкрыты ўрачэбная амбулаторыя, бібліятэка і хата-чытальня.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі вызначыўся камандзір сапёрнага ўзвода ст. лейтэнант М. Е. Волкаў і камандзір сапёрнага аддзялення сяржант І. В. Чашчарын, якія ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. На вясковых могілках пахаваны 36 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях за вызваленне вёскі. Сярод іх — Герой Савецкага Саюза Ш. Шаімаў. За 1,2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі ў лесе ў агульнай магіле пахаваны жыхары в. Дашкаўка, якіх гітлераўцы расстралялі 29 верасня 1941 г. У парку пастаўлены мемарыяльны знак на ўшанаванне памяці 28 вяскоўцаў, якія загінулі на франтах.

**ДУБІНКА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1759 г. сяло, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 г. 4 двары, 29 жыхароў, у складзе маёнтка Будзішча Магілёўскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1847 г. цэнтр маёнтка, уласнасць памешчыка. У 1858 г. 30 рэвізскіх душ, у складзе аднайменнага маёнтка, гаспадар якога меў тут у 1861 г. 693 дзесяціны зямлі. Па перапісу 1897 г. сяло Дубінка Старая, 17 двароў, 125 жыхароў, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. Мелася вінная лаўка. Побач была вёска Дубінка Новая, 36 двароў, 227 жыхароў. У 1909 г. у Старой Дубінцы 20 двароў, 145 жыхароў, у Новай Дубінцы 49 двароў, 283 жыхары.

У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Сцяг». У канцы 1930-ых гг. у вв. Дубінка Старая і Дубінка Новая склалі адну вёску Дубінка. У 1940 г. 83 двары, 409 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Непадалёку ад вёскі базіраваўся партызанскі атрад імя А. Касаева. У брацкіх магілах, што на вясковых могілках, пахаваны партызаны, якія загінулі ў баях супраць акупантаў. 18 лютага 1943 г. гітлераўцы сагналі 186 жыхароў у 2 гумны і спалілі жывымі. Яны пахаваны ў магіле на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі. У цэнтры вёскі пахаваны савецкі воін, які загінуў у баі за вызваленне вёскі.

**ЖУРАВЕЦ-1** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1785 г. 11 двароў, 78 жыхароў, цэнтр маёнтка, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 9 двароў, 40 жыхароў, у 1858 г. мелася карчма. Памешчык меў тут у 1874 г. 247 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 17 двароў, 60 жыхароў. Ва ўсіх дварах сяляне займаліся вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны, а таксама посуду і розных бытавых рэчаў з дрэва. Па перапісу 1897 г. 24 двары, 188 жыхароў, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. У 1909 г. 35 двароў, 208 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У хуткім часе была створана працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. для яе ўзведзены будынак, у 1925 г. 25 вучняў. У 1926 г. 60 двароў, 307 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя С. Ланцуцкага. У 1936 г. у пачатковай школе было 93 вучні, дзейнічала бібліятэка. У 1940 г. 55 двароў, 248 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. карнікі спалілі 43 двары, загубілі 29 жыхароў. У вёсцы і наваколлі базіраваўся 121-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы.

**ЗАБАЛАЦЦЕ** — вёска, у Пашкаўскім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1785 г. сяльцо, 16 двароў, 78 жыхароў, цэнтр маёнтка, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка і кармеліцкага кляштара. У 1818 г. 8 двароў, 44 жыхары, уласнасць Магілёўскай духоўнай кансісторыі. У 1848 г. побач была вёска Малое Забалацце (5 двароў, 48 жыхароў), уласнасць памешчыка. Па перапісу 1897 г. вёскі Вялікае Забалацце (20 двароў, 156 жыхароў), Малое Забалацце, або як яе інакш называлі Самадумаўка (9 двароў, 94 жыхары), Забалацце Казённае, яно ж Ніжнія Лужкі (19 двароў, 147 жыхароў) і сядзіба Забалацце (1 двор, 8 жыхароў). У вёсцы Вялікае Забалацце мелася школа граматы, якая ў пачатку 20 стагоддзя пераўтворана ў народнае вучылішча. У 1907 г. у ім навучаліся 42 хлопчыкі і 3 дзяўчынкі. У 1909 г. у в. Вялікае Забалацце было 30 двароў, 198 жыхароў, у в. Малое Забалацце — 17 двароў, 87 жыхароў, у Забалацці Казённым — 24 двары, 146 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. З 20 жніўня 1924 г. у Гаранскім сельсавеце Магілёўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені. У 1922 г. былая гарэлачная крама перабудавана пад школу. У 1925 г. у школе было 42 вучні, дзейнічаў драмгурток. У 1931 г. школе перададзены нацыяналізаваны будынак. У 1926 г. хутары налічвалі: Вялікае Забалацце — 45 двароў, 282 жыхары, Казённае Забалацце — 35 двароў, 207 жыхароў, Малое Забалацце — 26 двароў, 145 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Іскра сацыялізму». У 1936 г. у пачатковай школе было 102 вучні, бібліятэка. У 1939 г. за высокія паказчыкі ў вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі загадчык фермы Ф. А. Баранаў быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У 1930-ых гг. хутары Вялікае Забалацце, Малое Забалацце і Казённае Забалацце склалі адну вёску Забалацце. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ЗАБАЛАЦЦЕ** — вёска, у Заводскаслабодскім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з 1563 г. як сяло, 18 «дымоў», у Магілёўскай воласці, аддадзенае ў часовае валоданне шляхціцу. У 1604 г. 32 двары, у Іструбішчанскім войтаўстве Аршанскага павета. У 1635 г. мелася царква. У 1785 г. цэнтр маёнтка, 16 двароў, 101 жыхар, дзяржаўная ўласнасць. У 1832 г. уласнасць памешчыка. У 1909 г. 35 двароў, 208 жыхароў, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрыч-

ніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. З 1924 г. у Дасовіцкім сельсавеце. У 1926 г. вёска, 74 двары, 413 жыхароў. Дзейнічала пачатковая школа. У 1930 г. арганізаваны калгас «1 Мая», працавала кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ЗАПРУДДЗЕ** — вёска. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца пад 1604 г. як сяло ў Вяйнянскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, у часовым валоданні шляхціца. У 1635 г. у складзе Вільчыцкага фальварка Вяйнянскага войтаўства. У 1643 г. меўся млын. У 1742 г. 12 двароў, у 1785 г. 25 двароў, 185 жыхароў. У 1850 г. 19 двароў, 109 жыхароў, у складзе маёнтка Вейна, меўся шынок. Па перапісу 1897 г. 36 двароў, 262 жыхары, у Галянёўскай воласці Чавускага павета. У 1909 г. 39 двароў, 326 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 20 жніўня 1924 г. у Амхоўскім сельсавеце Лупалаўскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 73 двары, 389 жыхароў. Дзейнічала пачатковая школа. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны сцяг», які ў 1930 г. меў трактар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі загінулі 26 воінаў 70-ай стралковай дывізіі, якія пахаваны ў брацкай магіле на могілках.

**ЗЫЛІ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1635 г. абруб, у Брылёўскім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1777 г. вёска ў Магілёўскай акрузе. У 1785 г. сяльцо Зылёва — 12 двароў, 105 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. Меўся млын. У 1858 г. налічвала 42 рэвізскія душы. Памешчык меў тут у 1878 г. 325 дзесяцін зямлі і пастаялы двор. У 1880 г. 16 двароў, 80 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася стялярным і шавецкім промысламі. Па перапісу 1897 г. 19 двароў, 122 жыхары, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскай губерні. Меўся хлебазапасны магазін. Побач з вёскай былі дзве ўладальніцкія сядзібы: у адной 1 двор, 4 жыхары, у другой 2 двары, 12 жыхароў. У 1909 г. у вёсцы 27 двароў, 160 жыхароў, на сядзібе — 1 двор, 5 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 1924 г. у Машанацкім сельсавеце. У 1925 г. створана сыраварна-масларобчая арцель (20 гаспадарак). У 1926 г. 38 двароў, 207 жыхароў. У 1920-ых гг. дзейнічала садова-агароднае таварыства. У 1930 г. арганізаваны калгас «Новае жыццё». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ІВАНАВІЧЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку 17 стагоддзя. У 1604 г. сяло, 58 двароў, ва Ульянаўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць, мелася карчма на Мсціслаўскім гасцінцы. У 1635 г. 53 двары. У 1785 г. 46 двароў, 311 жыхароў, у складзе маёнтка Сухары Чавускага павета, памешчыцкая ўласнасць. У 1849 г. 28 двароў, 158 жыхароў. У 1852 г. 26 двароў, 165 жыхароў. Па перапісу 1897 г. 27 двароў, 198 жыхароў, у Гладкоўскай воласці Чавускага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У 1909 г. 30 двароў, 240 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 1918 г. у Сухароўскай воласці, з 20 жніўня 1924 г. у Лупалаўскім раёне Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка

1931 г. у Чавускім раёне, з 20 лютага 1938 г. у Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 45 двароў, 314 жыхароў. У вясковай школе навучаліся дзеці з вв. Іванавічы, Дварэц, Навасёлкі. У 1929 г. арганізаваны калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**КАЛІНАВАЯ** (да 30 ліпеня 1964 г. — Трыбухі) — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1785 г. сяло, 30 двароў, 195 жыхароў, цэнтр маёнтка, у Магілёўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, шляхецкая ўласнасць, меліся млын і драўляная царква. Памешчык меў тут у 1876 г. 741 дзесяціну зямлі, млын і карчму. У 1897 г. 38 двароў, 225 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Меліся хлебазапасны магазін, школа граматы, царква. Непадалёку была сядзіба — 2 двары, 29 жыхароў, вадзяны млын. У 1909 г. 51 двор, 264 жыхары, дзейнічалі бровар, вадзяны млын, карчма, царкоўнапрыходская школа (адкрыта ў 1890 г.). У маёнтку быў 1 двор, 1 жыхар.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. Пасля вызвалення ад немцаў на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, якой у 1919 г. перададзены нацыяналізаваны будынак. У 1925 г. у школе было 45 вучняў. У 1925 г. створана садова-агароднае таварыства (5 гаспадарак). У 1926 г. 79 двароў, 422 жыхары. У 1928 г. дзейнічала сыраварня. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пераможац», які ў 1933 г. аб'ядноўваў 12 гаспадарак. У 1936 г. у пачатковай школе было 46 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі вызначыліся камандзір асобнай разведроты ст. лейтэнант К. С. Лініца, разведчык Д. А. Кунцоў, камандзір аддзялення ст. сяржант В. І. Даўгаполаў, якім прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**КАЛЯСІШЧА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку 17 стагоддзя. У 1604 г. сяло Калясішчы ў Магілёўскім старостве Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 г. 15 двароў, 96 жыхароў, шляхецкая ўласнасць. У 1858 г. 13 двароў, 91 жыхар, уласнасць памешчыка, у Магілёўскім павеце. Па перапісу 1897 г. 35 двароў, 210 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У 1909 г. 32 двары, 243 жыхары. У 1926 г. 48 двароў, 255 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоная зорка». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баі каля вёскі ў чэрвені 1944 г. вызначыўся камандзір аддзялення ст. сяржант М. Д. Чапралаў, які ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

**КАМЕНКА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. Па перапісу 1897 г. 57 двароў, 427 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. У 1909 г. 65 двароў, 364 жыхары, мелася царкоўнапрыходская школа.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. З 20 жніўня 1924 г. у Косцінскім сельсавеце Магілёўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 91 двор, 521 жыхар. У 1930 г. арганізаваны калгас «IX з'езд ВЛКСМ», меліся кузня і ваўначоска. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня

1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы і наваколлі базіраваўся 61-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы.

**КАРЧОМКА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1785 г. 17 двароў, 139 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка, меліся млын і пабудаваная з дрэва царква. У 1858 г. 35 жыхароў мужчынскага полу. Памешчык меў тут у 1866 г. 640 дзесяцін зямлі. Па перапісу 1897 г. 16 двароў, 127 жыхароў, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. Непадалёку быў аднайменны фальварак, 2 двары, 18 жыхароў, ветраны млын. У 1909 г. у сяле 16 двароў, 174 жыхары, у фальварку 1 двор, 11 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1918 г. адкрыта школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1925 г. у школе было 49 вучняў. У 1926 г. у вёсцы 35 двароў, 233 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Ленінскі шлях». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 26 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы і наваколлі базіраваўся 121-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы. На вясковых могілках у брацкай магіле пахаваны савецкія воіны і партызаны 121-га партызанскага палка імя А. Касаева. На заходняй ускраіне, на могілках у 1958 г. пастаўлены абеліск у памяць аб земляках, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**КАСТРЫЦЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1643 г. абруб, у Плешчыцкім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 г. вёска Кастрыца-Слабодка, 7 двароў, 50 жыхароў, у складзе маёнтка Заходы, уласнасць Магілёўскага каталіцкага архіепіскапства. У 1848 г. 11 двароў. Па перапісу 1897 г. 29 двароў, 143 жыхары, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. Меўся хлебазапасны магазін. Непадалёку была аколі- ца — 9 двароў, 46 жыхароў. У 1909 г. у вёсцы 23 двары, 161 жыхар, у аколіцы 5 двароў, 35 жыхароў, у 1913 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 40 вучняў, З 20 жніўня 1924 г. у Заходскім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. Шклоўскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 51 двор, 278 жыхароў. У 1930-ых гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**КАЧУРЫНА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло, 23 двары, у Брылеўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўнае ўладанне. У 1742 г. 14 двароў, мелася карчма. У 1847 г. 21 двор, 119 жыхароў, у складзе маёнтка Любуж Магілёўскага павета. У 1857 г. уласнасць памешчыка. У 1880 г. 25 двароў, 166 жыхароў. У 1897 г. 32 двары, 213 жыхароў. Меўся хлебазапасны магазін. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся сталярным промыслам. У 1909 г. 50 двароў, 253 жыхары, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Непадалёку, на хутары Брылі, у 1910 г. была адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені імя А. І. Герцэна, у якой у 1925 г. было 59 вучняў. У 1926 г. 50 двароў, 297 жыхароў, у 1929 г. арганізаваны калгас «Барацьбіт». Для школы ў 1930 г. узведзены новы цагляны будынак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**КІСЯЛЬКІ** — вёска. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца пад 1567 г. як сяло Кісялі Магілёўскай воласці Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1604 г. 35 двароў, у Брылёўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі. У 1834 г. у сяле 80 жыхароў, непадалёку быў фальварак, 9 жыхароў. У 1848 г. сяло (16 двароў, 75 жыхароў) і фальварак (10 жыхароў), цэнтр маёнтка, меліся карчма, завод буйной рагатай жывёлы, уласнасць памешчыка, у Чавускім павеце. У 1852 г. 16 двароў, 81 жыхар. У 1860 г. 18 двароў, 78 жыхароў. Памешчык меў тут у 1879 г. 204 дзесяціны зямлі. Па перапісу 1897 г. 25 двароў, 139 жыхароў, у Гладкаўскай воласці Чавускага павета. Непадалёку былі аднайменныя пасёлак (2 двары, 26 жыхароў) і фальварак (3 двары, 26 жыхароў). У 1909 г. у сяле 25 двароў, 185 жыхароў, у пасёлку — 4 двары, 16 жыхароў, у фальварку — 5 двароў, 30 жыхароў, у аколіцы — 4 двары, 27 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 20 жніўня 1924 г. у Сухарэўскім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Чавускім раёне, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. 27 лістапада 1924 г. адкрыта школа, у якой у 1925 г. было 34 вучні. Тут вучыліся дзеці з в. Кісялькі і хутара Зылеўскія. У 1926 г. 75 двароў, 364 жыхары. У 1930-ых гг. вяскоўцы ўступілі у калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**КНЯЗЕЎКА** — вёска. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца пад 1604 г. як сяло ў Вяйнянскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. У 1635 г. у складзе Вільчыцкага фальварка Вяйнянскага войтаўства, у 1742 г. 5 гаспадарак, дзейнічала карчма. У 1785 г. 16 двароў, 166 жыхароў, у Чавускім павеце Магілёўскага намесніцтва. У 1850 г. 30 двароў, 162 жыхары, у складзе маёнтка Вейна Чавускага павета, меўся шынок. Па перапісу 1897 г. 43 двары, 279 жыхароў, у Галянёўскай воласці Чавускага павета. У 1909 г. 42 двары, 344 жыхары. У 1912 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 80 вучняў з вв. Князеўка, Быстрык, пасёлка Заппруддзе, хутара Князеўка. З 20 жніўня 1924 г. у Амхоўскім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Магілёўскім раёне, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 78 двароў, 494 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас «17-ы партз'езд». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**КНЯЖЫЦЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1501 г., калі вялікі князь літоўскі і польскі кароль Аляксандр аддаў вёску ў пажыццёвае валоданне сваёй жонцы Алене — дачцэ

рускага князя Івана III. У 1535 г. спалена рускім ваяводам Васілём Шуйскім у час вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім. У 1560 г. сяло, цэнтр маёнтка, шляхецкая ўласнасць. У 1632 г. заснаваны карметліцкі кляштар. У 1634 г. прыватнае ўладанне, дзейнічаў касцёл. У 1785 г. мястэчка ў складзе маёнтка Галоўчына, 43 двары, 452 жыхары, уласнасць памешчыка, меўся вадзяны млын. У 1848 г. сяло, 147 двароў, у Магілёўскім павеце Магілёўскай губерні, меліся драўляная царква, пабудаваны ў 1681 г. мураваны касцёл даміканцаў, які зараз з'яўляецца помнікам архітэктуры барока. Праз сяло праходзіў Віленскі паштовы тракт. У 1861 г. 72 двары, 625 жыхароў, дзейнічаў вадзяны млын, з 1879 г. — вінакурны завод, у якім у 1884 г. была ўстаноўлена паравая машына. Дзейнічалі царква, касцёл, сінагога. У 1861 г. адкрыта школа, для якой у 1890 г. пабудавана памяшканне. У 1880 г. 93 двары, 506 жыхароў, адзін раз у год (1 кастрычніка) праводзіўся кірмаш, а па нядзелях — таржкі. Частка насельніцтва займалася кравецкім, кавальскім і шавецкім промысламі. Памешчык меў тут у 1881 г. 1363 дзесяціны зямлі, піцейны дом і млын. У 1897 г. колькасць двароў павялічылася да 117, жыхароў — да 691. Меліся 2 царквы, малітоўны дом, народнае вучылішча, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, 14 лавак, 2 пастаялыя двары. Побач з мястэчкам была аднайменная сядзіба (2 двары, 31 жыхар), дзе працавалі вінакурны завод і вадзяны млын. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У пачатку 20 стагоддзя меліся 2 вінакурныя заводы і 8 вадзяных млыноў. Шырокія памеры прыняў выраб ільняной пражы і пянькі, ткацтва. Невялікія зямельныя надзелы, малая колькасць жывёлы і непасільныя падаткі прымушалі сялян займацца адходным промыслам — часцей за ўсё лесанарыхтоўкамі. У 1909 г. у мястэчку 60 двароў, 341 жыхар, у маёнтку 1 двор, 6 жыхароў, дзейнічалі вінакурны завод і млын.

З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта ў 1919 г. працоўная школа 1-ай ступені. З-за матэрыяльных цяжкасцей былі перабоі ў яе рабоце і нават некаторы час яна не дзейнічала. У 1923 г. камсамольцы звярнуліся да Н. К. Крупскай з просьбай дапамагчы адкрыць школу. Просьба была падтрымана і восенню 1924 г. школа аднавіла сваю працу. 16 лютага 1924 г. створана сельскагаспадарчае таварыства, 14 кастрычніка 1924 г. адбылася выстаўка, на якой дэманстраваліся поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі раёна. У 1924 г. адкрыты бібліятэка, урачэбная амбулаторыя, хата-чытальня, у 1925 г. — народны дом. У 1925 г. у школе, якая насіла імя М. В. Гогаля, быў 141 вучань, у іх ліку 26 піянераў. У 1920—1930-ых гг. пры школе дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1925 г. створана кустарна-прамысловая арцель «Адраджэнне», дзейнічала крэдытнае таварыства. Паблізу, у Княжыцкай дачы, працавала смалакурня. У 1926 г. у мястэчку 150 гаспадарак, 771 жыхар. У 1930-ых гг. местачкоўцы ўступілі ў калгас. У 1936 г. у 7-гадовай школе было 347 вучняў, дзейнічала бібліятэка, а ў 1938 г. 7-гадовая школа пераўтворана ў сярэднюю.

У Вялікую Айчынную вайну ў чэрвені—ліпені 1941 г. каля вёскі войскі Чырвонай Арміі вялі цяжкія абарончыя баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У час акупацыі партызаны разграмілі валасную ўправу гітлераўцаў, якая размяшчалася ў вёсцы. Вызвалена 28 чэрвеня 1944 г. У брацкай магіле, што ў вясковым скверы, пахаваны 80 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях за вызваленне вёскі. У гэтых

баях вызначыўся артылерыйскі дывізіён пад камандаваннем Я. Т. Андрушчанкі, які адрэзаў ворагу шлях да адступлення. Я. Т. Андрушчанка быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Вёска — радзіма вядомага беларускага хіміка, акадэміка АН Беларусі У. С. Камарова (нар. 29 студзеня 1923 г.) і беларускага савецкага паэта В. І. Матэвушава (6 сакавіка 1915 — 6 сакавіка 1974).

**КРАСНАПОЛЛЕ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 19 стагоддзя. У 1828 г. вёска, 15 жыхароў мужчынскага полу, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. Па перапісу 1897 г. 7 двароў, 46 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Побач былі аднайменныя фальварак (1 двор, 9 жыхароў), 4 сядзібы (6 двароў, 38 жыхароў), хутар (4 двары, 24 жыхары), яўрэйская калонія пры дарозе Магілёў—Палыкавічы (1 двор, 1 жыхар). У 1909 г. у вёсцы 9 двароў, 59 жыхароў, у фальварку 1 двор, 4 жыхары, у 4 сядзібах 6 двароў, 34 жыхары, на хутары 1 двор, 10 жыхароў. Каля вёскі і каля хутара былі цагельныя заводы.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1929 г. арганізаваны калгас «Камінтэрн», які ў 1933 г. аб'ядноўваў 41 гаспадарку. Першы старшыня Я. Ф. Казакоў быў у 1926—1929 гг. сакратаром вясковай камсамольскай ячэйкі. З 21 жніўня 1925 г. да 16 ліпеня 1954 г. цэнтр сельсавета. Калгасніца П. П. Вячыстая ў 1935 г. была дэлегатам II Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў. У 1939 г. калгас з'яўляўся ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У 1920-ых гг. была пачатковая, а ў 1930-ых — 7-гадовая школа, у якой у 1936 г. было 338 вучняў, мелася бібліятэка. У 1939 г. калгас перасяліў з хутароў 40 гаспадарак, ва ўсе дамы была праведзена электрычнасць, а ў 1940 г. — водаправод. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Партызаны разграмілі валасное ўпраўленне акупантаў, якое размяшчалася ў вёсцы. У баях за вызваленне вёскі загінула 76 воінаў 95-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту. Сярод іх — Герой Савецкага Саюза камандзір ўзвода коннай разведкі ст. лейтэнант М. І. Яшын, які 27 чэрвеня 1944 г. у ліку першых фарсіраваў Дняпро, на чале ўзвода ўступіў ў бой супраць фашыстаў і выбіў іх з ўмацаванняў, што садзейнічала поспеху наступлення асноўных сіл.

**КУПЁЛЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1743 г. сяло ў Аршанскім павеце. У 1785 г. 20 двароў, 126 жыхароў, у складзе маёнтка Трыбухі Магілёўскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1880 г. 26 двароў, 150 жыхароў. Ва ўсіх дварах сяляне займаліся вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны. У 1886 г. адкрыта школа граматы, пераўтвораная ў 1910 г. у царкоўнапрыходскую, а ў 1917 г. — у земскую. Размяшчалася школа ў наёмным памяшканні. У 1897 г. 39 двароў, 250 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета, меўся хлебазапасны магазін. Непадалёку былі сядзіба (1 двор, 5 жыхароў) і пастаялы двор. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. у вёсцы 59 двароў, 291 жыхар, на сядзібе 2 двары, 10 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 50 вучняў, дзейнічаў драмгурток, а ў

1936 г. у пачатковай школе было 116 вучняў. У 1926 г. 88 двароў, 479 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Першамайскі заклік», які ў 1933 г. аб'ядноўваў 12 гаспадарак. У 1940 г. калгас за дасягненні ў развіцці гаспадаркі быў занесены ў кнігу Пашаны Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы спалілі і разрабавалі вёску.

**КУТЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1568 г. як сяло, якое «людми прихожими засадили». У 1785 г. 15 двароў, 98 жыхароў, у складзе маёнтка Вендараж Магілёўскага павета, шляхецкая ўласнасць. Па перапісу 1897 г. 51 двор, 351 жыхар, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. У 1909 г. 60 двароў, 407 жыхароў. У 1910 г. адкрыта земская школа, для якой у 1914 г. пабудавана памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 110 вучняў, дзейнічалі бібліятэка і драмгурток. У 1923 г. арганізавана аддзяленне першага ў раёне Вендаражскага кааператыўнага таварыства, затым была створана арцель «Кастрычнік». У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. вёска, 90 двароў, 576 жыхароў. У 1927 г. пачала працаваць смалакурня, у 1930 г. арганізаваны калгас «Сталінскі заклік». У 1938 г. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ЛЕЖНЕЎКА** (да 1960 г. вёскі Старая Лежнеўка і Новая Лежнеўка). Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку 17 стагоддзя. У 1601 г. упамінаецца ў Баркулабаўскай хроніцы як сяло Лежнева. У 1785 г. 8 двароў, 88 жыхароў, у складзе маёнтка Старыя Буйнічы Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1858 г. 98 рэвізскіх душ. 8 памешчыкаў мелі тут у 1872 г. 602 дзесяціны зямлі і млын. У 1880 г. 34 двары, 110 жыхароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся кавальскім промыслам. Па перапісу 1897 г. сяло Старая Лежнеўка, 47 двароў, 309 жыхароў, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. Побач была вёска Лежнеўка Новая (18 двароў, 120 жыхароў). У 1909 г. у в. Старая Лежнеўка 50 двароў, 413 жыхароў, у в. Лежнеўка Новая 41 двор, 145 жыхароў. У 1912 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. былі 52 вучні. У 1926 г. у в. Старая Лежнеўка 103 двары, 403 жыхары, у в. Новая Лежнеўка 260 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Відны шлях», які ў 1933 г. аб'ядноўваў 46 гаспадарак. У 1939 г. свінарка калгаса Д. К. Міхаленка была ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На франтах загінулі 43 вяскоўцы.

**ЛЫКАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як заснаванае ў лесе сяло, 26 двароў, у Вяйнянскім войтаўстве Магілёўскага старoства-эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1635 г. 59 двароў, у 1742 г. 38 двароў, мелася карчма. У 1785 г. 63 двары, 390 жыхароў, дварцовая ўласнасць. У 1834 г. 238 жыхароў. У 1850 г. у складзе маёнтка Вейна Магілёўскага павета,

57 двароў, 347 жыхароў, уласнасць памешчыка, меўся шынок. У 1880 г. 69 двароў, 416 жыхароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся калёсным промыслам. У 1880-ых гадах адкрыта школа. У 1909 г. 105 двароў, 795 жыхароў, меліся царкоўнапрыходская школа, хлебная лаўка. У ліпені—жніўні 1910 г. адбыліся сялянскія хваляванні супраць сталыпінскай рэформы. 22 чэрвеня натоўп сялян (да 80 чалавек) спрабаваў перашкодзіць правядзенню каморніцкіх работ па нарэзцы хутароў. У справу ўмяшалася паліцыя (павятовы спраўнік з 30 коннымі стражнікамі). 26 чалавек былі арыштаваны. 25 ліпеня натоўп сялян (200 чалавек) з палкамі і каламі выступілі супраць выдзелу з абшчыны багатых вяскоўцаў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, для якой у 1923 г. было пабудавана памяшканне. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. У 1925 г. у школе было 102 вучні. У 1926 г. 152 двары, 1000 жыхароў. У 1930-ых гадах вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1936 г. у пачатковай школе быў 131 вучань з вв. Лыкава, Барок і хутара Лыкава, мелася бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, разрабавана і часткова спалена. На могілках і ў брацкіх магілах, што на заходняй ускраіне, пахаваны савецкія воіны, якія загінулі ў баях у 1941 і 1944 гг. У цэнтры вёскі ў 1975 г. пастаўлены абеліск у памяць аб вяскоўцах, якія загінулі ў барацьбе супраць фашызму.

**МАКАРЫНЦЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло, 47 двароў, у Брылёўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1742 г. сяло Макарына, у Палыкавіцкай воласці. Мелася карчма. У 1785 г. 50 двароў, 373 жыхары, у складзе маёнтка Палыкавічы Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1847 г. апрача жылых дамоў было 7 лазняў, 8 асецяў, 30 хлявоў. У 1897 г. 41 двор, 279 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета, меліся школа граматы, хлебазапасны магазін, піцейны дом. У 1905 г. школа граматы пераўтворана ў земскую, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1909 г. 69 двароў, 346 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 1924 г. у Машанацкім сельсавеце. На базе земскай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 82 вучні. У 1926 г. 90 двароў, 495 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камінтэрн». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы абрабавалі вёску. Нанесеныя калгасу страты склалі 9940 тыс. руб. На франтах загінулі 143 вяскоўцы.

**МАКОЎНЯ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку 17 стагоддзя. У 1604 г. сяло, 53 двары, у Брылёўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі, дзяржаўная ўласнасць. У 1635 г. мелася карчма. У 1785 г. 61 двор, 469 жыхароў, у складзе маёнтка Плешчыны Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1834 г. было 311 жыхароў, у 1847 г. 46 двароў, 253 жыхары, у складзе маёнтка Любуж, Магілёўскага павета, меўся пастаялы двор. У 1858 г. 46 двароў. Гаспадар маёнтка меў тут у 1866 г. 469 дзесяцін зямлі і 2 карчмы. У 1880 г. 57 двароў, 270 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася калёсным і кравецкім промысламі. Па перапісу 1897 г. 80 двароў, 506 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. Меліся хлебазапасны магазін і шко-

ла граматы. У 1909 г. 84 двары, 614 жыхароў. У 1910 г. школа граматы пераўтворана ў земскую, якая размясцілася ў наёмным памяшканні.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 2 красавіка 1919 г. у Гомельскай губерні РСФСР, з 1924 г. у Машанацкім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі БССР (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Магілёўскім раёне, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. З 1960 г. у Мастоцкім сельсавеце. На базе земскай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 82 вучні з в. Макоўня, хутара Макоўня і пасёлка Русінка. У 1926 г. 136 двароў, 773 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Пераможац». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**МАЛОЕ БУШКАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло Бушкава ва Ульянаўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 г. 16 двароў, 119 жыхароў, у складзе маёнтка Селішча, уласнасць памешчыка. Па перапісу 1897 г. 39 двароў, 290 жыхароў, у Гладкоўскай воласці Чавускага павета. Меўся хлебазапасны магазін. У 1909 г. 46 двароў, 324 жыхары. У 1916 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 20 жніўня 1924 г. у Сухарэўскім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Чавускім, з 12 лютага 1935 г. у Дрыбінскім раёне, з 20 лютага 1938 г. у Магілёўскай вобласці. На базе земскай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 64 вучні з вв. Малое Бушкава, Вялікае Бушкава, Зарэсце, пасёлкаў Узмошча, Сухараўка. У 1926 г. 78 двароў, 482 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пуцілавец», дзейнічала кузня. У 1940 г. 102 двары, 546 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У снежні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 40 жыхароў.

**МАЛОЕ ХОНАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 19 стагоддзя. Па перапісу 1897 г. былі сяло Ханава (84 двары, 565 жыхароў, царква, школа), хлебазапасны магазін, карчма і хутар Ханаў (5 двароў, 21 жыхар, млын) у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. Пазней сяло стала называцца Вялікае Ханава, хутар — Малое Ханава.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. Пры ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу корпуса польскіх легіянераў у пачатку 1918 г. загінулі 5 чырвонаармейцаў, якія пахаваны на вясковых могілках. З 1924 г. у Коцінскім, з 1925 г. у Хонаўскім сельсавеце. У 1929 г. арганізаваны калгас «17-ы партз'езд». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі загінулі 4 савецкія воіны, якія пахаваны на могілках. На франтах загінулі 62 вяскоўцы, у памяць аб якіх у 1967 г. каля будынка школы пастаўлены абеліск.

**МАЛЫЯ БЯЛЕВІЧЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1857 г. сяло ў Быхаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 29 двароў, 230 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кавальскім і адхожым промысламі. У 1886 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1909 г. 55 два-

роў, 366 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Магілёўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 70 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У 1926 г. 102 двары, 726 жыхароў. У лістападзе 1929 г. арганізаваны калгас «Сцяг камунізму», які ў тым жа годзе атрымаў трактар. У 1931 г. калгас аб'ядноўваў 67 гаспадарак. У 1930-ых гг. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 304 вучні, дзейнічала бібліятэка. У 1940 г. 73 двары, 420 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы і ваколіцах базіраваўся 113-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы і Магілёўскі падпольны РК КП(б)Б. Гітлераўцы 26 лютага 1943 г. спалілі жывымі 41 жыхара з вёсак Малыя Бялевічы і Навабеліца. Яны пахаваны ў магіле на заходняй ускраіне вёскі. У верасні 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі 69 двароў. У брацкай магіле, што ў цэнтры вёскі, пахаваны 12 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1944 гг. Пасля вайны адбудавана.

**МАСТОК** — вёска, цэнтр сельсавета (з 20 жніўня 1924 г.). Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1635 г. сяло, 64 двары, у Брылёўскім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1742 г. 18 двароў, млын, карчма. У 1785 г. 45 двароў, 212 жыхароў, у складзе маёнтка Палыкаўшчына Магілёўскага павета. У 1834 г. было 218 жыхароў, у 1847 г. — 49 двароў, 60 клецяў, 21 асець, 17 лазняў, 309 жыхароў, у складзе маёнтка Палыкавічы, уласнасць памешчыка, у Магілёўскім павеце.

Па перапісу 1897 г. 102 двары, 666 жыхароў, меліся хлебазапасны магазін, школа граматы, якая ў пачатку 20 стагоддзя пераўтворана ў народнае вучылішча, у якім у 1907 г. навучалася 48 хлопчыкаў. У 1912 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1909 г. 178 двароў, 884 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 80 вучняў, у іх ліку 18 піянераў, меліся харавы і драматычныя гурткі. У былым маёнтку ў 1921 г. створана сельскагаспадарчая арцель. З 20 жніўня 1924 г. цэнтр сельсавета Лупалаўскага, з 2 сакавіка 1931 г. Магілёўскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 207 двароў, 1164 жыхары. У 1933 г. арганізаваны калгас імя І. В. Сталіна, мелася кузня, дзейнічалі торфазавод «Хвойны масток» і цагельня. Пачатковая школа ў 1930-ых гг. пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 289 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У 1940 г. 271 двор, 965 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У снежні 1943 г. гітлераўцы спалілі 258 двароў, загубілі 227 жыхароў. У брацкай магіле, што на могілках, пахаваны 43 воіны 95-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі, якія загінулі ў баях за вызваленне вёскі. Камсамольцы Мастоцкага сельсавета сабралі ў час вайны 100 тысяч рублёў на будаўніцтва самалёта «Мастоцкі калгаснік».

**МАХАВА** — вёска, цэнтр сельсавета (з 20 жніўня 1924 г.). Вядома па пісьмовых крыніцах з 16 стагоддзя. Пад 1585 г. упамінаецца ў «Баркулабаўскай хроніцы». У 1604 г. сяло ў Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета,

шляхецкая ўласнасць. У 1781 г. 41 двор, 314 жыхароў, у Быхаўскім павеце. У 1844 г. пабудавана драўляная царква. У 1858 г. 75 жыхароў мужчынскага полу. Уладальнік маёнтка ў 1862 г. меў 120 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 40 двароў, 164 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася кавальскім промыслам. Па перапісу 1897 г. 45 двароў, 301 жыхар, у Царкоўна-Асавецкай воласці Быхаўскага павета. Меліся хлебазапасны магазін, царква, піцейны дом. У 1901 г. пабудаваны будынак і адкрыта царкоўнапрыходская школа, пераўтвораная ў 1916 г. у земскую. Побач былі фальварак Махава (1 двор, 13 жыхароў), фальварак Махава-1 (1 двор, 16 жыхароў), фальварак Махава-2 і фальварак Махава-3 (2 двары, 26 жыхароў). Меліся праваслаўная царква і пастаялы двор. У 1909 г. 44 двары, 365 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе земскай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 64 вучні, дзейнічаў драматычны гурток. З 20 жніўня 1924 г. цэнтр сельсавета Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Магілёўскім раёне, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. у сяле 80 двароў, 512 жыхароў, у былым маёнтку 32 жыхары. З 1928 г. працавала сыраробчае прадпрыемства. У 1929 г. паявілася радыё. У 1930 г. арганізаваны калгас «Юны ленінец», працавалі кузня, цяслярная майстэрня. Вёска расла за кошт перасялення сялян з суседніх хутароў. У 1930-ых гг. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 289 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У брацкай магіле, што на могілках, пахаваны 75 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях за вызваленне вёскі. На франтах загінулі 434 вяскоўцы, на ўшанаванне памяці якіх у 1975 г. каля будынка выканкома сельсавета пастаўлена стэла.

**МАШАНАКІ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло Машчаны ў Брылёўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная маёмасць, 64 двары. У 1667 г. дзейнічала царква. У 1785 г. у складзе маёнтка Плешчыцы Магілёўскага павета, 40 двароў, 298 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1847 г. 37 двароў, 205 жыхароў, у складзе маёнтка Любуж Магілёўскага павета. Меліся пастаялы двор і царква. Гаспадар маёнтка ў 1871 г. меў тут 541 дзесяціну зямлі. У 1888 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у 1900 г. пабудавана памяшканне. Па перапісу 1897 г. 56 двароў, 404 жыхары, у Нічыпаровіцкай воласці Горацкага павета Магілёўскай губерні. Меліся хлебазапасны магазін, казённая вінная лаўка. У жніўні 1905 г. пры ўдзеле членаў Палескага камітэта РСДРП у вёсцы адбыўся мітынг, на якім сяляне патрабавалі паляпшэння ўмоў жыцця. У памяць аб мітынгу ў 1973 г. на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У 1909 г. 72 двары, 456 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 78 вучняў, у іх ліку 21 піянер. З 20 жніўня 1924 г. да 9 снежня 1975 г. цэнтр сельсавета. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. З 1925 г. дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 116 двароў, 651 жыхар. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны партызан». У 1930-ых гг. пачатковая школа параўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 289 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У школе навучаліся дзеці з в. Машанакі і хутароў Мішкаўка, Зылі. У Вялікую Айчынную вай-

ну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У брацкай магіле, што каля будынка клуба, пахавана 45 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баі за вызваленне вёскі.

**МІКАЛАЕЎКА-1** – вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 19 стагоддзя. Па перапісу 1897 г. 62 двары, 401 жыхар, у Палыкавіцкай воласці, меліся школа граматы, 2 хлебазапасныя магазіны. У 1909 г. 87 двароў, 483 жыхары. Дзейнічалі царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, карчма і паром праз Дняпро. У 1910 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), якая размяшчалася ў наёмным памяшканні.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 47 вучняў. У 1930-ых гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На франтах загінуў 61 вясковец, у памяць аб якіх у 1971 г. каля будынка клуба пастаўлена скульптурная кампазіцыя.

**МІКАЛАЕЎКА-2** – вёска. Заснавана ў пачатку 1920-ых гадоў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Шлях сацыялізму», які ў 1933 г. аб'ядноўваў 44 гаспадаркі. За высокія вытворчыя паказчыкі ў 1940 г. калгас быў занесены ў кнігу Пашаны Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы спалілі вёску. У баі за вызваленне вёскі загінула 60 савецкіх воінаў. На франтах загінуў 61 вясковец, у памяць аб якіх за 3 км на поўдзень ад вёскі, злева ад дарогі Магілёў – Палавінны Лог, у 1970 г. пастаўлена дзвюхфігурная скульптурная кампазіцыя.

**НАВАСЁЛКІ** – вёска. У Вендаражскім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло, 60 двароў, у Іструбішчанскім войтаўстве Магілёўскага староства Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. У 1635 г. 84 двары, мелася карчма. У 1843 г. уласнасць памешчыка. Па перапісу 1897 г. былі: в. Навасёлкі-1 (98 двароў, 616 жыхароў), школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучаліся 42 хлопчыкі, 4 дзяўчынкі, хлебазапасны магазін, в. Навасёлкі-2 (53 двары, 378 жыхароў), сядзіба Навасёлкі-3 (3 двары, 24 жыхары). Апрача земляробства вяскоўцы займаліся кавальскім промыслам і вырабам посуду з дрэва. У ліпені 1905 г. адбылося выступленне сялян супраць прыгнёту. Разагнаўшы ахову, вяскоўцы захапілі панскія лугі. На падаўленне хвалявання былі выкліканы войскі. У 1909 г. у в. Навасёлкі -1 было 110 двароў, 734 жыхары, у в. Навасёлкі-2 – 67 двароў, 433 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. У 1930 г. арганізаваны калгас «Пралетарый». У 1930-ых гг. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, спалена і разрабавана гітлераўцамі.

**НАВАСЁЛКІ-1** – вёска. У Пашкаўскім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1667 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. спустошана ў выніку ваенных дзеянняў. У

1848 г. у Магілёўскім павеце Магілёўскай губерні, з'яўлялася ўласнасцю памешчыка, дзейнічала мураваная царква. У 1858 г. 61 рэвізская душа. У 1880 г. 30 двароў, 192 жыхары, у Княжыцкай воласці Магілёўскага павета. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся вырабам драўлянага посуду, лодак, рыдлёвак. Па перапісу 1897 г. 36 двароў, 220 жыхароў. Побач была сядзіба Навасёлкі-2 (3 двары, 24 жыхары). У 1909 г. 38 двароў, 259 жыхароў. Мелася школа граматы, якая ў 1911 г. ператворана ў земскую.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе земскай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 58 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. У 1925 г. адкрыта хата-чытальня. З 20 жніўня 1924 г. да 21 жніўня 1925 г. цэнтр Навасёлкаўскага-1 сельсавета. У 1930 г. арганізаваны калгас «Дзесяцігоддзе». Меліся кузня і сталярная майстэрня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**НАВАСЁЛКІ** — вёска. У Вяйнянскім сельсавеце. Вядома па рукапісных крыніцах з 16 стагоддзя. У 1566 г. сяло ў Магілёўскай воласці, у часовым валоданні шляхціца. У 1604 г. 56 двароў, у Вяйнянскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць, меўся вадзяны млын. У 1742 г. мелася карчма. У 1785 г. 60 двароў, 352 жыхары, у складзе маёнтка Вільчыцы Магілёўскага павета, дварцовая ўласнасць. У 1850 г. 50 двароў, 296 жыхароў, уласнасць памешчыка, дзейнічаў шынок. У 1880 г. 56 двароў, 351 жыхар, хлебная лаўка. Апрача земляробства вяскоўцы ва ўсіх дварах займаліся вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны. У вясковай школе (народнае вучылішча) у 1889 г. навучаўся 21 хлопчык. У 1897 г. 86 двароў, 580 жыхароў. У 1905 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1909 г. 108 двароў, 672 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 20 жніўня 1924 г. у Грабянёўскім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Магілёўскім раёне, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. На базе земскай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 104 вучні. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 182 двары, 1009 жыхароў. У маі 1931 г. арганізаваны калгас «Ударнік» (45 гаспадарак). Мелася кузня. У 1930-ых гг. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 238 вучняў, дзейнічала бібліятэка і быў радыёпрыёмнік. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За вызваленне вёскі загінула 20 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле, што ў цэнтры вёскі. На франтах загінулі 103 вяскоўцы, на ўшанаванне памяці якіх за 150 м на захад ад вёскі пастаўлена скульптурная кампазіцыя з нанесенымі на пліту прозвішчамі загінуўшых.

**ПАЛЫКАВІЧЫ-1** — вёска, цэнтр сельсавета (з 20 жніўня 1924 г.). Па пісьмовых крыніцах вядома з 1501 г., калі ў ёй было некалькі крытых саломай курных хат. На ўсходзе вёска мяжавала з балотам, на захадзе — з дубовымі і ліпавымі лясамі. У 1560 г. сяло Палуйкавічы ў Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1604 г. у Брылевіцкім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. Непадалёку быў фальварак. У 1742 г. 60 двароў, 2 млыны, карчма. У 1785 г. цэнтр маёнтка Магілёўскага павета.

102 двары, 848 жыхароў, млын, пабудаваная з дрэва царква, 2 сажалкі. У 1834 г. сяло і фальварак. У 1847 г. фальварак быў цэнтрам маёнтка, дзейнічалі вінакурны завод, піваварня, аранжарэя з садам. У сяле было 79 двароў, 520 жыхароў. У 1858 г. было 280 жыхароў мужчынскага полу. У 1864 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1889 г. навучалася 45 хлопчыкаў, у 1907 г. — 54 хлопчыкі і 6 дзяўчынак. Мясцовы памешчык меў у 1871 г. 5731 дзесяціну зямлі, 3 карчмы, 2 паромы, 3 млыны. У 1880 г. 96 двароў, 577 жыхароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся вырабам ільняной пражы і тканіны, пянькі, а таксама кавальскім промыслам. Па перапісу 1897 г. сяло, 142 двары, 950 жыхароў, цэнтр воласці, меліся хлебазапасны магазін, вінная лаўка, дом для ўчастковага фельчара. На сядзібе Палыкавічы было 4 двары, 21 жыхар, 2 вадзяныя млыны, шпалерна-запалкавае прадпрыемства, цэхі па пляценню кошыкаў і абпальванню цэглы. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. Падчас рэвалюцыі 1905—1907 гг. адбыліся сялянскія хваляванні, у выніку якіх была спалена шпалерна-запалкавая фабрыка (1905 г.), дом і свірны памешчыка (1907 г.). У 1908 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1909 г. у вёсцы 222 двары, 1114 жыхароў, на сядзібе — 2 двары, 10 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы разрабавалі і спалілі вёску. 94 савецкія воіны загінулі ў баях за вызваленне Палыкавіч і суседніх вёсак. Яны пахаваны ў брацкіх магілах, што на паўночнай ускраіне і на могілках. На заходняй ускраіне пахаваны жыхары Палыкавіч і суседніх вёсак (каля 8 тыс.), якіх у 1941—1944 гг. загубілі акупанты. У памяць аб земляках, што загінулі на франтах, у 1970 г. каля будынка школы пастаўлены помнік.

Вёска — радзіма Героя Савецкага Саюза Я. А. Юрчанкі і Героя Сацыялістычнай Працы Р. А. Пускіна. Каля вёскі ёсць помнік прыроды рэспубліканскага значэння — Палыкавіцкая крыніца, вада якой мае лекавыя ўласцівасці, апісана В. Севяргіным у «Записках падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы...» (1803—1804 гг.).

**ПЯТРОВІЧЫ** — вёска. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца пад 1560 г. у фрагменце інвентара, які быў складзены ў сувязі з правядзеннем аграрнай рэформы («рэвізіі»). Вёска ў гэты час была дзяржаўнай уласнасцю. У 1563 г. 18 «дымоў», аддадзена ў часовае валоданне шляхціцу. У 1580 г. у пажыццёвым валоданні памешчыка. У 1604 г. 40 двароў, у Гарбавіцкім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць, меўся вадзяны млын. У 1635 г. 33 двары. У 1742 г. сяло і фальварак, у якім былі 6 двароў, млын, карчма. У 1785 г. дварцовая ўласнасць. Памешчык меў у 1865 г. у вв. Пятровічы, Падгор'е і Гарбавічы 6972 дзесяціны зямлі, 4 карчмы, вінакурны завод, 3 вадзяныя млыны і паштовую станцыю. Па перапісу 1897 г. 45 двароў, 313 жыхароў, у Галянёўскай воласці Чавускага павета, меўся пастаялы двор. У 1909 г. 44 двары, 197 жыхароў.

З 20 жніўня 1924 г. у Амхоўскім сельсавеце Лупалаўскага, з 2 сакавіка 1931 г. Магілёўскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. Дзейнічала пачатковая школа. У 1930-ых гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас.

**САЛТАНАЎКА** — вёска. За 1 км на поўнач ад вёскі размешчаны 2 курганныя могільнікі, а за 1 км на поўдзень ад вёскі — 2 стаянкі эпохі неалі-

ту, што сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вёска вядома з 18 стагоддзя. У 1784 г. заснавана суконна-палатняная мануфактура, дзе ў 1797 г. працавала 28 рабочых. У 1785 г. вёска у складзе маёнтка Буйнічы Магілёўскага намесніцтва, меўся млын, уласнасць памешчыка. 11 ліпеня 1812 г. каля вёскі адбылася бітва 7-га пяхотнага корпуса генерала Раеўскага з французскімі войскамі маршала Даву. Рускія салдаты некалькі разоў урываліся ў вёску, знішчылі каля 7 тыс. варожых салдат. У гонар гэтай бітвы ў 1912 г. пабудавана капліца, а ў 1962 г. у цэнтры вёскі ўзведзены абеліск. У 1834 г. у вёсцы было 45 жыхароў, у 1845 г. — 13 двароў, 71 жыхар, цэнтр маёнтка, у Магілёўскім павеце. Гаспадар маёнтка меў тут у 1875 г. 903 дзесяціны зямлі і 3 млыны. Па перапісу 1897 г. 25 двароў, 173 жыхары, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета. Непадалёку быў аднайменны фальварак (5 двароў, 28 жыхароў, вадзяны млын) і сядзіба (4 двары, 27 жыхароў). У 1909 г. у вёсцы 27 двароў, 214 жыхароў, млын, у фальварку — 2 двары, 24 жыхары, млын. У 1913 г. дзейнічаў вінакурны завод (6 рабочых).

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1925 г. створана сельскагаспадарчая арцель, якая аб'ядноўвала 14 гаспадарак. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны сормавец», працавалі вадзяны млын і вінзавод. У 1930 г. калгас атрымаў трактар, у 1933 г. аб'ядноўваў 40 гаспадарак. У 1932 г. вёска атрымала электрычнае асвятленне. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы спустошылі вёску, загубілі 25 жыхароў.

**СЕМУКАЧЫ** — вёска і чыгуначная станцыя. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1745 г. вёска, 16 двароў, у Быхаўскім графстве, уласнасць памешчыка. У 1758 г. 25 двароў, 62 жыхары мужчынскага полу. У 1784 г. вёска павялічылася да 31 двара, а насельніцтва — да 234 чалавек. У 1848 г. 68 двароў, мелася драўляная царква, у 1858 г. 171 жыхар мужчынскага полу. З 1860 г. дзейнічала вапнавая вытворчасць. У 1880 г. 86 двароў, 626 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася адхожым і кравецкім промысламі. Па перапісу 1897 г. 129 двароў, 880 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. Меліся хлебазапасны магазін, піцейны дом, царква, школа граматы, якая ў 1907 г. пераўтворана ў царкоўнапрыходскую.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 65 вучняў. З 1925 г. дзейнічала хата-чытальня. У 1926 г. 181 двор, 1157 жыхароў. У лютым 1930 г. арганізаваны калгас «Колас», у якім спачатку было 7, а ў 1931 г. — 140 гаспадарак, меўся трактар. У 1932 г. у вёсцы стацыянарная кінаўстаноўка пачала паказваць фільмы. У 1936 г. у пачатковай школе было 145 вучняў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У сакавіку 1942 г. партызаны разбурылі вясковы маслазавод. У вёсцы і ваколіцы базіраваўся 113-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы і Магілёўскі падпольны РК КП(б)Б. У 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. За вызваленне вёскі загінулі 56 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле ў цэнтры вёскі. На франтах загінула 90 вяс-

коўцаў. У памяць аб іх у 1970 г. каля школы пастаўлены абеліск.

**СІДАРАВІЧЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1560 г. як сяло, 67 «дымоў», у Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1568 г. аддадзена ў часовае валоданне шляхціцу. У 1604 г. цэнтр маёнтка, шляхецкая ўласнасць. У 1607 г. упамінаецца ў Баркулабаўскай хроніцы. У 1848 г. 62 двары, дзейнічала драўляная царква. У 1858 г. вёска налічвала 420 жыхароў мужчынскага полу, меліся вадзяны млын, карчма, уласнасць памешчыка. Пасля пракладкі ў 1859 г. шашы Магілёў — Доўск у вёсцы размясцілася паштовая станцыя, якая мела 16 коней. У 1880 г. 112 двароў, 711 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася адхожым, рамізніцкім, кавальскім, бандарным і сталярным промысламі. Па перапісу 1897 г. 168 двароў, 1122 жыхары, у Царкоўна-Асавецкай воласці Быхаўскага павета. Дзейнічала мураваная царква (адкрыта не пазней 1880 г.), з 1868 г. школа (народнае вучылішча), у якой у 1889 г. навучалася 26 хлопчыкаў, у 1907 г. — 70 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак. У 1900 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1909 г. 177 двароў, 1361 жыхар, у Грудзінаўскай воласці Быхаўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У хуткім часе быў сфарміраваны чырвонагвардзейскі атрад з 30 найбольш актыўных сялян і былых салдат. У маі 1920 г. ад рук ворагаў савецкай улады загінуў першы старшыня Грудзінаўскага рэўкома С. П. Кандрычын (пахаваны на вясковых могілках). На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 122 вучні, мелася бібліятэка. У 1923—1924 гг. у выніку землеўпарадкавання была падзелена зямля паміж беззямельнымі і малазямельнымі. У 1922 г. створана камсамольская ячэйка (13 юнакоў і дзяўчат), у 1924 г. — арганізаваны піянерскі атрад, у 1925 г. адкрыта хата-чытальня. 5 лістапада 1929 г. агульны сход сялян прыняў рашэнне аб арганізацыі калгаса «Камінтэрн», у лістападзе—снежні ў калгас уступіла 36, а да вясны 1930 г. — 64 гаспадаркі. Старшынёй быў выбраны дваццаціцысячнік, рабочы шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» камуніст П. В. Цуканаў. Пачатковая школа ў 1930 г. пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 320 вучняў.

У Вялікую Айчынную вайну ў ліпені 1941 г. каля вёскі мужна змагаліся супраць гітлераўцаў байцы ўдарнага атрада 747-га стралковага палка 172-ой стралковай дывізіі пад камандаваннем маёра Златаустаўскага і палітрука Берука. У памяць аб воінах гэтага атрада ў 1984 г. каля будынка сельскага Савета пастаўлены абеліск. У баях за вызваленне вёскі ў чэрвені 1944 г. загінула 37 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле на могілках. 320 землякоў загінулі на франтах. У памяць аб іх у 1970 г. каля будынка клуба пастаўлены абеліск. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 279 вяскоўцаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, а ўдзельнік грамадзянскай вайны М. М. Топалеў быў узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Багдана Хмяльніцкага і 12 медалямі.

**СТАРОЕ ПАШКАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 19 стагоддзя. У 1880 г. сяло, 13 двароў, 99 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Мелася царква. Апрача земляробства ва ўсіх дварах вяскоўцы займаліся вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны. Побач быў маёнтак, дзе ў 1890 г. заснаваны мукамольны завод (у 1900 г. 6 рабочых). Па перапісу 1897 г. сяло Вялікі Пашкаў, 26 двароў, 171 жыхар, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага паве-

та. Меліся школа граматы, хлебазапасны магазін, царква. У 1909 г. 45 двароў, 203 жыхары. Побач былі ўладальніцкая сядзіба Вялікі Пашкаў (3 двары, 42 жыхары, паравы млын), сядзіба Вялікі Пашкаў (1 двор, 5 жыхароў, пастаялы двор), вёска Малы Пашкаў (1 двор, 2 жыхары), хутар Пашкаў (2 двары, 11 жыхароў), хутар Пашкаў-2 (7 двароў, 49 жыхароў). У 1910 г. адкрыта земская школа.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. 10 мая 1919 г. створана сельскагаспадарчая арцель «Чырвоны двор», у якую ўваходзіла 27 гаспадарак. У 1920 г. будынак школы згарэў, і пад школу перададзены ў 1922 г. былы царкоўны будынак. У 1925 г. у школе 104 вучні, дзейнічаў драматычны гурток. 1 мая 1924 г. 20 сем'яў аб'ядналіся ў сельскагаспадарчую арцель, для якой райземаддзел адвёў 60 га зямлі. У 1925 г. створана сыраварна-масларобчая арцель (48 гаспадарак). У 1926 г. у вёсцы 79 двароў, 417 жыхароў. 4 студзеня 1930 г. 65 сем'яў арганізавалі калгас імя В. Валадарскага. Меліся трактар, кузня. У 1930-ых гг. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 283 вучні, дзейнічала бібліятэка. У 1939 г. за дасягнутыя поспехі калгас быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. З хутароў у 1939 г. калгас перасяліў 17 гаспадарак. Вёска атрымала электрычнае асвятленне, быў пабудаваны клуб. У 1940 г. калгас узнагароджаны ордэнам Леніна. Тут дзейнічала стаханаўская школа па жывёлагадоўлі. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 11 лютага 1943 г. партызаны разграмілі гарнізон акупантаў, які размяшчаўся ў вёсцы. За 600 м на паўднёвы захад ад вёскі гітлераўцы расстралялі больш за 10 тысяч мірных грамадзян з Магілёва і бліжэйшых вёсак. У баях за вызваленне вёскі загінуў 61 воін 290-ай стралковай дывізіі, якія пахаваны ў брацкай магіле на могілках.

**СТУЖЫЦА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло, 18 двароў, заснаванае ў лесе, у Гарбавіцкім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. У 1858 г. 54 рэвізскія душы, меўся шынок. Па перапісу 1897 г. 34 двары, 252 жыхары, у Галянёўскай воласці Чавускага павета. У 1909 г. 38 двароў, 306 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1918 г. адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 54 вучні з в. Стужыца і хутароў Халмы, Нядашава, Стужыца. З 20 жніўня 1924 г. у Амхоўскім сельсавеце Лупалаўскага, з 2 сакавіка 1931 г. Магілёўскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. хутары, 67 двароў, 427 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоная зорка». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 26 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**СУХАРЫ** — вёска, цэнтр сельсавета (з 20 жніўня 1924 г.). За 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Раста, размешчана гарадзішча, якое сведчыць аб засяленні тутэйшых мясцін у глыбокай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вядома з 1560 г. як сяло ў Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1568 г. аддадзена ў часовае карыстанне шляхціцу. У 1604 г. ва Ульянаўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі. У 1737 г. мелася царква. Па статыстычным апісанні губерні 1784 г. мястэчка (19 двароў, 93 жыхары, млын, драўляная царква, па нядзелях праводзіліся таргі) і вёска (85 двароў,

552 жыхары, цэнтр маёнтка Чавускага павета, уласнасць памешчыка). У 1856 г. памешчык меў тут 1697 дзесяцін зямлі, вадзяны млын і піцейны дом. У 1878 г. працавала крупарушка. У 1880 г. у мястэчку і сяле 133 двары, 730 жыхароў. Меліся лаўка, драўляная царква, сінагога. Частка жыхароў займалася шавецкім і кравецкім промысламі. У 1887 г. школа граматы пераўтворана ў царкоўнапрыходскую, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. Па перапісу 1897 г. мястэчка (53 двары, 406 жыхароў, 2 крупарушкі, 13 лавак, царкоўнапрыходская школа, царква, малітоўны дом, 2 піцейныя дамы) і сяло (105 двароў, 682 жыхары). У пачатку 20 стагоддзя пабудавана з цэглы Успенская царква, якая зараз з'яўляецца помнікам эклектычнай архітэктуры з элементамі псеўдавізантыйскага стылю. У 1909 г. у мястэчку 64 двары, 500 жыхароў, паштовае аддзяленне, казённая вінная лаўка, у сяле — 113 двароў, 814 жыхароў, хлебазапасны магазін. Побач былі аднайменныя сядзіба (2 двары, 9 жыхароў) і фальварак (1 двор, 12 жыхароў, вадзяны млын).

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У студзені 1918 г. непадалёку ад вёскі чавускія чырвонагвардзейцы разграмілі атрад польскіх легіянераў і захапілі вялікія трафеі. У сакавіку 1918 г. сфарміраваны партызанскі атрад. На базе дарэвалюцыйнай была створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. навучалася 132 вучні. 1 мая 1924 г. створана сельскагаспадарчае таварыства. У гэтым жа годзе пачалі дзейнічаць сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства, бібліятэка, хата-чытальня, бальніца, у 1925 г. — народны дом. З 20 жніўня 1924 г. у Лупалаўскім раёне Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. у Чавускім раёне, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. у мястэчку 46 двароў, 222 жыхары, у сяле 131 двор, 902 жыхары. У 1928 г. пачало дзейнічаць сыраробчае прадпрыемства. У 1929 г. арганізаваны калгас «Камуністычны маніфест». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. За вызваленне вёскі загінула 114 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле, у цэнтры вёскі. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза М. К. Цярэшчанка, на ўшанаванне памяці якога ў 1965 г. на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. На франтах загінулі 154 вяскоўцы. На ўшанаванне іх памяці у 1977 г. каля будынка выканкома сельсавета пастаўлены абеліск.

**СЯЛЕЦ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1662 г. сяло ў Аршанскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1785 г. 21 двор, 275 жыхароў, у складзе маёнтка Старыя Буйнічы Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1866 г. адзін памешчык меў тут 309 дзесяцін зямлі, другі — 305 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 50 двароў, 250 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася сталярным, кравецкім, шавецкім і кавальскім промысламі. У 1897 г. сёлы Сялец (7 двароў, 42 жыхары), Сялец-Янава (11 двароў, 76 жыхароў, пастаялы двор), Сялец-1 (5 двароў, 38 жыхароў), Сялец-2 (87 двароў, 612 жыхароў, малітоўны дом). Меліся вадзяны млын, паштовае аддзяленне. У 1909 г. у сяле 93 двары, 295 жыхароў, у сяленні Сялец — 7 двароў, 50 жыхароў, у ваколіцы Янавы Сялец — 7 двароў, 46 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1918 г. адкрыта школа. У 1925 г. у школе было 79 вучняў. З 20 жніўня 1924 г. да 22 ліпеня 1960 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. ад-

крыта хата-чытальня. З 1928 г. дзейнічала сыраробчая арцель. У 1930 г. арганізаваны калгас імя К. Я. Варашылава, які ў 1933 г. аб'ядноўваў 32 гаспадаркі. У 1930-ых гг. у вёсцы дзейнічалі 7-гадовая і пачатковая школы. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Партызаны ў 1943 г. разграмілі валаснoе ўпраўленне акупацыйных улад, якое размяшчалася ў вёсцы. Гітлераўцы спалілі і абрабавалі вёску. За вызваленне вёскі загінулі 123 савецкія воіны, якія пахаваны ў брацкай магіле на паўднёва-ўсходняй ускраіне. На франтах загінулі 149 вяскоўцаў, на ўшанаванне памяці якіх каля будынка клуба ў 1970 г. пастаўлены абеліск.

**ТАРАНАВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1667 г. сяло ў Аршанскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1682 г. цэнтр маёнтка Таранавічы, меўся палац, перавоз праз р. Дняпро (за 4 км ад вёскі), 41 сялянскі двор. Па каралеўскаму ўказу адабрана ад Кіева-Пячэрскага манастыра. У 1785 г. у складзе маёнтка Любуж Магілёўскага павета. У 1858 г. мелася карчма. Па перапісу 1897 г. 20 двароў, 127 жыхароў, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Меліся школа граматы і хлебазапасны магазін. У 1909 г. 26 двароў, 176 жыхароў, у Вяйнянскай воласці Магілёўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 20 жніўня 1924 г. да 16 ліпеня 1954 г. цэнтр сельсавета. У 1926 г. 49 двароў, 283 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны сцяг», які ў 1939 г. аб'ядноўваў 53 гаспадаркі, мелася кузня, выраблялся колы, вазы, сані. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 26 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі загінулі 18 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле на ўсходняй ускраіне.

**ТАЛПЕЧЫЦЫ** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1667 г. маёнтак у Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1743 г. сяло ў Аршанскім павеце. У 1785 г. сяльцо Таўпечыцы-Нікаполь, 15 двароў, 113 жыхароў, цэнтр маёнтка ў Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка, меўся млын. Памешчык меў тут у 1878 г. 677 дзесяцін зямлі, карчму і вадзяны млын. У 1880 г. 33 двары, 253 жыхары. Дзейнічалі школа (народнае вучылішча, адкрыта не пазней 1884 г.) і драўляная царква. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся сталярным і пяньковым промысламі, вырабам тканіны з воўны. У 1884 г. заснавана слясарна-кузнечная майстэрня. У 1912 г. пабудавана для школы памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе земскай адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 87 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У 1924 г. адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 99 двароў, 541 жыхар. У 1929 г. арганізаваны калгас «10 год Кастрычніка». У 1930-ых гадах пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 199 вучняў. У 1940 г. 80 двароў, 394 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1944 г. гітлераўцы спалілі 70 двароў, загубілі 50 жыхароў.

**ХВОЙНА** — вёска. На паўднёва-ўсходняй ускраіне размешчана старажытнае гарадзішча, за 3 км на захад ад вёскі — стаянка эпохі позняга мезаліту (6—5 тысячагоддзе да н. э.), якія сведчаць аб засяленні тутэйшых мясцін у глыбокай старажытнасці. Па рукапіс-

ных крыніцах вядома з 17 стагоддзя. У 1604 г. сяло, у Брылёўскім войтаўстве Аршанскага павета. Меўся млын. У 1635 г. сяло Хвойна, 35 двароў, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 г. 27 двароў, у складзе маёнтка Палыкавічы, уласнасць памешчыка. У 1834 г. 136 жыхароў. У 1847 г. 32 двары, 190 жыхароў. У вёсцы ў 1880-ых гг. дзейнічалі казённыя вінная і хлебная лаўкі. Па перапісу 1897 г. 28 двароў, 222 жыхары, у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. Непадалёку была паштовая станцыя (2 двары, 14 жыхароў). У 1909 г. 34 двары, 202 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1918 г. адкрыта школа. У 1925 г. у школе было 56 вучняў, дзейнічаў драмгурток. З 1923 г. у Сухарэўскай воласці Чавускага павета РСФСР, з 20 жніўня 1924 г. у Мастоцкім сельсавеце Лупалаўскага раёна Магілёўскай акругі БССР (да 26 ліпеня 1930 г.), з 2 сакавіка 1931 г. Магілёўскага раёна, з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. 49 двароў, 278 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя К. Я. Варашылава, мелася кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 26 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ХРЫПЯЛЁВА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 16 стагоддзя. У 1565 г. сяло Хрыпялёва ў складзе маёнтка Княжыцы Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1785 г. 13 двароў, 101 жыхар, у складзе маёнтка Галоўчына Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1871 г. адзін памешчык меў тут 120 дзесяцін зямлі, другі — 135, трэці — 199 дзесяцін зямлі. Па перапісу 1897 г. былі фальварак Хрыпялёва (2 двары, 11 жыхароў), аколіца Хрыпялёва-1 (24 двары, 134 жыхары) і засценак Хрыпялёва-2 (4 двары, 27 жыхароў).

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1926 г. 55 двароў, 242 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Ф. Э. Дзяржынскага, меліся млын, кузня, ваўначоска, дзейнічала пачатковая школа. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У чэрвені 1942 г. партызаны разграмілі валасную ўправу акупантаў. У вёсцы і наваколлі базіраваўся 121-ы партызанскі атрад Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы. Каля могілак у брацкай магіле пахаваны воіны, якія загінулі пры вызваленні вёскі.

**ЦІШОЎКА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 18 стагоддзя. У 1785 г. 8 двароў, 39 жыхароў, у складзе маёнтка Буйнічы Магілёўскага павета. У 1873 г. заснавана запалкавая фабрыка, у 1878 г. — мылаварня. У 1880 г. 43 двары, 126 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кавальскім промыслам. Па перапісу 1897 г. у Цішоўцы-1 было 57 двароў, 489 жыхароў, мылаварня, цагельны завод, 2 кузні, 2 крупарушкі, 6 лавак, пастаялы двор, малітоўны дом, у Цішоўцы-2 — 39 двароў, 254 жыхары, кузня, пастаялы двор, у Цішоўцы-3 — 10 двароў, 71 жыхар. Непадалёку былі фальварак (4 двары, 19 жыхароў) і ўрочышча Дальнія Цішоўкі, яно ж Машанец (2 двары, 14 жыхароў). У 1909 г. у Цішоўцы-1 было 50 двароў, 418 жыхароў, у Цішоўцы-2 — 53 двары, 295 жыхароў, у Цішоўцы-3 — 9 двароў, 77 жыхароў, у фальварку Цішоўка — 1 двор, 14 жыхароў. Земскія школы адкрыты ў 1911 г. у Цішоўцы-2, у 1916 г. — у Цішоўцы-1, размясціліся ў наёмных памяшканнях.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. У 1920 г. створана

малочная арцель. На базе земскай у Цішоўцы-1 пачала дзейнічаць працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. будынак былой сінагогі быў перададзены для хаты-чытальні. У 1930 г. арганізаваны калгас. У 1932 г. вёска атрымала электрычнае асвятленне. З 1937 г. калгас стаў спецыялізавацца на насенняводстве, выпрабаванні новых гатункаў сельскагаспадарчых культур. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы спалілі вёску. У баях за вызваленне вёскі загінула 68 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле, на могілках. На франтах загінулі 39 вяскоўцаў, на ўшанаванне памяці якіх у цэнтры вёскі ў 1972 г. пастаўлены помнік. Пасля вайны адбудавана.

**ШЧЭГЛІЦА** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з 17 стагоддзя. У 1663 г. сяло ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. У 1772 г. 19 двароў, 109 жыхароў, меліся млын і карчма. У 1785 г. 22 двары, 151 жыхар, цэнтр маёнтка, шляхецкая ўласнасць, мелася пабудаваная з дрэва царква. У 1805 г. пабудавана новая драўляная царква. У 1848 г. 29 двароў. Памешчыкам Цімафеевым і Федаровічам належала ў 1872 г. 1142 дзесяціны зямлі. У 1880 г. 33 двары, 217 жыхароў. Ва ўсіх дварах вяскоўцы займаліся вырабам ільняной і пяньковай пражы і тканіны, а таксама посуду і іншых бытавых рэчаў з дрэва. У 1880 г. заснаваны смалакурны завод. Па перапісу 1897 г. 58 двароў, 410 жыхароў, у Княжыцкай воласці Магілёўскага павета. Дзейнічалі царкоўнапрыходская школа, для якой у 1910 г. пабудавана памяшканне, хлебазапасны магазін, пастаялы двор. Побач была аднайменная сядзіба (1 двор, 1 жыхар). У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. 53 двары, 418 жыхароў. Меўся вінакурны завод. У маёнтку, што знаходзіўся непадалёку, быў 1 двор, 4 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені. У 1925 г. у школе было 78 вучняў, дзейнічалі драмгурток, ленінскі куток, бібліятэка. У 1925 г. створана садова-агароднае таварыства, якое аб'ядноўвала 15 гаспадарак. У 1930 г. арганізаваны калгас «Авангард» (у 1933 г. аб'ядноўваў 17 гаспадарак). У гэтым жа годзе для школы пабудавана новае памяшканне. Працавалі кузня і ваўначоска. У 1930-ых гг. пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 207 вучняў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 25 вяскоўцаў. На ўшанаванне іх памяці ў цэнтры вёскі ў 1979 г. пастаўлены абеліск.

**ШЧЭЖАР-1** — вёска. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку 17 стагоддзя. У 1604 г. сяло, 61 двор, у Гарбавіцкім войтаўстве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1742 г. мелася карчма. У 1785 г. 49 двароў, 320 жыхароў, у Чавускім павеце, дварцовая ўласнасць. У 1858 г. 169 рэвізскіх душ, меўся шынок. У 1880 г. 89 двароў, 585 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася калёсным і кравецкім промысламі. У 1886 г. адкрыта школа граматы, пераўтвораная ў 1902 г. у царкоўнапрыходскую. У 1897 г. 107 двароў, 693 жыхары, у Галянёўскай воласці Чавускага павета. Меліся паравы млын (заснаваны ў 1894 г.), хлебазапасны магазін, піцейны дом. Побач былі аднайменныя старожка (1 двор, 1 жыхар) і пастаялы двор (1 двор, 6 жыхароў). У 1909 г. 131 двор, 860 жыха-

роў, дзейнічаў смалярна-дзягцярны завод.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 118 вучняў, дзейнічалі харавы гурток, хата-чытальня, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930-ых гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас, пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую, у якой у 1936 г. было 300 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У 1920-ых гг. вёска Шчэжар падзялілася на вёскі Шчэжар-1 і Шчэжар-2. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**ЯМНІЦА** — вёска. За 0,5 км на захад ад вёскі на правым беразе р. Лахва захаваўся курганны могільнік (7 насыпаў), які адносіцца да канца 11 — пачатку 12 стагоддзя, належаў крывічам. Гэты помнік археалогіі сведчыць аб засяленні тутэйшых мясцін у далёкай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вёска вядома з 17 стагоддзя. У 1680 г. сяло ў валоданні Магілёўскага езуіцкага калегіума. У 1699 г. побач быў маёнтак. У 1785 г. 21 двор, 182 жыхары, у Магілёўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, уласнасць Магілёўскага езуіцкага кляштара, меўся вадзяны млын. У 1846 г. 25 двароў, 189 жыхароў, у складзе аднайменнага казённага маёнтка. У 1880-ых гг. дзейнічалі млын, вінакурны завод. Па перапісу 1897 г. 54 двары, 362 жыхары, у Вендаражскай воласці Магілёўскага павета, мелася вінная лаўка. У 1908 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1909 г. 60 двароў, 405 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З лютага да кастрычніка 1918 г. акупіравана войскамі кайзераўскай Германіі. З 26 красавіка 1919 г. у Гомельскай губерні РСФСР, з 3 сакавіка 1924 г. у складзе БССР, з 17 ліпеня 1924 г. у Магілёўскім раёне Магілёўскай акругі (да 26 ліпеня 1930 г.), з 20 лютага 1938 г. Магілёўскай вобласці. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 38 вучняў. Дзейнічала смалакурня. У 1926 г. 82 двары, 473 жыхары. У 1934 г. арганізаваны калгас «17 год Кастрычніка». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 20 чэрвеня 1944 г. партызаны разграмілі гарнізон акупантаў, які размяшчаўся ў вёсцы.

Баркалабаўская хроніка. / Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 г.

Списки населенных мест Могилевской губернии. Могилев, 1910.

*В. Віталева*

## З архітэктурнай спадчыны

У в. Гарадзішча: *драўляная царква*, пабудаваная ў 1853 г. Прыхаджан было 2870. Там былі ўведзены агульна народныя царкоўныя спевы.

Зямлі пры царкве было 118 дзесяцін. Акрамя міністэрскай народнай школы, дзе навучаліся 104 хлопчыкі і 16 дзяўчынак, прыход адкрыў у вёсках 4 школы граматы, дзе вучыліся 75 хлопчыкаў і 19 дзяўчынак.

Сёння царква патрабуе рамонту.

У в. Машанакі: *драўляны храм*, аднапрастольны, пабудаваны у 1861 г. на сродкі казны. Прыхаджан было 4306. У прыходзе было 8 школ, з іх 7 школ граматы і аднакласная царкоўнапры-

ходская школа. Храм спісаны (рамонту не падлягае).

У в. Махава: *драўляны храм*, пабудаваны у 1844 г. Прыхаджан было 1897. Зямлі пры царкве 53 дзесяціны. У прыходзе было 5 школ, з іх адна царкоўнапрыходская, аднакласная і 4 школы граматы. Абучаліся 88 вучняў.

Ёсць прыпісная *Спаса-Праабражэнская царква*, драўляная, аднапрастольная, з адведзенай зямлёй у 34 дзесяціны. Патрабуе рамонту.

У в. Сідаравічы: *каменны храм*, пабудаваны ў 1866 г. на адпушчаную ўрадам суму. Прыхаджан было 1682. Зямлі 67 дзесяцін. Было 3 школы граматы, у іх абучаліся 45 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. Было тут міністэрскае народнае вучылішча, у ім вучылася 60 хлопчыкаў. Патрабуе рамонту.

**Царква Пакрова ў Багародзіцы.** Пабудавана з цэглы ў 1760 г. Знаходзіцца ў цэнтры в. Вейна.

Цэнтрычны будынак у плане блізкі да квадрата са скругленымі вугламі. У яго кампазіцыі дамінуе сферычны купал на круглым светлавым барабане. Вуглавыя часткі галоўнага фасада завершаны круглымі вежамі. Фасады раскрапаваны рызалітамі, завершанымі трохвугольнымі франтонамі. Па восях рызалітаў размешчаны вялікія нішы з лучковымі імпастамі. У нішах з захаду і поўдня — уваходы, аздобленыя паўкалонамі і стральчатымі люкарнамі ў імпастах. Пры галоўным уваходзе прыбудаваны вялікі драўляны тамбур.

Інтэр'ер двухсветлавы, падзелены 4 магутнымі слупамі. Аркі, якія злучаюць слупы і пілястры сцен, фарміруюць прастору інтэр'ера ў падоўжаным напрамку. Бакавыя часткі больш нізкія, скляпеністыя. У дэкоры выкарыстаны дарэскавыя размалёўкі ў стылі класіцызму. Паміж аконнымі праёмамі светлавога барабана ў медальёнах размешчаны выявы 4 евангелістаў, ніжэй, у рамных абрамленнях, — 4 шматфігурныя кампазіцыі на біблейскія сюжэты. Малюнак выразны, выкананы колера-ценявой мадэліроўкай. Каларыстычная гама цёплая, мяккая, прыглушаных пастэльных тонаў; размаляваны таксама скляпенні, бакавыя сцены алтара і сяродкрыжжа (падноўлены ў 19 ст.).

Царква — помнік архітэктуры класіцызму — сёння дзейнічае.

*А. Кулагін, В. Церашчатава*

**Успенская царква.** Знаходзіцца ў в. Галяні-1.

Пабудавана з цэглы ў 1903 г.

Будынак крыжападобны ў плане, складаецца з выцягнутага па папярочнай восі прамавугольнага асноўнага аб'ёму трохапсіднай алтарнай часткі, дадатковага аб'ёму і бабінца з двух'яруснай вежай — званіцай над ім. Асноўны аб'ём завершаны васьмігранным светлавым барабанам, накрытым пакатым шатром з галоўкай. У вуглавых частках асноўнага аб'ёму зроблены дадатковыя ўваходы. Сцены атынкаваныя. Аконныя праёмы ў ляпных абрамленнях з трохвугольнымі сандрыкамі.

Царква — помнік архітэктуры эклектызму, спалучае рысы традыцыйнага дойлідства, класіцызму і псеўдарускага стылю. Сёння дзейнічае ў святочныя дні.

*Т. Габрусь*

**Касцёл дамініканцаў.** Пабудаваны з цэглы ў 1681 г. Знаходзіцца ў цэнтры в. Княжыцы.

Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя храма складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму з невялікім трансептам у цэнтры і квадратнай апсіды, якія накрыты двухсхільнымі дахамі. Нізкія рознавялікія прыбудовы



Касцёл дамініканцаў у в. Княжыцы

каля алтарнай часткі не парушаюць агульнай сіметрычна-восевай кампаноўкі аб'ёмаў. Галоўны фасад расчлянёны па гарызанталі магутнымі крапаванымі карнізамі, па вертыкалі — пучкамі пілястраў і лучковымі нішамі на 3 часткі. Кожная з частак мае выцягнутыя прапорцыі, завершана вежамі з цыбулепадобнымі галоўкамі. Па баках галоўнага фасада — сцены-прапілеі з арачнымі праёмамі, якія ўтвараюць перад уваходам у храм парадны дворык. Уваходны партал афармлены нізкім рызалітам з трохвугольным завяршэннем і насычанай архітэктурнай пластыкай. Бакавыя фасады аздоблены магутнай аркатурай на вышыню будынка і здвоенымі пілястрамі ў прасценках паміж лучковымі аконнымі праёмамі.

Унутры перакрыцце цыліндрычнае, з распалубкамі і падпружнымі аркамі. Асаблівасць інтэр'ера — адсутнасць прамых вуглоў у планіроўцы нефа. Фрагменты алтара (якія захаваліся) сведчаць аб яго пабудове ў выглядзе групы фланкіруючых калон са стылізаванымі карынфскімі капітэлямі і выгнутымі антаблементамі. Над ўваходам — хоры. Касцёл — помнік архітэктуры барока. Патрабуе рамонту.

*А. Кулагін*

Капліца. Пабудавана з дрэва ў 19 ст. Знаходзіцца на паўночнай ускраіне ў в. Стайкі (Дашкаўскі с/с), на могілках.

Квадратны ў плане аб'ём з шатровым дахам, завершаным шлемападобнай галоўкай. Перад уваходам — ганак з двухсхільным гонтавым навесам на 2 слупах. Бакавыя сцены прарэзаны невялікімі прамавугольнымі вокнамі. Інтэр'ер не мае дэкору.

Капліца — помнік народнага драўлянага дойлідства.

**Успенская царква.** Пабудавана з цэглы ў 1891 г. Знаходзіцца на ўсходняй ускраіне в. Сухары.

Будынак крыжападобны ў плане, крыху выцягнуты па падоўжанай восі. Над сяродкрыжжам узвышаецца масіўны светлавы чацвярык, накрыты пакатым шатром з галоўкай. Алтарная



Успенская царква ў в. Сухары

частка пяціграннная. Па баках да яе сіметрычна прылягаюць меншыя памерамі гранёныя апсіды-рызніцы. Прамавугольны аб'ём бабінца пастаўлены папярок падоўжанай восі і накрыты вальмавым дахам. Асноўным матывам пластычнага вырашэння фасадаў з'яўляюцца трайныя арачныя аконныя праёмы на галоўным фасадзе і чацвярыку. Сцены завершаны развітымі прафіляванымі карнізамі, апрацаваны рустам і ляпнымі абрамленнямі праёмаў. У інтэр'еры памяшканні перакрыты крыжовымі скляпеннямі, апсіды — паўсферычнымі конхамі. Прастора сяродкрыжжа — двухсветлавая.

Царква — помнік эклектычнай архітэктуры з элементамі псеўдавізантыйскага стылю. Царква ў добрым стане. Працуе.

*Т. Габрусь*

## Помнікі гісторыі Магілёўскага раёна

### Брылёўскі сельсавет

**Вёска Брылі**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Каля школы. Пахаваны 25 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. ў баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. ў баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1977 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 142 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1976 г. пастаўлена стэла.

**Вёска Канстанцінаўка**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 128 воінаў 199-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Качурына**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў 1941 г. у баях супраць нямецкіх акупантаў. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Макарынцы**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызвален-

не раёна ад нямецкіх акупантаў. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла Ф. І. Каралькова. На могілках. Ф. І. Каралькоў — лейтэнант Чырвонай Арміі, які загінуў у чэрвені 1944 г. у баі за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 143 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1982 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Машанакі**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Каля клуба. Пахаваны 45 воінаў 32-ой стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Мемарыяльная дошка. На будынку школы. У гонар мітынгу сялян, які быў арганізаваны членамі Магілёўскай арганізацыі РСДРП і адбыўся ў вёсцы 15 чэрвеня 1905 г. у падтрымку палітычных стачак рабочых Іванава-Вазнясенска, Лодзі, Адэсы, рэвалюцыйных выступленняў салдат і матросаў. Устаноўлена ў 1973 г.

## Вендаражскі сельсавет

**Вёска Барсукі**

Магіла ахвяр фашызму. На могілках. Пахавана больш 100 мірных жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941—1944 гг. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Будзішча**

Помнік у гонар партызан 121-га палка імя А. М. Касаева. На ўскраіне вёскі. У 1971 г. на месцы, дзе была зямлянка партызанскага атрада, пастаўлены абеліск.

**Вёска Вендараж**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 60 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941 г. і ў чэрвені 1944 г. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла ахвяр фашызму. На ўскраіне вёскі. Пахаваны 100 жыхароў вёскі, расстраляных у 1941—1944 гг. нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1964 г. на магіле пастаўлена стэла.

Помнік аднавяскоўцам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1985 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Гуслішча**

Магіла Н. М. Зайцавай. На могілках. Н. М. Зайцава — партызанка 121-га партызанскага палка імя А. М. Касаева была закатавана фашыстамі 15 мая 1944 г. У 1965 г. на магіле пастаўлена стэла.

Помнік землякам. Каля магазіна. На ўшанаванне памяці 115 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1971 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

**Вёска Дубінка**

Брацкая магіла партызан. На могілках. Пахаваны партызаны, які загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1942—1944 гг. У 1978 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла ахвяр фашызму. На ўскраіне вёскі. Пахаваны 186 чалавек, якіх спалілі 17 лютага 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1978 г. на магіле ўзведзены курган Памяці.

Магіла Н. Т. Балабенкі. У цэнтры вёскі. Лейтэнант Чырвонай Арміі Н. Т. Балабенка загінуў у чэрвені 1944 г. у баі за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысціх захопнікаў. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Залессе**

Магіла партызан. На могілках. Пахаваны 2 партызаны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баі за вызваленне вёскі. У 1958 г. на магіле пастаўлена стэла.

**Вёска Карчомка**

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. На могілках. Пахаваны воіны Чырвонай Арміі і партызаны 121-га партызанскага палка імя А. М. Касаева, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Навасёлкі**

Магіла Г. З. Герцава. На могілках. Г. З. Герцаў — партызан 113-га партызанскага палка, які загінуў у 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1970 г. на магіле пастаўлена стэла.

**Вёска Салтанаўка**

Помнік рускім воінам. У цэнтры вёскі. У гонар 150-годдзя бітвы рускіх войск генерала Раеўскага супраць французскіх войск. У 1962 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Хрыпялёва**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў 1944 г. у баях за вызваленне вёскі і блізляжачых населеных пунктаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла І. П. Юдзіна. На могілках. І. П. Юдзін — воін Чырвонай Арміі, які загінуў у чэрвені 1944 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

## Вяйнянскі сельсавет

**Вёска Вейна**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі. Пахаваны 38 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне Магілёўскага раёна ад нямецкіх акупантаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўскраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 68 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1975 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: воін і партызанка.

**Вёска Навасёлкі**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі. Пахаваны 20 воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і ў чэрвені 1944 г. у баях супраць нямецкіх акупантаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

Помнік землякам. За 150 м на захад ад вёскі. На ўшанаванне памяці 103 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1972 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: партызан і дзяўчына.

**Пасёлак Усход**

Помнік землякам. У цэнтры пасёлка. На ўшанаванне памяці 74 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1981 г. пастаўлены абеліск.

## Дашкаўскі сельсавет

**Вёска Боўшава**

Магіла А. Н. Карлоўскага. На могілках. А. Н. Карлоўскі — партызан, які загінуў у 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Дашкаўка**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 36 воінаў 385-ай стралковай дывізіі 50-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод іх Герой Савецкага Саюза Ш. Ша-

імаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла ахвяр фашызму. За 1,2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у лесе. Пахаваны жыхары вёскі, расстраляныя 29 верасня 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1968 г. на магіле пастаўлена стэла.

Магіла ахвяр фашызму. Па другі бок прасёлачнай дарогі. Пахаваны савецкія воіны і жыхары вёскі, якія загінулі 29 верасня 1941 г. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Мемарыяльная дошка. На будынку доследнай станцыі. У гонар рускіх войск, якія ў 1812 г. дыслацыраваліся ў вёсцы і ўдзельнічалі 11 ліпеня 1812 г. у бітве супраць французскіх войск каля вёскі Салтанаўка. Установлена ў 1968 г.

Мемарыяльны знак. Каля будынка сельскага Савета. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пастаўлены ў 1984 г.

**Вёска Лежнеўка**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Навасёлкі**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 18 воінаў 222-ой стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Сялец**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 123 воіны 153-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. У 1962 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

Помнік землякам. Каля клуба.На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1970 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Туманаўка**

Магіла ахвяр фашызму. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 38 мірных жыхароў, якіх у снежні 1943 г. забілі нямецка-фашысцкія акупанты. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

## Заводскаслабодскі сельсавет

**Вёска Батунь**

Магіла савецкага воіна-афіцэра, прозвішча невядома. На могілках. У 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Дасовічы**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На ўскраіне вёскі. Пахаваны 81 воін 32-ой і 199-ай стралковых дывізій 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла З. М. Тупікавай — сувязной 22-га партызанскага атрада. На могілках. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Заводская Слабада**

Магіла савецкіх ваеннапалонных і ахвяр фашызму. На ўскраіне вёскі. Пахаваны 40 ваеннапалонных і мірных жыхароў вёскі, якіх у ліпені 1941 г. жывымі спалілі нямецка-фашсцкія карнікі. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 30 аднавяс-

коўцаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1970 г. пастаўлены помнік — скульптуры партызана і дзяўчыны.

**Вёска Малое Хонава**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Магіла чырвонаармейцаў. На могілках. Пахаваны 5 чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1918 г. у баях супраць войск буржуазнай Польшчы. У 1963 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. Каля школы. На ўшанаванне памяці 62 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны,у 1967 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Незаўка**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1963 г. пастаўлены абеліск.

## Кадзінскі сельсавет

**Вёска Кадзіна**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Каля школы. Пахаваны воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Таранава**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, за 50 м на ўсход ад вёскі. Пахаваны 18 воінаў 230-ай стралковай дывізіі, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. ў баях за вызваленне вёскі ад нямецкіх акупантаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Шчэжар**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі. Пахаваны 8 воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і ў чэрвені 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 79 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1971 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

## Княжыцкі сельсавет

**Вёска Бракава**

Помнік землякам. Каля школы. Ушаноўвае памяць 239 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1959 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Залубнішча**

Магіла ахвяр фашызму. На могілках. Пахаваны 153 жыхары вёсак Залубнішча і Пясчанка, якіх у 1942 г. спалілі жывымі нямецка-фашысцкія акупанты. У 1967 г. на магіле пастаўлена стэла.

**Вёска Княжыцы**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі. Пахаваны 80 воінаў 199-ай, 95-ай стралковых дывізій 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

## Мастоцкі сельсавет

**Вёска Грыбаны**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 11 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх

захопнікаў. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 173 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

**Вёска Масток**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 43 воіны 95-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне раёна. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

## Махаўскі сельсавет

**Вёска Касцінка**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Ліпец**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 11 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Махава**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 75 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 434 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1975 г. пастаўлена стэла.

## Нядашаўскі сельсавет

**Вёска Амхавая-1**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 23 воіны, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні вёскі. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Запруддзе**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 26 воінаў 70-ай стралковай дывізіі, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне Магілёўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Нядашава**

Помнік землякам. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 47 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1967 г. пастаўлена стэла.

## Палыкавіцкі сельсавет

**Вёска Краснаполле**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 76 воінаў 95-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза М. І. Яшын. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Мікалаеўка-1**

Помнік землякам. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 60 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1971 г. пастаўлены помнік—скульптурная кампазіцыя: партызан і дзяўчына.

**Вёска Мікалаеўка-2**

Помнік землякам. За 3 км на поўдзень ад вёскі. На ўшанаванне памяці 59 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1970 г. пастаўлены помнік – скульптурная кампазіцыя: воін і партызанка.

**Вёска Палыкавічы-1**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 68 воінаў 95-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 26 воінаў 199-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлена стэла.

Курган Памяці. За 0,2 км на захад ад вёскі. На ўшанаванне памяці мірных жыхароў, якіх у 1941–1944 гг. знішчылі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1968 г. пастаўлены абеліск.

Магіла Р. А. Пускіна – Героя Сацыялістычнай Працы. На могілках. У 1980 г. на магіле пастаўлена стэла.

Помнік землякам. Каля школы. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку Героя Савецкага Саюза І. М. Саламонікава. У 1970 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна.

Радзіма Я. А. Юрчанкі – Героя Савецкага Саюза, удзельніка абароны Масквы, Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, разгрома Квантунскай арміі Японіі на Далёкім Усходзе. Званне Героя прысвоена 29 кастрычніка 1943 г. Памёр у 1981 г., пахаваны ў Кіеве.

## Пашкаўскі сельсавет

**Вёска Гараны**

Магіла ахвяр фашызму. У скверы. Пахаваны больш 300 жыхароў вёскі, якіх 15 верасня спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Вёска Старое Пашкава**

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 61 воін 290-ай стралковай дывізіі 49-ай арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. у баях за вызваленне вёскі. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

